# Гісторыя Беларусі

Частка другая

XIX – XX стагоддзі

Мінск
БДУ
2002

Гісторыя Беларусі: У 2 ч. Ч.2. XIX – XX стагоддзі: Курс лекцый / Рэд. кал. П.І.Брыгадзін, І.Ф.Ладысеў, П.І.Зялінскі і інш. – Мн.: РІВШ БДУ, 2002

# УСТУП

Кніга, з якой шаноўныя чытачы маюць магчымасць пазнаёміцца, з'яўляецца другой часткай задуманага гісторыкамі БДУ і ГрДУ вучэбнага выдання па айчыннай гісторыі. Першая частка курса лекцый выйшла ў свет у 2000 г. Яе аўтарамі былі гродзенскія вучоныя. Другая частка, аўтары якой – навукоўцы Беларускага дзяржаўнага універсітэта, ахоплівае падзеі новага і навейшага часу. Гэты перыяд еўрапейскай, і ў тым ліку беларускай, гісторыі адзначаны глыбіннымі ўзрушэннямі, рэвалюцыямі, дзвюма сусветнымі войнамі, буйнейшай тэхналагічнай аварыяй на Чарнобыльскай АЭС. Яны пакінулі глыбокі адбітак на лёсе беларускага народа.

Адной з вызначальных асаблівасцяў гісторыі Беларусі гэтага перыяду з'яўляецца цесная сувязь з гістарычным лёсам рускага народа, іншых народаў заходняга рэгіёна былой Расійскай імперыі. Складаныя праблемы фарміравання беларускай нацыі, нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва, эканамічнага, сацыяльна-палітычнага і духоўнага развіцця беларускага народа разглядаюцца з улікам навуковых распрацовак беларускіх гісторыкаў, дасягненняў расійскіх, польскіх вучоных.

Безумоўна, падрыхтаваны выкладчыкамі БДУ курс лекцый не можа вычарпаць увесь праграмны матэрыял па айчыннай гісторыі. Лекцыі з'яўляюцца толькі падмуркам для далейшай паглыбленай працы студэнтаў над першакрыніцамі, манаграфічнай літаратурай, публіцыстыкай.

Будзем удзячны нашым чытачам за заўвагі і прапановы.

Рэдакцыйная калегія

## ТЭМА І

## БЕЛАРУСЬ У ПЕРЫЯД АД ПАДЗЕЛАЎ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ ДА БУРЖУАЗНЫХ РЭФОРМАЎ (КАНЕЦ XVIII ст. - 1861 г.)

**Гістарыяграфія, крыніцы.** Вывучэнне гісторыі Беларусі першай паловы XIX ст. пачынаецца ў другой палове гэтага стагоддзя. Спрэчкі аб гістарычным месцы і лёсе Беларусі асабліва абвастрыліся пасля паўстання 1863 г. Што ж такое Беларусь? У чым яе гістарычная роля?

Гісторыкі М. Каяловіч, П. Бацюшкаў, П. Карнілаў і іншыя звязвалі гістарычнае развіццё Беларусі з Расіяй. Прыхільнікі іншага накірунку (Т. Грабоўскі, К. Скірмунт, С. Радзішэўскі і інш.) у падзеях канца XVIII - першай паловы XIX стст. бачылі толькі разбурэнне польскай дзяржаўнасці.

Першыя гістарычныя працы, у аснову якіх была пакладзена "беларуская ідэя", з'явіліся ў пачатку XX ст. Яны былі звязаны з імёнамі М. Доўнар-Запольскага і В. Ластоўскага. Аднак сістэматычнае вывучэнне гісторыі Беларусі першай паловы XIX ст. пачынаецца толькі пасля 1917 г., калі былі адкрыты архівасховішчы і ў рукі гісторыкаў трапілі дакументы, якія дагэтуль не вывучаліся. Гэта была эпоха станаўлення марксісцкай метадалогіі ў гісторыі, і многія беларускія гісторыкі імкнуліся ёю авалодаць. Таму іх першыя даследаванні па гісторыі Беларусі канца XVIII - пачатку XIX ст. былі накіраваны на асвятленне сацыяльна-эканамічных і рэвалюцыйных праблем, заснаваных на марксісцкім разуменні гістарычнага працэсу.

Сярод работ, якія былі напісаны ў гэты час, трэба адзначыць даследаванні У. Ігнатоўскага "Кароткі нарыс гісторыі Беларусі" (Мн., 1919), "Гісторыя Беларусі ў XIX і ў пачатку XX стагоддзя" (Мн., 1928), М. Доўнар-Запольскага 'Гісторыя Беларусі" (Мн., 1994), А. Цвікевіча "Западно-русизм": Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в." (Мн.. 1929). Акрамя названых аўтараў у гэты час публікаваліся даследаванні Ф. Турука, А. Смоліча, У. Пічэты, з'явіліся ў друку публіцыстычныя матэрыялы А. Луцкевіча, Я. Лёсіка, М. Гарэцкага і інш. Аднак ужо ў канцы 20-х гг. вывучэнне гісторыі Беларусі ператвараецца ў спрошчанае тлумачэнне гістарычных фактаў, падзей і працэсаў. Гэта было абумоўлена новым палітычным курсам. З сярэдзіны 30-х гг. дагматызм становіцца метадалагічнай асновай развіцця навукі.

Але і ў гэты час у беларускай гістарыяграфіі з'яўляюцца высокапрафесійныя працы. Сярод іх – манаграфія К. Кернажыцкага

"Гаспадарка прыгоннікаў на Беларусі ў капцы XVIII - першай палове XIX стст." (Мн., 1935).

Новы перыяд гістарычнай навукі начаўся ў другой палове 50-х і працягваўся да канца 80-х гг. У гэты час беларускія гісторыкі асаблівае значэнне надавалі вывучэнню пытанняў сацыяльна-эканамічнага жыцця, фарміраванню буржуазнага грамадства, развіццю грамадска-палітычнага і рэвалюцыйнага руху. Былі надрукаваны кнігі М. Улашчыка "Предпосылки крестьянской реформы 1861 г. в Литве и Западной Белоруссии", В. Чапко "Сельское хозяйство Белоруссии в первой половнне XIX в." і “Города Белоруссии в первой половине XIX века", М. Болбаса "Развитие промышленности Белоруссии (1795-1861 гг.)", А. Лютага "Социалыю-экономическое развитие городов в Белоруссии в конце XVIII – первой половнне XIX вв.", Е. Карнейчыка "Белорусский народ в Отечественной войне 1812 г.", С. Букчына "К мечам рванулнсь наши руки" і інш. Былі выдадзены значныя публікацыі па гісторыі грамадска-палітычнай думкі і культуры Беларусі. Сярод іх трэба назваць работы Э. Дарашэвіча "Философия эпохи Просвещения в Белоруссии", Н. Махнач "Идейная борьба в Белоруссии в 30-40 гг. XIX в.", "От просвещения к революционному демократизму" і "Общественно-политическая и этическая мысль Белоруссии начала XIX в.", А. Мальдзіса "Падарожжа ў XIX ст.", Л. Дробава "Живопись Белоруссии XIX - начала XX вв.".

Этапнымі ў распрацоўцы праблем першай паловы XIX ст. сталі абагульняючыя працы па гісторыі Беларусі. Найбольш значнымі сярод іх з’яўляліся першы том шматтомнай "Гісторыі Беларускай ССР" і аднатомная “История Белорусской ССР”. Нават пры некаторай метадалагічнай абмежаванасці вартасцю гэтых даследаванняў з'яўляецца вялікі фактычны матэрыял, які не згубіў сваёй каштоўнасці да сённяшняга часу.

Новы перыяд у асэнсаванні гістарычнага мінулага Беларусі пачаўся ў 90-я гг. XX ст. Ён звязаны з прынцыпова новымі падыходамі да вывучэння айчыннай гісторыі. Параўнальны аналіз сацыяльна-эканамічнага, палітычнага, канфесіяналыіага і культурнага жыцця Беларусі псрпіай паловы XIX ст., заснаваны на шырокім выкарыстанпі разнастайных крынІц, быў пакладзены ў аснову даследаванняў С. Марозавай, С. Куль-Сяльверставай, В. Шведа, У. Сосны і інш. Спробай стварэння абагульняючага курса гісторыі Беларусі з'явіліся "Нарысы гісторыі Беларусі". Ч. 1 (Мн., 1994). Ч. 2 (Мн., 1995).

Гісторыя Беларусі канца XVIII - пачатку XX ст. вывучаецца на падставе дадзеных разнастайных гістарычных крыніц.

Першую групу гістарычных крыніц складаюць матэрыялы заканадаўства. Гэта законы, маніфесты, палажэнні, указы ўрада, якія дазваляюць прасачыць палітыку ўрада на тэрыторыі Беларусі. Асноўнай публікацыяй крыніц заканадаўчага характару з'яўляецца першы і другі збор законаў Расійскай імперыі, які ўключае заканадаўчыя акты, надрукаваныя ў першай палове XIX ст. Друюй універсальнай крыніцай з'яўлясцца звод дакументаў Расійскай імпсрыі. Звод уключаў толькі дзеючыя закопы, якія змешчаны не ў храналагічным, а ў сістэматычным парадку.

Побач з агульнаімперскімі зводамі на тэрыторыі Беларусі дзейнічалі і зводы мясцовых узаконенняў "Статут Великого Княжества Литовского", "Положение о дворянах Западных губернний, которые по достижении 18 лет поступают в военную службу на основании высочайшего указа 21 апреля 1852 г.", "Правила для составления, предьявления и утверждения люстрационных актов по казённым селениям и местечкам в губерниях: Виленской, Витебской..., Гродненской..., Минской, Могилёвской..." і інш. Матэрыялы заканадаўства па Беларусі апублікаваны С.Ф. Рубінштэйнам у "Хронологическом указателе указов и правительственных распоряженнй по губерниям Западной России, Белоруссии и Малороссии за 240 лет с 1652 по 1892 гг.".

Значнай групай гістарычных крыніц з'яўляюцца афіцыйныя дакументальныя матэрыялы дзяржаўных устаноў, без прыцягнення якіх немагчыма вывучэнне ніводнага пытання гісторыі Беларусі пэршай паловы XIX ст. Гэтыя матэрыялы разнастайныя як па сваёй форме, так і па зместу. Сярод крыніц гэтай групы найвялікшае значэнне маюць матэрыялы Камітэта па справах заходніх губерняў, справаздачы грамадзянскіх губернатараў і генерал-губернатараў беларускіх губерняў, дакументацыя дзяржаўных устаноў. Некаторыя з крыніц гэтага тыпу апублікаваны, але большая частка захоўваецца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь у Мінску, Беларускім дзяржаўным гістарычным архіве ў Гродне, Дзяржаўным гістарычным архіве Літвы ў Вільні.

Вялікая колькасць звестак аб сацыяльна-эканамічнай гісторыі Беларусі змяшчаецца ў эканоміка-геаграфічных і статыстычных апісаннях. Па характару і структуры гэта даволі стракатая група крыніц, аб'яднаная па паходжанню і тэматыцы. Сярод іх эканоміка-геаграфічныя і гаспадарчыя апісанні (інвентары памешчыцкіх маёнткаў, ваенна-тапаграфічныя апісанні). З апублікаваных такіх крыніц можна назваць "Записки путешествия по Западным провинциям Российского государства, или минералогические, хозяйственные

и другие примечания, учиненные во время проезда через оные в 1802 году академиком Василием Севергиным", "Военно-статистическое обозрение Российской империи. Гродненская губерния" Калмберга і інш.

Пры вывучэнні гісторыі Беларусі новага часу вялікае значэнне набываюць статыстычныя крыніцы. Да іх адносяцца спісы фабрык і заводаў, табліцы па гаспадарчаму і грамадскаму ўладкаванню гарадоў, адрас-календары і інш.

Асобную групу крыніц асабістага паходжання прадстаўляюць мемуары і дзённікі. Мемуарная літаратура XIX ст. адрозніваецца разнастайнасцю і адлюстроўвае шырокі спектр сацыяльна-эканамічнага, грамадска-палітычнага, рэлігійнага, культурнага жыцця Беларусі. Часта яны з'яўляюцца адзіным сведчаннем, якое дае ўяўленне аб той ці іншай падзеі або факце.

Урадавую палітыку на тэрыторыі Беларусі адлюстроўваюць, напрыклад, успаміны кн. А. Чартарыйскага, запіскі віленскага генерал-губернатара Ф.Я. Мірковіча, чыноўніка Г. Дабрыніна, селяніна Я. Чабодзькі, мітрапаліта Іосіфа Сямашкі. Для вывучэння гісторыі грамадска-палітычнага руху сур'ёзнай падмогай з'яўляюцца запіскі ўдзельнікаў руху дзекабрыстаў, польскага нацыянальнага паўстання, тайных студэнцкіх арганізацый, якія існавалі пры Віленскім універсітэце. Значная колькасць мемуарнай літаратуры прысвечана вайне 1812 года. Да гэтай самай групы крыніц далучаюцца эпістальярныя лісты, якія істотна дапаўняюць звесткі аб грамадска-палітычным і культурным жыцці Беларусі. Вялікую цікавасць сярод іх прадстаўляе карэспандэнцыя ўдзельнікаў таварыстваў філарэтаў і філаматаў, перапіска дзекабрыстаў.

Шматлікую групу гістарычных крыніц утвараюць літаратурныя і публіцыстычныя творы. Развіваючыся ў цеснай сувязі з грамадскім жыццём, адчуваючы на сабе ўплыў часу, яны з'яўляюцца спецыфічнай формай выяўлення духоўнага жыцця грамадства. Літаратура першай паловы XIX ст. прадстаўлена творчасцю А. Міцкевіча, Я. Чачота, А. Вярыгі-Дарэўскага, У. Сыракомлі, В. Дуніна-Марцінкевіча, публіцыстыкай П. Шпілеўскага і інш.

У перыяд новага часу беларускай гісторыі важнае значэнне набывае перыядычны друк, які становіцца моцным сродкам арганізацыі грамадскага ўсведамлення. Першая палова XIX ст. была прадстаўлена "Виленским вестником", губернскімі і епархіяльнымі "Ведомостями", якія насілі афіцыйны характар. Аднак перыядычныя выданні часта выходзілі за рамкі афіцыёза калі яны публікавалі разнастайны матэрыял па этнаграфіі краязнаўству, археалогіі Беларусі.

Своеасаблівай групай крыніц па гісторыі культуры Беларусі з'яўляюцца творы мастацтва першай паловы XIX ст. Створаныя мастакамі, дойлідамі, скульптарамі, яны сведчаць не толькі аб высокім майстэрскім узроўні іх аўтараў, але і аб духоўным жыцці беларускага грамадства таго часу. Першыя найбольш поўныя зборы мастацкіх твораў Беларусі былі зроблены Л. Дробавым і В. Чантурыяй. У цяперашні час гэта праца працягваецца і аўтары публікуюць разнастайныя альбомы – каталогі мастацтва Беларусі.

У дарэформенны перыяд з'явіліся навуковыя і вучэбныя выданні дакументаў па гісторыі Беларусі з'явіліся ў першай палове XIX стагоддзя. Гэтай працай займаліся Віленская, Пецярбургская археаграфічныя камісіі і іншыя ўстановы. У савецкі час зроблены публікацыі некалькіх цікавых зборнікаў дакументаў. Сярод іх трэба вылучыць "Матэрыялы па гісторыі мануфактуры Беларусі ў часы распаду феадалізму", "Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі (1772-1903 гг.), "Беларусь у эпоху феадалізму" і іншыя.

ЛЕКЦЫЯ 1

# ПРАВАВОЕ І САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЕ СТАНОВІШЧА БЕЛАРУСІ ПАСЛЯ ДАЛУЧЭННЯ ДА РАСІІ

- *Адміністрацыйна-прававое ўладкаванне*
- *Сельская гаспадарка*
- *Прамысловасць. Гандаль. Шляхі зносін*

**Адміністрацыйна-прававое ўладкаванне.** Падзелы Рэчы Паспалітай, адной з буйнейшых дзяржаў Еўропы, былі абумоўлены як знешнімі, так і ўнутранымі прычынамі. Краіна была аслабленая свавольствам шляхты і магнатаў, рэлігійнымі супярэчнасцямі. Суседнія дзяржавы з моцнай, цэнтралізаванай уладай мелі відавочную перавагу над Рэччу Паспалітай, дзе шляхецкая дэмакратыя пераўтварылася ў палітычную анархію.

Расія, Прусія, Аўстрыя выкарысталі зручны момант і рэалізавалі вядомы з часоў старажытных рымлян прынцып "Divide et impera". Тэрыторыя былога Вялікага княства Літоўскага была падзелена на Беларусь і Літву. Напачатку "Белоруссией" называлі самую ўсходнюю частку былога Вялікага княства Літоўскага, якая пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай адышла да Расіі. Пасля другога і трэцяга падзелаў тэрыторыя нованазванай краіны пашыралася на Захад.

У афіцыйных дакументах жыхароў Вялікага княства Літоўскага часта падзялялі на "каталікоў", "уніятаў" і "праваслаўных". Але з цягам часу ўсё больш укараняліся назвы "беларусы, "літоўцы" і "палякі". Прычым літоўцамі сталі называць былых жамойтаў і аўкштайтаў, а да палякаў залічвалі найчасцей каталіцкую шляхту.

Расійская афіцыйная гістарыяграфія на працягу двух стагоддзяў прапаноўвала сваю версію аб вызваленчай місіі Расіі ў адносінах да беларусаў. У савецкія часы падзелы Рэчы Паспалітай і далучэнне тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага да Расіі кваліфікавалася як уз'яднанне беларускага народа з рускім.

На рубяжы XVIII і XIX стст. Вялікае княства Літоўскае згубіла гістарычную назву, пад якой існавала сярод іншых краін Еўропы больш як пяць стагоддзяў.

Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай беларускія землі ўвайшлі ў склад дзвюх губерняў – Магілёўскай і Пскоўскай, якія ў сваю чаргу былі аб'яднаны ў адно генерал-губернатарства на чале з З. Чарнышовым. Згодна з Наказам Кацярыны II ад 28 мая 1772 г., галоўнай задачай губернатараў было сачыць за парадкам "дабы они

сами причину имели почитать отторжение свое от анархии республики польской за первый шаг к благоденствию".

Наказ гарантаваў усім прысягнуўшым на вернасць новай уладзе маёмасную і асабовую бяспеку. Зберагалася права карыстацца мясцовым "языком" і мясцовымі законамі ва ўсіх тых выпадках, калі яны "недотрагиваются до нашей власти".

Захоўваючы прывілеі тутэйшаму пануючаму класу, яшчэ большыя прывілеі даравыў царскі ўрад тым прадстаўнікам рускіх чыноўнікаў, якія пераязджалі на новае месца службы. Для іх павялічваўся аклад за працу, скарачаўся тэрмін службы для атрымання пенсіі і інш. Сяляне, якія пераязджалі з Расіі ў дзяржаўныя маёнткі на тэрыторыі Беларусі, на працяглы тэрмін вызваляліся ад падаткаў.

Першым актам новай улады на Беларусі было выданне генерал-губернатарам Чарнышовым ад імя імператрыцы ў верасні 1772 г. "Плаката" на рускай і польскай мовах з мэтай пазнаёміць насельніцтва з задачамі і палітыкай новай улады. "Плакат" павінен быў запэўніць перш за ўсё шляхту, святароў, гараджан, яўрэяў у тым, што новая ўлада "не збіраецца ўносіць змены ў прававое становішча асобных саслоўяў. Усім гарантавалася зберажэнне прыватнай маёмасці. Ніяк не ўпаміналася аб магчымых зменах у становішчы прыгоннага сялянства, што павінна было супакоіць шляхту. Усё насельніцтва Усходняй Беларусі заклікалася да прынясення прысягі, нягледзячы на тое, што ў самой Расіі прыгоннае сялянства не прыводзілася да прысягі з часоў Елізаветы Пятроўны (1725). Лагодныя адносіны дэманстравала новая ўлада да непрысягнуўшых: яны мелі магчымасць на працягу трох месяцаў прадаваць сваю маёмасць і бесперашкодна выехаць. І хаця ў выпадку адказу ад прысягі пасля трох месяцаў існавала пагроза канфіскацыі маёмасці, на самой справе тэрміны яе неаднаразова пераносіліся. Гэта цягнулася ўвесь 1773 год і нават пазней. Дакладная лічба людзей, што прынялі прысягу, невядома. Але трэба адзначыць, што ўрад Кацярыны II быў задаволены вынікамі прыняцця прысягі насельніцтвам Усходняй Беларусі, што быццам бы сведчыла аб яго згодзе на першы падзел Рэчы Паспалітай.

Колькасць людзей, якая адмовілася ад прысягі, была невялікай. Перш за ўсё гэта былі буйныя феадалы, што валодалі землямі за межамі Усходняй Беларусі, і вярхоўныя іерархі каталіцкай царвы, якія не чакалі нічога добрага ад Масквы. З іх ліку можна назваць двух князёў Чартарыйскіх, двух князёў Радзівілаў, трох князёў Агінскіх,

біскупа Інфлянцкага Я. Гедройца, біскупа Смаленскага Г. Вадзіньскага і інш.

Разам з афармленнем новага падданства быў праведзены перапіс насельніцтва. Урад цікавілі ў першую чаргу падатковыя групы насельніцтва: сяляне, мяшчане, яўрэі. У адносінах да сялян урад імкнуўся да уніфікацыі, прызнаючы толькі два разрады: казённых і прыватнаўласніцкіх сялян. Таму прышлыя, ці адпушчаныя на волю, незаконнанароджаныя, ці запамятаўшыя аб родных, тыя, што пражывалі часова ў гарадах і вёсках і займаліся рамяством, ці батракі запісваліся за панам. Калі ж апошні адмаўляўся запісваць за сабой, то іх запісвалі ў гарадское саслоўе. Жорсткую палітыку праводзіў царскі ўрад у адносінах да дробных уласнікаў. Як казённых сялян запісвалі зямян, якія выконвалі ваенныя абавязкі за атрыманыя ад караля землі. Тое самае можна сказаць пра пушкароў, надворных жаўнераў і іншых людзей ваеннага звання. Сяляне і мяшчане вымушаны былі штогод выстаўляць рэкрутаў, якія павінны былі служыць 25 гадоў у арміі. Толькі з 1793 па 1812 гг. Беларусь паставіла больш за 200 тыс. салдатаў.

Агульная колькасць дзяржаўных сялянскіх двароў паводле перапісу склала 199 575. З іх у прывагнае ўладанне Кацярынай II было аддадзена 141 995 двароў, што складала 71,4%. Значная колькасць сялян была падаравана фельдмаршалам П.А. Румянцаву і А.В. Сувораву ў спадчыннае карыстанне (адпаведна 17 750 і 13 279 душ нрыгонных).

Паншчына на беларускіх землях пасля далучэння да Расіі была паменшана да 57 дзён на тыдзень замест 8-12, або заставалася на ранейшым узроўні. Але падаткі, паменшаныя спачатку на 1,5 года, затым рэзка ўзраслі.

У выніку другога падзелу Рэчы Паспалітай (1793) усе землі, далучаныя да Расійскай імперыі, адміністрацыйна былі падзслены на тры губерні: Мінскую, Ізяслаўскую і Браслаўскую. Дзве губерні былі ўтвораны раней – Магілёўская і Полацкая (да 1776 г. – Пскоўская).

Пасля трэцяга падзелу Рэчы Пасііалітай з'явіліся дзве новыя губерні, Віленская і Слонімская. У 1796 г. з Полацкай і Магілёўскай губерняў была створана Беларуская губерня, а ў 1797 г. з Віленскай і Слонімскай губерняў – Літоўская губерня. Аднак у 1801 г. Літоўская губерня ў чарговы раз была падзелена на Віленскую і Гродзенскую. А Беларуская губерня ў 1802 г. – на Магілёўскую і Віцебскую (замест Полацкай). Перадзелы адбываліся і пазней. Але ў цэлым у першай палове XIX ст. тэрыторыі, далучаныя да Расійскай шперыі ў выніку падзелаў Рэчы Паспалітай, складаліся з двух генерал-губернатарстваў:

Беларускага ў складзе Магілёўскай і Віцебскай губерняў і Віленскага ў складзе Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губерняў. Усе губерні разам падзяляліся на 35 паветаў.

У выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай насельніцтва Вялікага княства Літоўскага, асабліва шляхта, сутыкнулася з дзяржаўным апарагам, які па характару быў вельмі адметным ад таго, з якім звыкліся ў княстве.

Адміністрацыйную палітыку расійскага ўрада адносна далучаных тэрыторый можна падзяліць на некалькі перыядаў, якія пачаргова змяняліся:

1772-1796 гг. (ад першага падзелу да смерці Кацярыны II) – спроба поўнай уніфікацыі і нівеліроўкі асаблівасцяў беларускіх земляў;

1796-1825 гг. (кіраванне Паўла I і Аляксандра I) – адраджэнне часткі некалішняга адміністрацыйнага ўладкавання і кіравання;

1825-1856 гг. (кіраванне Мікалая I) – новая спроба уніфікацыі;

1856-1881 гг. (кіраванне Аляксандра II) – зноў паслабленне ўціску.

У пачатку XIX ст. насельніцтва Беларусі налічвала 3,3 млн. чалавек. Большую яго частку складалі беларусы-літвіны. Выключэннем была Віленская губерня, у якой пераважалі жамойты – 48% ад агульнай колькасці насельніцтва губерні, а беларусы складалі 20% і жылі іераважна ў Віленскім, Дзісненскім і Свянцянскім паветах. Жылі на тэрыторыі беларускіх губерняў таксама рускія, украінцы, латышы, палякі, татары і яўрэі.

Насельніцтва Беларусі падзялялася на прывілеяваныя і падатковыя саслоўі. Вышэйшым прывілеяваным саслоўем было дваранства, якое налічвала крыху менш за 100 тыс. чалавек мужчынскага полу і падзялялася на спадчыннае і асабістае. Асаблівасцю дваранскага саслоўя Беларусі з'яўлялася перавага "сапраўднага" (снадчыннага) дваранства і нізкая ўдзельная вага асабістага (служылага) дваранства, што тлумачыцца адсутнасцю ў былой Рэчы Паспалітай падараванняў "высакароднасці" за службу, як гэта практыкавалася ў Расіі. Другой асаблівасцю, што вызначала дваранскае саслоўе Беларусі, была пераважная наяўнасць дробнапаместнага і беспаместнага дваранства-шляхты.

Па канфесіянальнай прыналежнасці дваранства размяркоўвалася наступным чынам: каталікі складалі каля 87%, праваслаўныя – 6%, пратэстанты – 0,7%, мусульмане – 0,9%. Па свайму нацыянальнаму складу вышэйшае саслоўе беларускіх губерняў у асноўным складалася з палякаў і беларусаў – 95%. Дваране рускага і ўкраінскага

паходжання складалі не больш 2% ад агульнай колькасці. Каля 2% дваран былі татарамі, менш 1% - нямецкага і французскага паходжання.

Другім прывілеяваным саслоўем з'яўлялася духавенства. Сярод яго пераважную большасць складала хрысціянскае духавенства. Яно было прадстаўлена праваслаўнымі, уніяцкімі (да 1839 г.), рымска-каталіцкімі і пратэстанцкімі святарамі. Праваслаўнае і уніяцкае духавенства надзялялася на чорнае (манаства) і белае (прыходскае). Акрамя хрысціянскага духавенства існавала іудзейскае і мусульманскае.

З асяроддзя прывілеяванага насельніцтва Беларусі патрэбна таксама выдзеліць адносна нешматлікую групу ганаровых гараджан (спадчынных і асабістых). У разрад ганаровых гараджан пападалі купцы першай гільдыі, вучоныя, мастакі, дзеці асабістых дваран і дзеці духавенства, якія мелі адукацыйнны цэнз. Ганаровыя гараджане надзяляліся прывілеямі: яны пазбаўляліся рэкрутчыны, цялесных пакаранняў, падушнага падатку і іншых дзяржаўных павіннасцяў.

У пачатку XIX ст. у Беларусі налічвалася каля 7 тыс. чалавек купецкага саслоўя. Яны вызваляліся ад падушнага падатку і цялесных пакаранняў, а купцы I i II гільдый – яшчэ і ад рэкрутчыны. Саслоўны статус купца цалкам залежаў ад яго маёмаснага стану: у выпадку банкруцтва ці разарэння купец выпадаў са свайго саслоўя.

Асноўную масу падатковых саслоўяў і ўсяго насельніцтва Беларусі складалі сяляне. Паводле дадзеных X рэвізіі (1859) з 4410849 жыхароў 2381513 былі прыгонныя і складалі 53,5% ад усёй колькасці жыхароў. Прыгонныя сяляне падзяляліся на дзвс асноўныя групы – памешчыцкія і дзяржаўныя. Пераважную колькасць прыгонных, больш за 95%, складалі памешчыцкія сяляне, якія падзяляліся на паселеных сялян і дваровых. Паселеныя сяляне атрымалі ў карыстанне зямельны надзел, які юрыдычна належаў памешчыку, і займаліся сельскай гаспадаркай. Дваровыя былі пазбаўлены сродкаў вытворчасці і абслугоўвалі памешчыка і яго сядзібу.

Значную частку сялян Беларусі складалі агароднікі, якія былі пазбаўлены ворнай зямлі і мелі толькі сядзібу з агародам. Да прыгонных належалі бабылі, або кутнікі – беззямельныя і бяздомныя сяляне, якія здымалі куток у цяглавых сялян і наймаліся да іх батракамі.

Прыгонныя сяляне знаходзіліся ў поўнай залежнасці ад сваіх уладальнікаў, якія часам адвольна назначалі віды і памеры феадальных павіннасцяў. Памешчык меў права без чаргі здаваць у рэкруты ссляніна, які правінаваціўся, мог адабраць у прыгонных

увесь іх скарб, пакараць цялесна. Сяляне неслі галоўныя і дадатковыя павіннасці. Да галоўных павіннасцяў адносіліся баршчына ці аброк, а гаксама згоны і гвалты. Яны выконвалі таксама дадатковыя павіннасці: шарваркі (будаўнічыя работы), вартаўніцтва (начны дазор) і падводную павіннасць. За гэта сяляне атрымлівалі права лавіць рыбу, займацца ляснымі промысламі і г. д. Па патрабаванню памешчыка яны аддавалі ўсялякія "даніны" ягадамі, грыбамі. мёдам, пражай, палатном і інш.

У сувязі з развіццём памешчыцкага прадпрымальніцтва эксплуатацыя сялянства набыла яшчэ больш цяжкія формы. Акрамя працы на панскай зямлі прыгонныя вымушаны былі яшчэ задарма працаваць на мануфактурах памешчыкаў.

Дзяржаўныя сяляне Беларусі ўтварыліся з розных катэгорый сельскага насельніцтва Рэчы Паспалітай і былі прадстаўлены групамі: ленныя (18098), паезуіцкія (40021), сяляне арэндных маёнткаў (2207). Бліжэй да іх па свайму становішчу былі "панцырныя баяры" (3420), велікарускія стараабрадцы (больш за 12000), вольныя людзі і інш.

Становішча дзяржаўных сялян было крыху лягчэйшым, чым памешчыцкіх. Яны належалі казне і афіцыйна называліся "свабоднымі сялянскімі абывацелямі". У адрозненне ад сялян іншых расійскіх губсрняў, якія знаходзіліся на "аброчным становішчы", беларускія дзяржаўныя сяляне засталіся па "гаспадарчым становішчы". Але казённыя маёнткі часта здаваліся ў арэнду памешчыкам ці чыноўнікам. А часовыя арандатары прымушалі сялян адбываць баршчыну як мага ў большых памерах. "...Уменне прыгнятаць сялян работамі абярнулася на Беларусі ў найтанчэйшае жудаснае для чалавецтва мастацтва", - адзначалася ў ананімнай запісцы, якая была прыкладзена да матэрыялаў рэвізіі 1836-1840 гг.

Другім падатковым саслоўем былі мяшчане – асабіста свабоднае насельніцтва гарадоў, якое павінна было плаціць падушны падатак, грашовыя і натуральныя павіннасці, адбываць рэкрутчыну. Аднак не ўсе мяшчане жылі ў горадзе. Звычайна заможныя сяляне, якія сталі вольнымі і перайшлі ў саслоўе мяшчан, "прыпісваліся" да таго ці іншага горада, але працягвалі жыць у сваёй вёсцы, дзе ў іх была наладжана прадпрымальніцкая справа.

На Беларусі афіцыйна афармляецца асобая непадатковая, але і не прывілеяваная група насельніцтва – разначынцы, г. зн. выхадцы з "розных чыноў і званняў". Гэта была асабіста свабодная катэгорыя насельніцтва, болей ці меней аднародная па характару сваіх заняткаў, па свайму становішчу ў грамадстве, у тым ліку і прававому. Як правіла, разначынец – невялікі чыноўнік, настаўнік гімназіі, дзеяч

навукі. літаратуры ці мастацтва. У першую чаргу разначынцамі з'яўляліся адукаваныя інтэлігенты, выхадцы з сялянства, мяшчанства, купецтва, духавенства, збяднелага дваранства. Агульны іх лік і ўдзельная вага сярод насельніцтва Беларусі ў пачатку XIX ст. не вызначаны.

Пэўныя змяненні адбыліся ў прававым і сацыяльна-эканамічным становішчы яўрэяў, што жылі на тэрыторыі ВКЛ пасля яго далучэння да Расійскай імперыі Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай яны былі запісаны ў мяшчане, дзе выдзяляліся ў асобныя падатковыя і саслоўныя групы. Прызнаваўся падзел на кагалы, зручны расійскай адміністрацыі ў якасці судовай установы. Яўрэі, запісаныя ў купецтва, з 1789 г. атрымалі дазвол на ўдзел у гарадскім самакіраванні, у тым ліку быць выбранымі ў кіраўніцтва. Але ў хуткім часе становішча яўрэяў значна пагоршылася. У 1792-1794 гг. была ўстаноўлена так званая "рыса яўрэйскай аседласці. Гэта была палітыка, накіраваная на ўтрыманне яўрэйскага насельніцтва ў межах яго рассялення. Правы грамадзянства і мяшчанства ім дазвалялася мець толькі ў губернях: Мінскай, Ізяслаўскай (Валынскай), Брацлаўскай (Падольскай), Полацкай (Віцебскай), Магілёўскай, Кіеўскай, Чарнігаўскай, Ноўгарад-Северскай, Екацярынаслаўскай і ў вобласці Таўрычаскай. З ліпеня 1794 г. яўрэі-мяшчане і купцы павінны былі плаціць падвойны падушны падатак. Пачынаючы з 1795 г., вясковых яўрэяў было загадана прыпісваць да гарадоў. А згодна з «Положением об устройстве евреев», зацверджаным 9 снежня 1804 г. Аляксандрам І, іх трэба было выселіць з сельскай мясцовасці ў гарады да 1808 г. Барацьба з Напалеонам затрымала ажыццяўленне гэтых планаў, але не адмяніла іх.

Новы этап наступу на правы яўрэяў пачаўся з імператарскага ўказа ад 11 красавіка 1823 г., які патрабаваў выселіць іх з сельскай мясцовасці да 1825 года. Высяленне пачалося адразу. Ніякай дапамогі не аказвалася. Таму дзесяткі тысяч людзей разам з сем'ямі пераўтварыліся ў бадзяг. З 1827 г. замест грашовага падатку на яўрэяў была распаўсюджана вайсковая павіннасць. У 30-х гг. XIX ст. значна скарацілася "рыса аседласці", былі ўведзены абмежаванні па прадстаўніцтву ў гарадскіх кіруючых органах. 19 снежня 1844 г. выйшаў указ аб ліквідацыі органаў абшчыннай аўтаноміі кагалаў і надначаленні яўрэяў агульным гарадскім і ўездным уладам.

**Сельская гаспадарка.** Тэрыторыя Беларусі ў пачатку XIX ст. складала каля 207 тыс. км$^2$. Землі былі пераважна гліністыя, пясчаныя ці супясчаныя, месцамі камяністыя. Яны патрабавалі стараннай апрацоўкі і добрага ўгнаення. Вядомы рускі эканаміст

сярэдзіны XIX ст. Л.В. Тэнгаборскі па якасных уласцівасцях глебы адносіў Віленскую і Віцебскую губерні да раёна з "пасрэднай" урадлівасцю, а Гродзенскую, Мінскую і Магілёўскую да "часткова пладароднай". Значную частку тэрыторыі Беларусі займалі лясы, шматлікія азёры і балоты. У прыватнасці, у Мінскай і Віленскай губернях лясы складалі 40-45% ад агульнай тэрыторыі. У Віцебскай і Магілёўскай губернях апрацаваных зямель было 41,6 і 39,0%. На ўсёй астатняй тэрыторыі яны займалі крыху больш 1/3 ад усёй плошчы Беларусі.

У канцы XVIII ст. і ў першых дзесяцігоддзях XIX ст. у дзяржавах, дзе ўжо адбыліся буржуазныя рэвалюцыі, назіраўся хуткі эканамічны і сацыяльны прагрэс. У Францыі разгарнуўся прамысловы пераварот, а ў Англіі ён ужо завяршыўся.

На пачатку другога дзесяцігоддзя XIX ст. каля паловы насельніцтва гэтых краін працавала ў прамысловасці і гандлі. Больш адсталыя еўрапейскія дзяржавы ўсё мацней адчувалі эканамічны ціск з боку перадавых капіталістычных краін.

Расія, нягледзячы на свае гаспадарчыя поспехі ў першай чвэрці XIX ст., значна адставала ад еўрапейскіх дзяржаў. Новыя капіталістычныя формы эканамічнага жыцця ў прыгонніцкай Расіі праяўляліся ўсё больш яскрава, але працэс разлажэння феадальна-прыгонніцкіх адносін ішоў марудна. У пачатку стагоддзя большасць насельніцтва Расіі было занята сельскагаспадарчай працай. Сельская гаспадарка па-ранейшаму заставалася вядучай галіной эканомікі.

Беларусь у першай палове XIX ст. лічылася аграрным рэгіёнам Расійскай імперыі. Яе сельская гаспадарка мела ў цэлым экстэнсіўны характар. Пераважала трохпольная сістэма: ярына - азімыя - папар, а дзе-нідзе яшчэ захавалася аблогавае карыстанне зямлёй.

Нярэдкай з'явай у прыгонніцкай вёсцы былі недарод і голад. Напрыклад, у Віцебскай губерні, пачынаючы з 1814 г., на працягу дванаццаці гадоў запар трымаліся "поўныя неўраджаі", а затым з 1847 і. неўраджайныя гады паўтараліся зноў. У Гродзенскай губерні 1845, 1853, 1854 і 1855 гг. характарызуюцца "поўнымі неўраджаямі". Трэба адзначыць, што і ў астатніх губернях Беларусі ўраджайнасць была нізкай.

Частыя неўраджаі, характэрныя для беларускіх губерняў, і выкліканы імі рост нядоімак у прыгонніцкай вёсцы, былі прычынай сур'ёзнай заклапочанасці і трывогі з боку ўрадавага акружэння. Аднак усе меры, што прымаліся ўладамі, былі недастаткова эфектыўнымі.

Нізкая ўраджайнасць была непазбежным спадарожнікам прыгонніцкай сістэмы з яе прымітыўнай земляробчай тэхнікай і невысокай прадукцыйнасцю працы. Паводле дадзеных губернатарскіх справаздач у Беларусі з 1801 на 1861 гг. ураджайнасць на ярыне і азімых у сярэднім не перавышала: у Магілёўскай губерні – 2,5 чвэрці збору на кожную чвэрць пасеву, у Мінскай – 3, у Гродзенскай – 3,5, у той час як па ўнутраных губернях Расійскай імперыі ўраджайнасць у сярэднім складала не менш за 3,6 чвэрці збору на кожную чвэрць пасеву. Сістэма прыгонніцкіх адносін моцна гармазіла развіццё сельскай гаспадаркі. Гэта разумелі і прадстаўнікі ўлады. Магілёўскі губернатар у справаздачах неаднаразова падкрэсліваў, што "асноўная прычына нездавальняючага стану сельскай гаспадаркі заключаецца ў існаванні да гэтага часу прыгонніцкіх адносін, пры якіх сяляне не маюць магчымасці распараджацца вынікамі сваёй працы і, не маючы ніякіх праў уласнасці на зямлю, неахвотна прыкладалі намаганні пры апрацоўцы палёў". Аб гэтым пісаў таксама мінскі губернатар.

Адной з прычын нізкай ураджайнасці была прымітыўная тэхніка земляробства. У першай палове XIX ст. асноўнымі сельскагаспадарчымі прыладамі па-ранейшаму заставаліся саха і драўляная барана. Праўда, часам на цвёрдых глебах выкарыстоўваліся жалезныя бароны. У Віцебскай губерні барану замяняў "смык", які быў зроблены з елкі. На жніве па-ранейшаму выкарыстоўваліся сярпы.

У сялян не хапала жывёлы, таму іх палеткі дрэнна ўгнойваліся, што таксама ўплывала на ўраджайнасць. Асабліва недахоп хатняй жывёлы адчуваўся ў сялянства Віцебскай, Мінскай і Гродзенскай губерняў. Па колькасці коней Гродзенская губерня была на апошнім месцы – 9 коней на 100 жыхароў.

З сельскагаспадарчых культур пераважалі так званыя "шэрыя" хлябы: жыта, ячмень. У 40-х гадах XIX ст. значна пашыраюцца пасяўныя плошчы бульбы, якая з агароднай культуры становіцца палявой. Хутка бульба стала другім хлебам для сялян і важнай тэхнічнай сыравінай для перапрацоўчай прамысловасці, галоўным чынам для вінакурнай. На поўдні Магілёўскай губерні істотна павялічыліся пасевы цукровых буракоў, якія ішлі на цукровыя заводы і вінакурэнне.

Вайна 1812 г. прывяла народную гаспадарку Беларусі да заняпаду. Велізарныя рэквізіцыі і разбурэнні пры адступленні войскаў спустошылі вёску. Сяляне страцілі амаль усю жывёлу і коней. Скараціліся пасяўныя плошчы пад зернавыя. У справаздачы за 1831 г. беларускі генерал-губернатар вымушаны быў прызнаць, што ў

выніку вайны 1812 г. Віцебская і Магілёўская губерні "працягвалі знаходзіцца ў канчатковым заняпадзе" і належаць да "самых бедных у дзяржаве". Вельмі цяжкімі былі неўраджайныя 1820-1822 гг. Недахоп харчовых прадуктаў з прычыны неўраджаю, вайна і голад - усё гэта прывяло да скарачэння насельніцтва Беларусі. На працягу наступных дзесяцігоддзяў смяротнасць на Беларусі перавышала нараджальнасць. Пры параўнанні дадзеных VIII і X рэвізій выявілася, што з 1833 па 1857 гг. у пяці беларускіх губернях прыгоннае насельніцтва скарацілася больш як на 76 тыс. рэвізскіх душ, або на 6,2% .

Прыгонная сельская гаспадарка на працягу другой чвэрці XIX ст. паступова губляла спецыфічныя для яе рысы. Паволі яна надпадала пад уплыў рынку і пачынала набываць таварны характар.

Адной з прычын росту таварнасці сельскай гаспадаркі з'яўлялася наяўнасць значнай колькасці "спажывецкага" насельніцтва. Так, на Беларусі ў 1835 г. налічвалася болей 275 тыс. чалавск гарадскога і мястэчковага насельніцтва, якое займалася пераважна рамяством, гандлем, прадпрымальніцтвам і наймалася на розныя работы. Сярод "спажывецкай" часткі насельніцтва неабходна таксама ўлічваць значную колькасць адыходнікаў.

З ростам таварнасці сельскай гаспадаркі павялічваўся вываз сельскагаспадарчых прадуктаў у прамысловыя губерні Расіі і за мяжу. Развіццю таварна-грашовых адносін спрыялі разгалінаваныя сістэмы рэк, якія звязвалі Беларусь з гарадамі Расіі, Украіны і Польшчы, а праз балтыйскія порты з краінамі Заходняй Еўропы.

У першай палове XIX ст. пачалася спецыялізацыя асобных рэгіёнаў Беларусі. У прыватнасці, у Віцебскай губерні штогод выраблялася да 500 тыс. пудоў ільновалакна. Лён засявалі і ў іншых губернях Беларусі. але ў меншых памерах. У Магілёўскай губерні вырошчваліся каноплі. У Мінскай губерні значна пашырыліся пасяўныя плошчы бульбы, якая потым перапрацоўвалася ў спірт. Па вытворчасці спірту з бульбы Мінская губерня займала першае месца сярод усіх губерняў Расійскай імперыі. У паўднёвых раёнах Магілёўскай і Мінскай губерняў з канца 30-х гадоў некаторыя памешчыкі засявалі велізарныя палеткі цукровымі буракамі, якія потым пераапрацоўвалі на сваіх цукровых заводах і атрымлівалі цукар.

З другой чвэрці XIX ст. у сельскай гаспадарцы Гродзенскай губерні пачала развівацца танкарунная авечкагадоўля. У губернатарскіх справаздачах за 40-50-я гг. падкрэслівалася, што ў губерні "воўна складае вельмі значную крыніцу даходу і прадаецца часткова для ўжывання на мясцовыя фабрыкі, а часткова – у Варшаве". У

канцы 30-40-х гг. у Гродзенскай губерні выраблялася штогод да 40-50 тыс. пудоў высакаякаснай танкарунннай воўны.

Увогуле ў першай палове XIX ст. жывёлагадоўля на Беларусі была развіта слаба. Толькі некаторыя з памешчыкаў спрабавалі прыстасаваць прадукты жывёлагадоўлі да патрэб рынку: адкормліваць жывёлу на мяса, выраблядь на продаж масла і сыр.

Удзельная вага прадпрымальніцкага земляробства на працягу першай паловы XIX ст. была нязначнай. Прадукцыйнасць сельскагаспадарчай вытворчасці на Беларусі стрымлівалася ў першую чаргу ўплывам прыгоннага права.

Асновай прыгонніцкай гаспадаркі Беларусі з'яўлялася феадальная ўласнасць на зямлю. Памешчыкі манапольна валодалі амаль усёй ворнай зямельнай плошчай. Напрыклад, у Мінскам губерні, дзе колькасць памешчыкаў складала толькі 0,2% ад агульнай колькасці жыхароў, ім належала 85% агульнай зямельнай плошчы; у Гродзенскай 58,5% , у Віленскай – 69,5% .

Беларусь была раёнам буйнога памешчыцкага землеўладання. Па дадзеных X рэвізіі ў Беларусі 9404 памешчыкам належала 1 152 411 рэвізскіх душ, гэта значыць сялян мужчынскага полу. Па колькасці прыналежных ім прыгонных сялян усіх памешчыкаў Беларусі можна падзяліць на некалькі груп: безмаёнткавыя - 332 чал., у якіх было 868 рэвізскіх душ; дробнамаёнткавыя – 6557, якія мелі 188921 прыгоннага; сярэднемаёнткавыя – 2117, якія валодалі 448791 (да 500 прыгонных) рэвізійскай душой; буйнамаёнткавыя – 398 чал., мелі 509 000 прыгонных (больш за 500 прыгонных).

Такім чынам, 398 буйных памешчыкаў (4,2% ад агульнай колькасці) мелі ва ўласнасці 44,4% усіх прыгонных. З іх 149 найбольш буйных памешчыкаў Беларусі (1,5 % ад іх агульнай колькасці), у кожнага з якіх было больш за 1000 рэвізскіх душ, з'яўляліся ўладальнікамі больш як 339,5 тыс. сялян, што складала 29,4% ад колькасці ўсіх прыгонных. Сярод іх найбольш уплывовымі былі магнаты Вітгенштэйны, Радзівілы,Румянцавы. Самая вялікая колькасць буйных латыфундый была ў Магілёўскай губерні, а самая меншая – у Віленскай. У Магілёўскай губерні знаходзілася і найбольшая колькасць (142) безмаёнткавых дваран, што складала больш за 40% усіх дваран гэтай катэгорыі на Беларусі.

На працягу першай паловы XIX ст. у памешчыцкай гаспадарцы Беларусі адбываліся змены, якія сведчылі пра разлажэнне феадальна-прыгонніцкай сістэмы. Памешчыцкая гаспадарка паступова ператваралася ў гаспадарку, якая працавала на рынак. З Беларусі

вывозіліся ў асноўным лён, ільняны алей, пянька, воск, лес, каноплі, скура і інш. З 20-х гадоў XIX ст. пашыраецца вываз збожжа.

Значнае павелічэнне экспарту беларускага збожжа адзначаецца ў 40-х і асабліва 50-х гадах XIX ст. Так, у Гродзенскай губерні ў гэты час у сярэднім штогод паступала ў продаж да 250 тыс. чвэрцяў хлеба на суму каля аднаго мільёна рублёў. Толькі ў Данцыг і Кёнігсберг губсрня вывозіла штогод ад 150 да 175 тыс. чвэрцяў жыта, жытняй мукі, проса і іншага зерня. У Віленскай губерні кожны год у сярэднім паступала ў продаж да 346 тыс. чвэрцяў хлеба на суму 1,4 млн. рублёў. Пэўная частка збожжа, якая прадавалася на ўнутраным рынку, выкарыстоўвалася для вінакурэння.

Галоўным пастаўшчыком таварнага збожжа былі памешчыкі. Але і сяляне, якім пагрэбны былі грошы для выплаты дзяржаўпых падаткаў і набыцця розных прадметаў, таксама прадавалі частку свайго хлеба.

Росту таварнай вытворчасці спрыяла рыначная кан'юнктура высокія цэны на хлеб у 1840-1850 гг. Цэны на збожжавыя ў Беларусі і Літве, як правіла, былі значна вышэйшымі, чым у іншых раёнах імперыі, з-за частых неўраджаяў і павышанага попыту на збожжа для памешчыцкага вінакурства. Напрыклад, у Гродзенскай губерні чвэрць жыта ў 1843 г. Каштавала 2 руб. 8 кап., у 1846 г. – 5 руб. 70 кап., а ў 1856 г. – 10 руб.

Развіццё таварна-грашовых адносін падштурхоўвала памешчыкаў прыстасоўваць сваю гаспадарк.у да патрэб унутранага і знешняга рынкаў, павялічваць даходнасць маёнткаў. Гэта імкненне ажыццяўлялася двума шляхамі: правядзеннем пекагорых рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў у сваёй гаспадарцы і ўзмацненнем прыгонніцкай эксплуатацыі сялян.

Для ўдасканалення памешчыцкай гаспадаркі ў 1826 г. было створана Беларускае вольнае эканамічнае таварыства. Таварыства прызначала ўзнагароды за "...увядзенне новай сістэмы гаспадаркі..., за вынаходніцтва і ўдасканаленне спосабаў, якія б паляпшалі становішча ўсіх галін гаспадаркі ў Беларусі земляробства, жывёлагадоўлі, рукадзелля і сельскай прамысловасці". Члены таварыства павінны былі ў сваіх гаспадарках выпрабоўваць новыя сельскагаспадарчыя прылады, ствараць узорпыя фермы, прымяняць мінеральныя ўгнаенні дзеля павышэння ўрадлівасці глебы. Спачатку гэга рэкамендавалася для Віцебскай і Магілёўскай губерняў. У 1848 г. у маёнгку Горы-Горкі Магілёўскай губерні быў адкрыты адзін з першых у Еўропе земляробчы інстытут.

Некаторыя памешчыкі пачынаюць выкарыстоўваць у сваіх маёнтках якаснае насенне бульбы, буракоў, уводзяць новыя сарты збожжавых культур, пашыраюць пасевы льну і іншых кулыур. Гродзенскі губернатар у сваёй справаздачы ў той час паведамляў, што ў большасці маёнткаў "працягваюць весці гаспадарку старымі метадамі, але ў некаторых маёнтках ужо ўводзяцца сучасныя метады", - пачынаюць сеяць кармавыя гравы і выкарыстоўваць земляробчыя машыны.

У Магілёўскай губерні граф Румянцаў, напрыклад, праводзіў вопыты па пасеву розных сартоў бульбы. У Мінскай і Магілёўскай губернях ужываліся ўдасканаленыя малатарні, арфы для ачысткі зерня. У Гродзенскай губерні ў 50-х г. XIX ст. з'явіліся жнейкі і даволі шырока выкарыстоўваліся ручныя і конныя арфы і саламарэзкі. Сельскагаспадарчыя машыны часцей за ўсё прывозіліся з-за мяжы. Але цікава, што ў Беларусі таксама з'яўляюцца вынаходнікі сельскагаспадарчых машын. Так, гаспадар маёнтка Дастоева Пінскага павета Мінскай губерні Якушык змайстраваў і пусціў у продаж параконную малатарню, трох- і чатырохконную жнейкі, машыну для капання равоў і распілоўкі дошак, а таксама такую саху, якая, са слоў вынаходніка, "арэ за чатыры сахі, нягледзячы на тое, што запрэжана параю коней або быкоў".

У першай палове XIX ст. некаторыя памешчыкі ўжо выкарыстоўвалі наёмную працу батракоў. Памешчык Магілёўскай губерні Дзярабін даводзіў графу Румянцаву, што дзесяць рабочых замяняюць трыццаць прыгонных сялян і каштуюць на 88 руб. ганней. Выгаду вольнанаёмнай працы разумелі многія памешчыкі, але выкарыстоўвалі яе адзінкі.

Між тым развіццё прадпрымальніцтва насіла абмежаваны характар. Намаганні памешчыкаў павялічыць прыбытковасць маёнгкаў суправаджаліся пашырэннем панскай ворнай зямлі за кошт скарачэння сялянскіх надзелаў. Памешчыцкая зямля падзялялася на ўласна панскую і сялянскую, якую сяляне атрымлівалі ў карыстанне. Суадносіны часта мяняліся. Паказальны ў гэтых адносінах Гомельскі маёнтак графа І. Паскевіча-Эрыванскага. За 20 гадоў (з 1814 па 1834 гг.) панская ворная зямля павялічылася амаль у два разы, сенажаць памешчыка ўзрасла амаль у тры разы. У 1834 г. з павелічэннем сельскага насельніцтва ў маёнтках на кожную рэвізскую душу прыходзілася тры дзесяціны зямлі (у 1814 г. – 3,76).

Паміж панскім і сялянскім заворваннем не было дакладна ўстаноўленых межаў, зямля была раскідана цераспалосна. На працягу доўгага часу захоўвалася сумеснае карыстанне зямельнымі ўгоддзямі.

Распаўсюджаны быў пашавы сервітут, калі сяляне пускалі сваю жывёлу на памешчыцкае поле пасля ўборкі ўраджаю.

Памешчыкі імкнуліся пашыраць свае заворванні, таму часта пазбаўлялі сялян магчымасці карыстацца зямельнымі надзеламі. Напярэдадні рэформы 1861 г. у Беларусі налічвалася 68717 беззямельных сялян-агароднікаў, батракоў і бабылёў.

Вялікую колькасць беззямельных сялян складалі так званыя "месячнікі", якія замест зямельнага надзелу атрымлівалі мізэрнае месячнае ўтрыманне за працу пры двары памешчыка.

Прыгонныя сяляне Беларусі неслі на карысць памешчыкаў павіннасці ў выглядзе паншчыны або аброку. Сяляне, якія выконвалі паншчыну, складалі 92,4% ад агульнай колькасці прыгонных, аброк – 7,6%.

Выдадзены Паўлам I у 1797 г. Маніфест аб трохдзённай паншчыне на тэрыторыі Беларусі па сутнасці не выконваўся. Землеўладальнікі даводзілі паншчыну да 5-6 і больш дзён у тыдзень. У сялян не заставалася часу працаваць на сваёй гаспадарцы. Дэградацыя сялянскай гаспадаркі адбівалася на агульным стане гаспадаркі краіны. У Расіі даўгі памешчыкаў гады складалі 39 597 тыс. руб. Памешчыкі, якія пазаблытваліся ў даўгах, закладвалі свае маёнткі і прыгонных. Амаль ва ўсіх справаздачах губернатараў беларускіх губерняў за 1850-1860 гг. паведамлялася аб павелічэнні колькасці закладзеных і перазакладзеных маёнткаў. Калі ў 1857 г. з 1190 тыс. рэвізскіх душ было закладзена 672225 (54%), то ў 1858 г. - 711450 (59,8%).

Запазычанасць памешчыкаў, адсутнасць у іх капіталаў, нізкая вытворчасць працы замаруджвалі пераход гаспадаркі на капіталістычны шлях. Толькі адмена прыгоннага права магла даць прастору для эканамічнага развіцця краіны.

Важнай базай сельскагаспадарчай вытворчасці з'яўлялася сялянская гаспадарка. Зямельныя надзелы сялян у Віленскай, Гродзенскай, Мінскай губернях адводзіліся ў падворнае карыстанне; у Віцебскай (за выключэннем Інфлянцкіх паветаў, дзе таксама было падворнае землекарыстанне) і Магілёўскай губернях пераважала абшчыннае землекарыстанне. Фармальна памеры зямельных надзелаў вызначаліся існуючымі тады інвентарамі, неабавязковымі для памешчыкаў.

Размеркаванне надзелаў паміж сялянамі было нераўнамерным. У канцы 50-х гг. сярэдні сялянскі надзел у Віцебскай губерні складаў 6,5 дзесяціны, у Магілёўскай – 7,3 дзесяціны, што з цяжкасцю забяспечвала пражытачны мінімум.

У Віленскай, Гродзенскай, Мінскай і часткова Віцебскай губернях асноўнай адзінкай зямельнага забеспячэння лічылася валока (каля 21,36 га) сенажаці, ворыўнай і прысядзібнай зямлі на двор. Поўныя валочныя гаспадаркі сустракаліся рэдка, у асноўным пераважалі гаспадаркі, якія мелі 3/4 або 1/2 валокі. Пры нізкай ураджайнасці і забалочанасці зямель гэтага надзелу ледзь хапала для забесііячэння пражытачнага мінімуму сялянскай сям'і.

Дзяржаўныя сяляне таксама пакутавалі ад малазямелля. Сярэднія надзелы на рэвізскую душу складалі ў Гродзенскай губерні ад 1 да 2 дзесяцін, у Віцебскай і Магілёўскай ад 3 да 5 дзесяцін.

Гаспадарка сялян была даволі прымітыўнай. Жывёлы не хапала, глеба ўгнойвалася дрэнна, ураджаі былі нізкімі. У пошуках выхаду з гэтага становішча частка сялян займалася промысламі, дробным гандлем і іншымі пабочнымі заробкамі.

Гандлёвыя сувязі сялянскай гаспадаркі з рынкам мелі аднабаковы характар. Сяляне больш прадавалі, чым куплялі. Амаль усе вырučаныя грошы ішлі на выплату дзяржаўных падаткаў.

У дарэформенны перыяд сярод сялян беларускіх губерняў адбывалася маёмаснае расслаенне. У вёсцы з'яўляюцца заможныя сем'і. Паводле дадзеных П.М. Шпілеўскага, у некаторых сялян Мінскай губерні было па дзесяць і болей коней, кароў, атары авечак. Яны выкарыстоўвалі наёмную працу. Частка заможных сялян займалася гандлем, падрадамі, арандавала альбо купляла зямлю, млыны, карчмы. Праўда, колькасць такіх сялян была нязначнай. У Мінскай губерні ў 30-40-я гады ў асабістай уласнасці мелі зямлю не болей 50 сялян.

У 40-х гадах працэс разлажэння феадальнай гаспадаркі паглыбіўся, перарос у агульны крызіс феадальна-прыгонніцкай сістэмы. У беларускіх губернях крызіс праявіўся ў памяншэнні ўраджайнасці, скарачэнні пагалоўя жывёлы, зніжэнні прыбытковасці памешчыцкіх маёнткаў, росце нядоімак. Урад вымушаны быў прызнаць факт цяжкага эканамічнага становішча беларускіх губерняў, пра гэта сведчыць уласнаручная прыпіска Мікалая I, якая была зроблена ім на дакладзе беларускага генерал-губернатара: "У Камітэт Міністраў з тым, каб усе сп. міністры прачыталі і пераканаліся, у якім страшным становішчы губерні знаходзяцца, што аднымі заканадаўчымі мерамі край не толькі не ўзнімецца, але і канчаткова прападзе; патрэбны экстранныя і крутыя меры".

Адным з паказчыкаў нарастаючага крызісу існуючай сістэмы быў сялянскі рух. У 1800-1839 гг. у Беларусі зафіксавана 160 сялянскіх хваляванняў, якімі былі ахоплены 147 маёнткаў і звыш 200

паселішчаў. 37 выступленняў былі падаўлены ваеннай сілай. У 1840-1860 гг. адбылося 350 хваляванняў. У 32 вынадках для іх спынення выклікалася войска. Абсалютная большасць хваляванняў (416, або 81,6%) прыпадала на панскія маёнткі. Паглыбленне антаганізму паміж сялянствам і памешчыкамі было выклікана ўзмацненнем прыгонніцкага ўціску, якое выяўлялася ў павелічэнні памераў паншчыны і чыншу, захопе сялянскіх надзелаў, гвалтоўным перасяленні сялян на неўрадлівыя землі, пераводзе на вотчынныя фабрыкі, жорсткім абыходжанні з імі прыгоннікаў, эканомаў, арандатараў. Асаблівасцю сацыяльных супярэчнасцяў на Беларусі з'яўлялася іх пераплятанне з нацыянальна-рэлігійнай варожасцю паміж сялянамі і панамі.

Барацьба сялян супраць прыгнёту выяўлялася ў розных формах: скаргі, "іскі аб вольнасці", адмова ад выканання павіннасцяў. уцёкі, супраціўленне вотчыннай паліцыі і войску. Пачасціліся выпадкі забойства прыгоннымі сваіх паноў і эканомаў маёнткаў. У 1840 г. былі забіты памешчыкі Магілёўскай губерні Рымша, Солтан, памешчыкі Віцебскай губерні Радзевіч, Таргонскі і інш. Распаўсюджанай формай пратэсту быў пошук сялянамі "вольных зямель". Яны верылі, што ёсць месцы, дзе людзі жывуць вольна. Таму часта сяляне гуртам накіроўваліся на пошукі лепшай долі. У пачатку 40-х гадоў 1200 прыгонных Беліцкага павета Магілёўскай губерні пакінулі сваё жыллё і накіраваліся на пасяленне ў Херсонскую, Екацярынаслаўскую губерні і Бесарабію. Для вяртання іх на радзіму была паслана ваенная каманда.

У канцы 40-х гадоў сярод беларускіх сялян шырока распаўсюдзіліся чуткі, што рыхтуецца адмена прыгоннага права. У сувязі з гэтым сяляне пачалі часцей уцякаць ад памешчыкаў. У 1847 г. каля 10000 сялян Віцебскай губерні групамі па 200-300 чалавек накіраваліся на будаўніцтва Мікалаеўскай чыгункі, спадзеючыся, што, адпрацаваўшы там 3 гады, яны будуць вызвалены ад прыгоннай залежнасці.

Большая частка хваляванняў у 1847-1848 гг. была звязана з увядзеннем у гэтых губернях інвентароў. Абурэнне сялян выклікаў той факт, што замест чакаемай "волі" з'явіліся інвентары, якія пацвярджалі захаванне прыгонніцтва. Мелі месца выпадкі, калі выступленні сялян былі звязаны з прапагандысцкай антыўрадавай дзейнасцю шляхты. Сялянскія выступленні сталі асаблівай пагрозай у сувязі з актывізацыяй польскага нацыянальнага руху і барацьбой галіцыйскіх сялян за сваю свабоду. Барацьба дзяржаўных і

памешчыцкіх сялян за паляпшэнне свайго становішча садзейнічала адмене прыгону.

**Прамысловасць. Гандаль. Шляхі зносін.** Развіццё прамысловасці ў Беларусі прайшло тры ступені (этапы): дробная таварная вытворчасць, мануфактура і фабрыка (буйная машынная індустрыя). Да сярэдзіны XIX ст. прамысловасць Беларусі асноўвалася галоўным чынам на дробнатаварнай і мануфактурнай ступенях развіцця.

Пераважная большасць гарадской прамысловасці Беларусі ў першай палове XIX ст. знаходзілася на стадыі дробнатаварнай рамеснай вытворчасці. Яе развіццё стрымліваў прыгонніцкі лад. Тым не менш у рамеснай вытворчасці адбыліся значныя змены. Былі ліквідаваны самастойнасць і карпаратыўная замкнутасць цэхаў, іх манаполія ў вытворчасці. У некаторых майстэрнях павялічылася колькасць вучняў да 5-8 (раней было не больш 3-4 чал.). Члены цэхаў атрымалі права наймацца на фабрыкі і заводы. У буйных майстэрнях пачалі выкарыстоўваць наёмных рабочых.

У гарадах і мястэчках было шмат дробных прадпрыемстваў з 1-3 рабочымі. Сярод іх найбольш распаўсюджаныя – скураныя, медныя, цагельныя, капялюшныя прадпрыемствы. Рынак збыту іх прадукцыі быў вельмі вузкі. Сяляне былі не ў стане купіць іх вырабы. Не маючы неабходных грошай, сялянская гаспадарка арыентавалася на самазабеспячэнне ўсім неабходным. Прадукцыя гарадской прамысловасці не цікавіла буйных памешчыкаў-прадпрымальнікаў.

Да таго ж у гарадах не было сканцэнтравана вялікіх капіталаў. Таму купцам і мяшчанам даводзілася самім плаціць за зямельныя ўчасткі, сыравіну і рабочую сілу. З гэтай прычыны канкурыраваць з вотчыннікамі ім было вельмі цяжка, а часам і немагчыма. Селянін, па сутнасці, не мог пакінуць вёску, памешчыцкую гаспадарку і перасяліцца ў горад. У такіх умовах пачалося прымусовае перасяленне яўрэяў з памешчыцкіх маёнткаў у гарады і мястэчкі. Яны павінны былі папоўніць гарадское насельніцтва, якое засяродзіла ў сабе гандаль і рамяство.

Міністр унутраных спраў Куракін рэкамендаваў выкарыстоўваць цяжкае матэрыяльнае становішча яўрэйскай беднаты, спрабаваць стымуляваць рознымі льготамі вольны наём; у выпадку ж няўдачы "прымушаць яўрэяў да найму на суконных фабрыках". Адпаведна з указаннем Куракіна віцебскі губернатар прапанаваў кагалам (яўрэйскім абшчынам) тэрмінова прадставіць імянныя спісы беднякоў, каб мець магчымасць "прыняць усе меры для адпраўлення іх на фабрыкі".

Вялікія разбурэнні і страты нанесла гарадам вайна 1812 г.

Непасільныя для многіх мяшчан дзяржаўныя падаткі і павіннасці суправаджаліся наўперызацыяй значнай часткі гарадскога насельніцтва. у канцы 50-х гг. XIX ст. 16,5 тыс. рамеснікаў Беларусі – задавальнялі патрэбы ў сваіх вырабах не толькі жыхароў горада, але і навакольнага вясковага насельніцтва.

Да пачатку 60-х гг. XIX ст. на Беларусі пераважала дробная вытворчасць, хоць, у параўнанні з 1796 г., яна скарацілася па колькасці прадпрыемстваў у 2,3 раза (найперш за лік вінакурняў), але прадукцыя яе істотна вырасла (да 7,1 млн. руб.). У 1860 г. дробная прамысловасць па кошту прадукцыі ўдвая пераўзыходзіла мануфактурную і фабрычную вытворчасці, разам узятыя. Рост адбываўся ў асноўным за кошт узмацнення эксплуатацыі рабочых.

У першай палове XIX ст. развітай была вотчынная прамысловасць. Гэта тлумачыцца тым, што памешчыкам належалі галоўныя каштоўнасці на Беларусі – землі, воды, лясныя і выкапнёвыя багацці, прыгонныя сяляне таксама былі іх уласнасцю.

Развіццю памешчыцкай прамысловасці спрыяў дазвол мясцоваму дваранству з 1776 г. атрымліваць пазыкі ў цэнтральных банках, з правам закладу маёнткаў разам з сялянамі на 24 гады. У канцы 50-х гг. XIX ст. у банках было закладзена каля 68% беларускіх сялян. Памешчыкам было значна лягчэй, чым купцам і мяшчанам, арганізоўваць прамысловыя прадпрыемствы. Вотчынная прамысловасць карысталася бясплатнай сыравінай і дармавой рабочай сілай прыгонных сялян. Перавага прыгонніцкай працы на прамысловых прадпрыемствах Беларусі была адметнай уласцівасцю яе эканамічнага развіцця. У пачатку XIX ст. на Беларусі налічвалася больш за 50 буйных прадпрыемстваў, якія мелі да 200 рабочых, 45 з іх належала памешчыкам.

На Беларусі найбольш распаўсюджанымі былі перапрацоўчыя прадпрыемствы, якія працавалі на сельскагаспадарчай сыравіне, - вінакурныя, суконныя, палатняныя, цукровыя, мукамольныя. Асабліва развіццё атрымалі вінакурні. Прычынай гэтай з'явы было тое, што адной з найважнейшых прывілей шляхты яшчэ з часоў Рэчы Паспалітай было права прапінацыі. Гэта азначала свабоду вырабу і продажу спіртных напояў. Царскае заканадаўства толькі часткова абмяжоўвала гэтае права. З 1796 па 1859 гг. вытворчасць прадукцыі вінакурняў у Беларусі ўзрасла больш чым у 3,5 раза.

У гэты час з'яўляюцца і прадпрыемствы, заснаваныя на вольнай працы. На суконнай мануфактуры Любамірскіх у мястэчку Дуброўна ў 1814 г. быў 261 вольнанаёмны рабочы, на суконнай мануфактуры віцебскага мешчаніна Рубанека – 221. У 50-х гг. XIX ст. значная

колькасць вольнанаёмных працавала на цукровых мануфактурах. Але большасць рабочых былі прыгоннымі, якіх паны на кароткі тэрмін адпускалі на заробкі.

У сярэдзіне 20-х гг. колькасць мануфактур павялічылася. Калі ў 1796 г. на Беларусі налічвалася 8844 дробных прамысловых прадпрыемстваў (галоўным чынам вінакурні і млыны), а таксама 53 мануфактуры, то на 1805 г. колькасць мануфактур павялічылася да 104, а дробных прадпрыемстваў скарацілася да 6681. Пры гэтым прадукцыя і тых і другіх павялічылася. Вядучай галіной вытворчасці была суконная (46 прадпрыемстваў з 2420 рабочымі). Пасля суконнай ішлі палатняная і шкляная галіны прамысловасці. Найбольш развітай у прамысловых адносінах у першай палове XIX ст. была Гродзенская губерня. Там было сканцэнгравана больш 1/3 прадпрыемстваў і больш паловы рабочых Беларусі. Па колькасці прадпрыемстваў яна займала 7-е месца сярод гу-берняў Расіі.

Прамысловае развіццё беларускіх губерняў у другой чвэрці XIX ст. паскорылася. Да сярэдзіны 40-х гг. усяго на Беларусі было ўжо 215 прадпрыемстваў мануфактурнай прамысловасці з 3920 рабочымі. Вядучай галіной прамысловасці заставалася суконная, у якой у 50-я гг. працавала каля 1/4 усіх рабочых. Разам з тым павялічваецца колькасць капіталістычных прадпрыемстваў, якія выкарыстоўвалі вольнанаёмную працу. Гэта было звязана з тым, што на прыгонных мануфактурах прадукцыйнасць была нізкай, што прыводзіла да высокага сабекошту прадукцыі і нізкай рэнтабельнасці прамысловых прадпрыемстваў. Напрыклад, у 1858 г. цукраварэнне ў маёнтку Паскевіча ў Гомелі не толькі не дало ніякага прыбыгку, але і прынесла страты на 4087 руб.

Такім чынам, прыгонныя мануфактуры ўжо не маглі прыносіць вялікія прыбыткі і таму паступова спынялі сваё існаванне. Пачынаючы з 50-х гг. XIX ст. ідзе хуткі рост купецкіх, капіталістычных прадпрыемстваў, якія выкарыстоўвалі вольнанаёмную працу. У 1860 г. да 45% усіх прадпрыемстваў дзейнічалі на аснове вольнага найму.

У другой чвэрці XIX ст. ідзе ўзбуйненне вотчынных мануфактур. Некаторыя з іх ужо адносіліся да тыпу фабрычна-заводскіх прадпрыемстваў, але рабочыя на іх па-ранейшаму заставаліся прыгоннымі. Так, на металургічным заводзе князя Вітгенштэйна выкарыстоўвалася праца прыгонных сялян. Наёмная праца была яшчэ рэдкай з'явай. Напрыклад, у суконнай прамысловасці Мінскай губерні было 7 мануфактур, на якіх працаваў 131 рабочы, з іх 50 – вольнанаёмныя, а астатнія – прыгонныя. Развіццё мануфактурных

прадпрыемстваў стварала передумовы для ўзнікнення першых фабрык і заводаў.

Фабрыкі на Беларусі пачалі ўзнікаць у 20-я гг. XIX ст. Першымі былі пабудаваны суконныя фабрыкі ў мястэчках Хомск і Косава Кобрынскага павета. Тут былі ўстаноўлены паравыя рухавікі, якія з'явіліся на Беларусі на два дзссяткі гадоў пазней, чым у Расіі. Буйным было цукровае прадпрыемства князя Паскевіча ў Гомелі. На металаапрацоўчым прадпрыемстве Бенкендорфа ў маёнтку Старынцы Чэрыкаўскаіа павета працавала каля 900 рабочых. У 1841 г. пачаў працаваць мукамольны завод капіталістычнага тыпу ў Магілёве. На заводзе выкарыстоўваўся паравы рухавік, які штогод перапрацоўваў у крупчатку 30 тыс. пудоў пшаніцы. Так на Беларусі з'явіліся псршыя нрадпрыемствы з механізаванай вытворчасцю прамысловых працэсаў. Псраход ад ручной працы да механізаванай азначаў прамысловы пераварот, які павінен быў прывесці да павышэння прадукцыйнасці працы і стварыць іювую арганізацыю вытворчасці – фабрычна-заводскую нрамысловасць. У 1845 г. на Беларусі налічвалася 9, у 1850 г. – 13, у 1860 г. – 30 фабрык, у тым ліку 8 – у вінакурнай, па 4 – у суконнай і металаапрацоўчай, па 3 – у цукраварнай, мукамольнай і лесапільна-гантарэзнай, па 1 – у мылаварна-свечнай, смола-шкіпінарнай, паташнай і гарбарнай вытворчасцях. Яны вырабілі прадукцыі на 1,6 млн. руб. і па гэтаму паказчыку перавысілі 127 мануфактур.

Прамысловасць па-ранейшаму спецыялізавалася на перапрацоўцы сельскагаспадарчай прадукцыі. Таму прыкметную ўдзельную вагу мелі такія галіны прамысловасці, як суконная (5152 рабочых, кошт прадукцыі каля 3 млн. руб.), папяровая (539 рабочых, кошт прадукцыі звыш 2 млн. руб.), шкляная (523 рабочых, кошт прадукцыі каля 200 тыс. руб.) і інш. У 1860 г. агульны кошт прадукцыі прамысловасці дасягаў ужо 10,2 млн. руб., аднак агульная колькасць прамысловых рабочых была невялікай.

Такім чынам, развіццё прамысловасці ў Беларусі ў першай палове XIX ст. характарызавалася сваімі асаблівасцямі. Галоўнай з іх была даволі вялікая колькасць дробных прадпрыемстваў. Фабрычная вытворчасць мела нізкую ўдзельную вагу ў агульным выпуску прамысловай прадукцыі. Дробныя прадпрыемствы (з колькасцю рабочых да 15 і без прымянення паравых рухавікоў) давалі амаль 84% усёй прамысловай прадукцыі, мануфактуры (прадпрыемствы з 16 і больш рабочымі, з ручной працай) – 7,4%, фабрычныя (машынізаваныя) – да 9%.

Размяшчэнне прамысловых прадпрыемстваў у беларускіх губернях было вельмі нераўнамерным. У канцы 50-х гадоў на прадпрыемствах Гродзенскай губерні працавала больш паловы ўсіх рабочых пяці паўночна-заходніх губерняў – 5112 рабочых з 9714. У Магілёўскай губерні на прадпрыемствах было 1882 рабочых, Мінскай – 815.

Найбольшых поспехаў у дарэформенны перыяд дасягнула суконная прамысловасць. Суконныя прадпрыемствы былі пастаўшчыкамі сукна для арміі, урад быў зацікаўлены ў іх развіцці. У цыркуляры міністра ўнутраных спраў у 1808 г. указвалася на неабходнасць павелічэння колькасці суконных мануфактур у Беларусі. Для заахвочвання прадпрымальнікаў апошнім даваліся дзяржаўныя пазыкі.

Сярод прадпрыемстваў Беларусі значнае месца займалі папяровыя, шкляныя, жалезаапрацоўчыя, цагельныя заводы ці фабрыкі. Яны працавалі на мясцовай сыравіне. Шкляная прамысловасць, напрыклад, была сканцэнтравана ў Магілёўскай губерні, дзе знаходзілася 8 з 14 заводаў Беларусі. На іх поацавала 433 рабочых і выпускалася больш 90% уссй прадукцыі шкляной прамысловасці.

У 30-я гады частка прадпрымальнікаў стварае новыя цукровыя праднрыемствы. "Цукровая гарачка" на Бела-пусі пачалася, галоўным чынам, у Мінскай і Магілёўскай губернях. У 1833 г. у Карэлічах пачаў працаваць цукровы завод. На ім працавала 150 рабочых. У Бабруйскім павеце ў маёнтку Дабосна на цукровым заводзе памешчыка Булгака ў 1839 г., у мэтах садзейнічання развіццю цукровай прамысловасці, было арганізавана спецыяльнае таварыства, Статут якога быў зацверджаны Камітэтам міністраў.

Цукровыя заводы ў асноўным грунтаваліся на вольнанаёмнай працы, некаторыя з іх мелі паравыя рухавікі. На цукровым заводзе памешчыка Скірмунта ў Парэччы Пінскага павета быў паравы рухавік, а ўсе рабочыя былі вольнанаёмныя (толькі на палях, дзе вырошчвалі буракі, працавалі прыгонныя). Завод выпрабляў 900 пудоў цукру ў год.

Наогул у 1857 г. на Беларусі дзейнічала 13 цукровых заводаў. На іх працавала 1164 рабочых, яны штогод выраблялі 12,5 тыс. пудоў цукру, які прадаваўся не толькі на мясцовым рынку, але вывозіўся і ў Маскву.

Аднак "цукровая гарачка" працягвалася нядоўга. Невялікія цукровыя заводы Беларусі не вытрымалі канкурэнтнай барацьбы з больш буйнымі прадпрыемствамі Расіі, Украіны, Польшчы і ў сярэдзіне 60-х гадоў XIX ст. спынілі сваё існаванне.

Нягледзячы на істотныя зрухі, развіццё прамысловасці Беларусі першай паловы XIX ст. было нязначным, а тэмпы развіцця – маруднымі.

У 1825 г. у беларускіх губернях вызначыліся 69 гарадоў. Найбольш буйнымі былі Вільна, Віцебск, Мінск, Магілёў, Гродна. У 59 гарадах колькасць жыхароў была меней 5 тыс. Па дадзеных Цэнтральнага статыстычнага камітэта гарадское насельніцтва ўзрасло ў 1861 г. да 655,3 тыс. жыхароў супраць 261,4 тыс. у 1825 г. Гарады раслі як за кошт натуральнага прыросту, так і ў выніку перасялення з вёсак, у тым ліку прымусовага перасялення яўрэяў з памешчыцкіх маёнткаў. 70-80% гарадскога насельніцтва складала мяшчанства (рамеснікі, дробныя гандляры), дваранства і духавенства – 6-7%, купецтва – 2-2,5% .

У першай палове XIX ст. пашыраецца ўнутраны і знешні гандаль. Яго развіццё стала вынікам разлажэння феадальна-прыгонніцкіх адносінаў, што садзейнічала росту гарадскога насельніцтва і прамысловасці.

Развіццю гандлю спрыяла і паляпшэнне сродкаў сувязі, будаўніцтва каналаў і дарог. Былі пабудаваны Маскоўска-Варшаўская шаша, якая прайшла праз Магілёўскую, Мінскую, Гродзенскую губерні, а таксама іншыя дарогі, абсаджаныя дрэвамі, так званыя "гасцінцы". Важнуіо ролю ў гандлёвых неравозках адыгрывалі рэкі і каналы. На іх знаходзілася 85 прыстаняў.

У 1804 г. быў адкрыты Агінскі канал, які злучыў рэкі Прыпяць і Днепр з Нёманам, а ў 1805 г. пачала дзейнічаць Бярэзінская водная сістэма, якая злучыла Днепр з Заходііяй Дзвіной. Усё гэта садзейнічала злучэнню паміж сабой беларускіх губерняў, а таксама забяспечвала гандлёвы абмен з цэнтральнай Расіяй, Украінай, Прыбалтыкай і Царствам Польскім.

Узрасла роля знешняга гандлю. Ён ажыццяўляўся ў асноўным па рэках. Транспартныя перавозкі дасягнулі значных памераў. У 1861 г. у Магілёўскай губерні па Дняпры і Сожы прайшлі 1082 судны, 441 плыт, на якіх было занята 17 тыс. рабочых. У Гродзенскай губерні па суднаходных рэках прайшло 5531 судна і 7584 плыты, у Віленскай губерні прайшло 3230 суднаў, 2441 плыт; на іх было занята 18 991 чалавек і загружалася тавару на 4471 тыс. рублёў. Праз Рыгу, Гданьск, Кёнігсберг адпраўляліся баржы з беларускімі таварамі.

Вывазны гандаль асабліва пашыраецца ў 40-50-я гады, калі ўзняліся сусветныя цэны на збожжа. Пра яго ажыўленне сведчыць павелічэнне вывазу збожжавых культур за апошнія пяць год перад рэформай. Калі ў 1856 г. з Беларусі вывезена жыта 73, аўса 92,

ячменю 39 тыс. чвэрцяў, то у 1861 г. адпаведна: 318, 447, 154 тыс. чвэрцяў.

Асабліва пашырыліся сувязі з Расіяй і Украінай. Штогод у Расію вывозілася тавараў на суму 15-18 млн. рублёў. Палову вывазу давала Віцебская губерня з яе галоўнай артэрыяй – Заходняй Дзвіной. Паўночныя раёны Беларусі былі пастаўшчыкамі льну і льнопрадукцыі. З цэнтральных і заходніх раёнаў вывозіліся хлеб, гарэлка, спірт, воўна, сала, лес. Увозіліся на Беларусь посуд, тканіна, соль, тытунь, віно, селядцы з Расіі і Рыгі. Беларускія тавары траплялі ў Вялікабрытанію, Аўстрыю, Прусію, Італію, Францыю, Турцыю, Кітай, Персію і іншыя краіны.

З'явіліся ў гэты час і новыя формы арганізацыі гандлю: пастаянны крамны гандаль, штотыднёвыя гарадскія кірмашы.

Гандаль на Беларусі развіваўся пераважна ў форме кірмашоў. Так, у Гродзенскай губерні налічвалася 43 ярмаркі. На самай буйной з іх – Зэльвенскай – гадавы гандлёвы абарот перавышаў 1 млн. рублёў. Сярод буйных кірмашоў Беларусі вылучаліся Мінская ярмарка, а таксама Любавіцкая – у Магілёўскай губерні. Усяго на Беларусі праходзіла каля 200 кірмашоў. Сюды прывозілі сельскагаскадарчыя і прамысловыя тавары не толькі з Беларусі, але і з Маскоўскай, Уладзімірскай, Ніжагародскай губерняў, Украіны, Польшчы, Прусіі і г. д. У Беларусь увозілі воўну, металічныя вырабы, галантарэю. Цікава адзначыць паступовае змяненне асартыменту прывезеных тавараў. Напрыклад, на Стаўпянскую прыстань у 1827 г. прывозілі пераважна прадметы раскошы: фарфоравы і фаянсавы посуд, крышталь, люстэркі, дарагое віно, а ў 50-х гадах ужо выгружалі пераважна чыгунныя вырабы, свінец, волава, паперу; у 1860 г. было выгружана на прыстань 19,7 тыс. пудоў чыгуну.

У мэтах павышэння прыбыткаў памешчыкі пачынаюць займацца прадпрымальніцтвам, што станоўча ўплывала на развіццё гандлю. Яны адкрываюць у сваіх маёнтках лесапільныя заводы, вінакурні. На пачатку XIX ст. у Беларусі налічвалася 5215 вінакурняў, што складала 20% ад іх агульнай колькасці ў Расіі. Амаль у кожным маёнтку была свая вінакурня.

Рост суконных мануфактур выклікаў попыт на воўну. Памешчыкі разводзілі спецыяльную пароду авечак-мерыносаў, шэрсць з якіх цалкам прызначалася на продаж. У 1860 г. у Гродзенскай губерні налічвалася 240 тыс. мерыносаў, з якіх здымалі да 68 тыс. пудоў воўны ў год для суконных фабрык.

Развіццё гандлю было цесна звязана са станам прамысловасці, сельскай гаспадаркі, плацежаздольнасці насельніцтва. Феадальна-

прыгонніцкая сістэма скоўвала развіццё ўсіх галін народнай гаспадаркі, абмяжоўвала пашырэнне ўнутранага рынку.

Знішчэнне прыгонных адносін з'яўлялася неабходнай перадумовай далейшага эканамічнага развіцця.

ЛЕКЦЫЯ 2

# УРАДАВАЯ ПАЛІТЫКА

- *"Польскае пытанне" і ўрадавая палітыка*
- *Урадавая палітыка ў галіне асветы*
- *Заканадаўства. Ідэі і рэаліі*
- *Канфесіянальная палітыка*

**"Польскае пытанне" і ўрадавая палітыка.** Урадавая палітыка ў першай палове XIX ст. звязана з імёнамі расійскіх імператараў Аляксандра I і Мікалая I. Для эпохі Аляксандра I (1801-1825) была характэрна палітыка "заходніцтва". Шырокія колы еўрапейскай грамадскасці былі незадаволены вынікамі французскай рэвалюцыі, якая не стварыла "царства розуму на зямлі", і ўмацоўвалі сваю веру ў эвалюцыйным, рэфармісцкім шляху дзяржаўнага развіцця. Адсюль спроба правядзення ў Расіі дзяржаўных пераўтварэнняў – "дней Александровых прекрасное начало". Намер Аляксандра I павярнуць краіну на шлях канстытуцыйнай манархіі і вырашыць сялянскае пытанне сустрэў ва ўрадавых колах Расіі моцную апазіцыю з боку кансерватараў, асабліва перад пагрозай напалеонаўскага нашэсця. Заходніцкі курс паступова згубіў сваю дынаміку, а ў 20-х гадах ён змяніўся ўзмацненнем самадзяржаўных тэндэнцый і расчараваннем імператара, які ўсвядоміў правал сваёй палітыкі.

Перыяд кіравання Мікалая I (1825-1855) – гэта вяртанне да традыцыяналісцкага шляху развіцця Расіі. Ідэалагічным абгрунтаваннем гэтага шляху стала так званая "тэорыя афіцыяльнай народнасці", адной з праяў якой з'явілася ўмацаваяне асноў манархічнага праўлення і новая спроба вырашэння сялянскага пытання, якая выразілася ў стварэнні некалькіх сакрэтных камітэтаў.

Нягледзячы на розныя падыходы ў здзяйсненні ўнутранай палітыкі, абодвух імператараў аб'ядноўвала імкненне вырашэння "польскага пытання". Падзелы Рэчы Паспалітай паклалі канец існаванню адной з буйных дзяржаў Еўропы і абумовілі ўзнікненне "польскага пытання". Польскае грамадства ўвесь час імкнулася да аднаўлення страчанай дзяржаўнасці і былой велічы. З ім салідарызавалася значная частка беларускай (літвінскай) шляхты, якая аж да канца XIX ст. марыла аб аднаўленні Рэчы Паспалітай і аўтаномнай Літвы ў яе складзе. "Польскае пытанне" ўвесь час заставалася вострым і аказвала ўплыў на ўсе сферы ўрадавай палітыкі, якая праводзілася

на тэрыторыі Беларусі. Гэта праявілася ў заканадаўчай, саслоўнай, нацыянальна-рэлігійнай палітыцы і ў галіне асветы.

Без змены сваёй сутнасці, формы і метады гэтай палітыкі мяняліся ў залежнасці ад палітычнай сітуацыі ў рэгіёне. Большасць зямель Вялікага княства Літоўскага разглядаліся як спрадвечна рускія. Таму адной з галоўных задач урад лічыў вяртанне страчаных пазіцый праваслаўя, ліквідацыі ўплыву Рыма на ўнутраныя справы Расіі, асабліва царкоўныя і асветніцкія.

Характар урадавай палітыкі на тэрыторіі Беларусі шмат у чым вызначаўся канстытуцыяналістычнымі памкненнямі Аляксандра І, які пагадзіўся з пастаноўкай пытання аб магчымым аднаўленні дзяржаўнасці Польшчы. Гэта дапамагло прыцягнуць да агульнаімперскай дзяржаўнай дзейнасці дзеячаў Рэчы Паспалітай, у тым ліку А. Чартарыйскага і М. Агінскага, садзейнічала стварэнню Царства Польскага са сваёй канстытуцыяй і мясцовай адміністрацыяй.

Няўпэўненасць, якая існавала ў Аляксандра І адносна межаў будучай Польшчы, а магчыма, і дыпламатычныя меркаванні прывялі да таго, што ўся тэрыторыя Беларусі была ўключана ў склад Віленскай навучальнай акругі. Вынікам такой палітыкі з'явілася ажыўленне польскага ўплыву ў галіне культуры і мовы, умацаванне пазіцый каталіцызму. Раскрыццё на пачатку 20-х гг. у Віленскім універсітэце тайных студэнцкіх гурткоў, у якіх прымала ўдзел беларуская моладзь, паўплывала на змяненне ўрадавай палітыкі на Беларусі. З гэтага часу асноўным яе накірункам становіцца ўсямернае паслабленне польскага палітычнага і культурнага ўплыву. Невыпадкова з Віленскай вучэбнай акругі у 1824 г. былі выключаны і перададзены ў Пецярбургскую вучэбную акругу дзве беларускія губерні – Віцебская і Магілёўская, а А. Чартарыйскі вызвалены ад пасады папячыцеля акругі і зменены М. Навасільцавым.

Курс гэты яшчэ больш узмацняецца ў канцы 20-х гадоў і асабліва ў сувязі з паўстаннем 1830-1831 гг. Менавіта гэтым тлумачыцца стварэнне Беларускай навучальнай акругі з дакладна акрэсленымі адміністрацыйна-этнічнымі межамі беларускай тэрыторыі. Урад імкнуўся даказаць, што гэта тэрыторыя была здаўна "рускай" і развярнуў даволі шырокую выдавецкую дзейнасць па гісторыі, этнаграфіі і культуры Беларусі.

Саслоўная палітыка, якая праводзілася на тэрыторыі Беларусі, была накіравана на ўмацаванне пазіцый Расіі. У адносінах да беларускага дваранства яна ўлічвала гістарычныя асаблівасці, якія складваліся на працягу стагоддзяў. Расія не ведала такой сацыяльнай групы як дробная шляхта, якая часам набліжалася да становішча

селяніна-аднадворца. Працэнт дваранскага саслоўя ў Расіі быў намнога ніжэй, чым у Беларусі. Збяднелыя дваране ў Расіі гублялі свае прывілеі, пераходзілі на дзяржаўную ваенную або грамадзянскую службу. На Беларусі збяднелая шляхта юрыдычна нічым не адрознівалася ад магнатаў і мела з імі аднолькавыя правы. Розніца ў прававым статусе дваранства ў Расіі і Беларусі была даволі значнай. У былой Рэчы Паспалітай шляхта не заўсёды бясспрэчна падпарадкавалася дзяржаўнай уладзе. У Расіі, дзе існавала неабмежаваная манархія, традыцыі палітычнага жыцця былі зусім іншыя. Таму палітыка расійскага ўрада ў адносінах да дваранства Беларусі яшчэ з канца XVIII ст. вызначалася надзвычайнай асцярожнасцю.

Мясцовым дваранам прадастаўляліся ўсе правы і прывілеі, якімі валодала расійскае дваранства, дазвалялася карыстацца "мясцовымі законамі", калі яны не супярэчылі "расійскім". На тэрыторыі Беларусі да 1840 г. дзейнічаў Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 г. Таму ва ўсіх указах, якія выходзілі ў першай чвэрці XIX ст., падкрэслівалася, што "суд і расправа" з'яўляюцца ўнутранымі справамі тэрыторый, якія былі далучаны да Расіі. Яны павінны весціся на мясцовым праве і, як правіла, на мясцовай мове. Аднак мясцовая адміністрацыя стваралася па расійскіх нормах і падпарадкоўвалася цэнтральнай уладзе. Асцярожнасць у адносінах да беларускага дваранства дыктавалася тактычнымі меркаваннямі.

Новым ва ўрадавай палітыцы быў дыферэнцыраваны падыход да розных груп беларускага дваранства. На першы план вылучалася палітыка ў адносінах да дробнай шляхты. якая складала абсалютную большасць мясцовага прывілеяванага саслоўя. Яна праявілася ў так званым "разборы" шляхты, у прыпісцы былых шляхціцаў да розных груп падатковага саслоўя.

І хоць "разбор" шляхты быў дэклараваны яшчэ ў 1772 г., яго рэалізацыя праводзілася марудна, непаслядоўна, асабліва з прычыны ўскладненай юрыдычнай сістэмы доказаў дваранскага паходжання. З пачатку новага стагоддзя адным са шляхоў паслаблення пазіцый дробнага дваранства было змяненне заканадаўства ў сістэме выбарных судовых органаў. Паўстанне 1830-1831 гг. паскорыла "разбор" шляхты. Разбор праводзіўся не толькі з пункту гледжання стварэння адзінай эканамічнай і палітычнай прасторы, але і пашырэння фіскальнай урадавай практыкі, павелічэння колькасці плацельшчыкаў падаткаў і пастаўшчыкоў рэкрутаў.

З канца XVIII ст. значная колькасць дваранства Беларусі актыўна выступала за аднаўленне Рэчы Паспалітай. Галоўнымі цэнтрамі руху былі Варшава і Кракаў, таму паняцце "Рэч Паспалітая" ўсё больш

атаясамлівалася з паняццем "Польшча". Частка беларускай шляхты апынулася ў фарватары гэтага руху. Яна не жадала русіфікацыі краю, а сама добраахвотна паланізавалася. Пасля далучэння беларускіх зямель да Расіі працэс паланізацыі часткі беларускага насельніцтва не толькі не быў прыпынены, а наадварот, нават паскорыўся.

Польскі элемент дамінаваў у вызваленчым руху. Урадавая палітыка ў адносінах да паўстанцаў, а таксама да членаў тайных гурткоў да 30-х гадоў была дваістай. Удзельнікі найбольш масавых з іх (напрыклад, паўстанне Т. Касцюшкі) практычна засталіся без пакарання. Гэтым урад спрабаваў прыцягнуць на свой бок вышэйшае саслоўе беларускіх губерняў. Адначасова адбываўся працэс абмежавання правоў і прывілеяў мясцовай шляхты. У выніку чаго яе становішча пагоршылася, а імкненне да аднаўлення Рэчы Паспалітай узмацнілася.

Невыпадкова на прадстаўнікоў дробнай шляхты ў першую чаргу абрушыліся рэпрэсіі. Арышты, высылка ва ўнутраныя губерні імперыі, сакрэтны нагляд паліцыі, цэнзура асабістай перапіскі сталі традыцыйнымі мерамі "супакойвання" шляхты. Пазіцыя беларускага дваранства ў ходзе падзей 1830-1831 гг. прымусіла ўрад Мікалая I змяніць адносіны да сялянства і пачаць палітыку дэпаланізацыі Беларусі.

Сялянскае нытанне на тэрыторыі Беларусі на працягу першай паловы XIX ст. зведала значную эвалюцыю. Мерапрыемствы царскага ўрада па сялянскаму пытанню не маглі не зацікавіць беларускіх памешчыкаў. "Вызваленне сялян" у Остзейскім краі ў 1816-1819 гг., па якому сяляне атрымлівалі асабістую свабоду, а памешчык заставаўся ўласнікам усіх зямельных угоддзяў, умацавала памешчыкаў памежных раёнаў у жаданні беззямельнага вызвалення сялян. Дзінабургскае дваранства Віцебскай губерні стварыла камітэт для выпрацоўкі адпаведнага палажэння. Аднак работа над ім зацягнулася надоўга і не была рэалізавана.

Пасля паўстання 1830-1831 гг. урад пачаў глядзець на сялян як на сваіх магчымых саюзнікаў, імкнуўся схіліць іх на свой бок. Адным з гакіх пачынанняў была рэформа кіравання казеннымі маёнткамі і дзяржаўнымі сялянамі. Яна праводзілася па праекту створанага ў 1837 г. Міністэрства дзяржаўных маёмасцей. У адрозненне ад вялікарасійскіх губерняў, дзе яна тычылася толькі арганізацыі кіравання казённымі маёнткамі і дзяржаўнымі сялянамі, рэформа П.Д. Кісялёва на Беларусі складалася з трох частак: рэформы сістэмы кіравання; палітыкі "апякунства" ў адносінах да сялян; некаторых аграрных мерапрыемстваў, вядомых пад назвай "люстрацыі

дзяржаўных маёмасцей". Рэформа пачалася з перабудовы апарату кіравання дзяржаўнай вёскай. У аснову заснавання ніжэйшых ступеняў кіравання было пакладзена "Устанаўленне аб кіраванні дзяржаўнымі маёнткамі ў губернях" (1838).

28 снежня 1839 г. для заходніх губерняў было выдадзена смецыяльнае палажэнне "Аб люстрацыі дзяржаўных маёмасцей заходніх губерняў і Беластоцкай вобласці". Замест чатырохступеннай сістэмы мясцовага кіравання, якая была ўведзена ў расійскіх губернях, на Беларусі ўстанаўлівалі тры адміністрацыйныя ступені: губерня-акруга-сельская ўправа. Функцыі валасной адміністрацыі размяркоўваліся паміж часовымі ўладальнікамі і сялянскімі выбарнымі. Новая адміністрацыя ўвяла жорсткі кантроль за часовымі ўладальнікамі, узняла статус сельскіх абшчын. Другой часткай рэформы стала палітыка "апякунства" над дзяржаўнымі сялянамі. Яна прадугледжвала арганізацыю харчовай дапамогі сялянам праз спецыялыпа пабудаваныя запасныя хлебныя магазіны, распрацоўку мер на выпадак неўраджаяў і масавых эпідэмій. Ставілася пытанне аб арганізацыі розных агранамічных мерапрыемстваў, пачатковага навучання дзяржаўных сялян, першай медыцынскай дапамогі, развіцця сістэмы страхавання, барацьбы з п'янствам, актывізацыі гандлю. Аднак недахоп сродкаў, жаданне палепшыць сялянскі быт цалкам за кошт саміх сялян звужалі рамкі рэформ, перашкаджалі здзяйсненню планаў рэфарматараў.

Галоўнай часткай рэформ П.Д. Кісялёва з'явілася люстрацыя дзяржаўнай маёмасці. Яна ставіла тры мэты: больш дакладны ўлік дзяржаўнай маёмасці, выраўноўванне гаспадарчага ўзроўню сялян шляхам скасавання малазямелля і рэгламентацыі павіннасцяў сялян, павышэнне плацежаздольнасці дзяржаўнай вёскі.

На першым этапе правядзення рэформ (да 1844) урад спрабаваў вырашыць праблему шляхам пераразмеркавання зямельнага фонду паміж дзяржаўнымі маёнткамі і перасялення часткі сялян у больш забяспечаныя зямлёй расійскія губерні.

Люстрацыйныя камісіі павінны былі скласці інвентарныя вопісы казённых маёнткаў, вызначыць гаспадарчае становішча сялян, памеры сялянскіх надзелаў і павіннасцяў. Сяляне падзяляліся на чатыры разрады: цяглых, якія мелі не менш дзвюх галоў буйной рагатай жывёлы; паўцяглых, якія мелі адну галаву працоўнай жывёлы; агароднікаў (халупнікаў), якія мелі хату з агародам, але былі пазбаўлены надзелу на полі; бабылёў (кутнікаў) – беззямельных і бяздомных сялян. Закон прадугледжваў, "...каб усе сяляне перайшлі ў разрад цяглых, або, на крайні выпадак, паўцяглых гаспадароў,

змяншаючы па магчымасці колькасць такіх, якія не маюць вясковай гаспадаркі і належаць да класа бабылёў". Рэалізацыя гэтага палажэння патрабавала наяўнасці запаснога зямельнага фонду, а таксама правядзення ўсеагульнага перадзелу зямлі ў казённых маёнтках. Абмежаванасць зямельнага фонду прымусіла ўсталяваць невысокі зямельны надзел на рэвізскую душу ў памеры трох дзесяцін і адной дзесяціны сенакосу. Відавочна, што такога надзелу было недастаткова, каб забяспечыць пражытачны мінімум сялян, але ён быў большы за дарэформенны. У выніку перадзелу колькасць бабылёў і агароднікаў у казённай вёсцы скарацілася.

Люстрацыя рэгламентавала павіннасці дзяржаўных сялян Беларусі. За выключэннем даніны захоўваліся ўсе формы раней існуючых павіннасцяў, але былі дакладна акрэслены іх памеры і нават усталяваны памеры штодзённых урокаў. Рэформа не адмяніла асноўную паншчыну, але ў далейшым прадугледжвалася пераводзе дзяржаўных сялян на аброк, што і пачало ажыццяўляцца ў 1844 г. Люстрацыя істотна абмежавала свавольства часовых гаспадароў і арандатараў, паставіла іх пад кантроль дзяржаўных чыноўнікаў.

З 1844 г. урад мяняе напрамак рэформ: фальваркова-прыгонная сістэма ва ўсіх дзяржаўных маёнтках ліквідуецца. Дзяржаўныя сяляне паскоранымі тэмпамі пераводзяцца на пазямельны аброк. З фальварковых зямель ім былі зроблены прырэзкі да надзелаў. Да канца 1857 г. на аброк былі пераведзены ўсе дзяржаўныя маёнткі Мінскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Віцебскай губерняў. Была знішчана ў іх і сістэма часовага ўладання.

Рэформа кіравання дзяржаўнымі сялянамі суправаджалася важнымі гаспадарчымі і адміністрацыйнымі пераўтварэннямі, садзейнічала паляпшэнню становішча дзяржаўных сялян. У выніку рэформы агульная плошча надзельнага фонду павялічылася на 10,73%. Але гэта мала што змяніла ў забеспячэнні сялян зямлёй, бо за перыяд правядзення рэформы колькасць рэвізскіх душ узрасла на 38,5%.

Тым не менш рэформа дазволіла крыху палепшыць становішча сялян. Некаторыя змяненні адбыліся ў прававым статусе дзяржаўных сялян. За імі прызнаваліся правы атрымання спадчыны, уласнасці, заняткі гандлем і промысламі.

Рэформа Кісялёва насіла буржуазны характар. Перавод на аброк спрыяў паскарэнню маёмаснай дыферэнцыяцыі, працэсу першапачатковага накаплення капіталу, вызваляў і падрыхтоўваў працоўныя рукі для капіталістычнай вытворчасці, стымуляваў рост гарадоў,

з'яўляўся адным з падрыхтоўчых мерапрыемстваў урада па вырашэнню аграрнага пытання ў Расіі.

Вясной 1840 г. П.Д. Кісялёў пачаў падрыхтоўку да інвентарнай рэформы з мэтай падцягнуць узровень памешчыцкай вёскі да дзяржаўнай. У 1844 г. быў створаны Камітэт заходніх губерняў для выпрацоўкі "Правілаў для кіравання маснткамі па зацверджапых для гэтага інвентарах". Былі складзены інвентары-апісанні памешчыцкіх маёнткаў з дакладнай фіксацыяй сялянскіх надзелаў і агульнай для ўсіх маёнткаў колькасці паншчынных дзён.

Увядзенне ў дзеянне перагледжаных і зноў складзеных інвентароў пачалося ў Беларусі з 1845 г. Для цяглавай сялянскай гаспадаркі, у залежнасці ад колькасці і якасці зямлі, у маёнтках устанаўліваліся надзелы памерам ад 4 да 9 дзесяцін. Такая гаспадарка павінпа была адпрацаваць на паншчыне 3 дні з канём (мужчынская паншчына) і 1 дзень без каня (жаночая паншчына). Падводная павіннасць заставалася, але павінна была выконвацца не звыш паншчыны, а за кошт паншчынных дзён. Памешчыкам забаранялася сама вольна ўстанаўліваць згонныя дні, а таксама абкладаць сялян "данінай" – натуральнымі паборамі.

Аднак памешчыкі абаранялі сваю ўласнасць, усяляк перашкаджалі перагляду старых і складанню новых інвентароў. Уваходзячы ў склад інвентарных камітэтаў, яны дамагаліся не толькі захавання былых прыгонніцкіх павіннасцяў для многіх маёнткаў, але і ў шэрагу выпадкаў іх павелічэння. Асцерагаючыся абвастрэння адносін з мясцовымі памешчыкамі, урад асабліва не падганяў іх. Да 1857 г. перагледжаныя і зноў складзеныя інвентары былі ўведзены ў дзеянне толькі ў 1/10 частцы памешчыцкіх маёнткаў Беларусі. А ў сувязі з падрыхтоўкай сялянскай рэформы неабходнасць ва ўвядзенні інвентароў зусім адпала.

Рэформы 30-50-х гг. захавалі дваранскую накіраванасць. Прынцыпы рэфармавання дзяржаўнай вёскі былі прызнаны памешчыкамі празмерна радыкальнымі. Сацыяльна-прававое становішча памешчыцкіх сялян змянілася мала. І пасля правядзення рэформ феадальная ўласнасць заставалася пакуль некранутай.

**Урадавая палітыка ў галіне асветы.** Адной з найважнейшых задач расійскі ўрад лічыў рэарганізацыю адукацыі на асновах, якія б поўнасцю адпавядалі яго інтарэсам. Найбольш яскрава гэтыя мэты былі сфармуліраваны ў запісцы беларуо кага генерал-губернатара князя М.Л. Хаванскага імператару Аляксандру І у 1824 годзе: "У Беларусі – пісаў ён – з часоў далучэння яе да Расійскай імперыі, адукацыя юнацтва знаходзіцца ў руках каталіцкага і уніяцкага

духавенства. ...У школах манаскіх ордэнаў юнацтва навучаецца па метадах старажытных аўтараў, навукі выкладаюцца на польскай і лацінскай мовах, славеснасць абмяжоўваецца навучаннем польскай мове, лацінскай і некаторых замежных, а расійская застаецца ў поўным зневажэнні".

Аднак зрабіць замах на пануючую ў Беларусі традыцыйную школу ўрад адразу не адважваўся, бо не жадаў абвастрэння адносін з мясцовым дваранствам. Адукацыйная сістэма Беларусі ў першай чвэрці XIX ст. была пабудавана ў адпаведнасці з рэформай адукацыі 1802 г. Уся тэрыторыя Беларусі ўвайшла ў склад Віленскай навучальнай акругі (1803-1824). якую ўзначальваў князь А. Чартарыйскі. Навучальная акруга мела поўную самастойнасць і кіравалася "Статутам, ці Агульнымі пастановамі Віленскага універсітэта і вучылішчаў яго акругі" (1803) і "Прадпісаннем арганізацыі вучылішчаў у акрузе імп. Віленскага універсітэта" (1804). Карыстаючыся неабмежаваным даверам Аляксандра 1 і міністраў народнай адукацыі П.В. Завадоўскага і А. Г. Разумоўскага, апякун акругі мог смела праводзіць ідэі аднаўлення самастойнасці Польшчы, якія, па яго прызнанню, "былі альфай і амегай ўсяго майго існавання".

У аснову адукацыйнай сістэмы Беларусі, як і Расіі, былі пакладзены прынцыпы бессаслоўнасці, бясплатнасці навучання на ніжэйшых яго ступенях, пераемнасці навучальных праграм. Згодна з рэформай стваралася некалькі тыпаў навучальных устаноў. Пачатковая школа была прадстаўлена аднакласнымі прыходскімі вучылішчамі для ніжэйшых саслоўяў. Сярэднюю адукацыю давалі павятовыя вучылішчы і гімназіі. У першыя дзесяцігоддзі XIX ст. у Беларусі дзейнічала сетка вучылішчаў пры каталіцкіх і базыліянскіх манастырах. Яны давалі сярэднюю адукацыю і прыраўноўваліся да павятовых вучылішчаў і гімназій. Аднак іх колькасць на працягу першай трэці XIX ст. паступова скарачалася, а ў 1832 г. у сувязі з закрыццём каталіцкіх манастыроў яны былі пераўтвораны ў свецкія.

Вышэйшай адукацыйнай установай быў Віленскі універсітэт, які налічваў 4 факультэты: маральных і палітычных навук; фізіка-матэматычны; медыцынскі; літаратуры і вольных мастацтваў, а таксама настаўніцкую і духоўную семінарыі. Меліся бібліятэка, батанічны сад, астранамічная абсерваторыя, анатамічны музей, лабараторыі. Першымі рэктарамі універсітэта былі браты І. і Я. Снядэцкія. У функцыі універсітэта ўваходзіла таксама арганізацыя навучальнага працэсу ў навучальнай акрузе наогул. Універсітэт павінен быў распрацоўваць навучальныя праграмы, выпускаць

падручнікі, прызначаць настаўнікаў у гімназіі і вучылішчы. З 1805 г. універсітэт выдаваў штомесячны навукова-літаратурны часопіс "Dziennik Wileński" і быў своеасаблівым цэнтрам культурнага жыцця краю, вакол якога гуртавалася мясцовая інтэлігенцыя.

Гімназіі Віленскай навучальнай акругі мелі 6 класаў, павятовыя вучылішчы – 3. Адначасова са свецкімі павятовымі вучылішчамі ў Беларусі існавалі 6-класныя манастырскія павятовыя вучылішчы з гімназічным курсам, выпускнікі якіх мелі права паступаць ва універсітэт. У 1824 г. у Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай, Мінскай і беларускіх паветах Віленскай губерняў налічвалася 32 сярэднія школы і каля 130 пачатковых школ. Выкладанне ў навучальных установах вялося на польскай мове, руская мова выкладалася як адна з вучэбных дысцыплін.

Раскрыццё ў 1823 г. тайных таварыстваў у навучальных установах Віленскай акругі падштурхнула расійскія ўлады распачаць працэс дэпаланізацыі асветніцкай сістэмы Беларусі. Дзеля гэтага праводзіўся перагляд праграм і падручнікаў, забаранялася існаванне любых таварыстваў. Па плану новага папячыцеля акругі М. Навасільцава пачалася ліквідацыя павятовых вучылішчаў з гімназічным курсам навук. Толькі два з іх – у Гродне і Жыровічах атрымалі статус гімназій. А астатнія 8 былі пераўтвораны ў звычайныя павятовыя вучылішчы, выпускнікі якіх не мелі права паступаць ва універсітэт.

Інакш разгортваліся падзеі ў Віцебскай і Магілёўскай губернях, навучальныя ўстановы якіх з 1824 г. падпарадкоўваліся Пецярбургскай навучальнай акрузе. Але аб'яднання мясцовай сістэмы асветы з расійскай не адбылося.

Важным элементам школьнай справы на беларускіх землях была дзейнасць езуіцкіх навучальных устаноў і асабліва Полацкай акадэміі, якая адкрылася ў 1812 г. Яна мела факультэты моў, вольных навук (філасофія, прыродазнаўчыя і грамадзянскія), тэалогіі. Да самага свайго закрыцця ў 1820 г. акадэмія была фактычна цэнтрам вышэйшай каталіцкай адукацыі ўсёй Расіі. Сярэдняя каталіцкая адукацыя Беларусі першай чвэрці XIX ст. была прадстаўлена Галоўнай духоўнай семінарыяй пры Віленскім універсітэце і Полацкай уніяцкай семінарыяй.

Праваслаўная духоўная адукацыя Беларусі знаходзілася ў стадыі фарміравання. Яе духоўным цэнтрам па-ранейшаму заставалася Магілёўская семінарыя, якая многа зрабіла для стварэння пачатковых духоўных школ (Гомель, Невель).

Пасля ўступлення на прастол імператара Мікалая І, які вядомы сваім антыпольскім настроем, началіся змяненні ў сістэме асветы. У аснову народнай асветы быў пакладзены прынцып строгай саслоўнасці. Каб ажыццявіць гэты прынцып, быў выдадзены ў 1828 г. "Статут навучальных установ". Згодна з ім пачатковая і сярэдняя адукацыя падзялялася на тры катэгорыі: для дзяцей ніжэйшага саслоўя (сялян) прызначаліся аднакласныя прыходскія вучылішчы з элементарнай праграмай навучання; для "сярэдняга" саслоўя – трохкласныя вучылішчы з больш шырокай праграмай пачатковага навучання; для дзяцей дваран і чыноўнікаў уводзіліся сямікласныя гімназіі, заканчэнне якіх давала права для паступлення ва універсітэты. Статут ліквідаваў пераемную сувязь паміж ступенямі. Узровень адукацыі павінен быў адпавядаць сацыяльнаму становішчу вучня, каб "ніхто не намагаўся ўзвысіцца палажэннем, у якім яму наканавана застацца". Па новаму палажэнню аб навучальных акругах (1835) апошнія выключаліся з-пад улады універсітэтаў, істотна пашыраліся правы папячыцеляў навучальных акругоў.

У адпаведнасці з палажэннем "Статута" 1828 г. была створана Беларуская навучальная акруга (1829). Дадатковыя палажэнні Статута 1828 г. тлумачылі мэту стварэння акругі – "неабходнасць навучання юнакоў у адпаведнасці з асаблівасцямі Беларусі", дзе і прадпісвалася "навучаць роднай мове". У новую вучэбную акругу ўвайшлі Віцебская, Магілёўская, а ў 1831 г. – Мінская губерні.

Падзеі 1830-1831 гг. прымусілі ўрад актывізаваць сваю палітыку на Беларусі. У студзенІ 1830 г. Магілёўскі губернатар граф М.М. Мураўёў звярнуўся да Мікалая І з запіскай аб неадкладнай і поўнай ліквідацыі польскага і каталіцкага ўплыву на працу школ на Беларусі. У красавіку 1831 г. з'явіўся "найвышэйшы указ". у якім адзначалася. што "спосаб сучаснага выхавання юнацтва на Беларусі і іншых губернях, вернутых ад Польшчы, патрабуе неадкладнага пераўтварэння і ўдасканалення". У сувязі з гэтым Міністэрству народнай асветы і папячыцелю акругі рэкамендавалася прыкласці ўсе магчымыя намаганні да хутчэйшага выпраўлення вучылішчаў пры рымска-каталіцкіх манастырах і аб выкладанні на рускай мове ў свецкіх вучылішчах. Каб зблізіць мясцовых жыхароў з "прыроднымі рускімі", у маі 1832 г. у сувязі з закрыццём Віленскага універсітэта была ліквідавана Віленская навучальная акруга. Навучальныя ўстановы Віленскай, Гродзенскай губерняў і Беластоцкай вобласці ўвайшлі ў склад Беларускай навучальнай акругі. Цэнтр навучальнай акругі знаходзіўся ў г. Віцебску, яго папячыцелямі былі вядомы матэматык Р. І. Карташэўскі (1829-1835) і былы дырэктар вучылішчаў

Закаўказскай вобласці і Тыфліскага шляхецкага пансіёна Е.А. Грубер (1836-1850).

Замест закрытага Віленскага універсітэта меркавалася адкрыць у Оршы вышэйшае вучылішча для дваранскіх дзяцей, каб потымператварыць яго ў вышэйшую навучальную ўстанову. Аднак асігнаваныя на гэта сродкі былі пераведзены ў Кіеў на будаўніцтва універсітэта св. Уладзіміра.

Сістэма асветы ў першай палове XIX ст. не абмяжоўвалася толькі мужчынскай і духоўнай адукацыяй. Разам з ёй у краі дзейнічалі жаночыя манаскія і прыватныя пансіёны.

Выкладанне ва ўсіх тыпах навучальных устаноў Беларускай навучальнай акругі было пераведзена на рускую мову. Польская мова была выключана з адукацыйных праграм. Толькі ў заходніх губернях акругі яна вывучалася як асобны прадмет па скарочанай праграме. Выпускнікам Віленскага універсітэта забаранялася выкладаць у мясцовых школах. Падрыхтоўку выкладчыкаў для Беларусі пачынае весці настаўніцкая семінарыя, створаная ў 1834 г. у Віцебску.

Важнай падзеяй у галіне асветы было адкрыццё ў 1840 г. у Горы-Горках земляробчай школы, а ў 1848 г. яна была пераўтворана ў земляробчы інстытут, які садзейнічаў распаўсюджванню перадавога вопыту гаспадарання. Усяго на пачатку 60-х гг. у Беларусі налічвалася 567 навучальных устаноў усіх тыпаў, у тым ліку адно вышэйшае, 12 сярэдніх, 21 духоўнае вучылішча, звыш 400 пачатковых школ.

Адметнай рысай мясцовай сістэмы асветы стала пашырэнне ваенна-вучэбных устаноў. Калі ў эпоху Аляксандра I яны былі прадстаўлены юнкерскімі вучылішчамі ў Бабруйску, Дзінабургу і Магілёве, то пры Мікалаю I былі адкрыты кадэцкія корпусы ў Полацку (1835) і Брэсце (1842). Яны разглядаліся ўрадам як сродак выхавання дваранства ў духу вернасці самадзяржаўю і таму напалову камплектаваліся з дваранства беларускіх губерняў.

**Заканадаўства. Ідэі і рэаліі.** Палітыка ў галіне заканадаўства была непарыўна звязана з агульным зместам палітычнага курсу расійскага ўрада.

Адносіны самаўладства да пануючага саслоўя былі лаяльнымі, але ў шляхецкай свядомасці жыла ідэя былой незалежнасці Вялікага княства Літоўскага, якая яскрава адлюстроўвалася ў так званым ліцвінскім патрыятызме. Расійскі ўрад дакладна рэагаваў на гэту асаблівасць менталітэту мясцовага дваранства і па-рознаму падыходзіў да вырашэння амаль усіх найбольш істотных праблем былога Вялікага княства і Польшчы. Напярэдадні вайны з Францыяй

імператару Аляксандру I неабходна было забяспечыць падтрымку з боку дваранства Літвы і Беларусі. Таму імператар знізіў падаткі, якія паступалі ў казну з былога Вялікага княства Літоўскага, і выказаў жаданне аднавіць яго цэласнасць пад эгідай Расіі. Па даручэпню імператара ў 1811 г. магнаты М. Агінскі, К. Любецкі, К. Плятэр, К. Любамірскі, С. Грабоўскі склалі праект палажэння "Аб кіраванні аўтаномным Вялікім Княствам Літоўскім", у склад якога павінны былі ўвайсці ўсе тэрыторыі, што адышлі да Расіі ад былой Рэчы Паспалітай. Першым крокам на шляху да аўтаноміі павінна было быць абвяшчэнне маніфеста Вялікага княства Літоўскага. Прадугледжвалася таксама паступова, на працягу 10 гадоў, асабістае вызваленне сялян ад прыгоннай залежнасці. Відаць, у гэтай сувязі трэба разглядаць публікацыі польскай і рускай мовах у 1811 г. "Статута Вялікага Княства Літоўскага" з польскага выдання 1786 г.

Акрамя ідэі аўтаноміі Вялікага княства Літоўскага ў Аляксандра I быў яшчэ другі план, прапанаваны князем А. Чартарыйскім. Мелася на ўвазе аднавіць усё Каралеўства Польскае ў межах 1772 г., не звяртаючы ўвагі на княства. Гэты план падтрымліваўся большасцю польскай і апалячанай шляхты Літвы і Беларусі. Аднак дыялог з дваранствам не атрымаўся. Ажыццяўленне праектаў зацягвалася, а вайна з Напалеонам карэнным чынам змяніла становішча Беларусі. Тым не менш, праца над новым выданнем Статута працягвалася. У выданні 1811 г. былі зроблены памылкі. Пераклад быў выкананы з польскага тэксту, а не з арыгінала. 17 лістапада 1828 г. Камітэт міністраў прыняў рашэнне стварыць камісію для перакладу і выдання Статута 1588 г. на рускай і старажытнабеларускай мовах, а таксама яго польскага перакладу 1614 г. выдання. Аднак паўстанне 1830-1831 гг. поўнасцю скасавала ідэю аўтаноміі. Урадам імператара Мікалая I была распрацавана праграма зліцця далучаных зямель з імперыяй. Яна цалкам супадала з новым курсам самадзяржаўя на уніфікацыю агульнарасійскага заканадаўства, якое знайшло адлюстраванне ў кадыфікацыі законаў Расійскай імперыі.

Важным мерапрыемствам у гэтым напрамку было ўвядзенне ўказам ад 1 студзеня 1831 г. расійскага заканадаўства ў Магілёўскай і Віцебскай губернях, а таксама адмена 25 чэрвеня 1840 г. дзейнасці Статута Вялікага княства Літоўскага на тэрыторыях Мінскай, Віленскай, Гродзенскай губерняў і Беластоцкай вобласці. У 1840-1842 гг. урадам былі праведзены некаторыя мерапрыемствы па ўпарадкаванню мясцовага справаводства. Яго вынікам стаў указ 18 ліпеня 1840 г., які прадпісваў замест агульнага наймення беларускіх і літоўскіх губерняў выкарыстоўваць іх асобныя назвы: Віцебская,

Магілёўская, Віленская і Гродзенская. Мінская губерня афіцыйна не адносілася ні да беларускіх, ні да літоўскіх. Урад Мікалая І паступова замяняў назвы "Украіна" і "Літва" на Паўднёва-Заходні і Паўночна-Заходні край. Назва "Белоруссия" і "белорусский" край, як і "Маларасія", "маларасійскі" і "Вялікарасія", "вялікароскі" афіцыйна не выключаліся з дзяржаўнага і афіцыйнага ўжытку, паколькі мелі агульны корань "рос", што сведчыла, з пункту гледжання ўрада, аб адзінстве паходжання "трох плямён русскага народа".

**Канфесіянальная палітыка.** Асноўным зместам канфесіянальнай палітыкі на тэрыторыі Беларусі было аднаўленне страчаных пазіцый праваслаўя. Аднак формы і метады дасягнення галоўнай мэты ў часы праўлення Аляксандра І і Мікалая І былі неаднолькавымі. Нягледзячы на сваё пануючае становішча, у эпоху імператара Аляксандра І праваслаўная царква знаходзілася ў цяжкім матэрыяльным і маральным стане. Веруючымі ў асноўным былі прыгонныя сяляне, бедная шляхта і мяшчапе. Дваранства, пераважна каталіцкае, мала клапацілася нра ўладкаванне праваслаўных прыходаў. Больш таго, пачасціліся выпадкі пераводу праваслаўных у каталіцызм, уз’яднанне уніятаў з праваслаўем спынілася. Шырокай свабодай карысталася каталіцтва і нават пратэстантызм. З дазволу імператара па ўсёй Беларусі зацвярджаліся езуіцкія місіі. Полацкі езуіцкі калегіум загадам ад 12 студзеня 1812 г. быў узведзены ў ранг акадэміі з правамі універсітэта. Толькі пасля вайны 1812 г., у ходзе якой выявілася супрацоўніцтва каталіцкага духавенства з напалеонаўскай адміністрацыяй, езуіты былі выдвараны з Расіі, а іх маёмасць канфіскавана. Была зачынена і Полацкая акадэмія.

Актывізацыя каталіцызму адбілася на становішчы уніяцкай царквы Беларусі. Раз’язджаючы па уніяцкіх прыходах, каталіцкія ксяндзы абвяшчалі, што быццам бы ёсць прадпісанне расійскага ўрада неадкладна далучыць уніятаў да каталікаў. Здараліся выпадкі гвалтоўнага захопу каталікамі уніяцкіх храмаў. Значную шкоду аўтарытэту уніяцкай царквы нанеслі базыляне, прыхільнікі далейшай лацінізацыі царкоўнай уніі. Польская гісторыя, мова і літаратура былі асноўнымі прадметамі базыліянскіх школ. Іерархі уніяцкай царквы пастаянна скардзіліся ў Санкт-Пецярбург, у выніку гэтага ў 1805 г. каталіцкая калегія была падзелена на два дэпартаменты, каталіцкі і уніяцкі, а ў 1830 г. было забаронена схіляць уніятаў да каталіцтва. Аднак барацьба ўнутры самой уніяцкай царквы паміж базыліянамі і белым духавенствам, прыхільнікамі яе "чысціні", не спынялася. У 1822 г. міністр духоўных спраў і народнай асветы князь А. Галіцын прапанаваў уніяцкаму дэпартаменту закрыць базыліянскія манас-

тыры, якія знаходзіліся ў населеных пунктах з праваслаўным насельніцтвам. У выніку ў Беларускай базыліянскай правінцыі засталося 18 манастыроў, у Літоўскай – 12. Уніяцкаму духавенству было перададзена каля 600 душ сялян і больш за 14 тыс. дзесяцін зямлі.

Каб узняць прэстыж праваслаўнай царквы і павысіць адукацыйны ўзровень духавенства, у канцы 20 - пачатку 30-х гг. была праведзена царкоўная рэформа, якая карэнным чынам змяніла становішча праваслаўнай царквы ў Расійскай імперыі. Мяняецца адначасова становішча праваслаўнай царквы і ў Беларусі. Яшчэ ў 1826 г. распараджэннем імператара каталікам забаранялася будаваць капліцы ў мясцовасцях, дзе большасць складала праваслаўнае насельніцтва. У 1827-1830 гг. былі праведзены мерапрыемствы, скіраваныя на рэфармаванне уніяцкай царквы і збліжэнне яе з праваслаўем. Была створана асобная грэка-уніяцкая калегія, чатыры уніяцкія епархіі рэарганізаваны ў Бсларускую і Літоўскую. У базіліянскія манастыры загадвалі прымаць толькі адных уніятаў, у набажэнствах выкарыстоўваць "мясцовы дыялект". Прадугледжвалася таксама ліквідаваць залежнасць уніяцкага духавенства ад памешчыкаў-католікаў. У аснову уніяцкага веравызнання была пакладзена праваслаўная сістэма навучання. У Вілснскую каталіцкую семінарыю забаранялася прымаць уніятаў. Для іх была створана асобная семінарыя ў Жыровічах (1828). Адначасова адбывалася ачышчэнне уніяцкай царквы ад лацінскіх абрадаў.

Польскае паўстанне 1830-1831 гг. вызначыла лёс уніяцкай Царквы. Для ўзмацнення пазіцый праваслаўя на Беларусі ў 1833 г. была створана Полацкая епархія. Дзейнасць іерархаў Уніяцкай царквы, прыхільнікаў аб'яднання з праваслаўем, прымае больш мэтанакіраваны і актыўны характар. Аднак паспешнасць у працэсе аб'яднання цэркваў, якая зачастую суправаджалася няўмелымі ўчынкамі мясцовай адміністрацыі, не толькі абурала уніяцкіх святароў, але і выклікала сялянскія хваляванні. Рост незадаволенасці сярод сялянства прывёў да змянення тактыкі ў справе аб'яднання цэркваў. "Найвышэйшы наказ" ад 13 студзеня 1834 г. прадпісваў праваслаўным епіскапам дзейнічаць "асцярожна і няспешна", а уніяцкім – "асцярожна і паступова" ачышчаць уніяцкую царкву ад лацінства.

У маі 1835 г. быў заснаваны Сакрэтны камітэт па справах уніяцкай царквы, у рамках якога была сканцэнтравана ўся дзейнасць па аб'яднанню дзвюх канфесій. У студзені 1837 і. кіраванне уніяцкай царквой перайшло да Свяцейшага Сінода. Пасля смерці уніяцкага мітрапаліта Іасафата Булгака (1838) – праціўніка аб'яднання,

старшынёй грэка-уніяцкай калегіі быў прызначаны епіскап Літоўскі Іосіф Сямашка, а Беларускую епархію ўзначаліў епіскап Васіль Лужынскі. Найбольш спакойна справа царкоўнага аб'яднання праходзіла ў Літоўскай епархіі. З 1057 служыцеляў уніяцкай царквы за аб'яднанне выказаліся 760. У Полацкай епархіі з 680 царкоўных дзеячаў згоду далі толькі 186. Каб паскорыць уз'яднанне.у канцы 1838 г. у Беларусь прыбыў прадстаўнік обер-пракурора Свяцейшага Сінода надворны саветнік Скрыпіцын. Разам з І. Сямашкам яны дамагліся згоды большасці уніяцкага духавенства на аб’яднанне. 12 лютага ў Полацку епіскапамі і начальніцкім духавенствам быў падпісаны "Саборны акт" аб аб’яднанні цэркваў і напісана прашэнне на вышэйшае імя. 26 лютага І. Сямашка нерадаў прашэнне і "Саборны акт" обер-пракурору Свяцейшага Сінода графу М. Пратасаву, які 1 сакавіка прадставіў іх на вырашэнне імператару. Да прашэння быў прыкладзены спіс 1305 святчэннікаў, якія падтрымалі аб'яднанне. 25 сакавіка "сінадальны ўчынак" зацвердзіў Мікалай І. Уніятам былі пакінуты тыя абрады і звычаі, якія не супярэчылі сутнасці праваслаўя. Усяго ў 1839 г. аб'ядналася каля 1607 прыходаў і больш 1 млн. 600 тыс. чалавек. Аднак у 1839 г. унія была ліквідавана не ўсюды. Уніяты засталіся ў Холмскай епархіі. Аб'яднанне на гэтай тэрыторыі адбылося ў 1875 г.

ЛЕКЦЫЯ 3

## ВАЙНА 1812 г. ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫ РУХ НА БЕЛАРУСІ

• *Вайна 1812 г. і Беларусь*
• *Грамадска-палітычны Рух*

**Вайна 1812 г. і Беларусь.** На пачатку **XIX** ст. на еўрапейскім кантыненце склаліся напружаныя міжнародныя адносіны, якія выліваліся ў ваенныя канфлікты. Галоўнымі суб'ектамі еўрапейскай палітыкі з'яўляліся Англія, Расія і Францыя, бо яны вялі барацьбу за гегемонію на кантыненце. Ініцыятывай валодала буржуазная Францыя. З прыходам да ўлады Напалеона (1799) яна імкнулася ўсталяваць панаванне над усё новымі тэрыторыямі. Такая сітуацыя пагражала непасрэдна інтарэсам Расійскай імперыі.

У 1806 г. была створана чацвёртая антыфранцузская кааліцыя (Англія, Прусія, Расія і Швецыя). Напалеон здолеў нанесці саюзнікам шэраг паражэнняў. 2 (14) чэрвеня 1807 г. пад Фрыдландам (зараз г. Праўдзінск Калінінградскай вобл.) руская армія была разбіта. У такіх умовах расійскі імператар Аляксандр I быў вымушаны пайсці на перамір'е.

13 (25) чэрвеня 1807 г. каля Тыльзіта (зараз г. Савецк Калінінградскай вобл.) адбылася сустрэча двух імператараў і ў выніку распачатых перагавораў 25 чэрвеня (7 ліпеня) былі падпісаны мірны дагавор і саюзны трактат. Расія прызнала ўсе захопы Францыі ў Еўропе, а Напалеона – імператарам. Яна, уступіўшы ў саюз з Францыяй, абавязвалася спыніць усе стасункі з Англіяй і далучыцца да кантынентальнай блакады. Аляксандр I быў вымушаны пагадзіцца на стварэнне Княства (Герцагства) Варшаўскага. Да Расіі далучалася Беласточчына, якая раней уваходзіла ў склад Прусіі. Тыльзіцкі дагавор супярэчыў інтарэсам Расіі, паколькі падрываў яе эканамічную аснову – гандаль з Англіяй, і прымушаў ісці ў фарватары французскай знешняй палітыкі. У цэлым ён быў цяжкім і зневажальным для Расіі, што выклікала незадаволенасць ім у краіне, уключаючы ўрадавыя колы.

Перад вайной 1812 г. заходнія губерні Расійскай імперыі апынуліся ў складаным эканамічным становішчы. Ваенныя дзеянні патрабавалі вялікай колькасці рэкрутаў і сродкаў. На беларускіх землях знаходзіліся буйныя вайсковыя злучэнні, якія часта выкарыстоўвалі рэквізіцыйны спосаб забеспячэння харчамі і фуражом. Прывілеяваныя колы грамадства павінны былі даказваць

сваю дваранскую годнасць. Усё гэта вяло да росту незадаволенасці з боку мясцовай шляхты.

У шляхецкім асяроддзі з сімпатыяй ставіліся да Францыі – традыцыйнага саюзніка былой Рэчы Паспалітай. Францыя дала прытулак многім эмігрантам, частка якіх добраахвотна пайшла ў французскую армію. Значную ролю адыгралі і заявы Напалеона аб магчымасці ўзнаўлення Рэчы Паспалітай. Стварэнне ў 1807 г. Княства Варшаўскага і пашырэнне яго тэрыторыі пасля аўстра-французскай вайны 1809 г., як быццам пацвярджалі сур'ёзнасць намераў французскага імператара.

Сярод шляхецкай моладзі Беларусі ў гэты час праявілася тэндэнцыя да руху ў польскую дзяржаву, дзе многія з іх паступалі на вайсковую службу. Прыклад у гэтым плане прадэманстраваў Дамінік Радзівіл, які пакінуў у Расіі свае вялізныя маёнткі і адным з першых перабраўся ў Княства Варшаўскае. Расійскія ўлады прынялі шэраг захадаў, каб спыніць адток насельніцтва і грашовых сродкаў. У ход былі зноў пушчаны секвестр і канфіскацыя маёмасці, жорсткія судовыя прыгаворы.

Але будзе перабольшваннем сцвярджаць, што ўсё шляхецкае саслоўе арыентавалася на Напалеона і Францыю. Пэўная частка шляхты і магнацтва насцярожана адносілася да рэформ у Княстве Варшаўскім. Асаблівую заклапочанасць выклікала адмена прыгоннага права. Для многіх імя Напалеона было звязана з французскай рэвалюцыяй, якая знішчыла ўсе феадальныя інстытуты.

Частка магнатаў і буйных землеўласнікаў (М.К. Агінскі, А.Е. Чаргарыйскі, Ф.К. Любецкі) звязвалі надзеі на аднаўленне польскай дзяржавы ў складзе Расійскай імперыі пад патранажам Аляксандра І. Такія планы ў 1805-1811 гг. неднаразова прапаноўваў расійскаму імператару Адам Чартарыйскі, але яны засталіся нерэалізаванымі.

Каб паслабіць французскі ўплыў сярод жыхароў заходніх губерняў імперыі і схіліць іх сімпатыі на бок Расіі, Аляксандр І пайшоў на часовую лібералізацыю палітыкі. Такім чынам, ён спрабаваў умацаваць сваё становішча на беларуска-літоўскіх землях. У сувязі з гэтым царызм усур'ёз разглядаў план стварэння аўтаномнага Вялікага княства Літоўскага, вядомы ў гісторыі пад назвай плана Агінскага.

Міхал Клеафас Агінскі (1765-1833), якому належыць сусветна вядомы паланез "Развітанне з Радзімай", паходзіў з буйнога магнацкага роду Вялікага княства Літоўскага. За яго плячыма былі і дыпламатычная праца, і змаганне за рэформы ў Рэчы Паспалітай, і ўзброеная барацьба супраць Расіі ў час падзелаў краіны. Пасля паражэння паўстання 1794 г. ён жыў у эміграцыі, а ў 1802 г.

вярнуўся на радзіму і пасяліўся ў маёнтку Залессе каля Смаргоні. Але М.К. Агінскі не застаўся ў баку ад палітычных спраў. Ідэя аднаўлення дзяржавы не пакідала яго. Ён часта вандраваў па краінах Еўропы, сустракаўся з вядомымі палітыкамі і дыпламатамі. У выніку некалькіх гутарак з Напалеонам Агінскі прыйшоў да высновы, што французскі імператар не надта зацікаўлены ў аднаўленні Рэчы Паспалітай. Таму свае спадзяванні на вырашэнне гэтага пытання ён звязваў з расійскім імператарам Аляксандрам І. Апошні таксама меў сімпатыі да М.К. Агінскага. У 1810 г. Аляксандр І прызначыў Агінскага сенатарам і надаў яму чын тайнага саветніка. З гэтага часу імператар неаднойчы абмяркоўваў з Агінскім розныя палітычныя пытанні.

Ідэя ўтварэння з заходніх губерняў асобнай правінцыі была выказана Агінскім у красавіку 1811 г. На працягу года групай магнатаў (М.К. Агінскі, Ф.К. Любецкі, Л. Плятэр, Т. Ваўжэцкі і інш.) былі распрацаваны асноўныя палажэнні плана.

У адпаведнасці з планам меркавалася стварэнне з Валынскай, Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Кіеўскай, Магілёўскай, Мінскай, Падольскай губерняў, Беластоцкай вобласці і Тарнопальскай акругі асобнай правінцыі пад назвай Вялікае княства Літоўскае (ВКЛ) з цэнтрам у Вільні і на чале з намеснікам расійскага імператара. Прадугледжвалася стварэнне асобных органаў кіравання (Літоўскай канцылярыі ў Пецярбургу, Адміністрацыйнай рады і Вярхоўнага трыбунала ў Вільні). Заканадаўчым кодэксам павінен быў стаць Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 г., а польская мова – мовай справаводства. Усе дзяржаўныя пасады ў ВКЛ планавалаа замяшчаць толькі яго ўраджэнцамі. Акрамя таго, прапаноўвалася вылучыць асігнаванні на адукацыю ў ВКЛ на спецыяльны рахунак дзяржаўнага бюджэту. У праекце канстытуцыі ВКЛ (студзень 1812 г.) меркавалася стварыць двухпалатны сейм, і паступова, на працягу 10 гадоў, ліквідаваць прыгонную залежнасць сялян. Адначасова па даручэнню імператара праводзілася работа над планам арганізацыі асобнага літоўскага войска ў складзе ўзброеных сіл Расіі.

План застаўся нерэалізаваным, паколькі яго выпрацоўка і абмеркаванне выклікалі моцнае незадавальненне ў расійскім грамадстве. У плане Агінскага бачылася спроба расчлянення і паслаблення краіны перад пагрозай вайны з Францыяй. Але разам з тым план Агінскага адыграў пэўную ролю ў фарміраванні ўрадавай палітыкі ў заходніх губернях. Урад прыняў шэраг мер да прымірэння з мясцовай шляхтай і дабіўся падпісання пагаднення з буйнымі памешчыкамі аб пастаўцы харчавання і фуражу для арміі.

Тым часам Францыя і Расія вялі падрыхтоўку да вайны. На працягу 1810-1812 гг. Аляксандр I некалькі разоў планаваў правядзенне наступальнай аперацыі. Яна прадугледжвала акупацыю Княства Варшаўскага і далучэнне яго да Расіі. Але гэтыя спробы пацярпелі няўдачу (адмова ад супрацоўніцтва Ю. Панятоўскага; здрада Прусіі), і таму расійскі імператар спыніўся на абарончым варыянце вядзення вайны.

Пачынаючы з сакавіка 1810 г., на тэрыторыі Беларусі разгарнуліся шматлікія рэкагнасцыроўкі і працы па картаграфаванню і ваенна-інжынернаму вывучэнню мясцовасці. У першую чаргу вывучаліся раёны ўздоўж Заходняй Дзвіны, Дняпра і Бярэзіны, дзе планавалася стварыць асноўную лінію абароны. У гэты самы час пачалося будаўніцтва крэпасцей у Дынабургу (цяпер Даўгаўпілс) і Бабруйску, умацаванняў у Барысаве, Рагачове і інш.

У межах Літвы, Беларусі і паўночнай Украіны былі сканцэнтраваны гры рускія арміі: 1-я Заходняя генерала М.Б. Барклая дэ Толі (каля 120 тыс. чалавек, 580 гармат, штаб у Вільні); 2-я Заходняя генерала П.І. Баграціёна (каля 49,5 тыс. чалавек, 180 гармат, штаб у Ваўкавыску); 3-я Заходняя генерала А.П. Тармасава (каля 44 тыс. чалавек, 168 гармат, штаб у Луцку); і рэзервовы корпус генерала Ф.Ф. Эртэля (37,5 тыс. чалавек) каля Мазыра. Усяго Расія ў пачатку вайны здолела супрацьпаставіць войску Напалеона толькі 317 тыс. чалавек.

10 (22) чэрвеня Францыя аб'явіла Расіі вайну і 12 (24) чэрвеня галоўныя сілы "Вялікай арміі" пачалі пераправу цераз Нёман у раёне Коўна. На працягу тыдня ў межы Расійскай імперыі ўступіла 448 тыс. чалавек (з 647 тыс.) пры 1372 гарматах. Астатнія войскі ўступілі на тэрыторыю Беларусі летам і восенню 1812 г. у якасці падмацаванняў.

1-я і 2-я Заходнія рускія арміі пачалі адыход з мэтай злучэння, ушчыльную за імі рухаліся напалеонаўскія войскі. Беларусь стала арэнай жорсткіх ваенных дзеянняў. Да пачатку жніўня пераважная частка Беларусі была занята французскімі войскамі, акрамя поўдня (Мінская губерня), поўначы (Віцебская губерня) і Бабруйскай цытадэлі, абаронцы якой вытрымалі ўсе прыступы праціўніка.

Насельніцтва Беларусі да напалеонаўскай арміі аднеслася неадназначна. Гараджане з надзвычайнай помпай наладжвалі ўрачыстыя сустрэчы. Дэпутацыі віталі войскі яшчэ за гарадской заставай, падносілі хлеб-соль. Пры ўваходзе ў горад французаў сустракала большасць насельніцтва, якое ў "вялікай арміі" бачыла вызваліцеляў.

У той самы час у мясцовасцях, дзе адбываліся непасрэдныя баявыя дзеянні, беларускае насельніцтва імкнулася схавацца, кідала свае дамы, уцякала ў лес. Расійскія чыноўнікі адыходзілі разам з арміямі, а памешчыкі самастойна эвакуіраваліся ў глыб краіны.

Для кіравання беларуска-літоўскімі губернямі 19 чэрвеня (1 ліпеня) Напалеон утварыў у Вільні Камісію Часовага ўрада Вялікага княства Літоўскага. Яе паўнамоцтвы распаўсюджваліся на Віленскую, Гродзенскую, Мінскую губерні і Беластоцкую вобласць. У склад Камісіі ўвайшлі мясцовыя землеўласнікі, палітычныя дзеячы і вучоныя: С. Солтан (старшыня), К. Прозар, Ю. Серакоўскі, А. Сапега, Ф. Ельскі, А. Патоцкі і Я. Снядэцкі. Генеральным сакратаром быў прызначаны Ю. Касакоўскі.

У кампетэнцыю Камісіі ўваходзіла спагнанне падаткаў і размеркаванне бюджэтных сум, арганізацыя ўзброеных сіл і адміністрацыі на месцах, фарміраванне жандармерыі, стварэнне сістэмы адукацыі і судовых устаноў. На французскі манер былі рэарганізаваны адміністрацыйныя адзінкі (дэпартаменты, дыстрыкты, кантоны, камуны) і органы мясцовага кіравання (адміністрацыйныя камісіі, падпрэфектуры). У гарадах, якія раней карысталіся магдэбургскім правам, ствараліся муніцыпалітэты.

На тэрыторыі Літвы і Беларусі паралельна дзейнічалі мясцовая і французская адміністрацыі. Кантрольныя функцыі і палітычнае кіраўніцтва належалі напалеонаўскаму камісару Л.П.Э. Біньёну. Ваенная ўлада знаходзілася ў руках генерал-губернатара Літвы Дз. ван Гагендорпа (са жніўня адначасова старшыня ўрада), якому падпарадкоўваліся ваенныя губернатары і каменданты. Агульны нагляд за дзейнасцю Камісіі меў міністр замежных спраў Францыі Г.-Б. Марэ.

Адпаведным чынам былі арганізаваны Віцебская, Магілёўская, Смаленская і Курляндская губерні, але яны не падпарадкоўваліся віленскаму ўраду.

Перад створанымі ваеннай і грамадзянскай адміністрацыямі была пастаўлена задача харчовага і фуражнага забеспячэння напалеонаўскага войска. Выканаць аб'ёмы паставак было немагчыма, а невыкананне вяло да рэквізіцый, канфіскацый і розных санкцый. Становішча ўскладнялася тым, што Напалеон не разлічваў на доўгатэрміновыя ваенныя дзеянні, а таму не зрабіў спецыяльных запасаў. Забеспячэнне арміі ён перакладаў на плечы мясцовага насельніцтва. Тым не менш, да лістапада 1812 г., агульнымі намаганнямі ваеннай і грамадзянскай адміністрацыі, у Вільні і Мінску

быў сабраны вялікі запас харчавання і фуражу (дастаўся наступаючым рускім войскам).

Вельмі важнай праблемай з'яўлялася фарміраванне ўзброеных сіл. Для абароны краю і папаўнення напалеонаўскай арміі ствараліся нацыянальная гвардыя (міліцыя), пяхотныя і кавалерыйскія палкі, жандармерыя, егерскія батальёны. Усяго ў войскі (кавалерыя і пяхота) планавалася набраць 14 тыс. рэкрутаў і 1 тыс. добраахвотнікаў з ліку шляхцічаў для палка імператарскай гвардыі. Справа ў гэтым накірунку ішла марудна. Сяляне не выказвалі асаблівага жадання ісці ў войска. Большую актыўнасць праявіла шляхта. Аднак і сярод яе добраахвотнікаў аказалася значна менш, чым чакалі. Адна частка шляхты прытрымлівалася пазіцыі чакання, другая – лічыла, што дастаткова будзе матэрыяльных ахвяраванняў. Нягледзячы на гэта, да зімы 1812 г. войска ВКЛ налічвала каля 20 тыс. чалавек. На ўласныя сродкі магнатаў былі сфарміраваны конна-егерскі полк І. Манюшкі, уланскія палкі Л. Паца і Д. Радзівіла, конна-артылерыйская рота Р. Тызенгаўза і інш.

З вонкавага боку адносіны паміж напалеонаўскімі ўладамі і мясцовым прывілеяваным насельніцтвам былі даволі лагоднымі, але ў сапраўднасці адбывалася паступовае ахалоджванне. У напалеонаўскім войску хутка пагаршалася дысцыпліна, вынікам чаго стала марадзёрства. Напалеон і яго адміністрацыя разумелі небяспечнасць гэтай з'явы, спрабавалі спыніць ці абмежаваць яе маштабы. У ліпені па загадах маршала Л.-Н. Даву былі расстраляны 13 кірасір у Мінску (за рабаванне яўрэйскай лаўкі) і двое салдат у Магілёве (за пабоі жыхароў). Для барацьбы з марадзёрамі і дэзерцірамі былі створаны спецыяльныя рухомыя вайсковыя каманды. Аднак кардынальнага паляпшэння дысцыпліны ў арміі не назіралася: самавольныя рабункі, несанкцыяніраваныя рэквізіцыі і экзекуцыі працягваліся.

Відавочна, што ў найбольш складанай сітуацыі апынулася беларускае сялянства. Становішча сялянства ніколі не было лёгкім, а з пачаткам ваенных дзеянняў яно яшчэ больш пагоршылася. У зоне непасрэдных баявых дзеянняў вяскоўцы шукалі паратунку ў лесе. Пасля заканчэння баёў многія з іх не спяшаліся вярнуцца дамоў. Гэта выклікала заклапочанасць памешчыкаў і адміністрацыі. Спробы прымусовага вяртання часам выклікалі жорсткае процідзеянне з боку сялян.

Ва ўмовах вайны адміністрацыя ўжо не мела магчымасці эфектыўна выкарыстоўваць рэпрэсіўны механізм. Гэта адчулі і сяляне, якія адмаўляліся выконваць феадальныя павіннасці, уцякалі ў лес. У ліпені 1812 г. прыгонныя пана Ф. Янкоўскага з вёскі Кузявічы

Барысаўскага павета "паднялі бунт і не з'явіліся на звычайпую павіннасць у маёнтак і аб гэтым не хочуць і слухаць". Каб прымусіць сялян выконваць свае абавязкі, мясцовыя намешчыкі звярталіся за дапамогай да новай улады. Але і гэта не заўжды прыносіла поспех. Нярэдка сяляне аказвалі ўзброенае супраціўленне сваім прыгнятальнікам. Вяскоўцы стваралі невялікія атрады, рабілі напады на хлебныя лаўкі, свірны і каморы навакольных памешчыкаў, а часам рабавалі і спальвалі двары і фальваркі. Для навядзення парадку французскія ўлады былі вымушанм пасылаць супраць сялян вайсковыя атрады.

З прыходам французскай арміі сяляне пэўны час займалі палітыку чакання, тым больш што сярод іх распаўсюдзіліся чуткі аб намеры Напалеона скасаваць прыгоннае права. Рэаліі вайны штурхалі сялян на супраціўленне. Яны аб'ядноўваліся і пачыналі даваць адпор малалікім групам марадзёраў, нападалі на салдат, якія адсталі ад войска ці заблудзілі, на каманды фуражыраў.

Напалеон мог перацягнуць сялян на свой бок, адмяніўшы прыгоннае права, але ён гэта не зрабіў. Сам Напалеон 20 снежня 1812 г. на пасяджэнні Сената Францыі тлумачыў- "Я мог бы ўзняць супраць яе (Расіі. - *Заўвага* аўт.) большую частку яе ўласнага насельніцтва, абвясціўшы вызваленне рабоў... Але, калі я даведаўся пра грубасць нораваў гэтага шматлікага рускага народа, я адмовіўся ад такой меры, якая асудзіла б мноства сямействаў на смерць, рабаванне і страшэнныя пакуты". Верагодна, Напалеон не столькі клапаціўся аб рускім дваранстве, колькі баяўся згубіць вынікі ваеннай кампаніі ў час народнага сацыяльнага выбуху.

Новыя ахвяры і разбурэнні прынесла беларускаму народу адступленне напалеонаўскага войска і рух рускай арміі на захад. У кастрычніку 1812 г. руская армія вымусіла Напалеона пакінуць Маскву і адступаць па старой смаленкай дарозе. У хуткім часе рэшткі "вялікай арміі" апынуліся на Беларусі. На Беразіне расійскія войскі з корпуса Вітгенштэйна, 3-й Заходняй арміі П.В. Чычагава і Галоўнай арміі планавалі акружыць французаў і захапіць Напалеона ў палон. Але М.І. Кутузаў адстаў на тры пераходы. Напалеон стварыў бачнасць пераправы цераз Беразіну каля с. Ухалоды, а сам навёў масты каля Студзёнкі. З цяжкімі баямі 14-16 (26-28) лістапада Напалеон пераправіў частку баяздольных часцей на правы бераг і крочыў ад Беразіны да Вільні. Бярэзінская аперацыя, нават не зусім удалая для расійскіх войскаў, паставіла Напалеона на край пагібелі. Яго армія фактычна перастала існаваць: пасля пераправы засталося толькі 9 тыс. баяздольных і каля 10-15 тыс. небаяздольных чалавек.

21 лістапада (3 снежня) у Маладзечне імператар склаў "пахавальны" 29-ты бюлетэнь, у якім ён прызнаў сваё паражэнне. 23 лістапада (5 снежня) у Смаргоні Напалеон перадаў камандаванне І. Мюрату і пакінуў сваю армію. Ён спяшаўся Ў Парыж.

У снежні рэшткі "вялікай арміі" (каля 30 тыс. чалавек) разам з мясцовай адміністрацыяй (Камісія Часовага ўрада ВКЛ існавала да лета 1813 г.) пакінулі межы Расійскай імперыі. На тэрыторыі заходніх губерняў было ўведзена расійскае ваеннае кіраванне і пачала аднаўляцца грамадзянская адміністрацыя. Кіруючыся ваенна-стратэгічнымі і палітычнымі меркаваннямі, Аляксандр І дараваў шляхце Літвы і Беларусі яе здраду ў час вайны. Маніфестам ад 12 (24) снежня 1812 і. аб'яўлялася амністыя жыхарам заходніх губерняў – удзельнікам вайны супраць Расіі – пры ўмове іх вяртання на радзіму на працягу 2 месяцаў. Толькі пасля гэтага тэрміну маёнткі шляхты і магнатаў падлягалі канфіскацыі.

Але абвешчанай Аляксандрам І амністыяй скарысталіся не ўсе. Тады Напалеон яшчэ не быў канчаткова пераможаны, і многія буйныя і дробныя землеўладальнікі па-ранейшаму звязвалі свае надзеі з яго спробамі павярнуць назад ход ваенных дзеянняў. Пасля вайны 1812 г. толькі ў Магілёўскай, Мінскай і Гродзенскай губернях поўнай ці частковай канфіскацыі падлягала каля 153 тыс. сялян мужчынскат полу. Але ў выніку ўсеагульнай і безумоўнай амністыі, якая была абвешчана маніфестам ад 30 жніўня (11 верасня) 1814 г., усе канфіскаваныя альбо секвестраваныя маёнткі падлягалі вяртанню іх уладальнікам.

Ваенныя падзеі 1812 г. прынеслі Беларусі незлічоныя страты: тысячы загінуўшых, зруйнаваныя гарады і вёскі, скарачэнне амаль напалову кольскасці жывёлы. Былі страчаны многія культурныя каштоўнасці Беларусі. Толькі добрыя ўраджаі 1813 і 1814 гг. дазволілі пазбегнуць на Беларусі масавага голаду. Аднак і пасля заканчэння вайны ўлады не спяшаліся прымаць кардынальныя меры на стабілізацыі становішча. Прыгоннае права было захавана, працягваліся рэкруцкія наборы, надатковы ціск амаль не змяншаўся. Разам з тым мясцовая шляхта, нават скампраметаваная супрацоўніцтвам з Напалеонам, захавала свае правы і прывілеі. Негатыўныя наступствы падзей 1812 г. адчуваліся на Беларусі на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў.

**Грамадска-палітычны рух.** Развіццё грамадска-палітычнага руху на землях Беларусі ў канцы XVIII начатку XIX ст. вызначалася агульнаеўрапейскімі падзеямі: французскай буржуазнай рэвалюцыяй, падзеламі Рэчы Паспалітай, напалеонаўскімі войнамі.

Французская рэвалюцыя садзейнічала распаўсюджванню дэмакратычных ідэй, спрыяла актывізацыі радыкальных і дэмакратычных рухаў. Разам з тым яна выклікала жах і нянавісць пераважнай часткі правячых колаў. Практычна ва усіх еўрапейскіх краінах назіраліся рэвалюцыйныя ўзрушэнні. Не была выключэннем і Беларусь. Шляхецкая інтэлігенцыя, вучнёўская моладзь, незадаволеныя падзеламі Рэчы Паспалітай, аб'ядноўваліся ў гурткі і таварыствы для выпрацоўкі і дасягнення сваіх сацыяльных і нацыянальных ідэалаў. З'яўленне тайных арганізацый было вынікам моцнага ўплыву ідэалогіі Асветніцтва, якая атрымала распаўсюджванне на Беларусі з другой паловы XVIII ст.

Віленская асацыяцыя (1796-1797) была адным з першых вядомых з канца XVIII ст. тайных антыўрадавых згуртаванняў. Гэтае таварыства разгарнула шырокую дзейнасць – яе адгалінаванні існавалі ў Ашмянах, Брэсце, Кобрыне, Мінску. Асноўнай мэтай асацыяцыі з'яўлялася аднаўленне ранейшай дзяржавы на аснове Канстытуцыі 3 мая 1791 г. Вялікія спадзяванні Віленская асацыяцыя ўскладала на дапамогу Францыі. Членамі таварыства быў складзены "Акт паўстання", але здзейсніць выступленне яны не паспелі – у 1797 г. арганізацыю раскрылі ўлады.

Далейшае распаўсюджванне тайных арганізацый было звязана з адраджэннем у Царстве (Каралеўстве) Польскім (з 1815 г.) дзейнасці легальнага масонства і з'яўленнем "Патрыятычнага таварыства". На працягу 1817-1823 гг. у асяроддзі студэнцкай моладзі Царства Польскага і заходніх губерняў Расіі існавала каля 50 тайных згуртаванняў. У той самы час шырока распаўсюджаны былі і легальныя таварыствы.

У 1819 г. у Вільні было створана адгалінаванне польскага таварыства "Нацыянальнае масонства", якое паставіла сабе на мэту аднаўленне незалежнай "Польшчы ў магчыма больш шырокіх межах". У маі 1821 г. "Нацыянальнае масонства" было пераўтворана ў "Патрыятычнае таварыства", а рэгіянальнае аддзяленне ў Вільні – у правінцыяльны савет таварыства (старшыня – М. Ромер). Асноўнай мэтай таварыства з’яулялася барацьба за свабоду і незалежнасць польскай дзяржавы ў межах 1772 г., для дасягнення якой прымальныя былі любыя сродкі, не выключаючы і рэвалюцыйныя метады. У сваёй дзейнасці таварыства звяртала ўвагу на Літоўскі асобны корпус і арсенал зброі ў Вільні. У 1826 г. існаванне "Патрыятычнага таварыства" было выкрыта па справе дзекабрыстаў.

Нацыянальна-вызваленчыя ідэі глыбока пранiклі ў студэнцкае асяроддзе. Створанае ў канцы 1817 г. студэнтамі Віленскага

універсітэта (Т. Занам, А. Міцкевічам, Я. Чачотам, Ю. Яжоўскім і інш.), Таварыства філаматаў (сяброў навук) мела намер пры дапамозе культурна-асветніцкай дзейнасці "падняць дабрабыт айчыны". "Айчына" для філаматаў уключала землі былога ВКЛ, якія на той час уваходзілі ў склад Віленскай навучальнай акругі. Паступова ад ідэі ўнутранага ўдасканалення філаматы пераходзяць да ідэі ўдасканалення грамадства шляхам карэнных сацыяльна-эканамічных рэформ: ліквідацыі прыгоннага права, увядзення канстытуцыйнага кіравання. І хаця практычная дзейнасць у гэтым накірунку была нязначнай, іх заслуга ў тым, што яны ўздымалі такія праблемы і спрабавалі звярнуць на іх увагу грамадства. У праграме таварыства вылучалася таксама ідэя аб праве народаў на незалежнае існаванне.

Некаторы час філаматы заставаліся нешматлікай групоўкай. Для павелічэння колькасці прыхільнікаў нацыянальна-асветніцкіх ідэй Т. Зан, ураджэнец Віленскага павета, вясной 1820 г. заснаваў яшчэ адну арганізацыю віленскіх студэнтаў –“прамяністыя” ("Таварыства прыхільнікаў карысных забаў"). Асноўныя задачы таварыства вызначаны ў статуце: "...жадаць дабра сваім землякам, кожнаму стану і цэламу народу наогул, захоўваць бацькоў сваіх карысныя звычаі, любіць прыродную мову і ёй вучыцца, маючы ў памяці адвагу і подзвігі продкаў, браць прыклад з іх па меры сіл сваіх і стану". На пачатку лета 1820 г. уладам стала вядома пра існаванне таварыстваў, якія займаліся прапагандай польскай гісторыі і культуры. Замест распушчаных паводле загаду рэктара Віленскага універсітэта філаматаў і прамяністых была ўтворана новая арганізацыя – Таварыства філарэтаў (прыхільнікаў маральнай чысціні), якая стала найбольш масавай у папаунанні з папярэднімі. Пашырэнне асветы з'яўлялася па-ранейшаму адным з асноўных накірункаў дзейнасці студэнцтва але галоўная мэта – аднаўленне Рэчы Паспалітай – насіла палітычны характар. Тайныя згуртаванні становяцца папулярнымі, і пад уплыў філарэтаў трапляюць навучэнцы Мінскай, Свіслацкай і іншых гімназій.

З пачатку 20-х гг. XIX ст. назіраюцца змены ў палітыцы Аляксандра І у дачыненні патрыятычна настроенай шляхты. У снежні 1821 г. выходзіць указ аб забароне дзейнасці на тэрыторыі Царства Польскага і Віленскай навучальнай акругі тайных таварыстваў, а ў жніўні 1822 г. – масонскіх ложаў. З гэтага часу распачалася дзейнасць тайнай паліцыі па выкрыццю недазволеных змоваў.

Вясной 1823 г. уладам стала вядома пра дзейнасць студэнцкіх і вучнёўскіх арганізацый у Віленскай навучальнай акрузе. Найбольш цяжкія пакаранні панеслі філарэты і філаматы. Паводле прысуду,

вынесенага ў красавіку 1824 г. спецыяльна створанай камісіяй, былі пакараны 20 членаў гэтых арганізацый. З іх трох (Т. Зана, А. Сузіна і Я. Чачота) выслалі на Урал, некаторых пакінулі ў Санкт-Пецярбургу і Маскве (А. Міцкевіча, Я. Сабалеўскага, Ю. Яжоўскага, Ф. Малеўскага) ці выслалі ў аддаленыя губерні Расіі. За выпушчанымі на волю нагляд вёўся да 1830 г. Была праведзена "чыстка" прафесуры Віленскага універсітэта. Ад працы былі адхілены І. Лялевель, І.М. Даніловіч, М.К. Бабро ўскі. Сваіх пасад пазбавіліся рэктар універсітэта Ю. Твардоўскі і папячыцель Віленскай навучальнай акругі А. Чартарыйскі.

Важным момантам у дзейнасці тайных таварыстваў Царства Польскага, Літвы, Беларусі было наладжванне кантактаў з рускімі дзекабрысцкімі арганізацыямі. Пасля паўстання Сямёнаўскага палка ў Пецярбургу (1820) на заходнюю ускраіну імперыі былі перадыслацыраваны гвардзейскія часці, у якіх служылі будучыя дзекабрысты А.А. Бястужаў-Марлінскі, М.С. Лунін, А.І. Адоеўскі, К.Ф. Рылееў і інш. У г. кіраўнік Паўночнага таварыства М.М. Мураўёў на(69)пісаў "мінскі варыянт" Канстытуцыі. У 1823 г. С.І. Мураўёў-Апостал і М.П. Бястужаў-Румін планавалі паўстанне войскаў, якія знаходзіліся ў Бабруйскай крэпасці ("бабруйская змова"), і арышт імператара ў час агляду цытадэлі. Яно не адбылося, але прымусіла дзекабрыстаў зразумець неабходнасць сувязі правінцыі з цэнтрам і аб'яднання Паўночнага і Паўднёвага таварыстваў.

Дзекабрысты і члены "Патрыятычнага таварыства" спрабавалі наладзіць супрацоўніцтва. Аднак рознае разуменне асноўных мэтаў (патрыёты Царства Польскага і беларуска-літоўскіх зямель на першы іілан ставілі нацыянальнае вызваленне, дзекабрысты галоўную задачу бачылі ў змене дзяржаўнага ладу і вырашэнні сялянскага пытання) прывялі да таго, што паўстанне на Сенацкай плошчы было падтрымана толькі афіцэрамі Літоўскага корпуса, якія ўваходзілі ў Таварыства ваенных сяброў (1825-1826). Выступленне Літоўскага піянернага батальёна (24 снежня 1825 г.) было задушана, пасля чаго камісіяй ваеннага суда да следства былі пры-цягнуты 144 чалавекі. Капітан К.Г. Ігельстром, паручнік А.І. Вягелін і іншыя зазналі долю ссыльных дзекабрыстаў.

Пасля разгрому студэнцкіх і вучнёўскіх груповак, а таксама выступлення дзекабрыстаў на Сенацкай плошчы яшчэ больш узмацняецца кантроль за дзейнасцю моладзі з боку афіцыйных уладаў. Нягледзячы на ўсё гэта, вызваленчы рух на былых землях ВКЛ не спыніўся, але ў ім адбыліся сур'ёзныя ідэалагічныя змены.

У 1826-1830 гг. тайныя таварыствы ("Чорныя браты", "Браты пільныя", "Сарматкае племя", "Мнезеры") мяняюць напрамак сваёй

дзейнасці. Калі раней асвета служыла асновай для выпрацоўкі вызваленчай ідэі, то з гэтага часу вызваленчая ідэалогія падпадае пад уплыў элементаў рэвалюцыйнага рамантызму. У праграмных патрабаваннях з'яўляюцца палажэнні, звязаныя з абавязковым набыццём і захаваннем зброі для здзяйснення вялікай вызваленча-адраджэнскай місіі – аднаўлення Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. Сацыяльна-культурныя пытанні, у якіх былі сканцэнтраваны амаль усе памкненні і надзеі членаў патрыятычнай моладзі, паступова саступаюць свае пазіцыі. Больш асцярожнай становіцца і дзейнасць саміх таварыстваў.

У канцы 20-х гг. XIX ст. нацыянальна-вызваленчы рух, узброены ідэяй незалежнасці Рэчы Паспалітай, уступіў у новую фазу свайго развіцця. Нетрываласць у самой аснове саюза паміж самадзяржаўнай Расіяй і канстытуцыйнай Польшчай, невыкананне палажэння, зафіксаванага Венскім кангрэсам пра магчымасць "распаўсюджвання свабоды (канстытуцыі. - *Заўвага аўт.)* на ўсёй тэрыторыі былой Польшчы ў межах 1772 г.", сістэматычнае парушэнне правоў і свабод, гарантаваных канстытуцыяй 1815 г., вяло да рэзкага абвастрэння супярэчнасцей паміж Расіяй і Царствам Польскім.

У снежні 1828 г. у Варшаве ўзнікла тайнае ваеннае Таварыства падхарунжых, ініцыятарам стварэння якога быў П. Высоцкі. Таварыства планавала забойства Мікалая I пад час яго каранацыі ў Варшаве (май 1829 г.) і захоп улады. Змоўшчыкі вагаліся, тэрмін выступлення некалькі разоў пераносіўся. Непасрэдна падштурхнулі да паўстання рэвалюцыйныя падзеі ў Францыі і Бельгіі (ліпень 1830 г.).

Мікалай I планаваў кінуць на разгром рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Еўропе армію Царства Польскага і Літоўскі асобны корпус. Аб гэтых планах стала вядома ў Варшаве, і кіраўнікі апазіцыі адчулі, што далей адцягваць паўстанне нельга. У ноч на 29 лістапада 1830 г. у Варшавс курсанты школы падхарунжых захапілі арсенал. Іх падтрымала большасць насельніцтва. Вялікі князь Канстанцін Паўлавіч, фактычны намеснік імператара ў Царстве Польскім, дзейнічаў нерашуча, а потым увогуле прыняў рашэнне аб адводзе расійскіх войскаў з польскай тэрыторыі.

У паўстанцкім руху вылучыліся дзве асноўныя плыні: кансерватыўная на чале з арыстакратам А. Чартарыйскім і рэвалюцыйная, так званая "левіца", сярод кіраўнікоў якой найбольш актыўную ролю адыгрываў І. Лялевель. Кансерватары баяліся ўзмацнення народнага руху ў ходзе паўстання, а таму і не лічылі патрэбным здзяйсненне грунтоўных сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў. Яны імкнуліся паказаць паўстанне як канфлікт Царства

Польскага з Расіяй, а не як нацыянальна-вызваленчы рух польскага народа. Вырашыць канфлікт арыстакраты прапаноўвалі дыпламатычным шляхам, а таму ўсяляк стрымлівалі патрыятычныя сілы і падрыхтоўку арміі да вядзення ваенных дзеянняў з Расіяй. Прадстаўнікі гэтага накірунку займалі большасць уплывовых пасад у арміі, урадзе і складалі асноўную частку ў сейме.

Асноўная ідэя праграмы "Патрыятычнага таварыства", так званай "левіцы", заключалася ў барацьбе за незалежнасць, аднаўленне Рэчы Паспалітай 1772 г. як цэнтралізаванай дзяржавы. "Левіца" адлюстроўвала інтарэсы пэўнай часткі сярэдняй і дробнай шляхты, буржуазіі, студэнцка-вучнёўскай моладзі. "Патрыятычнае таварыства" выступала адзінай палітычнай сілай, сацыяльная праграма якой улічвала інтарэсы падатковых саслоўяў. У змаганні з расійскім самадзяржаўем яна разлічвала на польскі народ. "Левіца" падкрэслівала, што змаганне ідзе нс супраць рускага народа, а накіравана супраць расійскага абсалютызму. Толькі "Патрыятычнае таварыства" адзначала, што паўстанне можа мець поспех, калі ахопіць усе землі былой Рэчы Паспалітай, а таму быў вылучаны лозунг "За нашу і вашу свабоду". Але рэвалюцыйная плынь не была кансалідаванай, яе ўплыў у сейме, арміі быў нязначным.

Кіраўніцтва паўстаннем сканцэнтравалася ў руках кансерватыўных дзеячаў, якія спачатку спрабавалі наладзіць перамовы з Канстанцінам Паўлавічам і Мікалаем І, але безвынікова. 18 снежня 1830 г. пачаў работу польскі сейм. Пад націскам патрыятычных сіл 20 снежня ён прыняў маніфест, які абвяшчаў нацыянальны характар паўстання, а галоўнай мэтай паўстання – змаганне за "незалежнасць і свабоду". У студзені 1831 г. сейм дэтранізаваў Мікалая І з польскага прастола.

Многія паслы разумелі неабходнасць тэрытарыяльнага пашырэння паўстання на заходнія губерні Расіі. І. Лялевель, М. Махнацкі настойвалі на тым, што польская армія павінна пачаць рух на ўсход і дапамагчы сваім братам скінуць прыгнёт расійскага царызму. Але толькі з пачаткам паўстання на землях былога ВКЛ на разгляд сейма былі вынесены пытанні аб палітычных адносінах паміж Царствам Польскім і ВКЛ у будучай дзяржаве. Аднак арганізацыя канкрэтных дзеянняў не вызначалася асаблівай эфектыўнасцю. Толькі 1 мая Нацыянальны ўрад прыняў рашэнне аб дапамозе жыхарам беларуска-літоўскіх зямель.

На тэрыторыі Беларусі непасрэдная падрыхтоўка да паўстання пачалася ў студзені 1831 г.: вусная агітацыя, распаўсюджванне пісьмовых адозваў, збор сродкаў і зброі. Акцэнт пры гэтым рабіўся на

цяжкае становішча краю, які прыгнечаны "маскалямі". Насельніцтва заклікалі ўзяць у рукі зброю. Але ніякіх канкрэтных абяцанняў, як палепшыць становішча насельніцтва, не гучала.

Тым часам шляхта, якая прыбыла ў Варшаву з заходніх губерняў Расіі і пажадала ўдзельнічаць у ваенных дзеяннях, па ініцыятыве І. Лялевеля была аб'яднана ў "Клуб аб'яднаных славян". 22 студзеня 1831 г. ад імя клуба было складзена пасланне да сейма, пад якім падпісалася каля 200 чалавек. У "Адрасе Ліцвінаў" падкрэслівалася, што "Літва (г. зн. сучасная Беларусь), Валынь, Падолія і Украіна заўсёды былі адзіным (з палякамі. - *Заўвага аўт.)* народам, адзінай Польшчай... З таго часу, як рэвалюцыя набыла характар нацыянальны, неабходным стала вяртанне зямель адабраных, бо толькі з імі паўстанне будзе адпавядаць свайму высокаму прызначэнню і адновіць незалежнасць... ". Варшаўскі ўрад, у сваю чаргу, звярнуўся з заклікам да насельніцтва Беларусі, Літвы і Украіны. У ім адзначалася, што сейм і ўрад абвясцілі цэласнасць і незалежнасць Польшчы, таму і насельніцтва ўсходніх тэрыторый былой Рэчы Паспалітай павінна прымаць актыўны удзел у барацьбе.

За развіццём падзей на Беларусі ўважліва сачылі ў Пецярбургу. 1(13) снежня 1830 г. у Віленскай, Гродзенскай, Мінскай губернях і Беластоцкай вобласці было ўведзена ваеннае становішча. У пачатку красавіка з войскаў, размешчаных каля Брэста і Гродна, і рэзервовых часцей была сфарміравана спецыяльная армія пад кіраўніцтвам генерала П.А. Талстога. Яна прызначалася для прадухілення паўстання на тэрыторыі ВКЛ. Паміж Царствам Польскім, літоўскімі і беларускімі губернямі была абмежавана сувязь, уведзена цэнзура перапіскі, узмацніўся паліцэйскі нагляд – нядобранадзейных высылалі ў глыб Расіі. Секвестру падвяргаліся маёнткі тых памешчыкаў, якія з пачатку паўстання знаходзіліся ў Царстве Польскім. Але прынятыя меры не змаглі прадухіліць пашырэнне паўстання на Бсларусь.

У студзені 1831 г. для кіраўніцтва паўстаннем быў створаны Віленскі цэнтральны камітэт (С. Шумскі, М. Балінскі, А. Гарэцкі і інш.). Камітэт прызнаваў вяршэнства Варшаўскага ўрада і не праяўляў асаблівай ініцыятывы, што тлумачыцца, магчыма, згасаннем самой ідэі ВКЛ, аднаўленне якога ў той момант ужо адыходзіла на другі план. Зараз намаганні накіроўваліся перш за ўсё на дасягненне незалежнасці Рэчы Паспалітай у межах 1772 г., што атаясамлівалася з аднаўленнем польскай дзяржаўнасці.

Камітэт займаўся зборам грашовых сродкаў на паўстанцкія мэты, арганізацыяй майстэрні па вырабу зброі, спрабаваў каардынаваць дзейнасць павятовых камітэтаў. Алс ў яго не было

выразнай лініі паводзін і праграмы дзеянняў. Па сутнасці, Камітэт не стаў кіруючым органам паўстання ў Беларусі, хаця яго дзейнасць спрыяла ўзнікненню тайных паўстанцкіх камітэтаў, якія ініцыіравалі выступленне.

Вясной 1831 г. у Беларусі склалася вельмі напружаная палітычная сітуацыя. Перадыслакацыі расійскіх вайсковых кантынгентаў, рэквізіцыі на патрэбы вайны вялі да пагаршэння і так дрэннага становішча значнай часткі насельніцтва. Адпаведную рэакцыю выклікалі чуткі аб поспехах польскай арміі. Да таго ж, у многіх рэгіёнах Беларусі не было расійскіх вайсковых сіл. Яны рушылі на захад. Таму шляхта Віленшчыны і Міншчыны скарыстала зручны момант.

У красавіку 1831 г. узброенае выступленне ахапіла Ашмянскі і Свянцянскі паветы Віленскай губерні, Вілейскі і Дзісненскі паветы Мінскай губерні. З першых дзён праявіліся асаблівасці ў арганізацыі паўстанцкай улады і ўзброеных сіл, якія істотна адрознівалі яго ад паўстання ў Царстве Польскім. У выпадку перамогі ў кожным павеце стваралася асобнае апалчэнне і паўстанцкае кіраўніцтва (з прадстаўнікоў буйной і сярэдняй шляхты), якое толькі часткова падпарадкоўвалася Віленскаму цэнтральнаму камітэту. Па сутнасці, дзейнасць павятовых паўстанцкіх органаў вызначалася канкрэтнымі мясцовымі абставінамі, што прыводзіла да пэўнай неаднастайнасці іх структуры. Паўстанцкія ўлады неадкладна абвяшчалі акты паўстання, прыводзілі насельніцтва да прысягі, абвяшчалі набор рэкрутаў; шляхце, якая далучалася да паўстання, гарантавалі захаванне ўсіх саслоўных і маёмасных правоў. Сялян і мяшчан заклікалі рашуча ўзяцца за зброю і адстойваць "сваю" новую ўладу.

У адпаведнасці з Актам паўстання абвяшчалася "вольнасць і роўнасць па праву". Паняцце "вольнасці" разглядалася як аб'яднанне тэрыторый, страчаных у выніку падзелаў 1772, 1793 і 1795 гг., і адначасова – рэалізацыя імкнення ліцвінаў да захавання самастойнасці ВКЛ у складзе адзінай федэратыўнай дзяржавы.

На працягу красавіка мая 1831 г. дзісненскія, свянцянскія, ашмянскія і вілейскія паўстанцы (да 10 тыс. чалавек), ажыццявілі некалькі аперацый, але затым пад націскам расійскіх войскаў пакінулі тэрыторыю Беларусі.

Спрыяльныя ўмовы для паўстання былі і ў іншых беларускіх губернях, але шляхта ў ім не прыняла ўдзелу. Сваю ролю тут адыгралі як папярэднія меры расійскіх уладаў, так і боязь шляхты выклікаць стыхійны сялянскі рух. Урад прымаў захады, каб не дапусціць аб'яднання шляхецкага руху з сялянскім. У красавіку 1831 г. з'явіўся

ўказ, якім прадугледжвалася падсуднасць шляхціцаў-паўстанцаў ваеннаму суду з канфіскацыяй іх маёмасці. Сялянам-паўстанцам абяцалі памілаванне, калі яны складуць зброю і вернуцца дамоў. (75)

З канца мая 1831 г. паўстанне на беларускіх землях уступіла ў новы этап, што было звязана з падыходам польскай рэгулярнай арміі. Першым на тэрыторыю Беларусі ўступіў атрад Д. Хлапоўскага (820 чалавек). Атрымаўшы шэраг перамог у невялікіх баях (над Гайнаўкай, Лідай і інш.), атрад Хлапоўскага папоўніўся зброяй і людзьмі. У хуткім часе атрад налічваў ужо каля 5 тыс. чалавек.

Набліжэнне польскіх войскаў выклікала хваляванні ў Лідскім, Навагрудскім, Пружанскім, Кобрынскім і Слонімскім паветах Гродзенскай губерні. З самага пачатку ўступлення польскай рэгулярнай арміі на тэрыторыю Белавежскай пушчы, дзеянпі паўстанцаў (да 800-1000 чалавек) сталі больш інтэнсіўнымі і рашучымі. Яны сур'ёзна пагражалі камунікацыям расійскай арміі, якая ваявала на тэрыторыі Царства Польскага. На задушэнне паўстання ў Белавежскай пушчы ўлады кінулі значныя вайсковыя сілы, і ў хуткім часе ачагі супраціву былі знішчаны.

У пачатку чэрвеня на тэрыторыю Віленскай губерні ўступіў 12-тысячны корнус генералаў А. Гслгуда, Г. Дэмбінскага і Ф. Роланда, які ўзяў накірунак на Вільню. 10 чэрвеня адбылося аб'яднанне фарміраванняў А. Гелгуда і Д. Хлапоўскага. Адзінае камандаванпе польскімі рэгулярпымі сіламі на беларуска-літоўскіх землях было ўскладзена на А. Гелгуда. Пры штабе камандуючага быў створаны так званы Часовы паўстанцкі ўрад на чале з генералам польскіх войскаў графам Т. Тышкевічам. Паўнамоцтвы новага ўрада распаўсюджваліся на тэрыторыю Віленскай губерні. Урад нсадкладна прыняў захады для папаўнення войска (з ліку сялян і дваран-паўстанцаў), што дазволіла сканцэнтраваць пад Вільняй каля 24 тыс. чалавек. Паўстанцы ставілі сваёй мэгай захоп горада.

Штурм Вільні пачаўся 19 чэрвеня. Сілы былі няроўныя, рускія войскі, якія налічвалі каля 40 тыс. чалавек, лёгка адбівалі атакі. Поспех 1794 г. пад Вільняй паўтарыць не ўдалося. Страціўшы ў бітве каля 2 тыс. чалавек, паўстанцы адступілі. Сярод іх пачалася дэмаралізацыя і дэзерцірства. Рэшткі экспедыцыйных і мясцовых атрадаў пакінулі Беларусь, частка з іх перайшла ў Прусію і склала зброю. Толькі атрад генерала Г Дэмбінскага (каля 4 тыс. чалавек) здолеў адысці ў Гродзенскую губерню.

Пры набліжэнні корпуса Дэмбінскага ў Навагрудскім і Слонімскім паветах пачалося паўстанне пад кіраўніцтвам павятовага маршалка Я. Кашыца. У ім прымалі ўдзел не толькі шляхціцы, але і

сяляне. У Навагрудку паўстанцы (400 чалавек) далучыліся да атрада Дэмбінскага і разам з ім пакінулі горад.

У чэрвені - ліпені 1831 г. паўстанцкі рух разгарнуўся ў Мазырскім, Рэчыцкім і Пінскім паветах Мінскай губерні. Арганізатарамі і кіраўнікамі яго былі мясцовыя памешчыкі Ф. Кеневіч і Т. Пуслаўскі. Колькасць паўстанцаў склала прыблізна 1300 чалавек, але дасягнуць нейкіх рэальных поспехаў яны не здолелі.

Пасля адыходу з тэрыторыі беларускіх паветаў польскай арміі паўстанне на землях былога ВКЛ пайшло на спад, але партызанская вайна асобных атрадаў не спынялася да восені 1831 г. І толькі звесткі пра падзенне 8 верасня Варшавы, а затым Модліна і Замосця (адпаведна 9 і 21 кастрычніка) – апошніх бастыёнаў паўстанцаў у Царстве Польскім, прымусілі разысціся тыя атрады, якія да гэтага часу яшчэ знаходзіліся ў лясах.

У тым, што паўстанне 1830-1831 гг. на Беларусі пацярпела паражэнне, былі свае прычыны. Неразуменне глыбіні сялянскага пытання і недастатковы ўлік этнарэлігійных асаблівасцяў прывялі да таго, што надзеі на шырокі ўдзел у паўстанні падатковых саслоўяў не спраўдзіліся. Не адчуўшы рэальнага паляпшэння свайго становішча, сялянства ў асноўным засталося абыякавым да палітычнай праграмы паўстанцаў. Паўплывала таксама адсутнасць належнага ўзаемаразумення паміж Нацыянальным урадам і Віленскім цэнтральным камітэтам. Сітуацыя ўскладнялася і тым, што ў самім кіраўніцтве на тэрыторыі ВКЛ не існавала адзінства і ўзгодненасці. Стаарэнне часовых павятовых органаў не прывяло да узнікнення адзінага ўрада, якому падпарадкоўваліся б усе мясцовыя структуры. Не спраўдзіліся надзеі беларускіх паўстанцаў і на падтрымку польскай рэгулярнай арміі.

Паўстанне 1830-1831 гг. насіла шляхецкі характар, нягледзячы на тое, што каля 30% удзельнікаў у ім складалі прадстаўнікі падатковых саслоўяў. У падрыхтоўцы і правядзенні паўстання на Беларусі асноўная роля належала сярэдняй шляхце, памешчыкам, чыноўніцтву і студэнцкай моладзі. Значную ролю ў распаўсюджванні паўстання выконваў каталіцкі клір. Адсюль відавочны кансерватызм паўстання. Тым не менш, яно ўскладніла пазіцыі расійскага самаўладдзя, паспрыяла замацаванню рэвалюцыйных змен у Еўропе, разгортванню нацыянальна-вызваленчай барацьбы ў іншых краінах. Усяго за перыяд з красавіка па лістапад 1831 г. колькасць удзельнікаў паўстання на Беларусі складала каля 15 тыс. чалавек.

Пасля паўстання пачаліся масавыя рэпрэсіі. Ствараліся спецыяльныя следчыя губернскія камісіі. Сотні шляхціцаў былі

пазбаўлены сваіх маёнткаў, некаторыя арыштаваны, мноства знайшло выратаванне ў эміграцыі. Сваіх маёнткаў пазбавіўся шэраг прадстаўнікоў магнацкіх родаў, якія валодалі тысячамі прыгонных: Агінскія, Плятэры, Пшаздзецкія, Радзівілы, Сапегі, Чартарыйскія і інш.

Урад разумеў, што адных рэпрэсій мала. Таму пасля 1831 г. быў распрацаваны канкрэтны план поўнага зліцця заходніх губерняў з тэрыторыяй Расіі пад сцягам праваслаўя і адзінай рускай народнасці. Гэтаму паспрыяў спецыяльна створаны пры імпсратары асобны Камітэт па справах заходніх губерняў (1831-1848).

Але рэпрэсіі не здолелелі спыніць грамадска-палітычны рух. Пасля паўстання 1830-1831 гг. сур'ёзную небяспеку для царызму ўяўляла шляхецкая эміграцыя. Эмігранты не адмовіліся ад намеру ўзнавіць паўстанне. Яны вылучылі нават ідэю еўрапейскай рэвалюцыі, пачаткам якой павінна было стаць паўстанне на былых землях Рэчы Паспалітай, а рухаючай сілай – народныя масы. Выкананне праекта было ўскладзена на палкоўніка Ю. Заліўскага, які павінен быў разгарнуць шырокі сялянскі рух.

У сакавіку 1833 г. частка эмісараў экспедыцыі Ю. Заліўскага тайна перайшлі мяжу Расійскай імперыі. Тэрыторыя былога ВКЛ была падзелена на асобныя акругі. Акругу ў складзе Гоодзенскага і Лідскага паветаў узначаліў М. Шыманскі, акругу са Слонімскага і Навагрудскага паветаў – М. Валовіч. Сам Заліўскі павінен быў знаходзіцца на Магілёўшчыне. М. Валовіч сфарміраваў у асноўным з сялян сваёй вёскі невялікі атрад і пачаў партызанскія дзеянні. Мэтай сваёй барацьбы ён лічыў вызваленне сялян і абвяшчэнне Беларусі і Літвы дэмакратычнай рэспублікай. Аднак мясцовыя памешчыкі мабілізавалі ўсе свае намаганні супраць эмісара. Сяляне не падтрымалі заклікаў М. Валовіча і 15 мая 1833 г. выдалі яго царскім уладам. Эмісара схапілі і пакаралі смерцю праз павешанне. У хуткім часе была ліквідавана дзейнасць і іншых партызанскіх атрадаў на тэрыторыі Віленскай і Гродзенскай губерняў.

Вастрыня і нявырашальнасць пытанняў, якія ўзнікалі перад паўстанцамі 1830-1831 гг., вялі да актывізацыі грамадска-палітычнага руху, які набываў новыя рысы. У другой палове 30-40-х гадоў XIX ст. пачынаюць ствараціца першыя рэвалюцыйныя і дэмакратычныя арганізацыі.

У 30-х гг. XIX ст. эпіцэнтрам апазіцыі па-ранейшаму заставалася Вільня. Пасля закрыцця Віленскага універсітэта там дзейнічалі створаныя на яго базе Медыка-хірургічная і Духоўная акадэміі. У 1836 г. сярод студэнтаў Медыка-хірургічнай акадэміі ўтварылася

"Дэмакратычнае таварыства", лідэрам якога быў студэнт Ф. Савіч. Акрамя студэнтаў у склад суполкі ўваходзілі прадстаўнікі разначыннай інтэлігенцыі, выхадцы з шляхецкага асяроддзя. Іх ідэалам было грамадства роўных магчымасцяў для ўсіх. Некаторыя з іх даволі крытычна ацэньвалі дзейнасць сваіх папярэднікаў у 1830-1831гг. за тое, што яны не здолелі ўзняцца да прызнання роўнасці ўсіх людзей, не пазналі ў селяніне брата. Савіч і яго аднадумцы выступалі за права кожнага народа на самастойнасць, прапагандавалі рэспубліканскі лад. У 1837 г. "Дэмакратычнае таварыства" стала часткай нелегальнай арганізацыі "Садружнасць (Саюз) польскага народа" на чале з эмісарам ад дэмакратычнага крыла эміграцыі Ш. Канарскім. Ён быў засланы на тэрыторыю Беларусі ў 1836 г., але хутка трапіў у рукі ўладаў і быў пакараны смерцю. У чэрвені 1838 г. улады выкрылі арганізацыю Савіча, а яе кіраўніка і іншых актыўных членаў саслалі салдатамі на Каўказ.

Пасля паўстання 1830-1831 гг. палітычнае становішча на Беларусі заставалася даволі складаным. Афіцыйныя ўлады ўвесь час вялі пошукі палітычных змоўшчыкаў. У гэтай атмасферы нервовасці ў 1840-1841 гг. была сфабрыкавана так званая справа "паслядоўнікаў" Ш. Канарскага. Яе пачатак быў пакладзены ў красавіку 1840 г. арыштам на граніцы з Прусіяй двух студэнтаў Медыка-хірургічнай акадэміі і вучня Мінскай гімназіі, у якіх знайшлі забароненыя вершы. Студэнты былі абвінавачаны ў падрыхтоўцы замаху на жыццё Мікалая І. На Медыка-хірургічную акадэмію абрынулася хваля арыштаў. У выніку следства, якое вялося забароненымі метадамі (катаванні, пагрозы), жандары атрымалі прызнанні аб існаванні ў Вільні тайнага таварыства "Чалавечнасць", галоўнай мэтай якога была прапаганда ідэй адраджэння Рэчы Паспалітай. Адбыліся новыя арышты, у тым ліку С. Залівакі, які даў паказанні аб падрыхтоўцы паўстання на тэрыторыі Літвы, Беларусі і Украіны. Для расследавання справы ў Вільню быў камандзіраваны палкоўнік У.І. Назімаў, які прыйшоў да высновы, што ніякай змовы не існуе. Але віленскі генерал-губернатар Ф.Я. Міркавіч настойваў на абвінавачваннях. І толькі пасля паўторнага следства, якое правёў генерал-ад'ютант А.А. Кавелін, Міркавіч прызнаў сваю памылку. Генерал-губернатар падаў у адстаўку, але яна не была прынята: Мікалай І падзяляў погляды Міркавіча на неабходнасць пільнага кантролю за заходнім краем. Арыштаваныя па справе былі ў большасці вызвалены, а палкоўнік Назімаў заслужыў гонар справядлівага следчага. У 1855 г., калі ён прыехаў у Вільню ў якасці генерал-губернатара, мясцовая шляхта сустракала яго з радасцю.

У 1846-1849 гг. на Беларусі дзейнічала тайная арганізацыя "Саюз свабодных братоў" ("Братні саюз літоўскай моладзі"), створаная ўраджэнцамі Лідскага павета Фр. і А. Далеўскімі. Вядомы суполкі "Саюза" ў Ашмянах, Вільні, Гродне, Лідзе і Мінску, колькасць удзельнікаў дасягала 200 чалавек. Мінскае аддзяленне вяло работу сярод вучнёўскай моладзі і вайскоўцаў гарнізона. Пад Мінскам у Бараўлянах была наладжана вытворчасць зброі і патронаў. Уплыў "Саюза" распаўсюджваўся нават на выхаванцаў Брэсцкага кадэцкага корпуса, дзе ў гэты час узнік палітычны гурток.

"Саюз свабодных братоў" ставіў мэту сацыяльнага і нацыянальнага вызвалення, выступаў супраць дэспатыі і прыгнечання, за свабоду Польшчы і Расіі. Пад уздзеяннем рэвалюцыйных падзей у Еўропе "Саюз" падышоў да практычнай падрыхтоўкі ўзброенага паўстання, але здзейсніць яго не здолеў.

Такім чынам, грамадска-палітычны рух у Беларусі ў першай палове XIX ст. сведчыў аб крызісе грамадства. Знішчэнне Вялікага княства Літоўскага пад час падзелаў Рэчы Паспалітай, няўдалая спроба яго аднаўлення ў 1812 г. і мэтанакіраваная палітыка расійскіх уладаў прывялі да ліквідацыі самой ідэі літвінскай дзяржаўнасці. А грамадскі рух і грамадская думка яшчэ не здолелі сфарміраваць новую канцэпцыю нацыянальна-дзяржаўнай ідэі.

ЛЕКЦЫЯ 4

## РАЗВІЦЦЁ КУЛЬТУРЫ

• *Асвета, навука*
• *Літаратура, музыка*
• *Архітэктура, жывапіс*

Культура Беларусі ў дарэформенны перыяд генетычна звязана з папярэднай эпохай. Але гэты працэс характарызаваўся і новымі своеасаблівымі рысамі. Галоўныя з іх – свецкасць культуры і рацыяналізм. Царква згубіла самастойную ролю ў асвеце і культуры. Манаполія рэлігійнага светапогляду была парушана. Аднак рацыяналізм XVIII ст., які звязаны з распаўсюджваннем ідэалогіі і культуры эпохі Асветы, не азначаў поўнага знішчэння рэлігійнага светапогляду.

Характэрнай рысай гісторыка-культурнага працэсу Беларусі становіцца яго паскарэнне і ўскладненне, што было звязана з больш хуткім развіццём грамадства ў цэлым. Пачынаўся працэс дыферэнцыяцыі культуры, з'явіліся яе новыя накірункі (навука, мастацкая літаратура, свецкі жывапіс, тэатр і інш.). Адначасова адбывалася значна большае, чым было да гэтага часу, сутыкненне і ўзаемаўплыў розных сфер культуры. У параўнанні з папярэднім перыядам у грамадстве істотна пашыралася сістэма псрадачы культурных каштоўнасцяў, фарміраваўся новы механізм іх распаўсюджвання (свецкая школа, выдавецтва кніг, газет, часопісаў, развіцце тэатра і інш.). Духоўнае жыццё беларускага грамадства станавілася больш разнастайным.

У дарэформенны перыяд адбывалася дэмакратызацыя агульнакультурнага працэсу: пашырылася кола вытворцаў і спажыўцоў культурных каштоўнасцяў, з'явілася магчымасць далучэння да культуры розных сацыяльных груп. Аднак амаль да канца феадальнай эпохі дэмакратызацыя культуры адлюстроўвалася больш у тэндэнцыі свайго развіцця, чым у рэальных выніках. Саслоўныя абмежаванні стрымлівалі гэты працэс.

Адметнай асаблівасцю развіцця культуры Беларусі ў першай трэці XIX ст. быў працэс яе паланізацыі. У многім гэта ябумовілася палітыкай імператара Аляксандра I, якая была накіравана на аднаўленне польскай дзяржаўнасці, і знайшла падтрымку ў асяроддзі польскай магнатэрыі і паланізаванага беларускага шляхецтва. Цэнтрам польскага ўплыву быў горад Вільня з яго універсітэтам.

Працэс паланізацыі крыху зменшыўся, але не спыніўся пры Мікалаю І, які праводзіў палітыку наслядоўнай русіфікацыі Беларусі.

Уплывовым фактарам культурнага развіцця Беларусі таго часу стала супрацьстаянне дзвюх канфесій: праваслаўнай і каталіцкай, носьбітаў розных культурных і духоўных каштоўнасцяў. Каталіцызм у асноўным з'яўляўся рэлігіяй прывілеяванага, дваранскага саслоўя. Праваслаўе было звязана пераважна з сялянствам, мяшчанствам. Цэнтрам праваслаўнай культуры Бсларусі быў Магілёў, дзе знаходзілася духоўная семінарыя, якую заснаваў яшчэ архіепіскап Георгі Каніскі. Трэба адзначыць, што выхаванцы гэтай установы шмат зрабілі для адраджэння праваслаўнай культуры. Сярод іх буйнейшы лінгвіст, фалькларыст і этнограф І. Насовіч (1788-1877), аўтар ”Слоўніка беларускай мовы”.

Падзел беларускага грамадства па саслоўнай і канфесійнай прыкмеце паспрыяў стварэнню на Беларусі двух культурных накірункаў: польскага, носьбітам якога ў асноўным было беларускае дваранства, і "заходнерускага", прадстаўнікамі якога з'яўляліся праваслаўнае і часткова уніяцкае духавенства, купецтва, мяшчанства. Абапіраючыся на праваслаўе, прыхільнікі "заходнерускага" накірунку аднаўлялі, як ім здавалася, асновы традыцыйнай, народнай культуры. Наяўнасць гэтых дзвюх плыняў у агульіай культуры Беларусі стрымлівала працэс стварэння адзінай беларускай нацыі.

Безумоўна, культура Бсларусі адлюстроўвала сацыяльную структуру грамадства. Яе часткамі былі: магнацкая культура, памесна-дваранская культура сярэдняй і дробнай шляхты, культура мяшчан і насельніцтва гарадоў і мястэчак, сялянская культура. І хоць розніца паміж імі на працягу XIX ст. пад уплывам сацыяльна-эканамічных фактараў паступова згладж валася, тым не менш канфесійная неаднастайнасць прыводзіла і да кульіурнай дыферэнцыяцыі, насіла часам характар вострага супрацьстаяння.

Па ўзроўню развіцця культуры як у цэлым, так і па асобных яе сферах розныя рэгёны Беларусі істотна адрозніваліся і паміж сабою. Ролю галоўных культурных цэнтраў адыгрывалі бсларускія гарады. На працягу ўсёй першай паловы XIX ст. прызнаным навуковым і літаратурным асяродкам Беларусі была Вільня, дзе знаходзіўся універсітэт, у сценах якога атрымлівала адукацыю беларуская моладзь.

Іншымі важнымі культурнымі цэнтрамі былі Магілсў, Віцебск, Слонім. Значны ўклад у развіццё культуры ўносілі магнацкія цэнтры: рэзідэнцыя Храптовічаў у Шчорсах, маёнтак М. Агінскага ў Залессі, маёнтак Ваньковічаў у Мінску і інш.

**Асвста, навука.** Якасна новым момантам у развіцці асветы на Беларусі было фарміраваніе адукацыі: вышэйшай, сярэдняй і пачатковай сістэмы. Стварэнне Міністэрства народнай асвсты (1802) цэнтралізавала дзяржаўнае кіраўніцтва школай. У кожным губернскім горадзе стваралася гімназія, у павятовым горадзе – павятовае вучылішча. Пры кожным царкоўным прыходзе – царкоўнапрыходскія вучылішчы, у якія прымалі дзяцей "усялякага стану". Прадугледжвалася сувязь паміж школамі розных ступеняў. Аднак фактычна для распаўсюджвання адукацыі сярод народа было зроблена мала. Казна не брала на сябе выдаткаў на ўтрыманне школ, перакладала гэта або на органы мясцовага кіравання, або на памешчыкаў. Статут 1804 г. адзначаў, што дзяцей прыгонных сялян нельга прымаць у гімназіі. Несумяшчальнасць прыгоннага права з распаўсюджваннем адукацыі сярод шырокіх слаёў сялянства станавілася відавочнай.

Значнымі былі поспсхі ў сферы вышэйшай адукацыі. Асноўным асяродкам навукі і адукалыі Беларусі у першай трэці XIX ст. быў Віленскі універсітэт, які ў 1803 г. атрымаў назву Імператарскага. Адначасова ён з'яўляўся вучэбным цэнтрам навучальнай акругі, ажыццяўляў кантроль за работай школ, яго выкладчыкі прымалі ўдзел у складанні праграм навучання, напісанні падручнікаў.

Палітычныя падзеі 1820-1830 гг. прывялі да ліквідацыі Віленскай навучальнай акругі, закрыцця універсітэта і ўнеслі істотныя змены ў сістэму асветы. Пераемнасць навучання была парушана. Выпускнікам Віленскага універсітэта, як удзельнікам рэвалюцыйных падзей, забаранялася выкладаць у мясцовых школах. Настаўніцкія кадры для Беларусі рыхтаваліся Пецярбургскім педагагічным інстытутам і створанай у 1834 г. Віцебскай настаўніцкай семінарыяй.

Развіцце асветы Беларусі першай паловы XIX ст. Характарызавалася наяўнасцю каталіцкай манастырскай адукацыі. Новай з'явай стала стварэнне сістэмы духоўнага, а таксама зараджэнне ваеннага і прафесійнага навучання.

Важным паказчыкам распаўсюджвання адукацыі было павелічэнне цікавасці да кнігі і актывізацыя выдавецкай справы. На Беларусі існавалі казённыя, прыватныя і царкоўныя друкарні.

Разам са значным павелічэннем колькасці друкарняў і агульнага аб'ёму выдавецкай прадукцыі, павялічвалася ўдзельная вага свецкай кнігі, пашыралася яе тэматыка. На Беларусі выдавалася вучэбная і мастацкая літаратура, назіраліся тэндэнцыі да фарміравання навуковай і навукова-папулярнай літаратуры. З'яўляюцца першыя краязнаўчыя нублікацыі і першыя часопісы.

Вялікая роля ў духоўным жыцці грамадства належала інтэлігенцыі. Па свайму сацыяльнаму складу інтэлігенцыя Беларусі была ў асноўным дваранскай. Аднак у яе асяроддзі зявіліся разначынцы. Беларуская інтэлігенцыя спрабавала аб'яднаць народную і прафесійную культуру. Адукаванага выхадца з беларускай шляхты, разначынца, ужо не зусім задавальняла польска-лацінская культура, у яго з'явілася цікавасць да мясцовай гісторыі, этнаграфіі, археалогіі, фальклору, мовы. Гэтыя галіны навуковых ведаў звязаны з імёнамі І. Грыгаровіча, М. Баброўскага, З. Даленгі-Хадакоўскага. Т. Нарбута, А. Кіркора, І. Даніловіча, братоў Я. і К. Тышкевічаў і шмат іншых. Гэта былі людзі розных палітычных поглядаў і культурных накірункаў. Так, з імем протаіерэя І. Грыгаровіча (1792-1852) звязана дзейнасць гісторыка-асветніцкага гуртка ў Магілёве, удзельнікаў якога аб'ядноўвалі пошукі, збор і апрацоўка і істарычных матэрыялаў, шляхі аднаўлення мінулага роднага краю.

Дзейнасць яю вылілася ў выданне першага зборніка дакуменгаў па гісторыі Беларусі над назвай "Беларускі Архіў старажытных актаў" (1824), выхадам у свет "Актаў археаграфічнай! экспедыцыі". Т. 1-4. (1834-1838) і "Актаў гістарычных". Вялікі ўклад у працу гургка ўнёс граф М. Румянцаў, пад кіраўніцтвам і на сродкі якога былі сабраны рукапісныя, этнаграфічныя, нумізматычныя калекцыі, створана бібліятэка, якая паклала пачатак вядомаму ў Маскве Румянцаўскаму музею.

Прадстаўніком гістарычнай навукі быў таксама прафесар Віленскага універсітэта І. Даніловіч (1788-1843). Прыхільнік аднаўлення суверэнітэту Вялікага княства Лігоўскага, ён выдаў Статут Вялікага кпяства Лігоўскаіа 1529 г., Судзебнік Казіміра IV 1468 г., Супрасльскі летапіс і іншыя крыніцы.

На гэты час прыпадае навуковая дзейнасць гісторыка, іірафесара Вілснскага універсітэта М.К. Баброўскага (1784-1848), заснавальніка беларусазнаўства і славяназнаўства. Менавіта заслуіа М.К. Баброўскага, што былі адкрыты Супрасльскі летапіс, працы Ф. Скарыны.

З дзсйнасцю гэтых навукоўцаў звязана зараджэнне на Беларусі археаг рафіі, крыніцазнаўства, славяназнаўства, а таксама беларусазнаўства.

Вялікую вядомасць у дарэформенны перыяд атрымалі працы З. Даленгі-Хадакоўскага (1784 1825), братоў Канстанціна (1806-1868) і Яўстафія (1814-1873) Тышкевічаў, стваральнікаў беларускай археалоііі і музеязнаўства. Па ініцыятыве братоў Тышкевічаў у 1842 г. быў створаны першы на Беларусі музей старажытнасцяў, экспанаты

якога склалі аснову музея ў Вільні. У 1855 г. Я. Тышкевіч арганізаваў і ўзначаліў Віленскую археалагічную камісію, якая займалася зборам, вывучэнпсм і публікацыяй дакументаў, што звязаны з гісторыяй Беларусі, Украіны і Літвы.

Значны ўклад у развіццё беларусазнаўства ўнеслі П. Шпілеускі (1823-1861), аўтар "Падарожжа па Палессі і беларускім краі", "Беларусь у характарыстычных апісаннях і фантастычных яе казках" і М. Без-Карніловіч, які выдаў у Пецярбургу "Гістарычныя звесткі".

У 40-я гг. пачынаецца творчая, культурна-асветніцкая і выдавецкая дзейнасць А. Кіркора (1818-1886). Выдатны знаўца гісторыі і этнаграфіі Беларусі, ён надрукаваў шматлікія навуковыя матэрыялы ў польскай і рускай перыёдыцы. Асабліва каштоўнай для станаўлення беларускай этнаграфіі была яго праца "Этнаграфічны погляд на Віленскую губерню" (1857-1859), напісаная ў адпаведнасці з праграмай Рускага геаграфічнага таварыства. У ёй было надрукавана больш за сотню беларускіх песень і прыказак, слоўнік беларускай мовы.

Вялікая цікавасць да гісторыі, этнаграфіі, археалогіі Бела-русі, якая выразна праявілася ў дарэформенны перыяд – сведчанне развіцця працэсу духоўнага адраджэння Беларусі. Аднак першая палова стагоддзя была звязана з развіццём не толькі гуманітарных, але і прыродазнаўчых навук. У Віленскім універсітэце працавалі ўраджэнцы Беларусі батанік і біёлаг С. Юндвіл, фізіёлаг М. Гамаліцкі. З Горы-Горацкім земляробчым інстытутам была звязана дзейнасць заснавальнікаў хімічнай навукі Беларусі К. Шмідта і І. Цютчава.

**Літаратура, музыка.** Для мастацкай культуры Беларусі дарэформеннага перыяду была характэрна змена ідэйна-мастацкіх накірункаў, суіснаванне розных мастацкіх стыляў. Ва ўсведамленні дзеячаў культуры адбываўся паступовы адыход ад эстэтыкі класіцызму, які ляжаў у аснове асветніцкай ідэалогіі, калі матывамі дзеянняў героя былі перш за ўсё грамадзянскі абавязак і служэнне грамадству. З цягам часу ўзрастае ўвага да чалавека, яго ўнутранага свету. Пачуццё, а не абавязак выступае пабуджальнай крыніцай яго ўчынкаў. На змену класіцызму прыходзіць рамантызм. На Беларусі ён зарадзіўся ў пачатку XIX ст. Сутнасцю рамантызму было імкненне супрацьпаставіць рэльнай рэчаіснасці абагулены ідэальны вобраз.

Асаблівасцю рамантызму мастакоў Беларусі быў інтарэс да мясцовай гісторыі. Гэта цікавасць шмат у чым была звязана з гісторыяй Вялікага княства Літоўскага. Да гістарычнай тэматыкі звярталіся многія пісьменнікі, паэты. Гісторыя была прадметам роздуму А. Міцкевіча. Яго гворы, напісаныя на польскай мове,

лічацца культурным скарбам Беларусі. У сваіх ранніх творах "Мешка, князь Навагрудка", "Бульба", а таксама ў паэмах "Дзяды", "Пан Тадэвуш", "Гражына" А. Міцкевіч выкарыстоўваў тэмы і вобразы беларускага фальклору, сюжэты беларускай гісторыі. Блізкімі па настрою, думках да А. Міцкевіча былі У. Сыракомля, Я. Чачот. Асобнае месца ў плеядзе рамантыкаў Беларусі належыць Я. Баршчэўскаму. Яго празаічны зборнік "Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях" прадстаўляе сабой, па водгуках сучаснікаў, беларускі цыкл "1000 і адной ночы".

У 40-я гады ў культуры Беларусі ярка праявіўся пераход ад рамантызму да рэалізму. Важнай вехай на гэтым шляху была творчасць В. Дуніна-Марцінкевіча. Першым творам пісьменніка сталі лібрэта аперэт "Рэкруцкі яўрэйскі набор", "Спаборніцтва музыкаў", "Чароўная вада", якія напісаны на польскай мове і пастаўлены на мінскай сцэне. У 1846 г. уба-чыла свет музычная п'еса В. Дуніна-Марцінкевіча "Сялянка" ("Ідылія"), у якой упермиыню загучала жывая беларуская мова. У 50-я гг. пісьменнік стварае вершаваныя апавяданні "Вечарніцы" і “Гапон", "Халімон на каранацыі", займаецца перакладамі. На пачатку 60-х гадоў ён стварае свой лепшы твор – фарс-вадэвіль "Пінская шляхта".

У дарэформенны перыяд усё большую ролю ў грамадска-культурным жыцці Беларусі адыгрывае тэатр. Асноўнай формай тэатральнай дзейнасці ў гэты час з'яўляецца прыватная антрэпрыза. Як нравіла, такі тэатр меў базу ў губернскім або буйным павятовым горадзе і перыядычна вандраваў па навакольных гарадах, мястэчках, маёнтках і кірмашах. Пастаянныя тэатральныя калектывы дзейнічалі ў Вільні (трупа Мараўскага), Гродне (тэатр Саламеі Дзешнер), Мінску (трупа Кажынскага). У выніку рэфармавання тэатральнай дзейнасці ў 1845-1847 гг. у губернскіх гарадах ствараліся пастаянныя тэатры, вызначаўся тэатральны сезон. Тым не менш дзейнасць "аб'язных" груп пасля гэтага не спынілася. Яны існавалі і ў больш позні час. Адлюстроўваючы моўную сітуацыю ў краі, рэпертуар тэатра быў двухмоўным – польскім і рускім. На сцэне ставіліся п’есы польскіх, рускіх і заходнееўрапейскіх аўтараў. Разам з прафесійным тэатрам развіваўся аматарскі, які быў вельмі папулярны сярод шляхецтва. чыноўнікаў і афіцэраў. Падзеяй у тэатральным жыцці Беларусі стала ўзнікненне першай трупы беларускага нацыянальнага тэатра В. Дуніна-Марцінкевіча. 23 верасня 1841 г. адбылася прэм'ера спек-такля – камічнай оперы "Рэкруцкі яўрэйскі набор", лібрэта да якога напісаў В. Дунін-Марцінкевіч, а музыку – С. Манюшка і К. Кжыжаноўскі. 9 лютага 1852 г. адбылася прэм’ера "Ідыліі" на музыку

тых самых аўтараў. П’есы гэтага таленавітага драматурга, рэжысёра і акцёра неаднаразова ставіліся на прыватных кватэрах не толькі Мінска, але і ў іншых гарадах Беларусі.

У грамадстве ўзмацнялася цікавасць да камерных і публічных канцэртаў. Музыка гучала ў салонах мясцовай магнатэрыі, яе выкладалі ў навучальных установах, адбываліся сольныя выступленні, аркестровыя канцэрты, праходзілі музычныя спектаклі. На Беларусі была добра вядома музыка заходнееўрапейскіх і рускіх кампазітараў. Папулярнасцю карысталіся таксама кампазіцыі мясцовых музыкантаў. Першая палова XIX ст. – пачатак збору і публікацый беларускай народнай песні, спробы яе кампазітарскай і канцэртнай апрацоўкі. Вялікую цікавасць у сувязі з гэтым уяўляюць апрацоўкі народных песень і заснаваныя на іх фартэпіянныя п'есы ўраджэнца Віцебшчыны А. Абрамовіча, асабліва паэма "Беларускае вяселле". Шырокую вядомасць атрымалі творы М. Агінскага, Д. Стэфановіча, Ф. Міладоўскага і іншых таленавітых музыкантаў і выканаўцаў.

Глыбокі след у беларускай музычнай культуры пакінуў класік польскай музычнай культуры, ураджэнец Ігуменскага павета Мінскай губерні С. Манюшка. Беларускія народныя песні і мелодыі арганічна ўвайшлі ў творы кампазітара. Музычную адукацыю С. Манюшка атрымаў у Мінску ў таленавітага музыканта і настаўніка Д. Стэфановіча. З Мінскам звязана стварэнне і пастаноўка яго першых вадэвіляў, музычных камедый і опер. Асабліва плённым аказалася творчае сяброўства кампазітара з В. Дуніным-Марцінкевічам. На лібрэта апошняга былі напісаны оперы "Спаборніцтва музыкаў", "Чарадзейная вада", "Сялянка" ("Ідылія").

**Архітэктура, жывапіс.** У канцы XVIII ст. стыль барока змяніўся класіцызмам. Для яго развіцця на Беларусі характэрна аб'яднанне заходнееўрапейскага, рускага накірункаў з мясцовымі мастацкімі традыцыямі. Важную ролю ў фарміраванні архітэктурнага выгляду беларускіх гарадоў адыграла Віленская архітэктурная школа (М. Шульц, К. Падчашынскі, Л. Стуока-Гуцявічус), творчасць вядомых рускіх архітэктараў М. Львова, В. Стасава, А. Мельнікава, а таксама англічаніна Дж. Кларка. Гэта быў час рэгулярнай тыпавой забудовы гарадоў і мястэчак Беларусі. У адрозненне ад сярэдневяковай хаатычнай забудовы, горад разглядаўся як цэласная, строга спланаваная сістэма, заснаваная на прынцыпах рацыяналізму і класічных ідэалаў. Як правіла, гарадам надавалася форма прамавугольнікаў або шматвугольнікаў: У старых гарадах Беларусі – Мінску, Віцебску, Полацку і іншых вялося ўпарадкаванне вулічнай сеткі, узбуйняліся кварталы, ствараліся новыя плошчы. У гэтых гарадах праекцыйны цэнтр

звычайна сумяшчаўся з гістарычна ўсталяваным ансамблем горада. Архітэктура цэнтра вызначалася як новай забудовай, так і манументальнай архітэктурай, характэрнай для таго перыяду: галоўным чынам манастырамі, касцёламі, калегіумамі. Гэта прыдавала цэнтрам беларускіх гарадоў пэўную адметнасць.

Асаблівасцю горадабудаўніцтва гэтага часу было развіццё ансамблевай забудовы, узвядзенне будынкаў спецыяльнага дзяржаўнага і грамадскага прызначэння (адміністрацыйныя, навучальныя, бальніцы). У кожным губернскім горадзе на цэнтральнай плошчы, акрамя сабораў, узводзіліся дзяржаўныя ўстановы і гандлёвыя рады, якія сталі прадметам новага грамадска-палітычнага і эканамічнага жыцця. Тут узнікалі школы, музеі, бібліятэкі. Прынцыпы прамавугольнай планіроўкі найбольш паслядоўна здзейснены ў Клімавічах, Суражы, Мсціслаўлі, Чавусах.

У дварцова-сядзібным будаўніцтве Беларусі класіцызм абумовіў геаметрычнасць планіроўкі тэрыторыі. З’явіўся новы тып палаца – цэнтрычная кампактная забудова з купалам (Грудзінская сядзіба ў Быхаўскім раёне), у кампазіцыі якой часта будаваліся галерэі-каланады, размешчаныя паўкругам або франтальна. Галоўным кампазіцыйным акцэнтам прысядзібнага дома з'яўляўся манументальны порцік. Сярод выдатных помнікаў гэтага тыпу патрэбна назваць палац графа М. Румянцава (з 30-х гадоў ён перайшоў да фельдмаршала І. Паскевіча ў Гомелі), Крычаўскі і Жыліцкі ў Кіраўскім раёне, палацавы комплекс у Снове ў Нясвіжскім раёне, палацы генерал-губернатара ў Віцебску і віцэ-губернатара ў Гродне. Да выдатных помнікаў гэтага архітэктурнага накірунку адносяцца культавыя забудовы: Петрапаўлаўскі сабор у Гомелі, Праабражэнская царква ў Чачэрску, Пакроўская царква ў Стрэшневе, касцёлы ў Лідзе і Шчучыне.

Аднак класіцызм быў не адзіным архітэктурным накірункам дарэформеннага перыяду. Побач з ім развіваецца неаготыка - архітэктурны аналаг эпохі сентыменталізму і рамантызму, які ахапіў усе сферы культуры Заходняй Еўропы і Расіі яшчэ ў канцы XVIII ст.

Захапленне сярэдневяковым гатычным стылем на Беларусі пачынаецца на рубяжы стагоддзяў. Неаготыка да 30-40-х гг. Суіснавала побач з класіцызмам. Яе элементы часцей за ўсё выкарыстоўваліся ў дэкаратыўных рашэннях пабудоўкі фасадаў гарадскога будаўніцтва. Больш шырокае прымяненне неаготыка знайшла ў культавых збудаваннях і "англійскім" пейзажна-паркавым мастацтве, загарадных прысядзібных комплексах.

Сярод стылёвай разнастайнасці помнікаў архітэктуры выдзяляецца шматлікая група збудаванняў, у мастацка-вобразнай трактоўцы якіх адчуваецца ўплыў старажытнарускай архітэктурнай культуры. Пачаткам развіцця "руска-візантыйскага стылю" з'яўляюцца 30-я гады. На Беларусі асноўнай сферай яго прымянення было царкоўнае будаўніцтва. Развіццё гэтага стылю адбывалася ў двух накірунках: перабудова існуючых каталіцкіх і уніяцкіх храмаў (Заслаўскі фарны касцёл, Ізабэлінская Міхайлаўская царква) і ўзвядзенне цэркваў па санкцыяніраваных Сінодам, а таксама прыватных праектах. Найбольшага росквіту стыль дасягнуў у другой палове XIX - пачатку XX ст.

Развіццё класіцызму і рэалізму ў выяўленчым мастацтве першай паловы XIX ст. азначала сур'ёзныя змены ў жывапісе Беларусі. У 30-40-я гг. ідэйныя каноны акадэмізму, заснаваныя на іерархічных каштоўнасцях жанраў, усё больш старэлі. Захоўваўся прыярытэт гістарычнага жывапісу; бытавы жанр як паўнапраўны яшчэ не прызнаваўся. Ідэйна-мастацкія ўстаноўкі акадэмізму ўступалі ў супярэчнасць з патрабаваннямі жыцця і грамадскімі задачамі мастацтва.

Важную ролю ў развіцці жывапісу ў гэты перыяд адыграла Віленская школа жывапісу - адцзяленне выяўленчага мастацтва факультэта літаратуры і мастацтва Віленскага універсітэта. Заснавальнікам школы быў прафесар Ф. Смуглевіч, які ўвайшоў у гісторыю жывапісу як майстар вялікіх шматфігурных кампазіцый на гістарычныя і рэлігійныя тэмы, пейзажыст і бытапісец. Яго вучні – таленавіты майстар жанравага партрэта Я. Рустэм і скульптар К. Ельскі. За чвэрць стагоддзя свайго існавання школа надрыхтавала больш 250 мастакоў, гравёраў, скульптараў і выкладчыкаў малявання для навучальных устаноў Беларусі. Аднак школа не магла поўнасцю вырашыць праблему прафесійнага навучання, бо давала толькі сярэднюю адукацыю. Для ўдасканалення ведаў і атрымання вышэйшай адукацыі найбольш таленавітыя студэнты накіроўваліся ў Пецярбургскую акадэмію мастацтваў або ў Маскоўскае вучылішча жывапісу, скульптуры і дойлідства (Строганаўскае вучылішча). Значнае месца ў падрыхтоўцы прафесійных мастакоў належала Полацкай езуіцкай акадэміі.

Найбольш распаўсюджанымі жанрамі жывапісу былі гістарычны жанр і партрэт. У 30-40-я гг. раснаўсюджванне атрымлівае пейзаж і бытавы жанр. Як і ва ўсім выяўленчым мастацтве, у жывапісе можна адзначыць два накірункі развіцця. Першы звязаны з Віленскай школай жывапісу (Ф. Смуглевіч) і

Пецярбургскай школай жывапісу, якой былі ўласцівы традыцыі класіцызму. Другая лінія была звязана з імёнамі В. Баравікоўскага і Кіпрэнскага, якія былі схільны да рамантызму і сентыменталізму.

Буйным майстрам партрэтнага жанру на Беларусі быў член Імператарскай акадэміі мастацтваў І. Аляшкевіч (1777-1830). Пэндзлю мастака належаць партрэты вядомых палітыкаў і дзеячаў: А. Чартарыйскага, Л. Сапегі, М. Радзівіла, А. Міцкевіча і інш. У апошнія гады жыцця І. Аляшкевіч пісаў шмат рэлігійных кампазіцый, якія адрозніваліся добрымі каларытнымі спалучэннямі (напрыклад, "Мадона з дзіцяцем"). Не менш цікавым партрэтыстам быў Ю. Пешка (1767-1831). Ён пісаў партрэты прадстаўнікоў віленскай шляхты і духавенства. Сярод іх найбольш вядомыя партрэты віленскага саветніка Вейса, партрэт С. Солтана, які ўзначальваў урад Вялікага княства Літоўскага ў перыяд напалеонаўскага нашэсця, і партрэт вядомай апякункі мастацтваў Тэафілы Радзівіл.

Яркім прадстаўніком адзначанай плеяды быў В. Ваньковіч (1799-1842). Сярод вялікай і разнастайнай спадчыны мастака ёсць шмат партрэтаў дзеячаў літаратуры і мастацтва, навукі. Лепшымі сярод іх з'яўляюцца кампазіцыйны партрэт "Міцкевіч па скале Аю-Даг", партрэты А. Тавяньkoўскага і яго жонкі Караліны, піяністкі М. Шымаўскай, паэта А. Гарэцкага. Радавы маёнтак В. Ваньковіча ў Сляпянцы пад Мінскам становіцца цэнтрам, які групаваў вакол сябе лепшыя мастацкія сілы. Тут бывалі Я. Дамель, М. Кулеша і іншыя мастакі, скульптары, кампазітары.

Развіццё гістарычнага жанру ў жывапісе Беларусі шмат чым вызначалася захаваннем сярод мастакоў палітычных поглядаў, якія былі звязаны з аднаўленнем Рэчы Паспалітай. Невыпадкова многія бралі для сваіх гістарычных кампазіцый сюжэты з польскай гісторыі. Аднак мясцовыя мастакі намагаліся адлюстроўваць тыя моманты, якія былі непасрэдна звязаны з гісторыяй роднага краю. Вядомым гістарычным жывапісцам гэтага часу быў Я. Дамель (1789-1840). На сваіх палотнах ён адлюстроўваў найбольш драматычныя моманты гістарычнага развіцця. Гэта карціны "Смерць князя Панятоўскага", 'Гібель прадвадзіцеля крыжаносцаў Ульрыха ў Грунвальдскай бітве", "Павел I вызваляе Касцюшку з няволі" і інш. Вядомасць атрымала карціна "Пераход Напалеона праз Беразіну". Акрамя гістарычных палотнаў для творчасці Я. Дамеля характэрны шматлікія рэлігійныя кампазіцыі, а таксама партрэты, якія адрозніваюцца глыбокім псіхалагізмам.

Мастаком, у творчасці якога ўдала спалучаліся якасці гістарычнага жывапісца і мастака-этнографа, быў М. Кулеша (1800-

1863). Пра майстэрства мастака можна меркаваць па такіх яго гістарычных кампазіцыях як "Гусары", "Гетман". Прыхільнікам гістарычнай тэматыкі М. Кулеша заставаўся і ў сваіх эпічных псйзажах і шматлікіх літаграфіях. Значнае месца гістарычны жанр займаў у работах мастакоў Я. Траяноўскага і Я. Сухадольскага.

У гэтым жанры выступалі не толькі мастакі-пейзажысты, але і майстры іншых жанраў. Вялікі ўклад у бсларускі пейзажны жывапіс унеслі мастакі В. Садоўнікаў, І. Гсрасімовіч, В. Дмахоўскі. Крыху ў баку ад агульнага развіцця пейзажнага жывапісу стаіць творчасць мастака-этнографа і гісторыка Напалеона Орды (1807-1883). Усё сваё жыццё мастак прысвяціў адлюстраванню цікавых мясцін Беларусі, Літвы і Ук-раіны, звязаных з вялікімі гістарычнымі падзеямі, а таксама з выдатнымі асобамі, якія тут нарадзіліся. Н. Орда ў асноўным працаваў як акварэліст. Яго эмацыянальна насычаныя і паэтычныя акварэлі ("Разваліны замка ў Лідзе", "Крэва", "Мір" "Нясвіж", "Белая вежа" і інш.) надзвычайна дакладна перадаюць прыгажосць псйзажу і гістарычных помнікаў Бсларусі.

Яркім прадстаўніком бсларускага жывапісу быў І. Т. Хрукі(1810 1885). Гэты мастак увайшоў у сусветны жывапіс як заснавальнік класічнага нацюрморта. У 1839 г. за нацюрморт "Кветкі і плады" ён атрымаў званне акадэміка. Аднак не менш скрава мастак праявіў сябе ў жанры партрэта і пейзажа.

У творчасці жывапісцаў першай паловы XIX ст. даволі інтэнсіўна развіваўся бытавы жанр. Мастакі стварылі шмат яркіх жывапісных палотнаў, дзе паказана багацце матэрыяльнай і духоўнай культуры беларускага народа. Першымі ў гэтым жанры сталі выхавальнікі Віленскай школы жывапісу К. Кукевіч, Ю. Карчэўскі, К. Русецкі і інш. Нягледзячы на ўплыў класіцызму, у творчасці прадстаўнікоў бытавога жанру ўсё больш зацвярджаецца рэалістычны элемент.

Некаторыя мастакі – ураджэнцы Беларусі – увайшлі ў гісторыю рускага рэалістычнага жывапісу. Сярод іх вядомыя партрэтысты С. Заранка (1818-1871) і К. Карсалін (1809-1871). Яны амаль усё сваё свядомае жыццё правялі за межамі Беларусі, але ніколі не парывалі сувязяў са сваёй радзімай.

Развіццё паліграфіі, масавыя тыражы друкаваных выданняў прадвызначылі развіццё беларускай графікі. Сярод майстроў гэтага віду мастацтва найбольш вядомымі з'яўляюцца М. Падалінскі, Ю. Главацкі, Ю. Азямблоўскі, Б. Клямбоўскі. Творчасці беларускіх графікаў уласціва ярка выражаная сацыяльная накіраванасць. Так, літаграфія ўраджэнца Мінска Ю. Азямблоўскага "Славянскі нявольнік" ("Беларускі раб") сваім сюжэтам прыцягнула ўвагу А. Міцкевіча і

дэманстравалася ім падчас чытанняў лекцый па славянскіх лігаратурах у Парыжы. Публіцыстычнасць сюжэта літаі рафіі прыцягнула ўвагу А. Герцэна, які высока ацаніў работу беларускага графіка.

Жывапіс Беларусі першай паловы XIX ст. багаты і разнастанны. Яго станаўленне і развіццё адбывалася ў агульным накірунку развіцця рускага, польскага, літоўскага і ўкраінскага жывапісу.

Адной з формаў выяўленчага мастацтва была скульыітура. Сярод скульптараў таго часу найбольшую вядомасць набылі Ельскія (бацька Караль і два яго сыны—Ян і Казімір), Астароўскі, Р. Слізень і інш. Іх творчасць была разнастай у жанравых адносінах. Гэта партрэты-бюсты, медальёны арэльефы гістарычных дзеячаў, родных, знаёмых. Асабліваe месца ў іх творчасці займала касцёльная скульптура якая захавалася і па сённяшні дзень.

У сярэдзіне XIX ст. завяршыўся адзін з этапаў у гісторыі беларускай культуры. Пад уплывам польскай і рускай культуры ішоў працэс фарміравання і развіцця нацыянальнай культуры. Перш за ўсё ён вызначыўся ў станаўленні сучаснай беларускай мовы, новай беларускай літаратуры, асэнсаванні гістарычнага шляху.

Разам з тым у грамадска-культурным жыцці народа Беларусі выразна праявілася неадпаведнасць паміж дасягнутым узроўнем духоўнай культуры і аваладаннем культурнымі грамадскімі каштоўнасцямі. Магчымасці распаўсюджвання асветы, народнай адукацыі былі абмежаваны. Феадальны строй уступаў у супярэчнасць не толькі з сацыяльна-эканамічным, але і з грамадска-культурным прагрэсам.

## ТЭМА II.

## СТАНАЎЛЕННЕ БУРЖУАЗНАГА ГРАМАДСТВА

**Гістарыяграфія, крыніцы.** Перыяд 60-90-х гг. XIX ст. у і гісторыі Беларусі аб'ядноўвае шэраг самастойных у гістарыяграфічным плане пытанняў: адмена прыгоннага права і шляхі капіталістычнай эвалюцыі сельскай гаспадаркі; рост гарадоў, развіццё прамысловасці і гандлю; сацыяльны рух; фарміраванне беларускай нацыі і развіццё культуры; палітыка царызму і г.д. Першыя публікацыі, прысвечаныя аналізу гэтых пытанняў, з'явіліся яшчэ да 1917 г. Спецыфічнай рысай тагачасных публікацый было тое, што іх аўтары часта з'яўляліся сведкамі гістарычных падзей і працэсаў, якія яны апісвалі. Іх работы вызначаліся эмпірызмам, багаццем цікавых назіранняў, статыстычных звестак. Сярод іх, у залежнасці ад манеры структурызацыі і характару змешчаных матэрыялаў, сустракаюцца гістарычныя нарысы з элементамі мемуарыстыкі, падрабязныя статыстыка-эканамічныя даследаванні, падмацаваныя вялізнымі дадаткамі ў выглядзе табліц, этнаграфічныя і фальклорныя агляды і г. д. Тагачасная гістарыяграфія развівалася ў трох аспектах: афіцыйна-ахоўніцкім, ліберальна-дэмакратычным і народніцкім.

З пункту гледжання афіцыйных колаў былі адлюстраваны гістарычныя падзеі 1863 г. на Беларусі, а таксама грамадска-палітычнае жыццё пасля разгрому паўстання пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага ў публікацыях П. Бранцава, М. Каткова, Г. Карнілава, М. Каяловіча, В. Ратча і інш. Імклівыя з'явы аб'ектыўнай рэальнасці, класавыя супярэчнасці канца XIX-пачатку XX стст. знайшлі свой адбітак з адпаведных пазіцый У публікацыях чарнасоценца Л. Саланевіча, ліберала А. **С**апунова, прадстаўнікоў беларускай нацыянальнай думкі Антона і Івана Луцкевічаў, К. Каганца, С. Палуяна і іншых.

Бурны рост прамысловасці, саматужных промыслаў, пашырэнне гандлю, становішча рабочых, эвалюцыя аграрнага пытання і сельскагаспадарчай вытворчасці ў Беларусі 60-90-х гг. XIX ст. адлюстраваны ў багатых звесткамі выданнях, даследаваннях І. Вульферта, А. Дэмбавецкага, П. Баброўскага, В. Сямёнава і іншых.

У 20-я гг. XX ст. з'явіліся грунтоўныя працы М. Доўнар-Запольскага "Народное хозяйство Белоруссии 1861-1914 гг." (1926), А. Цвікевіча "Западно-руссизм": Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в." (1929). Грамадска-палітычны рух і яго вынікі не маглі заставацца па-за ўвагай даследчыкаў таго часу.

Былі надрукаваныя ў гэты час манаграфіі і артыкулы С. Агурскага, У. Пічэты, А. Смоліча, Ф. Турука і іншых.

Гістарыяграфія 30-50-х гг. XX ст. вызначылася празмернай ідэалагізацыяй рабочага і сялянскага руху, грамадска-культурнага жыцця. Не без ідэалагічных шаблонаў таго часу, але ўсё ж змястоўны матэрыял аб сацыяльна-эканамічным развіцці Беларусі ўтрымліваюць даследаванні Д. Дудкова, І. Саладкова, М. Фрыдман і іншых.

У 60-80-х гг. з'явіўся шэраг прац па пытаннях сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі (даследаванні М.В. Біча, М.Ф. Болбаса, К.І. Шабуні, В.П. Панюціча, Л.П. Ліпінскага, Х.Ю. Бейлькіна і іншых), развіцця грамадска-палітычнай і навуковай думкі (Г.В. Кісялёў, У.А. Васілевіч, У.М. Конан, В.Ф. Шалькевіч, Г.А. Каханоўскі, А.С. Майхровіч, С.Х. Александровіч і інш.), эвалюцыі і формаў рабочага, сялянскага, рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызвален-чага рухаў, палітыкі царызму на Беларусі (С.М. Самбук, М.В. Біч і іншыя), гісторыі культуры Беларусі (Л.М. Дробаў, А. А. Лойка, А.І. Мальдзіс і іншыя). Каштоўным здабыткам для вывучэння гісторыі Беларусі стала выданне калектыўных абагульняючых прац: "История рабочего класса Белорусской ССР" (Мн., 1984. Т. 1), "Гісторыя Беларускай ССР" ( Мн., 1972. Т. 2), "Гісторыя беларускага мастацтва" (Мн., 1989. Т. 3) і г. д.

Па-за ўвагай даследчыкаў у гэты час засталіся пытанні гісторыі дваранства, буржуазіі, інтэлігенцыі, комплекснага асэнсавання развіцця беларускага нацыянальнага руху і яго ідэалогіі, фарміравання беларускай нацыі, палітыка царызму у Беларусі ў сацыяльна-культурнай і нацыянальнай сферах, грамадска-палітычнага становішча і г. д.

90-я гады вызначаліся цікавасцю даследчыкаў да пытанняў перш за ўсё палітычнай і этнакультурнай гісторыі Беларусі. З'явіліся ў друку цікавыя працы М.В. Біча, В.П. Панюціча, Г.В. Кісялёва, П.І. Брыгадзіна, З.В. Шыбекі і інш. Выдадзены "Нарысы гісторыі Беларусі" (Мн., 1994.Ч .1; Мн.,1995. Ч. 2).

Крыніцы па гісторыі Беларусі 60-х гг. XIX – пачатку XX стст. шматлікія. У значнай ступені яны апрацаваны і апублікаваны асабліва статыстыка і заканадаўчыя акты. Але большасць дакументаў знаходзіцца ў архівасховішчах і рукапісных аддзелах бібліятэк Мінска, Гродна, Вільнюса, Масквы, Санкт-Пецярбурга, Варшавы, Кракава і інш. Узнікае праблема іх выяўлення і выкарыстання. Як архіўныя, так і апублікаваныя крыніцы адрозніваюцца па свайму паходжанню і ступені сваёй рэпрэзентатыўнасці. Часта гістарычныя крыніцы не супастаўімыя паміж сабой з-за адрозненняў па свайму паходжанню, тэхніцы і праграме збору звестак. Па прычыне

існуючага разрыву паміж задачамі, якія стаялі перад складальнікам дакумента, і навуковымі мэтамі даследчыкаў, нярэдка паўстае праблема выяўлення падтэкставай, скрытай інфармацыі.

Аснову для характарыстыкі сацыяльна-эканамічных, дэмаграфічных і культурных працэсаў складаюць масавыя статыстычныя дадзеныя. Цікавыя звесткі па гісторыі Беларусі даносяць апублікаваныя матэрыялы пазямельных абследаванняў 1877, 1887, 1905 гг., ваенна-конскіх перапісаў, статыстыкі землеўладання, дадзеныя паказальнікаў і спісаў фабрык і заводаў, штогадовых справаздач губернатараў і дадаткаў да іх, аглядаў навучальных устаноў, "Адресов-календарей ..." і г. д. Каштоўнымі з'яўляюцца апублікаваныя вынікі Усеагульнага перапісу насельніцтва 1897 г. Яны дазваляюць адносна аб'ектыўна характарызаваць сацыяльна-дэмаграфічную, прафесійную і саслоўную структуры насельніцтва, дапамагаюць прааналізаваць вынікі нацыянальнай палітыкі царызму, эвалюцыю сацыяльна-эканамічных працэсаў на Беларусі ў канцы XIX ст.

Значную частку дакументаў складаюць заканадаўчыя акты, распараджэнні ўрадавых органаў, а таксама матэрыялы справаводства міністэрстваў, Сінода, губернатарскіх канцылярый, павятовых органаў. Яны дазваляюць характарызаваць палітыку царызму на Беларусі. тагачаснае грамадскае і культурнае жыццё, некаторыя працэсы ў развіцці эканомікі.

У другой палове XIX - пачатку XX стст. узрастае роля перыядычнага друку. Перыядычныя выданні істотна адрозніваліся паміж сабой па ідэйна-мастацкаму накірунку. У Мінску, Гродне, Віцебску, Магілёве, Вільні выдаваліся "Губернские ведомости" з афіцыйнай інфармацыяй губерняў, "Памятные кннжки...", "Епархиальные ведомости" і г. д. Вялікі ўплыў на грамадскую думку аказвала газета "Минский листок", якая хутка адклікалася на розныя праявы жыцця. У пачатку XX ст. павялічылася колькасць дзяржаўных і прыватных перыядычных выданняў, у тым ліку з'явіўся беларускамоўны легальны друк, матэрыялы якога дазваляюць узнавіць многія старонкі гісторыі нацыянальна-вызваленчага руху, жыцця рабочых і сялян.

Да нядаўняга часу мала выкарыстоўвалася даследчыкамі беларуская мемуарыстыка. Багатыя звесткі ўспамінаў, а таксама эпісталярная спадчына дазваляюць раскрыць падтэкст гістарычных з'яў і працэсаў. Частка мемуараў апублікавана. Гэта ўспаміны віленскага генерал-губернатара М. Мураўёва, нацыяльна-культурных дзеячаў А. Луцкевіча, Я. Дылы, А. Багдановіча і інш.

Звесткі аб палітычных працэсах і падзеях, сацыяльных канфліктах, вызваленчым руху на тэрыторыI Беларусі ўтрымліваюць

дакументы палітычных партый, нелегальных арганізацый. Гэтыя матэрыялы ў большасці яшчэ не апрацаваныя і захоўваюцца ў архівах. Наогул гістарычныя крыніцы па беларускай гісторыі другой паловы XIX – пачатку XX стст. разнапланавыя і багатыя, што дазваляе гісторыкам праводзіць маштабныя даследаванні.

ЛЕКЦЫЯ 5

# БУРЖУАЗНЫЯ РЭФОРМЫ

• *Аграрная рэформа 1861-1863 гг.*
• *Рэформы грамадскага ладу 1864* г.

**Аграрная рэформа 1861-1863 гг. У XIX** ст. у дзяржаўна-палітычным ладзе краін Заходняй Еўропы адбыліся значныя змены. Перамога капіталізму над феадалізмам у эканамічнай сферы выклікала неабходнасць стварэння адпаведнай палітычнай сістэмы буржуазнага грамадства. На змену феадальна-абсалютысцкай манархіі прыйшлі новыя формы дзяржаўнага ўтварэння – канстытуцыйныя манархіі, буржуазна-парламенцкія рэспублікі.

У адрозненне ад заходніх краін дзяржаўна-палітычны лад Расіі ў сярэдзіне XIX ст. заставаўся некранутым буржуазнымі пераўтварэннямі. Тут панавалі абсалютызм і прыгоннае права. Сведчаннем крызісу дзяржавы стала Крымская вайна (1853-1856). Расія не здолела супрацьстаяць краінам Заходняй Еўропы і пацярпела паражэнне. Стала відавочна, што прыгонніцкая сістэма значна прайграе капіталістычнай з яе таварна-грашовымі адносінамі, рынкам працы і жорсткай канкурэнцыяй, якія падштурхоўваюць тэхнічнае развіццё, вядуць да інтэнсіфікацыі вытворчасці. Між тым аб'ектыўныя патрэбы эканамічнага і палітычнага развіцця грамадства прымусілі расійскія ўлады пачаць распрацоўку і правядзенне неабходных рэформаў "зверху".

Беларусь сярэдзіны XIX ст. уяўляла сабой аграрны рэгіён. Сельская гаспадарка вызначала яго эканамічнае аблічча. Асноўную масу насельніцтва (каля 72,3%) складалі сяляне, якія падзяляліся на тры катэгорыі: прыватнаўласніцкія, дзяржаўныя і вольныя. Акрамя гэтага на Беларусі меліся нязначныя групы сялян удзельных (належалі царскай сям'і), паезуіцкіх, ленных, царкоўных і манастырскіх.

Нягледзячы на прыгоннае права, умовы эканамічнага развіцця непазбежна ўцягвалі Беларусь на шлях капіталізму. Аднак гэтаму супраціўлялася дваранства, якое трымалася за свае саслоўныя правы і прывілеі. Каб павялічыць даходнасць сваіх маёнткаў, памешчыкі пашыралі асабістыя надзелы і пераводзілі сялян з аброку на паншчыну (у 50-я гады на ёй было звыш 90% сялян). Працэс абеззямельвання сялянства пашыраўся.

Урад Аляксандра II, які разумеў неабходнасць адмены прыгоннага права, у студзені 1857 г. зрабіў першы практычны крок

да ажыццяўлення сялянскай рэформы. Пад кіраўніцтвам імператара "для абмеркавання мер па ўладкаванню быту памешчыцкіх сялян" быў створаны Сакрэтны камітэт.

Памешчыкі Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай губерняў праз генерал-губернатара У. Назімава выступілі з ініцыятывай вызвалення сялян. Прадугледжвалася, што сяляне бясплатна атрымаюць толькі асабістую свабоду, а ўся зямля і нерухомая маёмасць застануцца ва ўласнасці памешчыка. У адказ 20 лістапада 1857 г. Аляксандр II накіраваў рэскрыпт на імя У. Назімава, у якім абвяшчаўся пачатак падрыхтоўкі сялянскай рэформы. Абавязковай умовай яе правядзення было прадастаўленне сялянам, акрамя сядзібнага, таксама і палявога надзелу. Самадзяржаўная ўлада аказалася больш дальнабачнай, чым памешчыкі заходніх губерняў. Для падрыхтоўкі праекта рэформы былі створаны губернскія дваранскія камітэты.

У лютым 1858 г. Сакрэтны камітэт быў перайменаваны ў Галоўны камітэт па сялянскай справе. Цяпер гэта была публічная, заканадаўча аформленая ўстанова. Губернскім камітэтам даручалася распрацаваць праекты палажэнняў "Аб паляпшэнні быту памешчыцкіх сялян" і падаць іх у Галоўны камітэт. Большасць памешчыкаў заходніх губерняў па-ранейшаму выказвалася за беззямельнае вызваленне сялян, заператварэнне іх у вечных арандатараў, прывязаных да памешчыцкіх маёнткаў.

Прапановы землеўладальнікаў былі адхілены Рэдакцыйнай камісіяй, створанай у сакавіку 1859 г. пры Галоўным камітэце. Пазіцыя мясцовых памешчыкаў выклікала абурэнне з боку прагрэсіўных колаў беларускага грамадства. Настрой гэтай часткі насельніцтва Беларусі перадае У. Сыракомля у вершы, надрукаваным у 1858 г.:

Но вот вопрос решён ... о бедный край родной!
Отцы уездов честь отчизны помрачили,
И цепи рабства вновь, под фирмою иной,
На шее навсегда крестьянской закрепили!
Позорной памяти, над бедным мужичком
Проект своей опеки подписали...
И стыд за Вильню мне, печати стыд с гербом,
Стыжусь, чтобы меня литвином называли!
*(Русская старина. Ноябрь. 1884. С. 20)*

19 лютага 1861 г. Аляксандр II падпісаў ухваленыя Дзяржаўным саветам заканадаўчыя акты ("Палажэнні аб сялянах, якія выйшлі з-

пад прыгоннай залежнасці") і адначасова Маніфест аб адмене прыгоннага права. Гэтыя дакументы былі апублікаваны 5 сакавіка 1861 г.

У адпаведнасці з "Палажэннямі" памешчыкі пазбаўляліся права распараджацца асобай селяніна і прадаваць, дарыць, умешвацца ў сямейныя справы. Сяляне атрымлівалі права набываць на сваё імя нерухомую маёмасць, займацца гандлёва-прамысловай дзейнасцю. Аднак памешчык па-ранейшаму заставаўся ўласнікам усёй зямлі. Хоць сялянам і даваўся ў карыстанне пэўны надзел зямлі, аднак да яго выкупу (не раней чым праз 9 гадоў) яны не з'яўляліся ўласнікамі гэтай зямлі.

Да заключэння выкупной аперацыі селянін знаходзіўся ў стане часоваабавязанага і выконваў на карысць памешчыка вызначаныя павіннасці ў выглядзе паншчыны або аброку. Пазямельныя адносіны паміж памешчыкамі і часоваабавязанымі рэгуляваліся ўстаўнымі граматамі, у якіх указваліся памеры палявога надзелу і павіннасці за яго. Для складання ўстаўных грамат і падпісання іх сялянамі і памешчыкамі быў назначаны двухгадовы тэрмін да 19 лютага 1863 г.

Землеўпарадкаванне беларускіх сялян праводзілася па двух Мясцовых палажэннях. У Магілёўскай губерні і васьмі беларускіх паветах Віцебскай землеўпарадкаванне сялян праводзілася па "Мясцоваму палажэнню для вялікарускіх, новарасійскіх і беларускіх губерняў". У беларускіх паветах, дзе панавала абшчыннае землекарыстанне, памеры зямельных надзелаў складалі: вышэйшы – ад 4 да 5,5 дзес., ніжэйшы – 1/3 ад вышэйшага. Згодна з устаўнымі граматамі сялянам адводзілася ў карыстанне тая колькасць зямлі, якую яны мелі да рэформы. Калі памер надзелу перавышаў вышэйшы, памешчык меў права адрэзаць "лішак" на сваю карысць. За карыстанне "поўным", г. зн. вышэйшым надзелам, сяляне павінны былі плаціць аброк (у сярэднім 8 рублёў у год), або адбываць паншчыну (40 мужчынскіх і 30 жаночых дзён у год). Акрамя гэтага сяляне павінны былі несці на карысць памешчыка і іншыя павіннасці (падводную, будаўнічую і інш.). Захаванне кругавой парукі сялянскай абшчыны гарантавала памешчыкам спраўнае выкананне ўстаноўленых павіннасцяў.

У Віленскай, Гродзенскай, Мінскай губернях і чатырох паветах Віцебскай губерні землеўпарадкаванне сялян праводзілася па асобнаму "Мясцоваму палажэнню", якое не ўстанаўлівала пэўныя нормы надзелаў. У пастаянным карыстанні сялян гэтых губерняў захаваліся прысядзібныя землі і ўгоддзі, якімі яны, згодна з інвентарамі, карысталіся да 1861 г. Калі ў селяніна было больш, чым

паказана ў інвентары, або ў памешчыка заставалася менш 1/3 часткі зручных зямель, то апошні меў права адрэзаць на сваю карысць да 1/6 часткі сялянскіх зямель. Памер павіннасцяў вызначаўся незалежна ад памеру надзелаў, але не павінен быў перавышаць інвентаріiую норму:паншчына не больш 23 дзён, аброк нс больш 3 руб. з дзесяціны ў год. За выкананне павіннасцяў сяляне паветаў неслі асабістую адказнасць перад памешчыкам, таму што надзел адводзіўся ў падворнае карыстанне кожнаму гаспадару.

Набыццё сялянамі зямлі ва ўласнасць ажыццяўлялася праз выкуп. Правілы выкупу палявога надзелу былі аднолькавыя для ўсіх губерняў Расіі. Памер выкупной сумы вызначаўся на аснове капіталізацыі 6% гадавога аброку. У гэту суму ўключаўся прыбытак ад прыгоннай працы, якога памешчык быў пазбаўлены ў сувязі з вызваленнем сялян. Напрыклад, калі часоваабавязаны селянін плаціў памешчыку аброк 30 рублёў у год, тады выкуiшая сума складала 500 рублёў (30 х 100 : 6 = 500). Такім чынам, выкуп зямлі сялянамі, па сутнасці, з'яўляўся выкупам асобы, яе аброчных навіннасцяў. Дзяржава для ажыццяўлення выкупной аперацыі давала сялянам доўгатэрміновую грашовую пазыку на 49 гадоў. Сяляне рабіліся даўжнікамі дзяржавы і павінны былі выплачваць ёй доўг высокімі працэнтамі – так званыя выкупныя плацяжы. Памер выкупу значна перавышаў фактычны кошт зямлі. Напрыклад, рыначны кошт зямлі ў Мінскай губерні складаў 18 рублёў за дзесяціну, а па выкупу селянін павінен быў заплаціць за яе 79 руб. 20 кап. Выкупныя плацяжы спыніліся перад першай расійскай рэвалюцыяй 1905-1907 гг., калі ўрад быў вымушаны датэрмінова адмяніць іх. За гэты час сяляне выплацілі ўраду ў тры разы больш, чым каштавала набытая імі зямля.

"Агульным палажэннем" вызначаўся парадак кіравання сялянамі. Сельская абшчына, што складалася з сялян, якія пражывалі на землях аднаго памешчыка, выбірала сельскага старасту і зборшчыка падаткаў. Некалькі сельскіх абшчын утваралі воласць. На валасным сходзе выбіралася праўленне на чале з валасным старшынёй, а таксама валасны суд. Сельскія і валасныя праўленні ведалі раскладам і зборам падаткаў, аб'яўлялі сялянам законы і распараджэнні цэнтральных і мясцовых уладаў, сачылі за грамадскім парадкам. Для пра-вядзенпя рэформы ў жыццё ствараліся спецыяльныя органы – павятовыя міравыя з'езды і міравыя пасрэднікі, губернскія па сялянскіх снравах прысутнасці.

Міравыя пасрэднікі прызначаліся губернатарамі з мясцовых памешчыкаў. Ім падпарадкоўвалася сялянскае кіраваннен некалькіх валасцей. Асноўным іх абавязкам было садзейнічаць складанню

актаў, якія вызначалі пазямельны лад і павіннасці сялян згодна з "Палажэннямі". Губернская па сялянскіх справах прысутнасць кіравала правядзеннем рэформы ў губернях, старшынёй яе быў губернатар, членамі – мясцовыя памешчыкі і чыноўнікі. Прадстаўнікоў ад сялян не было ў гэтых установах.

Умовы адмены прыгоннага права не былі прыняты беларускім сялянствам і наслужылі шгуршком для развіцця шырокага сялянскага руху. У 1861-1862 гг. беларускае сялянства аказвала сур'ёзнае супрацьдзеянне міравым пасрэднікам, што спрыяла стварэнню новых органаў сялянскага "самакіравання" і ўвядзенню ўстаўных грамат. Да лютага 1863 г., гэта значыць да канца вызначанага тэрміну іх стварэння, на Беларусі не было падпісана амаль 80% устаўных грамат. Кульмінацыйнай кропкай сялянскага руху было паўстанне пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага. Паўстанне было падаўлена, аднак яно аказала значны ўплыў на палітыку царызму ў адносінах да Беларусі. Царскі ўрад вымушаны быў пайсці на ўступкі сялянам.

1 сакавіка 1863 г. выйшаў указ аб адмене часоваабавязанага становішча сялян у Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губернях і 4 паветах Віцебскай губерні. Праз тры месяцы гэты ўказ быў распаўсюджаны на Магілёўскую губерню і беларускія паветы Віцебскай. Указ уводзіў абавязковы выкуп сялянскіх надзелаў. Часоваабавязаныя адносіны спыняліся паміж селянінам і памешчыкам з 1 мая 1863 і. Выкупныя плацяжы за надзельную зямлю знізіліся на 20%. Сяляне пераходзілі ў разрад сялян-уласнікаў і павінны былі ўносіць выкуппыя плацяжы ў павятовае казначэйства. Указам ад 9 красавіка 1863 г. ствараліся павсрачныя камісіі, якія павінны былі праверыць правільнасць складання ўстаўных грамат пасля 19 лютага. Няправільна складзеныя ануляваліся. У выпіку праверкі для часткі сялян былі навялічаны зямельныя падзелы, зніжаны аброк і адпаведпа выкупныя плацяжы, за сялянамі замацоўваліся сервітутныя ўгоддзі (пашы, лугі, сенажаці, ваданоі і г. д.), якімі яны карысталіся да рэформы 1861 г.

Урадавая адміністрацыя надавала вялікае значэнне землеўладкаванню беззямельных і малазямельных сялян. На падставе цыркуляра 17 жніўня 1863 і. сяляне, абеззямеленыя пасля 1857 г., павінны былі атрымаць поўнасцю свае надзелы. Змянілася землеўладкаванне дзяржаўных сялян Беларусі. Па закону да 16 мая аброчная подаць пераўтваралася ў выкупныя плацяжы, і дзяржаўныя сяляне станавіліся ўласнікамі зямельных надзелаў. Такім чынам, у выніку рэформы 1863 г. сялянству Беларусі вярнулі адрэзаныя ад іх раней землі, а таксама былі значна аблегчаны ўмовы выкупу зямлі. У

адрозненне ад унутраных губерняў Расійскай імперыі феадальныя адносіны на Беларусі былі ліквідаваны раней, у 1863 г., праз спыненне часоваабавязанага становішча сялян.

Настрой сялянства ў сувязі са змяненнем умоў і правядзеннем аграрнай рэформы добра адлюстроўвае выказванне аднаго селяніна: "Дзякуем Вам, паночку, і всяму панству, что Вы взбунтоваліся. Інакш бы нам такой ласкі от царя во век не дочакацця".

Рэформа 1861 г. з'явілася пераломным момантам, мяжой паміж дзвюма эпохамі ў гісторыі Беларусі – феадалізмам і капіталізмам. Асабістае вызваленне ліквідавала манаполію памешчыкаў на эксплуатацыю сялянскай працы, садзейнічала росту рынку працоўнай сілы як у прамысловасці, так і ў сельскай гаспадарцы. Умовы рэформы забяспечвалі як памешчыкам, так і сялянам пераход ад прыгонніцкай да капіталістычнай гаспадаркі.

Буржуазная па зместу сялянская рэформа разам з тым захавала прыгонніцкія перажыткі, галоўным з якіх з'яўлялася памешчыцкае землеўладанне.

**Рэформы грамадскага ладу 1864 г.** Адмена прыгоннага права, буржуазнае развіццё краіны абумовілі неабходнасць правядзення шэрагу рэформ: земскай (1864), судовай (1864), гарадскога самакіравання (1870), вайсковай (1862, 1874), школьнай (1864), а таксама некаторых пераўтварэнняў у галінах фінансаў, цэнзуры. У Беларусі гэтыя рэформы былі праведзены пазней і да таго ж са значнымі адхіленнямі ў параўнанні з агульнарасійскімі нормамі.

Адной з першых пачалася рэалізацыя вайсковай рэформы.1862 г. Расійская імперыя была падзелена на вайсковыя акругі, тэрмін вайсковай службы быў скарочаны да 7-8 гадоў. Гэта адкрывала магчымасці для амаладжэння арміі і стварэння рэзерву для мабілізацыі з ліку звольненых у запас, але захоўваўся саслоўны характар фарміравання арміі. У пачатку 1874 г. была ўведзена ўсеагульная вайсковая павіннасць для мужчын, якія дасягнулі 20-гадовага ўзросту. Частка прызыўнікоў вызвалялася ад службы ў арміі па сямейных абставінах. Тэрмін службы ў сухапутных войсках паніжаўся да 6, а на флоце – да 7 гадоў. Асобы, якія мелі вышэйшую адукацыю, служылі ў арміі 6 месяцаў, сярэднюю – 1,5 года, пачатковую – 4 гады і г. д. Ільготы па службе ў арміі станавіліся дадатковым стымулам для распаўсюджвання адукацыі.

Земская рэформа была распаўсюджана на Беларусі толькі ў 1911 г. і яна закранула Віцебскую, Мінскую і Магілёўскую губерні. Урад непакоіла магчымае ўзмацненне польскага ўплыву ў земскіх выбарных органах. Гэта стала прычынай адсутнасці земстваў у

Віленскай і Гродзенскай губернях, дзе значнай была ўдзельная вага насельніцтва каталіцкага веравызнання. Земствы адыгралі пэўную ролю ў развіцці школьнай адукацыі, медыцынскага і ветэрынарнага абслугоўвання, гаспадарчага жыцця і г. д.

З усіх буржуазных рэформаў 60-70-х гг. найбольш паслядоўнай была судовая, у аснову якой пакладзены прынцыпы буржуазнага права: бессаслоўнасць суда, спаборніцтва бакоў, галоснасць судаводства і незалежнасць суддзяў. Быў створаны спецыяльны інстытут прысяжных паверанных (адвакатаў), якія ўдзельнічалі ў судовым працэсе на роўных з пракурорам. Уводзіўся таксама інстытут прысяжных засядацеляў (суддзяў-непрафесіяналаў), якія ўдзельнічалі ў крымінальных працэсах і выносілі канчатковае рашэнне аб вінаватасці ці невінаватасці падсуднага. Для разгляду дробных злачынстваў і нязначных іскаў быў створаны міравы суд са спрошчаным судаводствам. Міравыя суддзі выбіраліся на сходах земскіх і гарадскіх галосных. Рашэнні міравых суддзяў маглі быць абскарджаны ў павятовым міравым судзе. Стваралася стройная сістэ(108)ма судовых устаноў: акруговыя суды, судовыя палаты, Сенат. Для ўсіх саслоўяў уводзіўся адзіны акруговы суд.

Судовая рэформа на Беларусі пачала праводзіцца з 1872 г. увядзеннем міравых судоў. Васьмігадовая затрымка правядзення рэформы была звязана з існаваннем на тэрыторыі Беларусі да 1868 г. ваеннага становішча і дзейнасцю следчых камісій па справах за ўдзел у паўстанні 1863 г. На думку генерал-губернатара А.Л. Патапава, судовая рэформа павінна была зблізіць заходнія губерні з астатняй часткай імперыі, выклікаць у мясцовага насельніцтва пачуццё павагі да законаў Расійскай імперыі. З-за адсутнасці ў Беларусі земскіх устаноў міравыя суддзі прызначаліся тут міністрам юстыцыі з ліку лаяльных да ўрада памешчыкаў. Такім чынам, Беларусь адразу была пазбаўлена адной з галоўных рыс рэформы – выбарнасці суддзяў.

Вышэйшыя судовыя інстанцыі – акруговыя суды, судовыя палаты, а таксама пракуратура, інстытуты прысяжных паверанных і засядацеляў, у Беларусі былі ўведзены толькі ў 1882 г. Да гэтага часу ўрад звузіў межы судовай рэформы, асабліва адносна незалежнасці суддзяў. У 1878 г. разгляд спраў аб дзяржаўных (палітычных) злачынствах быў перададзены з суда прысяжных у судовыя палаты і ваенныя суды. Дзейнасць некаторых міравых суддзяў выклікала незадаволенасць уладаў. У 1889 г. быў уведзены інстытут земскіх начальнікаў, якія прызначаліся губернатарамі, міністрам унутраных спраў. Яны мелі права прыпыняць рашэнні сельскіх і валасных сходаў, маглі выносіць штрафы, аддаваць на кароткі тэрмін пад

арышт. Пасады земскіх начальнікаў былі ўведзены ў Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губернях у 1900 г., у Віленскай і Гродзенскай – у 1904 г. Судовая сістэма адразу з самага пачатку правядзення рэформы захоўвала і некаторыя рысы ранейшай эпохі. Побач з агульнасаслоўнымі судамі дзейнічалі сялянскія валасныя суды, святары ў шэрагу выпадкаў судзіліся ў асобным парадку і г.д.

Адукацыйная рэформа праводзілася ў адпаведнасці з дакументамі "Палажэнне аб пачатковых народных вучылішчах" (1864) і "Статут гімназій і прагімназій" (1864), якія былі заснаваны на прынцыпе агульнасаслоўнай адукацыі Саслоўныя абмежаванні адмяняліся пры паступленні ў вышэйшыя навучальныя ўстановы. Аднак склад навучэнцаў у сярэдняй і вышэйшай школах рэгуляваўся высокай аплатай за навучанне. У выніку рэалізацыі рэформы значна пашыралася сетка пачатковых школ, якія дазвалялася адкрываць грамадскім установам і прыватным асобам з падначаленнем іх мясцовай адміністрацыі. Адпаведна статуту дзейнічалі гімназіі двух тыпаў: класічныя і рэальныя. У класічных гімназіях вялікая ўвага ўдзялялася вывучэнню старажытных моў і дысцыплін гуманітарнага профілю; тыя, хто заканчваў навучанне ў класічных гімназіях, мелі права паступаць ва універсітэты без уступных экзаменаў. У рэальных гімназіях надавалася значэнне выкладанню прыродазнаўчых дысцыплін, замежных моў. Выпускнікі іх маглі паступіць у вышэйшыя тэхнічныя навучальныя ўстановы. У 1871 г. быў зацверджаны новы статут гімназій. Тэрмін навучання ў класічных гімназіях павялічваўся з 7 да 8 гадоў, пашыралася выкладанне старажытных моў і матэматыкі. Рэальныя гімназіі былі ператвораны ў рэальныя вучылішчы, і тэрмін навучання ў іх скарачаўся з 7 да 6 гадоў. Права паступаць у вышэйшыя тэхнічныя навучальныя ўстановы атрымлівалі толькі тыя, хто заканчваў сёмы дадатковы клас вучылішча. Важнымі элементамі дзейнасці ўрадавых органаў у сферы адукацыі Беларусі 60-90-х гг. XIX ст. сталі штучнае стрымліванне развіцця вышэйшай і сярэдняй адукацыі і адначасова значнае павелічэнне колькасці пачатковых школ, адкрыццё шэрагу настаўніцкіх | семінарый, дзе навучалася сельская моладзь. Нягледзячы на ўсе абмежаванні з боку ўрадавых органаў, школьная рэформа садзейнічала развіццю адукацыі і культуры.

Крыху пашырыліся магчымасці друку ў выніку прыняцця новага **цэнзурнага статуту 1865 г.** Абмяжоўвалася самавольства ўлад у галіне выдавецкай справы. Адмянялася папярэдняя цэнзура для кніг вялікага памеру (10 друкаваных аркушаў і больш 20 – для перакладных выданняў). Масавыя выданні якія прызначаліся для шыро-

кага кола чытачоў, павінны былі цраходзіць папярэднюю цэнзуру. Маглі быць вызвалены ад яе спецыяльным дазволам міністра ўнутраных спраў асобныя перыядычныя органы друку і пры ўмове ўнясення вялікага грашовага закладу. Выдаўцы і рэдактары прыцягваліся да адказнасці толькі праз суд. Для правінцыяльных масавых выданняў, у тым ліку і на Беларусі, захоўвалася папярэдняя цэнзура. Дзяржаўныя ўлады захоўвалі за сабой права накладваць штрафы, прыпыняць і нават зачыняць выданні, якія займалі непажаданую пазіцыю. У 1873 г. міністру ўнутраных спраў было дазволена прыпыняць любое выданне. Праз 6 гадоў такія паўнамоцтвы атрымалі і генерал-губернатары. Яшчэ доўгі час перыядычны друк абмяжоўваўся нешматлікімі афіцыйнымі выданнямі. Цэнзурная рэформа была найбольш непаслядоўнай з праведзеных у 60-70-х гг. пераўтварэнняў.

Рэформа гарадскога самакіравання на тэрыторыі Беларусі была праведзена ў 1875 г. У адрозненне ад дарэформенных саслоўных гарадскіх устаноў, дзе колькасна пераважалі дваране, ганаровыя грамадзяне і купцы, новы закон абвяшчаў бессаслоўнае самакіраванне. Выбарчым правам карысталіся ўсе плацельшчыкі гарадскіх падаткаў. Аднак прынятая сістэма выбараў гарадскіх гласных аўтаматычна забяспечвала большасць прадстаўнікам буйнога капіталу. Ад выбараў у гарадскія думы поўнасцю адхілялася большасць гарадскога насельніцтва, якая не мела неабходнага маёмаснага цэнзу: рабочыя, рамеснікі, хатняя прыслуга і г. д. Органы гарадскога самакіравання займаліся арганізацыяй камунальнай гаспадаркі і транспарту, пытаннямі сістэмы адукацыі і аховы здароўя, добраўпарадкаваннем тэрыторыі і зборам падаткаў. Дзейнасць гэтых органаў рэгулявалася губернскімі па гарадскіх справах прысутнасцямі, падначаленых губернатарам. У 1892 г. было зацверджана новае палажэнне, якое прадугледжвала ўзмацненне дзяржаўнага кантролю за дзеннасцю гарадскіх органаў самакіравання, павелічэнне маёмаснага цэнзу.

ЛЕКЦЫЯ 6

# НА ШЛЯХУ КАПІТАЛІСТЫЧНАГА РАЗВІЦЦЯ

- *Сельская гаспадарка*
- *Прамысловасць і гарады*
- *Транспарт, гандаль, крэдыт*

**Сельская гаспадарка.** Галоўным накірункам сацыяльна-эканамічнага развіцця парэформеннай Беларусі было развіццё капіталізму. Першыя два парэформенныя дзесяцігоддзі адносяцца да ліку пераходных, калі адбывалася разбурэнне феадальных адносін у сельскай гаспадарцы, завяршаўся працэс тэхнічнага перааснашчэння прамысловасці, ствараўся механізаваны транспарт і складаліся новыя, характэрныя для капіталістычнага грамадства сацыяльныя слаі насельніцтва – пралетарыят і прамысловая буржуазія.

Зацвярджэнне капіталізму, як дамінуючай сацыяльна-эканамічнай сістэмы адносіцца да канца XIX – пачатку XX стст. Развіццё яго адбывалася ва ўмовах, хоць і мадэрнізаванай, але, па сутнасці, старой палітычнай сістэмы, пры захаванні самадзяржаўнага і саслоўнага ладу. Гэта накладвала пэўны адбітак на сацыяльна-эканамічныя працэсы як на Беларусі, так і ў парэформеннай Расіі ў цэлым, абумовіла іх цяжкасці і супярэчнасці.

Пасля адмены прыгоннага права асновай эканомікі Беларусі па-ранейшаму заставалася сельская гаспадарка, характэрнай рысай якой было спалучэнне капіталістычных адносін з рэшткамі прыгонніцтва. Наяўнасць буйнога памешчыцкага землеўладання вызначыла для Беларусі павольны, паступовы ("прускі") шлях буржуазна-аграрнай эвалюцыі, пры якой буйная памешчыцкая гаспадарка надоўга захавала свае прыгонніцкія рысы. У 70-х гадах у Беларусі памешчыкам належала звыш 50,5% усёй зямлі, а сялянам – менш 33,4% . Буйныя памешчыкі валодалі дзесяткамі і сотнямі тысяч дзесяцін зямлі. У значнай колькасці сялянскіх двароў ва ўласнасці знаходзілася ад 2 да 5 дзесяцін.

Побач з латыфундыямі памешчыкаў існавала цераспалосіца сялянскіх і памешчыцкіх зямель.

У заходняй і цэнтральнай Беларусі захаваўся таксама і другі інстытут сярэдневякоўя – зямельныя сервітуты (права сялян карыстацца некаторымі ўгоддзямі, якія належаць памешчыкам, і

агульнымі пашамі). У 60-я гады XIX ст. імі было ахоплена тут 56% сялянскіх двароў.

У развіцці сельскай гаспадаркі Беларусі ў другой палове XIX ст. трэба вылучыць два перыяды. Першы з іх ахоплівае 60-70-я гады, другі прыпадае на 80-90-я гады. Першы перыяд з'явіўся часам пакутлівага выспявання капіталістычных адносін, шырокім распаўсюджваннем адработачнай сістэмы, сутнасць якой заключалася ў апрацоўцы зямлі памешчыка сялянскім інвентаром за прадастаўленне яму ў арэнду ворыўнай зямлі і іншых угоддзяў. Адработачная сістэма асабліва прыжылася ў Віцебскай і Магілёўскай губернях. У Мінскай, Гродзенскай і Віленскай губернях памешчыкі шырока выкарыстоўвалі працу наёмных рабочых. Але і ў гэтых губернях адработкі займалі значнае месца, асабліва падчас збору збожжа і сенажаці. Трэба адзначыць, што ў цэлым тэхнічная ўзброенасць у земляробстве як у памешчыцкай, так і ў сялянскай гаспадарках амаль нічым не адрознівалася ад дарэформеннай.

Нягледзячы на рэшткі феадальна-прыгонніцкіх адносін, капіталізм у сельскай гаспадарцы Беларусі развіваўся адносна хутка ў параўнанні з іншымі рэгіёнамі Расійскай імперыі. Гэтаму садзейнічалі развіццё прамысловасці, сістэмы капіталістычнага крэдыту, чыгуначнае будаўніцтва, рост гарадоў, канцэнтрацыя войскаў на тэрыторыі Беларусі. Усё гэта стварала спрыяльныя ўмовы таварнага земляробства і рынкавых адносін. Моцным каталізатарам эвалюцыі сельскай гаспадаркі Беларусі з'явіўся сусветны аграрны крызіс 80-90-х гадоў, які выклікаў рэзкае зніжэнне цэн на хлеб. Крызіс прывёў да карэнных змяненняў у эканамічнай арганізацыі і тэхнічнай аснашчапасці сельскай гаспадаркі, да канчатковай перамогі таварнага земляробства і павелічэння рынкавага попыту.

У сувязі з грунтоўным скарачэннем на пачатку 80-х гадоў пасяўных плошчаў пад збожжавыя культуры сельская гаспадарка Беларусі пачала спецыялізавацца на вытворчасці тэхнічных культур (бульбы, ільну і інш.). Развіццё малочнай гаспадаркі таксама паўплывала на структурныя змяненні пасяўных плошчаў. Так, у буйных маёнтках, на землях заможных сялян (часцей за ўсё купчых і арэндных) уводзілася шматпольная сістэма севазвароту, прымяняліся мінеральныя ўгнаенні, пашыралася выкарыстапне машын (малатарні, арфы) і палепшаных ссльскагаспадарчых прылад (жалезныя плугі, бароны з жалезнымі зубамі). Па прымяненню машын Беларусь стаяла на адным з першых месцаў у Расійскай імперыі, хоць ва ўсёй сельскай гаспадарцы і панавала ручная тэхніка. У другой палове 90-х гадоў у чатырох заходніх губернях (без Віленскай) палепшаную

глебаапрацоўчую тэхніку (пераважна плугі) выкарыстоўвалі 17-25% сялянскіх гаспадарак. Сяляне, галоўным чынам заможныя, набывалі простыя сельскагаспадарчыя машыны: малатарні, арфы, крупадзёркі, ільночасалкі, сячкарні. Такім чынам, у парэформенны перыяд быў пакладзены пачатак тэхнічнага перааснашчэння сялянскага землеўладання, што склала адну з важнейшых перадумоў эвалюцыі сацыяльна-эканамічнага ладу сялянскай гаспадаркі на шляху да капіталізму.

Важным відам капіталістычнага прадпрымальніцтва як у памешчыкаў, так і ў заможных сялян было вінаробства, асноўнаю сыравінаю для якога было спачатку зерне, пераважна жыта, а потым бульба. Адходы ад вінаробства ішлі на корм жывёле.

Развіццё таварнага земляробства, спецыялізацыя яго па асобных галінах (малочная жывёлагадоўля, вытворчасць ільну, пянькі, вінаробства) пашырылі абмен паміж сельскай гаспадаркай і прамысловасцю. Гэта спрыяла росту ўнутранага рынку і прывяло ў канцы XIX ст. да з'яўлення ў памешчыцкіх гаспадарках буйных, высокатаварных капіталістычных прадпрыемстваў, якія працавалі выключна на рынак. Колькасць малатаварных маёнткаў, заснаваных на адработачнай сістэме, паступова скарачалася. Збяднелыя дваране прадавалі маёнткі і ішлі на дзяржаўную службу, а іх зямля трапляла ў капіталістычны абарот, яе набывалі дваранства, купцы і заможныя сяляне. Развіццё капіталістычных адносін у сельскай гаспадарцы ўзмацніла працэс сацыяльнага расслаення сялянства. З аднаго боку, расла колькасць заможных сялян, а з другога, павялічвалася маламаёмаснае сялянства. Надзельная зямля, атрыманая ў 60-х гадах па ўраўняльнаму прынцыпу, ужо к канцу 70-х гадоў была размеркавана нераўнамерна. Павялічылася колькасць беззямельных двароў. Малазямельныя і беззямельныя сяляне, вымушаныя наймацца да памешчыкаў або да заможных сялян, па сутнасці, рабіліся наёмнымі сельскагаспадарчымі рабочымі.

Тысячы сялян-беднякоў ішлі ў адыходныя промыслы – на будаўніцтва чыгунак, на шахты Данбаса, на заводы прамысловых цэнтраў Расіі. Заможныя сяляне вялі сваю гаспадарку, выкарыстоўваючы наёмную працу, нярэдка спалучалі таварнае земляробства і жывёлагадоўлю з ліхвярскімі аперацыямі. Такі селянін выступаў і як капіталіст-фермер, і як гандляр, і як ліхвяр. Гэта сведчыла пра тое, што на Беларусі магчымы працэс фермерскага ("амерыканскага") шляху развіцця капіталізму ў сельскай гаспадарцы. Аднак ажыццявіць гэта перашкаджала наяўнасць памешчыцкага землеўладання.

Захаванне буйнога памешчыцкага землеўладання, абеззямельванне сялян абумовілі і развіццё сялянскага руху Беларусі ў парэформенны час. Асноўнымі патрабаваннямі сялян былі вяртанне зямель, адрэзаных памешчыкамі падчас рэформы, памяншэнне падаткаў і павіннасцяў, пазбаўленне ад памешчыцкай апекі і саслоўнага нераўнапраўя. Дынаміка сялянскіх выступленняў была нераўнамернай. Калі ў першыя гады пасля падаўлення паўстання 1863 г. адбыўся спад сялянскіх хваляванняў, то ў 70-х гг. наглядаўся іх значны пад'ём. Асаблівую вастрыню і размах сялянскі рух набыў у сярэдзіне 80-90 гг., калі побач з традыцыйнымі канфліктамі сялян з памешчыкамі, з'яўляюцца новыя – паміж сельскай буржуазіяй і беднатой. Своеасаблівай формай пратэсту быў масавы рух сялян, адзначаны найперш у Магілёўскай, Віцебскай губсрнях і асобных паветах Мінскай за перасяленне ў Сібір і паўднёвыя расійскія губерні. Пастурова элементы арганізаванасці і самасвядомасці пранікалі ў сялянскае асяроддзе, адбіваліся на светапоглядзе селяніна, узмацнялі ў ім пачуццё грамадзянскасці. Стандартным адказам мясцовай адміністрацыі на сялянскія хваляванпі было прыцягненне воінскіх каманд.

**Прамысловасць і гарады. У** другой палове XIX ст. прамысловасць Беларусі развівалася ў накірунку перапрацоўкі пераважна мясцовай мінеральнай, лясной і сельскагаспадарчай сыравіны. Аказаліся неканкурэнтаздольнымі металургічная, цукровая, суконная галіны вытворчасці. На працягу пcршых двух дзесяцігоддзяў пасля рэформы 1861 г. прамысловы рост быў запаволены. Па-ранейшаму па ўсіх паказчыках пераважала дробная вытворчасць і мануфактура. У 1873-1875 гг. Беларусь была ахоплена прамысловым крызісам, які выявіў нізкую пакупную здольнасць селяніна галоўнага спажыўца тавараў. Пад цяжарам высокіх выкупных плацяжоў ён вымушаны быў сам вырабляць палотны, сукны, абутак, галаўныя ўборы і г. д. Крызіс закрануў пераважна дрэваапрацоўчыя і харчасмакавыя, дробныя і мануфактурныя прадпрыемствы. Крызіс 1881-1882 гг. зноў ахапіў харчасмакавую, дрэваанрацоўчую, сілікатную, гарбарную і тэкстыльную галіны прамысловасці. Працэс развіцця прамысловай вытворчасці значна паскорыўся ў 80-90-я іт. За апошняе дзесяцігоддзе XIX ст. сярэднегадавы прырост прамысловай прадукцыі складаў у сярэднім 8,2% , што ў 2 разы вышэй, чым у папярэднія дзесяцігоддзі.

У 1860 г. на Беларусі налічвалася 20 тыс. рамесніцкіх майстэрняў, 7,8 тыс. немеханізаваных дробнакапіталістычных прадпрыемстваў (з колькасцю рабочых да 16 чалавек), 140

мануфактур і 76 фабрык і заводаў. Большая частка рамесніцкай вытворчасці Беларусі была сканцэнтравана ў гарадах і мястэчках. За чатыры паслярэформенныя дзесяцігоддзі адбылося павслічэнне яе вытворчасці, што было абумоўлена псрш за ўсё попытам сялянства, мястэчкавога і гарадскога насельніцтва на прадметы штодзеннага ўжытку і паслугі. Хуткімі тэмпамі развіваліся новыя віды рамёстваў – хімічныя, метала- і дрэваапрацоўчыя. Павялічылася ўдзельная вага рамесных прадпрыемстваў з 23,2 (1860) да 55,3% (1890). У канцы XIX ст. налічвалася звыш 58 тыс. рамесніцкіх майстэрняў. Аднак іх доля ў агульным аб'ёме прамысловай вытворчасці знізілася за паслярэформенны перыяд з 18,7 да 9,0% , хаця яна заставалася даволі высокай у 1900 г. у металаапрацоўчай (31%), хімічнай (29%), дрэваапрацоўчай (19%), сілікатна-будаўнічай (12%) вытворчасці. Звычайна майстэрні рамеснікаў былі невялікія. У іх працавалі самі гаспадары ("майстры") і 2-3 наёмныя рабочыя, а нярэдка і без іх. Падзел працы ў нрацэсе вытворчасці тут адсутнічаў, усе работы выконваліся ўручную. Збытам тавару спачатку займаўся сам рамеснік, потым з'явіліся скупшчыкі, якія займаліся рэалізацыяй вырабаў і купляй сыравіны для рамеснікаў. Пастунова скупшчык ператвараўся ў дробнага прадпрымальніка, а залежныя ад яго рамеснікі – у наёмных работнікаў.

Рамяство, такім чынам, ва ўмовах развіцця грашовых адносін перарастала ў дробную вытворчасць у форме простай кааперацыі. Да дробнакапіталістычных прадпрыемстваў прынята адносіць тыя, на якіх працавала 5-15 рабочых без паравога рухавіка, вадзяныя і ветраныя млыны, пільні і алейні (да 10 рабочых), вінакурні і піваварні з вытворчасцю да 25 тыс. вёдзер адпаведнага напітку ў год, а таксама другія прадпрыемствы, на якіх выраблялася прадукцыі менш чым на 1 тыс. руб. у год. У 1860 г. дробнакапіталістычная нрамысловасць складала 9% ад агульнай колькасці прадпрыемстваў і 62% -ад выробленай прадукцыі, і да 1888 г. на яе прадпрыемствах выпрацоўвалася больш паловы прамысловых вырабаў Беларусі. Аднак у сувязі з інтэнсіўным павелічэннем мануфактурна-фабрычнай вытворчасці ўдзельная вага дробнакапіталістычнай паменшылася да 28,2% у канцы XIX ст., хаця доля апошняй у той самы час па колькасці прадпрыемстваў павялічылася на 7% .

У другой палове XIX ст. адзначаецца рост мануфактурнай вытворчасці. Удзельная вага яе ў гэты перыяд павялічыласяпа аб'ёму вытворчасці з 7,2 да 15,1% , па колькасці прадпрыемстваў – з 0,2 да 0,7% . У 1890 г. у Беларусі працавала 760 мануфактур, у тым ліку 193

дрэваапрацоўчыя, 185 сілікатных. Мануфактуры заклалі асновы росту фабрычнай прамысловасці, фарміравання пралетарыяту і буржуазіі.

Машынная вытворчасць у другой палове XIX ст. развівалася найбольш інтэнсіўна. Колькасць фабрык і заводаў павялічылася ў 15 разоў і склала на канец XIX ст. 1137 прадпрыемстваў. Аб'ём вытворчасці на іх павялічыўся ў 37 разоў, колькасць рабочых у 9. Пачалі дзейнічаць запалкавыя фабрыкі ў Барысаве (1881) і Пінску (1882), тытунёвая ў Гродне (1862), папяровая ў Добрушы (1871) і інш. Пад канец XIX ст. адчувальным становіцца ўплыў замежнага, асабліва нямецкага, капіталу. Пераход ад ручной да машыннай вытворчасці на Беларусі меў адметную асаблівасць. У адрозненне ад вялікарускіх губерняў ён разгортваўся не ў тэкстыльнай, а ў харчасмакавай і металаапрацоўчай галінах.

Да 1890 г. доля фабрычна-заводскай вытворчасці ў агульным аб'ёме прамысловасці склала 46,2% (1860 г. – 8,4%), па колькасці прадпрыемстваў – 1,1% (1860 г. – 0,1%). Тэмпы росту аб'ёму вытворчасці і колькасці занятых наёмных работнікаў у мануфактурнай і машыннай прамысловасці ў 4-7 разоў перавышалі адпаведныя паказчыкі ў дробнай.

Шырокае чыгуначнае і прамысловае будаўніцтва спрыяла паскоранаму развіццю сродкаў вытворчасці. Пры росце прадукцыі ўсёй прамысловасці Беларусі ў 6,8 раза ў цяжкай прамысловасці аб'ём вытворчасці павялічыўся ў 12 разоў. У канцы XIX ст. сродкі вытворчасці складалі 32% усёй прамысловай прадукцыі Беларусі (для параўнання – па Расійскай імперыі наогул каля 40%). Найбольш буйныя фабрыкі і заводы знаходзіліся ў гарадах. Аднак 2/3 фабрык і заводаў Беларусі і амаль палова занятых на іх рабочых былі сканцэнтраваны ў вёсцы. Гэта ў значнай ступені было абумоўлена спецыялізацыяй беларускай прамысловасці на апрацоўцы мясцовай сельскагаспадарчай, лясной і мінеральнай сыравіны.

Узровень развіцця прамысловасці ў Беларусі быў ніжэйшы, чым у сярэднім на еўрапейскай частцы Расійскай імперыі. У 1900 г. тут прыпадала на душу насельніцтва 8,69 руб. прамысловага абаротнага капіталу, тады як у Еўрапейскай Расіі – 26,4 руб. Тэхнічнае пераўзбраенне прамысловасці Беларусі да канца XIX ст. не завяршылася.

Фарміраванне прамысловай буржуазіі Беларусі пачалося да правядзення рэформы 1861 г. У другой палове XIX ст. агульная колькасць уладальнікаў прамысловых прадпрыемстваў узрасла з 28,2 тыс. у 1860 г. да 77,1 тыс. чалавек у 1900 г. Сюды ўключаны

уладальнікі рамесніцкіх, дробнакапіталістычных, мануфактурна-фабрычных прадпрыемстваў.

У 60-х гг. XIX ст. 83% мануфактур і фабрык Беларусі належала дваранам. З 94 прадпрыемстваў, якія знаходзіліся ў іх уласнасці, было 55 харчовых, прычым тут перавага аддавалася вінна-гарэлачнай, цукровай, мукамольна-крупяной вытворчасцям; 17 сілікатна-будаўнічых; 7 металаапрацоўчых і г. д. Купцы валодалі 16% фабрык і мануфактур. Іх капіталы сканцэнтраваны ў асноўным у суконна-шарсцяной і харчовых вытворчасцях.

Да канца XIX ст. удзельная вага дваранскіх прадпрыемстваў у мануфактурна-фабрычнай прамысловасці знізілася да 45%, хаця колькасць іх складала 281. Па-ранейшаму асноўная маса прадпрымальнікаў з ліку вышэйшага саслоўя валодала 207 харчасмакавымі прадпрыемствамі (73,7%). Сярод фабрык і мануфактур дваран 15,7% (44) былі дрэваапрацоўчыя, 4,6% (13) сілікатна-будаўнічыя. Купцам належала 189 (30%) мануфактур і фабрык. Мяшчане валодалі 93 буйнымі прадпрыемствамі (15%). Яны ўкладвалі свае капіталы, у першую чаргу, у гарбарна-абутковую вытворчасць, дрэваапрацоўчую прамысловасць.

У канцы XIX ст. назіралася тэндэнцыя зніжэння ўдзельнай вагі дваран сярод сярэдніх і буйных прамыслоўцаў і рост прадпрымальніцкай дзейнасці купцоў і мяшчан. У 1900 г. большая частка дваран валодала фабрыкамі і заводамі з колькасцю рабочых да 20 чалавек і толькі 23% дваран мелі адносна буйныя прадпрыемствы з колькасцю наёмных работнікаў звыш 51 чалавека. Сярод купцоў была меншая ўдзельная вага дробных прамысловых прадпрымальнікаў і некалькі вышэй сярэдніх і буйных. Мяшчане валодалі пераважна невялікімі фабрыкамі і заводамі (у асноўным з колькасцю рабочых да 30 чалавек).

Да канца XIX ст. працэс станаўлення прамысловай буржазіі Беларусі як сацыяльнай групы не завяршыўся. Кансалідацыі буржуазіі перашкаджалі існаваўшыя саслоўныя перагародкі паміж яе прадстаўнікамі, а таксама іх нацыяльна-рэлігійныя адрозненні.

Тэмпы ўрбанізацыі ў Беларусі былі даволі інтэнсіўнымі. Гарадское насельніцтва за другую палову XIX ст. павялічылася ў 2,2 раза. Гарадское насельніцтва ў 1858 г. склала 293,6 тыс. чалавек (9% ад агульнай колькасці жыхароў), а ў 1897 г. – 655,1 тыс. чалавек (10,3%). Каля 500 тыс. чалавек жыло ў канцы XIX ст. у мястэчках Беларусі. Інтэнсіўна працэсы ўрбанізацыі праходзілі ў 60-х – першай палове 80-х гг., калі гарадское насельніцтва павялічвалася за кошт шляхты, абеззямеленага сялянства і выгнаных з сельскіх паселішчаў

яўрэяў. У другой палове 80-90-х гг. назіралася змяншэнне тэмпаў росту гарадоў, што было звязана з іх перанаселенасцю, складанасцямі пераарыентацыі іх гандлёва-прамысловай спецыялізацыі на агульнарасійскі рынак.

Мясцовае сялянства вельмі насцярожана ставілася да гарадской цывілізацыі, выступала за кансервацыю патрыярхальнасці беларускай вёскі. Назіралася раз'яднанасць сацыяльна-дэмаграфічных працэсаў у гарадах і вёсках Беларусі. Урадавая палітыка садзейнічала гэтаму. Абмежаванні ў рассяленні яўрэяў прывялі да штучнай канцэнтрацыі іх у гарадах і мястэчках Беларусі і дэфармавалі нацыянальны і часткова саслоўны склад насельніцтва. Гэтая сітуацыя ўскладнялася адноснай слабасцю і невялікімі патрэбамі гарадской прамысловасці ў наёмнай рабочай сіле. Сотні тысяч беларускіх сялян вымушаны былі знаходзіць сабе працу на прадпрыемствах і гаспадарках у сельскай мясцовасці ці перасяляцца ў іншыя рэгіёны Расійскай імперыі.

Працэсы горадаўтварэння найбольш інтэнсіўна ішлі ў цэнтральнай і заходняй частках Беларусі, што ў значнай меры было звязана з чыгуначным будаўніцтвам і больш цеснымі сувязямі з агульнарасійскім і замежным рынкамі. Эканамічная інтэграцыя беларускіх гарадоў у сістэму агульнарасійскага рынку больш заўважна пачала рэалізоўвацца ў 80-90-х гг. XIX ст. У выніку пераарыентацыі гаспадарчых сувязяў Беларусі з Польшы на Расію знікла фактычна традыцыйная структура гарадскіх цэнтраў, узнікла новая, арыентаваная на агульнарасійскія эканамічныя патрэбы. Адна з прычын гэтага – інтэнсіўнае чыгуначнае будаўніцтва. Беларускія гарады станавіліся важнымі вузламі пасрэдніцкага гандлю. Прычым іх значэнне ў азначанай сферы было вышэй, чым у прамысловай, гандаль прыносіў большыя прыбыткі. Прамысловасць Беларусі наогул развівалася ў адпаведнасці з попытам мясцовага рынку, без уздзеяння мэтанакіраванай урадавай палітыкі. Яшчэ адной асаблівасцю урбанізацыйных працэсаў на Беларусі ў XIX – пачатку XX стст. з'яўляецца адсутнасць буйных гарадскіх цэнтраў. У канцы XIX ст. толькі ў Мінску і Віцебску налічвалася ад 50 да 100 тыс. жыхароў, а Брэст, Гродна, Гомель, Магілёў мелі ад 20 да 50 тыс. жыхароў. Адной з прычын, што перашкаджала развіццю гарадоў на рубяжы стагоддзяў, была сістэма зямельных адносін. У адрозненне ад вялікарускіх губерняў, зямельная ўласнасць гараджан Беларусі мела вялікія памеры. У Мінску каля 85% будынкаў знаходзілася на чужой арандаванай зямлі, у Віцебску прыблізна 87%. Адпаведна расійскаму заканадаўству тэрміны зямельнай арэнды звычайна не перавышалі

12 гадоў і не абавязкова трэба было ўзнаўляць дагаворы аб арэндзе. Гэта ставіла арандатараў у залежнасць ад землеўласнікаў, прычым апошнія ў выпадку парушэння кантракту мелі права на яго скасаванне, і будынкі арандатараў і іншыя задаткі пераходзілі да землеўладальнікаў. У сувязі з гэтым для прадпрымальнікаў былі патрэбны дадатковыя фінансавыя выдаткі для папярэдняга набыцця зямлі. Попыт і кошт гарадскіх зямель у Беларусі быў высокі.

Прамежкавае становішча паміж горадам і вёскай займалі мястэчкі. Яны не мелі заканадаўча афармленага дакладнага вызначэння. Гэта была спецыфічная з'ява, характэрная для заходніх губерняў Расійскай імперыі. Каля паловы мястэчак знаходзілася на тэрыторыі Беларусі. Тут пераважалі па колькасці дробныя мястэчкі (да 2 тыс. жыхароў), але налічвалася каля ста населеных пунктаў з насельніцтвам ад 2 да 5 тыс. чалавек і нават вышэй.

У 80-х гг. XIX ст. з'явілася неабходнасць размежавання мястэчак і сельскіх паселішчаў у сувязі з забаронай у 1882 г. яўрэям сяліцца паза межамі гарадоў і мястэчак. Мястэчкі мелі пераважна прыватнаўласніцкі характар і шматэтнічны склад насельніцтва. 82,5% мястэчак Беларусі ў пачатку 60-х гг. знаходзілася на памешчыцкіх землях, астатнія – на дзяржаўных, у той час як вёскі стаялі пераважна на сялянскіх землях. У 1863 г. для мяшчан замест падушнага падатку быў уведзены падатак з нерухомай маёмасці. Разам з мяшчанамі гэты падатак павінны былі плаціць таксама і жыхары (у тым ліку сяляне) мястэчак. Акрамя таго, пасля 1875 г. з'явілася местачковае мяшчанскае самакіраванне. У пачатку 60-х гг. у беларускіх губернях налічвалася 418 мястэчак, у канцы стагоддзя каля 320. Мястэчкі адыгрывалі значную ролю ў эканамічным жыцці. Каля паловы ўсіх занятых у сферы прамысловасці Беларусі канцэнтравалася ў мястэчках, у гарадах – прыкладна 30% , у сельскіх населеных пунктах – каля 18% .

За другую палову XIX ст. толькі адно паселішча Беларусі атрымала афіцыйны статус горада. Гэта – Горкі ў 1861 г., хаця шэраг мястэчак па сваіх памерах і гандлёва-прамысловаму значэнню не ўступалі некаторым гарадам, а часам іх і пераўзыходзілі. Расійскі ўрад не спяшаўся надаваць гарадскі статус населеным пунктам Беларусі. Тыя, што былі афіцыйна прызнаны гарадамі, звычайна выконвалі пэўную адміністрацыйную функцыю. Сярод 44 беларускіх гарадоў налічваліся 4 губернскія цэнтры, 31 – павятовых і толькі 9 – пазаштатных ці беспавятовых гарадоў.

У гарадскіх цэнтрах Беларусі на працягу другой паловы XIX ст. пастулова паляпшаліся бытавыя ўмовы жыцця і прадпрымальніцтва.

Тут з'явіліся брукаваныя вуліцы, электраасвятленне, тэлефонная сувязь і г. д. Ужо з 1860 г. уздоўж шашэйных і чыгуначных дарог працягнуліся тэлеграфныя правады, якія злучылі многія населеныя пункты. З 1874 г. на Беларусі пачалі дзейнічаць водаправод (у Мінску), з 1889 г. –электраасвятленне (пры Добрушскай папяровай фабрыцы), з 1898 г. – трамвай (у Віцебску), які тут быў пушчаны раней, чым у Маскве і Пецярбургу.

У цэлым урбанізацыйныя працэсы ў Беларусі другой паловы XIX ст. развіваліся ў неспрыяльных умовах. Тагачаснаму стану эканомікі Беларусі найбольш адпавядалі дробныя гарады і буйныя мястэчкі. У іх канцэнтравалася больш паловы неземляробчага насельніцтва Беларусі. Структура вытворчасці ў такіх паселішчах найбольш адпавядала мясцоваму ўкладу жыцця. Беларускія гарады мелі перавагу над расійскімі ў сферы гандлю, які тут быў больш інтэнсіўным.

**Транспарг, гандаль, крэдыт.** Да 60-х гадоў XIX ст. асноўнымі сродкамі зносін на Беларусі з'яўляліся водныя, шашэйныя і грунтавыя дарогі, якімі карыстаўся ўнутраны і замежны гандаль. Водпыя шляхі ў беларускіх губернях складалі ў сярэдзіне XIX ст. 5399 вёрст, паштовыя дарогі – 3816 вёрст, шашэйныя дарогі 1109 вёрст. Водныя шляхі ўтваралі рэкі бассйнаў Дняпра, Заходняй Дзвіны і Нёмана, што Днепра-Бугскім, Агінскім і Бярэзінскім каналамі злучаліся ў адзіную транспартную сетку. У рачным суднаходстве за 60-90-я гг. XIX ст. значна ўзрасла роля параходаў. У 1900 г. на рэках Беларусі налічвалася 194 паравых і 590 непаравых суднаў. За гэты ж перыяд прыкметна палепшылася якасць і павялічылася працягласць шашэйных дарог. У пачатку XX ст. у разліку на 100 кв. вёрст Беларусь іх мела ў 2 разы больш, чым Еўрапейская Расія. Асабліваe значэнне мела Пецярбургска-Кіеўская і Маскоўска-Варшаўская шашэмныя дарогі.

На эвалюцыю струкгуры гарадскіх населішчаў, далейшае развіццё гандлёва-прамысловай дзейнасці істотны ўплыў аказала чыгуначнае будаўніцтва. Акрамя ваенна-стратэгічных задач яно адпавядала патрэбам агульнарасійскага рынку. Аднак правядзенне чыгуначных магістраляў не ўлічвала патрэб развіцця беларускага ўнутранага рынку, існаваўшай структуры гарадскіх пасслішчаў, змяніла транзітнае становішча Беларусі ў гандлі Расіі з заходнімі краінамі. Першая чыгунка праз Бсларусь прайпіла ў 1862 г. Гродзенскі кавалак пабудаванай Пецярбургска-Варшаўскай магістралі склаў 50 вёрст. У 1866 г. было завсршана будаўніцтва Рыга-Арлоўскай чыгункі, якая прайіпла праз паўночны ўсход Беларусі

(Дзвінск – Полацк – Віцебск). У лістападзе 1871 г. быў адкрыты рух на беларускім адрэзку (праз Оршу, Барысаў, Мінск, Баранавічы) чыгуначнай магістралі Масква – Брэст. Праз два гады была здадзена ў эксплуатацыю Лібава-Роменская чыгунка, якая прайшла праз Маладзечна – Мінск – Бабруйск – Гомель. У 80-х гг. пачаўся рух на палескіх чыгунках, якія складаліся з невялікіх участкаў (Вільня – Баранавічы – Лунінец, Гомель – Лунінец – Пінск – Жабінка, Баранавічы – Слонім – Ваўкавыск – Беласток). Да палескіх чыгунак былі далучаны ўчасткі, якія звязалі Брэст з Украінай, Гомель з Бранскам. У 1896 г. закончылася будаўніцтва лініі Асіповічы –Старыя Дарогі, а ў 1902 г. Пецярбургска-Адэскай магістралі, якая пралягла праз Віцебск, Оршу. Магілёў, Жлобін.

У выніку чыгуначнага будаўніцтва асноўнымі вузламі і цэнтрамі транзітнага гандлю сталі Мінск, Гомель, Орша, Жлобін, Пінск, Мазыр, Слонім, Баранавічы, Лунінец і інш. Аднак на мясцовым рынку новыя чыгуначныя станцыі не адразу станавіліся гандлёвымі цэнтрамі. У 60-90-х гг. паступова страчваюць сваю ролю кірмашы, затое актывізусцца магазінна-крамны гандаль. У канцы XIX ст. на яго прыходзілася 95% усяго ўнутранага абароту гарадоў.

На беларускім рынку галоўным таварам у канцы XIX ст. быў лес. Другое месца па значнасці ў грузаабароце займала група прадуктаў паляводства (зернявыя, плады, гародніна і г. д.). Аднак удзельная вага гэтых тавараў на працягу другой паловы XIX ст. скарачалася, асабліва ў сувязі з аграрным крызісам. Апошні прывёў да пераспецыялізацыі землеўласнікаў на мясамалочную вытворчасць і адпаведна да росту ў тавараздвароце ўдзельнай вагі прадуктаў жывёлагадоўлі. У грузаабароце Беларусі былі тавары з мінеральнага паліва, будаўнічых матэрыялаў, металічных вырабаў, шкла, солі.

Прадукты сельскай гаспадаркі і вырабы прамысловасці, акрамя збыту на месцы, вывозіліся ў гарады Расіі, Украіны, Польшчы. Спірт вывозіўся ў Пецярбург, Кіеў, Адэсу, Маскву, Цвер. Прадукцыя запалкавых фабрык адпраўлялася ў Ромны, Палтаву, Харкаў, Варшаву, Баку; папера і кардон – у Кіеў, Екацярынаслаў, Адэсу, Рыгу. Вырабы шкляной і керамічнай прамысловасці збываліся ў Маскве, Кіеве, Адэсе.

У другой палове XIX ст. з развіццём гандлёвага прадпрымальніцтва вырасла колькасць асоб, якія ім займаліся. Склад апошніх па саслоўнаму паходжанню і сацыяльна-эканамічнаму становішчу істотна пашырыўся. Да канца XIX ст. гандлёвае прадпрымальніцтва ў адносна буйных памерах заканадаўча звязвалася з прыналежнасцю да купецкага саслоўя. На пачатку 60-х гг. колькасць купцоў у

беларускіх губернях складала 14,9 тыс. чалавек. Перапіс насельніцтва 1897 г. зафіксаваў тут каля 18,3 тыс. чалавек. Аднак многія прадпрымальнікі лічылі для сябе больш мэтазгодным заставацца па-за межамі купецкага саслоўя, прыналежнасць да якога не давала ніякіх рэальпых пераваг. Яны пабывалі пасведчанні на права займацца гандлем і промысламі, але не выкуплялі гільдзейскіх дакументаў. Акрамя таго, статыстыка набытых прамысловых дакументаў улічвала і дробнае прадпрымальніцтва (развозны, разносны гандаль і г. д.). Так, толькі ў Мінскай губерні ў 1870 г. было выдадзена 12 625 гадавых пасведчанняў і білетаў на права гандлю і промыслаў, з іх 1317 (10,4%) – гільдзейскіх. У 1895 г. колькасць набытых тут гадавых дакументаў склала 14 239, у тым ліку 2 529 (17,8 %) купецкіх.

У сярздзіне XIX ст. пачалі з'яўляцца на тэрыторыі Беларусі крэдытныя кааператывы, аб'яднанні дробных гандляроў, рамеснікаў, сялян і г. д. У 1870 г. у Гомелі, а затым у 1874 г. – у Полацку, 1882 г. – у Віцебску былі адкрыты гарадскія грамадскія банкі, якія належалі органам гарадскога самакіравання. У 1873 г. быў створаны першы прыватны банк на тэрыторыі Беларусі – Мінскі камерцыйны. Ён займаўся пераважна крэдытаваннем гандлю сельскагаспадарчай прадукцыяй, лесам. Аддзяленні банка дзейнічалі ў Гомелі, Магілёве, а таксама за межамі Беларусі – у Лібаве, Навазыбкаве. У 1881-1884 гг. у Мінску, Віцебску, Магілёве, Гродне пачалі дзейнічаць аддзяленні Дзяржаўнага банка Расіі, якія крэдытавалі багатых кліентаў. Ва ўсіх беларускіх губернях дзейнічалі аддзяленні Дваранскага зямельнага банка, які быў створаны для льготнага крэдытавання памешчыкаў пад заклад зямлі і будынкаў. У Мінску, Віцебску і Магілёве былі адчынены аддзяленні Сялянскага зямельнага банка, куды, як і ў Дваранскі зямельны банк, доступ мелі асобы праваслаўнага веравызнання. У 1874 г. з'явіліся Мінскае і Магілёўскае таварыствы ўзаемнага крэдыту, да капца XIX ст. іх колькасць павялічылася да 9. Асобныя з іх мелі нс меншы аб'ём аперацый, чым філіялы буйных агульнарасійскіх банкаў.

Па крэдытных аперацыях у сярэдзіне XIX ст. Беларусь залежала ад Германіі і яе пасрэдніцы Польшчы. У апошняй чвэрці XIX ст. асноўны накірунак унлыву ў крэдытнай сферы перамясціўся з захаду на ўсход. У гэты час ужо склалася агульнарасійская крэдытная сістэма. У 90-х гадах XIX ст. у гарадах Беларусі пачалі працаваць аддзяленні Маскоўскага міжнароднага гандлёвага банка (Віцебск, Брэст), Пецярбургска-Азоўскага (Мінск), Арлоўскага (Гомель, Орша, Бабруйск), Паўднёва-Рускага (Магілёў), Віленскага (Бабруйск), Паўднёвага (Гродна) камерцыйных банкаў. Усе беларускія губерні

былі ўключаны ў раён дзейнасці Віленскага зямельнага банка. Акрамя таго, Віцебская, Магілёўская і Мінская губерні ўваходзілі ў сферу ўплыву Маскоўскага, а Віленская і Гродзенская – падпадалі над уплыў Пецярбургска-Тульскага зямельных банкаў.

ЛЕКЦЫЯ 7

## АСАБЛІВАСЦІ САСЛОЎНАЙ УРАДАВАЙ ПАЛІТЫКІ Ў 60-90-я гг. XIX ст.

- *Нацыянальны аспект*
- *Сацыяльна-саслоўныя праблемы*

**Нацыянальны аспект.** Нацыянальная палітыка Расійскага ўрада ў дачыненні да Беларусі вызначалася ў большай ступені спецыфічнымі чым агульнымі рысамі. Прычыны гэтага былі абумоўлены неабходнасцю змагання расійскага самадзяржаўя з уплывам польскага нацыянальна-вызваленчага руху і рэжымам абмежавальных законаў, асабліва ў дачыненні яўрэйскага насельніцтва.

Абмежавальныя законы прывялі да штучнай канцэнтрацыі яўрэяў у гарадах і мястэчках Беларусі, колькаснай перавагі іх сярод гарадскога пралетарыяту і гандлёва-прамысловага насельніцтва, адбіліся на ўзроўні канцэнтрацыі прадпрыемстваў і дэфармавалі структуру прамысловай і гандлёвай буржуазіі, пралетарыяту, затрымлівалі іх кансалідацыю як сацыяльных груп. Яны абвастрылі аграрную перанаселенасць у Беларусі, прывялі да зніжэння кошту зямлі, перашкаджалі яе вольнай куплі-продажу, спрыялі захаванню дваранскага землеўладання ў беларускіх губернях.

Кантынгент чыноўнікаў у Беларусі другой паловы XIX ст. фарміраваўся ў асноўным за кошт прысланых з унутраных губерняў Расіі дзяржаўных служачых. З 1863 па 1865 гг. у беларускіх губернях было прызначана на службу звыш 4600 новых чыноўнікаў. Пераважная большасць з іх з'яўлялася ўраджэнцамі велікарускіх губерняў. Каб утрымаць запрошаных чыноўнікаў на новым месцы, ім на льготных умовах прадаваліся казёныя і канфіскаваныя маёнткі, устанаўліваліся павышаныя аклады. Так, у 1866-1873 гг. у Віленскай, Мінскай і Гродзенскай губернях 300 чыноўнікаў купілі 329 зямельных уладанняў агульнай плошчай 146,3 тыс. дзесяцін. Наогул, для службы ў заходняй частцы Расійскай імперыі заахвочваліся ўраджэнцы велікарускіх губерняў. Трэба зазначыць, што далёка не заўсёды прынятыя льготы апраўдваліся. Нярэдка губернатары скардзіліся на тое, што прыезджыя чыноўнікі характарызаваліся нізкімі маральнымі і прафесійнымі якасцямі. Ахвочымі да прапанаваных прывілеяў былі

чыноўнікі авантурыскага складу, якія не стваралі аўтарытэту расійскім уладам сярод мясцовага грамадства.

Росту аграрнай перанаселенасці ў беларускай вёсцы садзейнічала абмежаванне перасялення сялян на слабанаселеныя і вольныя землі Расійскай імперыі. Яно праводзілася з мэтай захавання таннай рабочай сілы і ўмацавання "рускага элемента" ў беларускіх губернях за кошт праваслаўнага сялянства. Гэта падмацоўваў закон 13 ліпеня 1889 г. і пазней крыху яго аблегчыў цыркуляр 2 ліпеня 1894 г., які ствараў больш спрыяльныя ўмовы перасялення.

Урадавая палітыка ў дачыненні да дваранства Беларусі змянялася ў залежнасці ад нацыянальна-канфесійнай прыналежнасці яго прадстаўнікоў, пашырэння польскага нацыянальнага руху і рэвалюцыйнага руху ў Расіі, змен у адносінах дваранства да ўрадавых мерапрыемстваў, асабліва рэалізацыі рэформы 1861 г. і аграрнага заканадаўства.

У першыя гады пасля падаўлення паўстання 1863 г. урад ставіўся з недаверам да каталіцкага дваранства; гэта вызначалася рэпрэсіўнымі мерамі ў сферы землеўладання і землекарыстання, некаторым абмежаваннем саслоўных правоў. Мясцовае дваранства ўрадам было як бы падзелена на часткі. Большасць дваран каталіцкага веравызнання лічыліся нядобранадзейнымі ў палітычных адносінах, меншасць – праваслаўнага веравызнання, нямецкія памешчыкі, дваране прыбалтыйскага паходжання – былі прызнаны апорай самадзяржаўя.

Пасля паўстання 1863 г. урад вярнуўся да палітыкі прыпіскі да падатковых саслоўяў беззямельнай і неаселай шляхты, якая актыўна праявіла сябе ў нацыянальным руху. У новых правілах 1864 г. ускладніліся шляхі пацвярджэння шляхтай сваёй дваранскай годнасці, што скарачала колькасць прадстаўнікоў вышэйшага саслоўя. У беларускіх губернях была прыпынена дзейнасць дваранскіх сходаў – саслоўных выбарных органаў, а таксама зачынены дваранскія вучылішчы, заканчэнне якіх давала права паступаць на дзяржаўную службу. У дваранскія вучылішчы паступалі пераважна дзеці маламаёмаснай шляхты, сацыяльная і палітычная актыўнасць якіх выклікала асаблівую заклапочанасць ва ўрада. Уведзены былі абмежаванні пры паступленні каголікаў у вышэйшыя і сярэднія навучальныя ўстановы. Да 1868 г. на тэрыторыі Беларусі захоўвалася ваеннае становішча. Дваранству ў час яго дзеяння забаранялася збірацца разам па некалькі чалавек, нават на сямейныя ўрачыстасці, без асобага дазволу мясцовых уладаў. Захоўваліся штрафы і кантрыбуцыйныя зборы, якія спачатку накладваліся бескантрольна і

ператварыліся ў крыніцу дадатковых даходаў мясцовых уладаў, а з 1866 г. накладваліся толькі са згоды губернатара.

Пасля адмены ваеннага становішча ў заходніх губернях урад меў пэўныя хістанні ў сваёй палітыцы ў дачыненні да дваранства. Але ў канчатковым выніку, адмовіўшыся што-небудзь змяніць у сферы абмежаванняў у адносінах да каталіцкай часткі дваранства, ён пайшоў па шляху выключэнняў з правіла, вызваляў ад дзеяння закона асобных дваран, прадстаўляючы гэта як акт асаблівай міласці. Такім чынам, улады стрымлівалі незадаволеных і задавальнялі тых, якія ішлі на супрацоўніцтва. Праўда, спачатку на некаторыя ўступкі ўрад пайшоў. У 1867 г. было дазволена замяніць прадвадзіцеляў дваранства, якія не мелі маёнткаў у краі, на мясцовых рускіх ці праваслаўных памешчыкаў. Акрамя таго, у 1867 г. былі спынены ўсе незавершаныя следчыя справы па ўдзелу ў паўстанні, а тым, каго выслалі ў адміністрацыйным парадку з Царства Польскага і заходніх губерняў, было дазволена вяртацца.

Пачынаючы з канца 60-х гг. XIX ст. урад палічыў магчымым змяніць адносіны ў дачыненні да каталіцкай царквы і выдання польскай літаратуры. Не адмяняючы ўведзеных абмежаванняў, урад вырашыў пазбягаць дзеянняў, якія б маглі быць расцэнены як ганенні на каталіцкую царкву. Закрыццё касцёлаў і капліц адбывалася з вялікай перасцярогай. У мясцовым друку спыніліся адкрытыя нападкі на католікаў. Аднак мясцовая адміністрацыя не адмовілася ад пільнага нагляду за каталіцкімі святарамі і за зместам іх пропаведзяў. Па-ранейшаму не дазвалялася ксяндзам пакідаць свае прыходы без дазволу мясцовых уладаў, забараняліся духоўныя працэсіі, якія не былі ўстаноўлены каталіцкай царквой. Праяўленне некаторай лаяльнасці ў канфесійным пытанні было выклікана ўзнікненнем зацікаўленасці ўрада ў саюзе з мясцовым каталіцкім дваранствам для ўмацавання сваёй сацыяльнай апоры.

Пачынаючы з сярэдзіны 1869 г. у беларускіх губернях аднавілі выданне кніг на польскай мове. У 70-х гг. XIX ст. з дазволу віленскага цэнзара былі выдадзены 254 кнігі на польскай мове, галоўным чынам на рэлігійную тэматыку. Пры неабходнасці невялікія падачкі мясцоваму дваранству ўрадавымі коламі разглядаліся як першы крок да поўнага задавальнення іх памкненняў узамен на адмову змагацца за адраджэнне Польшчы.

У час палітычнай рэакцыі 80 – пачатку 90-х гг. XIX ст. ва ўмовах узмацнення палітыкі вялікадзяржаўнага шавінізму ўрад і мясцовая адміністрацыя адыходзяць ад палітыкі папярэдніх гадоў. Каталіцкае дваранства зноў успрымалася як ненадзейны саюзнік. Папярэдняя

палітыка была аб'яўлена памылковай і здрадай "рускай справе" ў Беларусі. Па загаду віленскага генерал-губернатара І.С. Каханава ў 1884-1885 гг. большасць чыноўнікаў каталіцкага веравызнання зноў была звольнена і заменена на рускіх. Да 1888 г. былі зменены ўсе прадвадзіцелі дваранства з ліку мясцовых каталіцкіх землеўладальнікаў на рускіх дваран, многія з якіх не мелі зямельнай уласнасці ў Беларусі. Былі спробы нават зачыніць таварыствы сельскіх гаспадароў у сувязі з тым, што там, на думку расійскіх уладаў, справамі кіравалі "польскія" землеўласнікі. Мясцовыя ўлады ўзмацнілі дыскрымінацыйныя меры ў дачыненні да каталіцкага дваранства, не дапускалі парушэнняў абмежавальных законаў у сферы землеўладання і землекарыстання католікаў і яўрэяў.

У залежнасці ад таго, як змяняліся адносіны ўладаў да дваранства Беларусі адбываліся перамены ва ўрадавай палітыцы ў дачыненні да сялянства. Адмена ва ўмовах паўстання 1863 г. часоваабавязаных адносін сялянства і перавод яго ў разрад уласнікаў нрымусілі ўрад тэрмінова вырашаць пытанні забеспячэння сялян палівам, размежавання памешчыцкіх і сялянскіх угоддзяў, а таксама сервітутнае пытанне. Памешчыкі пасля адмены часоваабавязанага стану нярэдка переставалі забяспечваць сялян і лічылі, што апошнія страцілі права на сервітуты. У 1863 г. урад быў зацікаўлены ў спакоі вёскі і ў сувязі з гэтым пайшоў на ўступкі сялянству. У адпаведнасці з распараджэннем віленскага генерал-губернатара за сялянамі захоўвалася права атрымання паліва ад памешчыкаў па ўстаноўленай плаце ці за павіннасці. Урад забараніў у Беларусі і Літве абавязковае размежаванне ўгоддзяў па жаданню аднаго толькі памешчыка і захаваў за сялянамі права на сервітуты. Пасля 1864 г., калі паўстанне станавілася ўсе больш аддаленай гістарычнай падзеяй, урад спыніў уступкі сялянству.

Ужо ў канцы 60-х гг. мясцовая адміністрацыя прапанавала ў выпадках несупадзення памераў сялянскіх надзелаў у сапраўднасці і паводле выкупнога акта браць за аснову памер надзелу адпаведнага выкупнога акта, што фактычна пазбаўляла беларускіх сялян права на іх дарэформенны надзел.

Сялянам прапаноўвалася заключаць пагадненні з памешчыкамі аб передачы ім лішкаў зямлі супраць выкупных дакументаў за дадатковыя выкупныя плацяжы. У такой сітуацыі складаўся дадатковы акт. У выпадку, калі землеўладальнік не пагаджаўся на вяртанне зямлі, то яе адразалі ў карысць памешчыка.

На рубяжы 70-80-х гг. урад зноў зрабіў некаторыя крокі ў сялянскім пытанні і ўлічыў бяскрыўдныя для памешчыкаў

патрабаванні сялян. Не парушаючы правоў памешчыкаў, у канцы 70 – пачатку 80-х гг. была зменена падатковая сістэма, устаноўлены абавязковы выкуп зямлі для ўсіх сялян. З мэтай змяншэння малазямелля спрабавалі стварыць умовы для перасялення сялян на вольныя землі і арганізаваць крэдыт для набыцця зямлі. Акрамя таго, прадугледжвалася ліквідацыя сервітутаў і ўладкаванне зямельнага пытання для дробных катэгорый сельскага насельніцтва. У 1882 г. быў створаны Сялянскі пазямельны банк з мэтай арганізацыі крэдыту для сялян, аказання дапамогі ў набыцці зямлі. У 1886 г. у Мінску было адчынена аддзяленне гэтага банка, што з вялікай надзеяй было сустрэта ліберальнымі коламі мясцовага грамадства. Аднак з-за вялікіх працэнтных ставак дорага абыходзілася зямля, набытая праз банк, у параўнанні з яе рынкавым коштам.

Сяляне былі абцяжараны вялікімі выкупнымі плацяжамі. У сувязі з гэтым неаднаразова ўздымалася пытанне аб спісанні нядоімак. 21 лютага 1884 г. быў прыняты закон, паводле якога зніжаліся выкупныя плацяжы для сялян Магілёўскай і беларускіх паветаў Віцебскай губерняў. Па закону 18 мая 1882 г. у Расійскай імперыі паступова адмянялася падушная подаць.

У 70-90-х гг. у адносінах да сялянства праводзілася палітыка стрымлівання паўперызацыі вёскі, ускладнення адрыву ад зямлі сялянства, захавання сельскай грамады. На гэта былі нацэлены закон 14 снежня 1893 г. аб неадчужэнні сялянскіх надзельных зямель і закон аб сельскагаспадарчых рабочых ад 12 чэрвеня 1896 г., якія часткова аднавілі назаэканамічную залежнасць сялян ад памешчыкаў.

Такім чынам, у залежнасці ад напружанасці польскага нацыянальна-вызваленчага руху і палітычнай сітуацыі ў краіне змянялася палітыка і адносіны ўрада ў дачыненні да розных сацыяльных груп, перш за ўсё сялянства і дваранства – звычайна ў супрацьлеглай залежнасці. Хаця, незалежна ад веравызнання, дваранства заставалася ва ўрадавай палітыцы асноўнай сацыяльнай апорай.

**Сацыяльна-саслоўныя праблемы.** У 60-90-х гг. XIX ст. структура насельніцтва Беларусі ўяўляла складанае перапляценне элементаў, характэрных для буржуазнага грамадства і саслоўнай іерархіі мінулай эпохі. Працэс буржуазнай эвалюцыі сацыяльнай структуры насельніцтва Беларусі стрымлівала ўрадавая палітыка, асабліва абмежавальныя законы ў дачыненні яўрэяў, католікаў, замежных грамадзян і сялянства. У той самы час капіталізацыя сельскай гаспадаркі, развіццё фабрычна-заводскай прамысловасці прычыніліся да адпаведных перамен у складзе грамадства,

фарміравання сацыяльных груп буржуазнага грамадства, інтэнсіфікацыі урбанізацыйных працэсаў.

Насельніцтва Беларусі ў 60-90-х гг. XIX ст. павялічылася амаль у два разы. Колькасць жыхароў у 1858 г. у сучасных межах рэспублікі складала 3273,9 тыс. чалавек, а ў 1897 г. -6387,0 тыс. Для Беларусі ў абазначаны перыяд быў характэрны больш высокі натуральны прырост насельніцтва, чым у Еўранейскай Расіі, большы прыток жыхароў, чым выезд. Шчыльнасць насельніцтва ў Беларусі ў 1858 г. складала 16 чалавек на 1 км$^2$ (Еўрапейская Расія - 12), у 1897 г. – 31 чалавек на 1 км$^2$ (Еўрапейская Расія – 22). Да канца XIX ст. удзельная вага насельніцтва Беларусі ў агульнарасійскай складала 5,1 %, тэрыторыі - 0,9%.

Саслоўны склад жыхароў пяці беларускіх губерняў, напярэдадні рэформы 1861 г., выглядаў наступным чынам: дваране (спадчынныя і асабістыя) складалі 5,1% (220 973 чал.) насельніцтва, хрысціянскія святары – 0,6% (27 717 чал.), ганаровыя грамадзяне – 0,012% (550 чал.), купцы – 0,4% (16 699 чал.), мяшчане – 12,3% (542 966 чал.), цэхавыя – 0,9% (38 434 чал.), сяляне – 77% (3 397 377 чал.), ваенныя саслоўі (за выключэннем рэгулярных войскаў) – 1,6% (72 209 чал.).

Адпаведна расійскаму заканадаўству ўсё вышэйшае саслоўе ў залежнасці ад паходжання і заслуг падзялялася на спадчыннае, якое перадавалася з пакалення ў пакаленне, і асабістае (пажыццёвае). Да 60-х гг. XIX ст. 14% спадчыннага дваранства Беларусі валодала зямлёй і сялянамі. Астатнія 86% складала дваранства, якое абазначалася ва ўрадавых дакументах таго часу як шляхта. Да яе ліку адносіліся тыя, хто не валодаў зямлёй ці меў ва ўласнасці зямлю не населеную сялянамі.

Святарства Беларусі ў асноўным было прадстаўлена праваслаўнымі, каталіцкімі і іудзейскімі служыцелямі культа. Астатнія яго групы - евангеліцка-лютэранскае, евангеліцка-рэфармацкае, мусульманскае – былі нешматлікімі. У 1866 г. налічвалася рэлігійных прадстаўнікоў: 18 593 – праваслаўных святароў, 679 – каталіцкіх, 1713 – іудзейскіх, 89 – аднаверскіх, 55 – мусульманскіх, 47 – евангеліцка-рэфармацкіх, 15 – евангеліцка-лютэранскіх, а ўсяго – 21 193.

Ганаровыя грамадзяне ўяўлялі сабой вышэйшае гарадское саслоўе. Яны падзяляліся на спадчынных і асабістых. Пачэснае грамадзянства атрымлівалі ад нараджэння дзеці асабістых дваран, праваслаўных святароў, калі апошнія мелі пэўныя багаслоўскія вучоныя ступені па заканчэнню духоўнай акадэміі ці семінарыі і г. д. Да гэтага саслоўя прыпісваліся купцы пасля 20 год знаходжання ў

гільдзействе ці па атрыманню ордэна; камерц- і мануфактурсаветнікі; асобы, якія закончылі універсітэт з вучонай ступенню магістра ці доктара; чыноўнікі з XIV па IX класы і інш. Прадстаўнікі гэтага саслоўя займаліся прамысловым, гандлёвым прадпрымальніцтвам, "вольнымі" прафесіямі. Заканадаўча афармленыя іх прывілеі ў 60-90-я гг. пастулова страцілі сваё рэальнае значэнне. Да катэгорыі "цэхавыя" адносілася карпарацыйная частка гарадскіх рамеснікаў.

У другой палове XIX ст. вырасла колькасць асоб, якія займаліся гандлёвым прадпрымальніцтвам. Склад апошніх па саслоўнаму паходжанню істотна пашырыўся. Многія прадпрымальнікі ў канцы XIX ст. лічылі для сябе больш мэтазгодным знаходзіцца за межамі купецкага саслоўя, прыналежнасць да якога не давала ніякіх рэальных пераваг. Яны набывалі насведчанні на права займацца гандлем і промысламі, але не выкуплялі гільдзейскія дакументы. Усё ж гандлёвае прадпрымальніцтва ў адносна буйных памерах заканадаўча звязвалася з прыналежнасцю да купецкага саслоўя. Акрамя таго, купцам належала каля 30% фабрычна-заводскіх прадпрыемстваў і мануфактур.

Сярод ваенных саслоўяў, акрамя рэгулярных войскаў, асобна ўлічвалася колькасць бестэрмінова адпушчаных, адстаўных ніжэйшых вайсковых чыноў, дзяцей і жонак салдат і кантаністаў. Асноўная маса іх жыла ў сельскай мясцовасці, займалася земляробствам, промысламі.

У другой паловс XIX ст. саслоўныя перагародкі захоўваюцца. Гэтаму спрыяла ўрадавая палітыка, а таксама традыцыйная грамадская свядомасць людзей. Аднак пад уплывам развіцця буржуазных адносін саслоўныя межы расплываліся. фармальнымі яны станавіліся ў першую чаргу ў эканамічных адносінах. Утвараліся новыя сацыяльна-прафесійныя групы, якія ўключалі прадстаўнікоў розных саслоўяў. Сімптаматычным пацвярджэннем адзначанага працэсу стаў закон 1898 г., які зацвярджаў Палажэнне аб дзяржаўным прамысловым падатку. Паводле яго неабавязкова было запісвацца ў купецкае саслоўе.

Паводле матэрыялаў перапісу насельніцтва 1897 г. саслоўны склад жыхароў пяці беларускіх губерняў выглядаў наступным чынам: дваранства складала 2,4% насельніцтва, духавенства – 0,3%, пачэсныя грамадзяне – 0,2%, купцы – 0,22%, мяшчане – 20,9%, сяляне – 75,3%. Удзельная вага розных саслоўных груп за 60-90-я гг. XIX ст. змянілася нязначна, можна заўважыць толькі тэндэнцыю росту гарадскіх катэгорый насельніцтва.

Змены ў сацыяльнай структуры беларускага грамадства адлюстроўваюцца ў яго занятках. Паводле перапісу 1897 г., сярод жыхароў Беларусі 8,15% былі заняты ў прамысловасці (тут улічаны і прадпрымальнікі, і інжынерна-тэхнічныя работнікі, і рабочыя); 4,9% - у сферы гандлю; 3,5% - прыватнай службай, прыслуга, падзёншчыкі; 1,7% - на транспарце і ў сувязі; 1,15% - ранцье; 1,15% - ваеннаслужачыя; 0,6% - чыноўнікі; 0,01% - прадстаўнікі вольных прафесій (вучэбная і выхаваўчая дзейнасць, урачэбная і санітарная праца, работа ў сферы навукі, літаратуры і мастацтва, прыватная юрыдычная практыка); 0,05% - пенсіянеры; 0,04 % - духавенства і 75,1% -сельскагаспадарчае насельніцтва. Да канца XIX ст. у Беларусі склаўся даволі шматлікі слой людзей, якія былі заняты ў прамысловасці, гандлі, прыватнай службай і г. д.

Развіццё прамысловасці і гандлю спрыяла фарміраванню прадпрымальніцкай дзейнасці. Буржуазія пашыралася за кошт прадстаўнікоў розных саслоўяў, найперш дваранства і купецтва, а таксама мяшчан, саслоўя пачэсных грамадзян, сялян і інш. Асноўная маса мануфактур і фабрык да канца XIX ст. належала дваранам. Гэты былі пераважна прадпрыемствы па прамысловай перапрацоўцы сельскагаспадарчай прадукцыі з памешчыцкіх маёнткаў. Уладальнікамі дробных прадпрыемстваў у гарадах і мястэчках Беларусі з'яўляліся звычайна мяшчане, у большасці сваёй прадстаўнікі яўрэйскай нацыянальнасці. За другую палову XIX ст. агульная колькасць уладальнікаў прамысловых прадпрыемстваў у Беларусі вырасла з 28,2 тыс. чалавек у 1860 г. да 77,1 тыс. чалавек у 1900 г. Сюды ўключаны гаспадары рамесных, дробнакапіталістычных і мануфактурна-фабрычных прадпрыемстваў, пры гэтым звыш 75% складалі ўладальнікі першых з іх і толькі каля 2,5% (1897 чалавек) адносіліся да буйной і сярэдняй буржуазіі, уладальнікаў фабрык, заводаў, мануфактур. У 1890 г. сярод 343 уладальнікаў фабрык і заводаў Беларусі, улічаных афіцыйнымі статыстычнымі крыніцамі Расійскай імперыі, 169 (49,3%) з'яўляліся дваранамі, 113 (32,9%) – купцамі, 14 (4,1%)) – мяшчанамі, 5 (1,5%) – сялянамі. З цягам часу паступова змяншалася доля дваран сярод уладальнікаў буйпых і сярэдніх прадпрыемстваў.

Яшчэ да правядзепня рэформы 1861 г. у прамысловасці Беларусі налічвалася 41,5 тыс. паёмных работнікаў, у тым ліку 3,1 тыс. фабрычных і 4,7 тыс. мануфактурных. У 60-70-я іт. XIX ст. павелічэнне колькасці пралетарыяту ў Беларусі адбывалася адносна невысокімі тэмпамі. У далейшым, асабліва ў 90-я гг., рост колькасці

рабочых паскорыўся. Гарадскі пралетарыят найперш папаўняўся за кошт збяднелых мяшчан, рамеснікаў, гандляроў.

Беларусь у 60-90-х гг. XIX ст. заставалася аграрным рэгіёнам. Рэформа 1861 г. змяніла характар і тэмп сацыяльных працэсаў сярод беларускага сялянства, хаця яго ўдзельная вага сярод насельніцтва практычна не змянілася. Пасля адмены прыгоннага права сярод сялянства захаваўся падзел на некалькі катэгорый – былыя памешчыцкія, дзяржаўныя, удзельныя, дваравыя і іншыя, якія адрозніваліся паміж сабой па характару надзельнага землеўладання, умовах выкупу і памерах плацяжоў. Урадавая палітыка садзейнічала захаванню падзелу сялянства на розныя групы, які праіснаваў да пачатку XX ст. Па дадзеных 1858 г., у беларускіх губернях налічвалася 2 477 568 памешчыцкіх сялян, з іх 51 284 дваравых; 869 353 дзяржаўных і 24 373 удзельных. Дзяржаўныя сяляне былі крыху заможней былых памешчыцкіх, яны валодалі ў сярэднім большымі кавалкамі надзельнай зямлі. Прыкладна ў аднолькавым маёмасным становішчы з былымі дзяржаўнымі знаходзіліся ўдзельныя сяляне.

Акрамя сялянства існавалі і іншыя даволі нешматлікія групы сельскіх жыхароў – стараверы, чыншавікі, аднадворцы, вольныя людзі, праваслаўныя, арандатары і інш. Стараверы ўяўлялі сабой кансерватыўную групу, якая жыла абасоблена ад вясковага насельніцтва. Гэтаму спрыялі іх этнарэлігійныя адрозненні. Стараверы больш негатыўна ўспрымалі праявы сялянскага і нацыянальна-вызваленчага руху, падтрымлівалі ўрадавыя мерапрыемствы. Большасць старавераў была сканцэнтравана ў Віцебскай і Магілёўскай губернях. У канцы XIX ст. іх тут налічвалася каля 125 тыс. чалавек.

Праваслаўныя арандатары былі сканцэнтраваны ў асноўным у Мінскай губерні і складалі невялікую колькасць. У 1861 г. у Беларусі іх налічвалася каля 13,5 тыс. чалавек. Праваслаўныя арандатары былі землекарыстальнікамі і толькі ў 90-х гг. XIX ст. атрымалі магчымасць выкупляць арандаваныя імі землі.

У Беларусі канца XIX ст. налічвалася некалькі соцень тысяч чыншавікоў. Яны бестэрмінова карысталіся зямлёй і абавязаны былі плаціць уладальніку зямлі грашовы аброк і выконваць шэраг павіннасцяў адпаведна закону ці звычаю. Прадстаўнікі гэтай сацыяльнай групы маглі чыншавае права прадаваць, дарыць, перадаваць у спадчыну, закладваць.

Адсутнасць заканадаўчых мер па іх землеўладкаванню дала памешчыкам падставу для згону іх з зямлі пасля рэформы 1861 г. Толькі ў 1886 г. урад пацвердзіў права чыншавікоў на вечнае

карыстанне зямлёй і даў ім магчымасць у трохгадовы тэрмін выкупіць зямлю.

У пачатку 60-х гг. XIX ст. у беларускіх губернях налічвалася каля 100 тыс. "вольных людзей". Гэта былі нашчадкі вызваленых з-пад прыгону сялян. Асобную групу сельскіх жыхароў складалі аднадворцы - былая шляхта, не зацверджаная ў дваранскіх правах. У пачатку 60-х гг. іх колькасць у Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губернях складала каля 58 тыс. чалавек. Пасля паўстання 1863 г. колькасць аднадворцаў павялічылася з-за паскоранага працэсу "разбору шляхты". У сярэдзіне 60-х гг. XIX ст. толькі ў Мінскай губерні аднадворцаў налічвалася звыш 37 тыс. чалавек. Столькі ж прыкладна іх было ў Магілёўскай губерні.

Трансфармацыя сялянства Беларусі ў 60-90-х гг. XIX ст. Адбывалася пад уплывам эвалюцыі буржуазных адносін. З гэтым працэсам звязаны сацыяльныя змены ў асяроддзі самога сялянства: узмацненне маёмаснага расслаення, паскарэнне міграцыйных працэсаў сярод сельскіх жыхароў, з'яўленне новых рыс у менталітэце і новых формаў сялянскага руху. Аднак гэтыя змены адбываліся нераўнамерна ў прасторы і часе. Заўважацца яны пачалі з 80-х гг. XIX ст.; 60-70-я гг. ніякіх істотных змен не прынеслі. На эвалюцыю сялянства значны ўплыў аказаў аграрны крызіс 80-х гг. XIX ст. Ён садзейнічаў сацыяльнай дыферэнцыяцыі вясковага насельніцтва і росту аграрнай буржуазіі. У рэгіянальных адносінах буржуазная трансфармацыя сялянства найменш інтэнсіўна адбывалася ў Віцебскай і Магілёўскай губернях, дзе панавала сялянская абшчына і больш адсталай была сельская гаспадарка.

У канцы XIX ст. склад насельніцтва Беларусі ўяўляў сабой заблытанае перапляценне саслоўных і сацыяльна-прафесійных груп жыхароў, што дадаткова ўскладнялася саслоўнай урадавай палітыкай і сістэмай абмежавальных мерапрыемстваў у дачыненні да асобных катэгорый насельніцтва.

ЛЕКЦЫЯ 8

## ГРАМАДСКІ РУХ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX ст.

- *Паўстанне 1863-1864* гг.
- *Ліберальны рух*
- *Народніцтва*
- *Эвалюцыя беларускай нацыі*
- *Рабочы рух, прапаганда марксізму*

**Паўстанне 1863-1864 гг.** Пачатак 1863 г. азнаменаваўся новым пад'ёмам сялянскага руху на Беларусі, які быў вызначаны спадзяваннямі былых прыгонных сялян атрымаць "сапраўдную волю" ў сувязі з пераводам іх у становішча часоваабавязаных. Гэта супала па часе з нацыянальна-вызваленчым паўстаннем, якое ахапіла ў 1863 г. Польшчу. Там яшчэ напярэдадні паўстання афарміліся два крылы, за якімі замацаваліся назвы "белыя" і "чырвоныя". "Белыя", партыя землеўладальніцкай шляхты і буржуазіі, жадалі дабіцца аднаўлення Рэчы Паспалітай, якую яны цяпер называлі не іначай, як Польшча ў межах 1772 г., спадзяваліся выкарыстаць дзеля гэтага націск заходнееўрапейскіх дзяржаў на Пецярбург. "Чырвоныя" ўяўлялі сабой разнастайны ў сацыяльных і палітычных адносінах блок. у які ўваходзіла дробная і беззямельная шляхта, інтэлігенцыя, гарадскія нізы, студэнцтва і часткова сялянства. Барацьбу за незалежнасць яны звязвалі з вырашэннем аграрнага пытання. Аднак па метаду іх вырашэння "чырвоныя" дзяліліся на правых – памяркоўных і левых – прадстаўнікоў рэвалюцыйна-дэмакратычных колаў. У рашэнні сваёй палітычнай праграмы правыя адводзілі рашаючую ролю шляхце. Яны баяліся сялянскага паўстання, але ў той самы час настойвалі на надзяленні сялян зямлёй за кошт канфіскацыі яе часткі з адпаведнай грашовай кампенсацыяй у памешчыкаў.

Левыя таксама жадалі аднаўлення Рэчы Паспалітай, але і прызнавалі права на нацыянальнае самавызначэнне літоўцаў, беларусаў і ўкраінцаў, залог поспеху нацыянальна-вызваленчай барацьбы бачылі ў саюзе з рэвалюцыйнымі сіламі Расіі. Для кіраўніцтва паўстаннем "чырвоныя" вясной 1862 г. у Варшаве стварылі Цэнтральны нацыянальны камітэт (ЦНК).

Падобныя палітычныя плыні існавалі ў Беларусі і Літве. Так, у Вільні летам 1862 г. з мэтай падрыхтоўкі паўстання быў створаны "Літоўскі правінцыяльны камітэт" (ЛПК), які фармальна быў падначалены ЦНК. У ЛПК уваходзілі прадстаўнікі як "чырвоных", так і "белых". Сярод іх былі Л. Звяждоўскі, Я. Козел, Б. Длускі, З. Чаховіч, Э.

Вярыга і К. Каліноўскі. Па ініцыятыве ЛПК збіраліся сродкі на паўстанне і былі створаны мясцовыя рэвалюцыйныя арганізацыі: гродзенская (кіраўнік К. Каліноўскі), мінская (А. Трусаў), навагрудская (У. Борзабагаты) і іншыя.

"Левую" частку паўстанцаў на Беларусі ўзначальваў Кастусь Каліноўскі (1838-1864). Ён быў выхадцам з сям'і збяднелага шляхціча Гродзенскай губерні, скончыў Пецярбургскі універсітэт, з'яўляўся актыўным удзельнікам тайнага гуртка польскага рэвалюцыянера З. Серакоўскага. Разам з В. Урублеўскім і Ф. Ражанскім К. Каліноўскі ў 1862-1863 гг. выдаваў на беларускай мове газету "Мужыцкая праўда" (усяго выйшла 7 нумароў), прасякнутую рэвалюцыйна-дэмакратычнымі ідэямі. Газета растлумачвала сялянам прыгонніцкія рысы аграрнай рэформы, заклікала іх не верыць цару і разам "з мужыкамі з-пад Варшавы... і ўсёй Расіі са зброяй у руках ісці здабываць сапраўдную волю і зямлю". "Мужыцкая праўда" брала пад абарону уніяцкую царкву.

У ходзе паўстання, якое пачалося ў Варшаве ў ноч на 23 студзеня, ЛПК прыняў праграму, раней абвешчаную радай ЛПК. Гэта праграма прадугледжвала раўнапраўе грамадзян незалежна ад саслоўя, нацыянальнасці і веравызнання, поўную ўласнасць сялян на надзелы, якія знаходзіліся ў іх карыстанні, адмяняла іх феадальныя павіннасці. Тым не менш, яна была за захаванне памешчыцкага землеўладання і выкуп зямлі, якая пераходзіла сялянам. Бсззямельныя сяляне, удзельнікі паўстання, павінны былі атрымаць па 3 маргі (зямельная мера, раўная 0,71 га) зямлі. Па свайму сацыяльна-эканамічнаму характару гэта была буржуазная праграма.

1 лютага 1863 г. ЛПК, які ўзначальваў К. Каліноўскі, звярнуўся да насельніцтва Беларусі і Літвы з заклікам падняцца на ўзброеную барацьбу. К. Каліноўскі і яго паплечнікі галоўнай мэтай паўстання лічылі адраджэнне Рэчы Паспалітай абодвух народаў, у гэтым яны бачылі вызваленне беларускага народа ад прыгнечанага стану. Сваю краіну К. Каліноўскі называў то Беларуссю, то Літвой, ён не змог удакладніць гэтыя паняцці. Можна меркаваць, што пад Беларуссю К. Каліноўскі разумеў сучасную Усходнюю Беларусь, а пад Літвой – Заходнюю, з Вільняй уключна. (Дарэчы, літоўцы-жамойты, як і ўкраінцы ўдзелу ў паўстанні не прымалі, іх не цікавіла праблема аднаўлення Рэчы Паспалітай абодвух народаў, у якой яны не былі ані першым, ані другім народам). Першыя паўстанцкія атрады былі створаны на тэрыторыі заходніх паветаў Беларусі ў сакавіку-красавіку. Яны фарміраваліся з мелкай шляхты, афіцэраў, рамеснікаў, студэнтаў, гімназістаў старэйшых класаў, сялян. Атрады

паўстанцаў, якія ўзначальвалі В. Урублеўскі, Ф. Ражанскі (Гродзенская губ.), З. Серакоўскі і А. Мацкявічус (Ковенская губ.), М. Чэрняк (Віленская губ.), імкнуліся прыцягнуць да паўстання як мага больш сялян, спрабавалі рэалізаваць аграрную праграму. Кіраўнікі паўстання мелі намер распаўсюдзіць паўстанне на прыбалтыйскія і рускія губерні. Для гэтага прадугледжвалася стварэнне новых атрадаў: З. Серакоўскага ў Жамойціі і Эстоніі, О. Грабніцкага, Б. Кульчыцкага ў Віцебскай губерні. На дапамогу Л. Звяждоўскаму з Пецярбурга і Масквы прыбылі афіцэры І. Будзіловіч, К. Жаброўскі і іншыя, каб распаўсюдзіць паўстанне на Смаленск і Маскву.

У хуткім часе "белыя" захапілі кіраўніцтва паўстаннем у свае рукі. У сакавіку 1863 г. па ўказанню ЦНК быў створаны "Аддзел кіраўніцтва правінцыямі Літвы" ўзамен распушчанага ЛПК. У склад мясцовых рэвалюцыйных арганізацый былі ўведзены прыхільнікі "белых". К. Каліноўскі, каб не ўносіць раскол у рады паўстанцаў, вымушаны быў падпарадкавацца.

У маі паўстанне ў Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай губернях было падаўлена. Цэнтрам паўстанцкага руху становіцца Гродзенская губерня, куды ў красавіку 1863 г. у якасці ваяводскага камісара прыязджае К. Каліноўскі. У Беларусь і Літву былі кінуты буйныя сілы для падаўлення паўстання. У маі 1863 г. генерал-губернатарам з неабмежаванымі паўнамоцтвамі быў прызначаны М.М. Мураўёў. Ён казаў пра сябе, што ён не з тых Мураўёвых, якіх вешаюць, але з тых, якія вешаюць. Тады ж для заспакаення сялян былі ўнесены змяненні ў "Палажэнні" 19 лютага. Для Беларусі і Літвы быў уведзены абавязковы выкуп сялянскіх надзелаў і прадугледжана неадкладнае вяртанне сялянскіх адрэзкаў, а таксама памяншэнне выкупных плацяжоў на 20%. Беззямельных сялян надзялялі зямлёй, па 3 дзесяціны. М. Мураўёў абавязаў сельскія таварыствы наглядаць за мясцовай шляхтай, арганізаваў сялянскія каравулы, якія павіны былі весці барацьбу з паўстанцамі, разгарнуў шырокую антыпольскую і антыпаўстанцкую агітацыю.

Гэтыя меры, а таксама нерашучая аграрная палітыка ЦНК значна звузілі геаграфію сялянскага руху. Асноўная маса сялян Беларусі ўдзелу ў паўстанні не прымала (сярод паўстанцаў сяляне складалі не больш 16%), прычым шмат хто з іх быў мабілізаваны сілаю. Такім чынам, разлічаная на пашырэнне сялянскага руху тактыка левых не апраўдалася. Акрамя таго, кіраўнікі "Літоўскага аддзела", баючыся рэпрэсій, пакідалі свае пасады. Панічны настрой сярод "белых" у Вільні быў абумоўлены стратай імі веры ў дапамогу з

боку Англіі і Францыі, урады якіх адкрыта спачувалі, але нічога не зрабілі. каб падтрымаць паўстанне.

Дакладная дапамога Захаду праявілася толькі ў тым, што ў Польшчу і Літву прыбыло некалькі соцень добраахвотнікаў. Палкоўнік Тэафіл Лапінскі ў 1863 г. арганізаваў з Лондана марскую экспедыцыю з добраахвотнікамі і зброяй, але яна трапіла ў шторм, і карабель, не дасягнуўшы мэты, павярнуў да берагоў Швецыі.

Паўстанцаў падтрымлівалі рэвалюцыянеры ў розных краінах: М. Бакунін, Дж. Гарыбальдзі, Л. Кошут, Дж. Мадзіні. Французскі пісьменнік Віктор Гюго па ініцыятыве А. Герцэна звярнуўся да расійскай дэмакратычнай грамадскасці з заклікам падтрымаць паўстанцаў. У выніку ў рады паўстанцаў улілося каля 300 рускіх салдат і афіцэраў. Аднак большая частка рускай інтэлігенцыі, у тым ліку гісторыкі М. Пагодзін і С. Салаўёў, пісьменнік І. Тургенеў, выступілі за тэрміновае падаўленне паўстання.

У чэрвені 1863 г. у Вільню быў вернуты К. Каліноўскі. Кіраўніцтва паўстаннем зноў перайшло ў рукі "чырвоных". ПрыхільнІкі К. Каліноўскага стварылі падпольны ўрад "Літоўска-Беларускі чырвоны Жонд". Новае кіраўніцтва рабіла перамены ў мясцовых арганізацыях, выкрывала паклёп урада на паўстанне як на спробу памешчыкаў вярнуць прыгоннае права, імкнулася аднавіць страчаныя сувязі з рэвалюцыйнай арганізацыяй "Зямля і воля". Аднак пашырыць паўстанне ўжо не давялося. Мясцовае дваранства канчаткова адышло, прыняло ўдзел у кампаніі "вернападданніцкіх" адрасоў. 28 жніўня 1863 г. польскі нацыянальны ўрад аддаў загад аб спыненні ваенных дзеянняў. Узброеная барацьба на Беларусі спынілася восенню 1863 г., а летам 1864 г. была ліквідавана апошняя рэвалюцыйная арганізацыя ў Навагрудскім павеце. Паўстанне было задушана. У студзені 1864 г. К. Каліноўскі быў арыштаваны. Знаходзячыся ў турме, мужны рэвалюцыяітер звярнуўся да народа з "Лістом з-пад шыбеніцы", у якім заклікаў працягваць барацьбу. 22 сакавіка 1864 г. К. Каліноўскі быў павешаны ў Вільні.

Удзельнікі паўстання падвяргаліся бязлітасным рэпрэсіям. У Беларусі 128 паўстанцаў было пакарана смерцю, больш 850 чалавек было саслана на катаргу, каля 12,5 тыс. чалавек было выселена, у тым ліку 500 чалавек – на пасяленне ў Сібір.

Маёнткі шляхцічаў, удзельнікаў паўстання, канфіскоўвалі Ў казну і на льготных умовах прадавалі выхадцам з цэнтральных губерняў. Землеўладальнікам "польскага паходжання" забаранялася купляць на Беларусі землі. Сялянам-католікам нормы зямлі на гаспадарку абмяжоўвалася 60 дзесяцінамі. За ўдзел у паўстанні

каталіцкія святары падпадалі пад рэпрэсіі, а некаторыя касцёлы закрываліся або ператвараліся ў праваслаўныя храмы. За тое, што студэнты падтрымлівалі паўстанне, улады закрылі Горы-Горацкі земляробчы інстытут. Колькасць сярэдніх навучальных установ скарацілася. Настаўнікі і наогул уся мясцовая інтэлігенцыя (медыцынскія работнікі, землямеры) былі пераведзены на службу ў цэнтральныя губерні і заменены новымі, якім урад давяраў рэалізацыю палітыкі, русіфікацыю краю.

Вынікі паўстання 1863-1864 гг. для Беларусі былі супярэчлівымі. З аднаго боку, яно прымусіла ўрад пайсці на больш выгадныя для сялян умовы правядзення аграрнай рэформы. Свабоднае сялянства і інтэлігенцыя, якая выйшла з яго асяроддзя, сталі новай сілай у жыцці беларускага народа. З другога боку, баючыся апазіцыйнага настрою дваранства, урад быў вымушаны пайсці па шляху абмежавання судзебнай, школьнай, цэнзурнай рэформ і стрымліваць правядзенне земскай рэформы, таму буржуазныя нсраўтварэнні на Беларусі мелі непаслядоўны незавершаны характар.

Важна падкрэсліць, што паўстанне К. Каліноўскага было апошнім палітычным выступленнем на Беларусі за адраджэнне Рэчы Паспалітай. У грамадскай думцы пачынае фарміравацца ідэя беларускай дзяржаўнасці.

**Ліберальны рух.** У XIX ст. на Беларусі атрымліваюць пашырэнне ліберальныя ідэі. Аднаведны ідэям рух нс меў значнага ўплыву на мясцовае грамадска-палітычнае жыццё і наогул ён быў у той час даволі абмежаваны і непаслядоўны. Асобныя ідэі, характэрныя для лібералізму, былі вядомы ў Беларусі ў канцы XVIII ст. (напрыклад, ідэі натуральнага права з іх сцвярджэннем свабоды індывідаў у адносінах да ўладаў).

Лібералізм не мае адназначнага вызначэння, тым больш што існуе шмат яго формаў. Асноўнымі прынцыпамі, на якіх грунтуецца ліберальная тэорыя, з'яўляюцца: сцвярджэнне свабоды індывідаў у адносінах да ўладаў; бяспека; права на ўласнасць. Лібералізм – сістэма пераважна індывідуалістычная, якая дае чалавечай асобе і яе правам перавагу перад усім астатнім. Аднаведна ліберальнай тэорыі, чалавек, асоба стаіць на першым месцы, а каштоўнасць грамадскіх груп ці ўстаноў вымяраецца выключна тым, у якой меры яны абараняюць правы і інтарэсы чалавека і спрыяюць рэалізацыі мэтаў асобных суб'ектаў.

На фарміраванне ліберальнай ідэалогіі ў Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX стст. аказваў уздзеянне перш за ўсё Захад. У другой палове XIX ст. больш адчуваецца ўплыў расійскага лібералізму.

Па аналогіі з Расіяй у Беларусі асноўным носьбітам лібералізму была заможная шляхта, дваранства. Галоўным чынам праяўляўся эканамічны лібералізм, палітычныя ідэі дапаўнялі яго не вельмі выразпа і пераважна ў час грамадска-палітычных зрухаў (напрыклад, пад час паўстання 1863 г.). Ліберальная ідэалогія і рух Беларусі ў 60-90-х гг. XIX ст. мелі і пэўную нацыянальную афарбоўку: у яго асяроддзі можна вылучыць польскую, расійскую, яўрэйскую і беларускую плыні.

Лібералізм у Беларусі 60-90-х гг. XIX ст. пашыраецца ва ўмовах складанай саслоўнай структуры грамадства. Слабасць буржуазіі, нацыянальна-палітычны радыкалізм дробнай шляхты, палітычная інертнасць землеўласнікаў і большасці інтэлігенцыі, нсшматлікасць і нацыянальная раз’яднанасць "сярэдніх" слаёў грамадства – сталі прычынамі слабасці сацыяльнай базы лібералізму і, адпаведна, самога руху.

Правядзенне буржуазных рэформаў паслужыла штуршком для з'яўлення шэрагу праектаў і меркаванняў, у аснове якіх можна ўгледзець ліберальныя ідэі. Распаўсюджванне апошніх у беларускіх губернях у паслярэформенны перыяд было звязана не толькі з палітычным курсам самадзяржаўя, з няўвагай да думкі дваранства, але і з нацыянальным пытаннем, абмежаваннямі ў некаторых саслоўных правах мясцовага дваранства, маёмасных і грамадзянскіх правах католікаў, яўрэяў і інш.

У перыяд падрыхтоўкі адмены прыгоннага права большасць землеўладальнікаў Беларусі выказалася з кансерватыўных пазіцый за вызваленне сялян без зямлі з захаваннем іх абавязковай нрацы на памешчыкаў. Меншасць падзяляла ліберальную пазіцыю ў сялянскім пытанні. За перадачу сялянам зямлі ва ўласнасць, за выкуп і пераўтварэнне сялянскіх гаспадарак у самастойныя выказваліся памешчык Магілёўскай губерні А. Мянжынскі, магілёўскі губернатар С. Галынскі. Апошні абгрунтоўваў неабходнасць перадачы сялянам зямельных надзелаў у памерах, якія б забяспечвалі іх жыццёвую патрэбу, з правядзеннем адначасовага іх поўнага выкупу. За ўтварэнне вольных арандатараў выказваўся буйны магнат В. Радзівіл. Гродзенскія памешчыкі К. Аржэшка, А. Глязэр лічылі неабходным стварыць слой заможных сялян. Ліберальных пазіцый у аграрным пытанні прытрымліваліся П. Баброўскі, М. Дубенскі, І. Зяленскі, А. Семянтоўскі. Але яны ўздымалі больш шырокае кола эканамічных праблем паслярэформеннага развіцця Беларусі.

Асяродкамі эканамічнага лібералізму ў Беларусі ў значнай ступені былі сельскагаспадарчыя таварыствы. Першымі і найбольш

буйнымі з іх сталі, заснаваныя ў 1876 г., - Мінскае і Віцебскае. Яны аб'ядноўвалі мясцовых землеўладальнікаў, аграномаў, інжынераў і інш. На пасяджэннях таварыстваў абмяркоўваліся розныя эканамічныя пытанні і ствараліся практычныя праекты па развіццю гаспадаркі. Магілёўскі губернатар А. Дэмбавецкі падзяляў пазіцыі аб неабходнасці рэфармавання сельскай гаспадаркі і ў сваіх апублікаваных працах даказваў, што ў Магілёўскай губерні трэба знішчыць абшчыну і даць беларускім сялянам магчымасць самастойна весці гаспадарку. Ён лічыў, што грамада не адпавядае іх звычаям, хаця ў рускіх яна можа існаваць дзякуючы іх гістарычнаму імкненню да калектывізму.

У 1886 г. пачала выдавацца ў Мінску першая ў Беларусі легальная неафіцыйная газета "Минскнй лнсток". Яна ўяўляла сабой перыядычны орган пераважна ліберальнага накірунку, які аб'ядноўваў адпаведнай пазіцыі публіцыстаў. З газетай супрацоўнічалі вучоныя А. Багдановіч, М. Янчук, М. Доўнар-Запольскі і інш. Рэдакцыя "Мннского листка" прапагандавала ідэі аб развіцці спажывецкіх таварыстваў, таннага крэдыту, арцеляў і г. д.

З ліберальна-народніцкіх пазіцый даецца асэнсаванне задач беларускай інтэлігенцыі ў выдадзеных у 1882 г. "Лістах аб Беларусі", аўтар якіх выступіў пад псеўданімам Д. Баравік. Ён выказваўся супраць радыкальных сацыяльных дзеянняў, лічыў найбольш мэтазгоднай асветніцкую дзейнасць сярод народа, што можа падрыхтаваць Беларусь да пераўтварэнняў.

У сярэдзіне XIX ст. сфарміраваліся інтэлектуальныя асяродкі А. Кіркора ў Вільні, В. Дуніна-Марцінкевіча ў Мінску, А. Вярыгі-Дарэўскага ў Віцебску. Беларуская інтэлігенцыя, якая гуртавалася вакол іх, па грамадска-палітычных погля-дах знаходзілася пераважна на ліберальных пазіцыях. Па нацыянальна-культурнай праграме прадстаўнікі названых асяродкаў з'яўляліся прыхільнікамі "краёвага", беларускага па сваёй сутнасці, патрыятызму. Выйшаўшы з польскамоўнага асяродку культуры Беларусі і не парываючы з ім сувязі, гурткі А. Кіркора, В. Дуніна-Марцінкевіча, А. Вярыгі-Дарэўскага знаходзіліся ля вытокаў беларускага нацыянальна-культурнага руху. Адзін з найбольш яркіх прадстаўнікоў беларускага лібералізму А. Кіркор зведаў нападкі як з боку прадстаўнікоў польскага грамадскага руху, так і расійскага. Першыя абвінавачвалі яго ў здрадзе польскім нацыянальным інтарэсам, другія бачылі ў ім замаскіраванага ворага Расіі. І гэта паказальна, у якіх умовах адбывалася фарміраванне беларускай ліберальнай плыні. У гэты ж час зараджаецца "заходнерусізм", які з самага пачатку меў пэўную

ліберальна-дэмакратычную афарбоўку, што было звязана са спробай даказаць непольскасць беларусаў. Прадстаўнікі ліберальнай плыні "заходне-русізму" ўнеслі значны ўклад у вывучэнне гісторыі і культуры Беларусі, развіццё яе статыстыкі, вывучэнне гаспадарчага жыцця. Нярэдка яны свядома імкнуліся палепшыць дабрабыт насельніцтва, супрацьстаяць пашырэнню папулярных у той час сярод моладзі сацыялістычных ідэй. Сярод іх сустракаюцца імёны вядомых даследчыкаў Я. Карскага, М. Нікіфароўскага, А. Багдановіча і інш. Выхадцам з Беларусі быў вядомы расійскі дзеяч ліберальнага руху, прафесар права У. Спасовіч, які не парываў сувязяў з грамадскім жыццём Беларусі і Польшчы.

Напярэдадні паўстання 1863 г. сфарміравалася кансерватыўна-ліберальная плынь у нацыянальна-вызваленчым руху на Беларусі, у Польшчы і Літве. Яна атрымала назву "белых". Прадстаўнікі гэтага лагера выступалі супраць паўстання як сродку вырашэння задач нацыянальнага руху, лічылі, што можна дыпламатычным шляхам аднавіць Польшчу ў межах 1772 г. "Белыя" выступалі за рэфарматарскія меры вырашэння сялянскага пытання. У адрозненне ад Польшчы, дзе "белыя" складаліся з шляхты і буйных прадпрымальнікаў, на Беларусі ў гэты лагер уваходзілі амаль выключна землеўласнікі. Сярод "белых" на Беларусі вылучаюцца постаці Я. Гейштара, А. Аскеркі, В. Стажэнскага, А. Яленскага і інш.

Пасля паражэння паўстання ў польскім грамадстве пашырылася новая ідэалагічная і грамадская плынь, якая атрымала назву "варшаўскі пазітывізм". Яна была заснавана на тэорыі "арганічнай працы", якая ставіла першачарговую задачу эканамічнага развіцця Польшчы для ўзбагачэння нацыі. Ба-рацьба за нацыянальнае вызваленне адкладвалася на перспектыву. Яшчэ адной адметнай рысай стала з'яўленне брашуры былога ўдзельніка віленскага грамадскага руху сярэдзіны XIX ст. І. Крашэўскага "Польская праграма", дзе ён прапануе шукаць кампраміснае пагадненне з расійскім урадам і ставіць найбліжэйшую задачу "вытворчай працы" і народнага асветніцтва. Актыўнай прыхільніцай варшаўскага пазітывізму на Беларусі была вядомая пісьменніца Э. Ажэшка. Яна аддавала перавагу развіццю гаспадаркі, узбагачэнню нацыі перад рэвалюцыйнай перабудовай грамадства. Прапагандавалі культ эканамічнага і тэхнічнага прагрэсу на Беларусі вядомыя навукоўцы А. Ельскі, Я. Завіша, В. Шукевіч, Я. Карскі.

З вялікай урачыстасцю ў 1879 г. у Кракаве адбылося святкаванне 50-гадовага юбілею літаратурнай творчасці І. Крашэўскага. Яно ператварылася ў патрыятычную маніфестацыю. На

ім прысутнічалі, акрамя іншых, дэлегацыі Віленскай, Магілёўскай і Мінскай губерняў. Паказальным было выступленне У. Спасовіча, які заклікаў да пашырэння ў расійскім грамадстве ўсведамлення неабходнасці канстытуцыйнай рэформы.

У канцы 60-80-х гг., калі ў польскім грамадстве на першы план выходзяць задачы эканамічныя, у беларускім, ва ўмовах узмоцненай русіфікатарскай палітыкі, фарміруецца беларускі нацыянальна-культурны рух. Аднак ён набіраў моц пад уплывам рэвалюцыйна-дэмакратычнай плыні. Лібералізм не стаў на Беларусі канструктыўным рухам, часткай грамадскага жыцця, які б аб'яднаў нацыянальную інтэлігенцыю, прадпрымальнікаў, чыноўнікаў. Ён быў прадстаўлены ў асноўным толькі ідэямі і ідэялогіяй.

**Народніцтва.** Пошукі шляхоў сацыяльнай перабудовы краіны складалі галоўны змест тэорыі рускага ўтапічнага сацыялізму і народніцтва ў прыватнасці. Роданачальнікамі гэтай тэорыі былі А. Герцэн і М. Чарнышэўскі. У народніцтве прысутнічала некалькі накірункаў: рэвалюцыйна-дэмакратычны, памяркоўна-ліберальны і кансерватыўны. Радыкальна настроеная інтэлігенцыя ўспрымала ідэі сялянскага сацыялізму як заклік да непасрэдна рэвалюцыйнага руху, а больш памяркоўная яе частка – як прапаганду паступовага развіцця краіны праз рэформы. Найвышэйшага пад'ёму рэвалюцыйнае народніцтва дасягнула ў 70-я - пачатку 80-х гадоў, якое праявілася тэарэтычна і практычна ў трох праграмах: прапагандысцкай (П. Лаўроў), бунтарскай (М. Бакунін), змоўніцкай (П. Ткачоў).

Народніцтва распаўсюдзілася пєрш за ўсё як ідэалогія і грамадскі рух сярод беларускай моладзі. Народнікі Беларусі былі ідэйна і арганізацыйна звязаны з рускім народніцтвам. Ідэі А. Герцэна і М. Чарнышэўскага былі знаёмыя К. Каліноўскаму, В. Урублеўскаму, З. Серакоўскаму і іншым кіраўнікам і ўдзельнікам паўстання 1863-1864 гг. Так, у канцы 1862 г. у склад "Зямлі і волі" поўнасцю ўвайшоў "Камітэт рускіх афіцэраў" у Польшчы, 40% членаў якога складалі ўраджэнцы беларуска-літоўскіх губерняў. Сярод вядомых прапагандыстаў і ўдзельнікаў "хаджэння ў народ" у пачатку 70-х гадоў былі ўраджэнцы Беларусі С. Кавалік, М. Судзілоўскі, К. Брэшка-Брэшкоўская і інш. У 1874-1884 гг. зямляцтвы і нелегальныя групы беларускіх студэнтаў існавалі ў многіх вышэйшых навучальных установах Расіі. Члены гэтых арганізацый нярэдка былі кіраўнікамі народніцкіх гурткоў у Мінску, Магілёве. Віцебску, Пінску, Гродне, Слуцку і іншых гарадах Беларусі. Звычайна гэта былі гурткі навучэнцаў, якія займаліся самаадукацыяй, вывучалі забароненую літаратуру, спрабавалі весці агітацыю ў сялянскім асяроддзі. Яны

дзейнічалі цалкам у рэчышчы агульнарасійскіх народніцкіх арганізацый. Нават такія вядомыя дзеячы рэвалюцыйнага руху - выхадцы з Беларусі, як Г. Ісаеў, А. Зундзілевіч, С. Гаховіч, М. Янчэўскі, І. Гецаў і іншыя не змаглі ўбачыць гістарычных, сацыяльна-эканамічных і нацыянальных асаблівасцяў Беларусі.

З узнікненнем у Пецярбургу арганізацыі "Зямля і воля" (1876) народніцкі рух Беларусі развіваецца пад яе непасрэдным уплывам. Цэнтрам руху становіцца Мінск, дзе найбольш актыўна дзейнічаў створаны ў 1877 г. гурток М. Велера.

Рэпрэсіі ўрада супраць членаў "Зямлі і волі" прымусілі народнікаў перагледзець тактыку барацьбы з самадзяржаўем. У 1879 г. адбыўся раскол "Зямлі і волі" на дзве арганізацыі -"Чорны перадзел" і " Народная воля". Адмовіўшыся ад палітычнай барацьбы, чорнапе-радзельцы лічылі галоўнаю мэтаю ажыццявіць перадзел зямлі памешчыкаў паміж сялянамі. "Народная воля" адстойвала неабходнасць узмацнення палітычнай барацьбы супраць самадзяржаўя і стаяла за індывідуальны тэрор. Гэты раскол адбыўся і сярод беларускіх арганізацый "Зямлі і волі". Вялікая частка беларускіх народнікаў пайшла за чорнаперадзельцамі; на гэта паўплывалі прыезды Г. Пляханава ў Мінск, дзе пасля правалу ў Пецярбургу была арганізавана ў 1881 г. нелегальная друкарня "Чорнага перадзелу". Аднак арышты чорнаперадзельцаў у Маскве і Пецярбургу, разгром друкарні ў Мінску, вымушаная эміграцыя яе кіраўнікоў адмоўна адбіліся на настроі членаў гэтага гуртка, большая частка з якіх перайшла на пазіцыі "Народнай волі". Яе аўтарытэт асабліва павысіўся пасля 1 сакавіка 1881 г., калі бомбай, кінутай ураджэнцам Мінскай губерні І. Грынявіцкім, быў забіты Аляксандр II. Пераходу чорнаперадзельцаў на бок "Народнай волі" садзейнічаў таксама прыезд на Беларусь маскоўскіх нарадавольцаў Р. Апельберга, І. Лампе, М. Грачэўскага, М. Аўчыннікава і інш. Задача іх заключалася ў стварэнні з асобных мясцовых народніцкіх гурткоў адзінай рэгіянальнай арганізацыі Беларусі і Літвы.

У пачатку 1882 г. такая арганізацыя пад назвай "Паўночна-Заходняя арганізацыя "Народнай волі" была створана. Яе кіруючым цэнтрам была Цэнтральная група, якая знаходзілася ў Вільні. Арганізацыя аб'ядноўвала народніцкія гурткі Мінскай, Магілёўскай Віцебскай, Гродзенскай, Віленскай і Ковенскай губерняў. Дзейнасць гэтай арганізацыі была накіравана на стварэнне новых груп, збор сродкаў для партыі, арганізацыю паднольнай друкарні. Нарада-вольцы Беларусі актывізавалі таксама работу "Ваеннай арганізацыі", "Народнай волі" ў гарнізонах беларускіх гарадоў.

Аднак у хуткім часе паліцыі ўдалося напасці на след Цэнтральнай групы і арыштаваць яе членаў. Да канца 1882 г. Цэнтр фактычна перастаў існаваць. Тым не менш мясцовыя гурткі так і не былі раскрыты. Яны працягвалі дзейнічаць у Гродне, Віцебску, Мінску, Пінску, Магілёве, Горках, вялі працу сярод навучэнцаў, рамеснікаў, рабочых.

У пачатку 80-х гг. была зроблена спроба стварыць цэнтр беларускіх народнікаў у Пецярбургу. Ініцыятарам выступіла беларускае зямляцтва пры Пецярбургскім універсітэце. Яно аб'ядноўвала прадстаўнікоў усіх напрамкаў народніцтва. У 1881 г. зямляцтва звярнулася са зваротам "Да беларускай моладзі", у якім заклікала беларускую інтэлігенцыю і студэнцтва да грамадскай дзейнасці на карысць Беларусі ў рамках існуючага ладу. Блізкія да іх шырокія ліберальна-асветніцкія погляды былі выказаны ў 1882 г. у ананімных гектаграваных "Лістах аб Беларусі". У адказ з'явілася таксама ананімнае "Пасланне да землякоў-беларусаў" (1884), у якім аўтар ("Шчыры Беларус") палемізуе з рэфарматарскімі палажэннямі "Лістоў" і заклікае да звяржэння самадзяржаўя ў саюзе з усімі рэвалюцыйнымі сіламі Расіі.

У пачатку 1884 г. з ініцыятывай аб'яднання ў агульную арганізацыю ўсіх народніцкіх гурткоў Беларусі выступіла група "Гоман", куды ўваходзілі беларускія студэнты, якія навучаліся ў Пецярбургу. Імі былі надрукаваны два нумары перыядычнага выдання пад назвай 'Гоман". Члены групы А. Марчанка, Х. Ратнер і іншыя, прызнаючы праграму "Народнай волі", лічылі неабходным аб'яднаць усе рэвалюцыйныя сілы Расіі для звяржэння самадзяржаўя.

Вельмі выразна гоманаўцы паставілі нацыянальнае пытанне. Яны ўпершыню адкрыта заявілі пра існаванне беларускай нацыі. Будучую вольную ад сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту Расію яны ўяўлялі як федэрацыю самакіруючых абласцей на чале з Устаноўчым сходам. "Беларуская сацыяльна-рэвалюцыйная група", як называлі сябе гоманаўцы, мела сувязі са студэнцкімі арганізацыямі Расіі, гурткамі Віцебска, Магілёва і Мінска. Аднак стварыць адзіную арганізацыю ўсёй Беларусі гоманаўцы так і не змаглі. Гэта было абумоўлена тым, што беларускае рэвалюцыйнае народніцтва, таксама як і расійскае, перажывала крызіс і зыходзіла з гістарычный сцэны, уступаючы дарогу марксізму.

У 1884-1890-х гг. пануючым накірункам у народніцтве становіцца ліберальнае. Адмовіўшыся ад рэвалюцыйнай барацьбы з урадам, ліберальныя народнікі сканцэнтравалі ўвагу на ўмацаванні сялянскага землеўладання, спадзеючыся тым самым затрымаць

працэс абеззямельвання сялян. Яны прапаноўвалі ўзмацніць абшчыннае землеўладанне, даць сялянам ільготныя крэдыты, развіваць пад апекай урада сялянскія промыслы. Беларускія народнікі віталі праект адмены сервітутаў і чыншавую рэформу, адкрыццё аддзялення Сялянскага пазямельнага банка.

Погляды беларускіх ліберальных народнікаў аказалі грунтоўны ўплыў на паглыбленне інтарэсу інтэлігенцыі да нацыяльнай гісторыі і культуры Беларусі.

**Эвалюцыя беларускай нацыі.** У XIX ст. у еўрапейскіх краінах адбываліся працэсы этнічнай эмансіпацыі народаў, рост нацыянальных рухаў. Яны былі вынікам і адначасова част каст(152)кай эканамічных, сацыяльных, палітычных і культурных мадэрнізацыйных зрухаў, якія ахапілі Еўропу. Істотнай перадумовай этнічных працэсаў і нацыянальных рухаў была сацыяльная мабілізацыя грамадства ў выніку разлажэння феадальна-саслоўнай сістэмы (вызваленне сялян, індустрыялізацыя і урбанізацыя, пашырэнне пісьменства і развіццё школьнай адукацыі і друку).

За стагоддзе пасля падзелу Рэчы Паспалітай пад уздзеяннем каланіяльнай палітыкі царызму народ літвінаў згубіў сваю нацыянальную самасвядомасць, быў падзелены на рускіх, палякаў і іншых. Людзі былі дэзарыентаваныя, не ведалі, хто яны. Менавіта ў гэтыя часы ўзнікла і замацавалася недарэчная, але гістарычна абумоўленая саманазва часткі насельніцтва "тутэйшыя".

Такім чынам, беларускі этнас прайшоў складаны шлях станаўлення нацыі сучаснага тыпу. Супярэчлівасць гэтага шляху, ваганне этнічнай свядомасці і нацыянальнай культуры паміж заходняй і ўсходняй цывілізацыямі – усё гэта абцяжарвала вызначэнне маладой нацыянальнай інтэлігенцыяй свайго месца, гістарычных абрысаў нацыянальнай ідэі і ўвогуле самавызначэнне беларускай нацыі. Аб'ектыўна працэс яе фарміравання ў канцы XIX - пачатку XX стст. вызначаўся асаблівасцямі і характарам сацыяльна-эканамічнай мадэрнізацыі краіны, сацыяльнай стратыфікацыяй грамадства, традыцыйнымі рысамі нацыянальна-культурнага развіцця, недастатковымі тэмпамі пашырэння пісьменнасці, моўнымі і канфесіянальнымі праблемамі. Саманазву "беларусы" мясцовая эліта ўкараніла цяпер ужо як альтэрнатыўную падзелу на рускіх і палякаў, як кампрамісную, паколькі да саманазвы "літвіны" вярнуцца было ўжо немагчыма. Такім чынам, этнагенез беларусаў у апошнія дзесяцігоддзі XIX - пачатку XX стст. выйшаў на новую стадыю фарміравання сучаснай нацыі.

Тэрыторыя фарміравання беларускай нацыі ўкладвалася ў асноўным у межы Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай губерняў.

Галоўным арэалам кансалідацыі беларускай нацыі былі цэнтральная і паўночна-заходняя часткі Беларусі, што вызначалі як эканамічна, сацыяльна і палітычна найбольш развіты рэгіён Беларусі. Тут быў найвышэйшы працэнт пісьменнага насельніцтва (да 70 % у 1913 г. сярод мужчын). Марудна этпакансалідацыйны працэс адбываўся ў паўночна-ўсходняй і ўсходняй частках Беларусі. Значнай была колькасць беларусаў па-за межамі тэрыторыі сучаснай беларускай дзяржавы.

Адным з паказчыкаў і фактараў станаўлення нацыі з'яўляецца пашырэнне і рост уплыву ў грамадстве нацыянальна-культурнага руху. Беларускі рух, паводле аднаго вобразнага параўнання, узрастаў паміж спрэчкамі расійскіх і польскіх шавіністаў за ідэалагічна-культурнае і эканамічнае панаванне на тэрыторыі краю. Гэтыя спрэчкі абудзілі ў пачынальнікаў беларускай нацыянальнай ідэалогіі пытанне: а хто такія беларусы?

Беларусаў у XIX - пачатку XX стст. можна ў пэўнай меры аднесці да ліку маладых нацый, якія мелі няпоўную сацыяльную структуру, дзе адсутнічалі ўласныя эліты, а нярэдка і сярэднія гарадскія слаі. "Маладыя" нацыі былі "сялянскімі", часта не мелі сваёй літаратурнай мовы і высокай культуры. Акрамя беларусаў, у Расійскай імперыі да катэгорыі этнічных груп адносіліся ўкраінцы, літоўцы, эстонцы, латышы і інш.

Беларусы выйшлі на першую фазу сваёй нацыянальнай эмансіпацыі ў пачатку XIX ст., поруч з украінцамі і літоўцамі і апярэдзіўшы напачатку фінаў, эстонцаў і латышоў. Вытокі гэтай фактычна культурна-асветніцкай стадыі можна шукаць у канцы XVIII ст., у краёвым, беларускім па сваёй сутнасці, патрыятызме часткі шляхты і магнатаў Вялікага княства Літоўскага. У пачатку XIX ст. яшчэ цяжка было ўявіць, і гэта выглядала амаль нерэальным, што праз стагоддзе будуць дзейнічаць беларускія нацыянальныя палітычныя партыі і ставіць пытанне аб стварэнні беларускай дзяржаўнасці. На гэтым этапе інтэлектуальнае жыццё Беларусі развівалася пераважна пад уплывам польскай культуры. Цэнтрам яго выступаў Віленскі універсітэт. У асяроддзі яго выкладчыкаў і студэнтаў ў 1810 – пачатку 1820-х гг. пачалі з'яўляцца парасткі ідэй будучага беларускага нацыянальнага адраджэння. Прафесары Віленскага універсітэта М. Баброўскі, І. Даніловіч пачалі збіраць і вывучаць помнікі беларускага пісьменства XVI-XVII стст. Віленскія

інтэлігенты папулярызавалі ідэі аднаўлення Вялікага княства Літоўскага і дзяржаўнасці беларускай мовы. Яны абудзілі цікавасць да гісторыі, культуры, вуснай народнай творчасці беларусаў студэнтаў-сяброў таварыстваў філаматаў і філарэтаў, перш за ўсё Я. Чачота, Т. Зана і інш. Беларуская інтэлігенцыя таго часу фарміравалася пераважна выхадцамі з духавенства і збяднелай шляхты.

10 снежня 1831 г. у Парыжы было створана Таварыства літоўскае і рускіх зямель, у склад якога ўваходзілі А. Міцкевіч, І. Дамейка. Мэта таварыства – вывучэнне мінуўшчыны і гаспадаркі Беларусі, Літвы і Валыні, дэманстрацыя перад сусветнай супольнасцю, што насельніцтва былога Вялікага княства Літоўскага застаецца "адным з народаў Еўропы...".

У сярэдзіне XIX ст. адчуваецца ўплыў беларускай ліберальнай думкі, прадстаўленай гурткамі А. Кіркора ў Вільні. В. Дуніна-Марцінкевіча ў Мінску, А. Вярыгі-Дарэўскага ў Віцебску. На беларускай мове ў гэты час з'яўляюцца асобныя творы Я. Чачота, Я. Баршчэўскага, А. Рыпінскага, У. Сыракомлі. Беларуская мова стала асноўнай для творчасці В. Дуніна-Марцінкевіча. Творчасць і погляды гэтага кола інтэлігенцыі не заўжды мелі акрэслены нацыянальны змест, але аб'ектыўна садзейнічалі развіццю нацыянальнай культуры і свядомасці.

Сярод дэмакратычнай інтэлігенцыі ў 60-я гг. XIX ст. сфарміравалася адносна невялікая група, якая ясна ўяўляла, што Беларусь мае ўсе ўмовы для самастойнага развіцця. Лідэрам гэтай групы быў К. Каліноўскі, які ўскосна выказаў ідэю аб самастойнасці Беларуска-Літоўскай Рэспублікі. Першыя спробы нацыянальнай агітацыі былі нязначныя. Урадавая рэпрэсіўная палітыка запаволіла нацыянальную культурна-асветніцкую дзейнасць, фарміраванне палітычных сіл і арганізацый. Гэты фактар, побач з адносна невысокімі тэмпамі сацыяльна-эканамічнай мадэрнізацыі Беларусі, стаў прычынай больш позняга пераходу да наступнай фазы нацыянальнай эмансіпацыі, звязанай з палітычнай агітацыяй.

Для абуджэння нацыянальнай самасвядомасці вялікае значэнне мела дзейнасць збіральнікаў і даследчыкаў фальклору, лінгвістаў, гісторыкаў, этнографаў. У другой палове XIX – пачатку XX стст. з'явіліся грунтоўныя працы І. Насовіча, М. Нікіфароўскага, Е. Раманава. Я. Карскага, М. Доўнар-Запольскага і іншых, з выданнем якіх пачынаецца развіццё навуковага беларусазнаўства.

Сур'ёзная нацыянальная агітацыя, звязаная з пашырэннем нацыянальнай свядомасці ў больш шырокіх слаях насельніцтва, пачынаецца ў 80-х гг. XIX ст., а дакладней – з дзейнасці народніцкай

арганізацыі "Гоман" і выдання аднайменнага гектаграфічнага часопіса (1884). У публікацыях на старонках "Томана" ("Лісты пра Беларусь", "Пасланне да землякоў-беларусаў") дадзена тэарэтычнае абгрунтаванне самастойнасці, асобнасці беларускага этнасу, асэнсаванне складанасці гістарычнага шляху і цяжкасці яго нацыянальнай кансалідацыі. Дачыненне да выдання "Гомана" мелі студэнты – ураджэнцы Беларусі А. Марчанка, Х. Ратнер і інш.

Фундаментам ідэалогіі беларускага вызваленчага руху стала публіцыстыка Ф. Багушэвіча. У прадмове да зборніка "Дудка беларуская", а таксама ў іншых творах ім дадзена гісторыка-філасофскае і мастацкае асэнсаванне лёсу беларускага народа, падкрэслена пераемнасць багатых дзяржаў-папалітычных і культурных традыцый Вялікага княства Літоўскага з сучаснымі задачамі сацыяльнага і палітычнага вызвалення і культурнага адраджэння беларускага народа.

На пачатку 90-х гадоў XIX ст. у Маскве і Пецярбургу дзейнічалі арганізацыі беларускага студэнцтва пад кіраўніцтвам А. Гурыновіча, М. Абрамовіча і інш. Вялікую ролю адыгралі літаратурна-грамадская дзейнасць К. Каганца, А. Абуховіча, краязнаўча-збіральніцкая праца Б. Эпімах-Шыпілы. Былі створаны “Гурток моладзі польска-літоўскай, беларускай і маларускай", "Круг беларускай народнай прасветы і культуры", прымаліся захады наладзіць выпуск нелегальнай газеты "Свабода", заснавання рэвалюцыйнай партыі Белай Русі. У 1902-1903 гг. на аснове гурткоў В. Іваноўскага, братоў А. і І. Луцкевічаў адбываецца палітычная самаарганізацыя беларускага нацыянальна-вызваленчага руху. Была створана "Беларуская рэвалюцыйная грамада", якая некалькі пазней стала называцца "Беларуская сацыялістычная грамада".

Глыбокія якасныя змены адбыліся ў нацыянальным руху ў час рэвалюцыі 1905-1907 гг. Са з'яўленнем беларускамоўнага легальнага друку ("Наша доля", "Наша ніва", пазней "Беларус", "Лучынка" і інш.), пашырэннем прафесійных, грамадска-культурных аб'яднанняў і гурткоў (Беларускі настаўніцкі саюз, Гродзенскі гурток беларускай моладзі, Беларускі музычна-драматычны гурток і г. д.), заснаваннем выдавецкіх суполак, нацыянальных тэатральных калектываў распаўсюдзіліся розныя формы і кірункі нацыянальнага руху. Рэдакцыя "Нашай нівы" стала арганізацыйным цэнтрам нацыянальнага руху.

У 1913 г. у Віцебскім аддзяленні Маскоўскага археалагічнага інстытута А. Сапуноў пачаў чытаць курс лекцый па гісторыі Беларусі. В. Ластоўскі ў 1910 г. выдаў першую навуковую працу на беларускай мове "Кароткая гісторыя Беларусі", дзе выклаў канцэптуальнае

выяўленне нацыянальнай гісторыі. У пачатку XX ст. навуковае абгрунтаванне этнічнай свядомасці знайшло ў фундаментальнай працы Я. Карскага "Беларусы".. т. 1-3 (1903-1922), даследаваннях М. Доўнар-Запольскага і інш.

Асэнсаванне агульнага гістарычнага мінулага спрыяла пашырэнню сярод часткі беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі, асабліва ў час першай сусветнай вайны, ідэі стварэння беларуска-літоўскай дзяржаўнасці. Акрамя таго, беларускі нацыянальны рух, таксама як і ўкраінскі, літоўскі, пад уплывам польскага, яўрэйскага, рускага сацыялістычнага рухаў меў на мэце перацягнуць на свой бок сялянства, аб'яднаць нацыянальныя і аграрна-рэвалюцыйныя задачы. Агульнарасійскія рэвалюцыйныя партыі нярэдка выступалі ў якасці паспяховых канкурэнтаў нацыянальных арганізацый, схіляючы да сябе многіх маладых прадстаўнікоў інтэлектуальных асяродкаў.

Масавы характар беларускі нацыянальны рух набывае ў час першай сусветнай вайны. Выкліканыя ёю сацыяльныя ўзрушэнні, аказалі значны ўплыў на працэсы этнічнай кансалідацыі. Шматлікія бежанскія арганізацыі адыгралі вялікую ролю ў абуджэнні нацыянальнай свядомасці. Цікавасць да беларускага руху актывізавалася сярод землеўласнікаў, вышэйшых чыноўнікаў, афіцэраў, кіраўніцтва праваслаўнай і каталіцкай цэркваў на Беларусі. У Вільні быў створаны Беларускі народны камітэт, адчыняліся беларускія школы, настаўніцкая семінарыя ў Свіслачы і г.д.

Пасля рэвалюцыйных падзей 1917 г. паўстала пытанне аб утварэнні беларускай дзяржаўнасці. Яно знайшло падтрымку ў большай часткі беларускага насельніцтва. Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі, а затым утварэнне БССР сцвердзіла пытанне аб існаванні беларускай нацыі як бясспрэчнае і незваротнае.

У канцы XIX - пачатку XX стст. тэрмін "Беларусь", этнонім "беларусы" замацоўваецца за ўсёй этнічнай тэрыторыяй беларусаў і паступова выцясняе ўсе іншыя агульныя для Беларусі назвы. Аднак гэты працэс быў яшчэ незавершаны. Сама назва беларусаў не набыла ў той час выразнага адзінага агульнацыянальнага зместу. Поруч з ёй ужываліся канфесіяналізмы "рускія" і "палякі", адпаведна падзелу на праваслаўных і католікаў, а частка насельніцтва Беларусі называла сябе "тутэйшымі". Яшчэ даволі часта ўжываўся тэрмін "літвіны", асабліва ў заходніх раёнах Беларусі. У некаторых мясцовасцях існавалі рэгіянальныя назвы, якія адносіліся да значных тэрыторый: "паляшукі" - для ўсяго Палесся, "пінчукі", "брашчане" - для яго асобных частак. Тым не менш, адбыліся істотныя зрухі ў этнічнай самасвядомасці беларусаў.

Паводле дадзеных перапісу 1897 г. аб роднай мове 51,8 % агульнай колькасці прадстаўнікоў спадчыннага дваранства прызнавалі сябе беларусамі. З ліку асабістых дваран (чыноўніцтва) 25,9% назвалі сваёй роднай мовай беларускую. Каля 20% урачоў і 21% настаўнікаў таксама лічылі сваёй роднай мовай беларускую. Адной са спецыфічных рыс станаўлення беларускай нацыі з'яўлялася тое, што каля 90% яе прадстаўнікоў пражывала ў сельскай мясцовасці. Горад па этнічнаму складу быў пераважна небеларускім – прыкладна 40-50% гарадскога і местачковага насельніцтва складалі яўрэі. Каля 20% гарадскога насельніцтва – рускія, 17,1% - беларусы. У другой палове XIX - пачатку XX стст. формай этнічнай самасвядомасці некаторай часткі гарадскога насельніцтва, асабліва ва Усходняй Беларусі (праваслаўная інтэлігенцыя, чыноўнікі, святары і інш.), быў "западнорусизм". У пачатку XX ст. ён стаў ідэалогіяй вялікадзяржаўна-чарнасоценнага руху, які вёў актыўную барацьбу супраць беларускага нацыянальнага адраджэння.

Сярод прыхільнікаў гэтай ідэалогіі вылучыліся дзве плыні:больш памяркоўная, ліберальная (М. Каяловіч, А. Пшчолка) і кансерватыўная (К. Гаворскі). Лібералы – "западнорусы" зрабілі шмат для даследавання нацыянальнай спадчыны беларусаў і першыя звярнулі ўвагу ўрадавых колаў на тое, што Беларусь, насуперак панаваўшаму ў той час меркаванню, не з'яўляецца часткай Польшчы. Прыхільнікі кансерватыўнай плыні лічылі этнічныя асаблівасці беларусаў лакальна-дыялектнымі і вынікам польска-каталіцкай экспансіі, вартымі знішчэння для аднаўлення "рускага" характару краю.

Слабасць нацыянальнай эканамічнай эліты – буржуазіі і дваранства – стала прычынай нешматлікасці і павольнага сталення нацыянальнай інтэлігенцыі. Эліта беларускага грамадства фактычна не дарасла да асэнсавання сваіх асобных ад расійскай рэчаіснасці ці польскай ідэі дзяржаўна-палітычных ідэалаў і не бачыла неабходнасці ў іх тэарэтычным абгрунтаванні. Адна з асаблівасцяў фарміравання беларускай інтэлігенцыі – гэта страта пераемнасці паміж рознымі яе пакаленнямі з-за прычын перш за ўсё палітычнага характару (рэпрэсіі ў сувязі з актыўным удзелам яе прадстаўнікоў у вызваленчых паўстаннях, дзейнасці нелегальных арганізацый і г. д.).

Істотным фактарам развіцця беларускай нацыі былі міграцыйныя працэсы. Яны ахапілі перш за ўсё сялянства. Гэта і сезонныя перамяшчэнні з мэтай знайсці заработак, і больш сталая працоўная дзейнасць на прамысловых прадпрыемствах цэнтральнай часткі Расіі, шахтах і рудніках Данбаса, портах Рыгі і Адэсы і г.д. У працэсе працоўнай дзейнасці ажыццяўляўся пастаянны абмен этнакультурнай

інфармацыяй. У канцы XIX ст. за межамі кампактнага рассялення беларусаў пражывала звыш 540 тыс. чалавек. Тут не ўлічаны тыя, хто выехаў у пошуках працы на прамысловыя і сельскагаспадарчыя прадпрыемствы Амерыкі, Заходняй Еўропы і Аўстраліі. У Пецярбургу беларусы на мяжы XIX-XX стст. і пазней складалі найбуйнейшую групу іншаэтнічнага насельніцтва. Звыш 30 тыс. рабочых (без уліку членаў сямей) працавала на прадпрыемствах Масквы і Адэсы. Уплывовай была знешняя міграцыя ў Беларусь. Гэта былі чыноўнікі, ва-еннаслужачыя, памешчыкі, прадстаўнікі вольных прафесій і г.д. У канцы XIX ст. яны скаладалі больш 2% насельніцтва і былі выхадцамі пераважна з цэнтральных губерняў Расіі, Прыбалтыкі, Украіны.

Развіццю нацыі аб'ектыўна садзейнічала стварэнне адзінага эканамічнага рэгіёна ў межах этнагенетычных працэсаў. Пашырэнне гандлёва-эканамічных сувязяў паміж рознымі часткамі Беларусі дазволіла прадстаўнікам карэннай нацыянальнасці лепш самаўсведамляць сваю этнічную агульнасць. Паскарэнне тэмпаў эканамічнага развіцця, пашырэнне капіталістычнага прадпрымальніцтва ў прамысловасці, пераарыентацыя памешчыцкіх гаспадарак на рынак, павелічэнне бессаслоўнага землеўладання, развіццё гандлю і шляхоў зносін, інтэнсіўнае чыгуначнае будаўніцтва спрыялі стварэнню на тэрыторыі Беларусі адзінага эканамічнага рэгёна і станаўленню беларускай нацыі. Аднак апошні стрымліваўся агульным накірункам урадавай палітыкі.

З пачатку XIX ст. адбываецца станаўленне новай беларускай літаратурнай мовы. Асаблівасцю гэтага працэсу была адсутнасць пераемнасці яе з пісьмовай старабеларускай мовай і складванне на народна-гутарковай аснове. Фарміраванне літаратурнай мовы ў гэты час адбывалася пераважна ў жанрах мастацкай літаратуры і публіцыстыкі. Пісьменнікі арыентаваліся на свае родныя гаворкі. Гэта перашкаджала ўсебаковаму пашырэнню слоўніка, у якім, акрамя слоў, звязаных з паняццямі штодзённага побыту, іншыя пласты лексікі былі развіты слаба. Не далі жаданых вынікаў і спробы скласці граматыку і правапіс беларускай мовы, працаваць над якімі пачалі з сярэдзіны XIX ст. Граматыкі П. Шпілеўскага 1846 г. і К. Нядзвецкага 1854 г. засталіся ў рукапісах. У 1862 г. у Варшаве мінскі маршалак А. Аскерка выдаў беларускі лемантар (буквар).

Пры друкаванні беларускіх выданняў выкарыстоўвалася пераважна лацінка. Гэтай графікай былі надрукаваны творы В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча, газета "Мужыцкая праўда", гутарка "Дзядзька Антон ... " і інш. У канцы XIX ст. лацінку паступова пачала выцясняць кірыліца. Пасля ўвядзення закона аб свабодзе друку ў

1905 г. і з'яўленне беларускіх легальных выданняў, асабліва газеты "Наша ніва", фарміраванне літаратурнай мовы, выпрацоўка яе навуковай тэрміналогіі пайшлі хутчэй.

Беларуская плынь у прафесійнай культуры Беларусі ўзрасла ад эпізадычных з'яў у першай палове XIX ст. да шматграннага накірунку на пачатку XX ст.

Беларускія гісторыкі, этнографы на мяжы XX-XXI стст. яшчэ спрачаюцца аб характары, ступені завершанасці працэсу станаўлення беларускай нацыі, выказваюць часам прынцыповыя сумненні, але пакідаюць па-за ўвагай дэталёвы і сур'ёзны аналіз азначанага працэсу. Аднак застаецца аксіёмай, што ў пачатку XX ст. ступень этнічнай кансалідацыі, узровень развіцця нацыянальнай самасвядомасці, нацыянальна-культурнага руху беларусаў, фарміраванне адзінага эканамічнага рэгіёна ў Беларусі са сваімі адметнымі рысамі выйшла на якасна новы ўзровень, які прынцыпова адрозніваецца ад папярэдніх этапаў станаўлення беларускай этнічнай супольнасці. Такім чынам, усё гэта дае падставы меркаваць, што ў пачатку XX ст. беларусы сталі маладой нацыяй, поруч з літоўцамі, украінцамі, латышамі і інш.

**Рабочы рух, прапаганда марксізму.** Развіццё капіталістычных адносін у эканоміцы Беларусі прывяло да фарміравання значных кадраў рабочага класа, занятага ў фабрычнай, мануфактурнай і дробнай прамысловасці, на чыгунках і водных шляхах зносін. У сілу спецыфікі прамысловага развіцця рэгіёна (наяўнасць мноства дробных прадпрыемстваў з невялікай колькасцю занятых на іх рабочых) становішча пралетарыяту Беларусі было больш цяжкім, чым у Расіі ў цэлым. 13-14-гадзінны працоўны дзень, нізкая аплата працы, адвольныя штрафы, жабрацкія жыллёвыя ўмовы, адсутнасць страхавога і пенсіённага забеспячэння вымушала звяртацца беларускіх рабочых да разнастайных формаў пратэсту. Так, у 1864-1865 гг. на будаўніцтве чыгункі Віцебск – Дзінабург асноўнай формай пратэсту былі ўцёкі, а ў 70-я гг. формай сацыяльнага пратэсту становіцца стачка. Па няпоўных дадзеных, у 70-я – першай палове 90-х гг. адбылося 23 забастоўкі і хваляванні, якія адрозніваліся ўзрастаючай арганізаванасцю. Яскравым прыкладам гэтага былі буйныя хваляванні на цагельным заводзе ў Брэсцкай крэпасці (1873), слясарна-кавальскіх майстэрнях Маскоўска-Брэсцкай чыгункі (1876), на будаўніцтве чыгуначных дарог Вільна – Баранавічы (1884), Лібава-Роменскай у Гомелі (1886, 1894), а таксама ў чыгуначных майстэрнях у Пінску (1893), трыкатажных майстэрнях Смаргоні (1895), рабочых-чыгуначнікаў Мінска (1895). 19 красавіка 1895 г. рабочыя Мінска,

Гомеля, Гродна, Смаргоні ўпершыню адзначалі першамайскае свята. На чале рабочага руху звычайна ішлі чыгуначнікі, як адзін з найбольш арганізаваных і буйных атрадаў рабочага класа Беларусі.

У цэлым рабочы рух 70-пачатку 90-х гг. быў накіраваны на паляпшэнне матэрыяльнага становішча рабочых (павышэнне заработнай платы, скарачэнне працоўнага дня, паляпшэнне ўмоў працы) і супраць спагнання штрафаў, ціто ў пэўнай ступені садзейнічала вырашэнню рабочага пытання ў краіне. Прынятае ў краіне працоўнае заканадаўства 80-90-х гг. абмяжоўвала выкарыстанне дзіцячай і жаночай працы (1882, 1885), памеры штрафу (1886), даўжыню працоўнага дня (11,5 гадзіны – у 1897 г.). Для кантролю за выкананнем гэтых і іншых рашэнняў была ўведзена ў 1882 г. фабрычная інспекцыя. Кантроль за ажыццяўленнем законаў аказаўся вельмі слабы, да таго ж законы не распаўсюджваліся на дробную і рамесніцкую вытворчасць. Таму прынятыя законы значна не паўплывалі на становішча рабочых Беларусі.

У той самы час рабочы рух 70 - першай паловы 90-х гг. стварыў умовы для пераходу ў другой палове 90-х гг. ад масавага рабочага руху да свядомай палітычнай барацьбы.

Упершыню планамерную прапагандысцкую работу сярод беларускіх рабочых пачалі весці народнікі. У гуртках, створаных у 1876 і 1877 гг. у Мінску, а таксама ў пачатку 80-х гг. у Магілёве, Віцебску, Гомелі, Брэсце і Гродне, рабочыя займаліся самаадукацыяй, чыталі рэвалюцыйную літаратуру, заадно вывучалі працы К. Маркса і Ф. Энгельса. Марксісцкую літаратуру прысылалі студэнты Пецярбурга і Варшавы. Многа для распаўсюджвання марксізму ў Беларусі зрабілі польская партыя "Пралетарыят" (1882) і асабліва група "Вызваленне працы" (1883), у дзейнасці якой актыўна ўдзельнічалі беларускія народнікі А. Трусаў і С. Ляўкоў, пісьменнік і рэвалюцыянер А. Гурыновіч. Менавіта яны пачалі выданне і распаўсюджванне твораў К. Маркса і Ф. Энгельса ў перакладзе на рускую і польскую мовы ("Маніфест камуністычнай партыі", "Капітал", "Грамадзянская вайна ў Францыі"). Студэнты Берлінскага універсітэта І. Самсонаў і Х. Гурэвіч, студэнт Цюрыхскага політэхнічнага інстытута Г. Салавейчык (ураджэнец Гродна) наладзілі транспарціроўку марксісцкай літаратуры ў Беларусь і Украіну. У другой палове 80 - пачатку 90-х гг. у Мінску (Э. АбрамовІч, Л. Гурвіч, С. Трусевіч), Гродне (Н. Дзем'яновіч, С. Галюн), Віцебску (М. Сакоўкін-Заслаўскі і яго жонка П. Дубінская), Гомелі (А. Поляк) былі арганізаваны гургкі і групы, у якіх вывучаліся працы К. Маркса і Ф. Энгельса. Першыя марксісцкія гурткі ў Беларусі былі нешмаглікія і слаба звязаныя з рабочым рухам.

Якасна новы этап марксізму пачынаецца з сярэдзіны 90-х гг., калі ў выніку стварэння ў Пецярбургу "Саюза барацьбы за вызваленне рабочага класа" (1895) рабочы рух Беларусі злучаецца з агульнарасійскім сацыял-дэмакратычным рухам. Членамі "Саюза барацьбы" былі ўраджэнцы Беларусі Л. Лепяшынскі, М. Левашкевіч, Т. Максімаў і інш. У верасні 1895 г. у Вільню для перагавораў з мясцовымі сацыял-дэмакратамі і аказання дапамогі зборніку "Рабогнік", у якім друкаваліся паведамленні аб сацыял-дэмакратычным і рабочым руху ў гарадах Літвы і Беларусі, прыязджаў У.І. Ленін. У другой палове 90-х гг. сацыял-дэмакратычныя арганізацыі ўжо існавалі ў Мінску, Гомелі, Віцебску, Смаргоні, Ашмянах, Брэст-Літоўску, Гродне, Пінску. Дзейнасць першых сацыял-дэмакратычных гургкоў вялася дзеля падрыхтоўкі з ліку рабочых новых кадраў-прапагандыстаў. Цыкл вучобы працягваўся не менш як тры гады. Гэта былі агульнаадукацыйныя заняткі, мэтай якіх з'яўлялася засваенне матэрыялістычнага светапогляду на гістарычнае развіццё прыроды і чалавецтва, вывучалася тэорыя Маркса. Заняткі ў гуртках мелі акадэмічны характар з захаваннем правіл канспірацыі. Члены сацыял-дэмакратычных арганізацый праводзілі палітычную агітацыю сярод рабочых, распаўсюджвалі лістоўкі і рэвалюцыйную літаратуру, кіравалі стачачнай барацьбой рабочых. Пад непасрэдным уздзеяннем сацыял-дэмакратаў з другой паловы 90-х гг. актывізуецца стачачны рух беларускіх рабочых. З 59 стачак, праведзеных у 90-я гг., на другую палову прыпадае 53, што складае звыш 90% ад агульнай колькасці.

У рабочым і сацыял-дэмакратычным руху Беларусі ў канцы 90-х гг. з*яўляюцца і свае спецыфічныя рысы: імкненне яўрэйскіх, літоўскіх і польскіх сацыял-дэмакратаў стварыць рабочыя арганізацыі па нацыянальнай прыналежнасці. Гэта была своеасаблівая рэакцыя на нацыянальную палітыку ўрада.

У 90-я гады былі створаны сацыял-дэмакратычная арганізацыя Каралеўства Польскага (у 1900 г. - Сацыял-дэмакратыя Каралеўства Польскага і Літвы), "Усеагульны яўрэйскі саюз у Лігве, Польшчы, Расіі" (Бунд).

Такім чынам, у другой палове XIX ст. рэвалюцыйным рухам на Беларусі, як і ва ўсёй Расіі былі закладзены ідэйныя і арганізацыйныя асновы далейшай барацьбы за правы працоўных.

## ТЭМА III. БЕЛАРУСЬ У ПАЧАТКУ XX ст.

**Гістарыяграфія, крыніцы.** Беларусь у канцы XIX – пачатку XX стст. знаходзілася на этапе значных эканамічных і палітычных перамен, якія праходзілі ў кантэксце з агульнарасійскімі працэсамі. На рубяжы стагоддзяў у Расійскай імперыі назіраецца хуткае развіццё буйной прамысловасці, чыгункі, банкаў. Актыўнае дзяржаўнае рэгуляванне ставіла эканоміку ў прамую залежнасць ад урадавай палітыкі. У той самы час прамысловы ўздым, рост гарадоў, капіталістычная эвалюцыя сельскай гаспадаркі, пашырэнне сацыяльнага і рэвалюцыйнага руху ўздзейнічалі на палітыку царызму. Урад падштурхоўваўся да змены ўнутранай палітыкі ад векавых традыцый самадзяржаўя да фарміравання больш адкрытага грамадства. У гэтых умовах пашыраліся магчымасці праяўлення рэгіянальных, нацыянальных асаблівасцей Беларусі.

Трэба адзначыць, што падзеі на Беларусі знайшлі адлюстраванне ў тагачасным друку. Аб сацыяльным і нацыянальным руху, напрыклад, пісалі прадстаўнікі рэвалюцыйнай плыні браты А. і І. Луцкевічы, К. Каганец, С. Палуян. Значны матэрыял на гэтую тэму быў змешчаны ў беларускамоўных газетах "Наша доля" і "Наша ніва". У дарэвалюцыйны час былі выдадзены працы П. Баброўскага, І. Вульферта, А. Дэмбавецкага, у якіх характарызуецца развіццё прамысловасці, сельскай гаспадаркі, гандлю на Беларусі. У 1908 г. у Кіеве Д. Дарашэнка надрукаваў адну з першых кніг, прысвечаных адраджэнню беларускага народа "Білоруси і їх национальне відроження", у якой апавядае аб лёсе беларусаў, іх гісторыі і культуры, развіцці нацыянальнай свядомасці, нацыянальна-вызваленчага руху ў начатку XX ст.

Вялікая колькасць публікацый, у якіх аналізуюцца гістарычныя падзеі на пачатку XX ст., з'яўляецца ў савецкі перыяд. У 20-я гады былі надрукаваны працы М. Доўнар-Запольскага "Народное хозяйство Белоруссии 1861-1914 гг.", У. Ігнатоўскага "Гісторыя Беларусі ў XIX і ў пачатку XX стагоддзя", У. Пічэты "Крестьянское и рабочее движение на Белоруссии в эпоху 1905 года", Ф. Турука "Белорусское движенне: Очерк истории национального и революционного движения белорусов", А. Цвікевіча "Западно-руссизм": Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в.", С. Агурскага "Очерки по истории революционного движения в Белоруссии (1863-1917 гг.)", М. Рафеса "Очерки истории еврейского рабочего двнжения" і іншыя. Аўтары ўвялі ў навуковы абарот вялікі пласт архіўнага і дакументальнага матэрыялу.

Актыўна распрацоўваліся праблемы эканамічнага, сацыяльна-палітычнага, культурнага развіцця Беларусі ў 60-80-я гады. У першую чаргу трэба адзначыць выдадзеныя шматтомныя калектыўныя працы: "Гісторыя Беларускай ССР", "История рабочего класса Белорусской ССР", "Гісторыя беларускага мастацтва". У гэты час з друку выйшлі змястоўныя манаграфічныя работы К. Шабуні "Аграрный вопрос н крестьянское движение на Белоруссии в революции 1905-1907 гг.", В. Панюціча "Из истории формирования пролетариата Белоруссии 1861-1914 гг.", М. Біча "Рабочее движение в Белоруссии в 1861-1904 гг.", М. Болбаса "Промышленность Белоруссии (1860-1904 гг.)", Л. Ліпінскага "Классовая борьба в белорусской деревне (1907-1914 гг.)" і іншых. Падрыхтаваныя на аснове багатага дакументальнага матэрыялу, кнігі гэтых аўтараў унеслі значны ўклад у распрацоўку беларускай гісторыі пачатку XX ст.

Безумоўна, у савецкай гістарыяграфіі некаторыя складаныя праблемы не маглі знайсці свайго адлюстравання з-за ідэалагічных абмежаванняў. Па-за ўвагай гісторыкаў засталося вывучэнне сацыяльна-класавай структуры грамадства, сістэмы дзяржаўнага кіравання, дзейнасці розных палітычных партый. У апошнія гады даследчыкі беларускай мінуўшчыны звярнуліся да гэтых нераспрацаваных праблем. З’явіліся новыя публікацыі, і ў тым ліку калектыўныя: "Энцыклапедыя гісторыі Беларусі", "Нарысы гісторыі Беларусі. Ч. 1. (Мн.,1994); Ч. 2. (Мн., 1995), Гісторыя Беларусі". Выд. 2, перапрац. і дапоўн. Ч. 1. (Мн., 2000); Ч. 2. (Мн., 2000).

Крыніцы па гісторыі Беларусі пачатку XX ст. даволі значныя. У першую чаргу гэта матэрыялы статыстыкі: "Первая Всеобщая перепись населения Российской империи 1897 г."; матэрыялы пазямельных абследаванняў; ваенна-конскіх перапісаў; статыстыкі землеўладання; дадзеныя паказальнікаў і спісаў фабрык і заводаў. Багаты матэрыял можна знайсці ў штогадовых справаздачах губернатараў і дадатках да іх, аглядах навучальных устаноў, справаздачах фабрычных інспектараў. Безумоўна, уяўляюць цікавасць заканадаўчыя акты і дакументы ўрадавых устаноў. Яны выдаваліся ў зборніках дакументаў: "Полное собрание законов Российской империи. Собрание третье", "Законодательные акты переходного времени. (1904-1908 гг.)", "Государственная дума в России в документах и материалах". Значны матэрыял прадстаўлены ў перыядычнам друку ў пачатку XX ст. У губернскіх гарадах выдаваліся “Губернские ведомости", "Памятные книжки губерний",

"Епархиальные ведомости", дзесяткі іншых перыядычных выданняў, у тым ліку і апазіцыйных.

Захаваўся пласт тагачаснай мемуарыстыкі. Надрукаваны ўспаміны віленскага гснерал-губернатара Мураўёва, мінскага губернатара П. Курлова, дзеячаў нацыянальна-адраджэнскага руху А. Луцкевіча, Я. Дылы і інш. Уся гэтая літаратура і крыніцы даюць магчымасць студэнтам больш глыбока асэнсаваць гісторыю нашай краіны на рубяжы стагоддзяў.

ЛЕКЦЫЯ 9

## НАЦЫЯНАЛЬНЫ І САЦЫЯЛЬНЫ СКЛАД ГРАМАДСТВА

- *Нацыянальны склад насельніцтва*
- *Сацыяльная структура грамадства*

**Нацыянальны склад насельніцтва.** У канцы XIX ст. на тэрыторыі пяці беларускіх губерняў пражывала больш за 8,5 млн. чалавек, у тым ліку 5,4 млн. беларусаў, 1,2 млн. яўрэяў, 493 тыс. рускіх, 424 тыс. палякаў, 377 тыс. украінцаў, а таксама прадстаўнікі іншых нацыянальных меншасцяў. Нацыянальны склад беларускіх губерняў, паводле дадзеных Першага Усеагульнага перапісу насельніцтва Расійскай імперыі ў 1897 г., прыведзены ў наступнай табліцы.

| Нацыянальнасць | Губерніі | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Гродзен-ская | Віленская | Віцебская | Мінская | Магілёўская | Агульная колькасць | У прац. |
| Беларусы | 705045 | 906820 | 788599 | 1633091 | 1389782 | 5423337 | 63,54 |
| Рускія | 74143 | 78623 | 198001 | 83999 | 58155 | 492921 | 5,78 |
| Украінцы | 362526 | 913 | 420 | 10069 | 3559 | 377487 | 4,42 |
| Яўрэі | 278542 | 202374 | 174240 | 343466 | 203507 | 1202129 | 14,08 |
| Палякі | 161662 | 130054 | 50377 | 64617 | 17526 | 424236 | 4.97 |
| Латышы | - | - | 264062 | 1686 | 7027 | 272775 | 3.20 |
| Літоўцы | 3366 | 279694 | 2235 | - | 3600 | 288895 | 3,39 |
| Татары | 2420 | 1223 | - | 4059 | - | 7702 | 0,09 |
| Немцы | 10284 | 2250 | 7361 | 3984 | 1806 | 25688 | 0,30 |
| Іншыя | 5421 | 1024 | 3951 | 6706 | 1802 | 18904 | 0,22 |
| Усяго | 1603409 | 1602975 | 1489246 | 2151677 | 1686764 | 8534071 | 100 |

Як бачна, суадносіны прадстаўнікоў нацыянальнасцяў у губернях былі розныя. Паводле перапісу, найбольш нацыянальна

аднароднай была Магілёўская губерня – там пражывала 82,39% беларусаў, у Мінскай губерні – 76%, Віленскай – 56,57%, Віцебскай – 52% і Гродзенскай – 44%.

У Віленскай губерні беларускае насельніцтва мела абсалютную большасць у Вілейскім, Дзісненскім, Ашмянскім і Лідскім паветах. У Свянцянскім павеце беларусаў было 47,5%, літоўцаў – 33,8%. У Віленскім павеце беларусы складалі 26%, яўрэі – 21,3%, літоўцы – 20,9%, палякі – 20,1%. У Трокскім павеце налічвалася 58,1% літоўцаў. На другім па колькасці месцы тут былі беларусы (15,7%).

У Віцебскай губерні пераважная большасць беларусаў пражывала ў паветах – Дрысненскім (86,2)%, Веліжскім (85,7%), Невельскім (84,0%), Гарадоцкім (83,6%), Лепельскім (82,0%), Полацкім (73,1%). У Віцебскім павеце беларусаў было 51,1%, яўрэяў – 22,3%, рускіх – 20,1%. У Себяжскім павеце беларускае насельніцтва складала 47,1%.

У Люцынскім павеце пражывала латышоў – 64,2%, беларусаў – 20,5%. У Рэжыцкім павеце латышскае насельніцтва складала 57,9%, беларускае – 5,4%. У Дзвінскім павеце латышы мелі адносную большасць – 39%, беларусы – 13,8%.

У Гродзенскай губерні беларускае насельніцтва складала ў Сакольскім павеце – 83,9%, Ваўкавыскім – 82,4%, Слонімскім – 80%, Пружанскім – 75,5%, Гродзенскім – 65,8%. Трэба адзначыць, што ў Кобрынскім і Брэсцкім паветах было зафіксавана большасць (79,5% і 64,3% адпаведна) украінцаў. Гэтая акалічнасць звязана з тым, што жыхароў Палесся, мова якіх набліжана да ўкраінскай, перапісчыкі аднеслі да ўкраінцаў. У Бельскім павеце 39,1% насельніцтва паказана ўкраінскага, 34,8% – польскага. У Беластокскім павеце палякі складалі 34,2%, яўрэі – 28,3%, беларусы – 26,1%.

Акрамя 5 беларускіх губерняў больш за 300 тыс. беларусаў кампактна пражывала на сумежных тэрыторыях. У Краснінскім павеце Смаленскай губерні беларускае насельніцтва складала 90%, у Суражкім павеце Чарнігаўскай губерні – 70%, у Аўгустоўскім павеце Сувалкскай губерні – 32,5%.

Характэрнай асаблівасцю беларускага этнасу з'яўлялася тое, што больш за 90% беларусаў пражывала ў сельскай мясцовасці і працавала на зямлі. У параўнанні з яўрэямі, рускімі, палякамі, якія мелі сваю монарэлігію, беларусы былі падзелены па веравызнанню на праваслаўных і католікаў. Безумоўна, гэта не садзейнічала кансалідацыі беларускага этнасу. Як праваслаўная царква, так і каталіцкі касцёл не прызнавалі беларусаў як народ. Пасля скасавання уніі (1839) і далучэння уніятаў да праваслаўнай царквы, колькасць

праваслаўных сярод беларусаў павялічылася ў 1897 г. да 81,2%. Беларусы-каталікі пражывалі ў асноўным у Віленскай і Гродзенскай губсрнях. У Мінскай і Віцебскай губернях колькасць каталікаў сярод беларусаў складала каля 10%, а ў Магілёўскай – 2%.

На другім месцы па колькасці насельніцтва ў Беларусі былі яўрэі. У 1897 г. у Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай губернях налічвалася больш за 1 млн. 200 тыс. чалавек. Яўрэйскае насельніцтва ў асноўным пражывала ў гарадах і мястэчках. Сярод гарадскога насельніцтва Віленскай губерні яўрэі склалі 43%, Віцебскай – 52%, Гродзенскай – 61,2%, Мінскай – 58,8%, Магілёўскай – 52,4%.

У 80-я гады XIX ст. пасля забойства імператара Аляксандра II царскі ўрад прымае шэраг абмежаванняў для яўрэйскага насельніцтва. Яўрэям было забаронена пасяляцца ў сельскай мясцовасці і займацца земляробствам, ім быў абмежаваны доступ на дзяржаўную службу, у органы мясцовага кіравання, вышэйшыя навучальныя ўстановы, на прадпрыемствы сувязі, чыгунку. Асноўнымі заняткамі яўрэяў быў гандаль, дзе было занята 38,7%, і рамесніцтва, якім займалася 34,3% яўрэйскага насельніцтва.

На тэрыторыі Беларусі пражывала амаль 500 тыс. рускіх. У сялянскім асяроддзі рускія складалі 5%, сярод патомных дваран – 16%, асабістых дваран – 51,8%, духавенства – 61,5%. Павелічэнне колькасці рускага насельніцтва было звязана з урадавай палітыкай у другой палове XIX ст. У выніку на тэрыторыю Беларусі перасяліліся рускія памешчыкі, чыноўнікі, часткова сяляне.

У канцы XIX ст. у Беларусі пражывала 424 тыс. палякаў. Найбольшая іх колькасць была ў Гродзенскай і Віленскай губернях. Сярод гараджан польскае насельніцтва складала 12,7%, у вёсцы – 4,6%. Значная колькасць палякаў пражывала ў Вільні – 47,8 тыс. чалавек (30,9% ад агульнай колькасці жыхароў горада), у Беластоку – 11,3 тыс. чалавек (16,9%), у Гродне – 6,8 тыс. (14%), Мінску - 10 тыс. (11%). Сярод польскага насельніцтва пераважала шляхта, якая складала 25%. сялянства – 40% мяшчане – 31%.

**Сацыяльная структура грамадства.** Сацыяльная структура насельніцтва Беларусі ў пачатку XX ст. была разнастайнай і даволі складанай. старычныя, палітычныя абставіны, нацыянальныя фактары, якія ўздзейнічалі на фарміраванне структуры грамадства, ускладнялі стварэнне адзінай і закончанай яе схемы. З аднаго боку, існавалі даволі жорсткія саслоўныя абмежаванні, а з другога, прамысловы рост, урбанізацыя, змяненне адукацыйнага ўзроўню насельніцтва мянялі грамадскі статус, лад мыслення і жыцця людзей.

Таму ў беларускім грамадстве можна вызначыць некалькі сацыяльных груп насельніцтва: дваранства, буржуазія, інтэлігенцыя (чыноўнікі, служачыя, настаўнікі, урачы, афіцэры і інш.), сялянства і рабочыя.

У сацыяльнай структуры беларускага грамадства значная роля адводзілася дваранству, якое было апорай дзяржаўнай улады. У канцы XIX ст. у заходніх губернях налічвалася 205 тыс. дваран, спадчынных і асабістых. Па нацыянальнаму складу спадчыннае дваранства ў асноўным было беларускім. Паводле перапісу 1897 г. у 35 беларускіх паветах з 149 168 патомных дваран 77 264 чалавек (51,8%) прызналі роднай беларускую мову, 32,9% – польскую, 11,7% – рускую.

Большасць асабістага дваранства на Беларусі было рускімі – 50,8% (12 726 чалавек), 25,9% (6487 чалавек) – беларусамі, 18,7% (4685 чалавек) – палякамі. Ва ўмовах бюракратызацыі грамадства ўрад быў зацікаўлены ў папаўненні кіруючага апарату дваранамі. Асабістае дваранства, якое надавалася чыноўнікам, было сведчаннем іх палітычнай надзейнасці, узроўню адукацыі, высокіх асабістых якасцсй. А для чыноўнікаў гэта быў стымул для сацыяльнай кар’еры.

У другой палове XIX ст. ў Беларусі колькасць дваранства павялічваецца. Але дваранства не было аднародным. Яно падзялялася на магнагаў і шматлікую шляхту. Прычым большасць шляхты была беззямельнай і малазямельнай. Здавалася, што яна не вельмі адрознівалася ад сялянства. але сацыяльная арыентацыя, псіхалагічныя ўстаноўкі стрымлівалі размыванне шляхты. Асобна трымалася польскае дваранетва. Яно прымала актыўны ўдзел у польскім нацыянальна-вызваленчым руху. Рэпрэсіі супраць удзельнікаў паўстання 1830-1831 гг. і 1863 г. прывялі да памяншэння іх колькасці. Палякам забаранялася купляць і браць у арэнду зямельныя ўчасткі, польскае дваранства не мела некаторых карпаратыўных прывілеяў. Адмена ў 1870 г. надзвычайнага становішча і амністыя, а затым адмена ў 1895 г. абавязковага продажу маёнткаў удзельнікаў паўстання 1863 г., адмена шасціпрацэнтнага збору на прыбытак крыху палепшылі становішча шляхты.

Асобнае месца сярод дваранства займалі памешчыкі. Безумоўна, асяроддзе буйных землеўладальнікаў не было сацыяльна аднародным: тут былі прадстаўнікі купецтва, святары, ганаровыя грамадзяне, якія валодалі зямельнымі надзеламі звыш 50 дзес., а таксама заможныя сяляне, якія мелі не менш чым 100 дзес. зямлі. Але галоўную ролю ігралі буйныя памешчыцкія гаспадаркі. У пачатку XX ст. 35% памеснага дваранства валодала больш чым 500 дзес. зямлі. У іх руках

знаходзілася 89% дваранскага зямельнага фонду. У нараўнанні з вышэйшым саслоўем Расійскай імперыі дваранства беларускіх губерняў на пачатку XX ст. захавала большасць сваіх зямельных угоддзяў. Да таго ж, у Гродзенскай і Мінскай губернях феадальная сістэма эканамічных адносін была значна падарвана. Памешчыцкая гаспадарка тут вялася амаль выключна за кошт наёмнай працы і была арыентавана на рынак. Разам з тым, у канцы XIX ст. назіраўся рост недваранскага, буржуазнага землеўладання. Значная колькасць дваранскіх гаспадарак была закладзена у банках, выстаўлялася на продаж за даўгі. У 1894 г., напрыклад, плошча зямель, закладзеных у банках, складала 51,7% ад агульнай іх колькасці. На Беларусі фарміраваўся клас так званых "новых памешчыкаў", выхадцаў з розных сацыяльных груп насельніцтва. Нягледзячы на дамінуючае становішча дваранскага землеўладання, набірала сілу іншая тэндэнцыя, якая сведчыла аб пашырэнні ў грамадстве капіталістычных адносін.

Працэс фарміравання прамысловай буржуазіі пачаўся яшчэ ў дарэформенны перыяд. Фабрыкі, буйныя мануфактуры, якія ў асноўным належалі дваранам, прызначаліся для перапрацоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі памешчыцкіх гаснадарак. Паступова гэтую групу прадпрымальнікаў папаўняюць прадстаўнікі гандлёвага капіталу. У канцы XIX ст. удзельная вага дваранскага прадпрымальніцтва панізілася. Між тым многія буйныя прадпрыемствы належалі памешчыкам: папяровая фабрыка князя Паскевіча ў Добрушы, суконная фабрыка і цукровы завод Скірмунта ў Парэччы Пінскага павета. Паводле "Спіса фабрык і заводаў Еўрапейскай Расіі", выдадзенага В.Е. Варзарам, у 35 беларускіх паветах сярод уладальнікаў 343 фабрык і заводаў дваране валодалі 169, што складала 49,3% ад іх агульнай колькасці. Свае капіталы яны накіроўвалі ў асноўным у харчовую прамысловасць. Многія памешчыкі адначасова з'яўляліся прадстаўнікамі буйной і сярэдняй буржуазіі.

Увогуле буйная і сярэдняя індустрыяльная буржуазія колькасна была нязначнай. У 1900 г. налічвалася каля 2 тыс. прадстаўнікоў гэтай сацыяльнай іруны. Асноўную масу прадпрымальнікаў складалі ўладальнікі дробных прадпрыемстваў, якіх налічвалася больш за 77 тысяч.

Вялікія фінансавыя магчымасці мела гандлёвая буржуазія. У гандлі знаходзілася 76% абаротных сродкаў. У 1900 г. кунцы валодалі 137 фабрыкамі і заводамі (30,4%). Гандлёвая буржуазія была прадстаўлена ў асноўным яўрэйскімі купцамі. У 5 беларускіх губернях яны складалі 84,5% купцоў, 10,7% былі рускія, 1,7% - беларусы.

Набірала сілу сельская буржуазія. На рубяжы стагоддзяў яна складала 8-10% ад агульнай колькасці сельскіх двароў, а гэта прыкладна 65,7 тыс. гаспадарак. Сельская буржуазія валодала большасцю купчых і арэндных зямель.

Фарміраванне новага класа прадпрымальнікаў праходзіла пад уздзеяннем розных эканамічных і палітычных фактараў. Існавалі саслоўныя перагародкі, нацыянальна-рэлігійныя адрозненні, палітычныя абмежаванні. Большасць прадпрымальнікаў з ліку купцоў і мяшчан складалі прадстаўнікі яўрэйскай нацыянальнасці. Буржуазія, якая выйшла з дваранства, па этнічнай прыналежнасці з'яўлялася рускай, польскай і толькі часткова беларускай. Сельская буржуазія была ў асноўным з ліку беларусаў. Яна фарміравалася з патомнай шляхты і заможнага сялянства, была рознай па веравызнанню, тэрытарыяльна раскіданай па вёсках і фальварках, абмежаванай у сваіх фінансавых магчымасцях. Таму яе ўздзеянне на сацыяльна-эканамічнае і культурнае жыццё краю было нязначным.

І яшчэ аб адной асаблівасці. Буржуазны клас фарміраваўся ў краіне пад патранажам дзяржаўнай улады і царскай бюракратыі. Таму эканамічная і палітычная незалежнасць» гэтага класа была даволі адноснай. Дзяржаўныя заказы, інвестыцыйная, мытная палітыка ўрада сур'ёзна ўздзейнічалі на развіццё прадпрымальніцтва. У многім урад з'яўляўся гарантам даходаў буржуазіі, якая вяла жорсткую эксплуатацыю наёмных рабочых. Менавіта ўрад забараняў рабочым легальна адстойваць свае эканамічныя інтарэсы шляхам стварэння прафесійных саюзаў, правядзення акцый пратэсту. З другога боку, царскі ўрад рэўнасна адносіўся да спробаў палітычнай актыўнасці новага класа. Але прадстаўнікі буржуазіі амаль не ўдзельнічалі ў палітычным жыцці, не валодалі гэхналогіямі сацыяльнага кіравання.

**Інтэлігенцыя** на Беларусі не была шматлікай. Да яе можна аднесці не толькі дзсячаў культуры, вучоных, работнікаў адукацыі, медыцыны, прадстаўнікоў тэхнічнай інтэлігенцыі, але і чыноўнікаў, служачых, ваенных, духавенства. Паводле звестак Усеагульнага нерапісу насельніцтва 1897 г. у 35 беларускіх паветах налічвалася 12 367 чыноўнікаў (з сем'ямі – 37 327 чал.), 6198 прадстаўнікоў духавенства (з сем'ямі – 21 067 чал.), 21 434 нрадстаўнікоў "вольных прафесій". Да апошніх адносілі работнікаў розных педагагічных, медыцынскіх устаноў, літаратараў, юрыстаў, дзеячаў культуры. На тэрыторыі Беларусі знаходзілася 69 412 ваеннаслужачых (74 585 чал. з сем'ямі). Сярод іх быў афіцэрскі корпус, які таксама трэба аднесці да інтэлігенцыі.

Агульную характарыстыку тагачаснай інтэлігенцыі даць вельмі складана, бо яна была неаднолькавай па свайму адукацыйнаму і прафесійнаму ўзроўню, матэрыяльнаму дабрабыту, палітычных поглядах. Што тычыцца нацыянальнай інтэлігенцыі, то яна была нешматлікай і недастаткова арганізаванай. У 80-90-я гады XIX ст. з вялікімі цяжкасцямі ідзе фарміраванне беларускай інтэлігенцыі з асяроддзя шляхты, сялян, мяшчан. Скончыўшы навучальныя ўстановы, беларусы сталі займаць пасады ў адміністрацыйных установах, настаўнікаў гімназій, школ. У гэты час у Расійскай імперыі пры паступленні на дзяржаўную службу заставаліся абмежаванні па паходжанню і адукацыі. Права атрымаць дзяржаўную пасаду мелі дзеці дваран, чыноўнікаў, духавенства, купцоў першай гільдыі, а таксама асобы з вышэйшай адукацыяй, альбо асобы, якія мелі дыплом з адзнакай сярэдняй спецыяльнай установы. Жыццё патрабавала пашыраць практыку замяшчэння пасад па вольнаму найму. Выключэнні былі зроблены для фінансавых устаноў, тэлеграфа і г. д. Але беларусам было вельмі цяжка прабіцца ў дзяржаўныя ўстановы. Калі іх і прымалі туды, то на другарадныя пасады. Палітычная надзейнасць таксама была адным з галоўных фактараў пры прыняцці рашэння аб залічэнні на службу. Асноўныя пасады займалі чыноўнікі з Расіі. Апошнім устанаўліваўся павышаны грашовы аклад, надавалася магчымасць ільготнай куплі зямлі, ствараліся перспектывы хуткай кар’еры.

Значны ўплыў у грамадстве мела духавенства, у склад якога ўваходзіла 4830 праваслаўных святароў (77,9%), 902 іудзейскіх і мусульманскіх (14,6%), 466 каталіцкіх і пратэстанцкіх (7,5%). Духавенства мела даволі высокі адукацыйны ўзровень, таму ўрад выкарыстоўваў праваслаўную царкву ў мэтах ідэйнага ўздзеяння на насельніцтва. Пасля адмены ў 1869 г. наследнасці ў фарміраванні духавенства паступова павялічвалася ўдзельная вага выхадцаў з іншых сацыяльных груп, у тым ліку і з беларускага сялянства. Гэта пашырала магчымасці фарміравання нацыянальнай інтэлігенцыі.

Найбольш значную групу інтэлігенцыі складалі людзі "вольных прафесій". Як ужо адзначалася, у 35 беларускіх паветах у канцы XIX ст. налічвалася больш за 21 400 такіх асоб, у тым ліку 15 тыс. займаліся вучэбнай і выхаваўчай дзейнасцю, 4715 работнікаў медыцынскіх устаноў, 609 прадстаўнікоў навукі, літаратуры, мастацтва, юрыстаў. У сярэдніх навучальных і спецыяльных навучальных установах вучыліся дваране, выхадцы з духавенства, якія закончылі універсітэты, педагагічныя інстытуты, альбо духоўныя акадэміі. Сярод настаўнікаў сельскіх школ каля паловы складалі

выхадцы з сялянства, амаль 30% выкладчыкаў было з духавенства. Адукацыю яны атрымалі ў настаўніцкіх семінарыях, гарадскіх вучылішчах, духоўных семінарыях і вучылішчах.

Па нацыянальнай прыналежнасці інтэлігенцыя складалася з рускіх, беларусаў і ў меншай ступені – палякаў. У іх асяроддзі найбольш уплывовай станавілася беларуская ліберальная думка. Набіраў сілу працэс культурнага адраджэння Беларусі. У Пецярбургу гурток студэнтаў пачаў выдаваць нелегальны часопіс "Гоман". У рэдакцыйным артыкуле першага нумара была абгрунтавана думка аб неабходнасці федэратыўнай незалежнасці Беларусі. Разважанні на гэту тэму мелі працяг у наступным нумары. У артыкуле па нацыянальнаму пытанню гаварылася аб прагрэсіўным характары ўзнікнення нацый, аб праве на самавызначэнне кожнай нацыі, аб праве беларускага народа на аўтаномную федэратыўную самастойнасць у сям'і іншых народнасцей Расіі. Аўтары заявілі аб сваім жаданні "энергічна абараняць Беларусь як ад польскага, так і вялікарасійскага насілля".

Акрамя дзейнасці народніцкіх гурткоў студэнцкай і вучнёўскай моладзі шырылася прапаганда беларускага адраджэння ў сродках масавай інфармацыі. У 1889-1890 гг. у Маскве выдаваўся "Календарь Северо-Западного края" пад рэдакцыяй М.В. Доўнар-Запольскага, у якім былі надрукаваны некалькі вершаў на беларускай мове, шэраг навуковых артыкулаў па гісторыі, этнаграфіі Беларусі. У 90-я гады ў мясцовых газетах ("Минскнй листок", "Виленский вестник", "Губернские ведомости") з'яўляліся артыкулы, якія асвятлялі моўныя, гістарычныя асаблівасці беларускага народа.

Паралельна ішла навуковая распрацоўка беларускай праблематыкі. Значны след у этнаграфічнай навуцы пакінуў настаўнік народнай школы, а потым падрыхтоўчага класа Віцебскай гімназіі М. Я. Нікіфароўскі (1845-1910), які ў сваіх працах "Нарысы Віцебскай Беларусі", "Простанародныя прыкметы і павер'і" і іншых выразна паказаў карціну народнага светапогляду. Шэраг беларускіх зборнікаў казак, песень, вершаў выдаў этнограф, археолаг, гісторык Е.Р. Раманаў. Веяьмі плённай была праца Я.Ф. Карскага па вывучэнню беларускай мовы. Ён надрукаваў кнігі: "Гісторыя гукаў і форм беларускай мовы", "Даследаванне пра беларускія псалтыры 15 ст.", а пазней – шматтомную працу "Беларусы".

У гэты час працавалі таксама вучоныя гісторыкі, этнографы М. Доўнар-Запольскі, К. Ляцкі, А. Багдановіч, М. Янчук, З. Радчанка, А. Сапуноў, У. Завітневіч, І. Лапа і многія іншыя, якія ўнеслі асабісты ўклад у вывучэнне гісторыі і культуры Беларусі.

Адраджалася беларуская літаратурная мова. Яе фарміраванне адбывалася ў жанрах мастацкай літаратуры і публіцыстыкі. У 90-я гады з'явіліся брашуры мінскага памешчыка А. Ельскага. У 1892 г. ён выдаў пераклад "Пана Тадэвуша" А. Міцкевіча, потым надрукаваў вершаваную аповесць "Сынок", "Слова аб праклятай гарэлцы" і інш. Значны ўклад у развіццё беларускай літаратуры канца XIX ст. унеслі пісьменнікі А. Абуховіч, Ф. Тапчэўскі, К. Каганец і інш.

Набірала моц творчасць беларускіх паэтаў Ф. Багушэвіча, Я. Лучыны, А. Гурыновіча, якія выказвалі сваю шчырую любоў да Беларусі, яскрава падкрэслівалі багацце беларускай культуры і цяжкую долю яго народа.

Фарміраванне беларускай інтэлігенцыі і яе дзейнасць рыхтавалі грамадства да нацыянальнага самаўсведамлення. Невыпадкова паводле перапісу 1897 г. большасць спадчыннага дваранства лічылі сябе беларусамі. Роднай прызналі беларускую мову 60% настаўнікаў, 20% работнікаў меды" цынскіх устаноў.

**Рабочы клас,** як самастойная сацыяльная група, узнікае яшчэ ў другой палове XVIII ст. На вотчынных мануфактурах Беларусі працавалі рабочыя, большасць якіх з'яўлялася прыгоннымі сялянамі. Пасля адмены прыгоннага права, прадпрыемствы, заснаваныя на прымусовай працы, былі пераведзены на вольнанаёмныя адносіны. Прамысловасць атрымала велізарны рэзерв рабочай сілы з ліку беззямельнага сялянства, яўрэйскай гарадской беднаты, рамеснікаў, сялян-саматужнікаў, якія не вытрымалі канкурэнцыі з прывазнымі таварамі фабрычна-заводскай вытворчасці. Найбольш масавай сацыяльнай базай пралетарыяту з'яўлялася бяднейшае сялянства. У канцы XIX ст. аграрная перанаселенасць складала прыкладна 1,5 млн. працаздольных жыхароў вёскі, многія з якіх шукалі магчымасць пракарміцца на адыходных промыслах у гарадах, на будаўніцтве дарог, сельскагаспадарчых работах. У 90-х гадах налічвалася да 300 тыс. сялян-адыходнікаў.

У пачатку XX ст. на Беларусі колькасць пастаянных наёмных рабочых склала больш за 400 тыс. чалавек, у тым ліку ў прамысловасці працавала каля 180 тыс. чалавек, на чыгунцы – 25 тыс., на рачным і гужавым транспарце, у будаўніцтве, гандлі, сельскай гаспадарцы налічвалася больш за 200 тыс. чалавек. Найбольш значныя атрады прамысловага пралетарыяту вылучаліся сярод рабочых дрэваапрацоўчай (53,4 тыс.) і харчасмакавай (26 тыс.) вытворчасці. Пастаянна павялічвалася колькасць наёмных сельскагаспадарчых рабочых. Сярод рабочых жанчыны склалі 16%, дзеці – 6%. Большасць пралетарыяту паходзіла з мясцовых людзей.

Паводле перапісу 1897 г. з другіх губерняў налічвалася ўсяго 5% рабочых. Знайсці працу на фабрычна-заводскіх, дробнакапіталістычных прадпрыемствах было вельмі складанай справай. Беларускія гарады былі перанаселены працаздольнымі яўрэйскімі жыхарамі, таму выхадцы з сяла практычна не маглі прабіцца ў гарады. Невыпадкова таму беларусы шукалі лепшай долі за межамі свайго краю. У 1897 г. у гарадах Мінску, Магілёве, Гродне, Гомелі, Віцебску пражывала 41 тыс. беларусаў, у той час як у Пецярбургу колькасць іх склала 66,5 тыс. чалавек, Адэсе – 16,9 тыс., Маскве – 15,9 тыс. чалавек.

Велізарны рынак свабоднай рабочай сілы, адсутнасць законаў, якія б рэгулявалі адносіны прадпрымальнікаў і рабочых, вялі да эксплуатацыі пралетарыяту. Рабочы дзень на прадпрыемствах складаў 12 гадзін і болей, у рамесных майстэрнях – 13, а то і 15 гадзін. Амаль адсутнічала медыцынскае абслугоўванне. Царскі ўказ ад 1866 г. аб увядзенні на прадпрыемствах прыёмных медыцынскіх кабінетаў з ліку 1 ложак на 100 рабочых у канцы XIX ст. выконваўся толькі на 12% прадпрыемстваў. Прынятыя законы аб абмежаванні працы дзяцей і падлеткаў (1882), забароне працы ноччу для жанчын і падлеткаў да 17 гадоў (1885), увядзенні выхадных і святочных дзён і скарачэнні працоўнага дня (1897) дзейнічалі абмежавана. Фабрычная інспекцыя цікавілася іх выкананнем толькі на прыватных фабрыках і заводах. Гэтае заканадаўства не распаўсюджвалася на рамесніцкую вытворчасць і амаль зусім не выконвалася на дзяржаўных прадпрыемствах.

Рабочым было забаронена ствараць прафесійныя арганізацыі, а правядзенне забастовак лічылася крымінальным дзеяннем. У краіне дзейнічала сістэма натуральнай аплаты працы, шматлікіх штрафных санкцый. У 1901 г. на прадпрыемствах. падначаленых надзору фабрычнай інспекцыі, штрафы атрымлівалі каля 50% усіх рабочых. Рублём каралі за спазненне на працу, курэнне, непарадак на рабочым месцы, парушэнне цішыні, непадпарадкаванне кіраўніку і г. д. Калі сума штрафаў складала трэць двухтыднёвага заработку рабочага, то яго можна было звальняць.

Умовы працы на большасці прадпрыемстваў не адпавядалі санітарным нормам, а заработак быў невялікі. У 1902 г. зарплата фабрычна-заводскіх рабочых беларускіх губерняў склала ў сярэднім 157,8 рубля. Многа гэта ці мала? Значна менш, чым у еўрапейскіх губернях Расіі, дзе яна была 215 рублёў. Па падліках тагачасных статыстыкаў у 1904 г. у Пецярбургу пражытачны мінімум на аднаго чалавека складаў прыкладна 250 рублёў. Дрэннымі былі жыллёвыя

ўмовы рабочых. У канцы XIX ст. каля 26% рабочых пражывалі ў казармах, інтэрнатах, кватэрах пры фабрыках, а астатнія здымалі вуглы, ложкі ў горадзе, альбо начавалі непасрэдна ў вытворчых памяшканнях. І толькі высокакваліфікаваныя рабочыя мелі сваё жыллё, альбо арандавалі кватэры.

Цяжкія эканамічныя ўмовы, палітычнае бяспраўе стваралі перадумовы для радыкалізацыі рабочага руху, пераходу пралетарыяту ў пачатку XX ст. да актыўнай палітычнай барацьбы.

Найбольш значным класам беларускага грамадства ў колькасным складзе было **сялянства.** На рубяжы стагоддзяў іх налічвалася 6,42 млн. чалавек, альбо (75,3%). Пасля адмены прыгоннага права ў Беларусі адбываецца працэс капіталізацыі вёскі. Скарачалася дваранскае землеўладанне, фарміравалася буржуазная ўласнасць на зямлю. Сельская гаспадарка арыентавалася на развіццё мясамалочнай жывёлагадоўлі. Павялічваліся пасяўныя плошчы сельскагаспадарчых культур.

Беларускае сялянства на рубяжы стагоддзяў не было адзінай сацыяльнай групай. У 90-я гг. сяляне валодалі, напрыклад, 16 фабрыкамі і мануфактурамі. Больш за тысячу сялянскіх гаспадарак былі на ўзроўні памешчыцкіх. Яны валодалі зямельнымі надзеламі звыш 100 дзесяцін. У багатых сялян працавала 55 тыс. сельскагаспадарчых наёмных рабочых. Але быў і супрацьлеглы полюс беларускай вёскі. Гэта мільёны сялян, якія ледзь зводзілі канцы з канцамі. У 1893 г. з 668,7 тыс. сялянскіх двароў каля 54,5 тыс. (8,8%) не мелі сваёй зямлі. Найбольшая колькасць беззямельных сялян была ў Віцебскай (9,7%) і Віленскай губернях (9,6%).

Калі характарызаваць развіццё вёскі на пачатку XX ст., то перш за ўсё трэба адзначыць тэндэнцыю эканамічнай палярызацыі сялянства. Рэформы другой паловы XIX ст. не вырашылі зямельнай праблемы. Плошча сялянскай надзельнай зямлі складала прыкладна трэць агульнага землеўладання. Беларусь і напярэдадні першай расійскай рэвалюцыі заставалася тэрыторыяй буйнога землеўладання.

Ва ўмовах пашырэння капіталістычных адносін адбывалася скарачэнне дваранскага і пашырэнне сялянскага землеўладання. Гэты працэс падтрымліваўся Сялянскім пазямельным банкам. З 1883 па 1904 гг. гэты банк выдаў у 5 беларускіх губернях 10 440 грашовых пазык, на якія было куплена сельскай грамадой, таварыствамі, сялянамі 1155 тыс. дзесяцін зямлі. З 1895 г. Сялянскі банк атрымаў права куплі зямлі для далейшага яе продажу. Закладзеная ў банках дваранская зямля паступова пераходзіла ў рукі купецтва, багатых

сялян. Значную частку такой зямлі куплялі сяляне-сераднякі, аб'яднаныя ў сельскія таварыствы.

У гэты час расла колькасць бедных і адносна заможных гаспадарак і памяншалася колькасць гаспадарак з памерам зямлі 10-20 дзесяцін. Павелічэнне колькасці насельніцтва прыводзіла да драблення гаспадарак. З 1877 па 1905 гг. колькасць сялянскіх двароў з надзелам да 15 дзес. зямлі павялічылася больш чым удвая.

Аб класавай дыферэнцыяцыі вёскі сведчаць вынікі ваенна-конскіх перапісаў. Па іх дадзеных у 1893 г. налічвалася 15% бясконных гаспадарак, у той жа час 20% гаспадарак мелі 3 і больш коней.

Сялянская гаспадарка ў пачатку XX ст. арыентавалася на развіццё жывёлагадоўлі. Менавіта сяляне валодалі асноўным статкам буйной рагатай жывёлы, коней, свіней. Яны значна пашырылі пасевы збожжа, бульбы, тэхнічных культур. Але пры невысокай ураджайнасці і недахопе зямлі сяляне не маглі забяспечыць сябе прадуктамі ў дастатковай колькасці.

Цяжкае эканамічнае становішча дапаўнялася сацыяльным бяспраўем сялянства. Без згоды сельскай грамады яны не маглі прадаць свой зямельны надзел, закласці яго ў банку. Сяляне павінны былі выплачваць дзяржаўны зямельны і земскі пазямельны падаткі, выкупныя плацяжы, несці дарожную, падводную і паліцэйскую павіннасці.

Сяляне выконвалі таксама так званыя "мірскія павіннасці". Яны плацілі на ўтрыманне школ, сельскіх медыцынскіх устаноў, судоў, валасных праўленняў, сельскіх старастаў, рамантавалі прасёлачныя дарогі, грамадскія будынкі.

Вясковае насельніцтва заставалася найбольш сацыяльна неабароненым саслоўем. Яно не мела права свабодна пакінуць сельскую грамаду, падпарадкоўвалася саслоўнаму кіраўніцтву, падвяргалася публічнаму фізічнаму пакаранню.

Непасільныя падаткі і павіннасці, саслоўнае нераўнапраўе, абмежаванасці ў культурным і палітычным развіцці сялянства ставілі праблемы беларускай вёскі ў якасці галоўных. Без іх вырашэння далейшае прагрэсіўнае развіццё грамадства было немагчымым.

ЛЕКЦЫЯ 10

## ЭКАНАМІЧНАЕ І ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЕ ЖЫЦЦЁ

- *Эканамічнае развіццё*
- *Грамадска-палітычнае жыццё*

**Эканамічнае развіццё.** Прамысловы пад'ём, які пачаўся ў Расійскай імперыі ў 1893 г., аказаў значны ўплыў на развіццё ўсіх галін народнай гаспадаркі. Пры актыўнай дзяржаўнай падтрымцы на працягу 90-х гг. адбылося хуткае развіццё айчыннай прамысловасці. У многім эканамічная палітыка была звязана з дзейнасцю С.Ю. Вітэ, якога Аляксандр III у 1892 г. назначыў міністрам фінансаў. Па ініцыятыве Вітэ пачалося буйнамаштабнае будаўніцтва чыгунак, якое павялічыла попыт на метал, лес і іншыя матэрыялы. С.Ю. Вітэ правёў шэраг мерапрыемстваў, якія паспрыялі стабілізацыі фінансавай сістэмы. З 1895 г. паэтапна пачала ўводзіцца вінная манаполія. Вытворчасць і продаж вінна-гарэлачнай ітрадукцыі перайшлі пад кантроль дзяржавы. Дзяржаўная манаполія не распаўсюджвалася толькі на вытворчасць піва, брагі і вінаграднага віна. Піцейны збор з'явіўся важнай крыніцай папаўнення бюджэту краіны. У 1900 г. ён склаў 85 млн. рублёў (11% даходнай часткі бюджэту).

У 1897 г. С.Ю. Вітэ праводзіць фінансавую рэформу. У аснову крэдытнай сістэмы быў пакладзены залаты рубель. З гэтага часу ўсе крэдытныя білеты маглі без абмежавання абмепьвацца на золата. Свабодная канвертацыя расійскага рубля садзейнічала прытоку айчынных і замежных інвестыцый. У 1899 г. былі зняты абмежаванні для замежных інвестараў, якія ўкладвалі сродкі ў развіццё прамысловых прадпрыемстваў і банкаў.

У канцы XIX ст. назіраецца інтэнсіўны рост эканомікі, які быў звязаны з завяршэннем прамысловага перавароту. Аб'ём прамысловай вытворчасці Расійскай імперыі ў 1900 г. склаў 7% ад сусветнай прамысловай прадукцыі.

На рубяжы стагоддзяў дынамічна развіваліся беларускія губерні. Прамысловасць мела тут значную колькасць свабоднай рабочай сілы, крыніцы мясцовай сыравіны. Хуткімі тэмпамі стваралася транспартная інфраструктура. Чыгуначныя дарогі ў беларускіх губернях павялічыліся ў шмат разоў і склалі ў пачатку XX ст. больш за 2800 вёрст. Шашэйныя, палепшаныя грунтавыя дарогі Беларусі складалі 18% дарог 50 еўрапейскіх губерняў Расійскай імперыі. Да гэтага трэба дадаць разгалінаваную сетку водных камунікацый.

Танныя сыравіна і працоўныя рэсурсы, досыць добра развітая сетка шляхоў зносін садзейнічалі ўстойлівай вытворчасці і збыту прадукцыі. Паступова прамысловыя тавары фабрычна-заводскай вытворчасці нацяснілі цэлыя галіны мясцовай вытворчасці, разбурылі цэхавую сістэму рамяства. Але сумарная ўдзельная вага рамесніцкай, дробнакапіталістычнай вытворчасці ў пачатку XX ст. яшчэ перавышала фабрычную.

Адметнай асаблівасцю беларускай прамысловасці была яе цесная прывязанасць да сяла. У пачатку XX ст. у прамысловасці працавалі каля 180 тыс. рабочых. Прычым 65,7% фабрычна-заводскіх прадпрыемстваў і 45,4% рабочых знаходзіліся ў вёсцы. Рабочыя вінакурных, лесапільных, цагельных, кафельных заводаў, папяровых фабрык часта з'яўляліся ўладальнікамі невялікіх зямельных участкаў. Старшы фабрычны інспектар Магілёўскай губерні пісаў у 1901 г., што "рабочыя-беларусы кафельна-ізразцовых заводаў Копысі ў час палявых работ пакідаюць заводы на кароткі тэрмін". Многія прадпрымальнікі падтрымлівалі жаданне рабочых працаваць на зямлі. Гаспадары Добрушскай папяровай фабрыкі "Скіна" здавалі сваім рабочым зямлю ў арэнду.

У эканоміку Беларусі актыўна пранікаў замежны капітал. У пачатку XX ст. замежным інвестарам належалі льнопрадзільныя фабрыкі ў Віцебску, Аршанскім павеце, суднабудаўнічы завод у Пінску, ткацкая фабрыка ў Дуброўне.

Характэрнай рысай прамысловага развіцця Расійскай імперыі ў пачатку XX ст. была высокая ступень канцэнтрацыі вытворчасці. Расійскія прадпрымальнікі выкарыстоўвалі лепшыя сусветныя тэхналогіі, інжынерныя кадры, значныя фінансавыя рэсурсы для прамысловага будаўніцтва. Пад дзяржаўны заказ расійскі ўрад даваў субсідыі, налогавыя льготы, праводзіў традыцыйную пратэкцыяналісцкую палітыку ў адносінах да фінансавых і прамысловых магнатаў.

У беларускіх губернях таксама праходзіў працэс стварэння манапалістычных аб'яднанняў. У 1905 г. узнік Заходні камітэт запалкавых фабрыкантаў, ствараліся акцыянерныя таварыствы з удзелам замежнага і мясцовага капіталу. У 1900-1908 іт. узнікла 13 акцыянерных таварыстваў. Ім належалі Віцебская льнопрадзільная фабрыка "Дзвіна", у Аршанскім павеце Выдрыцкі завод сухой перагонкі дрэва, самы буйны ў Расіі завод па вырабу крухмалу ў Мінску. Акцыянернае таварыства валодала тытунёвай фабрыкай "Нёман" у Гродне.

У 1899 г. пачаўся еўрапейскі фінансавы крызіс. Банкі павялічылі працэнтныя стаўкі па крэдытах, што прывяло да

памяншэння інвестыцый у эканоміку. Прамысловы пад'ём 90-х гг. змяніўся сусветным эканамічным крызісам у 1900-1903 гг. Ён закрануў прамысловасць Беларусі. У 1901 г. адбылося скарачэнне вытворчасці ў параўнанні з 1900 г. прыкладна на 10%. Аднак крызіс не меў рашаючага значэння для развіцця краю. Тэндэнцыя скарачэння рамесна-саматужнай вытворчасці, якая назіралася ў канцы XIX ст., прадоўжылася. Колькасць жа адносна буйных прадпрыемстваў павялічылася. Найбольш высокія тэмпы развіцця назіраліся ў дрэваапрацоўчай вытворчасці, доля якой у прамысловай прадукцыі павялічылася з 18,7% у 1900 г. да 23,6% у 1908 г. Замест сплаву лесу ў Украіну і ва Усходнюю Прусію ўсё больш драўніны ішло ў лесахімічную вытворчасць, на заводы для вырабу фанеры, запалкаў, паперы.

Хутка развівалася тэкстыльная прамысловасць. У 1900-1908 гг. з'явілася 8 новых прадпрыемстваў. Аб'ём вытворчасці ў гэтай галіне з 1908 па 1913 гг. павялічыўся ў 1,6 раза.

Традыцыйнымі галінамі харчовай прамысловасці былі піваварная, маслабойная, крухмала-патачная, мукамольная, тытунёвая. Асобае значэнне мела вінакурства. Колькасць вінакурных заводаў павялічылася з 470 у 1900 г. да 603 у 1908 г. Яны выраблялі каля 10% спірту ў агульным аб'ёме яго вытворчасці ў Расійскай імперыі.

Агульная колькасць цэнзавых фабрычна-заводскіх прадпрыемстваў павялічылася з 799 у 1900 г. да 1282 у 1913 г. Прадпрыемствы Беларусі выпускалі ў 1912 г. больш за 55% агульнарасійскай вытворчасці аконнага шкла, амаль 45% запалкавай саломкі, 24,4% дубовых шпал, 23,5% фанеры і г. д. Але ў валавой прадукцыі доля дробнай і рамесна-саматужнай вытворчасці па-ранейшаму была дамінуючай. У 1913 г. на гэтых прадпрыемствах працавала амаль 185 тыс. работнікаў, у той час як у цэнзавай прамысловасці – 54,9 тыс. чалавек. Дробная вытворчасць давала больш за палову прамысловай прадукцыі.

Такім чынам, мадэрнізацыя эканомікі Беларусі адбывалася нераўнамерна. З аднаго боку, ствараліся манаполіі, складвалася фінансавая алігархія, узмацнялася барацьба капіталу за эканамічныя і палітычныя сферы ўплыву, з другога – заставалася мноства прадпрыемстваў з прымітыўнымі тэхналогіямі, дрэннай арганізацыяй вытворчасці.

На пачатку XX ст. даволі няпростыя адносіны скланіся ў беларускай вёсцы. Нягледзячы на тое, што пануючым заставалася памешчыцкае землеўладанне, вёска ўсё больш уцягвалася ў капіталістычныя эканамічныя адносіны. Павялічвалася колькасць

дваранскіх гаспадарак, якія выкарыстоўвалі наёмную працу, сельскагаспадарчую тэхніку, новыя агратэхнічныя прыёмы апрацоўкі зямлі. Памешчыкі куплялі жалезныя плугі, сеялкі, жняяркі, сенакасілкі. Малатарні і веялкі былі даволі распаўсюджанымі ў гаспадарках заможных сялян. Такіх машын сяляне мелі нават больш, чым памешчыкі.

Пашырэнню землеўладання прадпрымальніцкага характару садзейнічаў пераход памешчыцкіх гаспадарак у рукі купцоў, банкіраў, фабрыкантаў, багатых сялян. Працэс куплі-продажу паскорыўся ў гады рэвалюцыйных зрухаў, калі дваране, чыноўнікі, афіцэры прадалі ў 5 заходніх губернях 1,5 млн. дзесяцін зямлі. Сяляне купілі 714,1 тыс. дзесяцін, купцы і мяшчане – 241,6 тыс. дзесяцін зямлі. Абсалютная большасць купленых зямель пераходзіла ва ўласнасць заможных людзей.

Прадаўцамі зямлі выступалі і бяднейшыя сяляне, якія ў ходзе аграрнай рэформы атрымалі права ўласнасці. У 1907-1914 гг. імі было прададзена 187,8 тыс. дзесяцін зямлі.

Капіталістычная сістэма ўмацавалася ў сельскай гаспадарцы, пацясніла паўпрыгонніцкія формы гаспадарання. Тым не менш развіццё капіталізму па прускаму шляху не прывяло да вырашэння аграрнага пытання. У 1905 г. дваранства беларускіх губерняў мела 41% усёй зямлі. Многія буйныя памешчыцкія гаспадаркі прыстасоўваліся да рынку.

Падзенне на еўрапейскім рынку цэн на хлеб у 80-90-я гг. XIX ст. абумовіла пераарыентацыю ссльскай гаспадаркі Беларусі на мяса-малочную вытворчасць. Больш таннае амерыканскае збожжа на еўрапейскім рынку зрабіла беларускіх вытворцаў неканкурэнтаздольнымі. У сувязі з гэтым яны значна пашырылі плошчы пасеваў пад бульбу, травы, лён і іншыя тэхнічныя культуры. У 1901-1913 гг. валавы збор бульбы павялічыўся на 37,6%. На Беларусь прыпадала 17,2% усёй плошчы, занятай бульбай у 50 еўрапейскіх губернях Расійскай імперыі. Вінакурныя заводы ў 1913 г. перапрацоўвалі на спірт 32 млн. пудоў бульбы і каля 3 млн. пудоў зерня. Адходы ад вінакурства ішлі на корм жывёле. У пачатку XX ст. на Беларусі было 2,8 млн. галоў буйной рагатай жывёлы, з іх прыблізна 1,4 млн. складалі дойныя каровы. Пашыралася прамысловая вытворчасць масла і сыру. У адзначаны час на Беларусі працавала каля 300 масларобчых і сыраварных заводаў.

Але традыцыйныя сялянскія адносіны не ўкладваліся ў капіталістычны рынак. Спадзяванні, што сялянская грамада ўтрымае вёску ад пралетарызацыі, не апраўдала сябе. Даволі хуткімі тэмпамі

адбывалася дыферэнцыяцыя сялянства. З'явіўся клас сельскай буржуазіі, а з другога боку – павялічылася колькасць беззямельнага сялянства.(188)

Вось як размяркоўвалася надзельная сялянская зямля, плошча якой у 1905 г. складала 6 043 260 дзес., альбо 32,2% ад усей зямлі.

| Губерні | Колькасць двароў | Зямельныя надзелы | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1-5 дзес | 5-10 дзес. | 10-15 дзес | 15-20 дзес | больш 20 дзес |
| Віленская | 94420 | 3,3 | 28,5 | 29,0 | 25.2 | 14,0 |
| Віцебская | 98608 | 1.6 | 46,6 | 29,6 | 7,4 | 14,8 |
| Гродзенская | 99 198 | 4,5 | 10,6 | 31,7 | 30,2 | 23,0 |
| Магілёўская | 198283 | 9,9 | 68,2 | 17,5 | 2,0 | 2,4 |
| Мінская | 213905 | 11,7 | 61,9 | 13,8 | 6,9 | 5,7 |
| Усяго ў сярэднім | | 6.2 | 43,1 | 24,3 | 14,3 | 11,98 |

Як бачна, каля 12% сялянскіх гаспадарак былі больш-менш заможнымі. Кожная з іх мела значны зямельны надзел і не менш двух коней. Тады як каля 50% сялянскіх двароў валодалі ад 1 да 10 дзес. зямлі. Такая колькасць зямлі не забяспечвала пражытачны мінімум сярэдняй сялянскай сям'і. 24,3% сялянскіх двароў мелі 10-15 дзес. зямлі. Але і гэты надзел не мог пракарміць сям'ю пры нізкай урадлівасці зямлі, адсталай агратэхніцы і даволі значных падатках.

Эканамічнае становішча беларускай вёскі было даволі складаным. Паводле дадзеных камісіі па вывучэнню дабрабыту сельскага насельніцтва ў 1900 г. па 5 заходніх губернях аграрная перанаселенасць склала 2039,8 тыс. чалавек, што больш за палову працаздольнага насельніцтва вёскі. Ішоў працэс драблення сялянскіх гаспадарак. Пры невысокай ураджайнасці Беларусь не магла, за выключэннем бульбы, дастаткова забяспечыць сябе прадуктамі сельскагаспадарчай вытворчасці. Калі паглядзець на размеркаванне збожжа ў сялянскай гаспадарцы ў канцы XIX ст., то астатак хлеба на чалавека склаў у Віленскай губерні 11,6 пуда, Віцебскай – 10,6; Гродзенскай – 11,6; Мінскай – 10,9; Магілёўскай – 9,9 пуда. Для параўнання трэба адзначыць, што гадавая норма на дарослага складала тады 17,4 пуда. Яшчэ больш сітуацыя пагоршылася ў пачатку XX ст., калі ў неўраджайныя гады значна паменшыліся хлебныя запасы ў насельніцтва.

Працэс капіталізацыі вёскі быў замаруджаны нявырашанымі праблемамі феадальнага мінулага. Пры складанні ўстаўных грамат, якія рэгулявалі пазямельныя адносіны памешчыкаў і сялян, не было прынята Палажэнне аб сервітутах. Пачаліся канфлікты адносна сервітутных зямель. Сур'ёзнай праблемай з'яўлялася цераспалосіца, шнуравое карыстанне зямлёй, што не давала магчымасці прымяняць новую агратэхніку. Да таго ж трэба дадаць подаці і павіннасці сялянства. Усё гэта сведчыла аб сур'ёзных супярэчнасцях у грамадстве.

**Грамадска-палітычнае жыццё.** На рубяжы стагоддзяў у грамадска-палітычным жыцці назіраецца шэраг з'яў, якія сведчылі аб фарміраванні ў грамадстве новых эканамічных, сацыяльна-палітычных адносін. Перш за ўсё на арэну палітычнага жыцця выйшлі класы, сацыяльныя групы буржуазнага грамадства. Буржуазія разлічвала на ўдзел у палітычным кіраванні краінай. Рабочы клас спадзяваўся на паляпшэнне ўмоў працы, павышэнне заработнай платы, скарачэнне працоўнага дня. Большасць інтэлігенцыі таксама займала крытычную пазіцыю ў адносінах да дзяржаўнай улады і тых парадкаў, якія існавалі ў Расійскай імперыі. Адукаваны клас быў вельмі палітызаваны. Нсвыпадкова ён пастаўляў кіраўнікоў і актыўных палітычных дзеячаў для ўсіх апазіцыйных партый і рухаў.

Значную палітычную сілу ўяўляў пралетарыят. Рабочы клас Беларусі ў пачатку XX ст. быў, як кажуць, пралетарыятам у першым пакаленні з псіхалогіяй селяніна альбо рамесніка, малаадукаваным, з нізкім узроўнем матэрыяльнага становішча. Ён не быў шматлікім, але быў добра арганізаваным. У рабочых быў прыклад краін Заходняй Еўропы, дзе ў гэты час рабочы клас дабіваўся значных поспехаў у эканамічнай абароне сваіх правоў.

Актывізацыі рабочага руху ў беларускіх губернях садзейнічала пранікненне ў яго асяроддзе радыкальнай марксісцкай ідэалогіі. У сярэдзіне 90-х гг. у Мінску арганізацыйна аформіліся сацыял-дэмакратычныя групы. Я. Гурвіч, П. Берман вялі прапаганду сярод яўрэйскіх рабочых чыгуначных майстэрань і машынабудаўнічага завода. У другой палове 90-х гг. сацыял-дэмакраты пераходзяць ад прапаганды ў гуртках да масавай эканамічнай агітацыі сярод рабочых.

У красавіку 1896 г. віленскія сацыял-дэмакраты праводзяць устаноўчы з'езд і ствараюць Літоўскую сацыял-дэмакратычную партыю. С. Трусевіч, які на з'ездзе прадстаўляў арганізаваныя ім гурткі, пакінуў устаноўчы сход з-за адказу дэлегатаў ад ідэі аб'яднання з расійскімі сацыял-дэмакратамі. У маі 1896 г. С. Трусевіч стварыў Рабочы саюз Літвы. Гэты саюз арганізаваў некалькі

забастовак эканамічнага характару, маёўку. У лютым 1897 г. былі праведзены арышты кіраўнікоў арганізацыі.

Прадстаўнікі яўрэйскіх сацыял-дэмакратычных арганізацый у верасні 1897 г. стварылі Усеагульны яўрэйскі рабочы саюз у Літве, Польшчы і Расіі (Бунд). У яго склад увайшлі арганізацыі Вільні, Мінска, Варшавы, Віцебска, Беластока. Бунд лічыў сябе адзіным прадстаўніком інтарэсаў яўрэйскага пралетарыяту. Па-рознаму аднесліся сацыял-дэмакраты да дзейнасці Бунда. Адны арганізацыі, як напрыклад, Брэсцкая, уступілі ў саюз, другія (Гомельская, Мінская) – адмовіліся.

У хуткім часе на базе мінскай арганізацыі была створана Рабочая партыя палітычнага вызвалення Расіі. Яе ўзначалілі Л. Радзівонава-Клячко, Р. Гершуні, А. Бонч-Асмалоўскі. Мінская група, якая налічвала каля 60 чалавек, устанавіла сувязі з рэвалюцыйнымі арганізацыямі ў Маскве, Пецярбургу, Кіеве, Адэсе, Сімферопалі. Яны наладзілі ў Серабранцы Друкарню, у якой былі надрукаваны пракламацыі да вучнёўскай моладзі, першамайскія адозвы. Вясной 1900 г. у друкарні выдаецца брашура "Свабода". Яна мела праграмны характар і абгрунтоўвала, з аднаго боку, неабходнасць тактыкі тэрору супраць урада, з другога – прапагандысцкую Дзейнасць сярод моладзі, інтэлігенцыі, рабочых, салдат шляхам стварэння кружкоў асветы, бібліятэк, выдання і распаўсюджвання літаратуры. У красавіку 1900 г. Л. Радзівонава-Клячко была арыштавана ў Санкт-Пецярбургу пры траспарціроўцы нелегальнай літаратуры. У 1902 г. арганізацыя ўвайшла ў склад партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў (эсэраў).

У другой палове 90-х гадоў набірае сілу ідэя стварэння агульнарасійскіх палітычных арганізацый. У сакавіку 1898 г. у Мінску адбыўся з'езд сацыял-дэмакратычных арганізацый Расіі. Прадстаўнікі пецярбургскага, маскоўскага, кіеўскага, екацярынаслаўскага Саюзаў барацьбы за вызваленне рабочага класа, Бунда і кіеўскай "Рабочай газеты" (усяго – 9 дэлегатаў) прынялі рашэнне аб стварэнні Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі (РСДРП). Быў прыняты падрыхтаваны П. Струве "Маніфест РСДРП". Але праведзеныя ў сакавіку-ліпені 1898 г. арышты паралізавалі дзейнасць партыі.

Ва ўмовах сусветнага эканамічнага крызісу адбываецца палітызацыя рабочага руху. У яго ўключыліся дэмакратычная інтэлігенцыя, вучнёўская моладзь. У 1901 г. прайшлі першамайскія палітычныя дэманстрацыі ў Вільні, Мінску, Гомелі, Дзвінску, Смаргоні, Ашмянах. У гэты час у рабочым руху беларускіх губерняў вядучыя пазіцыі займаў Бунд, які падзяляў ідэі Э. Бернштэйна аб

прыярытэце барацьбы за паляпшэнне эканамічнага становішча і культурнага ўзроўню працоўных.

Рэвалюцыйныя сацыял-дэмакраты, аб'яднаныя Леніным вакол рэдакцыі газеты "Іскра", выступілі за стварэнне адзінай рэвалюцыйнай марксісцкай партыі, пашырэнне палітычнай агітацыі пратэсту. Летам 1903 г. на II з'езде РСДРП адбыўся раскол у партыі на бальшавікоў (патрабавалі ўвядзення жорсткай партыйнай дысцыпліны) і меншавікоў (выступалі за большую аўтаномію партыйных арганізацый). Прадстаўнікі Бунда пакінулі з'езд і выйшлі з РСДРП.

У 1900 г. у Мінску па ініцыятыве С. Трусевіча і Ф. Дзяржынскага на базе Рабочага саюза Літвы і прадстаўнікоў Сацыял-дэмакратыі Каралеўства Польскага была створана партыя Сацыял-дэмакратыі Каралеўства Польскага і Літвы. Яна выступала за аб'яднанне з РСДРП, але лічыла памылковым партыйнае патрабаванне апошняй аб утварэнні незалежных нацыянальных дзяржаў.

У верасні 1902 г. з груп Польскай сацыялістычнай партыі арганізавана ППС у Літве. Партыя мела некаторы ўплыў у Заходняй Беларусі.

У канцы 1901 пачатку 1902 гг. была створана (ПС-Р) партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў (эсэраў). Аб сваіх палітычных намерах яна заявіла ў першых выпусках газеты "Революционная Россия", часопіса "Вестник русской революции". ПС-Р выступала за знішчэнне самадзяржаўя і пабудову сацыялістычнага грамадства, усталяванне федэратыўнай дэмакратычнай рэспублікі. Партыя аб'явіла сябе абаронцай працоўнага насельніцтва. Эсэры карысталіся рознымі формамі барацьбы: ад агітацыі і прапаганды да індывідуальнага тэрору супраць прадстаўнікоў дзяржаўнай улады. Тэрарыстычную дзейнасць узначаліў Г. Гершуні, затым Е. Азеф, які адначасова з'яўляўся агентам царскай ахранкі. Акрамя цэнтральнай баявой арганізацыі існавалі мясцовыя баявыя дружыны пры Віцебскім, Дзвінскім, Гомельскім, Беластоцкім, Мінскім камітэтах. Праўда, на працягу 1902-1904 гг. актыўнай дзейнасці яны не вялі. Першыя тэрарыстычныя акцыі (да 1905 г. іх праведзена 6) былі скіраваны супраць вышэйшых чыноў царскай улады. Трэба адзначыць, што ва ўмовах татальнага падаўлення ўрадам апазіцыйных рухаў тэрарыстычныя акцыі эсэраў мелі значны палітычны рэзананс, лаяльна ўспрымаліся дэмакратычнай грамадскасцю.

На Беларусі эсэраўскія арганізацыі дзейнічалі ў Мііску, Віцебску, Вільні, Гомелі, Бабруйску, Рэчыцы, Добрушы, Ветцы і іншых гарадах. У 1904 г. быў створаны Паўночна-Заходпі абласны камітэт,

якому падпарадкоўваліся эсэраўскія арганізацыі на тэрыторыі Беларусі і Смаленскай губерні.

У канцы 90-х гг. XIX ст. значна пашырыўся беларускі нацыяльны рух. У гэты час актыўна ішоў працэс фарміравання беларускай нацыі. Новае пакаленне інтэлігенцыі праяўляла цікавасць да гісторыі, культуры народа, садзейнічала росту нацыянальнай самасвядомасці грамадства. У 1902 г. у Пецярбургу Іван і Антон Луцкевічы стварылі гурток па вывучэнню Беларусі. Пецярбургскі студэнцкі "Гурток беларускай народнай асветы" прапагандаваў нацыянальную культуру, вёў пошук шляхоў яе адраджэння.

У канцы 1902 – пачатку 1903 гг. прадстаўнікі беларускіх культурных гурткоў арганізавалі Беларускую рэвалюцыйную грамаду (БРГ). Браты Луцкевічы, А. Пашкевіч (Цётка), К. Кастравіцкі, А. Бурбіс, В. Іваноўскі, Ф. Умястоўскі выступілі з ідэяй стварэння сацыяльна-палітычнай арганізацыі працоўнага народа. Грамада пазней атрымала назву Беларуская сацыялістычная грамада. У 1903 г. на з'ездзе была прынята праграма партыі, у якой дэкларавалася неабходнасць ліквідацыі самадзяржаўя і капіталістычнага ладу. БРГ выступала за пераход асноўных сродкаў вытворчасці, зямлі з прыватнай у грамадскую ўласнасць, абвяшчала права кожнага чалавека на апрацоўку зямлі без выкарыстання наёмнай працы, патрабавала васьмігадзіннага працоўнага дня, дзяржаўнага страхавання, бясплатнай медыцынскай дапамогі, устанаўлення мінімальнай зарплаты.

У палітычны раздзел праграмы ўвайшлі патрабаванні дэмакратычнага характару: раўнапраўе людзей, прамое, агульнае, роўнае выбарчае права з тайным і аласаваннем, рэформа судзейскай сістэмы, свабода слова, друку, сходаў, забастовак і інш., замена пастаяннай арміі народным апалчэннем. Грамада выступала за нацыянальную свабоду, прызнанне правоў усіх народаў на аўтаномію, стварэнне незалежных дэмакратычных рэспублік.

У перыяд яе станаўлення ўплыў грамады ў рабочым і сялянскім руху, у асяроддзі інтэлігенцыі быў нязначным. У гэты час яна актыўна ўзаемадзейнічала з другімі сацыялістычнымі партыямі (эсэрамі, ППС у Літве, Літоўскай сацыял-дэмакратычнай партыяй, Латышскім сацыял-дэмакратычным саюзам), выкарыстоўвала іх вопыт, арганізацыйныя і тэхнічныя магчымасці.

У 1904-1905 гг. на Гродзеншчыне дзейнічала Сацыялістычная партыя Белай Русі, якая распаўсюджвала беларускамоўныя лістоўкі агульнадэмакратычнага накірунку. Колькасны склад партыі, яе праграмныя ўстаноўкі нам невядомы.

Апазіцыйныя партыі і рухі шукалі падтрымкі ў першую чаргу сярод рабочага класа і працоўнага сялянства. Разумелі гэта і прадстаўнікі ўрада, мясцовыя чыноўнікі. Урад узмацніў кантроль за сродкамі масавай інфармацыі, бібліятэкамі, навучальнымі ўстановамі, прымаліся меры ўздзеяння праз палітычныя, грамадскія арганізацыі. Начальнік Маскоўскага ахоўнага аддзялення С. Зубатаў прапанаваў стварыць падкантрольныя легальныя рабочыя арганізацыі, якія б клапаціліся аб задавальненні эканамічных і сацыяльных запатрабаванняў рабочых. У 1901 г. такая арганізацыя была створана ў Мінску – Яўрэйская незалежная рабочая нартыя (ЯНРП). Узначаліла яе М. Вільбушэвіч. У 1900 г. яна была арыштавана як актыўная бундаўка. Зубатаў дакладваў міністру ўнутраных спраў: "Манечку я ўрабіў так, што яна стала перакананай манархісткай..., яна ўсё сказала і мае намер весці барацьбу з нядобранадзейнымі элементамі".

ЯНРП абвясціла сваёй мэтай паляпшэнне па меры магчымасці эканамічнага і культурнага ўзроўню яўрэйскага пралетарыяту. Партыя прапагандавала самадзяржаўе як форму надкласавай улады, паслушэнства рабочых, адказ іх ад удзелу ў рэвалюцыйных выступленнях. Пры падтрымцы начальніка Мінскага губернскага жандармскага ўпраўлення палкоўніка Васільева кіраўнікі ЯНРП запрашалі ў свой клуб прадпрымальнікаў і дамагаліся ад іх уступак рабочым. Многіх рабочых такая праграма задавальняла. У канцы 1901 г. пад кіраўніцтва ЯНРП перайшлі 15 з 20 прафесійных арганізацый рамеснікаў. Мінская бундаўская арганізацыя не магла канкурыраваць з Яўрэйскай незалежнай рабочай партыяй, якая стала актыўным прапагандыстам сіянізму. Невыпадкова менавіта ў Мінску ў 1902 г. адбыўся Усерасійскі з’езд сіяністаў.

Рэвалюцыйныя партыі выступілі з крытыкай "паліцэйскага сацыялізму". З свайго боку прадпрымальнікі патрабавалі спыніць умяшанне ў іх справы арганізацый рабочых. У ліпені 1903 і. міністр унутраных спраў Плеве выдаў распараджэнне аб ліквідацыі легальных рабочых арганізацый. ЯНРП аб’явіла аб самароспуску.

Між тым развіццё апазіцыйнага руху на Беларусі сведчыла, што набывала сілу як эканамічная, так і палітычная барацьба працоўных. У 1901 г. адбылося 105 эканамічных стачак, 26 палітычных стачак, 10 вулічных дэманстрацый. Улады адказалі на гэта ўвядзеннем становішча ўзмоцненай аховы ў Віленскай губерні, у гарадах – Мінску, Вільне, Віцебску, Гомелі, Магілёве.

1902 год быў больш-менш спакойны. Паменшылася колькасць эканамічных выступленняў, дэманстрацый працоўных. Але ў наступны год палітычны рух ахапіў 28 гарадоў і мястэчак,

эканамічны – 30 населеных пунктаў. Сярод стачачнікаў 70% з'яўляліся ўдзельнікамі палітычных акцый.

Не меншую актыўнасць праявіў рабочы клас у 1904 г. Рэвалюцыйныя партыі, апазіцыйныя рухі актывізавалі сваю дзейнасць і разгарнулі крытыку ўрада ў сувязі з руска-японскай вайной. Палітычны рух ахапіў 44 населеныя пункты. Узрасла колькасць стачачнікаў, якія прынялі ўдзел у першамайскіх выступленнях, маніфестацыях у падтрымку рабочых Беластока (расстрэл сходкі), Якуцка (суровы прыгавор палітычным ссыльным). Нярэдка маніфсстанты прымянялі сілу і наваг зброю ў сутычках з паліцыяй.

Сялянства Беларусі было менш палітызаваным. Непадпарадкаванне ўладам, сутычкі з паліцыяй, а іх было ў 1901 г. – 16, 1902 г. – 41, 1903 г. – 24, 1904 г. – 32, тычыліся вырашэння канкрэтных праблем вёскі. У аснове гэтых выступленняў былі патравы і лясныя парубкі, захопы сервітутаў, непрынящце новых межавых граніц.

Як бачна, колькасна рабочы і сялянскі рух на Беларусі не меў масавага характару. Але ён выяўляў агульную тэндэнцыю незадаволенасці ў грамадстве. Царскі ўрад дэманстраваў няздольнасць адказаць на выклік часу. Узаемаадносіны ўлады з асноўнымі сацыяльнымі групамі станавіліся ўсё больш нацягнутымі і варожымі.

ЛЕКЦЫЯ 11

## РЭВАЛЮЦЫЙНЫЯ ПАДЗЕІ Ў ПАЧАТКУ XX ст.

- *Рэвалюцыйны ўздым 1905* г.
- *Палітычная барацьба ў 1906-1907* гг.
- *Аграрная рэформа*

**Рэвалюцыйны ўздым 1905 г.** Развіццё класавых супярэчнасцей, нарастанне канфрантацыі ў грамадстве набліжалі рэвалюцыйную сітуацыю ў краіне. Яе эканамічныя і палітычныя перадумовы фарміраваліся ў час эканамічнай дэпрэсіі. Інтарэсы большасці класаў і сацыяльных груп патрабавалі рэформаў, ліквідацыі феадальна-прыгонніцкіх перажыткаў, дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця. Незадаволенасць палітыкай урада стала адкрыта праяўляцца на старонках газет, гарадскіх сходах, у навучальных установах.

У гэтых умовах пашыраецца дзейнасць рэвалюцыйных арганізацый. У пачатку кастрычніка 1904 г. у Парыжы адбыўся з'езд апазіцыйных партый, якія прыняў рэзалюцыі аб неабходнасці ліквідацыі самадзяржаўя, праве нацыянальнага самавызначэння народнасцей Расіі.

Значны рэзананс меў з'езд земскіх дзеячаў, які адбыўся ў Пецярбургу 7-9 лістапада 1904 г. У рэзалюцыі з'езда закраналася пытанне ўвядзення канстытуцыйнага ладу і абмежавання самадзяржаўнай улады.

У канцы 1904 г. пачаліся дыскусіі з удзелам імператара і другіх вышэйшых дзяржаўных асоб аб магчымых рэформах улады. Але ні Мікалай II, ні яго бліжэйшае акружэнне не былі гатовы пайсці на радыкальныя змены ў грамадстве.

Нацыянальны крызіс быў паглыблены руска-японскай вайной. 27 студзеня 1904 г. Японія без аб'яўлення вайны пачынае баявыя дзеянні супраць Расіі. У краіне прайшлі шумныя кампаніі ў падтрымку ўрада, збору ахвяраванняў для расійскай арміі. Усе былі ўпэўнены ў хуткай перамозе. Але падзеі ў Маньчжурыі, на Ціхаакіянскім тэатры баявых дзеянняў былі няўдалымі для Расіі. У снежні 1904 г. расійская армія здала Порт-Артур. У лютым 1905 г. на працягу больш чым двух тыдняў доўжыліся баі пад Мукдэнам, у ходзе якіх страты рускіх войскаў склалі каля 100 тыс. чалавек. У маі 1905 г. адбылася Цусімская бітва. Расійская эскадра была разбіта. Цусіма надоўга стала сінонімам слова "катастрофа", выклікала ў грамадстве шок.

У жніўні 1905 г. пры пасрэдніцтве прэзідэнта ЗША Т. Рузвельта ў Портсмуце пачаліся перамовы з Японіяй. 23 жніўня яны закончыліся падпісаннем няўдалага для Расіі мірнага дагавору.

На такім знешнепалітычным фоне, які абумоўліваў маральную атмасферу ў краіне, адбываліся ўнутраныя падзеі ў Расіі. Пачаткам рэвалюцыі стала шматтысячнае шэсце да Зімняга палаца, якое адбылося ў Пецярбургу 9 студзеня. Дэманстранты ішлі прасіць у цара праўды і абароны. У петыцыі, падрыхтаванай групай упаўнаважаных пад кіраўніцтвам Г. Гапона, эканамічныя патрабаванні аб перадачы зямлі народу і іншыя дапаўняліся палітычнымі: палітычныя свабоды, увядзенне "народнага прадстаўніцтва". Арганізатары пажадалі, каб цар не толькі прыняў петыцыю, але паабяцаў выканаць іх патрабаванні.

Мясцовыя ўлады ведалі аб падрыхтоўцы шэсця. 8 студзеня цэнтр горада быў блакіраваны войскамі. Але 9 студзеня тысячы дэманстрантаў прарваліся да Зімняга палаца. Войскі адкрылі агонь. Было забіта 96, паранена больш за 330 чалавек. Гэтыя падзеі ўскалыхнулі краіну. Пачаліся стачкі, вулічныя дэманстрацыі. Забастоўкі салідарнасці прайшлі ў 30 гарадах і мястэчках Беларусі. 11 студзеня забастоўка адбылася ў Мінску. У ёй удзельнічала каля 2 тыс. чалавек. Да рабочых далучыліся рамеснікі, служачыя. 12 студзеня мітынгі і сходкі пачаліся ў Гомелі. 16-17 студзеня яны набылі агульнагарадскі размах. У гэтыя дні баставала каля 4 тыс. чалавек. 13-14 студзеня адбыліся масавы мітынг і дэманстрацыя ў Смаргоні. Забастоўкі салідарнасці прайшлі таксама ў Гродне, Магілёве, Брэсце, Мазыры, Дуброўна. Талочыне, Слоніме, Крынках, Ашмянах. У многіх месцах улады прымянілі вайсковыя сілы, каб спыніць выступленні. Пры разгоне дэманстрантаў былі забітыя і параненыя.

У студзені 1905 г. на Беларусі баставала каля 34 тыс. чалавек. У наступныя месяцы на змену палітычным выступленням ідуць забастоўкі эканамічнага характару. Па сведчанню мінскага губернатара ў красавіку-маі ў Мінску баставалі на ліцейным заводзе "Тэхнолаг" 114 чал., у чыгуначных майстэрнях і дэпо Маскоўска-Брэсцкай чыгункі 750 чал., на ліцейным заводзе Якабсона і Ліўшыца 130 чал., у друкарні Дворжаца 40 чал., а таксама на другіх заводах і ў майстэрнях, патрабуючы скарачэння рабочага дня, павелічэння зарплаты, незвальнення забастоўшчыкаў і аплаты часу іх забастовак.

Уздым палітычных выступленняў назіраецца ў красавіку ў сувязі са святкаваннем 1 Мая. Першамайскія забастоўкі і маніфестацыі адбыліся ў 35 гарадах і мястэчках Беларусі. У чэрвені прайшлі выступленні ў знак салідарнасці з рабочымі Лодзі, Варшавы, Іванава-

Вазнясенска, Адэсы, матросамі эскадранага браняносца "Князь Пацёмкін Таўрычаскі".

Не спынялася эканамічная барацьба рабочых. У маі адбылося 170 стачак на прадпрыемствах Мінска, Магілёва, Віцебска, Бабруйска, Пінска, Мазыра. Прадпрымальнікі вымушаны былі ісці на ўступкі забастоўшчыкам па скарачэнню рабочага дня, павелічэнню зарплаты.

Вясной – летам 1905 г. пачаліся масавыя выступленні ў вёсцы. У красавіку-чэрвені адбылося 237 сялянскіх хваляванняў. Яны насілі як эканамічны, так і палітычны характар. У першую чаргу сяляне патрабавалі знішчэння памешчыцкага землеўладання.

Уздым рэвалюцыйнай актыўнасці, з аднаго боку, быў абумоўлены супярэчнасцямі эканамічнага, сацыяльнага, палітычнага развіцця краіны. З другога – арганізаванасцю апазіцыйных сіл. Значны націск на ўладу аказваў ліберальна-буржуазны рух. У маі 1905 г. у Маскве на з’ездзе земскіх і гарадскіх дзеячаў было прынята рашэнне аб неабходнасці канстыгуцыйных перамен. Дэпутацыя з’езда 6 чэрвеня ўручыла імператару гэтыя патрабаванні.

Што тычыцца Беларусі, дык тут ліберальны рух не меў сур'ёзнай сацыяльнай базы для свайго развіцця. На Беларусі адсутнічалі выбарныя земствы, вышэйшыя навучальныя, буйныя культурныя ўстановы, дзе звычайна фарміраваліся цэнтры буржуазна-ліберальнай апазіцыі.

Арганізатарамі рэвалюцыйнага руху выступілі партыі левай арыентацыі. Найбольш уплывовымі сярод іх былі Расійская сацыял-дэмакратычная рабочая партыя (бальшавікі і меншавікі), Партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў (эсэры), Усеагульны яўрэйскі саюз у Літве, Польшчы і Расіі (Бунд), Беларуская сацыялістычная грамада (БСГ). Прадстаўнікі гэтых партый выступалі з радыкальнымі патрабаваннямі знішчэння самадзяржаўя, устанаўлення дэмакратычнай рэспублікі, ліквідацыі памешчыцкага землеўладання, патрабавалі права нацый на самавызначэнне.

Нягледзячы на розныя падыходы ў стратэгіі, тактыцы, мясцовыя арганізацыі гэтых партый для каардынацыі барацьбы спрабавалі ствараць аб'яднаныя саветы, кааліцыйныя камітэты. У красавіку 1905 г. III з'езд РСДРП прыняў рашэнне аб аб'яднанні сацыял-дэмакратычных арганізацый у барацьбе за звяржэнне самадзяржаўя. У гады рэвалюцыі пашырыла свой уплыў на сялянства Беларуская сацыялістычная грамада. Разам з эсэрамі яна правяла сялянскі з'езд, на якім быў створаны Беларускі сялянскі саюз. Дэлегаты выказаліся за канфіскацыю памешчыцкіх зямель, узмацненне барацьбы з царскім самадзяржаўем, тэрытарыяльную аўтаномію Беларусі.

Пад націскам апазіцыйных сіл 6 жніўня 1905 г. Мікалай II падпісаў маніфест аб скліканні заканарадчай Дзяржаўнай думы. Прапаноўвалася правесці выбары па складанай схеме: для сялян – гэта чатырохступенныя выбары, землеўладальнікаў і гараджан – двухступенныя. Выбарчага права не мелі жанчыны, рабочыя, ваеннаслужачыя, навучэнцы. Ліберальныя кругі падтрымалі гэты праект. Партыі сацыялістычнай арыентацыі (бальшавікі, эсэры, бундаўцы, БСГ) заклікалі да байкоту выбараў.

У канцы верасня-кастрычніку 1905 г. у краіне зноў пашырыўся забастовачны рух. Ён пачаўся ў Маскве з агульнагарадской стачкі і маніфестацый. Па закліку Усерасійскага чыгуначнага саюза з 7 па 17 кастрычніка спыніўся рух на многіх чыгунках. Выступленне мела палітычны характар. Забастоўшчыкі патрабавалі ліквідацыі самадзяржаўя і ўстанаўлення дэмакратычнай рэспублікі. Ва ўсерасійскую палітычную стачку былі ўцягнуты 24 гарады, 29 мястэчак Беларусі. Арганізатарамі выступленняў з'яўляліся гарадскія стачачныя камітэты альбо камісіі, у якіх галоўная роля належала мясцовым арганізацыям чыгуначнага саюза, сацыял-дэмакратаў, эсэраў, бундаўцаў. На чыгуначных станцыях штодзённа ішлі мітынгі, дэманстрацыі. Чыгуначнікаў падтрымалі рабочыя фабрык і заводаў, рамеснікі, работнікі гандлю, гімназісты.

17 кастрычніка 1905 г. Мікалай II падпісаў Маніфест "Аб удасканаленні дзяржаўнага парадку", які абвяшчаў свабоду слова, сходаў, друку, саюзаў, недатыкальнасці асобы. Дзяржаўная дума надзялялася заканадаўчымі паўнамоцтвамі, пашыраўся кантынгент выбаршчыкаў. Была адкрыта магчымасць стварэння палітычных арганізацый, легалізацыі створаных раней партый.

У Мінску аб царскім маніфесце стала вядома на наступны дзень. У горадзе адбыліся дэманстрацыі, удзельнікі якіх накіроўваліся на плошчу Віленскага вакзала. Сабралася каля 20 тыс. чалавек. Удзельнікі абралі дэпутацыю да губернатара Курлова з патрабаваннем вызваліць палітычных зняволеных. Курлоў прыняў дэманстрантаў і аддаў загад вызваліць 15 арыштантаў, а гэта былі ў асноўным бальшавікі і бундаўцы. Вызваленыя далучыліся да маніфестантаў на вакзальнай плошчы. У другой палове дня салдаты адкрылі агонь па дэманстрантах. Па звестках урадавай камісіі было забіта 52 чалавекі і паранена 123.

Раніцай 19 кастрычніка адбылося аб'яднанае пасяджэнне прадстаўнікоў мінскай групы РСДРП, камітэта Бунда, камітэта партыі эсэраў і Лібава-Роменскага аддзялення Усерасійскага чыгуначнага саюза, на якім была прынята рэзалюцыя аб абʼяўленні

ўсеагульнай забастоўкі, аб тэрміновай адстаўцы губернатара, паліцмейстара, начальніка Віленскага жандармскага паліцэйскага ўпраўлення чыгункі, вывадзе з горада казакаў і г. д.

18 кастрычніка гучалі стрэлы ў Віцебску. Казацкі патруль адкрыў стральбу падчас мітынгу. 7 чалавек былі забіты, 4 паранены. На наступны дзень на дэманстрацыю выйшлі каля 20 тыс. чалавек, а ў дзень пахавання забітых дэманстрантаў на вуліцах горада сабралася каля 40 тыс. чалавек.

З 17 па 23 кастрычніка праходзіла ўсеагульная палітычная забастоўка ў Мазыры. Аб'яднаны камітэт сацыял-дэмакратычнай партыі і партыі эсэраў на мітынгу 17 кастрычніка аб'явіў аб пачатку забастоўкі і пераходзе ўлады ў горадзе ў яго рукі. Атрады аб'яднанай баявой дружыны патрулявалі ў горадзе. 19 кастрычніка паспрабавалі вызваліць з турмы палітычных зняволеных. Выступленне было падаўлена. Адзін са зняволеных быў забіты, 8 чалавек цяжка паранены падчас разгону дэманстрацый. Сяброў аб'яднанага камітэта асудзілі па справе так званай "мазырскай рэспублікі".

Увосень 1905 г. у рэвалюцыйны рух усё больш уцягваецца армія. Салдацкія выступленні адбыліся ў Кранштаце, Севастопалі, Кіеве, Харкаве, Варшаве. У канцы 1905 г. армейскія хваляванні прайшлі ў Віцебску, Магілёве, Мінску, Бабруйску, Гродне. Начальнік Мінскага губернскага жандарскага ўпраўлення дакладваў у дэпартамент паліцыі, што чыгуначная брыгада ў Баранавічах з кастрычніка 1905 г. прыведзена ў нешта дэзарганізаванае да такой ступсні, што "ўсе мясцовыя ўлады не маглі глядзець на яе інакш, як на рассаднік рэвалюцыйных летуценняў і ідэй. Да 1906 г. яна стала акадэміяй супрацьурадавай прапаганды". Брыгада была рэарганізавана, большая яе частка накіравана ў Маскву.

У кастрычніку 1905 г. царскі ўрад змог адбіць рэвалюцыйны націск. І не толькі сілай. Пэўную стабілізуючую ролю адыграў маніфест аб непарушных асновах грамадзянскай свабоды. Маніфест з энтузіязмам і надзеямі на палітычныя рэформы быў сустрэты маёмаснымі класамі, інтэлігенцыяй.

Але ён не супакоіў вёску. "Маніфест вызваў новы пад'ём сялянскага руху", - тэлеграфаваў 25 кастрычніка 1905 г. магілёўскі губернатар старшыні Савета Міністраў С. Вітэ. З пачатку верасня 1905 г. па студзень 1906 г. на Беларусі адбылося больш за 600 сялянскіх хваляванняў. Таму садзейнічала актыўная прапаганда палітычных партый (РСДРП, эсэраў, БСГ), настаўніцкіх і сялянскіх арганізацый. Вось адзін прыклад. Па інфармацыі мінскага губернатара (снежань 1905 г.), "гняздом заразы з'яўляецца маёнтак

"Блонь" памешчыка Бонч-Асмалоўскага. Прапаганда вядзецца настолькі паспяхова сярод служачых і навакольных сялян, што яны з'яўляюцца падрыхтаванымі агітатарамі, накіроўваюцца ў другія часткі не толькі павета, але і губерні для арганізацыі аграрных беспарадкаў і супрацьурадавых дэманстрацый. Двое з гэтых агітатараў былі на сялянскім з'ездзе ў Маскве". (На II з'ездзе сялянскага саюза ў лістападзе 1905 г. - *Заўвага аўт.).*

Урад спрабаваў аслабіць сацыяльную напружанасць. У лістападзе 1905 г. выдадзены маніфест аб памяншэнні напалову выкупных плацяжоў. Былі ўстаноўлены льготы на пакупку зямлі праз Сялянскі пазямельны банк. У пачатку снежня царскі ўрад прымае рашэнне перайсці ў наступленне і навесці парадак у краіне. У тэлеграме міністра ўнутраных спраў начальнікам паліцыі было прадпісана "выяўляць усіх кіраўнікоў палітычнага і аграрнага супрацьурадавага руху, браць іх пад арышт". У адпаведнасці з гэтай стратэгіяй у снежні быў павялічаны штат паліцыі, уведзена павятовая паліцэйская стража, арганізаваны раённыя ахоўныя аддзяленні, праведзепы арышты ў Пецярбургу, Маскве і іпшых гарадах, забаронена дзейнасць чыгуначных саюзаў. 3 снежня быў арыштаваны Пецярбургскі савет рабочых дэпутатаў, закрыты апазіцыйныя газеты, якія надрукавалі так званы "фінансавы маніфест" Пецярбургскага савета, цэнтральных устаноў Усрасійскага сялянскага саюза, ППС, РСДРП, ПС-Р. 7 снежня ў Маскве пачалася палітычная забастоўка. Праз некалькі дзён яна перарасла ва ўзброснае паўстанне, якое працягвалася да 18 снежня.

Снежаньскія падзеі на Беларусі пачаліся 8 снежня з забастоўкі чыгуначнікаў. Дэманстрацыі, мітынгі, забастоўкі прайшлі ў 28 гарадах, мястэчках, на чыгуначных станцыях. У іх удзельнічала каля 44 тыс. чалавек. Вельмі актыўна дзейнічалі рабочыя Гомельскага чыгуначнага вузла. Забастоўшчыкі занялі станцыю, пошту, тэлеграф. Стачка была падаўлена армейскім батальёнам пад началам генерала Арлова. У Мінску губернатар Курлоў у ноч на 9 снежня правёў арышты найбольш актыўных рэвалюцыянераў, закрыў газету "Северо-Западный край", аб'явіў аб увядзенні становішча надзвычайнай аховы. 12 снежня ваеннае становішча было ўведзена ў Баранавічах, дзе стачачны камітэт пры падтрымцы рабочых і салдат чыгуначнага батальёна спыніў рух цягнікоў.

Мясцовыя ўлады з дапамогаю армейскіх падраздзяленняў падавілі рэвалюцыйныя выступленні. Разам з тым трэба адзначыць, што царскі ўрад, як і ў кастрычніку, у барацьбе з апазіцыйным рухам выкарыстоўваў не толькі войскі. 2 снежня 1905 г. Мікалай II падпісаў

указ аб адмене крымінальнай адказнасці за ўдзел у эканамічных мірных стачках. 11 снежня 1905 г. выдадзены новы закон аб выбарах у Дзяржаўную думу. Па гарадской курыі выбарчае права атрымалі рабочыя.

Буржуазна-ліберальныя партыі падтрымалі гэтыя рашэнні ўрада. Яны заклікалі спыніць рэвалюцыйныя выступленні, прыняць актыўны ўдзел у выбарах кандыдатаў у Дзяржаўную думу.

**Палітычная барацьба ў 1906-1907 гг.** Наступным крокам урада ў напрамку да капстытуцыйнай манархіі з'явіўся Маніфест ад 20 лютага 1906 г. і ііалажэнне "Аб рэарганізацыі Дзяржаўнага савста". Дзяржаўны савет надзяляўся заканадаўчымі функцыямі. Фактычна ён стаў вышэйшай заканадаўчай палатай з правам вета на рашэнні Думы. Палова членаў Дзяржаўнага савета назначалася царом, другая – выбіралася асобымі ўстановамі і грамадскімі арганізацыямі.

Фарміраванне ў краіне канстытуцыйных дэмакратычных інстытутаў ішло непаслядоўна. Па-першае, Дзяржаўная дума мела абмежаваныя правы. Яна не магла ўносіць змены ў асноўныя законы Расійскай імперыі. Па-другое, царызм не пайшоў на ўвядзенне ўсеагульнага выбарчага права, захаваў класавыя абмежаванні, маёмасны цэнз. Усе выбаршчыкі былі разбіты на 4 курыі: землеўладальніцкую, гарадскую, сялянскую, рабочую. Выбары былі няроўнымі: адзін голас памешчыка адпавядаў 3 галасам гараджан, 15 галасам сялян і 45 галасам пабочых. Выбары былі многаступеннымі: двухступеннымі для землсўласнікаў і гарадскіх гаспадароў, трохступеннымі для рабочых і чатырохступеннымі для сялян. Не мелі права голасу жанчыны, ваенныя, чыны паліцыі, моладзь ва ўзросце да 25 гадоў. Існавалі і многія іншыя абмежаванні. Напрыклад, па рабочай курыі выбарчае права мелі рабочыя прадпрыемстваў, дзе рабочых мужчын ва ўзросце 25 гадоў было больш за 50 чалавек. Прадпрыемствы з колькасцю рабочых ад 50 да 100 чалавек выбіралі аднаго паўнамоцнага прадстаўніка. На буйных прадпрыемствах адзін прадстаўнік выбіраўся ад кожнай тысячы працаўнікоў. Упаўнаважаныя ад прадпрыемстваў на гарадскіх альбо губернскіх з'ездах выбіралі выбаршчыкаў, якія потым на сходах выбаршчыкаў выбіралі дэпутатаў Думы. Не ўдзельнічалі ў выбарах дапаможныя рабочыя, рамеснікі. Існуючыя абмежаванні прывялі да таго, што ў Мінскай губерні, напрыклад, выбарчае права мелі 31 прадпрыемства з колькасцю рабочых 5794, у той час як пад надзорам фабрычнай інспекцыі было 8500 рабочых. Акрамя таго, у рамесных майстэрнях працавалі 18 тыс. чалавек.

У сувязі з выбарамі ў Думу разгарнулася барацьба розных палітычных партый, груповак за галасы выбаршчыкаў. Даволі

арганізавана на выбарах выступіла буржуазія. Яшчэ ў кастрычніку 1905 г. прадстаўнікі інтэлігенцыі, сярэдняя гарадская буржуазія, часткова ліберальыіыя памешчыкі стварылі Канстытуцыйна-дэмакратычную партыю. Кадэты выступілі супраць неабмежаванай самадзяржаўнай улады, патрабавалі ўвядзення ўсеагульнага выбарчага права, дэмакратычных свабод, адказнага перад парламентам урада і г. д. У перыяд выбарчай кампаніі арганізацыі кадэтаў былі створаны ў Гомелі, Магілёве, Пінску. Абмежаванні, якія існавалі на Беларусі Для дзейнасці апазіцыйных партый, прымусілі кадэтаў пайсці на заключэнне розных выбарчых блокаў. У Мінскай губерні, напрыклад, быў створаны Прагрэсіўны блок, у склад якога Ўвайшлі кадэты, перадвыбарчы камітэт землеўладальнікаў, прадстаўнікі некаторых польскіх і літоўскіх палітычных сіл. У склад Вілснскага яўрэйскага выбарчага камітэта ўвайшлі "Саюз дасягнення раўнапраўя яўрэяў у Расіі", група кадэтаў, прадстаўнікі Віленскага рабіната.

У лютым 1906 г. у Вільні была створана Канстытуцыйна каталіцкая партыя Літвы і Бсларусі на чале з епіскапаі Э. Ропам. Гэтая партыя вяла актыўную выбарчую кампанію ў Віленскай і Гродзенскай губсрнях. Урадавы лагер на выбарах быў прадстаўлены памешчыцка-манархічнымі партыямі. Іх тактыку вызначыў у красавіку 1906 г. II манархічны з'езд. Неабмежаванае самадзяржаўе і адзінства Расіі былі галоўнымі патрабаваннямі ў ідэалогіі правых сіл. "Саюз рускага народа", "Саюз 17 кастрычніка" вялі работу па стварэнню сваіх арганізацый у Мінску, Гомелі, Магілёве, Віцебску, Вільні, Гродне. У Магілёве, напрыклад, створаная ў кастрычніку 1905 г. арганізацыя налічвала каля 10 тыс. чалавек. Янаі надрукавала сотні пракламацый у падтрымку "праваслаўя, самадзяржаўя, рускай народнасці".

У снежні 1905 г. у Вільні пачало дзейнічаць Паўночна-Заходняе рускае веча. Арганізацыя выдавала газету "Белая Русь", якая была рунарам афіцыйнай урадавай ідэалогіі. ;

Актыўную кампанію ў друку вялі акцябрысты. У 1906 г. яны выдалі звыш 50 нумароў газеты, дзесяткі брашур.

Рэвалюцыйна-дэмакратычныя партыі байкатавалі выбары. Такія рашэнні былі прыняты на I з'ездзе партыі эсэраў (29 снежня 1905 г. 4 студзеня 1906 г.), II з'ездзе Беларускай сацыялістычнай грамады (студзснь 1906 г.), VII канферэнцыі Бунда (люты 1906 г.). Гэтыя партыі звязвалі ажыццяўленне сваіх праграмных патрабаванняў з рэвалюцыйным выступленнем супраць самадзяржаўнай улады.

Аднак выбары адбыліся. Ад 5 беларускіх іубсрняў 536 выбаршчыкаў абралі ў 1 Дзяржаўную думу 36 дэпутатаў. Сярод іх

было 13 сялян, 11 прадстаўнікоў інтэлігенцыі, 8 памешчыкаў, 4 святары. Праўда, гэта дзяленне крыху ўмоўнае, таму што некаторыя памепічыкі вызначылі сябе інтэлігентамі. Большасць дэпутатаў Беларусі (29 з 36) прайшлі над кадэцкімі лозунгамі пры падтрымцы Канстытуцыйна-каталіцкай партыі, сіяністаў, "Саюза дасягнення раўнапраўя яўрэяў У Расіі".

27 красавіка 1906 г. Дзяржаўная дума пачала работу. З палітычных партый у час выбараў у 1 Дзяржаўную думу атрымалі перамогу кадэты. Фракцыя кадэтаў налічвала 161, трудавікоў – 97, аўтанамістаў – 70, акцябрыстаў – 25, сацыял-дэмакратаў – 17, прагрэсістаў – 12, партыі дэмакратычных рэформаў – 14, беспартыйных – 103 дэпутаты. Ужо на першай сесіі Думы праявіўся яе характар. Пасля абрання старшыні Думы выступіў кадэт Петрункевіч з патрабаваннем вызвалення палітычных вязняў. У адказ на прывітальную прамову Мікалая II дэпутаты падрыхтавалі свой адрас, дзе сфармулявалі патрабаванні: усеагульнага выбарчага права, адказнага перад парламентам урада, адмены смяротнага пакарання, правядзення аграрнай рэформы, бясплатнага навучання, недатыкальнасці асобы, дэмакратычных свабод. Тэкст быў зацверджаны 5 мая, але цар адмовіўся прыняць дэпутацыю Думы, бо ўспрымаў адрас як супрацьурадавы маніфест.

Галоўным у Думе было аграрнае пытанне. Спрэчкі разгарэліся вакол аграрных законапраектаў кадэтаў, трудавікоў і эсэраў. Кадэты прапанавалі праект надзялення сялян зямлёй за кошт казённых, удзельных, манастырскіх і часткі памешчыцкіх зямель, якія падлягалі прымусоваму выкупу. Трудавікі выступалі за ліквідацыю памешчыцкага землеўладання, перадачу зямлі ў народную ўласнасць, увядзенне ўраўняльнага землекарыстання. 20 чэрвеня 1906 г. у газетах з'явілася ўрадавая аграрная праграма. Яна прадугледжвала перадачу малазямельным сялянам прыгодных для земляробства казённых зямель, добраахвотны продаж праз Сялянскі банк памешчыцкай зямлі, павелічэнне дапамогі перасяленцам, ліквідацыю цераспалосіцы і інш. У праграме крытыкаваліся рэвалюцыйныя думскія праекты.

Дума пастанавіла звярнуцца да народа, адзначыўшы, што яна "ад прымусовага адчужэння прыватнаўласніцкіх зямель не адступіць, адхіляючы ўсе астатнія прапановы". У сувязі з гэтым зваротам 9 ліпеня 1906 г. Мікалай II выдаў указ аб роспуску I Думы і скліканні II Думы 20 лютага 1907 г. Перад гэтым адбылося назначэнне П.А. Сталыпіна старшынёй Савета Міністраў.

У адказ на разгон Думы частка дэпутатаў (230 чал.) у Выбаргу прыняла адозву "Да народа ад народных прадстаўнікоў", у якой заклікалі насельніцтва адмовіцца ад выканання вайсковага абавязку, не плаціць падаткі. Аднак гэтая адозва поспеху не мела.

У канцы 1906 г. - пачатку 1907 г. адбыліся выбары II Дзяржаўную думу. Урад рабіў усё магчымае, каб забяспечыць прадстаўніцтва ў Думе "законапаслухмяных" грамадзян У цыркуляры Міністэрства ўнутраных спраў удакладнялася што права голасу маюць толькі рабочыя фабрычна-заводскай, горна-заводскай прамысловасці і рамонтных майстэрняў. Рабочыя іншых прадпрыемстваў у выбарах не ўдзельнічалі. Былі ўведзены некаторыя абмежаванні для сялянства. У прыватнасці, забаранялася ўдзельнічаць у выбарах сялянам, якія мелі запазычанасць у Сялянскім пазямельным банку.

Ва ўмовах спаду рэвалюцыі палітычныя партыі сацыялістычнай арыентацыі змянілі тактыку адносна выбараў. РСДРП, ПС-Р, Бунд, БСГ прынялі актыўны ўдзел у выбарчай кампаніі. З'явілася рэальная магчымасць фарміравання блока левых сіл. Такі блок, у прыватнасці, быў створаны ў Мінску. Але рэвалюцыйныя партыі не змаглі выпрацаваць адзіныя палітычныя дактрыны і выступіць на выбарах з агульным спісам кандыдатаў.

Урадавы блок на выбарах у беларускіх губернях ішоў пад сцягам "Русского окраинного союза" (РОС), створанага ў Вільні ў кастрычніку 1906 г. РОС выступаў за "адзіную і недзялімую Расію", адмаўляў існаванне беларускай нацыі. Росаўцы заклікалі ліквідаваць эканамічны ўплыў польскіх землеўласнікаў і яўрэйскай буржуазіі, патрабавалі забараніць удзельнічаць у выбарах палякам і яўрэям. Пры падтрымцы дзяржаўных устаноў, праваслаўнай царквы гэты блок правёў у II Думу 15 дэпутатаў.

Аўтанамісты (польскія і беларускія памешчыкі, інтэлігенцыя, ксяндзы) арганізавалі шырокую агітацыю ў заходніх губернях. Яны крытыкавалі ўрад за імперскую нацыянальную палітыку, абмежаванні ў рэлігійным пытанні. Аўтанамісты атрымалі 11 дэпутацкіх мандатаў. 8 дэпутатаў былі беспартыйнымі, 2 прадстаўлялі партыю кадэтаў.

Рэвалюцыйныя партыі на Беларусі падчас выбараў пацярпелі паражэнне. Але ў цэлым па Расіі левыя сілы зноў пацвердзілі свой уплыў у грамадстве. II Дзяржаўная дума была яшчэ больш левай, чым першая. 104 мандаты мелі трудавікі, 98 – кадэты, 65 – сацыял-дэмакраты, 37 – эсэры, 16 – народныя сацыялісты. Правы блок налічваў 54 дэпутаты, аўтанамісты – 76, беспартыйныя – 50, казацкая група - 17 дэпутатаў.

II Дзяржаўная дума пачала работу 20 лютага 1907 г. З праграмнай прамовай 6 сакавіка выступіў старшыня Савета міністраў П. А. Сталыпін. Ён прапанаваў Думе шэраг законапраектаў па перабудове мясцовага самакіравання, вырашэнні аграрнага пытання шляхам паляпшэння землекарыстання, развіцця зямельнага, кааператыўнага і перасяленскага крэдытаў, падкрэсліў значэнне ўказа ад 9 лістапада 1906 г.

Думскія фракцыі па-рознаму аднесліся да гэтай праграмы. Трудавікі ўнеслі свой аграрны законапраект за подпісам 113 дэпутатаў. Па большасці пазіцый іх падтрымалі эсэры. Яны прапанавалі адмену прыватнай уласнасці на зямлю, перадачу яе ў карыстанне працоўнаму народу без выкупу па норме не ніжэй спажывецкай і не вышэй працоўнай. Не падтрымалі ўрадавую праграму кадэты. Яны прапанавалі праект выкупу прыватнаўласніцкіх зямель па справядлівай ацэнцы за кошт дзяржавы і паловы сродкаў сялянства. Сацыял-дэмакраты ўнеслі праект муніцыпалізацыі зямлі, які не атрымаў падтрымкі ў Думе.

Салідарнасць з урадавай праграмай выказалі толькі прадстаўнікі акцябрыстаў і памешчыцкіх партый. Але гэтага было недастаткова. 10 мая 1907 г. у Думе выступіў П.А. Сталыпін з рэзкай крытыкай апазіцыйных аграрных праектаў. "Мы прапануем вам сціплы, але дакладны шлях, - гаварыў ён. Ворагі дзяржаўнасці імкнуцца выбраць шлях радыкалізму, адмовы ад гістарычнага мінулага Расіі, забыцця яго культурных традыцый. Ім неабходны вялікія ўзрушэнні, нам патрэбна вялікая Расія".

26 мая кадэты пры падтрымцы правага блока правалілі рэзалюцыю левых фракцый аб прыняцці ў якасці галоўнага прынцыпу работы Аграрнай камісіі Думы - прынцып прымусовага адчужэння прыватнаўласніцкіх зямель. Кадэты прытрымліваліся тактыкі берагчы Думу ад разгону. П Дзяржаўная дума выходзіла з-пад кантролю ўрада. Правыя партыі патрабавалі распусціць яе. У маі 1907 г. супраць прадстаўнікоў сацыял-дэмакратычнай фракцыі ў Думе было зроблена абвінавачанне ў падрыхтоўцы змовы супраць цара. Старшыня Савета Міністраў П.А. Сталыпін патрабаваў пазбавіць гэтых дэпутатаў парла-менцкай недатыкальнасці. Думская камісія пачала расследаванне. Але Мікалай II, не чакаючы вынікаў гэтага разгляду, 3 чэрвеня 1907 г. распускае Думу. Выбарчы закон, прыняты ў адпаведнасці з маніфестам 17 кастрычніка, быў зменены. Царскі ўказ не адпавядаў Асноўным законам Расійскай імперыі, якія забаранялі без згоды Думы прымаць новыя законы. Грамадства

ацаніла такі крок урада як своеасаблівы дзяржаўны пераварот, як канец першай расійскай рэвалюцыі.

Рэвалюцыя 1905-1907 гг. была этапнай з'явай у гісторыі Расійскай імперыі. Ва ўмовах рэвалюцыі ўрад, прадпрымальнікі вымушаны былі пайсці на прыняцце шэрагу мер па паляпшэнню эканамічнага становішча працоўных. Былі зроблены захады па фарміраванню ў краіне канстытуцыйнай манархіі, пашырэнню дэмакратычных свабод, стварэнню палітычных партый, грамадскіх і прафесійных арганізацый. Адбылася актывізацыя рабочага, сялянскага і нацыянальна-вызваленчага руху.

Новы выбарчы закон ад 3 чэрвеня 1907 г. пашырыў прадстаўніцтва памешчыкаў, буйной буржуазіі. Выбаршчыкі, як і раней, падзяляліся на 4 курыі. Але землеўладальніцкай курыі давалася 49,6% выбаршчыкаў у еўрапейскіх губернях Расійскай імперыі замест 32,7% на выбарах у папярэднія Думы. Скарачалася колькасць выбаршчыкаў ад сялян (з 42,3% да 21,8%) нацыянальных рэгіёнаў. У беларускіх губернях улады паспрабавалі супрацьпаставіць выбаршчыкаў па нацыянальнаму прызнаку. У Віленскай губерні была створана асобная руская курыя з перадачай ёй 2 дэпутацкіх месцаў. У Гродзенскай, Мінскай, Віцебскай, Магілёўскай губернях павятовыя з’езды памешчыкаў былі падзелены на рускае і польскае аддзяленні. У гарадах Мінскай губерні курыя буйной буржуазіі (першая) дзялілася на рускую, польскую і яўрэйскую. Курыя дробнай буржуазіі (другая) у розных паветах таксама дзялілася на нацыянальныя аддзяленні. Усё гэта рабілася з мэтай, каб правесці ў Думу прадстаўнікоў урадавых партый.

На справе так і адбылося. У III Дзяржаўную думу было абрана 268 прадстаўнікоў урадавых партый (61%), 115 – лібералаў (26%), 27 – дэмакратаў (6%). Ад беларускіх губерняў 80,5% дэпутатаў прадстаўлялі ўрадавы лагер. III Дзяржаўная дума працавала на працягу 5 гадоў, разглядзела 2197 законапраектаў.

На выбарах у IV Думу ў 1912 г. беларускае насельніцтва падзялялася на 3 курыі: рускую, польскую і яўрэйскую. Беларусаў-праваслаўных запісалі ў рускую, католікаў – у польскую курыі. Царская палітыка расколу беларускага этнасу па веравызнанню падтрымлівалася, з аднаго боку, акцябрысцка-чарнасоценнымі, з другога – польскімі клерыкальнымі арганізацыямі.

Партыі ліберальнага лагера, рэвалюцыйна-дэмакратычныя партыі, якія згарнулі сваю дзейнасць у перыяд рэакцыі, на выбарах у IV Думу актывізаваліся. Так, бундаўцы на IX канферэнцыі ў Вене (чэрвень 1912 г.) прынялі палітычную платформу па выбарах у Думу,

у якой патрабавалі ўстанаўленне дэмакратычнай рэспублікі, нацыянальнага раўнапраўя і скасавання надзвычайнага становішча, мяжы аседласці і г. д. Бальшавікі на Пражскай канферэнцыі (1912) вырашылі выстаўляць сваіх кандыдатаў, каб з думскай трыбуны прапагандаваць свае ідэі. Але вынікі выбараў былі прадказальнымі. Па партыйнаму складу дэпутаты ад беларускіх губерняў амаль не адрозніваліся ад папярэдняй Думы (27 правых, 5 краёўцаў, 3 акцябрысты, 1 прагрэсіст). Такім чынам, ад Беларусі ніхто з левых кандыдатаў не трапіў у IV Дзяржаўную думу, якая праіснавала да кастрычніка 1917 г.

Паражэнне першай расійскай рэвалюцыі азначала наступленне новага этапа ў гісторыі дзяржавы, сістэме яе грамадскіх адносін. Буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя насіла незавершаны характар, але гэта не азначала, што яна закончылася безвынікова. Рэвалюцыйныя падзеі абудзілі ў мільёнаў людзей цікавасць да сацыяльна-палітычнага і культурнага жыцця.

Царскі ўрад пасля 3 чэрвеня 1907 г. перайшоў да больш жорсткіх формаў кіравання. У 1907-1910 гг. на Беларусі было забаронена больш за 40 прафесійных саюзаў, якія ўзніклі ў час рэвалюцыі. На становішчы надзвычайнай і ўзмоцненай аховы знаходзіліся Мінская і Магілёўская губерні, Віцебскі павет, гарады Віцебск, Гродна, Смаргонь. Між тым гісторыя не павярнула назад. Дзейнічала Дзяржаўная дума, існавалі легальныя магчымасці работы прафсаюзаў, грамадскіх арганізацый. Царскі ўрад быў вымушаны палітыку рэпрэсій супраць вальнадумцаў праводзіць разам з палітыкай лавіравання і рэформаў.

Пасля рэвалюцыі краіна перажывала эканамічную дэпрэсію. Звужэнне рынку цяжка адбілася на пераапрацоўчых галінах прамысловасці Беларусі. У 1907 г. у беларускіх губернях спынілі работу 459 прамысловых прадпрыемстваў. Павялічылася колькасць беспрацоўных. Спад вытворчасці, узмацненне палітычнай рэакцыі прадпрымальнікі выкарыстоўвалі для наступлення на эканамічныя запатрабаванні рабочага класа. Пры павелічэнні рабочага дня, узмацненні інтэнсіфікацыі працы замарожвалася, а то і памяншалася зарплата, пашыралася сфера прымянення жаночай і дзіцячай працы.

У лістападзе 1907 г. Сенат пацвердзіў права прадпрымальнікаў прымяняць лакаўты ў выпадках аб'яўлення рабочымі частковай забастоўкі. Фабрыканты і заводчыкі каардынавалі дзейнасць праз свае саюзы, перадаючы адзін аднаму так званыя "чорныя спісы". Фабрычнай адміністрацыі ў студзені 1908 г. было дадзена права звальнення рабочых за "дурныя паводзіны".

**Аграрная рэформа.** Актыўны ўдзел у рэвалюцыі сялянства паставіў перад урадам задачу рэфармавання аграрных адносін. Гаворка ішла аб стварэнні новай сацыяльнай апоры ў вёсцы. Такой апорай маглі стаць заможныя сяляне, клас сельскай буржуазіі. Але складанасць сітуацыі заключалася ў тым, што царызм не хацеў сварыцца са сваім даўнім саюзнікам у асобе памешчыкаў. За вырашэнне гэтай складанай задачы ўзяўся старшыня Савета Міністраў і Міністр унутраных спраў П.А. Сталыпін. 9 лістапада 1906 г. быў апублікаваны ўказ "Аб змяненні і дапаўненні некаторых пастаноў аб сялянскім землеўладанні". Быў створаны Галоўны камітэт па справах землеўладання, губернскія і павятовыя землеўпарадкавальныя камісіі, у склад якіх увайшлі выбарныя ад сялян і чыноўнікі мясцовай адміністрацыі.

Указ ад 9 лістапада дазваляў вяскоўцам выхад з абшчыны і замацаванне надзельнай зямлі ў асабістую ўласнасць. Сельскі сход павінен быў разглядаць такія заявы на працягу аднаго месяца. У спрэчных выпадках справу вырашаў земскі начальнік.

Сялянам дазвалялася выдзяленне зямлі асобным участкам.

Лістападаўскі ўказ не быў адзіным дакументам сталыпінскай аграрнай рэформы. Яшчэ ў жніўні 1906 г. былі праведзены мераіірыемствы па перадачы Сялянскаму банку часткі ўдзельных, казённых зямель для продажу сялянам. У кастрычніку Сялянскі банк атрымаў дазвол на выдачу сялянам пазыкі пад залог надзельнай зямлі. У адносінах да сялянства былі рэалізаваны некаторыя палітычныя мерапрыемствы, накіраваныя на пашырэнне іх сацыяльнай мабільнасці: адменены абмежаванпі ў адносінах да дзяржаўнай і ваеннай службы, вучобы ў навучальных установах.

Указ 9 лістапада 1906 г. стаў законам 14 чэрвеня 1910 г. пасля яго прыняцця Дзяржаўнай думай, адабрэння Дзяржаўным саветам і падпісання Мікалаем II. Урад рабіў захады, каб паскорыць аграрную рэформу. Ствараліся паказальныя гаспадаркі, у якіх разводзілася пародзістая жывёла, прымяняліся новыя агратэхнічныя прыёмы гаспадарання і г. д. У Віленскай губерні ў 1914 г. дзейнічала 387 такіх гаспадарак.)

Прымаліся меры па пашырэнню прапаганды сельскагаспадарчых ведаў, арганізацыі агранамічнай, ветэрынарнай службы, пунктаў продажу сартавога насення, мінеральных угнаенняў, машын і прылад працы.

Так, сельскагаспадарчыя склады ў Віцебскай губерні з 1911 па 1913 гг. больш чым утрая павялічылі продаж тэхнікі, насення.

Павялічыліся расходы на меліярацыю зямель. У Мінскай губерні яны склалі ў 1907 г. 17 тыс. рублёў, а ў 1914 г. – 152,3 тыс. рублёў. Для падрыхтоўкі адпаведных спецыялістаў, правядзення навуковых даследаванняў у 1911 г. была створана Мінская балотная станцыя.

Значнае развіццё на Беларусі атрымаў кааператыўны рух. Ствараліся крэдытныя і пазыковыя арганізацыі, ашчадныя і спажывецкія таварыствы, вытворчыя арцелі. У Магілёўскай губерні, напрыклад, колькасць крэдытных і пазыкова-ашчадных таварыстваў павялічылася з 8 – у 1905 г. да 139 – у 1913 г.

Урадавая аграрная палітыка была доўгатэрміновай і разлічанай, - як казаў Сталыпін, - "не на ўбогіх і п'яных, а на моцных". Каб падштурхнуць працэс ліквідацыі абшчыны 29 мая 1911 г. быў прыняты закон "Аб землеўпарадкаванні", які дазваляў камісіям па землеўпарадкаванпю прымусова выдзяляць сялянам асобны зямельны ўчастак. Трэба адзначыць актыўны выхад сялянства з абшчыны ў Магілёўскай губерні, дзе 56,8% гаспадарак замацавалі зямлю ў асабістую ўласнасць. У 5 беларускіх губернях на зямельнай плошчы 1,4 млн. дзесяцін было створана 128 тыс. хутароў і вотрубаў. Тэмпы хутарызацыі сельскай гаспадаркі на Беларусі былі больш высокімі ў параўнанні з іншымі еўрапейскімі губернямі Расійскай імперыі.

Адным з накірункаў аграрнай рэформы была перасяленчая палітыка. З найбольш аграрна перанаселенай Еўрапейскай Расіі сялянства накіроўвалася ў азіяцкую частку Расіі, Сібір. Для заахвочвання перасяленцаў выдзялялася дапамога, кароткатэрміновыя пазыкі, транспарт, ствараліся пункты прыёму перасяленцаў. За 1904-1914 гг. з беларускіх губерняў выехала на ўсход 368,4 тыс. чалавек. У першую чаргу гэта былі беззямельныя і малазямельныя сяляне. Не ўсе яны змаглі прыжыцца на новых землях. Каля 11% перасяленцаў вярнуліся на Беларусь.

У перабудову вёскі ўкладваліся значныя сродкі. Выдаткі дзяржавы на аказанне агратэхнічнай дапамогі насельніцтву, распаўсюджванне сельскагаспадарчай адукацыі ў 1913 г. павялічыліся да 29 млн. руб., у той час як у 1908 г. гэтая сума складала 5,7 млн. руб. Між тым аграрная праблема не страціла сваю вастрыню і складанасць, бо заставаліся аграрная перанаселенасць вёскі, малазямелле, нізкай была культура і тэхналогія вытворчасці, а кошт зямлі быў высокі.

Сталыпін разлічваў знайсці стабілізацыю грамадства на шляху ўмацавання новай сацыяльнай групы зямельных уласнікаў. Рэформа зямельных адносін патрабавала пашырэння грамадзянскіх правоў гэтага класа, змянення іх сацыяльнага статуса. Невыпадкова таму Сталыпін прапанаваў увесці выбарнае земства ў заходніх губернях. У

праекце "Аб выкарыстанні "Палажэння аб земскіх установах ад 12 чэрвеня 1890 г. да губерняў Віцебскай, Валынскай, Кіеўскай, Мінскай, Магілёўскай, Падольскай", які пачаў абмяркоўвацца ў 1910 г., замест саслоўных памешчыцкай і сялянскай курый прапаноўвалася ўвесці курыі нацыянальныя рускую, польскую. У рускую курыю ўключалася беларускае праваслаўнае насельніцтва, у польскую – каталіцкае. Каб забяспечыць перавагу рускай курыі выбарчы маёмасны цэнз паніжаўся з 15 тыс. да 7,5 тыс. рублёў.

Гэты законапраект III Дзяржаўнай думай быў успрыняты крытычна. У ходзе дэбатаў у думскай камісіі па мясцоваму самакіраванню і на пасяджэннях Думы акцябрысты выступілі за захаванне ў законе толькі маёмаснага цэнзу. Група дэпутатаў выказалася за ўвядзенне земства па палажэнню "Аб земскіх установах" ад 12 чэрвеня 1890 г. без дзялення на нацыянальныя курыі. Кадэты ацанілі законапраект як праяўленне грубейшай нацыяналістычнай палітыкі, якая аслабляе дзяржаву на заходніх ускраінах. Трудавікі лічылі магчымым будаваць мясцовае самакіраванне на роўным удзеле ў выбарах усяго мясцовага насельніцтва. Супраць законапраекта выступілі сацыял-дэмакраты, якія асудзілі шавіністычную палітыку царызму.

З крытыкай выступіла газета "Наша ніва", бо новы выбарчы закон ігнараваў факт існавання беларускай нацыі, падзяляў беларусаў на рускіх і палякаў.

Законапраект П.А. Сталыпіна быў прыняты Думай з нязначнымі папраўкамі праўрадавай фракцыяй рускіх нацыяналістаў пры падтрымцы часткі акцябрыстаў і паступіў на разгляд Дзяржаўнага савета. Але 4 сакавіка 1911 г. праект быў адхілены саветам 92 галасамі, супраць 68. Ідэя паніжэння маёмаснага цэнзу, увядзення нацыянальных курый не знайшла падтрымкі. Буйныя землеўладальнікі не жадалі дзяліць уладу з вясковай буржуазіяй. П. А. Сталыпін заявіў аб сваёй адстаўцы ў выпадку, калі законапраект не будзе зацверджаны ў надзвычайным парадку. Мікалай II распусціў на 3 дні Дзяржаўную думу і Дзяржаўны савет і, у адпаведнасці з артыкулам 87 Асноўнага закона, 14 сакавіка 1911 г. падпісаў указ аб увядзенні земства ў 6 заходніх губернях. Павятовыя і губернскія выбарныя земствы ў Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях адыгралі станоўчую ролю ў правядзенні аграрнай рэформы, развіцці адукацыі, медыцынскага абслугоўвання насельніцтва.

## ЛЕКЦЫЯ 12

## КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ

- *Адукацыя. Літаратура*
- *Навука*
- *Тэатр і музыка*
- *Выяўленчае мастацтва і архітэктура*

**Адукацыя. Літаратура.** Развіццё буржуазных адносін паскорыла працэсы дэмакратызацыі культурнага жыцця. Новыя эканамічныя ўмовы, новая сацыяльная структура грамадства пашыралі магчымасці для атрымання адукацыі, ведаў у розных галінах навукі. У 1864 г. урад прыняў рашэнне аб правядзенні школьнай рэформы, якая спрыяла развіццю сферы пачатковай і сярэдняй адукацыі, павялічвала сетку навучальных устаноў, прыцягвала да іх новыя педагагічныя кадры. Аднак яе вынікі ў Беларусі былі менш значнымі, чым у цэнтральных губернях Расіі. Пасля падаўлення паўстання 1863 г. і амаль да канца XIX ст. на Беларусі дзейнічалі "Часовыя правілы для народных школ", якія былі распрацаваны пры М. Мураўёве і зацверджаны Аляксандрам II 18 мая 1864 г. Згодна з імі пачатковыя школы поўнасцю аддаваліся пад кантроль праваслаўнага духавенства, чыноўнікаў і паліцыі. Прадугледжвалася выкладанне ў школе граматыкі, арыфметыкі, навучанне Закону Божаму (па праваслаўнаму абраду). Падручнікі для школ Паўночна-Заходняга краю прынцыпова адрозніваліся ад адпаведных падручнікаў для рускіх губерняў вялікадзяржаўным тлумачэннем гісторыі.

У 1864 г. за ўдзел студэнтаў і вучняў у паўстанні былі закрыты Горы-Горацкі земляробчы інстытут, Навагрудская гімназія, Свіслачская і Маладзечанская прагімназіі. На Беларусі былі ліквідаваны польскія школы, амаль усе прыватныя вучылішчы. У школах забаранялася выкладанне польскай і беларускай моў. З пасад звальнялі мясцовых настаўнікаў каталіцкага веравызнання, на іх месцы запрашаліся асобы з Расіі.

Але, нягледзячы на гэта, грамадства патрабавала развіцця адукацыі. Фарміраваліся агульныя падыходы да арганізацыі вучэбнай справы. Навучальныя ўстановы розных ведамстваў былі падпарадкаваны ў сваёй большасці Міністэрству народнай асветы. На вёсцы пачатковая школа была прадстаўлена народнымі і двухкласнымі пачатковымі вучылішчамі. У гарадах адукацыйнымі ўстановамі ніжэйшага тыпу з'яўляліся адна-, двух-, трох-, чатырохкласныя вучы-

лішчы. Пры царкоўных прыходах існавалі пачатковыя прыходскія вучылішчы.

У канцы XIX ст. сярэднюю адукацыю давалі 13 гімназій, 3 прагімназіі, Горы-Горацкае земляробчае вучылішча, Полацкі кадэцкі корпус, духоўныя і настаўніцкія семінарыі. З-за высокай платы за навучанне сярэднія навучальныя ўстановы для працоўнага насельніцтва былі недаступныя. Да канца XIX ст. сярэдняя школа заставалася ўстановай для прывілеяваных саслоўяў. Найбольш масавамі з'яўляліся пачатковыя школы, колькасць якіх на рубяжы стагоддзяў складала 1400. Дзейнічалі таксама 20 павятовых вучылішчаў.

На такім агульнаадукацыйным фоне адбывалася развіццё беларускай культуры. Трэба адзначыць, што ў тагачаснай культуры выразна адбіліся супярэчнасці эпохі. З аднаго боку, фарміравалася новае сацыякультурнае асяроддзе, у якім усё большае месца займала інтэлігенцыя. У гэты час значнымі тыражамі выйшлі пераклады прац Тэна, Гільдэбрана, Кона, Шапэнгаўэра, Ніцшэ, Фрэйда. Яны сведчылі аб цікавасці да новых накірункаў філасофскай думкі. У расійскай гуманітарнай навуцы з'явіліся вучоныя, якія ўнеслі значны ўклад у развіццё гісторыі, філасофіі, культуралогіі, сацыялогіі:В. Ключэўскі, У. Салаўёў, М. Бярдзяеў, С. Булгакаў, П. Фларэнскі, С. Франк і іншыя.

Эпоха на мяжы стагоддзяў з’явілася сярэбраным векам у культуры Расійскай імперыі, часам фарміравання новых творчых накірункаў у літаратуры, мастацтве. Сімвалізм, мадэрнізм, футурызм, авангардызм былі звязаны з сусветна вядомымі імёнамі А. Блока, А. Белага, Ф. Салагуба, У. Маякоўскага, В. Хлебнікава, М. Цвятаевай, В. Кандзінскага і іншых.

Культурнае жыццё ў беларускіх губернях развівалася пад уплывам суседніх славянскіх, французскай і іншых еўрапейскіх культур. Найбольшае ўздзеянне на развіццё культуры беларускага народа аказала, безумоўна, руская культура. "Адбітак рускай культуры – пісаў М. Багдановіч, - ляжыць на духоўнай творчасці кожнага народа Расіі, яна з'яўляецца для іх агульнай глебай, збліжаючы змест іх культур, іх ідэйных і літаратурных плыняў".

З другога боку, пошук новых філасофскіх ідэй, канцэпцый уладкавання грамадства, накірункаў мастацкай творчасці адбываўся ва ўмовах масавай неадукаванасці насельніцтва, нізкага яго культурнага ўзроўню. У канцы XIX ст. у беларускіх губернях колькасць адукаванага насельніцтва складала ўсяго 22%. Але трэба адзначыць, што тэндэнцыі ў развіцці асветы былі станоўчымі. Доля расходаў Міністэрства народ-най адукацыі ў бюджэце краіны павялічылася з 2,1% у 1900 г. да 14,6% у 1913 г. Замест царкоўна-прыходскіх школ

адкрываліся народныя вучылішчы, а гарадскія вучылішчы пераўтвараліся ў вышэйшыя пачатковыя школы. Значна павялічылася колькасць гімназій, рэальных вучылішчаў, развівалася прафесійная адукацыя, ствараліся школы для дарослага насельніцтва. У 1909-1916 гг. на Беларусі былі адкрыты тры настаўніцкія інстытуты, пяць настаўніцкіх семінарый. У 1914 г. дзейнічала 7682 школы розных тыпаў.

З канца 90-х па 1913 гг. граматнасць насельніцтва ў Расійскай імперыі ўзрасла да 31%. У 1906 г. у Дзяржаўную думу нават быў унесены законапраект "Аб увядзенні ўсеагульнай пачатковай адукацыі ў Расійскай імперыі", аднак ён не знайшоў падтрымкі ў большасці дэпутатаў.

У пачатку XX ст. значна павялічылася колькасць перыядычных выданняў, якія выходзілі на 75 мовах народаў Расійскай імперыі. У лістападзе 1905 г. была адменена папярэдняя цэнзура для перыядычных выданняў, што, безумоўна, паспрыяла развіццю выдавецкай справы. Колькасць газет у Расіі павялічылася з 125 у 1900 г. да 1130 у 1913 г. У 2,5 раза павялічылася колькасць выдадзеных кніг.

Беларуская інтэлігенцыя рабіла намаганні, каб стварыць падмурак для развіцця нацыянальнай школы. З 1906 г. у Пецярбургу пачало дзейнічаць выдавецтва "Загляне сонца і ў наша ваконца", якое займалася выданнем дзіцячай літаратуры і за 8 гадоў надрукавала 38 кніг тыражом больш за 100 тыс. экземпляраў. Кнігі на беларускай мове друкавалі таксама выдавецтвы "Наша ніва", "Беларускае выдавецкае таварыства ў Вільні", "Наша хата", "Палачанін", "Мінчук", "Вясёлкі' "Агранамічнае бюро К. Карповіча".

На Беларусі развіваўся перыядычны друк. На працяг 1901-1914 гг. колькасць перыядычных выданняў павялічыла ся з 15 да 125 найменняў. Большасць іх друкавалася на рускай мове, але ў перыядычным друку на беларускай мове выходзілі газеты "Наша доля" і "Наша ніва", "Гоман", "Вольная Беларусь", “Грамада”; часопісы "Саха", "Лучына", "Крапіва", "Раніца", а таксама календары, альманахі.

Значную ролю ў справе нацыянальнага адраджэння адыграла грамадска-палітычная, навукова-асветніцкая, літаратурна-мастацкая газета "Наша ніва", якая выходзіла ў 1906-1915 гг. Ужо ў першых публікацыях газета выразна заявіла аб неабходнасці дэмакратызацыі грамадства, развіцці беларускай духоўнай культуры. На яе старонках друкаваліся творы Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, вядомых літоўскіх, польскіх, рускіх, украінскіх паэтаў, празаікаў, драматургаў, публіцыстаў.

Вядучае месца ў духоўным жыцці народа займала мастацкая літаратура. Паэты, пісьменнікі актыўна ўплывалі на развіццё дэмакратычнай думкі, фарміраванне ідэі сацыяльнай справядлівасці і нацыянальнай годнасці. Многія літаратурныя творы былі тэматычна звязаны з паўстаннем 1863 г. Да іх перш за ўсё адносіцца публіцыстыка К. Каліноўскага (1838-1864). Яна прадстаўлена пракламацыямі, газетай "Мужыцкая праўда" і "Лістамі з-пад шыбеніцы", у якіх аўтар выкрываў палітыку расійскага ўрада, заклікаў сялян да паўстання, марыў аб стварэнні дэмакратычнай народнай дзяржавы. выступаў супраць прымусовага пераводу уніятаў у праваслаўе. К. Каліноўскі вядомы як паэт. Да нас дайшоў адзін твор, які складаецца з двух вершаў "Марыська чарнаброва, галубка мая" і "Калі за нашу праўду Бог нас стаў караці".

У першыя два дзесяцігоддзі пасля паўстання 1863 г. асноўным жанрам у беларускай літаратуры з'яўлялася ананімная вершаваная "гутарка", набліжаная да фальклору. Узорам такіх твораў з'яўляецца "Гутарка Данілы са Сцяпанам", "Сход", "Дзядзька Ангон, або Гутарка аб усім, што баліць, а чаму баліць – не ведаем" і інш. Яны адлюстроўвалі настрой беларускага сялянства, напісаны жывой народнай мовай, у рэалістычнай манеры.

Новае ажыўленне ў развіцці беларускай літаратуры пачалося ў канцы 80-х гадоў з прыходам у яе пісьменнікаў-дэмакратаў – Ф. Багушэвіча, Я. Лучыны, А. Гурыновіча і інш.

Прадстаўніком дэмакратычнага напрамку ў беларускай літаратуры з'яўляецца Францішак Багушэвіч (1840-1900), які пісаў пад псеўданімамі Мацей Бурачок і Сымон Рэўка з-пад Барысава. Спадчына Ф. Багушэвіча багатая і разнастайная ў жанравых адносінах: паэма "Кепска будзе!", вершаванае апавяданне "У астрозе", публіцыстычны маналог "Мая дудка", філасофскі роздум "Праўда", "Думка", прысвячэнне "Ясна-вяльможнай пані Арэшчысе", байка "Воўк і авечка" і інш. Першы зборнік вершаў "Дудка беларуская" ён надрукаваў у 1891 г. у Кракаве, другі зборнік "Смык беларускі" – у 1894 г. у Познані.

З 1886 г. пачаў друкавацца Янка Лучына (Іван Неслухоўскі, 1851-1897), паэзія якога была цесна звязана з жыццём беларускай вёскі. Найбольш вядомы яго твор – верш "Роднай старонцы", у якім аўтар выражае сваю любоў да Радзімы. Вершы Я. Лучыны былі выдадзены ў зборніку "Вязынка"(1903). З яго паэзіі бярэ вытокі беларуская філасофская лірыка.

На фарміраванне светапогляду Адама Гурыновіча (1869-1894) вялікі ўплыў аказалі ідэі шляхецкіх рэвалюцыянераў і народнікаў, у

тым ліку групы “Гоман”, распаўсюджванне марксізму у Расіі. Ён верыў у “жыццёвае” прымяненне сацыялістычных ідэй, першым у беларускай літаратуры выказаў думку пра агульнасць інтарэсаў рабочых і сялян. А. Гурыновіч сцвярджаў, што літаратура павінна "будзіць у сэрцы думку аб лепшай долі, якой мы не зналі дагэтуль ніколі". у паэзіі ён быў паслядоўнікам Ф. Багушэвіча і выступаў з пазіцый рэалізму і народнасці. Літаратурныя творы Гурыновіча былі выдадзены пасмяротна.

Я. Лучына, А. Гурыновіч, А. Абуховіч, К. Каганец актыўна працавалі ў галіне перакладу. А. Гурыновіч, напрыклад, пераклаў на беларускую мову многія творы А. Пушкіна, М. Някрасава, А. Талстога.

Вялікі ўклад у развіццё беларускай літаратуры на рубяжы стагоддзяў унеслі М. Багдановіч, Я. Купала, Я. Колас, Ц. Гартны, Цётка (А. Пашкевіч), З. Бядуля, К. Буйло. Яны неслі ідэі сацыяльнага і нацыянальнага адраджэння, актыўна ўплывалі на духоўнае жыццё народа. "Беларускі народ не tabula rasa, - пісаў М. Багдановіч, - а самастойная нацыянальная велічыня". Ідэі беларускага адраджэння падтрымліваліся дэмакратычнай грамадскасцю ў Расіі, Украіне. Паэтычныя творы беларускіх паэтаў выдаваліся ў Маскве, Кіеве, Львове і іншых гарадах. "У Беларусі ёсць два паэты: Якуб Колас і Янка Купала - вельмі цікавыя хлопцы. Проста пішуць, так ласкава, журботна, шчыра. Нашым бы крыху такіх якасцей", -такую характарыстыку паэтам даў у свой час М. Горкі.

**Навука.** З другой паловы XIX ст. пашыраюцца навуковыя даследаванні гісторыі, мовы, культуры і быту беларусаў. Значную ролю ў вывучэнні Беларусі адыгралі аддзяленне рускай мовы і славеснасці Расійскай акадэміі навук, Таварыства аматараў прыродазнаўства, антрапалогіі і этнаграфіі, створанае ў 1864 г. пры Маскоўскім універсітэце, Вольнае эканамічнае таварыства. У 1867 г. у Вільніа быў створаны Паўночна-Заходні аддзел Рускага геаграфічнага таварыства, які аб'яднаў вакол сябе мясцовых даследчыкаў. Разгарнулася дзейнасць беларускіх вучоных.

У 1870 г. у Пецярбургу быў выдадзены першы фундаментальны беларускі слоўнік І. Насовіча (1788-1877). Пачалася публікацыя гістарычных крыніц “Акты Заходняй Расіі”, “Акты Віленскай камісіі” і інш. Значную ролю ў збіранні беларускага фальклору і вывучэнні этнаграфіі Беларусі адыгралі рускія і польскія даследчыкі П. Уладзіміраў, І. Сразнеўскі, Д. Сабалеўскі, А. Патабня, М. Федароўскі.

Актыўную дзейнасць па збіранню фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў правёў П.В. Шэйн (1826-1900). У 1867 г. ён выдаў адну з першых спецыяльных фальклорных прац у Расіі "Праграму для

збірання помнікаў народнай творчасці", у 1874 г. – зборнік "Беларускія народныя песні", які налічваў больш за тысячу песень, "Матэрыялы для вывучэння быту і мовы рускага насельніцтва Паўночна-Заходняга краю" ў трох тамах (1887-1902).

Выдатным прадстаўніком беларускай этнаграфіі з'яўляўся М.Я. Нікіфароўскі (1845-1910) – настаўнік народных школ Віцебска. Ён апублікаваў каля 20 даследаванняў па этнаграфіі, фальклоры і гісторыі Віцебшчыны, сярод іх самая буйная праца на матэрыялах культуры беларусаў XIX ст. – "Нарысы простанароднага жыцця-быцця ў Віцебскай Беларусі і апісанні прадметаў ужытку (Этнаграфічныя звесткі)".

Матэрыяльную і духоўную культуру беларусаў: жыллё, сямейны побыт, народныя абрады і іншыя вывучаў этнограф Е.Р. Раманаў (1855-1922). Ён апублікаваў каля 200 прац, больш за 10 тыс. фальклорных твораў, вёў археалагічныя раскопкі ў Магілёўскай і Віцебскай губернях, склаў археалагічныя карты Магілёўскай, Віцебскай і Гродзенскай губерняў.

У пачагку XX ст. на Беларусі дзейнічала больш за 50 навуковых і культурна-асветніцкіх таварыстаў, у тым ліку аддзяленне Маскоўскага археалагічнага інстытута, Мінскае таварыства аматараў прыродазнаўства этнаграфіі і археалогіі. У гэты час пачалі друкаваць свае даследаванні гісторыкі М. Доўнар-Запольскі, В. Ластоўскі. Яшчэ адной падзеяй з'явіліся праца Я. Карскага па філалогіі, этнаграфіі, беларускай мове і літаратуры, гісторыі "Беларусы", фізічныя даследаванні Я. Наркевіча-Ёдкі, Я. Сняткова, А. Садоўскага.

На рубяжы стагоддзяў у грамадскім жыцці ўсё большую ролю ігралі прафесійныя, навуковыя, грамадскія таварыствы, саслоўныя і прафесійныя клубы. Ва ўсіх губернскіх і некаторых павятовых гарадах дзейнічалі дваранскія клубы, прафесійныя аб'яднанні, дзе праходзілі святочныя сустрэчы, праводзіліся літаратурныя, музычныя вечары. Існавалі прафесійныя аб'яднанні медыкаў, чыгуначнікаў, гандляроў, служачых прамысловых прадпрыемстваў, яўрэйскія клубы лавачнікаў.

У большасці гарадоў дзейнічала дабрачыннае "Усерасійскае таварыства імператрыцы Марыі Фёдараўны", якое збірала сродкі на правядзенне культурна-масавых мерапрыемстваў, падтрымку беднай вучнёўскай моладзі.

У Гродне і некаторых іншых гарадах былі створаны народныя дамы, у якіх працавалі бібліятэкі, праводзіліся публічныя лекцыі, забаўляльныя мерапрыемствы. Культурнае жыццё гарадскога насельніцтва падкрэслівала саслоўную, прафесійную, сацыяльную

дыферэнцыяцыю ў грамадстве. Культурная, грамадская дзейнасць з'яўлялася прывілеяй заможнай часткі насельніцтва. Грамадскае жыццё беднаты, рамеснікаў, рабочых было звязана з вуліцай, карчмой, рынкам.

**Тэатр і музыка.** Тэатральная і музычная культура другой паловы XIX ст. характарызавалася народнасцю і гуманізмам, ідэйным і эмацыянальным багаццем, вывучэннем чалавечых характараў і гістарычнай праўды. На Беларусі развіваліся розныя формы народпага тэатра (народная драма, батлейка). Узнікненне беларускага прафесійнага тэатра звязана з дзейнасцю пісьменніка, драматурга і тэатральнага дзеяча В. Дуніна-Марцінкевіча (1808 1884). Яшчэ ў 50-х гг. у сваім маёнтку Люцынка ён арганізаваў дамашні гэатр. У 1852 г. на мінскай сцэне яго тэатр паставіў нершую беларускую оперу "Сельская ідылія". Пасля паўстання 1863-1864 гг. ім былі напісаны вадэвіль "Пінская шляхта" (1866), камедыя "Залёты" (1870). Драматычныя творы пісалі на беларускай мове таксама А. Вярыга-Дарэўскі (1816-1884), У. Сыракомля (1823-1862), Ядвігін Ш. і інш.

На развіішё беларускай культуры і тэатральнага мастацтва вялікую ролю аказала гэатральнае мастацтва рускага, украінскага і польскага народаў. У перыяд 70-90-х гг. мінскім іледачам былі паказаны лепшыя творы рускай і сусветнай класікі. У гарадах Беларусі гастралявалі вядомыя майстры рускай сцэны М. Савіна, У. Давыдаў, А. Южын, К. Варламаў, А. Яблачкіна і інш. З вялікім поспехам праходзілі гастролі акцёраў з тэатраў Масквы і Пецярбурга, украінскіх тэатраў М. Крапіўніцкага, М. Старыцкага, М. Занькавецкай, А. Суслава, польскіх тэатраў.

У канцы XIX ст. у Беларусь на гастролі прыязджалі вядомыя выканаўцы – спевакі Л. Собінаў, М. Фігнер, А. Мазіні, Ф. Шаляпін, піяністы і кампазітары С Рахманінаў, А. Скрабін, А. Зілоці і іншыя.

У 1890 і. у Мінску быў адкрыты пастаянны гарадскі тэатр. З 1898 па 1906 гг. у Мінску дзейнічала "Таварыства аматараў прыгожых мастацтваў". Яно складалася з чатырох секцый: літаратурнай, драматычнай, мастацкай і музычнай.

Вялікае значэнне набыла ў той час дзейнасць музычных таварыстваў. Яны наладжвалі публічныя канцэрты і музычныя вечары, лекцыі аб жыцці і творчасці вядомых кампазітараў і выканаўцаў, адкрывалі музычныя навучальныя ўстановы і бібліятэкі.

У канцы XIX ст. у тэатральным жыцці адбыліся значныя нерамены. З'явіўся тэатр з рэалістычнай драматургіяй і рэжысурай, адпаведнай ігрой акцёраў. У тэатральны свет увайшлі новыя школы К. Станіслаўскага, В. Меерхольда.

Тэатральнае жыццё на Беларусі было даволі разнастайным. На гастролях тут знаходзіліся лепшыя тэатральныя калектывы, дзейнічалі тэатральныя таварыствы, прафесійныя і аматарскія трупы. Драматычныя гургкі існавалі ў Брэсце, Бабруйску, Барысаве, Быхаве, Горках, Лідзе, Навагрудку, Слоніме, Слуцку, Вілейцы, Полацку, Рагачове, Клімавічах.

У 1907 г. у Палевічах Дзісненскага павета быў створаны мастацкі калектыў І. Буйніцкага (1861-1917). На працягу трох гадоў тэатральны дзеяч, рэжысёр І. Буйніцкі разам з А. Бурбісам і Л. Рагоўскім сфарміравалі драматычную і харавую трупы. Ішлі запісы і апрацоўка народных песень і танцаў, падрыхтоўка п'ес. Калектыў Буйніцкага стаў нацыянальным прафесійным тэатрам. У яго рэпертуары былі п'есы "Модны шляхцюк" К. Каганца, "У зімовы вечар", "Хам" Э. Ажэшкі, "Паўлінка", "Прымакі" Я. Купалы, "У судзе", "Вылечыў" Я. Коласа, "Краю мой родны!.." М. Багдановіча, "Сватанне" А. Чэхава, народныя песні і танцы. Тэатр гастраляваў у розных гарадах, выязджаў у Пецярбург, Варшаву. У 1913 г. з-за фінансавых цяжкасцяў ён спыніў сваю дзейнасць.

У гарадах і вёсках Беларусі ствараліся аматарскія самадзейныя калектывы, якія праводзілі так званыя беларускія вечарынкі. Па словах М. Гарэцкага, - "тэатр наш павінен стаць храмам нашага Адраджэння".

Даволі разнастайным на Беларусі было музычнае жыццё. На гастролях у беларускіх гарадах выступалі оперныя трупы, музычныя ансамблі, харавыя калектывы, вакалісты.

Дзейнічалі музычна-драматычныя гурткі, аркестры, хоры, якія выстулалі з канцэртамі ў дваранскіх маёнтках, саслоўных клубах, народных дамах. У 1910 г. І. Шадурскім была створана беларуская музычная камедыя "Тарас на Парнасе".

У 1903 г. у Мінску ўпершыню пачаліся дэманстрацыі кіно. На працягу 1907-1910 гг. было адкрыта 6 кінатэатраў.

**Выяўлснчае мастацтва і архітэктура.** У выяўленчым мастацтве ў другой палове XIX ст. ішоў пошук нацыянальнай і самабытнай прыгажосці сваёй краіны, сваіх людзей. Рэалізм усталёўваўся ў мастацтве, ён пераадольваў супраціўленне афіцыйнага напрамку з уласцівым яму культам класіцызму, перавагай біблейскай і міфалаіічнай тэматыкі. У гэты час сусветна вядомымі мастакамі сталі І. Рэпін, В. Сяроў, М. Урубель, В. Васняцоў, М. Несцераў і многія іншыя. Дзейнічалі аўтарытэтныя школы жывапісу ў Пецярбургу, Маскве, Варшаве, Кіеве, Адэсе, дзе можна было атрымаць вышэйшую адукацыю.

У 1866 г. І. Трутнеў стварыў Віленскую школу малявання. Навучанне было бясплатнае. Сярод выкладчыкаў былі П. Ромер, І. Чамаданаў, І. Трутнеў, Б. Бальзукевіч і інпі. Школа падрыхтавала некалькі пакаленняў беларускіх і літоўскіх мастакоў, скульптараў, настаўнікаў рысавання.

У другой палове XIX ст. сярод творчай інтэлігенцыі абуджаецца цікавасць да гісторыі, жыцця і побыту беларускага народа. Майстрам бытавых і гістарычных кампазіцый называлі К. Альхімовіча (1840-1916). Ён ствараў карціны на тэмы беларускай, літоўскай і польскай гісторыі: "Пахаванне Гедзіміна", "Пасля бітвы", "Смерць Глінскага ў турме". Пад уплывам ссылкі за ўдзел у паўстанні 1863-1864 гг. ён напісаў творы "Смерць у выгнанні", "Пахаванне на Урале", "На этапе". У карцінах на бытавыя тэмы ("Жніво", "Парабкава хата", "Наём работнікаў") паказаў быт, цяжкую працу сялян. Мастак напісаў серыю карцін па матывах творчасці А. Міцкевіча і 12 кардонаў-ілюстрацый да паэмы "Пан Тадэвуш".

Гістарычная тэматыка адлюстравана ў творах Д. Баркоўскага (1850-1905) "Мыта на Беларусі", "Бітва пад Чуднавам". Ён вядомы як аўтар жанрава-бытавых карцін "Каля вадапою", "Хворая жонка" і інш.

На гістарычную тэматыку пісалі мастакі Я. Манюшка "Атака кавалерыі", "Шлюб Зігфрыда", Ф. Дмахоўскі "Прысяга князя", М. Андрыёлі.

Вядомым майстрам бытавога жанру быў мастак Н.Ю. Сілівановіч (1830-1918), творчасць якога развівалася ў пераходны перыяд ад класіцызму да рэалізму. Яго карціны "Дзеці на двары", "У школу", "Стары пастух" прасякнуты цеплынёй і любоўю да простага народа. Мастак прымаў удзел у стварэнні мазаічнага пано "Тайная вячэра" для Ісакіеўскага сабора ў Пецярбургу. Распісваў храмы на Беларусі. Атрымаў званне акадэміка.

У другой палове XIX ст. назіраецца ўздым пейзажнага жывапісу. Ва ўмовах цэнзуры мастак мог, хоць і ўскосна, перадаваць свае думкі і пачуцці, свае сімпатыі. Не менш важным фактарам, які абумовіў з'яўленне кагорты майстроў эмацыянальнага пейзажа, была іх вучоба ў рускіх мастакоў. Так, Ф. Рушчыц вучыўся ў І. Шышкіна і А. Куінджы, Г. Вейсенгоф – у М. Клота і Б. Вілевальдэ, К. Стаброўскі – у І. Рэпіна, С. Жукоўскі – у І. Левітана. Творчасць выдатных рускіх жывапісцаў наклала адбітак на ўсю далейшую дзейнасць беларускіх пейзажыстаў. Яны не цураліся і дасягненняў французскіх імпрэсіяністаў, якія прынеслі ў жывапіс святло і паветра, і творчасці польскіх мастакоў, якая адзначалася высокай культурай колеравага

вырашэння, падкрэсленай дэмакратычнасцю і лаканізмам кампазіцыйнай пабудовы.

Краявіды 60-90-х гадоў услаўлялі прыгажосць і багацце беларускай зямлі. Акадэмічны пейзаж ужо згубіў сваю ўрачыстасць і строгасць. Ён стаў удзелам адных салонных пейзажыстаў. Аднак устойлівасць акадэмічных традыцый тлумачалася яшчэ і тым, што многія беларускія жывапісцы па свайму сацыяльнаму паходжанню належалі да шляхты.

Вострую сацыяльную афарбоўку атрымаў пейзаж у 80-90-х гг. XIX ст. Мастакі часцей пачалі паказваць "неўладкаванасць" жыцця. Найбольш вядомым пейзажыстам таго часу з'яўляецца А.Г. Гараўскі (1833-1900). Яго карціны прасякнуты жыццёвай праўдай, глыбокай народнасцю, услаўляюць прыгажосць роднага краю ("Вечар у Мінскай губерні", "На радзіме", "Балота", "Рака Бярэзіна" і інш.). За карціну "Від у Пскоўскай губерні" атрымаў залаты медаль. У створаных ім партрэтах ("Жанчына ў жоўтым", "Аўтапартрэт", "Партрэт жывапісца Бруні", "Партрэт кампазітара Глінкі", "Жаночы партрэт" і інш.) галоўная ўвага сканцэнтравана не на знешніх аксесуарах і кампазіцыі, а на паказе светаадчування сваіх герояў. Каля 20 работ Гараўскага зпаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі.

У жанры пейзажу працавалі мастакі Ф. Рушчыц, Г. Вейсенгоф, К. Стаброўскі, В. Бялыніцкі-Біруля.

Партрэтны жывапіс прадстаўлялі мастакі Б. Русецкі, А. Ромер, Э. Паўловіч, Р. Слізень, Л. Пігулеўскі і інш. У жанры партрэта працавалі таксама прадстаўнікі іншых відаў і жанраў жывапісу. Напрыклад, шмат цікаййгх партрэтаў стварылі Н. Сілівановіч, пейзажыст А. Гараўскі, майстар бытавой і гістарычнай кампазіцыі К. Альхімовіч. Мастакі імкнуліся перадаць знешнія рысы, псіхалогію свайго героя, іх сацыяльную прыналежнасць, такім чынам стваралі паргрэты-біяграфіі. У гэты час з'явіўся новы вобраз працаўніка.

Значны след амаль ва ўсіх жанрах выяўленчага мастацтва пакінуў А. Ромер (1832-1897). Ён быў мастаком, графікам, скульптарам і мастацтвазнаўцам, стварыў шмат гравюр, партрэтаў (В. Луцкевіча, скульптара Яцунскага, бацькі, маці, жонкі, аўтапартрэт, партрэт сялянскай дзяўчынкі, паўстанца 1863 г.) і кампазіцый, у якіх паказаў жыццё і быт беларускага народа.

Найбольш вядомыя работы Б. Русецкага (1824-1913) "Аўтапартрэт", "Жаночы партрэт", партрэт Навасільцава, Бібікава, Карповіча.

У беларускай графіцы самым прыкметным майстрам быў М. Андрыёлі (1836-1893). У сваіх работах ён адлюстроўваў жыццс і побыт

беларускага і літоўскага народаў, іх гістарычнае мінулае. Найбольш вядомыя яго графічныя творы:

"Смерць Кейстута", "Сутычка ліцвінаў з крыжаносцамі", "Хрышчэнне язычнікаў", "Смерць Людвіка Нарбута каля Дубічаў". М. Андрыёлі – аўтар ілюстрацый да кніг А. Міцкевіча, У. Сыракомлі, Э. Ажэшкі, У. Шэкспіра.

Графік і жывапісец Ф. Дмахоўскі (1858-?) пісаў кампазіцыі на гістарычныя тэмы і пейзажы ("Прысяга князя", "Лясная глуш"). Аўтар серыі малюнкаў гербаў беларускіх гарадоў для "Гербоўніка літоўскага". Вядома яго графічная серыя партрэтаў польскіх каралёў, гістарычных асоб, дзеячаў культуры.

У канцы XIX ст. пашыраецца кола творчых дзеянняў прызнанага мастака В. Бялыніцкага-Бірулі (1872-1957). У 1897 г. яго праца "З ваколіц Пяцігорска" набыта для Траццякоўскай галерэі, а палатно "Вечныя снягі" ў 1901 г. на Каўказскай юбілейнай выстаўцы адзначана залатым Медалём.

На рубяжы стагоддзяў у выяўленчым мастацтве назіраецца розныя стылі: мадэрнізм, неакласіцызм, жывапісны і сацыяльны рэалізм, прымітывізм, рускі авангардызм. Адным з сусветна вядомых мастакоў-авангардыстаў быў М.Шагал (1887-1985). Нарадзіўся ён у г. Лёзна Віцебскай губерні. Займаўся ў Віцебскай мастацкай школе Ю. Пэна, з 1907 г. – у школе М. Рэрыха, другіх мастацкіх школах. З 1910 г. М. Шагал удзельнічаў у розных выставах. у сваёй творчасці мастак імкнуўся перадаць сваё светаўспрыманне, глыбіню псіхікі праз абсалютызацыю свайго творчага "Я".

Адбываліся прыкметныя змены ў архітэктуры Беларусі. Вялікіх поспехаў дасягнула будаўнічая тэхніка, пачалі выкарыстоўвацца новыя будаўнічыя матэрыялы (бетон, жалеза), а таксама шматпралётныя канструкцыі. Галоўнае значэнне набывае грамадзянскае будаўніцтва. Аднак прамысловыя будынкі, чыгуначныя вакзалы, тэатры, шматпавярховыя даходныя дамы яшчэ не мелі сваіх архітэктурна-стылявых традыцый.

Да канца XIX ст. у беларускім дойлідстве панавала эклектыка, спалучэнне разнастайных стылявых элементаў у архітэктурных формах фасадаў і інтэр'ераў: готыкі, барока, класіцызму і псеўдарускага стыляў. Звычайна банкі і вучэбныя ўстановы афармлялі пад класіцызм, тэатры – пад барока, касцёлы – у стылі неаготыкі, праваслаўныя храмы – у візантыйскім, ці псеўдарускім стылі. Прыкладамі выкарыстання псеўдарускага стылю з'яўляецца капліца князёў Паскевічаў у Гомелі (1870-1889), Васкрасенскі сабор у Барысаве (1874, зодчы П. Мяркулаў), цэрквы ў Браславе, Нарачы;

постkласічных формаў – гімназія ў Вілейцы, дом дваранскага сходу ў Слуцку. Для псеўдарускага стылю характэрны традыцыйнае пяцікупалле, высокія шатровыя званіцы, цыбулепадобныя галоўкі, багаты дэкор у выглядзе какошнікаў.

Грамадзянскія будынкі ў гарадах і вёсках ствараліся ў традыцыйным духу беларускай архітэктуры. Будаваліся яны з дрэва. Вокны, ганак, карнізы і франтоны дамоў часта ўпрыгожваліся драўлянай разьбой.

Такім чынам, развіццё культурнага працэсу на Беларусі Ў другой палове XIX – пачатку XX стст. азнаменавалася значнымі поспехамі і дасягненнямі ў розных галінах матэрыяльнай і духоўнай культуры.

## ТЭМА IV.
## БЕЛАРУСЬ НА ПЕРАЛОМЕ ЭПОХ

**Гістарыяграфія, крыніцы.** Першыя навуковыя і публіцыстычныя работы, у якіх аналізаваліся падзеі першай сусветнай вайны, праблемы развіцця беларускага нацыянальнага руху і станаўлення нацыянальнай дзяржаўнасці, належаць удзельнікам беларускага нацыянальна-вызваленчага руху І Я. Варонку, М.В. Доўнар-Запольскаму, К.Б. Езавітаву, Я.С. Канчару, А.І. Луцкевічу, Ф.Ф. Туруку, А.І. Цвікевічу, а таксама ўдзельнікам рэвалюцыйных падзей З.Ф. Жылуновічу, В.Г. Кнорыну, К.І. Ландару, А.Ф. Мяснікову, А.Р. Чарвякову, Р.В. Пікелю і інш. У работах дзеячаў беларускага нацыянальнага руху галоўная ўвага ўдзялялася працэсу нацыянальна-культурнага адраджэння, станаўленню беларускай дзяржаўнасці, дзейнасці Рады БНР, палітыцы Польшчы і Расіі ў адносінах да беларусаў. Сярод іх сваёй прафесійнасцю выдзяляюцца навуковыя працы М.В. Доўнар-Запольскага "Асновы дзяржаўнасці Беларусі" (Мн., 1919); І.Я. Варонкі "Белорусский вопрос к моменту Версальской мирной конфереции. Историко-политическнй очерк" (Мн., 1919); А.І. Цвікевіча "Адраджэнне Беларусі і Польшча" (Мн., 1921); Я.С. Канчара "Белорусскнй вопрос. Сб. статей" (Мн., 1919); Из нсторнн общественных национальных и революционных двнжений белорусов. Часть II. История возникновения и деятельность организаций..." (М., 1918); Ф.Ф. Турука "Белорусское двнжение. Очерк истории национального и революционного движения белорусов" (М., 1921). У сваіх кнігах Ф. Турук, Я. Канчар упершыню прывялі шэраг дакументальных крыніц, якія давалі магчымасць аб'ектыўна ацаніць многія супярэчлівыя пытанні развіцця беларускага нацыянальна-адраджэнскага руху.

Супрацьлеглы падыход утрымліваўся ў работах першых партыйных і дзяржаўных дзеячаў Беларусі. У гэтых працах шмат увагі ўдзялялася рэвалюцыйным падзеям на Беларусі і Заходнім фронце, устанаўленню Савецкай улады ў Беларусі. Адной з першых такіх публікацый з’явіўся зборнік артыкулаў аб падрыхтоўцы і правядзенню Кастрычніцкай рэвалюцыі у Беларусі, напісаны ў 1918 г. М.І. Калмановічам, В.Г. Кнорыным, А.Ф. Мясніковым, В.С. Селязнёвым і інш. "Октябрьские дни и их подготовка в Западной области: Штрихи и воспоминания" (Мн., 1919). У 20-я гады з'явіліся мемуарныя і навукова-даследчыя працы, у якіх былі сінтэзаваны партыйныя ацэнкі і асабістыя ўспаміны. Асаблівую гістарычную вартасць уяўляюць працы А.Р. Чарвякова "За Савецкую Беларусь" (Мн., 1927); З.Ф. Жылуновіча "Два бакі беларускага руху" (Полымя,

1922, № 3/4); "Беларускія секцыі РКП і стварэнне Беларускай Савецкай Рэспублікі" (Полымя, 1928, № 10); В.Г. Кнорына "1917 год в Белоруссии и на Западном фронте"( Мн., 1925) і інш.

Пэўны ўклад у развіццё нацыянальнай канцэпцыі гісторыі Беларусі ўнеслі работы прафесійных гісторыкаў М.К. Любаўскага, У.М. Ігнатоўскага, а таксама зборнік "Беларусь. Нарысы гісторыі эканомікі, культуры і рэвалюцыйнага руху беларусаў" (Мн., 1924). у якім былі змешчаны артыкулы А. Бурбіса, Я.Л. Дылы, З.Ф. Жылуновіча, У.І. Пічэты і інш. На развіццё беларускай гістарычнай навукі ў гэты час значны ўплыў аказвалі гісторыкі-прафесіяналы дасавецкай школы Я.Ф. Карскі, М.В. Доўнар-Запольскі, У.І. Пічэта. Выданні 20-х гадоў стваралі неабходны падмурак, на падставе якога павінны былі разгортвацца далейшыя даследаванні.

З пачатку 30-х гадоў у беларускай гістарыяграфіі асноўная ўвага засяроджвалася на асвятленні дзейнасці бальшавікоў сярод салдат Заходняга фронту, падрыхтоўцы і ўстанаўленні Савецкай улады на Беларусі. Нацыянальны рух быў прадстаўлены як контррэвалюцыйны, таму ўсе гістарычныя публікацыі 20-х гадоў трапілі ў спецсховішчы. Публікацыі па гісторыі Беларусі тычыліся найперш сацыяльна-эканамічнай праблематыкі. Працы С.Х. Агурскага, А.І. Зюзькова, В.Г. Кнорына ўводзілі ў навуковы абарот частку новага фактычнага матэрыялу, але на іх ляжаў адбітак спрошчаных падыходаў і заэдалагізаваных ацэнак. У такіх умовах у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе пад непасрэдным кантролем ЦК КП(б)Б былі напісаны "Тэзісы аб асноўных пытаннях гісторыі БССР" (Ч. І. Мн., 1948) і першы том "Гісторыі Беларускай ССР" (Мн., 1954), апублікаваны работы Н.В. Каменскай "Утварэнне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі" (Мн., 1946);

"Вялікая Кастрычніцкая Сацыялістычная рэвалюцыя і ўтварэнне БССР" (Мн., 1954), С.П. Маргунскага "Создание и упрочение белорусской государственности 1917-1922 гг." (Мн., 1958). У апошніх асноўная ўвага засяроджвалася на асвятленні кастрычніцкіх падзей на Беларусі і дзейнасці бальшавікоў, праводзілася ідэя класавай непрымірымасці да іх палітычных праціўнікаў, замоўчваліся асобныя факты, якія не ўкладваліся ў сталінскую метадалогію гісторыі. Адзначаныя метадалагічныя падыходы праявіліся і ў тагачасных публікацыях крыніц.

У другой палове 1950-1980-х гг. паявіліся больш збалансаваныя канцэпцыі гісторыі дарэвалюцыйнай Беларусі. Але многія беларускія гісторыкі абмежаваліся мінімальнымі, дэкларатыўнымі зменамі ў гістарыяграфіі. Пра гэта сведчаць "Нарысы гісторыі КПБ" (Ч. І. 1961;

2-е выд. 1968), папраўленае выданне 1-га тома "Гісторыі Беларускай ССР" (Мн., 1961), манаграфіі Я. Бугаёва "Узнікненне бальшавіцкіх арганізацый і ўтварэнне Кампартыі Беларусі" (М., 1959); Ц.Е. Саладкова "Барацьба працоўных Беларусі супраць царызму (1907-1917 гг.)" (Мн., 1967); Я.І. Карнейчыка "Беларуская нацыя" (Мн., 1969) і інш. Тым не менш, "хрушчоўская адліга" адкрыла магчымасць з'яўлення асобных публікацый, у якіх былі зроблены спробы навуковай аб'ектыўнай ацэнкі беларускага нацыянальна-культурнага і палітычнага руху, БСГ, Бунда, рэвалюцыйных падзей 1917 года і праблем станаўлення беларускай дзяржаўнасці. Праўда, пры гэтым нярэдка забывалі імёны папярэднікаў (М. Доўнар-Запольскага, Ф. Турука. Я. Канчара). Крыніцазнаўчая аснова гістарыяграфіі ў параўнанні з папярэднімі перыядамі значна павялічылася. Апісальны метад, характэрны для гістарычнай літаратуры 1920-1940-х гадоў, у большай ступені спалучаўся з рознабаковым аналізам гістарычных працэсаў і з'яў. Такі падыход характэрны для 2-га і 3-га тамоў "Гісторыі Беларускай ССР" (Мн., 1972 і 1973), калектыўнай манаграфіі "Эканоміка Беларусі ў эпоху імперыялізму (1900-1917 гг.) (Мн., 1963), манаграфічных прац Л.П. Ліпінскага і Я.П. Лук'янава "Сялянскі рух у Беларусі ў перыяд паміж дзвюма рэвалюцыямі чэрвень 1907-люты 1917 гг." (Мн., 1964); Л.П. Ліпінскага "Сялянскі рух у Беларусі ў (1914-1917 п.)" (Мн., 1978); П.Т. Петрыкава "Рэўкомы Беларусі" (Мн., 1975); Э.М. Савіцкага "Рэвалюцыйны рух у Беларусі (жнівень 1914-люты 1917 гг.)" (Мн., 1984), У.І. Салашэнкі "Бальшавікі ў барацьбе з дробнабуржуазнымі партыямі ў Беларусі (1903 - сакавік 1917)" (Мн., 1981) і інш. Больш увагі гісторыкі сталі надаваць пытанням рэалізацыі нацыянальнай ідэі, што яскрава праявілася ў двухтомнай працы В.А. Круталевіча "Нараджэнне Беларускай Савецкай Рэспублікі" (Мн., 1975, 1979). У працах М.С. Сташкевіча "У абароне ідэй Кастрычніка: з гісторыі ідэйна-палітычнай барацьбы ў Беларусі ў гады грамадзянскай вайны (1919 1920 гг.)" (Мн., 1978); "Прыгавор рэвалюцыі: крушэнне антысавецкага руху ў Беларусі (1917-1925 гг.)" (Мн., 1985) і інш., больш грунтоўна была паказана структура беларускага палітычнага руху пасля Лютаўскай рэвалюцыі, узаемаадносіны бальшавікоў з нацыянальнымі палітычнымі партыямі.

Пад уздзеяннем палітычных падзей другой паловы 80-х гадоў, што зруйнавалі шмат якія старыя ідэалагічныя ўяўленні і метадалагічныя падыходы да гісторыі Беларусі, паяўляюцца работы акадэміка І.М. Ігнаценкі "Лютаўская буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя ў Беларусі" (Мн., 1986);"Кастрычніцкая рэвалюцыя і самавызначэнне Беларусі" (Мн., 1992). У іх аўтар прыйшоў да

высновы аб непарыўнай сувязі сацыяльных і нацыянальных праблем у час развіцця рэвалюцыйных надзей 1917 года, да навуковага вываду аб тым, што Кастрычніцкая рэвалюцыя вырашыла найперш пытанні дэмакратычнага характару. Некаторыя пытанні дзейнасці саветаў, беларускіх нацыянальных палітычных арганізацый, іх ролі ў станаўленні беларускай дзяржаўнасці па-новаму асвятляліся ў манаграфіях П.К. Башко "Саветы рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў Беларусі (сакавік-кастрычнік 1917)" (Мн., 1987); В.У. Скалабана "Белнацком" (Мн., 1989). Новым падыходам у асвятленні гістарычных падзей спрыяла публікацыя ў часопісах і газетах архіўных матэрыялаў, якія раней знаходзіліся ў спецсховішчах, а таксама выданне работ дзеячаў беларускага нацыянальна-вызваленчага руху: І.Я. Варонкі, М.В. Доўнар-Запольскага, Я.С. Канчара, А.І. Луцкевіча, А.І. Цвікевіча. Пашырэнне крыніцазнаўчай базы садзейнічала паяўленню новых калектыўных абагульняючых прац: "Нарысы гісторыі Беларусі" (Мн., 1994-1995. ч. I-II), "Палітычныя партыі Беларусі" (Мн., 1994); манаграфічных работ В.А. Круталевіча "На шляхах нацыянальнага самавызначэння БНР-БССР-РБ" (Мн., 1995); У.Ф. Ладысева, П.І. Брыгадзіна "На пераломе эпох: станаўленне беларускай дзяржаўнасці (1917-1920 гг.)" (Мн., 1999), шэрагу навуковых артыкулаў, апублікаваных у "Беларускім гістарычным часопісе", "Беларускай мінуўшчыне" і "Спадчыне". У іх асвятляліся многія малавядомыя старонкі беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, давалася новае тлумачэнне падзеям і фактам першай сусветнай і грамадзянскай войнаў, беларускай дзяржаўнасці.

Публікацыя крыніц па праблемах нацыянальнай гісторыі перыяду 1914-1920 гадоў праходзіла ў некалькі этапаў. Спачатку асноўнае месца сярод іх належала ўспамінам і мемуарам непасрэдных удзельнікаў рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху. Камісіі па гісторыі Кастрычніцкай рэвалюцыі і партыі ў Віцебску і Гомелі, Гістпарт пры ЦК КП(б)Б падрыхтавалі і выдалі першыя зборнікі артыкулаў, мемуараў і дакументальных матэрыялаў аб рэвалюцыйных падзеях у Беларусі. (Революционная борьба в Гомельской губернии: Ист. материалы. Гомель. 1921, вып. I; Красная быль: Большевики в Витебске. Сб. статей, воспоминаний и материалов. Витебск, 1923; Кастрычнік на Беларусі: зб. артыкулаў і дакументаў, Мн. 1927, вып. I).

Аднымі з першых навуковых і дакументальных крыніц аб складаных і супярэчных працэсах станаўлення беларускай дзяржаўнасці і нацыянальна-вызваленчага руху 20-х гадоў былі працы Я.С. Канчара, Ф.Ф. Турука, К.Б. Езавітава. У іх у якасці дадатку быў

змешчаны разнастайны дакументальны матэрыял, які не страціў сваёй навуковай вартасці і ў наш час.

Падзеі і факты гісторыі Беларусі перыяду 1-й сусветнай вайны знайшлі дакументальнае адлюстраванне ў наступных выданнях: "Крах немецкой оккупации в Белоруссии в 1918 году" (Мн., 1947); "Документы и материалы по истории Белоруссии (1900-1917)" (Т. 3, Мн., 1953); "Документы и материалы по истории Белоруссии" (Т. 4, Мн., 1954); "Революционное движение в Белоруссии (июнь 1907 - февраль 1917)" (Мн., 1987).

У пасляваенны час быў таксама апублікаваны шэраг зборнікаў матэрыялаў і дакументаў, прысвечаных зменам грамадска-палітычных адносін на Беларусі ў 1917 годзе: "В борьбе за Октябрь в Белоруссии и на Западном фронте. Воспоминания активных участников Октябрьской революция" (Мн., 1957). "Великая Октябрьская Социалистическая революция в Белоруссии" (Т. I-II, Мн., 1957) і "Борьба за Советскую власть в Белоруссии, 1918-1920" (Т. I, Мн., 1968. Т. II, Мн., 1971 гг.).

Дакументы і матэрыялы, прысвечаныя абвяшчэнню Беларускай Народнай Рэспублікі і дзейнасці яе Рады, змешчаныя ў зборніку "Октябрь 1917 г. и судьбы политической оппозиции" (Ч. II. Гомель, 1993), а таксама ў публікацыях "Беларускага гістарычнага часопіса" за 1993 і 1997 гады. Важным набыткам археаграфічнай навукі Беларусі была таксама публікацыя матэрыялаў пасяджэнняў 1-га Усебеларускага кангрэса. У 1998 г. у Вільні былі апублікаваны "Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі" (Т. 1. Кн.: I, II. Вільня-Нью-Ёрк-Менск-Прага) ф. № 582 дзяржаўнага архіва Літвы. Апублікаваныя новыя дакументальныя матэрыялы садзейнічаюць аб'ектыўнаму раскрыццю гісторыі станаўлення беларускай дзяржаўнасці, дзейнасці беларускіх палітычных партый і груп рознай палітычнай арыентацыі, іх лідэраў.

ЛЕКЦЫЯ 13

## ПЕРШАЯ СУСВЕТНАЯ ВАЙНА І БЕЛАРУСЬ

- *Ваенныя падзеі на тэрыторыі Беларусі*
- *Беларускі нацыянальны рух напярэдадні Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г.*

**Ваенныя падзеі на гэрыторыі Беларусі.** Агульнавядомыя прычыны, якія прывялі 19 ліпеня 1914 г. (1 жніўня па новаму стылю) да 1-й сусветнай вайны. Гэта барацьба за перадзел ужо падзеленых гэрыторый і "сфер уплыву" паміж асноўнымі дзвюма групоўкамі капіталістычных дзяржаў: Траістага саюза (Германія, Аўстра-Венгрыя, Турцыя, Італія, Балгарыя) і краінамі Антанты (Вялікабрытанія, Францыя і Расія). Пазней да іх далучыліся ЗША і Японія. Вайна з'явілася адлюстраваннем глабальнага крызісу сусветнай цывілізацыі. Паступова ў яе былі ўцягнуты 33 краіны з насельніцтвам 1,5 млрд. чалавек.

Расія ўступіла ў вайну пад лозунгам брацкай салідарнасці з Сербіяй, абароны славянскага насельніцтва ад германскага мілітарызму. Аднак у Расіі былі свае інтарэсы ў Турцыі, Персіі, Галіцыі. Яна імкнулася авалодаць пралівамі Басфор і Дарданелы.

На заходнім чатырохсоткіламетровым фронце супраць Германіі ваявалі ўзброеныя сілы Францыі, Вялікабрытаніі, а затым ЗША. У параўнанні з саюзнікамі Расія валодала ў 3-4 разы меншым ваенна-эканамічным патэнцыялам, аднак утрымлівала націск да 40% узброеных сіл аўстра-германскага блока на фронце працягласцю дзве тысячы кіламетраў ад Балтыкі да Ірана.

Усе маёмасныя класы падтрымалі ўрадавую ваенную палітыку. Праводзіліся маніфестацыі і сходы, наладжваліся царкоўныя маленні, на старонках газет актыўна прапагандаваліся ідэі панславізму і нацыяналізму, прадказвалася блізкая перамога "славянскай зброі". У вырашэнні як унутраных праблем краіны, так і праблем арміі значную ролю сталі адыгрываць грамадскія арганізацыі: Земскі саюз, Саюз гарадоў, ваенна-прамысловыя камітэты. Яны ўзялі на сябе функцыі забеспячэння войскаў узбраеннем, прадуктамі харчавання, лекамі. Фактычна да гэтых арганізацый адышла частка функцый органаў улады. Гэта ўзмацніла палітычныя пазіцыі ліберальных дзеячаў – князя Г.Е. Львова, А.І. Гучкова, А.І. Канавалава, П.М. Мілюкова і іншых, арыентаваных на заходні шлях развіцця грамадства.

Партыі ліберальна-дэмакратычнай апазіцыі (кадэты, акцябрысты і інш.), не кажучы ўжо аб партыях кансерватыўна-ахоўнага на-

прамку, заклікалі насельніцтва да грамадзянскай згоды ў "імя Айчыны". Урадавая палітыка знайшла падтрымку ў большай частцы партый сацыялістычнага кірунку: эсэраў, меншавікоў, бундаўцаў. Неўзабаве, як пачалася вайна, эсэры заходніх губерняў утварылі так званы Ваенна-рэвалюцыйны саюз, які сканцэнтраваў свае намаганні на рабоце ў арганізацыях, што абслугоўвалі фронт. Ён заклікаў устрымацца ад друкавання і распаўсюджвання рэвалюцыйных пракламацый.

Бальшавікі лічылі вайну імперыялістычнай, захопніцкай. Таму заклікалі рабочы клас усіх краін змагацца за паражэнне сваіх урадаў і пераўтварэнне вайны імперыялістычнай у грамадзянскую.

Патрыятычна-шавіністычная хваля захліснула і частку працоўных. Але большасць рабочых, сялян, частка інтэлігенцыі былі супраць палітыкі вайны.

На Беларусі, па сутнасці, антываенную пазіцыю заняла газета "Наша ніва", рэдактарам якой з сакавіка 1914 года быў Я. Купала. На старонках газеты, наколькі гэта дазваляла цэнзура, асвятлялася, што вайна вядзецца не ў інтарэсах народа. Тэме вайны Я. Купала прысвяціў цыкл вершаў пад назвай "Песні вайны". Вялікадзяржаўныя газеты: "Северо-Западная жизнь", "Виленский вестник", "Новое время" і іншыя абвінавачвалі "Нашу ніву" ледзь не ў здрадзе Расіі.

Беларускія губерні яшчэ 18 ліпеня 1914 года былі аб'яўлены на ваенным становішчы. На іх тэрыторыі, як і ў іншых заходніх ускраінах Расіі, блізкіх да тэатра ваенных дзеянняў быў устаноўлены жорсткі ваенна-паліцэйскі рэжым. Забараняліся сходы, маніфестацыі, продаж газет, кніг без дазволу вайсковых уладаў. Асабліва строгія захады рабіліся, каб папярэдзіць забастоўкі на чыгунках. Для гэтага на заходніх чыгунках былі створаны Камітэты надзвычайнай аховы.

У падтрыманні гэтага "парадку" на тэрыторыі заходніх губерняў актыўна ўдзельнічалі рэакцыйныя сілы, што нахлынулі сюды з розных раёнаў Расіі і групаваліся вакол Стаўкі Вярхоўнага галоўнакамандавання, штаба Мінскай ваеннай акругі і штаба Заходняга фронту. Амаль усе населеныя пункты Беларусі былі запоўнены войскамі. У адным толькі Мінску вайскоўцаў і чыноўнікаў ваенных ведамстваў было каля 150 тыс.

Таму з другой паловы 1914 г. назіраўся спад рэвалюцыйна-вызваленчага руху. З лета 1915 г. значная частка Беларусі стала арэнай ваенных дзеянняў. У канцы жніўня пад пагрозай акружэння руская армія пакінула Коўна, Брэст, а 3 верасня – Гродна. У кастрычніку 1915 г. фронт стабілізаваўся па лініі Дзвінск-Паставы-Баранавічы-Пінск. Безвынікова закончылася спроба рускай арміі ў

сакавіку 1916 г., затым у чэрвені-ліпені таго ж года прарваць фронт у раёнах возера Нарач і г. Баранавічы. Руская армія панесла вялікія страты. Толькі ў нарачанскай аперацыі было забіта, паранена і захоплена ў палон звыш 90 тыс. расійскіх салдат і афіцэраў.

Паражэнне на фронце было вынікам тэхніка-эканамічнай адсталасці Расіі, адсутнасці моцнага тылу, гніласці дзяржаўнага апарату. Руская армія была дрэнна забяспечана артылерыяй і снарадамі. Не хапала нават вінтовак і патронаў.

На акупіраванай тэрыторыі, якая складала 1/4 частку Беларусі, дзе да вайны пражывала 2 млн. чалавек быў установлены рэжым рабаўніцтва і гвалту. Насельніцтва павінна было здаць увесь авёс (акрамя насеннага), скуры, воўну, масла і г. д. Была распрацавана шырокая сістэма падаткаў, штрафаў, прымусовых работ, рэквізіцый. Насельніцтва Беларусі ва ўзросце ад 16 да 60 гадоў плаціла падушныя падаткі. Абсталяванне прамысловых прадпрыемстваў, сельскагаспадарчыя прадукты, жывёла, лясныя багацці Белавежскай пушчы, а таксама частка працаздольнага насельніцтва – вывозіліся ў Германію. Нямецкія ўлады планавалі каланізаваць і германізаваць мясцовых жыхароў шляхам перасялення немцаў на захопленыя землі. Пашыралася дзейнасць каталіцкага касцёла, адкрываліся прыватныя нямецкія школы. Захопленая тэрыторыя была ўключа на ў склад ваенна-адміністрацыйнага ўтварэння Обер Ост.

Цяжкае сацыяльна-эканамічнае становішча склалася і на неакупіраванай тэрыторыі Беларусі. Царскі ўрад не здолеў больш-менш арганізавана эвакуіраваць абсталяванне пра мысловых прадпрыемстваў. Усяго з Беларусі было вывезеш ці дэманціравана 432 прамысловыя прадпрыемствы, што склала 1/3 тых, якія працавалі ў 1913 г. Прычым большая частка абсталявання згубілася ў дарозе.

З-за адсутнасці сыравіны, паліва, кваліфікаваных рабочыг многія галіны прамысловасці скарацілі або спынілі сваю вытворчасць. У канцы 1915 г. на Беларусі працавала толькі 139 фабрычна-заводскіх прадпрыемстваў, на якіх было занята 20,5 тыс рабочых (37,7% даваеннай колькасці рабочых буйной прамысловасці). Спынілася больш як 600 прадпрыемстваў дрожджава-вінаробнай і харчовай прамысловасці, амаль усе дрэваапрацоўчыя заводы. Закрыліся або рэзка скарацілі вытворчасць прадпрыемствы будаўнічых матэрыялаў. На пачагак 1917 года аб’ём прамысловай вытворчасці, якая абслугоўвала цывільнае насельніцтва, склаў толькі 15-16% даваеннага. Разам з тым асобныя галіны прамысловасці Беларусі: швейная, абутковая, металаапрацоўчая. хлебапякарна-

сухарная, што выконвалі ваенныя заказы, значна павялічылі выпуск прадукцыі. Напрыклад, колькасць рабочых, занятых у хлебапякарна-сухарнай вытворчасці павялічылася ў 5 разоў, а аб’ём вытворчасці ў 4,7 раза. Было створана нямала часовых буйных прадпрыемстваў і майстэрняў, што абслугоўвалі армію. На вытворчасць боепрыпасаў, транспартных сродкаў і іншага вайсковага рыштунку былі пераключаны ўсе прадпрыемствы металаапрацоўчай прамысловасці. Напрыклад, У Мінску снарады і гранаты выпускалі 5 заводаў, у Гомелі – 3, а таксама Рэчыцкі і Бараньскі (Аршанскага павета) драцяна-цвіковыя заводы. У выніку заказаў ваеннага ведамства на 25-40% павялічыўся аб'ём вытворчасці на Віцебскай ільнопрадзільнай фабрыцы "Дзвіна", Дубровенскай бавоўна-прадзільнай і Магілёўскай панчошнай фабрыках і інш. Практычна ўсе дробныя майстэрні, а таксама саматужнікі выконвалі заказы па пашыву вайсковага адзення, абутку. Было адкрыта шмат новых майстэрняў па рамонту ваеннага абмундзіравання.

У цэлым агульная колькасць прадпрыемстваў цэнзавай прамысловасці ў 1917 г. у параўнанні з 1913 г. на неакупіраванай тэрыторыі Беларусі скарацілася з 829 адзінак да 297 (у 2,8 раза), а рабочых – з 37,7 тыс. да 25,1 тыс., г. зн. прыкладна на 1/3. Рабочы клас прадпрыемстваў цэнзавай прамысловасці папоўніўся мабілізаванымі рабочымі з цэнтральных губерняў Расіі. Толькі ў артылерыйскіх і авіяцыйных парках Гомеля налічвалася каля 10 тыс. такіх рабочых, у артылерыйскіх майстэрнях Мінска і Бабруйска - 3500 рабочых. На прадпрыемствах, што выпускалі прадукцыю для арміі, рабочыя былі пастаўлены пад кантроль ваенных ведамстваў. Працоўны дзень не рэгламентаваўся, а за спыненне працы без дазволу адміністрацыі і вайсковых уладаў рабочых адпраўлялі ў штрафныя роты. Былі адменены выхадныя і святочныя дні. Шырока практыкавалася нізкааплатная праца жанчын, падлеткаў, дзяцей. У пачатку 1917 г. жанчыны, падлеткі і дзеці складалі 58,4% фабрычных рабочых Беларусі.

У яшчэ больш цяжкім стане анынулася сельская і гаспадарка Беларусі. Больш паловы працаздольнага насельніцтва вёскі было мабілізавана ў армію. З Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай губерняў у армію прызвалі 634 400 чалавек. Вясковае насельніцтва прыфрантавой паласы прыцягвалася да вы-канання ваенна-абарончых работ: капанне акопаў, будаўніцтва мастоў, рамонт дарог, ахова вайсковых аб'ектаў і г. д. Велізарныя страты наносілі сялянскім гаспадаркам рэквізіцыі коней, кароў, фуражу, хлеба і іншых прадуктаў харчавання. Так, у Віцебскай губерні пагалоўе буйной рага(241)тай

жывёлы скарацілася на 21,5%. Яшчэ больш скараціліся пасяўныя плошчы Беларусі за гады вайны: пад жыта – на 20,6%, пад пшаніцу – на 23,3%, бульбу – на 37,7%.

Скарачэнне сельскагаспадарчай і прамысловай цывільнай вытворчасці абумовіла рост цэн на прадукты харчавання і асноўныя прамысловыя тавары ў 2-7 разоў. Пагоршылася становішча насельніцтва Беларусі. Рабочыя і сяляне ў хуткім часе пазбавіліся патрыятычных настрояў. Пачынаючы з 1915 г. назіралася нарастанне рабочага руху. Адбылося 12 забастоваі у 6 населеных пунктах, у якіх прынялі ўдзел крыху больш з 300 рабочых. У 1916 г. стачачны рух ахапіў 11 населеныя пунктаў Беларусі, а колькасць забастоўшчыкаў склала 1800 Асноўным патрабаваннем стачачнікаў з'яўлялася павышэнн заработнай платы ў сувязі з пагаршэннем жыцця. Выключэн нем стала толькі выступленне часткі рабочых і служачых Гомельскага чыгуначнага вузла ў красавіку 1915 г., у ходзе якой яны выказалі пратэст супраць звальненняў па палітычных матывах. У параўнанні з Расіяй, дзе колькасць стачачнікаў вырасла ў 1916 г. да 1 млн. чалавек, рабочы рух на Беларусі быг зусім нязначным.

Больш шырокі размах атрымалі сялянскія выступленні. У многіх месцах Беларусі сялянскі рух выліўся ў пачатку вайні ў своеасаблівую форму разгрому мабілізаванымі запасным памешчыцкіх маёнткаў. Па сутнасці, гэта былі стыхійныя пагромы, якія суправаджаліся рабаваннем маёмасці памешчыкаў і гандляроў-яўрэяў у разліку на тое, што іх удзельнікі, як "абаронцы цара і айчыны", не будуць пакараны.

Найбольш масавым сялянскі рух быў у Мінскім, Сенненскім, Мазырскім, Ігуменскім і Рэчыцкім паветах. У той ці іншай ступені гэты рух ахапіў 20 з 35 паветаў Беларусі.

Царскі ўрад жорстка расправіўся з удзельнікамі гэтых выступленняў. У Сенненскім павеце, напрыклад, па прыгавору ваенна-палявога суда 4 чалавекі былі павешаны. У Мазырскім мавеце 13 чалавск таксама былі пакараны смерцю. Многія ўдзельнікі выступленняў трапілі на катаргу і ў арыштанцкія роты.

У сувязі з ростам рэквізіцый і ваенных павіннасцяў антыпамешчыцкія, антываенныя і антыўрадавыя настроі прадаўжалі нарастаць. У 1915 г. адбылося 99 сялянскіх выступленняў, супраць 36 у жніўні – снежні 1914 г., у 1916 г. – усяго 60, у студзені – лютым 1917 г. – толькі 7 (усяго 202 сялянскія выступленні). Уздым руху ў 1915 г. тлумачыцца рэзкім пагаршэннем становішча сялян у сувязі з пераносам баявых дзеянняў на тэрыторыю Беларусі.

Даследаванні сялянскага руху сведчаць, што тут амаль не было выступленняў беднякоў і сераднякоў супраць т. зв. кулакоў, шю ў савецкай літаратуры лічылася адной з перадумоў сацыялістычнай рэвалюцыі. Такіх выступленняў за перыяд вайны зафіксавана толькі 6, прычым у 1916-1917 гг. іх наогул не было.

Буйныя ваенныя паражэнні царскай арміі ў кампаніі 1915 г., няўдачы баявых дзеяпняў у 1916 г., велізарныя людскія, тэрытарыяльныя і матэрыяльныя страты выклікалі незадаволенасць салдат. Расло дэзерцірства. Адзначаліся выпадкі адмовы цэлых часцей і злучэнняў ісці ў наступленне, братанне з немцамі. Узмацнялася антыўрадавая агітацыя сярод салдат з боку ўдзельнікаў рабочага руху, мабілізаваных у армію, бальшавіцкіх агітатараў. У войсках успыхвалі хваляванні, звязаныя з дрэнным забеснячэннем прадуктамі і абмундзіравапнем, недахопам зброі і боепрыпасаў. Усяго на Беларусі ў гады вайны адбыліся 62 значныя хваляванні салдат.

Сярод іх найбуйнейшым было выступленне ў кастрычніку 1916 г. на размеркавальным пункце ў Гомелі. Паўстанне ўспыхнула ў сувязі з арыштам аднаго з казакаў. На яго абарону выступілі каля 4 тыс. салдат і матросаў, якія абяззброілі каравул гаўптвахты і вызвалілі з-пад арышту больш за 800 чалавек, знішчыўшы пры гэтым абвінаваўчыя дакументы. Некалькі рот, верных камандаванню, рассеялі паўстанцаў. Пачаліся павальныя вобыскі і арышты. Аднак 26 кастрычніка каля сотні салдат разагналі паліцэйскі атрад, які займаўся вобыскамі, і ўварваліся на размеркавальны цункт, дзе з дапамогай салдат і матросаў зноў вызвалілі арыштаваных таварышаў.

Царскія ўлады жорстка расправіліся з паўстанцамі. Да суда былі прыцягнуты 16 чалавек, з іх 9 расстралялі, а астатніх адправілі на катаргу і арыштанцкія роты. Але спыніць працэс разлажэння арміі ўжо было немагчыма.

Узмацнялася апазіцыя ўраду ў Дзяржаўнай думе на чале з партыяй кадэтаў. Распаўсюджваліся чуткі аб здрадніцтве ва ўрадзе, у вярхах арміі і нават у царскай сям'і. Выспяваў агульнанацыянальны крызіс.

**Беларускі нацыянальны рух напярэдадні Лютаўскам рэвалюцыі 1917 г.** Вайна значна паўплывала на беларускі нацыянальны рух. У жніўні 1915 г. у сувязі з набліжэннем фронту да Вільні спынілася выданне "Нашай нівы". Частка дзеячаў нацыянальнага адраджэння была мабілізавана ў армію, іншыя эвакуіраваліся з прыфрантавой паласы ў цэнтральыіую Расію. Усе даваенныя беларускія нацыянальна-культурныя арганізацыі распаліся, снынілася выданне беларускамоўных газет і кніг.

У занятай нямецкімі войскамі Вільні засталася невялікая група актыўных беларускіх нацыямальных дзеячаў на чале з брагамі Ангонам і Іванам Луцкевічамі, Алаізай Пашкевіч-Кайрыс (Цёткай), Вацлавам Ластоўскім. Менавіта яны ўвайшлі з беларускага боку ў так званы Віленска-Ковенскі камітэт, створаны з прадстаўнікоў розных нацыянальнасцяў:палякаў, літоўцаў, беларусаў і яўрэяў. Ва ўмовах агульнага адступлення расійскай арміі і гаспадарчага бязладдзя царскія ўлады перадалі камітэту кіраванне горадам. Цікава тое, што губернатар Вяроўкін зацвердзіў гэты камітэт перад эвакуацыяй з Вільні і перадаў яму ўладу. Гэта бадай адзіны гістарычны факт уступства царызму на карысць мясцовага насельніцтва.

У хуткім часе камітэт быў рэарганізаваны, на яго базе стварыліся нацыянальныя народныя камітэты. Дзеячы камітэтаў паставілі мэту – аднавіць незалежнасць Вялікага княства Літоўскага. Гэту ідэю на словах падтрымлівалі акупацыйныя ўлады, масонскія ложы "Беларусь" (уваходзілі А. Луцкевіч, У. Красноўскі і іншыя) і раней утвораная ложа "Літва".

У канцы 1915 г. утварыўся блок беларускіх, літоўскіх, польскіх і яўрэйскіх грамадскіх арганізацый "Канфедэрацыя Вялікага княства Літоўскага". Канфедэрацыя аб'яднала прадстаўнікоў розных нацыянальных рухаў вакол ідэі незалежнасці беларуска-літоўскай дзяржавы. Галоўным пунктам апублікаванай у лютым 1916 г. праграмы канфедэрацыі было ўтварэнне беларуска-літоўскай дзяржавы з сеймам у Вільні. Сейм фарміраваўся на падставе агульных, простых і роўных выбараў і станавіўся гарантам прававой роўнасці ўсіх этнасаў краю. У межы канфедэрацыі ўключаліся Ковенская і Віленская губерні, беларуская і літоўская часткі Гродзенскай і Сувалкскай губерняў, літоўская частка Курляндскай і частка Мінскай губерняў.

Але сама ідэя ўзнаўлення Вялікага княства Літоўскага на той час была ўжо нерэальнай. Яна не знайшла шырокай падтрымкі сярод беларускага і літоўскага насельніцтва, не кажучы ўжо пра іншыя нацыянальнасці. Літоўскія нацыянальныя дзеячы баяліся, што ў супольнай беларуска-літоўскай дзяржаве яны могуць быць падвергнуты асіміляцыі беларускай большасцю. Таму больш клапаціліся аб стварэнні сваёй нацыянальнай дзяржаўнасці, знаходзячы пры гэтым падтрымку з боку нямецкіх ваенных уладаў.

У сваю чаргу польскія памешчыкі і касцёл разгарнулі інтэнсіўную дзейнасць па апалячванню беларусаў, заклікалі да федэрацыі Беларусі і Літвы з Польшчай. Па меры адраджэння Польшчы як самастойнай дзяржавы пераважная частка польскай грамадскасці Беларусі і Літвы паступова перайшла на пазіцыі партыі

польскіх нацыянальных дэмакратаў, выступала за далучэнне беларуска-літоўскага краю да Польшчы.

Аднак у планы германскага ўрада не ўваходзіла стварэнне ні незалежнай беларуска-літоўскай дзяржавы, ні федэрацыя Беларусі і Літвы з Польшчай. Кайзераўская Германія была не супраць замацаваць сваю ўладу на захопленых тэрыторыях. Таму створаныя народныя камітэты выкарыстоўваліся акупацыйнай уладай, якая праводзіла на захопленых землях двурушніцкую палітыку. Палякам і частцы акаталічаных беларусаў абяцалі адраджэнне Польшчы, астатнім – беларусам і літоўцам – разгледзець пытанне аб утварэнні іх дзяржавы. Такая палітыка германскіх акупацыйных уладаў прывяла народныя камітэты да ўнутраных спрэчак, якія закончыліся ў рэшце рэшт распадам канфедэрацыі.

Разбурэнню канфедэрацыі садзейнічалі меры акупацыйных уладаў па прадухіленню паглынання Беларусі Польшчай. Паводле загаду Галоўнакамандуючага ўсходнім германскім фронтам фельдмаршала фон Гіндэнбурга ад 16 студзеня 1916 г. беларуская мова абвяшчалася раўнапраўнай з польскай, літоўскай і яўрэйскай, і мела права ўжытку ў грамадскім, культурным, асветным і адміністрацыйным жыцці.

Трэба адзначыць, што адраджэнне беларускай школьнай справы пачалося раней загаду Гіндэнбурга. Першая беларуская пачатковая школа была адкрыта ў Вільні яшчэ 13 лістапада 1915 г. Па звестках польскага даследчыка Ю. Туронка колькасць беларускіх школ восенню 1916 г. на акупіраванай частцы Беларусі ўзрасла да 50. Пашырэнне беларускай адукацыі сутыкнулася з праблемай недахопу настаўнікаў, нястачай беларускіх школьных падручнікаў. Таму з кастрычніка 1916 г. пачалася падрыхтоўка настаўнікаў у настаўніцкай семінарыі ў Свіслачы Ваўкавыскага павета. Тут атрымалі падрыхтоўку 144 настаўнікі беларускіх школ.

У арганізацыі беларускай школьнай справы значпую ролкл адыграў створаны ў пачатку 1916 г. у Вільні Цэнтральны саюз беларускіх нацыянальных грамадскіх арганізацый. Пад яго кіраўніцтвам было наладжана выданне падручнікаў і школьных дапаможнікаў, адкрываліся школы, выданне газеты "Гоман" ("Homan"), якая друкавалася кірыліцай і лацінкай. Яна пачала выходзіць з 15 лютага 1916 г. два разы на тыдзень пад рэдакцыяй В. Ластоўскага.

Вялікай падзеяй у культурным жыцці бсларусаў на акупіраванай тэрыторыі з'явілася адкрыццё ў чэрвсні 1916 г. у Вільні Беларускага клуба, у рамках якога быў наладжаны аматарскі тэатр. Ён налічваў

60 асобаў і меў сцэну ва ўласным распараджэнні. Акрамя тэагра былі адчыпены беларуская бібліятэка, кнігарня, каапэратыўнае таварыства "Раніца", дзіцячы прытулак "Золак", "Навуковае таварыства", "Беларускі настаўніцкі саюз", якія спрыялі кансалідацыі беларускіх нацыянальных сіл.

Беларускі нацыянальны рух рабіў першыя крокі і пачынаў выходзіць на міжнародную арэну. Беларускі народны камітэт паслаў сваіх прадстаўнікоў у красавіку 1916 г. на міжнародную канферэнцыю народаў Расіі ў Стакгольм, а ў чэрвені таго самага года на III кангрэс нацый у Лазану. Беларуская дэлегацыя на чале з В. Ластоўскім прадставіла ўдзельнікам кангрэса мемарандум, у якім былі сфармуляваны палітычныя патрабаванні беларускага нацыянальнага руху. У выступленні А. Луцкевіча на кангрэсе была выказана ўпэўненасць, што народы Еўропы памогуць забяспечыць Беларусі палітычныя і культурныя правы. У мемарандуме беларускай дэлегацыі ўпершыню абаснавана ідэя "Злучаных штатаў Беларусі, Літвы, Латвіі і Украіны ад Балтыйскага да Чорнага мораў.

Але ўрадам краін Антанты, да якіх звярталіся беларускія дэлегаты, патрэбна была царская Расія, якая і далей працягвала б вайну з Германіяй. Таму яны засталіся глухімі да такіх патрабаванняў.

Пасля распаду "Канфедэрацыі Вялікага княства Літоўскага" група дзеячаў беларускага нацыянальнага руху на чале з рэдактарам "Гомана" В. Ластоўскім стварыла ў чэрвені 1917 г. заканспіраваную арганізацыю "Сувязь незалежнасці і непадзельнасці Беларусі". Гэтая арганізацыя была не толькі супраць краёвай аўтаноміі ў складзе Расіі альбо Польшчы, але лічыла непрымальнай і федэрацыю з Літвой. Яна паставіла сваёй галоўнай мэтай "стварэнне незалежнай Беларусі ў яе этнаграфічных межах" і выступала за вольную дэмакратычную рэспубліку Беларусь. Гаворка ішла ўжо пра ўсе беларускія землі – і акупіраваныя немцамі і падуладныя Расіі.

У той самы час назіраецца далейшае дыстанцыраванне кіраўніцтва літоўскага нацыянальнага руху не толькі ад беларускага, але польскага і яўрэйскага. З дапамогай германскіх акупацыйных уладаў яны стварылі ў верасні 1917 г. Літоўскую раду (Тарыбу) як вярхоўны орган Літвы. |

У такіх умовах дзеячы беларускага руху выступілі за незалежную Беларусь і зрабілі стаўку на нямецкую акупацыйную ўладу. Аб гэтым сведчылі рашэнні канферэнцыі прадстаўнікоў беларускага нацыянальнага руху ў студзені 1918 года. У ходзе яе насуперак Літоўскай тарыбе была створана Віленская беларуская рада на чале з А.

Луцкевічам. Віленская рада ўзяла курс на парыванне сувязяў з Расіяй і стварэнне самастойнай дзяржаўнасці.

У канцы 1916-пачатку 1917 гг. на тэрыторыі Беларусі, якая ўваходзіла ў сферу дзейнасці расійскіх войскаў, пачынаюць дзейнічаць розныя нацыянальныя арганізацыі, у асноўным культурна-асветніцкія. Прыкладам у справе актывізацыі нацыянальнай дзейнасці ў гэты перыяд становіцца Мінск, у якім маладая беларуская інтэлігснцыя аб'ядноўвалася ў таварыствы, клубы, гурткі, каб паспрабаваць заявіць аб сабе. Асноўнымі цэнтрамі такіх аб'яднанняў інтэлігенцыі і моладзі тады былі "беларускія хаткі". Звычайна па суботах у іх адбываліся доўгія і змястоўныя вечарыны. На іх абмяркоўваліся палітычныя пытанні, разбіраліся і асэнсоўваліся беларускія нацыянальныя справы, арганізоўваліся спектаклі і іншыя культурна-асветныя мерапрыемствы.

Беларускіх пісьменнікаў, паэтаў і мастакоў, публіцыстаў і іншых культурных дзеячаў у Мінску аб'яднала "Беларуская хатка", створаная па ініцыятыве мінскага аддзела "Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны". У яе рабоце таксама, як і ў працы таварыства, прымалі актыўны ўдзел тэатральныя дзеячы У. Галубок, У. Фальскі, вучоны А. Смольскі, архітэктар Л. Дубяйкоўскі, літаратары Ядвігін Ш. (А. Лявіцкі), Зм. Бядуля, а таксама пазней вядомыя дзеячы беларускага нацыянальнага руху: Я. Лёсік, Ф. Шантыр, З. Верас (Л. Сівіцкая) і іншыя. Шматлікія культурна-асветніцкія мерапрыемствы былі прысвечаны актуальным праблемам грамадска-палітычнага жыцця беларускага народа. Актыўны ўдзел у працы мінскага аддзела Таварыства і ў "Беларускай хатцы" прымаў М. Багдановіч.

Сусветная вайна пашырыла фронт барацьбы нацыянальных сіл Беларусі супраць самадзяржаўя. У гэты час спрабавалі заявіць аб сваёй палітычнай ролі на Беларусі некаторыя прадпрымальніцкія гандлёва-прамысловыя колы беларусаў. У канцы 1916 г. у Мінску пад кіраўніцтвам ініцыятыўнай групы палітычных дзеячаў, у якую ўваходзілі Р. Скірмунт, П. Аляксюк, В. Чавусаў і некаторыя іншыя, была разгорнута праца па стварэнню партыі беларускіх народных сацыялістаў (ПБНС). Сярод беларускіх ксяндзоў намецілася тэндэнцыя да стварэння беларускай партыі на аснове хрысціянскай маралі.

Пашыралася дзейнасць беларускага нацыянальнага руху сярод бежанцаў, асноўная маса якіх асела ў цэнтральных губернях Расіі і Паволжы. Паводле афіцыйных звестак камітэта вялікай княжны Таццяны Мікалаеўны па аказанню дапамогі пацярпелым ад ваенных дзеянняў колькасць бежанцаў з 5 заходніх губерняў складала 1130042 чалавек. Асноўная маса бежанцаў была з Гродзенскай губерні – 750

680 чал. Цэнтрамі беларускага нацыянальнага руху сталі Масква, Петраград, Казань, Тамбоў, Саратаў, Калуга, Самара і іншыя гарады, дзе бежанцы-беларусы ўтварылі свае суполкі і згуртаванні. У кастрычніку 1916 г. Міністэрства ўнутраных спраў Расіі дазволіла выданне ў Петраградзе беларускіх газет "Дзянніца" і "Светач" ("Swietač"), якія выдаваліся пад рэдакцыяй адпаведна З. Жылуновіча і Э. Будзькі. Газета "Светач", якая выдавалася рэлігійна-клерыкальнымі дзеячамі, была разлічана на беларусаў у асноўным каталіцкага вераызнання, прапагандавала ідэі адзінства беларусаў незалежна ад іх сацыяльнай прыналежнасці, заклікала да ажыццяўлення "беларускага нацыянальнага ідэалу". У пачатку 1917 г. яе выданне было спынена.

Газету "Дзянніца" выдаваў на свае сродкі З. Жылуновіч. Яна адлюстроўвала рэвалюцыйна-дэмакратычны характар беларускага нацыянальнага руху, інфармавала пра дзейнасць беларускіх таварыстваў у Петраградзе і Казані па аказанню Дапамогі пацярпелым ад вайны, паслядоўна выступала за развіццё беларускай культуры і друку. На яе старонках друкаваліся творы З. Жылуновіча (пад псеўданімам Акцуб А.Б.), К. Буйло, А. Паўловіча, Х. Чарнышэвіча, Ф. Шантыра і іншых беларускіх нацыянальных дзеячаў, якія стаялі на рэвалюцыйна-дэмакратычных пазіцыях.

Нацыянальна-рэвалюцыйны накірунак газеты выклікаў незадаволенасць царскай цэнзуры. Таму цэнзары выкідвалі з яе ўсе матэрыялы аб становішчы ў Беларусі і абвінавачвалі газету ў тым, што нібыта служыла інтарэсам Германіі. З-за фінансавых цяжкасцяў і цэнзурных забарон выданне газеты было спынена ў снежні 1916 г. на сёмым нумары.

Далейшы якасна новы этап развіцця беларускага нацыянальна-вызваленчага руху звязаны з Лютаўскай рэвалюцыяй 1917 года.

ЛЕКЦЫЯ 14

## ПАДЗЕІ ЛЮТАЎСКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ Ў БЕЛАРУСІ

- *Падзенне ўлады расійскага царызму*
- *Альтэрнатывы грамадска-палітычнага развіцця*
- *Уздым беларускага нацыянальнага руху*

**Падзенне ўлады расійскага царызму.** Лютаўская рэвалюцыя падвяла рысу пад шматвяковай гісторыяй расійскай манархіі і адкрыла шлях да дэмакратычнага развіцця Расіі. Царская манархія пала настолькі раптоўна, што да сучаснага моманту падзеі таго часу многія гісторыкі разглядаюць як нейкі феномен. У замежнай гістарычнай літаратуры доўгі час пераважала канцэпцыя стыхійнасці лютаўскіх падзей. Савецкія гісторыкі проціпастаўлялі ёй канцэпцыю "вядучай ролі бальшавіцкай партыі." У сучаснай расійскай гістарыяграфіі набывае папулярнасць канцэпцыя ліберальна-масонскага загавору.

Бясспрэчна, лютаўскія падзеі "выраслі" з вайны. Незадаволенасць рабочых, сялян, салдат, даведзеных да крайняй галечы вайной, гаспадарчай разрухай, голадам, - усё гэта вылілася ў масавыя выступленні супраць царызму.

Пачатак рэвалюцыі паклалі масавыя забастоўкі, мітынгі і дэманстрацыі рабочых 23 лютага 1917 г. у Петраградзе. 25 лютага да рабочых сталі далучацца іншыя слаі гарадскога насельніцтва, і рух стаў набываць характар усеагульнай стачкі. Спробы ўладаў перайсці 26 лютага (нядзеля) да актыўных дзеянняў і прымяніць сілы саслужыла дрэнную службу. У панядзелак 27 лютага ў развіцці падзей наступіў рашаючы пералом. Салдаты раскватараваных у Петраградзе запасных батальёнаў гвардзейскіх палкоў сталі пераходзіць на бок мітынгаваўшых рабочых. Баявыя дружыны з рабочых і салдат захапілі 27 лютага Галоўны арсенал, тэлеграф, вакзалы, вызвалілі з турмаў палітычных зняволеных. Рэвалюцыя ў Петраградзе перамагла. 2 сакавіка імператар Мікалай II падпісаў адрачэнне ад прастола. Манархія ў Расіі перастала існаваць, бо сістэма царскай улады прыйшла ў супярэчнасць з грамадскім развіццём Расіі. Краіну ахапіў палітычны, эканамічны і нацыянальны крызіс. Гэта і было галоўнай прычынай хуткай і адносна лёгкай перамогі рэвалюцыі.

27 лютага па ініцыятыве некаторых членаў Саюза рабочых кааператываў Пецярбурга, сацыял-дэмакратычнай фракцыі Дзяржаўнай думы створаны Савет рабочых дэпутатаў (па ўзору 1905 г.). У Савет выбіралі па аднаму дэлегату ад тысячы рабочых, па аднаму – ад роты

салдат. У хуткім часе прыбыло прыкладна 250 дэлегатаў. Вечарам 27 лютага было адкрыта пасяджэнне ў Таўрычаскім дварцы.

Большасць у Выканкаме Савета, які ўзначаліў меншавік Чхеідзе, і ў самім Савеце належала меншавікам і эсэрам. Гэта адбылося не таму, што бальшавікі, як яны пазней тлумачылі, недаацанілі значэнне пытання аб уладзе і "затрымаліся" ў вулічнай барацьбе. Галоўная прычына была ў іншым. Рэвалюцыя ўскалыхнула дзесяткі тысяч людзей з розных сацыяльных слаёў. У тых умовах петраградскія бальшавікі, колькасць якіх складала ўсяго 2 тыс. чалавек (па ўсей краіне 24-25 тыс.), разлічваць на значную падтрымку не маглі.

З першых дзён Савет, перайменаваны хутка ў Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў, імкнуўся рэалізаваць уладныя функцыі. Асобнае значэнне набыў загад № 1. Ён прадугледжваў ва ўсіх вайсковых частях арганізацыю салдацкіх камітэтаў з устанаўленнем кантролю над зброяй, падпарадкаванне салдат у палітычных выступленнях толькі Савету, а афіцэрам толькі ў службовых абставінах і шэраг іншых. Загад садзейнічаў дэмакратызацыі арміі, але зніжаў баяздольнасць.

Кіраўніцтва Савета лічыла, што легітымная ўлада можа сфарміравацца толькі пад эгідай Дзяржаўнай думы, і стрымлівала імкненне дэпутатаў узяць на сябе ўладныя функцыі. 2 сакавіка Часовы камітэт Дзяржаўнай думы на чале з лідэрам акцябрыстаў М. Радзянкам, утвораны яшчэ 27 лютага, на аснове пагаднення з кіраўніцтвам Петраградскага савета ўтварыў Часовы ўрад на чале з князем Г. Львовым. У яго склад увайшлі, у асноўным, прадстаўнікі кадэтаў і акцябрыстаў. Выключэннем стаў сацыяліст А. Керанскі, які заняў цасаду міністра юстыцыі і адначасова з'яўляўся намеснікам старшыні Петраградскага савета. Быў абвешчаны курс на дэмакратызацыю краіны.

Такім чынам, галоўны вынік Лютаўскай рэвалюцыі – падзенне царскай манархіі. Аднак рашэнне многіх жыццёва важных для краіны праблем, у тым ліку выбару цывілізаванага шляху развіцця, яшчэ патрэбна было знайсці.

Звесткі аб падзеях у Петраградзе паступілі ў Беларусь 28 лютага. А больш дакладную інфармацыю з газеты "Известия Петроградского Совета" атрымалі 1 сакавіка ў Віцебску і Мінску. У гарадах Беларусі прайшлі мітынгі і дэманстрацыі ў падтрымку рэвалюцыі. Ноччу з 1 на 2 сакавіка на нарадзе бальшавікоў Мінска, на якой прысутнічалі М. Фрунзе, В. Кнорын, К. Ландар, С. Магілёўскі і іншыя, было вырашана мабілізаваць усе сілы, каб падтрымаць рабочых і салдат Піцера. Баявыя дружыны рабочых вызвалілі 2 сакавіка з турмы 400 палітычных зняволеных. Былі арыштаваны камандуючы Заходнім

фронтам генерал А. Эверт, начальнік штаба, камендант горада. Створаная 4 сакавіка міліцыя, якую ўзначаліў М. Фрунзе, раззброіла паліцыю і жандармерыю, узяла пад ахову ўрадавыя ўстановы, пошту і тэлеграф. На Беларусі ўстанаўлівалася новая ўлада і сістэма кіравання.

Асаблівая ўвага прадстаўнікоў партый – сацыялістаў-рэвалюцыянераў і сацыял-дэмакратаў была звернута на ўтварэнне Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў па прыкладу Петраграда. Выбары ў Саветы адбываліся амаль адначасова на ўсіх прадпрыемствах Мінска, Гомеля, Віцебска, Оршы, Полацка, Баранавіч і іншых гарадоў. У Мінску ўжо 2 сакавіка праводзіліся сходы рабочых, на якіх выбіраліся прадстаўнікі ў Савет. 4 сакавіка паводле рэзалюцыі служачых Заходнефрантавога камітэта Усерасійскага земскага саюза пачаў дзейнічаць Мінскі савет рабочых дэпутатаў. Старшынёй вы-канкама Мінскага савета быў абраны меншавік Б. Позерн, а яго намеснікам – бальшавік У. Любімаў. З 5 сакавіка Мінскі савет пачаў выдаваць свой друкаваны орган "Весці Мінскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Савет прыняў пастанову аб выбранні салдацкіх фабрычна-заводскіх, сялянскіх камітэтаў, стварэнні прафесійных саюзаў, паліткл убаў. У мэтах аб'яднання сіл пралетарыяту з рэвалюцыйнай арміяй 10 сакавіка быў створаны адзіны Мінскі савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў і адзіны выканаўчы камітэт.

6 сакавіка быў створаны Гомельскі савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў, 8 сакавіка Віцебскі савет рабочых дэпутатаў. Неўзабаве Савет рабочых і Савет салдацкіх дэпутатаў аб'ядналіся, аформіўся адзіны Віцебскі савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў.

Стаўка Вярхоўнага Галоўнакамандуючага ў Магілёве рабіла ўсё, каб не дапусціць дэмакратычных пераўтварэнняў у горадзе і выбрання Саветаў. Аднак ужо 6 сакавіка быў створаны часовы камітэт салдацкіх дэпутатаў, у які ўвайшлі таксама афіцэры, а 7 сакавіка – Савет рабочых дэпутатаў. 22 сакавіка яны аб'ядналіся ў адзіны Савет. Паралельна з Саветам у Магілёве функцыянаваў Сход салдацкіх і афіцэрскіх прадстаўнікоў, які складаўся з манархістаў. Апошнія распаўсюджвалі звесткі, што хутка дынастыя Рама-навых будзе адноўлена ў правах, а ўсе ўдзельнікі рэвалюцыі будуць пакараны смерцю.

У першай палове сакавіка Саветы былі створаны ў Барысаве, Полацку, Оршы, Бабруйску, Рэчыцы, Слуцку і іншых гарадах. На працягу сакавіка-чэрвеня Саветы рабочых дэпутатаў або рабочыя секцыі пры Саветах розных найменняў арганізаваліся ў 57 населеных

пунктах Беларусі, Саветы салдацкіх дэпутатаў – у 59. Адначасова пачаліся выбары салдацкіх камітэтаў. Яны павінны былі садзейнічаць павышэнню палітычнай і культурнай адукацыі салдат, дэмакратызацыі армейскага жыцця. Наогул, уплыў войска на палітычнае жыццё Беларусі пасля Лютаўскай рэвалюцыі быў вельмі значны.

Асноўную задачу Саветы бачылі ў арганізацыі рабочых, сялян і салдат, у абароне іх сацыяльна-эканамічных інтарэсаў і палітычных правоў. Яны актыўна ўдзельнічалі ў стварэнні народнай міліцыі, прафсаюзаў, рабочых, салдацкіх, сялянскіх камітэтаў. Усе Саветы рабочых і салдацкіх дэпутатаў на Беларусі ўзначальвалі эсэры і меншавікі; сялянскія арганізацыі, за выключэннем Выканкама Савета сялянскіх дэпутатаў Мінскай і Віленскай губерняў – эсэры. Прафсаюзамі кіравалі пераважна меншавікі і бундаўцы. У салдацкіх камітэтах, асабліва ў палкавых, верхаводзілі эсэры і меншавікі. Усе Саветы Беларусі прызналі кіруючую ролю Петраградскага савета рабочых і салдацкіх дэпутагаў, а таксама Часовы ўрад і яго органы на месцах. На практыцы Саветы фактычна падпарадкоўваліся органам Часовага ўрада, дапамагалі ствараць такія органы на месцах і дэлегіравалі ў іх сваіх прадстаўнікоў.

У сакавіку на месцах склалася сістэма органаў улады і кіравання Часовага ўрада. Вечарам 3 сакавіка ў Мінску на нарадзе гласных гарадской думы, прадстаўнікоў Земскага саюза і Саюза гарадоў, губернскага і павятовага земстваў, праваслаўнага, каталіцкага і іудзейскага духавенства быў абраны грамадзянскі камендант горада, старшыня губернскай земскай управы кадэт Б. Самойленка і сфарміраваны Часовы грамадскі камітэт парадку. 6 сакавіка Часовы ўрад зацвердзіў Б. Самойленку мінскім губернскім камісарам, гарадскога галаву Б. Хржанстоўскага мінскім гарадскім камісарам. У Віленскай, Віцебскай і Магілёўскай губернях былі зацверджаны губернскія камісары, да якіх пераходзілі функцыі губернатараў, у паветах – павятовыя камісары. Была таксама скасаваная пасада земскіх начальнікаў; іх адміністрацыйныя функцыі перадаваліся павятовым камісарам, а судовыя – часовым суддзям.

**Альтэрнатывы грамадска-палітычнага развіцця.** Пасля Лютаўскай рэвалюцыі фактычна склаліся два лагеры буржуазна-памешчыцкі, які быў супраць радыкальных сацыяльна-эканамічных пераўтварэшіяў, і рэвалюцыйна-дэмакратычны, які адстойваў інтарэсы незаможных і маламаёмасных слаёў насельніцтва.

Палітычны працэс на Беларусі меў свае асаблівасці. Пачынаючы з сакавіка 1917 г., тут адбываўся інтэнсіўны працэс утварэння беларускіх нацыянальных партый. Акрамя іх, актыўна дзейнічалі

губернскія арганізацыі агульнарасійскіх партый кадэтаў, сацыялістаў-рэвалюцыянераў, меншавікоў, бундаўцаў, народных сацыялістаў, анархістаў і інш. Адзіных кіруючых і нават каардынуючых цэнтраў, акрамя бальшавікоў, бундаўцаў і эсэраў, гэтыя партыі не мелі. Палітыку Часовага ўрада на Беларусі актыўна праводзілі арганізацыі партыі кадэтаў, якая пасля Лютаўскай рэвалюцыі фактычна стала кіруючай. З мая па восень 1917 г. колькасць арганізацый кадэтаў на Беларусі павялічылася з 7 да 30. Яны дзейнічалі ў Мінску, Віцебску, Магілёве, а таксама ў 18 навятовых гарадах і 10 населеных пунктах. У жніўні 1917 г. на Беларусі і Заходнім фронце кадэты былі аб'яднаны ў адзіную арганізацыю, якой кіраваў краявы цэнтр.

Састаўнымі часткамі праграмы кадэтаў былі ліквідацыя двоеўладдзя, скліканне пасля вайны Устаноўчага сходу, які павінен прыняць канстытуцыю, вырашыць пытанне аб дзяржаўным ладзе і правесці неабходныя рэформы. Кадэты не змаглі схіліць на свой бок салдат і абапіраліся ў асноўным на Саюз афіцэраў. Галоўнай перашкодай на шляху дэмакратыі кадэты лічылі Саветы рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў. Палітычная эвалюцыя партыі прывяла яе да прыняцця ідэі моцнай улады, ваеннай дыктатуры. Кадэты лічылі беларусаў адгалінаваннем рускага народа, выступалі за культурна-нацыянальнае самавызначэнне ўсіх народаў Расіі, за адмену ўсіх абмежаванняў у правах налякаў, яўрэяў і іншых нацыянальнасцяў, за поўную свабоду ўжывання нацыянальных моў і развіццё нацыянальных культур.

Кадэтаў падтрымлівалі эсэры і меншавікі, якія складалі левы спектр палітычных сіл Беларусі. Эсэры пасля звяржэння царызму схілілі на свой бок частку рабочых, вялікую колькасць сялян і салдат. Гэтаму спрыяла іх аграрная праграма. У канцы сакавіка 1917 г. у Мінску быў створаны арганізацыйны камітэт, які ў далейшым быў пераўтвораны ў губернскі камітэт партыі эсэраў. Найбольш моцны ўплыў эсэраў адчуваўся ў Магілёўскай губерні. Значныя пазіцыі мелі эсэры і ў войску. Эсэраўскія арганізацыі аб'ядноўвалі звыш 30 тыс. салдат – у асноўным выхадцаў з сялянства.

Партыя эсэраў лічыла неабходным "устанаўленне дэмакратычнай рэспублікі з шырокай аўтаноміяй абласцей і абшчын, як гарадскіх, так і сельскіх". Пры гэтым эсэры дапускалі федэрацыю толькі ў адносінах паміж некаторымі нацыянальнасцямі, прызнавалі за імі права на самавызначэнне. III з'езд партыі эсэраў у маі 1917 г. Выказаўся за "нацыянальна-персанальную аўтаномію" для нацыянальных меншасцяў абласцей Расіі са змешаным характарам насельніцтва,

фактычна гэтыя палажэнні не выходзілі за праграмныя ўстаноўкі кадэтаў у нацыянальным пытанні.

Меншавікі, як і бундаўцы, першапачаткова ўваходзілі ў склад аб'яднаных сацыял-дэмакратычных арганізацый. Аднак пасля VII Усерасійскай канферэнцыі РСДРП(б) (красавік 1917 г.) пачаўся працэс размежавання бальшавікоў з меншавікамі і бундаўцамі. У маі 1917 г. аформіўся Паўночна-Заходні абласны камітэт Бунда, які размяшчаўся ў Мінску. Колькасць арганізацый Бунда хутка расла і ўжо восенню 1917 г. дасягнула 30 тыс. членаў. Па ўсіх асноўных пытаннях меншавікі і бундаўцы фактычна падтрымлівалі ўнутраную і знешнюю палітыку Часовага ўрада. Вырашэнне сацыяльна-эканамічных пытанняў, у тым ліку аграрнага, адкладвалі да склікання Устаноўчага сходу.

У Беларусі меншавікі вялі актыўную барацьбу супраць "сепаратызму" нацыянальнага руху. У адрозненне ад меншавікоў Бунд у нацыянальным пытанні адстойваў праграму нацыянальна-персанальнай аўтаноміі для яўрэяў, свабоды культурна-нацыянальнага развіцця іншых нацый.

Уплыў бальшавікоў у параўнанні з іншымі партыямі першапачаткова на Беларусі быў нязначным. Малалікія бальшавіцкія групы ўваходзілі ў склад аб'яднаных сацыял-дэмакратычных арганізацый. У практычнай дзейнасці бальшавікі Беларусі зыходзілі з ленінскай стратэгіі перарастання рэвалюцыі ў сацыялістычную, з апорай на пралетарыят і незаможных сялян. Пры падтрымцы рэвалюцыйных сіл Саветаў і Заходняга фронту бальшавікі ў красавіку 1917 г дамагліся склікання I з'езда ваенных і рабочых дэпутатаў армій і тылу Заходняга фронту, дзе рашуча выступілі супраць "абаронцаў і згоднікаў", правялі рашэнне не выбіраць у Франтавы камітэт кадэтаў.

Жаданне мець большасць у Саветах прыводзіла бальшавікоў да супрацьстаяння з іншымі сацыялістычнымі партыямі, у першую чаргу з меншавікамі і бундаўцамі. У канцы сакавіка з "аб'яднанкі" выйшлі бальшавікі Гомеля, а ў красавіку выбралі Палескі камітэт РСДРП(б). У чэрвені 1917 г. стварылі свой камітэт бальшавікі Мінска (старшыня А.Ф. Мяснікоў). Самастойныя бальшавіцкія арганізацыі пачалі дзейнічаць у Віцебску, Полацку, Оршы, Бабруйску, Слуцку і іншых гарадах. У жніўні 1917 г. узнікла ідэя аб'яднаць бальшавіцкія сілы Беларусі ў адзіную арганізацыю. Карнілаўскі мяцеж адцягнуў працэс аб'яднання. Першая Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РСДРП(б) 15-18 верасня 1917 г. завяршыла афармленне партыйнай арганізацыі бальшавікоў Беларусі, абрала яе камітэт на чале з А.

Мясніковым. Дэлегаты канферэнцыі прадстаўлялі ўжо 9190 членаў партыі і спачуваючых.

У нацыянальным пытанні бальшавікі зыходзілі з лозунга права нацый на самавызначэнне, аўтаноміі нацыянальных абласцей, якія захочуць застацца ў складзе агульнай дэмакратычнай дзяржавы. Аднак вырашэнне нацыянальнага пытання, што было падкрэслена на VII канферэнцыі РСДРП(б), ставілася ў залежнасць ад інтарэсаў грамадскага развіцця і класавай барацьбы пралетарыяту за сацыялізм. Прычым толькі з чэрвеня 1917 г. праграма партыі бальшавікоў у нацыянальным пытанні была дапоўнена тэзісам аб федэратыўным прынцыпе пабудовы многанацыянальнай дзяржавы.

Такім чынам, бальшавікі Беларусі, як і цалкам у краіне, знаходзіліся на крайнім левым флангу рэвалюцыйна-дэмакратычных сіл, заставаліся адзінай партыяй, якая не пагадзілася супрацоўнічаць з Часовым урадам.

18 красавіка міністр замежных спраў кадэт П. Мілюкоў дапусціў палітычны пралік: звярнуўся да саюзнікаў з заявай, што Расія будзе прадаўжаць вайну да пераможнага канца. У адказ 100-тысячная дэманстрацыя салдат і рабочых Петраграда прайшла пад бальшавіцкімі лозунгамі "Далоў вайну!", "Далоў міністраў-капіталістаў!"

У выніку красавіцкага крызісу быў утвораны першы кааліцыйны Часовы урад з 16 міністраў – 6 з якіх з'яўляліся прадстаўнікамі сацыялістычных партый. Пасаду ваеннага міністра заняў эсэр А. Керанскі. Апублікаваная гэтым урадам праграма аб'яўляла далейшую дэмакратызацыю краіны, барацьбу з гаспадарчай разрухай, падрыхтоўку радыкальнай аграрнай рэформы і імкненне да грамадзянскага міру.

Для рэалізацыі гэтай нраграмы Часоваму ўраду была неабходна палітычная стабільнасць. Практычна ўсе партыі, акрамя бальшавікоў, падтрымалі ідэю кааліцыі. У Беларусі бальшавікі разгарнулі работу па стварэнню прафсаюзаў, фабрычна-заводскіх камітэтаў. Да ліпеня працэс арганізацыі прафсаюзаў завяршыўся. Паводле звестак Усерасійскага з'езда прафсаюзаў у ліпені 1917 г. на Беларусі было створана 126 прафесійных саюзаў, якія аб'ядноўвалі ў сваіх шэрагах 36 тыс. рабочых. (Гэта без чыгуначнікаў і прафсаюза Заходняга фронту. Прафсаюз "Тэхнабуд" Заходняга фронту налічваў каля 60 тыс. чалавек, а камітэт аб'яднаных рабочых Усерасійскага земскага саюза – каля 45 тыс. чалавек). Створаныя фабрычна-заводскія камітэты змагаліся з сабатажніцтвам прадпрымальнікаў, адшуквалі сыравіну, паліва, фінансы, устанаўлівалі рабочы кантроль за вытворчасцю. Па ініцыятыве фабзаўкамаў на працягу красавіка-чэрвеня было разгледжана каля 100 канфліктаў паміж рабочымі і

прадпрымальнікамі, большасць якіх было вы-рашына на карысць рабочых.

Як вынік незадаволенасці палітыкай Часовага ўрада нзіралася ўзмацненне рабочага руху. Праведзеныя ў маі – чэрвені 1917 г. перавыбары Саветаў рабочых дэпутатаў паказалі далейшы рост уплыву бальшавікоў. У новым складзе Мінскага савета была створана іх самастойная фракцыя, у прэзідыуме Савета бальшавікам належала 4 месцы з 5. Пры абмеркаванні важнейшых эканамічных і палітычных пытанняў бальшавікоў падтрымлівала большасць дэпутатаў (ад 160 да 195 з 265). Павялічылася фракцыя ў Гомельскім савеце, якая складалася з 30 дэпутатаў. Была створана фракцыя бальшавікоў і ў Віцебскім савеце.

Аднак у той час палітыку бальшавікоў падтрымлівалі толькі рабочыя буйных прамысловых прадпрыемстваў і чыгуначнікі. Большая частка рабочых, асабліва на дробных і кустарных прадпрыемствах, давярала Часоваму ўраду.

Асаблівая ўвага палітычных партый надавалася агітацыйнай працы сярод салдат Заходняга фронту. У арміях было створана 7289 камітэтаў розных ступеняў: ротных, батальённых, палкавых, дывізіённых, карпусных і армейскіх, праз якія салдацкія масы ўцягваліся ў актыўнае палітычнае жыццё. У гэтыя камітэты ўваходзіла больш 55 тыс. салдат. Важную ролю ў арганізацыі салдацкіх мас адыграў першы з'езд ваенных і рабочых дэпутатаў армій і тылу Заходняга фронту 7-17 красавіка 1917 г. На з'ездзе разгарнулася барацьба паміж бальшавікамі Бадаевым, Ногіным, Фрунзе, Мясніковым, Селязнёвым, Любімавым, Фаліным і старшынёй IV Дзяржаўнай думы акцябрыстам Радзянка, кадэтамі Масленікавым, Шчэпкіным, Родзічавым, меншавікамі Чхеідзе, Цэрэтэлі і Скобелевым.

З'езд па асноўных пытаннях прыняў рашэнне аб падтрымцы Часовага ўрада і прадаўжэнні вайны. У той самы час пад уплывам менавіта бальшавікоў з'езд выказаўся за 8-гадзінны рабочы дзень, за неадкладную арганізацыю Саветаў сялянскіх дэпутатаў, правядзенне рэвалюцыйных пераўтварэнняў на сяле, далейшае ўмацаванне салдацкіх камітэтаў.

Вострая барацьба паміж эсэрамі і бальшавікамі разгарнулася за ўплыў на сялянскія масы. 22 сакавіка па ініцыятыве бальшавікоў Мінскага савета была склікана нарада сялянскіх дэпутатаў, а 20 красавіка адбыўся першы з'езд сялянскіх дэпутатаў Мінскай і Віленскай губерняў. Большая частка дэлегатаў ішла за эсэрамі і спадзявалася на ажыццяўленне праграмы сацыялізацыі зямлі. Аднак дэлегаты выказаліся супраць таго, каб адкласці вырашэнне гэтага

пытання да Устаноўчага сходу. З'езд выказаўся таксама за ліквідацыю прыватнай уласнасці на зямлю, дэмакратызацыю сялянскіх камітэтаў і за папаўненне іх прадстаўнікамі сялянства. Сялянскія дэлегаты пад уплывам эсэраў не паставілі пытанне аб праве беларускага народа на самавызначэнне.

У красавіку-маі прайшлі сялянскія з'езды і ў іншых беларускіх губернях. Да лета 1917 г. ва ўсіх уездах і валасцях Беларусі дзейнічалі Саветы сялянскіх дэпутатаў.

Як бачна, партыі эсэраў, меншавікоў, народных сацыялістаў, бундаўцаў, якія ў той час падтрымлівала большасць народных мас, ухіляліся ад канкрэтных дзеянняў па задавальненню рэвалюцыйна-дэмакратычных патрабаванняў. Разыходжанне выклікала размежаванне ў грамадстве. Да супрацоўніцтва на падставе ўзаемных кампрамісаў яно не было падрыхтавана.

Новая хваля рэвалюцыйнага руху ў чэрвені з'явілася адказам народа на падрыхтоўку Часовым урадам летняга наступлення на фронце. Выконваючы пастанову Мінскага савета, адзінаццаць палкоў 2-й арміі, 2-гі каўказскі корпус, шэраг палкоў 10-га армейскага корпуса, 724-ты полк 181-й дывізіі 3-й арміі адмовіліся выконваць загад аб наступленні.

Наступленне рускіх войскаў на Паўднёва-Заходнім фронце закончылася няўдачай. На працягу 10 дзён было забіта і паранена каля 60 тыс. салдат і афіцэраў. Цяжкія страты панеслі і арміі Заходняга фронту. Толькі адна 10-я армія страціла дзесяткі тысяч чалавек. Міністры-кадэты 2 ліпеня выйшлі з Часовага ўрада, імкнучыся перакласці на сваіх былых партнёраў – меншавікоў і эсэраў – адказнасць за крызіс, які яшчэ працягваўся, і правал наступлення на фронце. У час дэманстрацыі 3-4 ліпеня ў Петраградзе супраць маніфестантаў Часовым урадам была ўжыта зброя. Больш за 400 чалавек было забіта і паранена.

Ліпеньскі палітычны крызіс быў больш глыбокі ў параўнанні з папярэднімі і азначаў канец двоеўладдзя. Ён сведчыў, што падстаў для прымірэння не было. Нават тое, што 8 ліпеня старшынёй Часовага ўрада стаў эсэр А. Керанскі, а ЦВК Саветаў аб'явіў Часовы ўрад "урадам выратавання рэвалюцыі", не азначала змены ў палітычным жыцці краіны.

Пасля ліпеньскіх падзей у Петраградзе, пачалося наступленне правых і ў Беларусі. Праводзіліся арышты бальшавікоў, рэвалюцыйна настроеных салдат. Толькі ў мінскай турме на гаўптвахтах і спецыяльна прыстасаваных памяшканнях утрымлівалася халя 3 тыс. зняволеных. Ганенням падвергліся прафсаюзы. Над дзейнасцю

Саветаў сялянскіх дэпутатаў быў устаноўлены кантроль павятовых органаў Часовага ўрада. Выступленні сялян супраць памешчыкаў падаўляліся ваеннай сілай. Аднак рэвалюцыйныя сілы не былі разгромлены. Яны толькі адступілі, пачалі перагрупоўку для новага наступу. Аб гэтым сведчылі і выбары ў гарадскія думы, якія адбыліся ў другой палове ліпеня ў гарадах Беларусі. Партыя кадэтаў пацярпела паражэнне. У Віцебску за іх галасавала каля 6%, у Мінску – 3%, у Гомелі – паўпрацэнта выбаршчыкаў. Трохі ўмацавалі свае пазіцыі бальшавікі. За іх спіс галасавалі ў Віцебску – звыш 16%, у Гомелі і Мінску – па 5%. Выбары сведчылі, што эсэры, меншавікі, бундаўцы і іншыя рэвалюцыйна-дэмакратычныя арганізацыі мелі найбольшы поспех у масах.

У Ленін пасля ліпеньскіх падзей стаў сцвярджаць, што Саветы капітулявалі перад Часовым урадам і ператварыліся ў яго бяссільны прыдатак. Таму настойваў на зняцці лозунга "Уся ўлада Саветам!" Гэта азначала заклік да падрыхтоўкі ўзброенага паўстання і захопу ўлады. Аднак VI з'езд РСДРП(б) (26 ліпеня - 3 жніўня 1917 г.) фактычна ўхіліўся ад гэтага патрабавання, прыняўшы не зусім акрэсленую рэзалюцыю з заклікам рыхтавацца да класавых баёў, што набліжаліся.

Кадэты пасля ліпеньскіх падзей зрабілі стаўку на ўстанаўленне ў краіне ваеннай дыктатуры і далі згоду ўвайсці ў склад другога буржуазнага кааліцыйнага ўрада, які быў аб'яўлены 24 ліпеня. А. Керанскі па-ранейшаму імкнуўся праводзіць цэнтрысцкую палітыку Ў абставінах паглыбленнага крызісу і нарастаючай палярызацыі грамадскіх сіл.

Аднак фінансава-прамысловыя кругі, прадстаўнікі дваранства, афіцэраў выйсце з крызісу бачылі ў саюзе антысацыялістычных сіл і ўсталяванні моцнай дыктатуры. Гэта яскрава выявілася на Дзяржаўнай нарадзе ў Маскве 12 жніўня. У сваёй прамове А. Керанскі заклікаў да адзінства, да прымірэння грамадскіх сіл і палітычных партый. Вярхоўны галоўнакамандуючы Л. Карнілаў дакладна выклаў праграму дзеянняў контррэвалюцыі: падпарадкаванне яму войскаў, якія знаходзіліся ў тыле, распаўсюджванне смяротнага пакарання, увядзенне ваеннага становішча на ваенных заводах, чыгунцы. Большасць удзельнікаў нарады, у тым ліку лідэры меншавікоў і эсэраў, пагадзіліся з гэтай праграмай.

Пасля Дзяржаўнай нарады правыя кругі адчулі сябе больш ўпэўнена. Першапачаткова А. Керанскі пагадзіўся са зместам Запіскі Карнілава і 17 жніўня нават даў даручэнне падрыхтаваі^ь

адпаведныя законапраекты. У Стаўку 23 жніўня прыбыў камісар Часовага ўрада Б. Савінкаў, які ўдзельнічаў у выпрацоўцы многіх палажэнняў гэтай Запіскі і імкнуўся спалучыць "чырвоны сцяг Керанскага" і "моцную руку Карнілава". 24 жніўня Л. Карнілаў аддаў загад 3-му коннаму корпусу генерала Крымава рухацца на Петраград. Аднак 26 жніўня А. Керанскі адмежаваўся ад Карнілава, аддаў загад аб змяшчэнні яго з пасады галоўнакамандуючага і арышце ўдзельнікаў змовы. Керанскі разумеў, што выступленне Карнілава – спроба не толькі задушыць рэвалюцыйны рух, пакончыць з бальшавізмам, але ў першую чаргу захапіць уладу і стаць на чале ўрада. Аднак Часовы ўрад і УЦВК не маглі даць эффектыўны адпор карнілаўшчыне.

Цэнтральную ролю адыгралі бальшавікі. Правядзенне агітацыі ў войску і блакіраванне чыгуначных шляхоў аказалася дастатковым, каб паралізаваць войска генерала Крымава. У Беларусі на аснове Выканкама Заходняга фронту быў створаны Часовы рэвалюцыйны камітэт Заходняга фронту, у які ўвайшлі прадстаўнікі Франтавога камітэта, выканкамаў Мінскага савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў і Савета сялянскіх дэпутатаў, гарадской думы. Старшынёй камітэта быў прызначаны эсэр А. Кажэўнікаў, намеснікам старшыні бальшавік К. Ландар. Для аператыўнага кіраўніцтва быу створаны штаб рэвалюцыйных сіл на чале з М. Фрунзе. Былі зроблены захады, каб не даць магчымасці Карнілаву выкарыстаць войскі Заходняга фронту, парушыць сувязь карнілаўскіх войскаў са Стаўкай у Магілёве. На ўсе вузла-выя станцыі Мінскай ваеннай акругі, у першую чаргу Оршу Віцебск, былі накіраваны ўпаўнаважаныя камісара Заходня-га фронту меншавіка У. Жданава з правам кантролю за перамяшчэннем войскаў. Толькі на лініі Гомель - Жлобін было затрымана 30 воінскіх эшалонаў. Рэдкія спробы агітацыі за Карнілава не мелі істотных вынікаў. Не далі вынікаў яго меры, каб зняць блакаду з Магілёва. 1 верасня ў Магілёве былі арыштаваны Л. Карнілаў і іншыя генералы Стаўкі.

Палітычныя сілы, якія баяліся паглыблення рэвалюцыі і анархіі, склікалі 14 верасня Дэмакратычную нараду, у якой прынялі ўдзел і прадстаўнікі беларускіх нацыянальных партый. Большасць дэлегатаў нарады выказалася за кааліцыю з кадэтамі і стварэнне трэцяга Часовага ўрада. Каб папярэдзіць магчымы раскол сярод яе ўдзельнікаў, меншавіцка-эсэраўскія лідэры ЦВК дамагліся прыняцця рашэння аб арганізацыі "Дэмакратычнага савета", г. зн. дарадчага органа пры Часовым урадзе з прадстаўнікоў "рэвалюцыйнай дэма-

кратыі", які павінен быў дзейнічаць да адкрыцця Устаноўчага сходу, і згарнулі работу нарады.

Калі надзеі на ўтварэнне на Дэмакратычнай нарадзе новай улады не здзейсніліся, бальшавікі прапанавалі склікаць ІІ Усерасійскі з'езд Саветаў, які і павінен быў вырашыць пытанне аб уладзе. Дэмакратычны савет быў вымушаны падтрымаць гэтую прапанову. ЦВК вызначыў дату яго адкрыцця – 20 кастрычніка. 25 верасня быў сфарміраваны трэці кааліцыйны ўрад пад старшынствам Керанскага, які запэўніў саюзнікаў, што будзе працягваць вайну.

Аднак урад Керанскага, як і кансерватыўныя кругі, не ўлічваў, што з часу Лютаўскай рэвалюцыі адбылася прыкметная змена ў расстаноўцы сацыяльна-палітычных сіл, У тым ліку і ў рэвалюцыйна-дэмакратычным лагеры. Рэзка аслаблі пазіцыі галоўнай сілы буржуазна-ліберальнага лагера – партыі кадэтаў. За прадстаўнікоў кадэтаў ва Устаноўчы сход У 3-х беларускіх акругах галасавала толькі 1,8% выбаршчыкаў. Нежаданне меншавікоў і эсэраў выйсці з блока з кадэтамі вымусіла бальшавікоў умацаваць саюз з левымі плынямі дэмакратыі. Так, бальшавікі Беларусі ў практычнай рабоце падтрымлівалі левых эсэраў і левыя плыні ў беларускім нацыянальным руху.

У кастрычніку 1917 г. у Паўночна-Заходняй абласной арганізацыі эсэраў склалася даволі буйная фракцыя левых эсэраў (эсэраў-інтэрнацыяналістаў). Да іх перайшла значная і актыўная частка эсэраўскай арганізацыі. Адбылося далейшае ўмацаванне пазіцый бальшавіцкіх арганізацый Беларусі. На другой Паўночна-Заходняй абласной канферэнцыі РСДРП(б) 5 кастрычніка яе дэлегаты прадстаўлялі 28 591 членаў партыі і 27 856 спачуваючых. Пераважную большасць складалі салдаты Заходняга фронту.

Ва ўмовах паглыблення сістэмнага крызісу, што ахапіў многанацыянальную Расійскую дзяржаву, дзе выступленні рабочых і сялян дасягнулі свайго апагея. Рэвалюцыйныя выступленні ў асноўным насілі палітычны характар. Рабочыя арыштоўвалі і адхілялі ад кіравання заводскую адміністрацыю. Так, у верасні былі арыштаваны ўладальнікі лесапільных заводаў у Мазырскім павеце і Заслаўі, якія адмовіліся ўвесці рабочы кантроль. Рабочыя Беларусі актыўна падтрымалі верасноўскую ўсерасійскую забастоўку чыгуначнікаў. Першымі выступілі рабочыя Мінскага вузла, затым да іх далучыліся чыгуначнікі Віцебска, Оршы, Магілёва, Жлобіна, Гомеля. Часовы ўрад быў кымушаны пайсці на ўступкі рабочым. Баставалі рабочыя гарбарных, вінакурных заводаў, механічных майстэрняў у Мінску, тытунёвай фабрыкі ў Віцебску.

Барацьба сялян за зямлю восенню 1917 г. набыла шырокі характар і вострыя формы. Сяляне захоплівалі зямлю, палілі маенткі. Калі ў жніўні было разгромлена 38 памешчыцкіх двароў, то ў верасні ўжо 67. У спецыяльна выдадзенай адозве галоўнакамандуючага Заходняга фронту генерала П. Балуева ад 8 кастрычніка 1917 г. Насельніцтва Беларусі папярэджвалася, што антыўрадавыя выступленні будуць падаўляцца "самымі рашучымі мерамі, з прымяненнем зброі". Нягледзячы на гэта, сялянскі рух у кастрычніку ахапіў 40 паветаў Беларусі. У Мазырскі і Слуцкі паветы супраць сялян бышi накіраваны войскі. Гэта выклікала рост недаверу сялян да ўлады.

Да рэвалюцыйнага руху Беларусі далучаліся выступленні салдат Заходняга фронту, узмацнілася братанне сярод рускіх і нямецкіх салдат. Шырокі рэзананс атрымала выступленне салдат Гомельскага размеркавальнага пункта ў верасні 1917 г., калі прыкладна 9 тыс. салдат рашылі правесці дэманстрацыю пад лозунгам "Далоў вайну!". Пасля забароны ўладамі дэманстрацыі, салдаты правялі мітынг, адмовіліся ехаць на фронт, а ў прынятай рэзалюцыі патрабавалі міру. Інтэнсіўна праходзіў працэс бальшавізацыі арміі. У кастрычніку на Заходнім фронце дзейнічала 170 бальшавіцкіх партыйных арганізацый.

Такім чынам, Часовы ўрад, які працягваў вайну, не жадаў ахвяраваць памешчыцкім землеўладанпем, не праводзіў карэнных змен у грамадска-палітычным жыцці, канчаткова пазбавіўся падтрымкі сялянства, салдат і рабочых, значнай часткі нацыянальнай інтэлігенцыі. Рэфармісцкі шлях развіцця Расіі стаў немагчымым. Кадэцкая правасацыялістычная кааліцыя вычарпала сябе і страціла былы аўтарытэт. Самымі ўплывовымі сталі партыі бальшавікоў, сацыялістаў-рэвалюцыянераў, меншавікоў. Склалася рэальная магчымасць стварэння дэмакратычнай, аднароднасацыялістычнай улады. Але супраць выступілі правыя меншавікі і эсэры. У такіх абставінах бальшавікі сталі на шлях падрыхтоўкі ўзброенага паўстання.

**Уздым беларускага нацыянальнага руху.** Пасля іiадзення самаўладдзя беларускі нацыянальны рух уступіў у якасна новы этап развіцця. Адмена Часовым урадам 3 сакавіка нацыянальных, саслоўных і рэлігійных абмежаванняў дала магчымасць арганізавацца беларускім грамадска-палітычным партыям, розным па сваёй сацыяльна-класавай сутнасці і палітычнай арыентацыі. З сакавіка па лістапад 1917 г. на Беларусі і сярод бежанцаў-беларусаў дзейнічала каля 26 палітычных партый і арганізацый. У іх ліку 14 беларускіх нацыянальных партый, якія з пэўнай доляй умоўнасці можна

падзяліць на кансерватыўна-клерыкальныя, ліберальна-дэмакратычныя, рэвалюцыйна-дэмакратычныя і сацыялістычныя накірункі.

Кансерватыўныя, памешчыцка-клерыкальныя партыі і арганізацыі – Беларускі саюз зямельных уласнікаў, Саюз беларускага праваслаўнага духавенства, Заходне-Рускае таварыства ў Петраградзе з'яўляліся выразнікамі інтарэсаў буйных і сярэдніх землеўласнікаў, праваслаўнага духавенства і вышэйшага чыноўніцтва. Асновай ідэалогіі гэтага тыпу арганізацый быў так званы "заходнерусізм", паводле якога беларусы лічыліся не самастойным этнасам, а адгалінаваннем рускага народа.

Партыі ліберальна-дэмакратычнага накірунку – Беларускі народны саюз, Магілёўскі беларускі нацыянальны камітэт, Гомельскі саюз беларускай дэмакратыі, Віцебскі саюз беларускага народа, Аршанскі беларускі народны камітэт, Беларуская партыя народных сацыялістаў, Беларуская хрысціянская дэ-макратыя, Беларуская партыя аўтанамістаў – адлюстроўвалі інтарэсы галоўным чынам заможных слаёў беларускага грамадства, духавенства, чыноўніцтва, сярэдняй і дробнай буржуазіі і беларускай інтэлігенцыі. Іх нацыянальныя праграмы вызначаліся супярэчлівасцю і непаслядоўнасцю, зыходзілі з ідэі адміністрацыйна-гаспадарчай самастойнасці ў межах Расійскай дзяржавы і ідэалогіі "заходнерусізму". Вырашэнне аграрнага пытання яны адкладвалі да Устаноўчага сходу.

Больш дэмакратычных поглядаў у нацыянальным пытанні прытрымлівалася БХД, заснавальнікамі якой былі беларускія ксяндзы Ф. Абрантовіч, А. Станкевіч, В. Гадлеўскі, К. Сваяк (К. Стаповіч) і інш. У рэзалюцыі першага з'езда БХД (май 1917 г.) вылучалася патрабаванне "шырокай аўтаноміі Беларусі ў складзе Расійскай дэмакратычнай рэспублікі", навучанне ў школах на беларускай мове і паступовы пераход на беларускую мову ў набажэнствах.

Такое ж палажэнне змяшчаў праект праграмы БПНС, у склад якой уваходзіла група памешчыкаў на чале з дэпутатам Дзяржаўнай думы Р. Скірмунтам. У ім патрабавалася аб'явіць Расію федэратыўнай дэмакратычнай рэспублікай, у якой Беларусь павінна мець статус аўтаноміі.

Больш паслядоўна праблема будучага дзяржаўнага ўладкавання краю была распрацавана ў праграмных дакументах Беларускай партыі аўтанамістаў, арганізацыі якой узніклі вясной 1917 г. у Петраградзе, Маскве, Мінску і іншых гарадах. У зацверджаным у верасні на канферэнцыі праекце платформы беларускіх аўтанамістаў вылучалася патрабаванне права на нацыянальнае, культурнае і

палітычнае самавызначэнне Беларусі, але з захаваннем федэратыўнага саюза з Расіяй.

Патрабаванне аўтаноміі Беларусі ў складзе Федэратыўнай Расійскай Рэспублікі было цэнтральным і ў праграме найбольш уплывовай беларускай партыі – Беларускай сацыялістычнай грамады (БСГ), якая аднавіла сваю дзейнасць адразу пасля падзення самаўладдзя. У першай палове 1917 г. арганізацыі гэтай партыі дзейнічалі ў Мінску, Віцебску, Гомелі, Слуцку, Оршы, Буда-Кашалёве, сярод бежанцаў-беларусаў у Петраградзе, Маскве, Казані, Саратаве, Яраслаўлі і Адэсе. У ліпені ў яе шэрагах налічвалася каля 5 тыс. членаў і спачуваючых. а ў кастрычніку колькасць іх узрасла да 10 тыс. Палітычны курс БСГ адлюстроўваў інтарэсы пераважна сярэдніх слаёў, якія былі зацікаўлены ў ажыццяўленні дэмакра-тычных пераўтварэнняў, але асцерагаліся рэвалюцыйнай ломкі грамадскіх адносін. Так, канферэнцыя БСГ у сакавіку 1917 г. выступіла ў падтрымку Часовага ўрада, заклікаўшы працоўны народ аказваць на яго "арганізаваны націск". Япа салідарызавалася з лозунгам "рэвалюцыйнага абароніцтва", выставіла патрабаванне аўтаноміі Беларусі ў складзе Федэратыўнай Расійскай Рэспублікі.

У аграрным пытанні канферэнцыя выказалася за агульнанародную ўласнасць на зямлю і перадачу яе сялянам для карыстання ў адпаведнасці з працоўнай нормай. Аднак канчатковае вырашэнне пытання канферэнцыя адносіла да кампетэнцыі краёвага сейма аўтаноммай Беларусі і перасцерагала сялян ад неарганізаваных стыхійных выступленняў. У рабочым пытанні выстаўлялася патрабаванне 8-гадзіннага рабочага дня і гарантаванага мінімуму заработнай платы.

Як бачна, праграмныя патрабаванні БСГ асобным радыкалізмам не вызначаліся. Аднак пад уздзеяннем абвастрэння сацыяльна-класавых супярэчнасцей у грамадстве яе праграмныя патрабаванні набывалі ўсё больш сацыялістычную афарбоўку. Да восені БСГ пашырыла свой уплыў не толькі сярод беларускай інтэлігенцыі, служачых, але сярод беларускіх сялян і рабочых. Мясцовыя арганізацыі БСГ праводзілі мітынгі, распаўсюджвалі адозвы, выступалі ў друку з прапагандай партыйнай праграмы. У красавіку-чэрвені яна выдавала газету "Грамада". БСГ мела сваіх прадстаўнікоў у Петраградскім (З. Жылуновіч, П. Бадунова) і Мінскім саветах рабочых і салдацкіх дэпутагаў, гарадскіх думах, удзельнічала ў рабоце Савета нацыянальных сацыялістычных партый народаў Расіі.

Чарговая канферэнцыя БСГ. якая адбылася ў Петраградзе 4-6 чэрвеня 1917 г., разгледзела і ўхваліла праект новай праграмы,

абвясціла канчатковай мэтай партыі "ўвядзенне сацыялістычнага парадку цераз развіццё класавай барацьбы і сацыяльную рэвалюцыю".

Праект праграмы прадугледжваў неадкладную забарону куплі-продажу зямлі, канфіскацыю ўсёй зямлі, пераход яе ў распараджэнне Беларускай краёвай рады і размеркаванне паміж сялянамі праз органы мясцовага самакіравання для бясплатнага карыстання ў адпаведнасці з працоўнай нормай. У якасці пераходу да калектыўных формаў гаспадарання прапаноўвалася арганізацыя і развіццё розных формаў кааперацыі.

У праекце праграмы дэкларавалiся дэмакратычныя правы і свабоды грамадзян, паўтараліся ранейшыя ўстаноўкі БСГ аб нацыянальна-тэрытарыяльнай аўтаноміі, развіцці беларускай мовы, культуры і інш. У склад Часовага ЦК БСГ былі вбраны: ад Петраградскай арганізацыі БСГ П. Бадунова, З. Жылуновіч, І. Варонка, К. Душэўскі, Э. Будзька, ад Мінскай – А. Смоліч, У. Ігнатоўскі (Яраслаўль), Я. Колас (Перм). А. Бурбіс (Масква), Р. Астроўскі (Слуцк). М. Мялешка (Віцебск). У склад Прэзідыума БСГ увайшлі З. Жылуновіч (старшыня), П. Бадунова, К. Душэўскі, Барысёнак, Лузгін – галоўным чынам дзеячы левага крыла БСГ.

Актывізавала сваю дзейнасць Беларуская народная грамада (БНГ), якую заснавалі ў маі 1917 г. у Маскве сярод бежанцаў-беларусаў адвакат А.І. Цвікевіч, археолаг Я.І. Васілевіч і выкладчык гімназіі Ф.Ф. Турук. Да лета 1917 г. яна налічвала ў сваіх радах каля 1 тыс. чалавек і аб'ядноўвала прадстаўнікоў розных сацыяльных груп грамадства, мела аддзелы ў іншых гарадах, дзе пражывалі бежанцы-беларусы. У аснову палітычнай платформы БНГ было пакладзена патрабаванне аўтаноміі Беларусі ў складзе Расіі, перадача ўсёй зямлі ў агульнанародную ўласнасць з правам карыстання тым, хто на ёй працуе.

Важнае значэнне ў развіцці беларускага нацыянальнага руху мела стварэнне яго каардынацыйных органаў. Па ініцыятыве Беларускага таварыства (перайменаваны Мінскі аддзел Беларускага камітэта дапамогі пацярпелым ад вайны) 25-27 сакавіка ў Мінску быў скліканы з'езд беларускіх нацыянальных партый і арганізацый, бежанскіх камітэтаў, камітэтаў дапамогі ахвярам вайны ў колькасці да 150 чалавек. У парадак дня з'езда былі вынесены: бягучы момант, адносіны да расійскіх і нацыянальных сацыялістычных партый і арганізацыйныя пытанні. Большасць выступленняў была пранікнута ідэяй грамадзянскага прымірэння ўсіх класаў і сацыяльных слаёў.

Прадстаўнік Часовага ўрада эсэр І. Метлін, які заявіў аб несвоечасовым вырашэнні нацыянальнага пытання, і што беларускі нацыянальны рух не падтрымліваюць народныя масы, быў вымушаны пакінуць з'езд. У прынятых пастановах з'езд вітаў Лютаўскую рэвалюцыю, якая наблізіла волю народа і аўтаномію Беларусі, абавязваўся падтрымліваць Часовы ўрад. Быў абраны Беларускі нацыянальны камітэт (БНК) у складзе 18 чалавек, дзесяць з якіх з'яўляліся прадстаўнікамі БСГ.

Абранне старшынёй БНК Р. Скірмунта, а яго намеснікам адваката П. Алексюка (абодва прадстаўнікі БПНС) мела розныя водгукі ў беларускім нацыянальным руху. Напрыклад, вядомы беларускі нацыянальны дзеяч К. Кастравіцкі склаў паўнамоцтвы старшыні прэзідыума з'езда пасля абрання Р. Скірмунта ў прэзідыум з'езда.

Асноўнай задачай БНК абвясціў культурна-нацыянальнае адраджэнне беларускага народа. Яго канкрэтная праграма прадугледжвала федэратыўна-дэмакратычную рэспубліку ў Расіі, а ў яе складзе – аўтаномію Беларусі. Адносна вайны БНК падтрымаў Часовы ўрад, а вырашэнне зямельнага пытання адклаў да Устаноўчага сходу. Па двух найбольш злабадзённых праблемах БНК фактычна не падтрымаў беларускае сялянства.

Не мела станоўчага выніку наведванне Часовага ўрада дэлегацыяй БНК, якая перадала міністру-старшыні Часовага ўрада кн. Львову дакладную запіску з пераказам рэзалюцын з'езда. Дэлегатаў прынялі міністр народнай асветы А. Мануйлаў, таварыш міністра ўнутраных спраў Лявонцеў. Аднак канкрэтныя прапановы дэлегацыі не знайшлі падтрымкі ва ўрадавых колах. У маі БНК стаў выдаваць газету "Вольная Беларусь". Левая частка БНК, галоўным чынам прадстаўнікі БСГ, настойвалі на спалучэнні ў яго дзейнасці палітычнай і нацыянальна-культурнай працы з праграмай сацыяльна-культурных пераўтварэнняў.

Рознагалоссі паміж Р. Скірмунтам і яго прыхільнікамі і прадстаўнікамі левай плыні БСГ (З. Жылуновіч і А. Бурбіс), прывялі да скасавання БНК у час другога з'езда прадстаўнікоў беларускіх партый і арганізацый, што праходзіў з 8 па 10 ліпеня 1917 года ў Мінску. Большасць дэлегатаў падтрымала ідэю ажыццяўлення нацыянальна-тэрытарыяльнай аўтаноміі Беларусі ў складзе Расійскай дзяржавы. Аднак практычных мер па яе рэалізацыі з'езд не выпрацаваў. У склад створанай замест БНК Цэнтральнай рады беларускіх арганізацый увайшлі ў асноўным прадстаўнікі БСГ. Пад націскам прадстаўнікоў рэвалюцыйна-дэмакратычнага кірунку Рада заявіла, што будзе

дабівацца перадачы зямлі працоўнаму народу і абараняць інтарэсы рабочага класа.

У рабоце першай сесіі Рады, якая адбылася ў Мінску 5-6 жніўня 1917 г., удзельнічалі з правам рашаючага голасу прадстаўнікі 23 беларускіх арганізацый. У іх радах налічвалася звыш 23 тыс. чалавек. Згодна з прынятым сесіяй Статутам Рада складалася з дэпутатаў, што дэлегіраваліся ўсімі беларускімі арганізацыямі, гарадамі, паветамі, мястэчкамі, бежанскімі арганізацыямі і воінскімі часцямі, якія "прызнаюць патрэбу аўтаноміі Беларусі, роднай мовы і развіцця беларускай нацыянальнай культуры".

У новых умовах кіраўніцтва Цэнтральнай рады (Я. Лёсік – старшыня, А. Смоліч, У. Фальскі, В. Лявіцкі, У. Галубок – члены Выканкама Рады) актывізавала сваю дзейнасць па стварэнню нацыянальнага беларускага фронту на аснове рэалізацыі ідэі нацыянальна-культурнай аўтаноміі ў рамках дэмакратычнай Расіі. Цэнтральная рада звязваецца з бежанскімі камітэтамі, раскіданымі па ўсёй Расіі, умацоўваюцца яе сувязі з беларускімі гурткамі ў арміі і на флоце, у якіх хутка расце колькасць прыхільнікаў БСГ і беларускага нацыянальнага руху наогул.

Перабудову цэнтральных органаў беларускага нацыянальнага руху, якая праходзіла летам 1917 г., можна разглядаць як пэўны крок у напрамку да яго далейшай класавай дыферэнцыяцыі. Прадстаўнікі левай плыні ўсё больш схіляліся ў бок бальшавікоў. Але некаторыя аспекты нацыянальнага пытання, якія абараняў З. Жылуновіч, адрозніваліся ад бальшавіцкіх. У прыватнасці, ён выступаў супраць забыцця беларускімі пралетарыямі свайго нацыянальнага пачуцця на карысць агульнарэвалюцыйных інтарэсаў.

Ідэю нацыянальна-тэрытарыяльнай аўтаноміі Беларусі адстойвала дэлегацыя Цэнтральнай рады ў складзе І. Варонкі (старшыня), З. Жылуновіча, К. Душэўскага, І. Мамонькі, З. Сабалеўскага, У. Фальскага на Дэмакратычнай нарадзе ў Петраградзе. Яны адзначалі нежаданне "расійскай дэмакратыі" прадаставіць народам сапраўдную свабоду. Характарызуючы пазіцыю Рады ў адносінах да ўлады, І. Варонка зазначыў, што "Цэнтральная рада беларускіх арганізацый стаіць за канструяванне ўлады без усялякіх кааліцый з буржуазіяй".

Рост сацыяльных супярэчнасцяў паскорыў працэс размежавання ў беларускім нацыянальным руху. Увосень 1917 г. ад БСГ адкалолася частка рэвалюцыйна настроеных рабочых-беларусаў Петраграда і маракоў Балтыйскага флоту. Яны стварылі новую палітычную арганізацыю – Беларускую сацыял-дэмакратычную рабочую партыю

(БСДРП) у ліку 500 чалавек, якая поўнасцю раздзяляла праграмныя і тактычныя ўстаноўкі бальшавікоў. У выканаўчы камітэт БСДРП уваходзілі А. Чарвякоў, А. Усціловіч, Сосна, Гурыновіч, Лаўрэцкі, Пялмецка і І. Лагун, за выключэннем А. Чарвякова, усе рабочыя петраградскіх заводаў. У хуткім часе да іх далучылася Гельсінфорская арганізацыя БСГ, якая складалася з маракоў і налічвала 200 чалавек.

БСДРП адразу ж актыўна ўключылася ў грамадска-палітычнае жыццё краіны. Прадстаўнікі яе ўваходзілі ў склад Петраградскага савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў, падтрымлівалі курс бальшавікоў на ўзброенае паўстанне.

Спробы кансалідацыі беларускага нацыянальнага руху, распачатыя на ІІ сесіі Цэнтральнай рады і ІІІ з'ездзе БСГ 15-25 кастрычніка, поспеху не мелі. З-за адсутнасці адзінства кіраўніцтва БСГ не выпрацавала агульнапартыйнай лініі ў адносінах да кастрычніцкага ўзброенага паўстання. Па гэтай прычыне З. Жылуновіч адмовіўся ўвайсці ў створаны з'ездам ЦК БСГ. На апошнім пасяджэнні 25 кастрычніка адбылася рэарганізацыя каардынуючага цэнтра беларускага нацыя-нальнага руху. Быў утвораны новы краёвы орган пад назвай "Вялікая беларуская рада". У прынятых рашэннях падкрэслівалася, што "Рада павінна бараніць увесь беларускі народ". Гэта азначала, што рэарганізацыя Рады адбылася на аснове ідэі адзінства ўсіх слаёў беларускага насельніцтва ў адстойванні агульнанацыянальных інтарэсаў. Аднак беларускі нацыянальны рух аслабляўся рознасцю падыходаў яго ўдзельнікаў да вырашэння сацыяльных і нацыянальных праблем.

Як бачна, эвалюцыйны і рэвалюцыйны шляхі развіцця, якія адстойвалі супрацьлеглыя сілы ў беларускім нацыянальным руху, сумясціць не ўдалося.

ЛЕКЦЫЯ 15

# КАСТРЫЧНІЦКАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ І ЛЁС БЕЛАРУСІ

- *Усталяванне Савецкай улады*
- *Брэсцкі мір*

**Усталяванне Савецкай улады.** У сучаснай гістарычнай літаратуры выказваюцца розныя пункты погляду на сутнасць і характар падзей 25-26 кастрычніка 1917 г. у Петраградзе. Адны называюць іх Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыяй, якая паклала пачатак новай эры ў гісторыі чалавецтва. Яшчэ нядаўна ён быў пануючым.

Другі пункт погляду зводзіцца да тэзісу, што ў кастрычніку 1917 г. адбылася рабоча-сялянская дэмакратычная рэвалюцыя. Адзін з прадстаўнікоў гэтага накірунку П. Валабуеў лічыць, што Кастрычніцкая рэвалюцыя адбылася не "па Марксу", у сілу недастатковага ўзроўню развіцця вытворчых сіл, а "па Леніну". Рухаючымі сіламі рэвалюцыі з'явіліся не толькі пралетарыят і бяднейшае сялянства, а ўсё сялянства ў цэлым. Таму рэвалюцыя не пралетарская, а народная, якая адкрыла шлях да сацыялістычных пераўтварэнняў.

У апошні час атрымаў распаўсюджванне трэці пункт погляду на кастрычніцкія падзеі як на ваенны пераварот, выпадковую з'яву. Ён практычна супадае з трактоўкай падзей кастрычніка 1917 г. амерыканскім палітолагам З. Бжэзінскім.

Але гіпотэза не дае адказу на пытанне, як змаглі пратрымацца ва ўладзе бальшавікі, абапіраючыся толькі на штыкі ў 170-мільённай краіне?

Падзеі 25-26 кастрычніка з'явіліся вынікам абвастрэння сацыяльна-класавых і палітычных супярэчнасцей у краіне, актыўнай і мэтанакіраванай дзейнасці бальшавікоў па захопу ўлады. Няздольнасць Часовага ўрада вырашыць кардынальныя задачы дэмакратычнай рэвалюцыі, непаслядоўная палітыка кіруючых партый прывяла іх да палітычнага банкруцтва. Пасля правалу карнілаўскага мяцяжу ўлада страціла ўсялякую апору. Усе без спагады глядзелі на тое, як над Часовым урадам збіраюцца "бальшавіцкія хмары".

У гэтай сітуацыі ў ЦК РСДРП(б) перамог пункт погляду У. Леніна на неадкладную падрыхтоўку ўзброенага паўстання. Напярэдадні штурму Зімняга палаца, позна вечарам 24 кастрычніка, Ленін у

суправаджэнні сувязнога Э. Рах'я прыйшоў у Смольны, каб непасрэдна кіраваць узброеным паўстаннем.

Вечарам 25 кастрычніка пачаў работу II Усерасійскі з'езд Саветаў, на якім прысутнічала 649 дэлегатаў, з іх 390 – бальшавікі. У яго рабоце прынялі ўдзел дэлегаты Беларусі і Заходняга фронту: 24 бальшавікі, 6 левых эсэраў, 3 сацыял-дэмакраты-інтэрнацыяналісты, 5 меншавікоў, 10 эсэраў і 3 беспартыйныя. З'езд адкрыў выконваючы абавязкі старшыні Прэзідыума Усерасійскага Цэнтральнага Выканаўчага камітэта меншавік Ф. Дан. Пасля таго як меншавікі і правыя эсэры пакінулі залу з'езда, усялякая магчымасць стварыць кааліцыйны савецкі ўрад, што вызначылася ў пачатку работы з'езда, была страчана. Адыход развязаў рукі бальшавікам, ачысціў для іх поле палітычнай барацьбы. Аб гэтым недвухсэнсава сведчыла выступленне старшыні Петраградскага савета Л. Троцкага. "Паўстанне народных мас, - сказаў ён, - не патрабуе апраўдання. Тое, што адбылося, - гэта паўстанне, а не загавор... Народныя масы ішлі пад нашым сцягам, і наша паўстанне перамагло. І зараз нам прапаноўваюць: адмоўцеся ад вашай перамогі, ідзіце на ўступкі, заключыце дамоўленасць. З кім?.. Тым, хто адсюль пайшоў і хто выступае з прапановамі, мы павінны сказаць: вы – жалобныя адзінкі, вы банкроты, ваша роля сыграна, і адпраўляйцеся туды, дзе вам ад гэтага часу належыць быць: у смеццевы кошык гісторыі". Вечарам 26 кастрычніка былі прыняты важнейшыя дакументы: Дэкрэт аб зямлі, Дэкрэт аб міры, пастанова аб адмене смяротнай кары, рэзалюцыя супраць пагромнага руху, Дэкрэт аб утварэнні бальшавіцкага Ўрада – Савета народных камісараў.

Мінск атрымаў вестку аб узброеным паўстанні ў Петраградзе апоўдні 25 кастрычніка. Як толькі стала вядома аб паўстанні, Выканкам Мінскага савета вывеў на вуліцы 37-мы і 289-ты запасныя пешыя палкі і вызваліў з турмы рэвалюцыйных салдат каля 800 чалавек, арыштаваных Часовым урадам пасля ліпеньскіх падзей. З іх быў сфарміраваны 1-шы імя Мінскага савета рэвалюцыйны полк. Адначасова былі ўзброены чыгуначнікі і рабочыя некаторых прамысловых прадпрыемстваў горада. Бальшавікі – члены прэзідыума ад імя Выканкама выдалі загад № 1, у якім абвяшчалася аб пераходзе ўлады ў Мінску ў рукі Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Быў арганізаваны кантроль над поштай, тэлеграфам, чыгункай, штабам Заходняга фронту.

Для прапаганды і ўмацавання Савецкай улады 26 кастрычніка пры Мінскім савеце па рашэнню Паўночна-Заходняга абласнога камітэта РСДРП (б) быў створаны Рэвалюцыйны камітэт (у пачатку

лістапада быў ператвораны ў Ваенна-рэвалюцыйны камітэт Паўночна-Заходняга фронту). Ядро камітэта склалі прэзідыум Мінскага савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў, бюро абласнога выканаўчага камітэта саветаў Заходняй вобласці, бальшавіцкая фракцыя Франтавога камітэта, прадстаўнікі Мінскага раённага чыгуначнага камітэта і ўсіх вайсковых часцей Мінска.

Да вечара 26 кастрычніка становішча ў Мінску ўскладнілася. Штаб фронту пачаў рыхтаваць франтавыя часці для адпраўкі ў Петраград на дапамогу Краснову і Керанскаму, збіраць сілы для барацьбы супраць Саветаў у Мінску. Да сярэдзіны дня 27 кастрычніка ў горадзе з'явіліся 4 каравулы Франтавога камітэта з казакаў Каўказскай дывізіі, якая перайшла на яго бок. Эсэры расклейвалі лістоўкі, якія заклікалі насельніцтва да барацьбы супраць Саветаў. Па загаду генерала Балуева ў горад была ўведзена Каўказская дывізія.

Супраць пераходу ўлады Саветам у Мінску выступілі адзіным фронтам меншавікі, эсэры, бундаўцы, беларускія і яўрэйскія нацыянальна-дэмакратычныя палітычныя партыі і арганізацыі. 26 кастрычніка на пасяджэнні Мінскага савета яны аб'явілі дэкларацыю, у якой асуджалася ўзброенае паўстанне ў Петраградзе. Высоўвалася патрабаванне перадаць уладу ў Мінску "рэвалюцыйнаму камітэту", у якім былі б прадстаўлены ўсе "дэмакратычныя арганізацыі" і палітычныя партыі. Але большасць членаў выканкама Савета гэтую прапанову адхіліла. 27 кастрычніка агульны сход членаў Мінсюай арганізацыі Бунда прыняў рэзалюцыю, якая абавязвала сваіх членаў неадкладна выйсці са складу Мінскага савета і яго выканкама, як толькі тыя прызнаюць створаны ў Петраградзе ўрад бальшавікоў. Гарадская дума, у якой бундаўцы мелі большасць, таксама не прызнала ўрад У. Леніна і пераход улады Мінскаму савету, заклікала насельніцтва горада да барацьбы з бальшавікамі.

Мінскі абласны камітэт партыі эсэраў распаўсюдзіў тэлеграму Ваеннага бюро ЦК сваёй партыі, у якой патрабавалася ад кожнага члена ПС-Р актыўна садзейнічаць армейскім арганізацыям, камісарам Часовага ўрада і каманднаму саставу арміі ў ліквідацыі "д'ябальскіх задумак бальшавікоў". Тэлеграма патрабавала таксама прыняць рашучыя меры, каб хутчэй ліквідаваць Мінскі савет і яго ядро – бальшавікоў.

27 кастрычніка быў створаны Камітэт выратавання рэвалюцыі, надзвычайнае аб'яднанне партыйных, грамадскіх арганізацый Мінска і Франтавога камітэта Заходняга фронту. Большасць членаў Камітэта складалі эсэры, правыя і левыя меншавікі, бундаўцы. Узначаліў

камітэт меншавік Т.М. Калатухін. На ўзор Мінскага камітэта падобныя арганізацыі былі створаны ў Бабруйску, Оршы, Полацку і інш. Камітэт увёў у Мінск часці Каўказскай дывізіі, зняў ваенныя пасты Мінскага савета, адхіліў прызначаных ім камісараў, запатрабаваў ад Савета перадаць яму ўсю ўладу ў горадзе і Заходнім фронце.

Суадносіны сіл на той час былі не на карысць бальшавікоў. Яны пайшлі на перагаворы і дасягнулі кампрамісу. Камітэт выратавання рэвалюцыі абавязваўся не пасылаць войскі Ў Петраград і Маскву, а Савет пагадзіўся перадаць Камітэту ўладу ў раёне Заходняга фронту і дэлегаваў у яго склад двух прадстаўнікоў І. Алібегава і Я. Пярно.

Адначасова бальшавікі Мінска прынялі дзейсныя захады па ўмацаванню сваіх сіл. У армейскі камітэт 2-й арміі былі накіраваны ўпаўнаважаныя, каб перакінуць тэрмінова ў горад рэвалюцыйныя часці. Камітэт РСДРП(б) таксама разгарнуў актыўную агітацыйную работу сярод рабочых горада ў сувязі з тым, што Цэнтральнае бюро прафсаюзаў выступала за нейтралітэт прафсаюзаў у канфлікце. Прымаліся меры па ўцягненню гарадской міліцыі ў актыўную барацьбу на баку Мінскага савета.

У сваю чаргу Камітэт патрабаваў 29 кастрычніка ва ўльтыматыўнай форме ад Мінскага савета апублікаваць заявы, што пастановы Савета Народных Камісараў і Петраградскага ВРК не падлягаюць выкананню. Мінскі савет адхіліў ультыматум.

Сітуацыя рэзка абвастрылася. Эсэра-меншавіцкія лідэры пачалі адкрыта заклікаць да разгрому Мінскага савета. Аднак абставіны складваліся не ў іх карысць. 29 кастрычніка былі разгромлены атрады Керанскага-Краснова. 30 кастрычніка гарадскі сход праўленняў і камітэтаў прафсаюзаў прыняў пастанову аб падтрымцы ўлады Саветаў. Рэзалюцыі ў падтрымку ўлады Саветаў прынялі таксама сходы рабочых многіх прадпрыемстваў горада, з'езд салдацкіх камітэтаў 10-й арміі, многія вайсковыя падраздзяленні 2-й і 3-й армій.

1 лістапада ў Мінск з 2-й арміі прыбылі атрады рэвалюцыйных салдат, а таксама браніраваны поезд пад камандаваннем бальшавіка У. Пралыгіна. Яны ўзялі пад ахову Мінскі савет. Вечарам 2 лістапада ў гарадскім тэатры адбыўся пашыраны сход Мінскага савета з удзелам прадстаўнікоў прадпрыемстваў, чыгуначнікаў, вайсковых часцей – усяго каля 100 чалавек. Сход адобрыў мерапрыемствы па ажыццяўленню дэкрэтаў ІІ Усерасійскага з'езда Саветаў, якія былі распрацаваны ВРК. Лідэры эсэраў, меншавікоў і бундаўцаў заявілі аб выхадзе іх фракцый са складу Савета. Але многія дэпутаты гэтых

партый не пад-трымалі сваіх лідэраў і засталіся ў Савеце. Мінская арганізацыя меншавікоў палічыла дзеянні фракцыі памылковымі і 5 лістапада прыняла рашэнне аб яе вяртанні ў Савет.

Ваенна-рэвалюцыйны камітэт Заходняга фронту, які не паспеў аформіцца да абвастрэння абставін, быў папоўнены прадстаўнікамі арганізацый і вайсковых часцей. Была вызначана і яго арганізацыйная структура. Вышэйшым органам быў аб'яўлены пленум ВРК, а выканаўча-распарадчым бюро і галіновыя аддзелы. У склад бюро ВРК увайшлі: К.І. Лацдар (старшыня), А.Ф. Мяснікоў, У.С. Селязнёў, М.У. Рагазінскі, М.І. Калмановіч, М.І. Крывашэін, В.М. Фрэйман. Да фарміравання абласных органаў савецкай улады ВРК з'яўляўся адзіным поўнаўладным органам на ўсёй неакупіраванай тэрыторыі Беларусі і Заходняга фронту.

Услед за Мінскам Саветы ўзялі ўладу ў Віцебску, Гомелі, Оршы, Бабруйску, Слуцку, Рэчыцы, Мазыры, Полацку і іншых гарадах Беларусі і Заходнім фронце. Да таго ж Саветы, дзе прадстаўнікі іншых партый пераважалі, як правіла, распускаліся. Так адбылося ў Віцебску, дзе 27 кастрычніка па рашэнню Віцебскага губернскага камітэта РСДРП(б) быў створаны Ваенна-рэвалюцыйны камітэт. На наступны дзень ён узяў пад свой кантроль пошту, тэлеграф, чыгуначны вузел, распусціў існуючы Савет і назначыў новыя выбары. Ваенным камендантам горада і начальнікам гарнізона стаў С.М. Крылоў. Спроба меншавікоў, эсэраў і бундаўцаў стварыць пры Віцебскім савеце ваеннае бюро поспеху не мела: чыгуначнікі заявілі, што яны далучацца да ВРК. Загадам 29 кастрычніка Віцебскі ВРК ліквідаваў ваеннае бюро, а новы склад Віцебскага савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў 11 лістапада прыняў рэзалюцыі аб падтрымцы дзеянняў II Усерасійскага з'езда Саветаў.

28 кастрычніка Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў Оршы стварыў ВРК на чале з бальшавіком Дзмітрыевым і распусціў Камітэт выратавання рэвалюцыі. 12 лістапада на надзвычайным сходзе сялянскіх таварыстваў Аршанскага раёна была прынята рэзалюцыя аб прызнанні і падтрымцы Савета Народных Камісараў, правядзенні ў жыццё Дэкрэта аб зямлі яшчэ да склікання Устаноўчага сходу.

Востра праходзіла барацьба за Савецкую ўладу ў Гомелі. Пасля атрымання звестак аб перамозе ўзброенага паўстання Ў Петраградзе Палескі камітэт РСДРП(б) накіраваў сваіх агітатараў на прамысловыя прадпрыемствы горада, чыгуначны вузел, у воінскія падраздзяленні і прыступіў да фарміравання Чырвонай гвардыі. Меншавікі, эсэры і бундаўцы, каб выклікаць паніку і разгубленасць, 28 кастрычніка на пашыраным пасяджэнні Савета зачыталі прысланую з Магілёва

фальшывую тэлеграму, у якой паведамлялася, што войскі Краснова занялі Петраград, а СНК на чале з Леніным арыштаваны. Аднак большасць дэлегатаў Савета не паверыла гэтай фальшыўцы. Савет прыняў бальшавіцкую рэзалюцыю аб падтрымцы рабоча-сялянскага ўрада, а праз два дні адобрыў дэкрэты II Усерасійскага з'езда Саветаў і абвясціў аб устанаўленні савецкай улады ў горадзе і ўездзе. У склад абранага ваенна-рэвалюцыйнага камітэта ўвайшлі 4 бальшавікі, 2 левыя эсэры і па 1 прадстаўніку ад фракцый Савета. ВРК узначаліў дэлегат II Усерасійскага з'езда Саветаў бальшавік Р. М. Ляплеўскі. У сярэдзіне лістапада адбыліся перавыбары Гомельскага савета, якія далі бальшавікам 109 дэпутацкіх месцаў з 195. 17 лістапада Гомельскі савет прыняў рэзалюцыю, якая выражала давер савецкаму ўраду і яго знешняй палітыцы, а таксама выказвала рашучасць мясцовых бальшавікоў праводзіць яе ў жыццё.

У больш складаных умовах праходзіла барацьба за ўсталяванне Савецкай улады ў Магілёве. Генералітэт Стаўкі і выконваючы абавязкі Вярхоўнага галоўнакамандуючага генерал М.М. Духонін адмовіліся выконваць распараджэнні Саўнаркама. Сілы, якія групаваліся вакол Стаўкі, імкнуліся ператварыць Магілёў у апорны пункт барацьбы супраць савецкага ўрада. Контррэвалюцыйныя намеры Стаўкі падтрымлівала эсэра-меншавіцка-бундаўская большасць Магілёўскага савета, Выканкам губернскага Савета сялянскіх дэпутатаў і эсэра-меншавіцкі па складу ўсеармейскі камітэт. 28 кастрычніка на нарадзе палітычных і грамадскіх арганізацый горада меншавікі і эсэры асудзілі ўзброенае паўстанне ў Петраградзе і патрабавалі стварэння "дэмакратычнага міністэрства". У Магілёў прыбылі лідэры партый эсэраў і меншавікоў В.М. Чарноў і І.Г. Цэрэтэлі з мэтай сфарміраваць "кааліцыйны ўрад" на чале з В. Чарновым. СНК Расіі ў адказ прызначыў галоўнакамандуючым М. В. Крыленка, з Петраграда быў накіраваны зводны атрад салдат Літоўскага палка. матросаў Балтыйскага флоту і чырвонагвардзейцаў. ВРК Заходняга фронту сфарміраваў атрад з салдат 1-га палка імя Мінскага савета. У Магілёў спешна накіроўваліся рэвалюцыйныя атрады з Віцебска, Гомеля, Мінска, Оршы, Полацка, Жлобіна і іншых гарадоў Беларусі.

З набліжэннем рэвалюцыйных войскаў да горада, калі лёс Стаўкі быў фактычна вырашаны, 18 лістапада Магілёўскі савет быў вымушаны прызнаць савецкую ўладу і ўтварыць Ваенна-рэвалюцыйны камітэт, які ўстанавіў кантроль над Стаўкай. 20 лістапада ў Магілёў з рэвалюцыйнымі атрадамі ўступіў новы Вярхоўны галоўнакамандуючы Крыленка. Прадстаўнікі Часовага ўрада генерал М. Духонін, старшыня ўсеармейскага камітэта В.Б.

Станкевіч, памочнік начальніка штаба Галоўкаверха па палітычных справах В.В. Вырубаў былі ўзяты пад дамашні арышт, а ўсеармейскі камітэт распушчаны. На працягу 25 кастрычніка – 18 лістапада 1917 г. у часцях і злучэннях фронту ўлада перайшла да Саветаў.

Ва ўмацаванні новай улады важнае значэнне мелі з'езды Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў, якія адбыліся ў лістападзе-снежні. Яны зацвердзілі структуру органаў Савецкай улады, вызначылі сістэму кіравання, абралі выканаўчыя камітэты.

18-21 лістапада 1917 г. праходзіў з'езд Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў Заходняй вобласці. З 560 дэлегатаў 460 складалі бальшавікі, што і вызначыла яго ход, рашэнні, склад кіруючых органаў. З'езд адзначыў, што многія Саветы яшчэ знаходзяцца на стадыі свайго станаўлення. Што тычыцца пытання шматпартыйнасці пры фарміраванні органаў улады, то з'езд лічыў дапушчальным пагадненні толькі з тымі сацыялістычнымі партыямі, якія прызналі СНК, дэкрэты аб міры, аб зямлі, аб кантролі за вытворчасцю. З'езд абраў Выканаўчы камітэт абласнога Савета ў складзе 35 чалавек. Паколькі ў парадку дня стаяла пытанне аб стварэнні адзінага органа дзяржаўнай улады на тэрыторыі Заходняй вобласці, з'езд прыняў рашэнне (яго падтрымалі іншыя з'езды) аб стварэнні Выканаўчага камітэта Саветаў Заходняй вобласці і дэлегіраваў у яго склад свой Выканкам, абраны на з'ездзе.

Тое ж зрабіў і ІІІ з'езд сялянскіх дэпутатаў Мінскай і Віленскай губерняў, які праходзіў 18-20 лістапада. На ім прысутнічала 335 дэлегатаў, большасць з якіх былі прадстаўнікамі беднаты і сераднякоў. У мэтах найбольш паслядоўнага ажыццяўлення Дэкрэта аб зямлі з'езд вырашыў пераабраць усе валасныя камітэты, валасныя земскія ўправы, міліцыю. Зямельным камітэтам было рэкамендавана выдзеліць камісіі; для ўзяцця на ўлік усіх зямель, інвентару і размеркаванне іх сярод бяднейшых сялян. З'езд абраў 35 чалавек у склад Выканкама сялянскіх дэпутатаў Мінскай і Віленскай губерняў і прыняў рашэнне аб аб'яднанні Выканаўчага камітэта Савета сялянскіх дэпутатаў з Выканаўчым камітэтам Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў.

20 лістапада адкрыўся ІІ з'езд армій Заходняга фронту. У яго рабоце ўдзельнічала 714 дэлегатаў. У іх ліку: бальшавікоў – 473, левых эсэраў – 74, меншавікоў – 24, беспартыйных – 103. Астатнія дэлегаты з'яўляліся прадстаўнікамі розных дробных партый і арганізацый. За рэзалюцыю даверу Саўнаркому прагаласавала 500 дэлегатаў. Адкрытым галасаваннем галоўнакамандуючым Заходняга фронту быў абраны А.Ф. Мяснікоў.

З'езд распрацаваў сістэму арганізацыі савецкай улады на Заходнім фронце і ў вобласці. У вобласці, губернях, паветах, валасцях ствараліся Саветы рабочых і салдацкіх дэпутатаў, Саветы сялянскіх дэпутатаў, Саветы батрацкіх дэпутатаў. У выніку іх аб'яднання з прадстаўнікамі арміі, прафесійных саюзаў, чыгуначнага саюза, паштова-тэлеграфных служачых былі створаны Саветы рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў, якія з'яўляліся дзяржаўнай уладай у вобласці, губерні, арміі. Для кіравання рознымі галінамі гаспадарча-палітычнага і культурнага жыцця Саветы стваралі галіновыя аддзелы (ваенны, харчовы, працы, фінанасавы, асветы, агульнага кіравання і г. д.). Узначальвалі аддзелы народныя камісары. У сувязі з тым, што рэвалюцыйныя органы ўлады знаходзіліся на стадыі станаўлення, а сярод рабочых, салдат і сяляп не было кваліфікаваных спсцыялістаў, то вырашылі выкарыстаць гарадскія і земскія самаўправы, харчовыя камітэты з іх рознагаліновым кваліфікаваным апаратам. Яны падпарадкоўваліся Саветам. У штабах, банках, казначэйствах камісары ўтваралі самаўправы з ліку служачых, якія ажыццяўлялі кіраўніцтва дадзенымі ўстановамі. У мясцовыя самаўправы пасылаліся прадстаўнікі Саветаў.

27 лістапада на аснове раней дасягнутай паміж з'ездамі Саветаў дамоўленасці было створана спецыфічнае ў адрозненне ад іншых рэгіёнаў краіны адміністрацыйнае аб'яднанне – Заходняя вобласць і Заходні фронт. З гэтай мэтай выканаўчыя органы, абраныя вышэйназванымі з'ездамі, зліліся. Быў утвораны Выканаўчы камітэт Заходняй вобласці і Заходняга фронту (Аблвыкамзах). У яго склад увайшлі 100 членаў Франтавога камітэта, па 35 членаў выканаўчых камітэтаў Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў Заходняй вобласці і Саветаў сялянскіх дэпутатаў Мінскай і Віленскай губерняў, 11 прадстаўнікоў ад прафсаюзаў, 4 - ад чыгуначнага саюза, 2 – ад саюза паштова-тэлеграфных служачых. Быў утвораны выканаўча-распарадчы орган – Савет Народных Камісараў Заходняй вобласці і Заходняга фронту. Старшынёй Аблвыкамзаха быў абраны бальшавік М.У. Рагазінскі, намеснікамі – бальшавік М.І. Крывашэін і левы эсэр П. Казлоў, а старшынёй СНК – К.І. Ландар.

Узнікае пытанне: чаму ў Выканаўчым камітэте Заходняй вобласці і Заходняга фронту, якому належала вышэйшая ўлада паміж з'ездамі, з 187 яго членаў прадстаўнікі фронту складалі 100 чалавек, а грамадзянскае насельніцтва прадстаўлена толькі 87? Салдаты былі і ў ліку дэлегатаў, абраных не толькі з'ездамі армій Заходняга фронту, а таксама і на з'ездзе Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў Заходняй вобласці. Таму ў Выканаўчым камітэце Заходняй вобласці і Заходняга

фронту салдат было не 100, а значна больш, па апошніх падліках беларускага гісторыка І.М. Ігнаценкі каля 90%. З гэтага вынікае. што пры арганізацыі Савецкай улады ў рэгіёне бальшавікі зрабілі стаўку на ваенных, а не на рабочых. Органы ўлады, якія былі абраны з'ездамі Саветаў Віцеб-скай і Магілёўскай губерняў, у склад Аблвыкамзаха не былі ўключаны. Склалася парадаксальнае становішча: фармальна гэтыя губерні знаходзіліся ў складзе Заходняй вобласці і адначасова з'яўляліся адміністрацыйна-тэрытарыяльнымі ўтварэннямі, якія падпарадкоўваліся непасрэдна ўраду РСФСР.

Вядома, што ў час і пасля кастрычніцкіх падзей 1917 г. у кіраўніцтве бальшавікоў разгарэлася барацьба вакол пытання мэтазгоднасці фарміравання "кааліцыйнага ўрада" з прадстаўнікоў усіх партый сацыялістычнай арыентацыі. У сувязі з гэтым неабходна адзначыць, што за ўтварэнне кааліцыйнай дэмакратычнай улады, якая павінна абапірацца на падтрымку шырокіх рэвалюцыйных мас, стаялі Гомельскі і Віцебскі губернскія саветы рабочых і салдацкіх дэпутатаў, Магілёўскі, Барысаўскі, Нясвіжскі гарадскія саветы рабочых і салдацкіх дэпутатаў, Аршанскі раённы савет рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў, франтавы і армейскія камітэты Саветаў салдацкіх дэпутатаў. Выканкам Мінскага савета рабочых і салдацкіх дэпутагаў у загадзе № 1 звярнуўся да ўсіх рэвалюцыйных арганізацый і палітычных партый з прапановай неадкладна пачаць арганізацыю рэвалюцыйнай улады на месцах на шматпартыйнай аснове.

Ні адзін Савет альбо ваенна-рэвалюцыйны камітэт не прапанаваў увесці дыктатуру пралетарыяту. Практычна ўсе найбольш аўтарытэтныя Саветы, Цэнтральнае бюро прафсаюзаў, салдацкія камітэты выказваліся за стварэнне ўлады з прадстаўнікоў усіх сацыялістычных партый. Часовы ВРК Заходняга фронту таксама лічыў, што ўрад павінен быць створаны з прадстаўнікоў усіх сацыялістычных партый, якія ўдзельнічалі ў рабоце II Усерасійскага з'езда Саветаў.

Але, як вядома, перамагла пазіцыя У. Леніна і Л. Троцкага, якія не паіадзіліся з прапановай канферэнцыі сацыялістычных партый, сазванай пад эгідай Вікжэля для фарміравання "кааліцыйнага ўрада" з прадстаўнікоў усіх партый сацыялістычнай арыентацыі. Палітычныя супярэчнасці па пытанню аб уладзе прывялі да прымусовага роспуску Устаноўчага сходу, а перад гэтым Першага Усебеларускага з'езда, да выхаду левых эсэраў са складу савецкага ўрада. Асноўная маса сялян падтрымала бальшавікоў падчас кастрычніцкіх падзей таму, што яны атрымалі зямлю памешчыкаў без

выкупу. Але, падтрымліваючы бальшавікоў, сяляне зусім не імкнуліся да "дыктатуры пралетарыяту". Аб гэтым пераканаўча сведчаць выбары ва Устаноўчы сход у лістападзе 1917 г. За партыю кадэтаў прагаласавала каля 5% выбаршчыкаў, правых і левых эсэраў – 58,5%, бальшавікоў – 24%.

**Брэсцкі мір.** Дэкрэты Савецкай улады аб міры і зямлі задавальнялі інтарэсы большасці насельніцтва краіны. Найважнейшым і самым неадкладным было пытанне аб спыненні ваенных дзеянняў. ВРК Заходняга фронту дамовіўся з камандаваннем германскіх войскаў пачаць перагаворы аб міры (генерал Духонін адмовіўся выканаць загад Саўнаркама пачаць перагаворы). Першым 14 лістапада было заключана перамір'е вайсковым камігэтам Грэнадзёрскага корпуса 2-й арміі з прадстаўнікамі германскай арміі, затым карпуснымі камітэтамі 3-й і 4-й армій. Начальнік штаба германскай групы армій Усходняга фронту генерал фон Эйхгорн 18 лістапада даў згоду на перагаворы з прадстаўнікамі Заходняга фронту і месцы іх правядзення. ВРК Заходняіа фронту сфарміраваў дэлегацыю ў складзе салдата С. Шчукіна (старшыня), В. Фаміна, Н. Ціхмянёва, Г. Пятрова, Лук'янава, Школьнікава, В. Яркіна, Хрусталёва, малодшага унтэр-афіцэра С. Берсана. Акрамя іх у склад дэлегацыі ўвайшлі два спецыялісты ад штаба Заходняга фронту Ліпскі і Крузенштэйн, перакладчык Калаш. Позна вечарам 18 лістапада дэлегацыя выехала з Мінска.

Перагаворы пачаліся раніцай 20 лістапада ў мястэчку Солы (што ў 15 кіламетрах ад Смаргоні). Нямецкую дэлегацыю ўзначаліў начальнік групы армій германа-аўстрыйскіх войскаў генерал-маёр фон Заўберцвейг. Перагаворы насілі ў асноўным характар дыялога двух асоб: фон Заўберцвейга і (285) члена ВРК Заходняга фронту С. Шчукіна, які ўмела, з тактам і годнасцю вёў складаную дыпламатычную місію.

Падпісаны дагавор аб перамір'і ўступаў у сілу з 12 гадзін дня 23 лістапада (5 снежня) 1917 г. тэрмінам на два месяцы па 24 студзеня (6 лютага) 1918 г., або да заключэння агульнага перамір'я на ўсім працягу руска-германскага фронту. З гэтага часу прыпыняліся ваенныя дзеянні на ўсім фронце ад мястэчка Відзы да ракі Прыпяць.

Перагаворы і перамір'е на Заходнім фронце мелі выключнае значэнне. Для расійскага боку яны сведчылі аб поўнай дэзарганізацыі арміі і стваралі небяспеку ваеннага паражэння. Таму мірныя перагаворы ўрадавых дэлегацый былі паскораны. Перагаворы пачаліся 20 лістапада (3 снежня) 1917 г. у Брэст-Літоўску, дзе размяшчалася камандаваннне нямецкіх войскаў на Усходнім фронце.

2(15) снежня савецкай урадавай дэлегацыяй быў падпісаны дагавор аб перамір'і, а потым пачаліся мірныя перагаворы. Савецкая дэлегацыя ў складзе А.А. Іофе (старшыня), Н.А. Біцэнкі, Л.Б. Каменева, Л.М. Карахана (сакратар), М.М. Пакроўскага выступіла за заключэнне дэмакратычнага міру без анексій і кантрыбуцый. Кюльман ад імя германа-аўстрыйскага блоку заявіў аб прымальнасці асноўных гэзісаў савецкай дэкларацыі пры ўмове, што да іх далучацца ўрады краін Антанты. Аднак чарговы зварот наркама па замежных справах Л.Б. Троцкага да краін Антанты і ЗША 17(30) снежня прыняць удзел у мірных перагаворах застаўся без адказу. Таму Кюльман заявіў, што германскі блок лічыць сябе свабодным ад савецкіх мірных прапаноў.

Пачаўся другі этап перагавораў, які вызначыўся абвастрэннем супярэчнасцяў паміж іх удзельнікамі. Расійскую дэлегацыю ўзначаліў Л. Троцкі. У цэнтры дыскусій апынуліся пытанні, звязаныя з паняццем "самавызначэнне нацый". Немцы патрабавалі прызнаць права на самавызначэнне для Курляндыі, Літвы, Ліфляндыі, Польшчы і Эстляндыі. Савецкая дэлегацыя сцвярджала, што самавызначэнне ва ўмовах нямецкай акупацыі немагчыма, і патрабавала вывесці нямецкія войскі з захопленых тэрыторый. Істогны ўплыў на гэтым этапе перагавораў аказала пазіцыя дэлегацыі Украінскай Народнай Рэспублікі, якая была прызнана ў снежні 1917 г. Савецкім урадам. Дэлегацыю Украіны ўзначальваў У. Галубовіч.

На перагаворы прыбыла таксама беларуская дэлегацыя ў складзе С. Рак-Міхайлоўскага (старшыня), І. Серады і А. Цвікевіча, а таксама польская дэлегацыя. Троцкі згадзіўся прызнаць паўнамоцтвы ўкраінскай дэлегацыі, але выступіў супраць удзелу ў перагаворах прадстаўнікоў Беларусі і Польшчы, як не прызнаных Савецкім урадам. Нямецкі бок задаволіў гэтае патрабаванне, таму беларускія дэлегаты прысутнічалі на канферэнцыі як дарадцы ўкраінскай дэлегацыі. Актыўнага ўдзелу ў перагаворах яны не прымалі.

Выкарыстаўшы адмову Антанты далучыцца да перагавораў, германская дэлегацыя 5(18) студзеня 1918 г. запатрабавала адарвання ад Расіі тэрыторыі плошчаю больш за 150 тыс. км$^2$. Граніца павінна была праходзіць па тэрыторыі Беларусі на Захад ад Дзвінска, каля мястэчка Відзы і далей да Брэст-Літоўска. Пад кантроль Германіі пераходзіла Літва, Польшча, амаль палова этнічнай тэрыторыі Беларусі і частка Латвіі. Па прапанове Троцкага на перагаворах быў зроблены перапынак, і ён выехаў у Петраград, каб пракансультавацца з кіраўнікамі Савецкай Расіі. Троцкі прапанаваў абвясціць аб спыненні вайны і дэмабілізацыі арміі, але мір не

падпісваць да таго часу, пакуль аўстра-германскія войскі не пачнуць наступленне. У. Ленін выказаўся за тактыку зацягвання перагавораў да прад'яўлення германскай дэлегацыяй ультыматуму. Для Леніна пытанне аб міры ўскладнялася тым, што ў складзе партыйнага і савецкага кіраўніцтва ўтварылася моцная апазіцыя на чале з М. І. Бухарыным, якая выступала за працягванне рэвалюцыйнай вайны, супраць падпісання міру. Перамагла пазіцыя Троцкага. 27 студзеня (9 лютага) 1918 г. Кюльман ва ўльтыматыўнай форме патрабаваў ад савецкай дэлегацыі даць адказ на прапанаваныя раней умовы міру. Троцкі прыняў да ведама заяву Кюльмана, што непадпісанне Расіяй мірнага дагавору аўтаматычна спыняе перамір'е, і савецкая дэлегацыя пакінула Брэст. Троцкі і яго прыхільнікі зыходзілі з таго, што аўстра-германскія войскі не змогуць выступіць супраць Савецкай Расіі з-за рэвалюцыйнага ўздыму ў Германіі і Аўстра-Венгрыі.

Аднак аўстра-германскія войскі 18 лютага пачалі наступленне на ўсім фронце. У той самы дзень на пасяджэнні ЦК РСДРП(б) пасля вострай барацьбы з "левымі камуністамі" большасць (7 – "за", 5 – "супраць", Троцкі ўстрымаўся) выказалася за падпісанне міру. Раніцай 19 лютага Ленін ад імя СНК РСФСР накіраваў германскаму ўраду радыёграму са згодай падпісання міру. Аднак наступленне працягвалася. Былі заняты Дзвінск, Мінск, акупіравана большая частка Беларусі. 23 лютага германскі ўрад запатрабаваў неадкладна ачысціць ад рускіх войскаў Ліфляндыю, Украіну, Фінляндыю, Эстляндыю, дэмабілізаваць рускую армію, аднавіць нявыгадны для Расіі руска-германскі гандлёвы дагавор 1904 г. На прыняцце ультыматыму давалася 48 гадзін. Тады было вырашана прыняць германскія мірныя ўмовы. Супраць выказаліся меншавікі-інтэрнацыяналісты, правыя і левыя эсэры, максімалісты і анархісты.

Для падпісання дагавору 24 лютага ў Брэст-Літоўск выехала савецкая дэлегацыя. 1 сакавіка яна атрымала канчатковы тэкст мірнага дагавору, які складаўся з 14 артыкулаў і розных дадаткаў. Ад Расіі аддзяліліся Курляндыя, Літва, Ліфляндыя, Эстляндыя і частка Беларусі. На Каўказе да Турцыі адыходзілі Карс і Батумі. Украіна і Фінляндыя прызнаваліся самастойнымі дзяржавамі. Усяго Расія страчвала тэрыторыі каля 1 млн. км$^2$ з насельніцтвам больш за 50 млн. чалавек. Савецкая Расія абавязана была дэмабілізаваць армію і флот, прызнаць дагавор Цэнтральнай украінскай рады з Германіяй і яе саюзнікамі, заключыць мірны дагавор з Радай і вызначыць мяжу паміж Расіяй і Украінай. Брэсцкі мір навязваў нераўнапраўныя эканамічныя пагадненні. Брэсцкі мір фармальна завяршыў перыяд удзелу Расіі ў Першай сусветнай вайне 1914-1918 гг. Інтарэсы

Беларусі не былі прыняты пад увагу ніводным з бакоў. Паводле ўмоў Брэсцкага міру тэрыторыя Беларусі была падзелена на лініі Дзвінск-Свянцяны-Ліда-Пружаны-Брэст. Немцы арыентаваліся на стварэнне "малой Літвы" з далучэннем да этнічнай Літвы часткі беларускіх зямель, у тым ліку Віленшчыны і Гродзеншчыны. Землі на поўдзень ад Палескай чыгункі па дамоўленасці з Цэнтральнай украінскай радай перадаваліся УНР. Беларусь не атрымлівала нічога на аднаўленне разбуранай у час вайны гаспадаркі, таму што Германія і Расія ўзаемна адмовіліся пагасіць страты, прычыненыя вайной насельніцтву гэтых дзяржаў.

ЛЕКЦЫЯ 16

# СТАНАЎЛЕННЕ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

- *Першы Усебеларускі з'езд*
- *Абвяшчэнне БНР і дзейнасць яе ўрадавых структур*
- *Стварэнне Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь*

**Першы Усебеларускі з'езд.** Станаўленне беларускай дзяржаўнасці праходзіла ў некалькі этапаў. Першы звязаны з абвяшчэннем Беларускай Народнай Рэспублікі. Утварэнне БНР непарыўна звязана з 1-м Усебеларускім з'ездам і прынятымі ім рашэннямі, якія тычыліся беларускай дзяржаўнасці. З'езд з'явіўся заканамерным вынікам развіцця беларускага нацыянальнага руху. Восенню 1917 г. у ім выразна акрэсліліся два напрамкі: левагадыкальны (сацыялістычны) і нацыянальна-дэмакратычны. Першы напрамак быў прадстаўлены Беларускай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыяй, Беларускім абласным камітэтам і пазней – Беларускім нацыянальным камісарыятам. Лідэры гэтага напрамку – З. Жылуновіч, А. Чарвякоў, Я. Канчар, І. Лагун, А. Усціновіч адлюстроўвалі інтарэсы часткі беларускай інтэлігенцыі, рабочых і сялян, якія імкнуліся да самавызначэння Беларусі на савецкай аснове. Беларускія нацыянальныя дзеячы нацыянальна-дэмакратычнага кірунку, якія групаваліся вакол Вялікай беларускай рады, адмоўна аднесліся да ўсталявання савецкай улады ў Петраградзе. Кастрычніцкая рэвалюцыя кваліфікавалася імі як анархія.

Пытанне аб дзяржаўнасці Беларусі ўскладнялася тым, што кіраўнікі Аблвыкамзаха мелі цьмянае ўяўленне аб форме будучай нацыянальнай дзяржаўнасці беларускага народа. Яны лічылі, што перамога сусветнай пралетарскай рэвалюцыі пакладзе пачатак адміранню дзяржаўнасці. Развіццё сусветнай рэвалюцыі разглядалася як справа першачарговай важнасці, а станаўленне новых дзяржаў, як перашкода на гэтым шляху. З тых самых пазіцый зыходзіў у сваей практычнай дзейнасці Паўночна-Заходні абкам РКП(б) на чале з А. Мясніковым.

Таму ініцыятыва ў вырашэнні нацыянальнага пытання перайшла да беларускіх нацыянальных палітычных партый і арганізацый. Абвешчаны ў "Дэкларацыі правоў народаў Расіі" лозунг права народаў на вольнае самавызначэнне аж да аддзялення і ўтварэння самастойных дзяржаў (2 лістапада 1917 г.) даваў

юрыдычную падставу ў вырашэнні нацыянальна-дзяржаўнага ўладкавання Беларусі. На мітынгах і сходах салдат, працоўных і беларускай інтэлігенцыі ўсе часцей прымаліся рэзалюцыі аб нацыянальным раўнапраўі. Аб гэтым сведчылі прынятыя рэзалюцыі на з'ездзе воінаў-беларусаў Паўночнага фронту ў Віцебску і другім з'ездзе бежанцаў-беларусаў у Маскве ў сярэдзіне лістапада 1917 года.

Паступова ў беларускіх грамадскіх арганізацыях выспявае думка аб скліканні Усебеларускага з'езда, які павінен быў арганізаваць краёвую ўладу. Першапачаткова яна знайшла сваё адлюстраванне ў звароце (27 кастрычніка) выканкамаў Вялікай беларускай рады, Цэнтральнай вайсковай рады і Беларускага выканкама Заходняга фронту "Да ўсяго беларускага народа". У звароце быў заклік да выбрання прадстаўнікоў беларускага народа на Усебеларускі з'езд, адкрыццё якога намячалася 5 снежня 1917 г. у Мінску. А. Мяснікоў тэрмінова выехаў у Петраград з мэтай дабіцца ад Народнага камісарыята па справах нацыянальнасцей забароны на скліканне з'езда. І. Сталін не пагадзіўся з такой прапановай і параіў: знайсці арганізацыю, якая б змагла выступіць з ініцыятывай склікання свайго з'езда, толькі ў іншым месцы.

Выбар быў зроблены на Беларускім абласным камітэце (БАК), які быў створаны ў Петраградзе ў лістападзе 1917 г. пры Усерасійскім савеце сялянскіх дэпутатаў з ліку дэлегатаў ад беларускіх губерняў, прадстаўнікоў арміі і флоту. Па сваей палітычнай сутнасці БАК быў леваэсэраўскай арганізацыяй, кіраўнікі якой Я. Канчар (старшыня), М. Гольман, Ф.Караткевіч, А. Кусэ-Тюз, В. Селіванаў і інш. з'яўляліся левымі эсэрамі.

17 лістапада БАК, які быў лаяльна настроены да Савецкай улады і выступаў супраць падзелу Расіі на нацыянальныя дзяржавы, заявіў аб намеры склікання надзвычайнага беларускага з'езда. Але кіраўніцтва БАК крытычна ставілася да Аблвыкамзаха па прычыне таго, што ён фактычна не з'яўляўся ўсебеларускім органам улады. Для склікання з'езда, які першапачаткова планаваўся на 10-15 снежня ў Рагачове, а потым перанесены на 15 снежня ў Мінск, Саўнаркам выдзеліў 50 тыс. рублёў. Яго арганізатарам дазволілі карыстацца тэлефонам, тэлеграфам, іншымі сродкамі сувязі.

Паміж ВБР і БАК разгарнулася вострая барацьба па пытанню правядзення з'езда. БАК спрабаваў прымусіць Раду адказацца ад правядзення з'езда. Але пакуль БАК вёў перамовы з Наркамнацам, ВБР разгарнула актыўную працу па выбранню дэлегатаў з'езда. Прадстаўнікі ВБР, якія першапачаткова пагадзіліся на правядзенне з'езда 15 снежня, фарсіравалі яго скліканне 5 снежня. У такіх

абставінах БАК нічога не заставалася, як пайсці на заключэнне пагаднення аб узаемнай падтрымцы і адзінстве дзеянняў.

У беларускай гістарычнай літаратуры ёсць розныя погляды і меркаванні наконт часу адкрыцця з'езда. У сувязі з тым, што 5 снежня прыехала толькі 300 дэлегатаў, а 7 снежня – 383, у першыя дні адбыліся нарады прыбыўшых дэлегатаў, быў абраны Савет старэйшын, выпрацавана пазіцыя дэлегатаў ВБР да прапановы БАК аб аб'яднанні дэлегатаў і правядзенні адзінага з'езда. Вечарам 7 снежня адбылося афіцыйнае адкрыццё з'езда. 9 снежня быў абраны прэзідыум з'езда ў складзе: С. Рак-Міхайлоўскі (старшыня), У. Фальскі, Савіч, Калішэвіч і Вярбіцкі (таварышы старшыні), А. Цвікевіч, Г. Каўшыла, Т. Грыб і Я. Ладноў (сакратары). Пачынаючы з 10 снежня, разгарнулася актыўная работа ў секцыях і фракцыях. На з'ездзе было арганізавана 12 секцый па асобных галінах дзяржаўна-прававой, эканамічнай і культурнай дзеннасці. Барацьба паміж фракцыямі ішла галоўным чынам па пытанню аб форме самавызначэння Беларусі, яе ўзаемаадносінах з Расіяй. Таму на з'ездзе выразна вылучыліся дзве амаль што роўныя па колькасці групы дэлегатаў з рашаючым голасам: "радаўцы" – прыхільнікі пазіцыі ВБР і "абласнікі", якія выступалі за аўтаномію Беларусі ў складзе Савецкай Расіі. З самага пачатку на з'ездзе ўтварылася даволі ўплывовая левая фракцыя ў складзе 118 чалавек, у якую ўваходзілі бальшавікі, левыя эсэры і ім спачуваючыя прадстаўнікі левай плыні БСГ, дэлегаты ад БСДРП.

14 снежня, калі прыехала большасць дэлегатаў, з'езд абраў новы склад прэзідыума і сфарміраваў Савет з'езда. Старшынёй з'езда быў абраны І. Серада, таварышамі старшыні – А. Вазіла і А. Прушынскі, сакратарамі – Каляда і Шаўчук, таварышамі сакратара – Гушча і Т. Грыб. У Савет з'езда ўвайшлі 57 чалавек, у тым ліку І. Варонка (старшыня), К. Аляксееўскі, А. Бурбіс, Я. Дыла, Я. Карскі, Я. Канчар, А. Смоліч, С. Рак-Міхайлоўскі, А. Цвікевіч і інш. Мандатная камісія з'езда выдала 1167 мандатаў з правам рашаючага голасу і 705 з правам дарадчага. У ліку дэлегатаў з рашаючым голасам былі прадстаўнікі Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў (па аднаму на ўезд), губернскіх, уездных, валасных земстваў і самакіраванняў, губернскіх і ўездных зямельных камітэтаў, паштова-тэлеграфных служачых, настаўніцкіх арганізацый, саюза земскіх служачых, беларускіх нацыянальных арганізацый (па аднаму на губерню), воінаў арміі, флоту і тылу (па аднаму на 500 чалавек, беларусаў па нацыянальнасці), а таксама члены выканаўчых органаў ВБР, БАК, ЦБВР і Выканаўчага бюро з'езда беларусаў у Маскве. З дарадчым

голасам удзельнічалі прадстаўнікі партый, у тым ліку і нацыянальных: яўрэйскіх, польскіх і літоўскіх.

Трохдзённая дыскусія на з'ездзе агаліла разыходжанні Фракцый па пытаннях дзяржаўнага будаўніцтва Беларусі, сістэмы органаў улады, адносін да Савецкай Расіі. Галоўным лунктам разыходжання "радаўцаў" і "абласнікоў" стала пытанне аб абвяшчэнні Беларускай рэспублікі. "Радаўцы" патрабавалі неадкладна абвясціць беларускую дзяржаву. "Абласнікі" лічылі, што гэтую прапанову нельга рэалізаваць у тых канкрэтна-гістарычных умовах.

Вечарам 17 снежня была праведзена нарада Савета з'езда з лідэрамі фракцый і зямляцтваў для прыняцця агульнай рэза(293)люцыі. Пасля доўгіх дыскусій быў выпрацаваны адзіны тэкст рэзалюцыі аб самавызначэнні Беларусі і аб часовай краёвай уладзе і зачытаны дэлегатам з'езда ў 1 гадзіну 15 хвілін у ноч з 17 на 18 снежня. Рэзалюцыя складалася з 15 пунктаў, сярод якіх цэнтральнае месца займаў першы пункт. У ім надкрэслі. валася, што "...замацоўваючы сваё права на самавызначэнне абвешчанае расійскай рэвалюцыяй, і ўсталёўваючы рэспубліканскі дэмакратычны лад у межах Беларускай зямлі, для выратавання роднага краю і засцерагаючы яго ад падзелу і адарвання ад Расійскай Дэмакратычнай Федэратыўнай Рэс-публікі, з'езд пастанаўляе: неадкладна арганізаваць са свайго складу орган Краёвай улады ў асобе Усебеларускага Савета сялянскіх, рабочых і салдацкіх дэпутатаў, які часова становіцца на чале кіравання краем, уступаючы ў дзелавыя зносіны з цэнтральнай уладай, адказнай перад Саветам рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў".

У іншых пунктах рэзалюцыі падкрэслівалася, што Савет канцэнтруе ў сабе ўсе функцыі адказнага кіравання краем, павінен прыняць меры "да хутчэйшага склікання Беларускага Установчага сходу, які павінен вырашыць лёс беларускага народа". Астатнія пункты рэзалюцыі тычыліся арганізацыі беларускага войска, вырашэння зямельнага пытання, устанаўлення народнага кантролю над вытворчасцю, гандлем і інш.

Як бачна, выпрацаваная рэзалюцыя ўлічвала інтарэсы як "радаўцаў", так і "абласнікоў". У рэзалюцыі абыходзіцца нават назва Беларусі як аўтаномнай рэспублікі. Гаворка ідзе пра кіраванне краем, пра Беларусь, пра Расійскую Федэрацыю і сувязь з цэнтральнай уладай. Мелася на ўвазе федэратыўнасць Беларусі, але выразнае абвяшчэнне яе федэратыўнай рэспублікай у рэзалюцыі адсутнічае.

Пад уплывам левай фракцыі дэлегаты прынялі кампраміснае рашэнне аб часовым устанаўленні на Беларусі ўлады Усебеларускага

савета сялянскіх, салдацкіх і рабочых дэпутатаў і даручылі яму ў бліжэйшы час склікаць Устаноўчы сход, на якім і павінна быць вырашана пытанне аб беларускай дзяржаўнасці. Аднак такое рашэнне не задавальняла бальшавікоў. Пасля таго, як быў прыняты першы пункт рэзалюцыі У ноч з 17 на 18 снежня, з'езд быў разагнаны. Арыштавалі 27 удзельнікаў, у тым ліку і старшыню з'езда Івана Сераду. У пасланай 21 снежня старшынёй СНК Заходняй вобласці і фронту К. Ландарам тэлеграме Ураду Народных Камісараў, Камісару па нацыянальных справах Сталіну, УЦВК, рэдакцыі газеты "Праўда" давалася скажоная інфармацыя, звязаная з работай з'езда і прынятых рашэнняў. Пазней А. Чарвякоў, З. Жылуновіч і В. Кнорын выказвалі сваё сумненне ў неабходнасці акцыі разгону. Яны лічылі, што, абапіраючыся на левае крыло з'езда і паўплываўшы на тых, хто вагаецца, можна было стрымаць правых і нацэліць з'езд на рашэнне ў падтрымку існуючай улады.

Пасля разгону з'езда на пасяджэнні часткі яго прэзідыума 18 снежня быў створаны Выканкам Савета з'езда на чале з лідэрам народніцкага крыла БСГ Т. Грыбам, а Савет з'езда быў дапоўнены дэлегатамі ад зямляцтваў і іншых груп. Выканкам Савета, які існаваў нелегальна, здолеў паслаць неафіцыйную дэлегацыю на мірныя перагаворы ў Брэст-Літоўск.

На пасяджэнні III Усерасійскага з'езда Саветаў 12 студзеня 1918 г. Т. Грыб ад імя дэлегацыі беларускіх эсэраў выступіў з абвінавачваннямі аб самаўпраўстве Саўнаркама Заходняй вобласці і фронту, незаконнасці яго дзеянняў у адносінах да дэлегатаў з'езда. Аднак гэтае, як і іншыя выступленні, не знайшлі падтрымкі ў дэлегатаў з'езда. Як адзначана ў пратаколе пасяджэння, выступленне Т. Грыба было сустрэта вельмі непрыветліва", бо яго пазіцыя "не ўзгоднена з пазіцыяй беларускага пралетарыяту". У гэтым праявілася нежаданне кіруючай партыі ісці на кампрамісы з дробнабуржуазнай "нацыянальнай дэмакратыяй.

**Абвяшчэнне БНР і дзейнасць яе ўрадавых структур.** Наступленне аўстра-германскіх войскаў 18 лютага 1918 г. цалкам змяніла геапалітычную сітуацыю ў заходнім рэгіёне Расіі. нямецкія войскі занялі большую частку тэрыторыі Беларусі. некупіраванымі засталіся толькі 14 усходніх паветаў Віцебскай і Магілёўскай губерняў. Да гетманскай Украіны былі далучаны Гомельскі, Рэчыцкі, Мазырскі і Пінскі паветы. Ца пярэдадні ўступлення нямецкіх войскаў у Мінск Аблвыкамзах і СНК Заходняй вобласці і фронту 19 лютага з цяжкасцямі эвакуіраваліся ў Смаленск. З мінскай турмы выйшлі

дзеячы Цэнтральнай Беларускай вайсковай рады, аднавіў сваю дзейнасць Выканаўчы камітэт Савета Усебеларускага з'езда.

Кіраўніцтва беларускага нацыянальнага руху на акупіраванай тэрыторыі Беларусі свае далейшыя надзеі ў рэалізацыі плана адраджэння беларускай дзяржаўнасці звязвала з кайзераўскай Германіяй. Выканаўчы камітэт Савета з'езда 21 лютага 1918 г. выдаў Першую Устаўную грамату, у якой абвясціў сябе вышэйшай уладай у Беларусі. У грамаце падкрэслівалася, што здзейсніць сваё права на самавызначэнне беларускі народ можа толькі шляхам склікання на дэмакратычных пачатках Установчага сходу. Да гэтага часу выканаўча-распарадчым органам аб'яўляўся Народны сакратарыят. 22 лютага быў надрукаваны спіс членаў урада, які ўзначаліў І. Варонка. Найбольш важныя пасады занялі члены БСГ П. Бадунова, Т. Грыб, К. Езавітаў, А. Карач, П. Крэчэўскі і эсэры Г. Белкінд, Я. Бялевіч, П. Злобін, І. Макрэеў, В. Рэдзька, І. Серада. Партыя Паалей-Цыён была прадстаўлена М. Гутманам, БПНС прадстаўляў Л. Заяц.

Нямецкія ўлады аднесліся да дзейнасці Народнага сакратарыята даволі стрымана. Але як толькі ім была апублікавана пастанова № 1, згодна з якой казённая маёмасць на тэрыторыі Беларусі, установы, капіталы і цэннасці аб'яўляліся набыткам народаў Беларусі і пераходзілі ў распараджэнне Народнага сакратарыята, акупацыйныя ўлады адразу ж паказалі, хто з'яўляецца сапраўдным гаспадаром. 25 лютага У будынку, дзе размяшчаўся Народны сакратарыят, з'явіўся з атрадам салдатаў нямецкі камендант горада і выдварыў членау Народнага сакратарыята з памяшкання, канфіскаваў з касы сакратарыята 340 тыс. рублёў і зняў беларускі сцяг.

28 лютага дэлегацыя Народнага сакратарыята на чаяе з І. Варонкам наведала рэзідэнцыю германскай ваеннай адміністрацыі ў Мінску і выказала лаяльнасць у адносінах да акупацыйных уладаў. Аднак у хуткім часе рэйхсканцлер Германіі даў знаць, што Берлін разглядае Беларусь, як "частку Савецкай Расіі і па Брэсцкаму дагавору без урада Леніна гэтае пытанне сам вырашыць не можа". У сваю чаргу германскія акупацыйныя ўлады спасылаліся на тое, што яшчэ ў студзені 1918 г. з іх згоды ў Вільні адбылася другая беларуская асамблея, якая заявіла аб незалежнасці Беларусі і сфарміраванні сваёй адміністрацыі. (Маецца на ўвазе ўтварэнне Віленскай беларускай рады замест Беларускага народнага камітэта, якая ў пастанове ад 18 лютага 1918 г. заявіла аб парыванні сувязяў паміж Расіяй і Беларуссю).

Падштурхоўваемыя акупацыйнай уладай Выканкам Савета з'езда і Віленская беларуская рада пачалі ўзгадняць свае дзеянні,

вынікам якіх з'явілася абнародаваная заява, дзе прызнавалася неабходным утварыць Беларускую Народную Рэспубліку. Гэтая ідэя знайшла сваё афармленне ў выдадзенай 9 сакавіка 1918 г. II Устаўной грамаце. Беларусь у межах рассялення беларускага насельніцтва аб'яўлялася Народнай Рэспублікай. Грамата пацвярджала сацыяльныя заваёвы народных мас: 8-гадзінны рабочы дзень, свабода слова, друку, сходаў, забастовак, веравызнання, роўныя правы ўсіх народаў Беларусі.

Калі ў I Устаўной грамаце вырашэнне зямельнага пытання адкладвалася да Усебеларускага сходу, то згодна з 7-м пунктам II Устаўной граматы касавалася прыватная ўласнасць на зямлю, і яна перадавалася тым, хто на ёй працуе. Выканкам Савета з'езда з гэтага часу стаў называцца Радай Першага Усебеларускага з'езда, а 18 сакавіка быў перайменаваны ў Раду БНР, якая павінна была стаць заканадаўчым дзяржаўным органам. Колькасны састаў Рады быў даведзены да 71 чалавека. У Склад Рады, акрамя 56 членаў Савета Усебеларускага з'езда, уваходзілі прадстаўнікі правінцыяльных беларускіх рад, земскага і гарадскога самакіравання, прафсаюзаў рабочых, гандлёва-прамысловых арганізацый, саюза кааператараў Беларусі, мінскага праваслаўнага брацтва, польскай "Рады зямлі мінскай". Беларусаў налічвалася 36 чалавек. Па партыйнай прыналежнасці ў Радзе пераважалі прадстаўнікі БСГ. У яе склад уваходзілі прадстаўнікі Аб'яднанай яўрэйскай сацыялістычнай партыі, Бунда і Паалей-Цыёна, а таксама рускіх эсэраў і меншавікоў. У канцы сакавіка ў Раду было кааптавана 5 членаў Віленскай беларускай рады, на чале з яе старшынёй А. Луцкевічам, што ўзмацніла ў фракцыі БСГ незалежніцкую плынь.

Працягам працэсу нацыянальнага самавызначэння з'явілася прыняцце III Устаўной граматы. Пасля працяглых спрэчак раніцай 25 сакавіка была прынята рэзалюцыя, што "Рада БНР аб'яўляе Рэспубліку незалежнай, аб чым выдае адпаведную Устаўную грамату". Гарадская група Рады БНР і прадстаўнікі Бунда галасавалі супраць, земская група з 9 чалавек у знак пратэсту пакінула залу. Ад галасавання ўстрымаліся прадстаўнікі Аб'яднанай яўрэйскай сацыялістычнай партыі, Паалей-Цыёна і сацыялістаў-рэвалюцыянераў. Прынятая III Устаўная грамата канстытуіравала стварэнне незалежнай беларускай дзяржаўнасці; тым самым дэкларавала нераспаўсюджванне суверэнітэту Расіі на Беларусь. З 71 члена Рады за аддзяленне Беларусі ад Расіі галасавалі 40, супраць 22, устрымалася 9 членаў Рады. Згодна з III Устаўной граматай БНР аб'яўлялася ў складзе Магілёўскай, Мінскай, а таксама беларускіх частак Гродзенскай,

Віленскай, Віцебскай, Сма-ленскай, Чарнігаўскай і сумежных губерняў. Яна пацвярджала ўсе правы і свабоды грамадзян і народаў Беларусі, якія абвяшчаліся Устаўной граматай ад 9 сакавіка.

Такім чынам, Устаўныя граматы вызначалі асноўныя палажэнні аб грамадскім і дзяржаўным ладзе Беларусі. Беларусь аб'яўлялася дэмакратычнай, парламенцкай, прававой дзяржавай, у якой будуць гарантаваны правы ўсіх яе грамадзян і нацыянальных меншасцяў. Але своеасаблівасць сітуацыі, яе парадаксальнасць заключаліся ў тым, што БНР была аб'яўлена на тэрыторыі, дзе ўся ўлада належала нямецкай акупацыйнай адміністрацыі. Магчымасці рэалізацыі абвешчаных ідэй аб нацыянальнай свабодзе і дзяржаўнай самастойнасці істотна абмяжоўваліся палітыкай кайзераўскай Германіі, якая не збіралася прызнаваць якую-небудзь паралельную ўладу. Не дапамагла і прывітальная тэлеграма, пасланая 25 красавіка 1918 г. германскаму кайзеру Вільгельму II.

У той самы час германскія акупацыйныя ўлады ў сваёй палітыцы ўлічвалі магчымасці нацыянальнага руху на Беларусі. Падчас сустрэчы старшыні Народнага сакратарыята І. Варонкі і начальніка штаба 10-й арміі фон Штанпфа была дасягнута дамоўленасць аб стварэнні інстытута дарадчыкаў пры павятовых камендантах "у мэтах урэгулявання ўзаемаадносін насельніцтва і германскіх войскаў".

Такім чынам, у сваіх спробах стварыць беларускую дзяржаўнасць ва ўмовах акупацыі, дзеячы БНР апынуліся перад выбарам: весці барацьбу з акупантамі, аб'ядноўваючы пры гэтым усе патрыятычныя сілы, або супрацоўнічаць з акупацыйнымі ўладамі. Быў выбраны памылковы другі шлях.

Прагерманская арыентацыя не знайшла падтрымкі беларускага насельніцтва, якое выступіла з пратэстам супраць акупантаў, не спыняючыся і перад узброенай барацьбой. Вынікам такой палітыкі стаў востры ўнутраны крызіс урада БНР. Са складу Рады выйшлі гарадская група, прадстаўнікі Бунда, Аб'яднанай яўрэйскай сацыялістычнай партыі. БСГ распалася на 3 партыі: Беларускую сацыял-дэмакратычную партыю, Беларускую партыю сацыялістаў-федэралістаў і Беларускую партыю сацыялістаў-рэвалюцыянераў. Дзве апошнія выставілі лозунг барацьбы супраць Германіі і Расіі, заваяванне незалежнасці Беларусі, абапіраючыся на ўласныя сілы беларускага народа.

У знак нязгоды з курсам Рады члены БПС-Р Т. Грыб, П. Бадунова, А. Карач выйшлі ў пачатку мая са складу Народнага сакратарыята, але засталіся ў Радзе як непрымірымая апазіцыя. З

уключэннем 12 красавіка ў склад Рады 10 членаў кансерватыўна-клерыкальнага Беларускага народнага прадстаўніцтва на чале з Р. Скірмунтам сацыяльна-палітычны склад Рады стаў яшчэ больш стракатым. З другой паловы красавіка ў дзейнасці Рады БНР пераважае ліберальна-кансерватыўны напрамак. Такі курс знаходзіў падтрымку нямецкіх акупацыйных уладаў, якія адкрыта выказвалі незадавальненне "сацыялістычным" складам Рады. 12 чэрвеня І. Варонка падпісаў дэкрэт, згодна з якім абвяшчаліся нядзейснымі на тэрыторыі БНР "усе дэкрэты ўрада Леніна, а таксама былых народных камісараў Заходняй вобласці і фронту".

Рэакцыя нямецкіх акупацыйных уладаў на гэты дэкрэт, які знішчаў давер народных мас Беларусі да БНР, была станоўчай. 21 чэрвеня германскае камандаванне дало згоду на ўтварэнне пры павятовых камендатурах груп беларускіх дарадчыкаў. Аднак спробы Р. Скірмунта сфарміраваць па даручэнню нямецкага камандавання на працягу двух месяцаў новы склад Народнага сакратарыята поспеху не мелі. Прадстаўнікі сацыялістычных партый лічылі, што на аснове праграмы Скірмунта выйсця з палітычнага крызісу не будзе. Не знайшоў рашэння і І. Серада, які спрабаваў сфарміраваць новы ўрад.. Палітычны крызіс Рады БНР лета-восені 1918 г. пашырыўся.

На паглыбленне крызісу значнае ўздзеянне аказвала партызанская барацьба ў тыле нямецкіх войскаў, змяненне міжнароднага становішча Германіі. Паводле няпоўных звестак толькі на тэрыторыі Мінскага, Магілёўскага, Бабруйскага, Гомельскага, Рэчыцкага, Слуцкага і Быхаўскага паветаў да восені 1918 г. налічвалася каля 100 партызанскіх атрадаў.

Пасля падпісання 27 жніўня 1918 г. Савецкай Расіяй Германіяй Дадатковага дагавора, згодна з якім германска армія вызваляла тэрыторыю Беларусі да р. Бярэзіны ўключна, надзеі кіраўніцтва БНР на ўмацаванне сваёй улады з дапамогай акупацыйных уладаў пачалі хутка згасаць. У мэ тах стабілізацыі свайго ўнутрыпалітычнага становішча Радг БНР 9 кастрычніка прыняла пастанову аб павелічэнні свайго складу. З прыцягненнем прадстаўнікоў правых сіл, каталіцкага і праваслаўнага духавенства яе колькасны склад дасягнуў 101 асобы. Народны сакратарыят быў перайменаваны ў Раду народных міністраў, якую ўзначаліў А. Луцкевіч. Але адрасаваныя канцлеру Германіі, амерыканскаму прэзідэнту В. Вільсану пісьмы з просьбай прызнаць незалежнасць Беларусі, даць магчымасць беларускаму ўраду здзейсніць функцыі дзяржаўнага будаўніцтва і кіравання, арганізаваць сваю узброеную сілу засталіся без адказу.

Надзеі кіраўнікоў БНР на прызнанне і падтрымку заходнімі краінамі не спраўдзіліся і вымусілі іх шукаць кантактаў з савецкім урадам. Першая спроба наладзіць сувязі з Савецкай Расіяй была зроблена прэм'ер-міністрам урада БНР А. Луцкевічам у кастрычніку 1918 г. у час сустрэчы з прадстаўніком РСФСР Х. Ракоўскім у Кіеве. Як сведчыць дзённік А. Луцкевіча, ён не быў супраць федэрацыі з Савецкай Расіяй і ўвядзення савецкай канстытуцыі на Беларусі пры ўмове прызнання яе незалежнасці.

У сваю чаргу змены ва ўнутрыпалітычнай сітуацыі ў Польшчы абумовілі паглыбленую цікавасць кіраўніцтва РСФСР да БНР. Каб пазбавіць кіруючыя колы Польшчы магчымасці выкарыстаць БНР у сваіх мэтах, Масква праявіла зацікаўленасць да кіраўнікоў БНР. Праявай гэтага, як можна меркаваць на аснове ўспамінаў саратніка А. Луцкевіча прафесара В. Іваноўскага, было запрашэнне А. Луцкевіча ў Маскву У. Леніным для перамоў аб удзеле Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі ў беларускім савецкім урадзе, стварэнне якога прадугледжвалася пасля поўнага вызвалення тэрыторыі Беларусі ад войскаў кайзераўскай Германіі. У другой дэкадзе лістапада А. Луцкевіч прыехаў у Маскву.

Аднак маскоўскія перагаворы А. Луцкевіча з урадам РСФСР не былі завершаны. Падзеі ў Германіі, якія карэнным чынам мянялі геапалітычную сітуацыю ва Усходняй Еўропе, змянілі і падыход савецкага кіраўніцтва да вырашэння праблемы беларускай дзяржаўнасці. Калі 10 снежня 1918 г. Чырвоная Армія ўступіла ў Мінск, там ужо не было членаў Рады БНР, за выключэннем прадстаўнікоў партыі сацыял-дэмакратаў: старшыні Рады Я.Ю. Лёсіка, членаў Рады А.М. Уласава, А.А. Смоліча, В. Л. Іваноўскага, А.У. Прушынскага і інш. Луцкевіч выехаў у Вільню. Для перагавораў не было як аб'ектыўных, так і суб'ектыўных падстаў. Бо ў IV Грамаце ад 29 лістапада і V, апублікаванай 3 снежня 1918 г. напярэдадні ад'езду большасці членаў Рады БНР у Вільню, беларускі народ заклікаўся да стварэння на месцах "беларускіх Саветаў" якія павінны падпарадкоўвацца Радзе БНР і змагацца з Савецкай уладай. Аднак прадстаўнікі левых арганізацый схіляліся да сумеснай работы з Савецкай уладай.

Працэс станаўлення беларускай дзяржаўнасці быў складаны і супярэчлівы. У ім былі свае здабыткі і пралікі. Так, Народны сакратарыят і Рада БНР актыўна займаліся культурна-асветніцкай справай. На працягу 1918 г. у Мінску і Вільні на старонках беларускага перыядычнага друку ішла распрацоўка беларускай літаратурнай мовы. Пэўны ўклад у гэта ўнеслі А. Луцкевіч, Я. Лёсік і Я. Станкевіч. У

красавіку Радай БНР беларуская мова была аб'яўлена дзяржаўнай, пры Народным сакратарыяце пачалі працаваць курсы беларусазнаўства. Паводле розных падлікаў працавалі ад 150 да 350 беларускіх школ, 5 гімназій, Свіслачская семінарыя, Мінскі педагагічны інстытут, рэктарам якога з'яўляўся прафесар В. Іваноўскі. Пад кантролем БНР выходзіла 28 газет, працавалі 11 выдавецтваў.

Народны сакратарыят БНР праводзіў некаторыя мерапрыемствы ў галіне міжнароднай палітыкі. БНР мела сваіх прадстаўнікоў у Літве і Украіне, працавалі дыпламатычныя місіі ў Берліне і Варшаве. У Маскве дзейнічала консульства БНР. Урад Літвы згодна з дагаворам ад 11 лістапада 1920 г. прызнаў урад БНР на чале з В. Ластоўскім, прадставіў яму і Прэзідыуму Рады БНР фінансавую дапамогу і прытулак на правах экстэрытарыяльнасці ў Коўне.

Як бачна, Народны сакратарыят і Рада БНР утварылі пэўную палітычную структуру з зародкамі дзяржаўнай арганізацыі. Але ў прамым сэнсе БНР дзяржавай не была. Не было сапраўднай сістэмы органаў заканадаўчай, выканаўчай і судовай улады, сістэмы распрацоўкі і прыняцця законаў, забеспячэння іх выканання, аховы правоў і свабод грамадзян. Функцыі ўрада БНР абмяжоўваліся паўнамоцтвамі нацыянальнага прадстаўніцтва пры германскай акупацыйнай адміністрацыі і рашэннем задач у культурна-асветнай галіне.

Тым не менш, абвяшчэнне БНР і дзейнасць яе структур з'явіліся важным крокам на шляху да беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці. Пытанне аб праве беларускай нацыі на самавызначэнне было пастаўлена ў плоскасць яе практычнай рэалізацыі.

**Стварэнне Савецкай Сацыялістычная Рэспублікі Беларусь.** Беларускай дзяржаўнасці яшчэ прадстаяў працяглы і драматычны шлях рэалізацыі незалежніцкага ідэалу ў складаных гістарычных абставінах. Бо Беларусь у вачах палітыкаў Расіі і Польшчы, як справядліва канстатаваў ідэолаг беларускага нацыянальнага адраджэння А. Цвікевіч, – "суб'ектам праваадносін і адзінкай палітычна роўнай ... ніколі не лічылася".

Нягледзячы на прынятую "Дэкларацыю правоў народаў Расіі", уладныя структуры РСФСР вясной-летам 1918 г. не ішлі далей пазіцыі абласніцтва ў вырашэнні нацыянальнага пытання. Адміністрацыйная камісія УЦВК РСФСР прапанавала на тэрыторыі былой царскай Расіі ліквідаваць усялякі нацыянальны падзел і стварыць, акрамя Маскоўскай, яшчэ тры вобласці (камуны): Заходнюю, Паўночную і Уральскую. Заходнюю вобласць меркавалася стварыць у складзе Смаленскай, Віцебскай, Магілёўскай, Чарнігаўскай, Мінскай, Віленскай і Ковенскай губерняў з абласным цэнтрам у Мінску.

меліся і цяжкасці аб'ектыўнага характару. Сацыяльная база, на якую магла абаперціся ідэя дзяржаўнасці Беларусі, была даволі вузкая. Самасвядомасць асноўнай масы беларускага грамадства яшчэ праходзіла этап свайго фарміравання. Ва ўмовах вайны і эканамічнага разбурэння першачарговымі для насельніцтва з'яўляліся пытанні міру, хлеба, зямлі.

Аднак логіка гістарычнага развіцця, ваенныя ўзрушэнні абумовілі надзвычай хуткае выспяванне нацыянальнай ідэі ў грамадска-палітычным жыцці. Актыўнымі выразнікамі гэтай тэндэнцыі былі дзеячы левага крыла нацыянальна-вызваленчага руху Беларусі: З. Жылуновіч, А. Чарвякоў, І. Лагун, Я. Дыла, Б. Тарашкевіч, Я. Канчар і іншыя, якія ў пачатку 1918 г. склалі аснову Беларускага нацыянальнага камісарыята (Белнацкама), створанага ў адпаведнасці з дэкрэтам У. Леніна ад 31 студзеня 1918 г. Ён функцыянiраваў на правах аддзела Народнага камісарыята па справах нацыянальнасцяў РСФСР.

Белнацкам, камісарам якога да мая 1918 г. з'яўляўся А.Р. Чарвякоў, намеснікам – У. В. Скарынка (эсэр), меў аддзяленні ў Петраградзе, Віцебску, Саратаве і Смаленску. Разам з беларускімі секцыямі РКП(б) Белнацкам вёў палітычную і культурна-асветную работу сярод беларусаў на тэрыторыі Савецкай Расіі, клапаціўся пра бежанцаў, браў на ўлік беларускія арганізацыі і ўстановы, адкрываў беларускія школы і клубы, выдаваў літаратуру на беларускай і рускай мовах. Менавіта пад уплывам гэтых арганізацый ідэя Беларускай Савецкай Рэспублікі набывала ўсё большую падтрымку. Гэта выяўлялася ў прыняцці адпаведных рэзалюцый беларускімі сходамі, канферэнцыямі і з'ездамі. Характэрна, што ў гэтых рэзалюцыях меліся, як правіла, тры асноўныя пункты: непрызнанне БНР і яе ўрада, дэкларацыі ў падтрымку Савецкай улады, ідэя федэрацыі Беларусі з Расіяй.

Аднак імкненні да беларускай дзяржаўнасці нават на аўтаномных пачатках, ці ў федэратыўнай форме з Савецкай Расіяй поўнасцю ігнараваліся кіраўніцтвам Паўночна-Заходняга камітэта РКП(б) і Аблвыкамзаха на працягу ўсяго 1918 г. Аблвыкамзах адмаўляў нават пачатковую форму нацыянальнай і дзяржаўнасці Беларусі – абласную аўтаномію, прапанаваную Белнацкамам. Ідэі стварэння дзяржаўнасці проціпастаўляўся лозунг інтэрнацыянальнага адзінства працоўных Заходняй вобласці ў барацьбе з буржуазіяй.

Пазіцыі Белнацкама ў пытанні дзяржаўнасці падтрымлівалі беларускія секцыі РКП(б), якія існавалі ў 1918-1919 гг. у Петраградзе, Маскве, Варонежы, Казані, Невелі, Саратаве, Тамбове і іншых

гарадах. Праз газету "Дзянніца", якая з 3 снежня 1918 г. (№ 40) з'яўлялася адначасова і органам Маскоўскай беларускай секцыі РКП(б), беларускія секцыі сталі настойліва дамагацца рэалізацыі беларускім народам права на самавызначэнне на аснове савецкага ладу і ў саюзе з РСФСР.

У другой палове 1918 г. ўсё больш нарасталі непаразуменні паміж Паўночна-Заходнім абкамам РКП(б), з аднаго(304)боку, Белнацкамам і беларускімі секцыямі РКП(б) – з другога. У аснове разыходжанняў былі розныя падыходы да рэалізацыі прынцыпу самавызначэння і нацыянальнай дзяржаўнасці ва ўмовах дыктатуры пралетарыяту. Усе надзеі ў гэты час савецкае кіраўніцтва ўскладала на перамогу сусветнай пралетарскай рэвалюцыі.

Невыпадкова, што ў дырэктывах савецкага кіраўніцтва адносна заходніх тэрыторый, якія вызваляліся з-пад нямецкай акупацыі, не ўпамінаецца пра Беларусь. Вырашэнне праблемы беларускай дзяржаўнасці ставілася ў залежнасць ад развіцця падзей у Прыбалтыйскіх краінах, Польшчы і Цэнтральнай Еўропы.

Такая пазіцыя савецкага кіраўніцтва і кіраўніцтва Заходняй вобласці ў адносінах да дзяржаўнасці Беларусі выклікала занепакоенасць з боку Белнацкама і беларускіх секцый РКП(б). 19 лістапада 1918 г. з'явіўся востры артыкул у газеце "Дзянніца" пад характэрнай назвай "Як жа з Беларуссю?" (аўтар З. Жылуновіч). У артыкуле ў адрас Наркамнаца РСФСР і кіраўніцтва Заходняй вобласці робяцца адкрытыя папрокі, што ў іх дагэтуль няма праекта дзяржаўнага ўладкавання Беларусі.

Вырашальным крокам на шляху самавызначэння Беларусі з'явіліся рашэнні канферэнцыі беларускіх секцый РКП(б), якая адбылася 21-23 снежня 1918 г. у Маскве. Канферэнцыя прызнала неабходным стварэнне Часовага рабоча-сялянскага ўрада Беларусі, выбрала Цэнтральнае бюро беларускіх секцый РКП(б) з 5 членаў: З. Жылуновіча (старшыня), Ф. Балбекі, І. Няцецкага, М. Драка-Дракона, А. Чарвякова і кандыдата Я. Дылы. Цэнтральнаму бюро было даручана пасля прызначанай на канец 1918 г. VI Паўночна-Заходняй абласной канферэнцыі РКП(б) склікаць Усебеларускі з'езд камуністаў і стварыць нацыянальны партыйны цэнтр. Прынятыя дакументы паставілі ЦК РКП(б) перад неабходнасцю тэрмінова вырашыць праблему беларускай дзяржаўнасці. 24 снежня гэтае пытанне было разгледжана ў ЦК РКП(б), а назаўтра старшыня Наркамнаца РСФСР І. Сталін запрасіў да сябе на размову адказных супрацоўнікаў Белнацкама. У ходзе абмену думкамі яны прыйшлі да паразумення аб неабходнасці аб'явіць Беларусь незалежнай Сацыялістычнай Савец-

кай Рэспублікай. Сталін прапанаваў прадстаўнікам Белнацкама скласці спіс кандыдатаў на замяшчэнне пасад у Часовым рабоча-сялянскім урадзе Беларусі. На аб'яднаным экстраным пасяджэнні вечарам 25 снежня членаў калегіі Белнацкама, прадстаўнікоў Цэнтральнага бюро беларускіх ка-муністычных секцый і камітэта маскоўскай беларускай секцыі РКП(б) быў вызначаны спіс кандыдатаў у склад рабоча-сялянскага ўрада Беларусі ў складзе 15 чалавек. Старшынёй яго тайным галасаваннем быў абраны З. Жылуновіч.

Тады ж 25 снежня І. Сталін у тэлеграфнай размове з А. Мясніковым інфармаваў аб рашэнні ЦК, а 27 снежня правёў нараду ў Маскве з А. Мясніковым і М. Калмановічам. На гэтай нарадзе была акрэслена тэрыторыя Беларускай Рэспублікі з пяці губерняў: Гродзенскай, Мінскай, Магілёўскай, Віцебскай і Смаленскай, а таксама вызначаны склад урада (старшыня і 15 членаў) і паўнамоцтвы рэспублікі. Аб сама-стойнасці будучай ССРБ размова не вялася.

Такім чынам, пытанне аб самавызначэнні Беларусі стала вырашацца фактычна ў апошні тыдзень снежня 1918 г. Не было асобнага пытання пра абвяшчэнне беларускай рэспублікі і ў парадку дня VI Паўночна-Заходняй абласной канферэнцыі РКП(б), якая пачала сваю работу 30 снежня 1918 г. У даклад А. Мяснікова па пытанню "Бягучы момант" быў уключаны пункт "Беларуская Савецкая Рэспубліка", які змяшчаў прапанову "абвясціць Заходнюю камуну самастойнай Савецкай Сацыялістычнай Беларускай Рэспублікай". Дэлегаты пагадзіліся з такой прапановай і без абмеркавання прынялі прапанаваную рэзалюцыю пры 5-ці ўстрымаўшыхся.

У той самы дзень, 30 снежня, адзінагалосна была прынята асобная пастанова аб тэрыторыі Беларусі. Згодна з ёй асноўным ядром Беларускай Рэспублікі лічыліся губерні Мінская, Смаленская, Магілёўская, Віцебская і Гродзенская з прылеглымі да іх мясцовасцямі суседніх губерняў, населеных пераважна беларусамі. З. Жылуновічу і А. Чарвякову было даручана падрыхтаваць праект Маніфеста часовага рэвалюцыйнага рабоча-сялянскага ўрада.

Аднак пастановы 1 з'езда КП(б)Б (канферэнцыя канстытуіравалася ў І з'езд) не ліквідавалі ўсіх супярэчнасцяў і не спынілі далейшага змагання паміж беларускімі секцыямі РКП(б) і Цэнтральным бюро КП(б)Б. Барацьба разгарнулася як на з'ездзе, так і пасля яго. У склад Цэнтральнага бюро ўвайшлі амаль усе члены Паўночна-Заходняга абкама РКП(б) (13 чалавек), у мінулым праціўнікі ўтварэння ССРБ. Толькі З. Жылуновіч і І. Лагун з'яўляліся прадстаўнікамі беларускіх секцый РКП(б). На пасяджэннях ЦБ КП(б)Б 31 снежня 1918 г. і 1 студзеня 1919 г. разгарнуліся вострыя спрэчкі ў сувязі з

фарміраваннем Часовага ўрада рэспублікі. З. Жылуновіч дамагаўся 10 з 17 месцаў ва ўрадзе для прадстаўнікоў Белнацкама і ЦБ беларускіх камуністычных секцый, а таксама патрабаваў выключыць са складу ўрада А. Мяснікова, М. Калмановіча і Р. Пікеля, у мінулым праціўнікаў стварэння беларускай дзяржаўнасці. Пасля асабістых перагавораў І. Сталіна з З. Жылуновічам па тэлефоне апошні быў вымушаны зняць сваё патрабаванне. Позна вечарам 1 студзеня быў канчаткова сфарміраваны Часовы рабоча-сялянскі ўрад Беларусі ў склад якога ўвайшлі 7 прадстаўнікоў Белнацкама і беларускіх секцый РКП(б) і 9 прадстаўнікоў Паўночна-Заходняга абкама і Аблвыкамзаха. Старшынёй урада быў зацверджаны З. Жылуновіч.

Вечарам 1 студзеня 1919 г. па радыё быў абнародаваны Маніфест Часовага рабоча-сялянскага Савецкага ўрада Беларусі, які быў падпісаны ў спешцы толькі 5 членамі ўрада (З. Жылуновічам, А. Мясніковым, С. Івановым, А. Чарвяковым і І. Рэйнгольдам). Спачатку Маніфест быў напісаны на рускай мове. У пераклад тэксту Маніфеста на беларускую мову, зробленым З. Жылуновічам, А. Мяснікоў унёс папраўкі. Таму тэксты Маніфеста ў некаторых дэталях не супадаюць. У Маніфесце Беларусь урачыста абвяшчалася "вольнай незалежнай Сацыялістычнай Рэспублікай", заканадаўча замацоўваліся асноўныя палажэнні грамадскага і палітычнага ладу Беларусі, адмяняліся ўсе загады і распараджэнні акупацыйных уладаў. Рада БНР аб'яўлялася па-за законам.

У сувязі з абвяшчэннем Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі Аблвыкамзах 3 студзеня 1919 г. прыняў пастанову аб самароспуску і пераходзе ўсёй улады да Часовага рэвалюцыйнага рабоча-сялянскага ўрада Беларусі. Гэта пастанова была зацверджана Прэзідыумам УЦВК 11 студзеня 1919 г. 5 студзеня 1919 г. урад ССРБ пераехаў з Смаленска ў Мінск.

Трэба адзначыць, што ў многіх дзеячаў Рады БНР, у тым ліку і А. Луцкевіча, адносіны да ўтварэння ССРБ не былі катэгарычна адмоўнымі. Аднак большасць беларускіх нацыянальных дэмакратычных партый не прызналі беларускую дзяржаўнасць на савецкай аснове, разглядаючы яе як нешта незаконнае, штучнае, прынесенае звонку.

Часовы рабоча-сялянскі ўрад Беларусі пачынаў сваю дзейнасць у надзвычай цяжкіх палітычных і эканамічных умовах. На вызваленай ад нямецкіх акупантаў беларускай зямлі панавалі разруха і голад. У сувязі з гэтым Саўнаркам РСФСЯ прыняў пастанову выдзеліць ураду Беларусі 10 млн. рублёд для разгортвання дзяржаўнага, гаспадарчага і сацыяльнаі культурнага будаўніцтва. На

працягу снежня 1918 г. – студзеня 1919 г. адбыліся валасныя, павятовыя і губернскія з'езды Саветаў. Галоўны сэнс усёй перадвыбарнай кампаніі – барацьба за класавую чысціню Саветаў. ЦБ КП(б)Б дало ўстаноўку строга прытрымлівацца класавага адбору дэпутатаў. У выніку ў Саветы былі абраны ў асноўным камуністы, а таксама рабочыя і сяляне, што іх падтрымлівалі. Так, з'езд Саветаў Віцебскай губерні 20-21 студзеня 1919 г. абраў У склад губвыканкама 128 дэпутатаў, сярод якіх было 98 камуністаў. З 385 дэпутатаў Мінскага гарадскога савета 286 складалі камупісты. На працягу снежня-студзеня 1919 г. на Беларусі была створана адзіная сістэма дзяржаўнай улады: камітэты беднаты былі зліты з Саветамі, скасаваны ваенна-рэвалюцыйныя камітэты.

У складаных міжнародных абставінах, звязаных з распачатай польскай агрэсіяй, 16 студзеня 1919 г. ЦК РКП(б) прыняў рашэнне аб выхадзе Смаленскай, Віцебскай і Магілёўскай губерняў са складу ССРБ, аб'яднанні Мінскай і Гродзенскай губерняў з Лігоўскай ССР. Размаўляючы з прадстаўнікамі ЦБ КП(б)Б, У. Ленін матываваў такое рашэнне наступным чынам: "Рэспубліка буферная і патрэбна настолькі, паколькі мяжуецца з іншымі краінамі. Паколькі Смаленская, Віцебская і Магілёўская губерні не мяжуюцца з іншымі краінамі, пастолькі іх можна выключыць". Стварэннем ЛітБела як бы здымалася пытанне аб правамернасці далучэння ўсходніх этнічных беларускіх зямель да РСФСР.

У мэтах хутчэйшага правядзення ў жыццё гэтых рашэнняў на Беларусь быў накіраваны ўпаўнаважаны ЦК РКП(б) А. Іофе. Аднак з гэтым рашэннем не пагадзіўся ні ўрад рэспублікі, ні ЦБ КП(б)Б. Пазіцыя Часовага рабоча-сялянскага ўрада Беларусі была выкладзена ў пісьме, адрасаваным у ЦК РКП(б). У ім адзначалася, што пастанова ЦК РКП(б) аб аддзяленні ад Беларусі Віцебскай, Смаленскай і Магілёўскай губерняў карэнным чынам мяняе ўсю палітычную сітуацыю. Прычым пастанова парушае замацаваныя Расійскай Савец-кай Канстытуцыяй прынцыпы самавызначэння народаў і адмоўна адаб'ецца на жыццёвых інтарэсах беларускага пралетарыяту і сялянства". Аўтары пісьма З. Жылуновіч, А. Квачанюк, З. Чарнушэвіч, Я. Дыла, Ф. Шантыр, У. Фальскі. А. Чарвякоў, І. Пузыроў прасілі ЦК РКП(б) пераглядзець прынятае ім рашэнне. Аднак гэты зварот быў праігнараваны.

Нават былыя праціўнікі стварэння дзяржаўнасці Беларусі А. Мяснікоў, В. Кнорын, І. Рэйнгольд, С. Іваноў на пасяджэнні ЦБ КП(б)Б 22 студзеня выступілі супраць пазіцыі А. Іофе. Удзельнікі нарады падкрэслілі, што аддзяленне ад Беларусі усходніх губерняў разбурае

створаны і ў рэспубліцы "тэхнічны і прадуктовы апарат". Члены Бюро, зыходзячы з партыйнай дысцыпліны, былі вымушаны прыняць прапанову ЦК РКП(б), але вырашылі звярнуцца ў ЦК РКП(б) з просьбай аб перарашэнні пытання ўсходніх губерняў Беларусі.

Таму А. Іофе ў пісьме ад 28 студзеня старшыні УЦВК РСФСР і сакратару ЦК РКП(б) Я. Свярдлову адзначыў, што абедзве групы – З. Жылуновіча і А. Мяснікова – нікуды не вартыя. Беларусы, ці група Жылуновіча – нацыяналісты, я Мяснікоў і яго прыхільнікі, хаця не нацыяналісты, але сепаратысты яшчэ горшай маркі. І раіў іх разагнаць, паслаць на працу куды-небудзь далей ад Беларусі. Дэлегаты Мінскай губернскай партыйнай канферэнцыі ў канцы студзеня выказалі недавер члену і прадстаўніку ЦК РКП(б) А. Іофе і патрабавалі адазваць яго з Беларусі. Былі зроблены папрокі ў адміністрыраванні Я. Свярдлову.

Распачатыя спробы захаваць тэрытарыяльную цэласнасць Беларусі не ўдаліся. У рабоце І Усебеларускага з'езда Саветаў 2-3 лютага 1919 г. прыняў непасрэдны ўдзел Я. Свярдлоў, а таксама старшыня ўрада Літоўскай ССР В. Міцкявічус-Капсукас. 230 дэлегатаў з рашаючым голасам, з іх 213 былі членамі партыі і 44 – з дарадчым прадстаўлялі працоўных Мінскай, Гродзенскай і Магілёўскай губерняў, а таксама Віленскага павета Віленскай губерні. У сваім выступленні Я. Свярдлоў абвясціў пастанову прэзідыума УЦВК "Аб прызнанні незалежнасці Беларускай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі". З'езд звярнуўся да ўрадаў савецкіх рэспублік з прапановай "пайсці за прыкладам рабочых і сялян Беларусі і пачаць перагаворы пра наладжванне федэратыўных сувязяў з Савецкай Расіяй...". Было прадубліравана прынятае раней у Маскве рашэнне аб утварэнні Літоўска-Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі (ЛітБел). А 3 лютага дэлегаты з'езда прынялі першую Канстытуцыю БССР, зацвердзілі герб і сцяг рэспублікі. У склад ЦВК, абранага на з'ездзе, увайшло 50 чалавек (45 камуністаў, два бундаўцы, два члены партыі Паалей-Цыёна, адзін меншавік).

У хуткім часе І з'езд Савецкай Літвы, які праходзіў 17-21 лютага 1919 г., прыняў рашэнне аб аб'яднанні з БССР. 27 лютага былі створаны ЦВК Літоўска-Беларускай ССР (100 чалавек) і яго Прэзідыум на чале з К. Цыхоўскім, урад аб'яднанай рэспублікі – Савет Народных Камісараў на чале з В. Міцкявічусам-Капсукасам. У склад ЛітБел увайшла тэрыторыя Мінскай, Гродзенскай, Віленскай, Ковенскай і частка Сувалкаўскай губерняў з больш як 6-мільённым насельніцтвам. 1 сакавіка 1919 г. СНК ЛітБел ССР афіцыйна зацвердзіў назву

рэспублікі – Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка Літвы і Беларусі, а таксама флаг і герб рэспублікі (з надпісам "ССР Л і Б" на пяці мовах).

У сувязі з утварэннем Літоўска-Беларускай ССР узнікла неабходнасць зліць і камуністычныя партыі Літвы і Беларусі. На з'ездзе 4-6 сакавіка 1919 г. быў абраны ЦК Кампартыі Літвы і Беларусі. 6 сакавіка 1919 г. Пленум ЦК КП(б)Л і Б стварыў прэзідыум ЦК КП(б)Л і Б. Старшынёй прэзідыума быў абраны В. Міцкявічус-Капсукас, сакратаром В. Кнорын. Сталіцай новага дзяржаўнага ўтварэння стаў горад Вільня.

Такім чынам, Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка Беларусь, праз два месяцы пасля яе абвяшчэння, была фактычна ліквідавана. Частка яе тэрыторыі ўвайшла ў ЛітБел ССР. У адпаведнасці з рэкамендацыямі А. Іофе ў пачатку лютага 1919 г. З. Жылуновіч быў накіраваны на журналісцкую працу ў Харкаў. А. Мяснікоў, улічваючы яго ваеннае мінулае, у маі 1919 г. быў накіраваны на Усходні фронт у рангу камандуючага Паволжскім фронтам.

## ЛЕКЦЫЯ 17

## ПОЛЬСКА-САВЕЦКАЯ ВАЙНА 1 БЕЛАРУСЬ

- *Экспансія Польшчы ў Беларусі*
- *Аднаўленне ССРБ*
- *Заключэнне мірнага дагавора. Слуцкае паўстанне*

**Экспансія Польшчы ў Беларусі.** Пасля адраджэння польскай дзяржавы ў лістападзе 1918 г. яе кіруючыя колы сталі на шлях анексіі беларускіх этнічных зямель. У лістападзе 1918 г. польскія легіянеры занялі Аўгустоўскі павет Сувалкаўскай, а ў снежні Бельскі павет Гродзенскай губерняў. Дэкрэтамі польскага ўрада ў снежні 1918 г. гэтыя паветы былі далучаны да Польшчы. Накіраваныя ў студзені 1919 г. урадам БНР ноты пратэсту ўраду Польшчы і дыпламатычным прадстаўнікам ЗША, Вялікабрытаніі і Францыі былі праігнараваны.

Фінансавая падтрымка і ваенныя пастаўкі Францыі, Англія, ЗША далі магчымасць Польшчы да канца студзеня паставіць пад ружжо добра ўзброеную стотысячную армію, а ў красавіку 1920 г. яе колькасць на польска-савецкім фронце складала 300 тыс. чалавек. Галоўным аб'ектам ваенных дзеянняў польскіх войскаў у пачатку 1919 г., згодна з планам Начальніка польскай дзяржавы Ю. Пілсудскага, сталі беларуска-літоўскія землі. Тым самым, як справядліва сцвярджаюць сучаснь польскія гісторыкі, ён хацеў паставіць краіны Антанты на Парыжскай мірнай канферэнцыі перад фактам – анексіяй беларуска-літоўскіх зямель. Пачалося шырокамаштабнае наступленне польскіх войскаў.

Першае сутыкненне польскіх легіянераў з часцямі Чырвонай Арміі адбылося 16 студзеня ў 26 кіламетрах к захаду ад Ліды. Паўночная група пад камандаваннем генерала В. Івашкевіча, пачынаючы з 14 лютага, заняла большую частку Гродзенскай губерні, павяла наступленне ў напрамках Вільні і Ліда-Маладзечна. Паўднёвая – пад камандаваннем генерала А. Лістоўскага – наступала ў напрамках Баранавічы-Мінск, Кобрын-Пінск. Да сярэдзіны сакавіка былі захоплены Ваўкавыск, Слонім, Скідаль, Шчучын, Пінск, Баранавічы. 22 красавіка пасля трохдзённых баёў савецкія войскі пакінулі Вільню.

Зыходзячы з ідэі выканання Польшчай "асобай місіі" на ўсходзе Еўропы, Ю. Пілсудскі прапанаваў план стварэння ў гэтым рэгіёне максімальна шырокай федэрацыі дзяржаў пад гегемоніяй Польшчы. У 1919 г. ён фактычна меў два планы. У першым, "большым", прадугледжваўся антыбальшавіцкі саюз усіх нацыянальнасцяў

заходніх акраін былой царскай імперыі, з перспектывай свабоднага самавызначэння кож-най з іх пасля заканчэння вайны. У другім, "меншым", меркаваўся падзел спрэчных зямель Польшчай і Расіяй на аснове плебісцыту, які б быў праведзены пад міжнародным кантролем. У "большым" плане даваўся беларусам шанс на самавызначэнне, незалежна ад скептыцызму, з якім Пілсудскі ставіўся да іх дзяржаўных здольнасцяў. У "малым" – лічыў сэнсоўным падтрыманне беларусізму, але толькі на тэрыторыі Міншчыны, як процівагу расійскаму ўплыву. Каб падтрымаць федэралісцкія ілюзіі сярод часткі беларускага грамадства, Пілсудскі ў красавіку, а затым ў жніўні 1919 г. выступіў з адозвамі да жыхароў былога Вялікага княства Літоўскага. У іх ён абяцаў будаваць адносіны на роўных, даць магчымасць беларусам і літоўцам самім вырашаць канфесіянальныя і нацыянальныя пытанні.

Палітычныя апаненты Пілсудскага – нацыянал-дэмакраты – клалі ў аснову вызначэння ўсходніх граніц Польшчы гістарычны прынцып, г. зн. аднаўленне граніц 1772 г. з частковымі зменамі. Таму яны імкнуліся да прамой інкарпарацыі гэтых зямель у склад польскай дзяржавы.

У сувязі з захопам беларускіх, украінскіх і літоўскіх зямель Урады РСФСР і Літоўска-Беларускай ССР заявілі афіцыйны пратэст і прапанавалі ўраду Польшчы мірным шляхам вырашыць спрэчныя пытанні. Прапанова засталася без адказу. Адначасова былі праведзены мерапрыемствы ваеннага характару. 19 лютага быў створаны Заходні фронт. 8 красавіка 1919 г. у Літоўска-Беларускай Савецкай Рэспубліцы было ўведзена ваеннае становішча. Яе кіруючыя органы правялі партыйную, камсамольскую і агульную мабілізацыю ў Чырвоную Армію. У выніку было мабілізавана каля 93 тыс. чалавек. Значная частка іх была накіравана на Заходні фронт.

Наступленню польскіх войскаў садзейнічалі антысавецкія выступленні, якія мелі месца ў лютым - сакавіку ў Слуцку, Барысаве, а таксама ў Гомельскім, Рагачоўскім і іншых паветах. Яны з'явіліся ў першую чаргу вынікам незадаволенасці сялян з увядзеннем у пачатку 1919 г. "харчраскладкі", абавязковай здачы гаспадаркамі дзяржаве ўсіх "лішкаў" сельскагаспадарчай прадукцыі, забароны прыватнага гандлю, а таксама актыўных антысавецкіх дзеянняў эсэраў. Сваёй жорсткасцю выдзялялася выступленне салдат 67-га і 68-га стралковых палкоў Тульскай брыгады на чале з былым афіцэрам царскай арміі Стракапыгавым у сакавіку 1919 г. На участку Калінкавічы-Оўруч салдаты зняліся з фронту і рушылі на Гомель. Захапіўшы горад, яны грамілі савецкія ўстановы, арыштоўвалі

камуністаў. Абаронцы савецкай улады з ліку савецкіх і партыйных работнікаў горада, супрацоўнікі ЧК і міліцыі ў колькасці 300 чалавек забарыкадаваліся ў гасцініцы "Савой". У выніку артылерыйскага абстрэлу частка іх загінула, а астатнія вымушаны былі пайсці на перагаворы. Аднак дасягнутае пагадненне аб захаванні жыцця тым, хто абараняўся, было парушана, у выніку чаго 25 савецкіх і партыйных работнікаў Гомеля былі забіты. Намаганнямі часцей Чырвонай Арміі, сфарміраваных рабочых атрадаў мяцеж у Гомелі 29 сакавіка быў ліквідаваны. Своеасаблівым водгукам стракапытаўскага бунту з'явілася паўстанне ў канцы сакавіка каравульнай роты ў Рэчыцы.

Летам 1919 г. становішча на Заходнім фронце пагоршылася. У маі польскія войскі захапілі Смаргонь, Свянцяны, Лунінец і прасоўваліся ў глыб тэрыторыі Беларусі. Часці 15-й і 16-й армій у выніку бесперапынных чатырохмесячных баёў мелі вялікія страты ў людзях і ўзбраенні. На 15 чэрвеня іх асабовы склад не перавышаў 36 тыс. чалавек. Польскія войскі, якія дзейнічалі на Заходнім фронце, налічвалі больш за 96 тыс. чалавек. Улічваючы складанасць ваеннага становішча, былі мабілізаваны на Заходні фронт дадатковыя людскія рэсурсы. Толькі Гомельшчына і Віцебшчына далі фронту каля 40 тыс. байцоў. У Мінскай губерні было мабілізавана каля 35 тыс. рабочых і сялян чарговых гадоў прызыву. З ліку мабілізаваных былі цалкам ўкамплектаваны дзеючыя і сфарміраваны новыя вайсковыя часці – асобны рабочы полк войскаў ВЧК, Бабруйскі рабочы батальён і г. д. Заходні фронт дадаткова атрымаў фонды харчавання, адзення, абутку. Палепшыліся ўмовы ўтрымання параненых, удзялялася ўвага сем'ям чырвонаармейцаў. ЦВК Украіны, Літвы і Беларусі ў маі 1919 г. прынялі пастановы аб неабходнасці ваенна-палітычнага саюза. На аснове гэтых пастаноў ЦВК Расіі прыняў 1 чэрвеня рашэнне аб аб'яднанні ваенных сіл Савецкай Рэспублікі Расіі, Украіны, Латвіі, Літвы і Беларусі.

Праведзеныя мерапрыемствы ўмацавалі Заходні фронт, але не настолькі, каб можна было дабіцца павароту ў вайне. Калі ж з Францыі была перакінута добра абучаная і ўзброеная армія Галера, сілы польскіх войскаў амаль падвоіліся. 1 ліпеня яны пачалі агульнае наступленне на Заходнім фронце і ў той самы дзень захапілі Вілейку, а 3 ліпеня – Маладзечна. У мэтах цэнтралізацыі апаратыўнага кіраўніцтва войскамі 19 ліпеня Савет абароны ЛітБел ССР быў скасаваны, а яго функцыі перададзены Рэўваенсавету Заходняга фронту. Уся ўлада на неакупіраванай тэрыторыі была перададзена Мінскаму губернскаму рэўкому. Аднак становішча на фронце не

палепшылася. Нягледзячы на ўпартае супраціўленне чырвонаармейцаў і рабочых баявых атрадаў, якія абаранялі Мінск, 8 жніўня горад быў заняты польскімі войскамі.

Польскія войскі ў жніўні-верасні захапілі Ігумен (сучасны Чэрвень), Нова-Барысаў, Бабруйск, Жлобін, Рагачоў і Рэчыцу. Навісла пагроза над Гомелем. Аднак у працяглых і ўпартых баях польскія войскі панеслі значныя страты. У кастрычніку 1919 г. наступленне было спынена на лініі Заходняй Дзвіны: Полацк-Лепель-Барысаў, затым на поўдзень па Беразіне. Польскі ўрад для кіравання захопленымі тэрыторыямі стварыў Цывільнае кіраўніцтва ўсходніх зямель (ЦКУЗ) на чале з Ежы Асмалоўскім. Тэрыторыя Беларусі была падзелена на тры акругі – Віленскую, Брэсцкую і Мінскую, якія ў сваю чаргу дзяліліся на паветы. На чале акруг стаялі грамадзянскія акруговыя камісары, а на чале паветаў – павятовыя старасты. На пасады ва ўсіх установах прызначаліся мясцовыя польскія памешчыкі, якія ўладу выкарыстоўвалі перш за ўсё для расправы над сялянамі. Павятовымі старастамі прынцыпова назначаліся памешчыкі, войтамі ў гмінах – выключна палякі і католікі. Былі аб'яўлены незаконнымі ўсе аграрныя пераўтварэнні і адноўлена памешчыцкае землеўладанне. Насілле і рэквізіцыі, якім падвяргаліся вясковыя жыхары з боку польскіх вайсковых падраздзяленняў, жандармерыі і паліцыі,. грабеж маёмасці, тэрор і частыя расстрэлы падазроных у сімпатыях да Савецкай улады – усё гэта прыдавала новам уладзе рысы акупацыйнай. Толькі ў Мінску было арыштавана на 1000 жыхароў, з якіх 100 чалавек расстраляна па прыгаворах ваенна-палявога суда. Масавым разбоем адзначана знаходжанне польскіх інтэрвентаў у Рэчыцкім, Бабруйскім Пінскім і іншых паветах Беларусі. У Лідзе ў выніку ўчыненых імі пагромаў загінула звыш 100 чалавек.

Прыхільнікамі бальшавізму лічыліся нават праваслаўныя цэрквы і яўрэйскія сінагогі. Паспешліва перадаваліся католікам храмы, якія больш за сто гадоў знаходзіліся ва ўладанні праваслаўных. Такая палітыка праводзілася і ў тых мясцовасцях, дзе палякі складалі нязначны працэнт ад агульнага ліку жыхароў.

У беларускай інтэлігенцыі адмоўную рэакцыю выклікала знішчэнне ўсіх праяў адраджэння нацыянальнага жыцця. Рэквізіцыям і судовым праследаванням падвяргаліся незалежныя беларускія газеты. У Мінску забаронена было ставіць на сцэне п'есы папулярных бсларускіх пісьменнікаў – Янкі Купалы, Каруся Каганца і іншых аўтараў. Паводле ацэнкі II аддзела Генеральнага штаба Войска Польскага першапачатковы беларускі энтузіязм хутка

перайшоў у антыпатыю, ажно ўрэшце ператварыўся ў нянавісць да ўсяго польскага. Рост апазіцыйных настрояў сярод беларускіх палітычных партый дэмакратычнай плыні ўнёс у іх шэрагі раскол. Гэта праявілася ўжо на з'ездзе прадстаўнікоў беларускай грамадскасці Віленшчыны і Гродзеншчыны 9-10 чэрвеня 1919 г. у Вільні. Надзеі кіруючых колаў Польшчы, што ўдзельнікі нарады прымуць рашэнне аб далучэнні Беларусі да Польшчы, не спраўдзіліся. Дэлегаты з'езда, большасць якіх з'яўляліся прадстаўнікамі БПС-Р, а таксама БПС-Ф, пацвердзілі ідэю суверэннасці і непадзельнасці Беларусі, выказалі пратэст у сувязі з арыштамі беларускіх дзеячаў і забаронай беларускіх арганізацый польскімі ўладамі. З'езд абраў Цэнтральную беларускую раду Віленшчыны і Гродзеншчыны на чале з эсэрам К. Душэўскім.

Аднак частка беларускіх нацыянальных дзеячаў пад уплывам дэкларацыйных заяў Ю. Пілсудскага пайшла на супрацоўніцтва з польскімі акупацыйнымі ўладамі. Калі 18 верасня 1919 г. у Мінск прыязджаў Пілсудскі, дык яго віталі прадстаўнікі ўсіх беларускіх палітычных партый, апроч БПС-Р. Старшыня Рады БНР Я. Лёсік і яго намеснік А. Смоліч, іншыя дзеячы Рады БНР накіравалі Пілсудскаму ліст, у якім прасілі згоды на аднаўленне працы БНР і паступовую перадачу цывільнай улады ўраду БНР і арганізацыю беларускага войска. Старшыня ўрада БНР А. Луцкевіч летам 1919 г. знаходзіўся ў Парыжы, дзе беспаспяхова імкнуўся дабіцца ад удзельнікаў Парыжскай мірнай канферэнцыі прызнання незалежнасці Беларусі. Стаўка кіраўнікоў краін Антанты была зроблена на Польшчу ў яе барацьбе з бальшавіцкай Расіяй.

Яскравай праявай непрыняцця насельніцтвам Беларусі польскай акупацыйнай улады з'явілася разгортванне партызанскага руху. Гэта быў актыўны стыхійны пратэст насельніцтва. Разам з тым нельга недаацэньваць актыўную ролю ў разгортванні партызанскай барацьбы падпольных бальшавіцкіх арганізацый, што дзейнічалі ў Мінску, Бабруйску, Мазыры, Слуцку, Пінску, Барысаве, Лунінцы, Гродне, Ваўкавыску і іншых гарадах. Яшчэ ў маі 1919 г. ЦК КП(б)ЛіБ, абмеркаваў пытанне аб становішчы за дэмаркацыйнай лініяй і вырашыў накіраваць на акупіраваную тэрыторыю Беларусі і Літвы як мага больш камуністаў-падпольшчыкаў. Ён выступіў са зваротам да салдат польскай арміі аб спыненні братазабойчай вайны. У верасні 1919 г. было створана спецыяльнае бюро нелегальнай работы. У склад бюро ўваходзілі В.С. Міцкявічус-Капсукас, В.Г. Кнорын, В.А. Багуцкі. У кастрычніку сфарміраваліся два нелегальныя краёвыя партыйныя цэнтры ў Мінску і Гродне. У выніку на акупіраванай тэрыторыі

рэспублікі дзейнічалі 28 нелегальных камітэтаў, якія ў сваёй практычнай дзейнасці абапіраліся на нізавыя арганізацыі і ячэйкі.

Партызанскія атрады, значная частка якіх фарміравалася ў прыфрантавой зоне, цесна ўзаемадзейнічалі з чырвонаармейскімі часцямі Заходняга фронту. Штаб фронту каардынаваў іх дзеянні, дапамагаў набываць узбраенне, распрацоўваць планы баявых аперацый.

Найбольш буйной падпольнай арганізацыяй быў партыйны камітэт у Мінску, створаны ў жніўні 1919 г. Шырокую дзейнасць у польскім тыле разгарнуў Бабруйскі падпольны камітэт.

У тыле акупантаў стваралася разгалінаваная сетка партызанскіх атрадаў, байцамі якіх былі, галоўным чынам, сяляне і рабочыя. Летам і восенню 1919 г. партызанскі рух ахапіў Мінскі, Бабруйскі, Пінскі, Слуцкі, Мазырскі, Барысаўскі, Рагачоўскі, Віленскі, Гродзенскі і іншыя паветы. У Мінскім павеце дзейнічалі партызанскія атрады С. Плашчынскага, В. Пагірэйчыка, у Пінскім – атрад пад камандаваннем рабочага-цесляра Арбузава, у Бабруйскім – атрад пад камандаваннем І. Жынко, у Рудабельскай воласці – атрад імя III Інтэрнацыянала, які ўзначальваў В. Аляшкевіч. У раёне мястэчак Свіслач і Асіповічы дзейнічаў атрад пад камандаваннем Я. Багдановіча і А. Каралька. Арганізатарам партызанскага атрада ў Мазырскім павеце з'яўляўся незаможны селянін В. Талаш.

Восенню 1919 г. быў створаны штаб па кіраўніцтву партызанскім рухам у Мінскім павеце. Ён дыслацыраваўся ў прыгарадзе Мінска – Козыраве. З партызанскіх атрадаў Руд-бельскай воласці і валасцей Рагачоўскага павета, што з ёй межавалі, Бабруйскі падпольны камітэт сфарміраваў асобны партызанскі батальён імя Бабруйскага рэўкома (600 чалавек). Аб'яднанне партызанскіх сіл павысіла баяздольнасць партызан, дало магчымасць весці баявыя дзеянні супраць буйных часцей акупантаў. У Бабруйскім павеце быў створаны атрад пад камандаваннем М. Ляўкова. Новыя партызанскія атрады былі створаны ў раёне Жлобіна, Маладзечна, Слуцка.

На барацьбу з партызанскім рухам польскія акупацыйныя ўлады вымушаны былі здымаць з фронту вайсковыя часці. Так, у студзені 1920 г. у Рудабельскую воласць быў накіраваны карны атрад з 1500 чалавек пры 30 кулямётах. Карнікі палілі дамы і гаспадарчыя пабудовы, рабавалі і забівалі мірных жыхароў. 200 партызан і невялікі атрад чырвонаармейцаў былі акружаны ў раёне вёскі Новая Дуброва. Завязаўся няроўны бой. Загінулі памочнік камандзіра партызанскага атрада Максім Ус, многія партызаны. Карнікі таксама

панеслі значныя страты. Толькі каля вёскі Дуброва партызаны знішчылі 75 польскіх салдат.

Аднак рэпрэсіямі польскія акупацыйныя ўлады не маглі спыніць партызанскі рух. Пад вясну 1920 г. чыгуначныя ўчасткі Мінск-Вільня, Мінск-Баранавічы, Мінск-Барысаў амаль поўнасцю кантраляваліся партызанамі.

Узмацненне барацьбы насельніцтва Беларусі супраць польскіх інтэрвентаў актывізавала радыкальную плыню ў асяродку сацыяліс-таў-рэвалюцыянераў. 11 ліпеня 1919 г. ЦК БПС-Р апублікававаў дэкларацыю, у якой заклікаў усе палітычныя партыі і групы да аб'яднання і стварэння адзінага фронту барацьбы за вызваленне Беларусі. У асяродку партыі Узмацняецца левая плынь на чале з Я. Трафімавым, якая патрабавала пагаднення з бальшавікамі для сумеснай барацьбы з польскімі інтэрвентамі.

Восенню 1919 г. лідэры беларускіх эсэраў афіцыйна заявілі аб разрыве кааліцыі з тымі партыямі, якія супрацоўнічаць з польскімі акупантамі. На падпольнай канферэнцыі ў Мінску ў лістападзе была сфармуліравана новая тактычная лінія. Яна прадугледжвала часовы адказ ад барацьбы з савецкай уладай, адмову ад кааліцыі з буржуазна-нацыянальнымі партыямі і стварэнне "трэцяй сілы". Беларускія эсэры заявілі, што будуць дабівацца ўстанаўлення "сярэдняй" улады, якая стаіць паміж дыктатурай пралетарыяту і дыктатурай буржуазіі., Адмаўляючы Савецкую ўладу, як непрыдатную форму для дзяржавы працоўных, беларускія эсэры меркавалі, што найбольш адпаведнай інтарэсам усяго беларускага народа формай улады будзе беларуская працоўная рэспубліка. Гэта ў многім утапічная эсэраўская дактрына адлюстроўвала мары і надзеі сялянства, якое тады вяло актыўную барацьбу з польскімі інтэрвентамі і паступова асэнсоўвала свае сацыяльныя мэты.

Зыходзячы з тактыкі "трэцяга шляху", беларускія эсэры актывізавалі партызанскую барацьбу ў тыле польскіх войскаў. ЦК БПС-Р даручыў сваім губернскім камітэтам у Мінску, Гродне і Вільні прыступіць да фарміравання масавай партызанскай арміі. Ядром яе павінна была стаць так званая "Сувязь беларускага працоўнага сялянства", якая аб'ядноўвала некалькі дзесяткаў сялянскіх дружын. Уплыў эсэраў асабліва адчуваўся ў заходніх паветах Мінскай, Гродзенскай і беларускіх паветах Віленскай губерняў, дзе функцыяніравалі эсэраўскія "сялянскія дружыны".

Такая пазіцыя беларускіх эсэраў аб'ектыўна збліжала іх з падпольнымі камуністычнымі структурамі. У снежні 1919 г. у Смаленску на нарадзе прадстаўнікоў БПС-Р і ЦК КП(б)ЛіБ было

выпрацавана пагадненне аб сумеснай барацьбе за аднаўленне беларускай дзяржаўнасці, агавораны агульныя прынцыпы супрацоўніцтва і арганізацыі барацьбы з польскімі інтэрвентамі. Пагадненне падпісалі члены ЦК БПС-Р П. Бадунова, Я. Мамонька, А. Трафімаў, М. Асвенцімскі і Ф. Шантыр.

Зрух беларускіх эсэраў улева паглыбіў крызіс у беларускім нацыянальным руху. Спробы А. Луцкевіча ў час сустрэчы ў Варшаве з Ю. Пілсудскім у лістападзе 1919 г. вырашыць праблему дзяржаўнасці Беларусі вынікаў не далі. Самае большае, на што пагадзіўся Ю. Пілсудскі, з'явілася выданне дэкрэта ад 22 кастрычніка 1919 г., у адпаведнасці з якім былі створаны два пяхотныя батальёны "беларускага войска". Рознагалоссе ў беларускім нацыянальным руху яскрава выявілася на сесіі Рады БНР 12 снежня. Большая частка дэлегатаў з эсэраў і сацыялістаў-федэралістаў выступіла супраць усялякага пагаднення з польскім урадам і выказала недавер лідэрам сацыял-дэмакратычнай партыі, старшыні Рады БНР Я. Лёсіку і кіраўніку ўрада А. Луцкевічу. Другая частка Рады з сацыял-дэмакратычнай фракцыі (37 членаў Рады з 87) на чале з А. Смолічам заявіла аб сваёй польскай арыентацыі, заклікала сесію выказаць давер ураду Луцкевіча. Аднак большасць дэлегатаў не пагадзілася з такімі прапановамі. Таму паланафільская фракцыя ў знак пратэсту пакінула залу пасяджэння. Удзельнікі, якія засталіся, 13 снежня абралі новы склад Рады. Старшынёй Прэзідыума Рады быў абраны П. Крэчэўскі (сацыяліст-федэраліст), членамі – П. Бадунова, Я. Мамонька, М. Козіч (сацыялісты-рэвалюцыянеры) і В. Захарка (сацыяліст-федэраліст). Кабінет міністраў было даручана сфарміраваць В. Ластоўскаму.

Паланафільская фракцыя БПСД на кватэры А. Уласава абрала "Найвышэйшую раду" ў складзе І. Серады (старшыня), ф. Абрантовіча, В. Іваноўскага, Я. Лёсіка, С. Рак-Міхайлоўскага, А. Смоліча, К. Цярэшчанкі, А. Уласава. Сфарміраваць склад новага ўрада было даручана А. Луцкевічу. Аднак У абставінах, калі вырашальная роля ў беларускім нацыянальным руху адышла да БПС-Р, "Найвышэйшая рада" стала марыянеткай у польскай акупацыйнай адміністрацыі. Бо далей культурна-нацыянальнай аўтаноміі, прычым на тэрыторыі толькі Мінскай акругі, польскія ўлады не пайшлі. Сфарміраваны А. Луцкевічам урад у хуткім часе распаўся, а сам ён часова адышоў ад палітычнай дзейнасці.

Сумесная барацьба эсэраў і бальшавікоў супраць польскіх інтэрвентаў вызначыла збліжэнне некаторых іх ідэйна-палітычных пазіцый. На надзвычайнай нелегальнай канферэнцыі БПС-Р 3-7

сакавіка ў Мінску было афіцыйна заяўлена, што члены БПС-Р разам з усімі рэвалюцыйнымі сіламі выступа. юць за аднаўленне ўлады працоўнага народа. У прынятай праграме ставілася задача "аднаўлення Беларускай незалежнай сацыялістычнай рэспублікі ў этнаграфічных граніцах з Працоўнай Радай на чале, якая выбіраецца ўсім насельніцт. вам Беларусі".

У красавіку 1920 г. пасля разгрому дэфензівай Мінскага падпольнага партыйнага камітэта ЦК КП(б)ЛіБ ўвёў сваіх прадстаўнікоў у Беларускі паўстанцкі камітэт, арганізаваны эсэрамі ў Мінску. У яго склад увайшлі таксама прадстаўнікі іншых палітычных партый, якія дзейнічалі на тэрыторыі Бела-русі: рэвалюцыйных народнікаў-сацыялістаў, Паалей-Цыёна, Беларускай камуністычнай арганізацыі, створанай на аснове арганізацыі "Маладая Беларусь" (дзейнічала з 1 студзеня па жнівень 1920 г. да зліцця з КП(б)ЛіБ). Камітэт выконваў функцыі кіруючага цэнтра па арганізацыі ўзброенага супраціўлення польскім інтэрвентам.

6 красавіка 1920 г. у Маскву выехала дэлегацыя ЦК БПС-Р на чале з членам ЦК П. Бадуновай. У размове з І. Сталіным Бадунова заявіла, што беларускія эсэры адмежаваліся ад згодніцкіх і нацыяналістычных партый, якія згубілі сацыялістычнае аблічча, таму па свайму рэвалюцыйнаму характару беларускія эсэры з'яўляюцца самай блізкай да РКП(б).

Аднак прэтэнзіі БПС-Р на палітычную ўладу ў Беларусі былі асуджаны на няўдачу. У Савецкай Расіі блок бальшавікоў з левымі эсэрамі быў парваны яшчэ ў ліпені 1918 г. Кіраўнікі РКП(б) не збіраліся дзяліць уладу ў нацыянальных рэгіёнах з нацыянальна-дэмакратычнымі партыямі. Улічваючы складанае становішча на Заходнім фронце, ЦК РКП(б) запрасіў ЦК КП(б)ЛіБ даць тлумачэнне наконт гэтай партыі. За подпісам сакратара ЦК КП(б)ЛіБ В. Кнорына ў накірава-най у Маскву дэпешы падкрэслівалася, што БПС-Р сярод працоўных мас ніякага даверу не мае і складаецца з невялічкай групы беларускіх інтэлігентаў (8-10 чалавек), а беларускі нацыянальны рух у сучасны момант ніяк сябе не праяўляе. Трэба адзначыць, што Беларуская партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў у той час уяўляла самую шматлікую палітычную арганізацыю Беларусі. Яна аб'ядноўвала больш за 20 тыс. чалавек (падпольныя бальшавіцкія арганізацыі пазам з Беларускай камуністычнай арганізацыяй не перавышалі 4 тыс. чалавек). Пад кіраўніцтвам эсэраў дзейнічаў Саюз моладзі, які налічваў 10 тыс. членаў. Партыю эсэраў падтрымлівалі Беларускі настаўніцкі саюз, прафесійныя саюзы чыгуначнікаў, паштова-тэлеграфных служачых і інш.

Між тым становішча на польска-савецкім фронце абвастрылася. У пачатку сакавіка 1920 г. войскі Польшчы пачалі ваенныя дзеянні на Палессі на стыку Заходняга і Паўднёва-Заходняга франтоў. 5-6 сакавіка яны захапілі Мазыр, Рэчыцу, Калінкавічы. У канцы красавіка наступленне пачалося і на Украіне.

У абставінах, што скаліся на той час, Палітбюро ЦК РКП(б) 28 красавіка 1920 г. зацвердзіла план адпору Польшчы, у якім прадугледжвалася нанясенне галоўнага удару войскамі Заходняга фронту ў напрамку Мінск-Беласток-Варшава. Галоўнакамандуючым фронтам быў назначаны 27-гадовы М. Тухачэўскі, начальнікам палітаддзела А. Мяснікоў. Наступленне пачалося 14 мая даволі паспяхова. Але ў выніку падмацавання польскіх войскаў наступленне ў канцы мая было спынена. У пачатку чэрвеня савецкія войскі былі адкінуты зноў за Бярэзіну.

**Аднаўленне ССРБ.** Пасля таго, як войскі Заходняга фронту атрымалі падмогу, (толькі ў чэрвені звыш 70 тыс.), у сярэдзіне чэрвеня Мазырская група сумесна з часцямі Паўднёва-Заходняга фронту пачала баявыя дзеянні супраць правага фланга польскіх войскаў. Група фарсіравала Днепр і вызваліла Мазыр, Рэчыцу і іншыя населеныя пункты.

7 ліпеня пачалося наступленне на Мінскім напрамку, 11 ліпеня Мінск быў вызвалены. З гэтага часу пачаўся новы этап баявых дзеянняў – праследаванне праціўніка. 14 ліпеня савецкія войскі занялі Вільню, 19 ліпеня – Гродна, а 1 жніўня пасля моцных баёў авалодалі Брэстам. Польскія войскі панеслі вялікія страты, асабліва 1-я польская армія. Склаліся аб'ектыўныя ўмовы для аднаўлення беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці.

Аднак для савецкага кіраўніцтва вырашэнне гэтага пытання было падпарадкавана ваенна-палітычнай мэце – курсу на практычную рэалізацыю ідэі сусветнай пралетарскай рэвалюцыі. Пазней у палітычнай справаздачы ЦК РКП(б) IX Усе-расійскай канферэнцыі РКП(б) (22-25 верасня 1920 г.) У. Ленін адкрыта заявіў, што наступам на Варшаву Цэнтральны Камі-тэт імкнуўся дапамагчы "саветызацыі Літвы і Польшчы...".

Згодна з падпісаным 12 ліпеня 1920 г. у Маскве мірным дагаворам паміж Літвой і РСФСР частка этнічнай беларускай тэрыторыі з гарадамі Гродна, Шчучын, Ашмяны, Смаргонь, а таксама Віленскі край з Вільняй былі прызнаны часткай Літвы. Дагавор вырашаў на карысць Літвы пытанне аб прыналежнасці гістарычнай сталіцы Вялікага княства Літоўскага – Вільна, што з'яўлялася аб'ектам вострага супрацьста-яння паміж польскім і літоўскім кіраўніцтвам.

Такім чынам, дагавор гарантаваў нейтралітэт Літвы ў ходзе савецка-польскай вайны, бяспеку правага фланга войскаў Заходняга фронту ў яго наступленні на Варшаву. Былая Літоўска-Беларуская ССР юрыдычна перастала існаваць. Пачалася практычная рабога па аднаўленню беларускай дзяржаўнасці.

Для падрыхтоўкі Дэкларацыі аб абвяшчэнні беларускай дзяржаўнасці ў другі раз была створана камісія. У склад яе ўвайшлі 4 прадстаўнікі БПС-Р (Я. Бялькевіч, П. Берднік, Я. Мамонька і М. Пашкевіч), 2 – ад КП(б)ЛіБ (А. Чарвякоў і В. Кнорын), ад Беларускай камуністычнай арганізацыі (БКА) –У. Ігнатоўскі, ад Бунда - А. Ванштэйн. На першым сходзе камісіі былі пастаўлены пытанні: Беларусь і яе межы, адносіны да суседзяў, дзяржаўна-палітычны лад Беларусі, зямельнае, эканамічнае, ваеннае іiытанні і інш. Фактычна па кожнаму з іх прадстаўнікі БПС-Р мелі свой пункт гледжання, які не супадаў з пазіцыяй камуністаў. Так, у пы'ганні аб межах Беларусі прадстаўнікі БПС-Р настойвалі, каб у акце абвяшчэння незалежнасці Беларусі быў ясна акрэслены прынцып этнічнага самавызначэння Але прадстаўнік камуністаў В. Кнорын адказаў, што яны "не могуць дапусціць каб Смаленская, Магілёўская і Віцебская губерні адышлі да Беларусі, таму што жывуць там рускія людзі і што там няма беларусаў". Прадстаўнікі БПС-Р афіцыйна заявілі, што пад такой Дэкларацыяй яны сваіх подпісаў не паставяць, і адмовіліся ўвайсці ў склад створанага 30 ліпеня 1920 г. Ваенрэўкама Беларускай рэспублікі, які замяніў Мінскі губрэўкам.

На ўрачыстым абвяшчэнні ССРБ, што адбылося 31 ліпеня 1920 г. у памяшканні гарадскога тэатра, прысутнічалі прад-стаўнікі КП(б)ЛіБ, БКА, Бунда, Паалей-Цыёна, савецкіх і прафесійных арганізацый. Я. Мамонька ад імя БПС-Р растлумачыў прысутным сутнасць разыходжання з камуністамі. Ён заявіў, што эсэры будуць працаваць і дапамагаць "савецкаму ўраду ў справе культурнага і эканамічнага будаўніцтва Беларусі". Але за палітыку адказваць не будуць.

Аднак ЦК КП(б)ЛіБ выказаўся за разрыў адносін з беларускімі эсэрамі. На пасяджэнні 4 жніўня Мінскага губернскага камітэта КП(б)ЛіБ прапанова ЦК БПС-Р правесці перагаворы была адхілена. Кароткатэрміновае пагадненне з БПС-Р у тых гістарычных абставінах было, па сутнасці, кампрамісам Савецкай улады з шырокімі сялянскімі масамі і беларускай інтэлігенцыяй.

Далейшая рэчаіснасць паказала шкоднасць тактычнай лініі на раз'яднапне беларускіх нацыянальных дэмакратычных сіл, якія выступалі за тэрытарыяльную цэласнасць Беларусі. Калі пачаліся

перагаворы ў Рызе паміж расійскай і польскай дэлегацыямі аб умовах прэлімінарнага дагавору, патрэбна было вб'яднанне сіл. На практыцы гэта не адбылося.

Этнічная тэрыторыя беларускай нацыі аказалася падзеленая на тры часткі. Як суверэнная дзяржава Беларуская рэспубліка існавала пасля другога абвяшчэння ў межах шасці паветаў (Бабруйскі, Барысаўскі, Ігуменскі, Мазырскі, часткова Мінскі і Слуцкі) былой Мінскай губерні. Яе плошча складала 52,4 тыс. км$^2$, а насельніцтва 1 544 000 чалавек.

Ці разумелі кіраўнікі Савецкай Беларусі ўсю складанасць сітуацыі, у якой апынулася новаўтвораная беларуская дзяржаўнасць? Чаму не была вырашана праблема далучэння ўсходніх этнічных зямель Беларусі?

Безумоўна, разумелі. Але абмеркаванне пытання "Аб тэрыторыі Беларусі" на пасяджэнні Цэнтральнага Бюро КП(б)Б ад 11 лістапада 1920 г. засталося безвыніковым. Адзначалася, што ва ўмовах, якія склаліся пад час савецка-польскай вайны, стазіць пытанне перад кіраўніцтвам РСФСР "Аб пашырэнні тэрыторыі Беларусі... несвоечасова". Аднак рэальнае жыццё вельмі хутка паказала, што штучны разрыў адзінага этнасацыяльнага арганізма з'яўлялася перашкодай паспяховага нацыянальна-дзяржаўнага, эканамічнага і культурнага будаўніцтва рэспублікі.

**Заключэнне мірнага дагавора. Слуцкае паўстанне.** 11 ліпеня міністр замежных спраў Англіі Дж. Керзан па даручэнню Вярхоўнага Савета Антанты накіраваў Савецкаму ўраду радыёграму з патрабаваннем спыніць наступленне савецкіх вой-скаў па лініі Гродна-Ялаўка-Няміраў-Брэст-Літоўск і далей па тэрыторыі Украіны да Карпат, зацверджанай у снежні 1919 г. тэрытарыяльнай камісіяй Парыжскай мірнай канфе-рэнцыі ў якасці ўсходняй часовай граніцы Польшчы. Гэтая прапанова разглядвалася 17 ліпеня на пасяджэнні ЦК РКП(б). Большасць членаў ЦК, у тым ліку У. Ленін, выказалася за перанясенне баявых дзеянняў на захад ад "лініі Керзана". Урад РСФСР у той самы дзень паведаміў ураду Вялікабры-таніі аб намеры адмовіцца ад прапановы аб пасрэдніцтве, запатрабаваўшы ад Польшчы прамога звароту да РСФСР з просьбай аб перамір'і і заключэнні міру. Савецкі ўрад імкнуўся выкарыстаць гэтыя спрыяльныя, на яго погляд, ваенныя абставіны. Кіраўнікам РСФСР у канцы ліпеня здавалася, што Польшча пераможана. Гэта быў сур'ёзны палітычны пралік, які катастрафічна адбіўся на ходзе мірных перагавораў.

З пераносам у пачатку жніўня 1920 г. баявых дзеянняў на тэрыторыю Польшчы выразна праступілі палітычныя матывы і мэты вайны з боку Савецкага ўрада. З абарончай яй ператварылася ў сродак экспарту сусветнай пралетарскай рэвалюцыі. Створаны 30 ліпеня ў Беластоку Часовы рэвалюцыйны камітэт Польшчы (Польрэўкам) у складзе Ю. Мархлеўскага (старшыня), Ф. Дзяржынскага, Ф. Кона, І. Уншліхта замест надзялення зямлёй беззямельных сялян за кошт памешчыцкіх зямель, пачаў ствараць буйныя дзяржаўныя гаспадаркі. Такая палітыка не знайшла падтрымкі ў сялян.

Адказам на наступленне Чырвонай Арміі быў моцны нацыянальна-патрыятычны ўздым польскага народа. Польшчы была аказана ваенная, дыпламатычная і маральная падтрымка з боку Францыі, Вялікабрытаніі, Італіі і ЗША. Савецкія войскі былі аслаблены, панеслі вялікія страты, не хапала боепрыпасаў, іх тылы адсталі на 200-300 кіламетраў. Папоўненыя новымі часцямі і злучэннямі, польскія войскі перайшлі 16 жніўня ў контрнаступленне пад Варшавай. У баях на польскай тэрыторыі 5 савецкіх армій былі цалкам разгромлены, астатнія панеслі цяжкія страты. Ініцыятыва перайшла да польскіх войскаў, якія 21 жніўня занялі Брэст-Літоўск.

У гэтых умовах савецкае кіраўніцтва заявіла аб гатоўнасці да мірных перагавораў. Перагаворы пачаліся 17 жніўня 1920 г. у Мінску ў неспрыяльных для савецкага боку абставінах, а ў верасні былі перанесены ў Рыгу. Аднак у прадстаўленай савецкай дэлегацыяй Дэкларацыі аб асноўных умовах міру не ўлічвалася зменен ае ваенна-аператыўнае становішча. У тэрытарыяльным пытанні дэлегацыя РСФСР настойвала на правядзенні савецка-польскай граніцы ў адпаведнасці з "лініяй Керзана" з перадачай Польшчы зямель у раёнах Беластока і Хелма (на Украіне). Польскі бок адхіліў патрабаванні, у тым ліку і тэрытарыяльныя, спасылаючыся на тое, што прапанаваная лінія граніцы супадае з лініяй трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай і абражае нацыянальныя пачуцці палякаў.

На пасяджэнні надзвычайнага органа ўлады Польшчы – Савета абароны дзяржавы (САД) 11 верасня 1920 г. былі Разгледжаны перспектывы заключэння міру з РСФСР. САД выказаўся за ўключэнне ў склад Польшчы Віленшчыны, Гродзеншчыны і часткі Мінскай губерні, правядзення ўсходняй граніцы Польшчы па лініі "нямецкіх акопаў". Гэтае рашэнне было пакладзена ў аснову практычных дзеянняў польскай дэлегацыі па перагаворах у Рызе. Дыпламатычныя акцыі польскай дэлегацыі былі падмацаваны актыўнымі ваеннымі дзеяннямі. 19 верасня польскія войскі перайшлі ў новае наступленне,

захапілі Бярозу-Картузскую, 23 верасня Ваўкавыск, а ў канцы месяца – Пінск.

Савецкі ўрад быў зацікаўлены ў хутчэйшым заключэнні міру. У Чырвонай Арміі масавы характар набыло дэзерцірства. Толькі з 1 жніўня па 15 кастрычніка 1920 г. у часці Заходняга фронту было вернута звыш 17 тыс. дэзерціраў. Адмоўна настроеныя да Савецкай улады дэзерціры аб'ядноўваліся ва ўзброеныя атрады і наносілі ўдары па армейскіх тылавых камунікацыях. Мелі месца адмовы ад выканання загадаў. На поўдні Расіі дзейнічала армія генерала Урангеля. Савецкай дэлегацыі, якую ўзначальваў А. Іофе, у другой палове верасня было прадпісана ісці пры неабходнасці насустрач патрабаванням Польшчы ў частцы змянення яе межаў.

У такіх умовах прымаліся рашэнні, якія вызначалі лёс Беларусі. Фармальна Ваенна-рэвалюцыйны камітэт ССРБ выдаў 10 верасня дэлегацыі РСФСР мандат на вядзенне перагавораў. 18 верасня, згодна з тэлеграмай наркама замежных спраў РСФСР Г. Чычэрына, у Рыгу выехалі старшыня Ваенрэўкама ССРБ А. Чарвякоў і сакратар ВРК І. Клішэўскі. Але за стол перагавораў іх так і не дапусцілі, па той прычыне, што польская дэлегацыя адмовілася прызнаць паўнамоцтвы прадстаўнікоў Савецкай Беларусі. У пачатку кастрычніка яны вярнуліся ў Мінск. Не дапусцілі да перагавораў і дэлегацыю БНР, якая 5 кастрычніка 1920 г. прыехала ў Рыгу ў складзе старшыні Рады В. Ластоўскага, міністра юстыцыі А. Цвікевіча, сакратара У. Пігулеўскага.

12 кастрычніка 1920 г. на ўмовах анексіі беларускіх і ўкраінскіх зямель быў заключаны дагавор аб перамір'і і прэлімінарных умоў міру. Нягледзячы на тое, што ваенныя дзеянні на Заходнім фронце павінны былі спыніцца 18 кастрычніка, польскія войскі працягвалі наступаць. Баі завязаліся на подступах да Мінска. 15 кастрычніка польскія войскі зноў занялі Мінск, але 17 кастрычніка пакінулі горад, бо па ўмовах перамір'я сталіца Беларусі заставалася за савецкім бокам.

Аднак і пасля заключэння перамір'я польскія ўлады не пакінулі захопніцкіх намераў. З Прыбалтыкі на Беларусь у паён Турава і Давыд-Гарадка былі перакінуты сфарміраваныя ў Эстоніі са згоды польскага ўрада ваенныя фарміраванні С. Булак-Балаховіча лікам звыш 10 тыс. чалавек. Булак-Балаховіч устанавіў цесныя кантакты з Б. Савінкавым, а таксама з беларускімі нацыянальнымі дзеячамі П. Алексюком, А. Адамовічам, В. Адамовічам, Ю. Сянкевічам, якія перадалі ў яго распараджэнне ўзброеныя атрады арганізацыі "Зялёны дуб". У пачатку лістапада армія С. Булак-Балаховіча перасекла

дэмаркацыйную лінію і заняла Петрыкаў, Мазыр, Рэчыцу, Калінкавічы. Барацьбу з Булак-Балаховічам вяла 16-я армія, часці якой панеслі значныя страты ў папярэдніх баях з польскімі войскамі. Атрады Булак-Балаховіча ў занятых мясцовасцях чынілі расправу над савецкімі работнікамі, рабавалі мясцовае насельніцтва. Атрымаўшы падмаца-ванні, 16 лістапада злучэнні 16-й арміі перайшлі ў наступленне. На працягу тыдня "добраахвотная армія" была поўнасцю разгромлена ў раёне Мазыра, Калінкавіч і Рэчыцы.

Адначасова ў Слуцкім павеце адбыліся падзеі, што атрымалі пазней назву "Слуцкае паўстанне". Слуцкі павет паводле ўмоў прэлімінарнага дагавору адыходзіў да тагачаснай ССРБ. Кіраўнікі Слуцкага БНК вырашылі скарыстаць зручны момант і абвясціць тэрыторыю павета незалежнай. Яго старшыня П.Я. Жаўрыд быў адкамандзіраваны ў Варшаву да Найвышэйшай Рады за інструкцыямі. Польскае камандаванне зацягвала вывад сваіх войскаў з Случчыны. У якасці "першага кроку па абвяшчэнню самастойнасці камітэт прыняў "пастанову аб скліканні з'езда Случчыны. Для падтрымання парадку быў арганізаваны штаб міліцыі, на месцах створаны валасныя камітэты.

З'езд Случчыны, на які былі запрошаны прадстаўнікі ўсіх валасцей і мястэчак павета ў ліку 107 дэлегатаў, адбыўся 14-15 лістапада 1920 г. Пасля дыскусій была прынята рэзалюцыя, згодна з якой Слуцкі павет аб'яўляўся незалежнай тэрыторыяй Беларускай Народнай Рэспублікі. Новая радя Случчыны на чале з суддзёй Слуцка У. Пракулевічам прыняла рашэнне аб фарміраванні "першай беларускай брыгады". Камісар Рады Жаўрыд аддаў загад аб мабілізацыі насельніцтва ва ўзросце ад 16 да 50 год. Была сфарміравана брыгада ў складзе двух палкоў лікам каля 4 тыс. чалавек. Не хапала ўзбраення, амуніцыі, ваеннай падрыхтоўкі, а галоўнае – жадання ваяваць. Беларуская вайсковая камісія ў Лодзі прыслала 12 афіцэраў на чале з яе старшынёй капітанам Якубецкім. Камандзірам брыгады быў прызначаны капітан Анцыповіч, якога потым змяніў штабс-капітан А. Сокал-Кутылоўскі.

Пасля другога папярэджвання савецкім бокам польска-му камандаванню 24 лістапада польскія войскі пакінулі Слуцк і адышлі за дэмаркацыйную лінію. Кіраўніцтва Слуцкай рады таксама пакінула Слуцк і размясцілася ў мястэчку Семежава (8 км ад граніцы). Пачаткам баявьн дзеянняў можна лічыць 26-27 лістапада, калі першы Слуцкі полк, а затым другі Грозаўскі пачалі рабіць напады на палявыя заставы і варты 8-й дывізіі 16-й арміі. Са згоды польскага камандавання часці 16-й арміі былі ўведзены ў нейтральную зону на 3

дні для ачысткі ад антысавецкід узброеных фарміраванняў. Пасля ўзброенага сутыкненш пад Семежавам 6-7 снежня частка Слуцкай брыгады вымушана была перайсці польскую мяжу, пасля чаго палякамі было інтэрніравана 30 афіцэраў і 400 салдат.

Скарыстаўшы адыход часцей 16-й арміі з нейтральнай зоны, рэшткі Слуцкай брыгады зноў распачалі напады на пазіцыі савецкіх войскаў. Былі заняты мястэчкі Семежава і Вызна. У мэтах ліквідацыі гэтай групоўкі 19 снежня пачалася наступальная аперацыя 8-й дывізіі. У выніку часткі Слуцкай брыгады 28 снежня перайшлі раку Лань на польскую тэрыторыю, дзе былі раззброены.

Такім чынам, пасля заключэння прэлімінарнага дагавора спатрэбілася яшчэ пяць месяцаў, каб дыпламаты Польшчы і Савецкай Расіі больш-менш узаемапрымальна вырашылі многія спрэчныя пытанні. Толькі 18 сакавіка 1921 г. быў падпісаны "канчатковы, моцны, пачэсны і заснаваны на ўзаемнай згодзе мір", як падкрэслівалася ў прэамбуле дагавора што не адпавядала рэчаіснасці. Да Польшы адышла этнічная тэрыторыя Беларусі памерам 98 815 км$^2$, што склала амаль палову этнічнай тэрыторыі Беларусі. Абодва бакі гарантавалі неўмяшанне ва ўнутраныя справы і абавязваліся ні прама, ні ўскосна не падтрымліваць варожай інтэрвенцыі, узаемна адмаўляліся ад ваенных выдаткаў і страт, якія былі панесены ў час савецка-польскай вайны, што ў першую чаргу закранала інтарэсы Беларусі. Прычым РСФСР абавязвалася выплаціць Польшчы 30 млн. рублёў у золаце за актыўны ўдзел польскіх зямель у гаспадарчым жыцці былой Расійскай імперыі.

Дагавор стаў своеасаблівым кампрамісам паміж Польшчай і Савецкай Расіяй. Абодва бакі пагадзіліся з наяўным становішчам і немагчымасцю яго змены сілавым шляхам. Пратэст беларусаў супраць адарвання этнічных беларускіх зямель яскрава сфармуляваў у вершы "Беларускаму народу" Якуб Колас:

Нас падзялілі - хто? Чужаніцы,
Цёмных дарог махляры.
К чорту іх межы! К д'яблу граніцы!
Нашы тут гоні, бары!

Аднак, нягледзячы на тэрытарыяльныя страты ў гады грамадзянскай вайны і знешняй інтэрвенцыі, была ўтворана, прызнана "дэ-юрэ" беларуская нацыянальная дзяржаўнасць. На тэрыторыі Савецкай Беларусі ў лістападзе-снежні 1920 г. прайшлі выбары ў сельскія, валасныя, павятовыя і гарадскія Саветы. Рэўкамы былі скасаваны. У склад Саветаў увайшлі ў асноўным бальшавікі. 13-

17 снежня 1920 г. адбыўся II Усебеларускі з'езд Саветаў. З'езд ратыфікаваў "Прэлімінарны дагавор, абраў ЦВК БССР і звярнуўся да насельніцтва Беларусі з заклікам накіраваць усе сілы на аднаўленне народнай гаспадаркі рэспублікі.

## ТЭМАV. БЕЛАРУСЬ У 20-30-я гг.

**Гістарыяграфія, крыніцы.** Першыя працы па гісторыі міжваеннага перыяду напісаны, галоўным чынам, партыйнымі і грамадскімі дзеячамі, сучаснікамі і ўдзельнікамі тых падзей.

Артыкулы В. Кнорына, А. Чарвякова, Я. Адамовіча З. Прышчэпава, А. Хацкевіча, А. Баліцкага аб першых выніках нэпа і беларусізацыі носяць публіцыстычны характар. Найбольшую цікавасць мае артыкул А. Баліцкага "Беларусізацыя культурна-асветных устаноў". У ім дадзены кароткі гістарычны нарыс беларусізацыі навучальных устаноў, статыстычны аналіз школ усіх тыпаў, сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных устаноў, дзіцячых дамоў, клубаў, народных дамоў, хат-чытальняў. Выдадзены зборнік "Практическое разрешение национального вопроса в Белорусской Социалистической Республике" (Мн., 1927), дзе змешчаны артыкулы старшыні нацыянальнай камісіі ЦВК БССР А. Хацкевіча па беларусізацыі ў рэспубліцы, а таксама рэзалюцыі партканферэнцый і пленумаў ЦК КП(б)Б па нацыянальнаму пытанню, аб утварэнні БССР і пашырэнні тэрыторыі рэспублікі ў 1924, 1926 гг. У 1929 г. быў апублікаваны зборнік артыкулаў, прамоў і рэзалюцый па нацыянальнаму пытанню "Два гады нацыянальнай работы ў БССР" (Мн., 1929).

Метадалагічнай асновай гістарыяграфіі гэтага перыяду была "Гісторыя УКП(б). Кароткі курс", якая выключала альтэрнатыўнасць гістарычнага развіцця, зводзіла яго да спрошчанай эвалюцыі савецкага грамадства.

З другой паловы 50-х да сярэдзіны 80-х гг. павялічылася колькасць даследаванняў гэтага перыяду. Праблемы індустрыялізацыі, калектывізацыі, дзяржаўнага і культурнага будаўніцтва знайшлі адлюстраванне ў манаграфіях М.Е. Шкляра, Н.В. Власенкі, А.А. Філімонава, М.П. Касцюка, А.М. Сарокіна, В.А. Круталевіча, К.К. Германа, Г.Г. Герасіменкі» Л.Н. Дробава, М.С. Кацера, М. Арлова і інш. У гэтыя гады было выдадзена шэраг калектыўных работ. Аналіз гістарыяграфіі беларускіх даследчыкаў быў дадзены ў гістарычных працах “Дасягненні гістарыяграфічнай навукі ў БССР за 50 год (1919-1969 гг.)", "Дасягненні гістарычнай навукі ў БССР за 60 год", "Станаўленне і развіццё гістарычнай навукі Савецкай Беларусі" (1919-1941 гг.) У.М. Міхнюка, "Сялянства Беларусі на шляху да сацыялізму: гістарыяграфічны нарыс" і інш. У гэтых даследаваннях адлюстроўваюцца розныя бакі жыцця беларускага грамадства ва ўмовах адміністрацыйна-каманднай сістэмы. Аднак негатыўныя

з'явы развіцця грамадства асветлены вельмі сціпла або зусім абмінутыя.

У гады перабудовы большасць гісторыкаў імкнулася супрацьпаставіць "добры" нэп "кепскаму" сталінізму. Для гістарыяграфіі гэтага перыяду быў характэрны пошук альтэрнатывы сталінскаму "вялікаму пералому" 1929 г. і мадэлі дзяржаўнага сацыялізму. Нэпаўская эканоміка з яе плюралізмам формаў уласнасці, гаспадарча-разліковай дзяржпрамысловасцю, суіснаваннем планавага рэгулявання і рынку ўяўлялася многім ідэальнай мадэллю "сацыялістычнай рыначнай эканомікі".

Спроба больш аб'ектыўна прааналізаваць некаторыя праблемы гісторыі 20-30-х гг. была зроблена ў зборніку "Старонкі Кампартыі Беларусі" (Мн., 1989).

Наступны этап у асвятленні міжваеннага перыяду пачаўся з пачатку 90-х гадоў. Новыя навуковыя падыходы пераважаюць у апошніх працах расійскіх вучоных В.З. Раговіна, В. П. Дзмітрэнкі, Г.А. Трукана, М.М. Горынава, А.А. Данілава і інш. У "Нарысах гісторыі Беларусі" з большай аб'ектыўнасцю "аказана новая эканамічная палітыка, беларусізацыя, індустрыялізацыя, калектывізацыя сельскай гаспадаркі, станаўленне адміністрацыйна-каманднай сістэмы. З новых пазіцый асвятляюцца эканамічныя праблемы ў курсе лекцый пад агульнай рэакцыяй В.І. Галубовіча "Эканамічная гісторыя Беларусі"(Мн. 1999)- Паслярэвалюцыйнае нацыянальна-культурнае будаўніцтва, яго дасягненні, супярэчнасці і трагічны лёс раз(333) глядаюцца ў кнізе Л. Лыча і У. Навіцкага 'Гісторыя культуры Беларусі" (Мн., 1996). Прычына станаўлення, развіцця, дзейнасці таталітарнай сістэмы і асаблівасці яе праўлення на Беларусі даследуюцца ў артыкуле М.П. Касцюка "Сталіншчына і Беларусь". У гістарычным сшытку "Крыжовы шлях" (Мн., 1993) змешчаны артыкул А. Караля "Беларусізацыя – палітыка нацыянальнага адраджэння", у якім падрабязна аналізуюцца вытокі і змест беларусізацыі.

Праблеме палітычных рэпрэсій 30-х гадоў прысвечаны калектыўны зборнік "Праўда гісторыі: памяць і боль" (Мн., 1991). Асобныя аспекты праблемы адлюстраваны ў працах У.М. Міхнюка, М.П. Касцюка, В.В. Вялічкі, А.П. Урублеўскага, А.М. Сарокіна, Р.П. Платонава і інш. Цэласная карціна рэпрэсій супраць народа паказана ў манаграфіі У. І. Адамушкі "Палітычныя рэпрэсіі 20-50-х гадоў на Беларусі" (Мн., 1994). Крыніцамі па міжваеннаму перыяду гісторыі Беларусі з'яўляюцца зборнікі дакументаў па калектывізацыі, індустрыялізацыі, культурнаму будаўніцтву і рэпрэсіях у 20-30-я гг.

ЛЕКЦЫЯ 18

## ДЗЯРЖАЎНАЕ І НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНАЕ БУДАЎНІЦТВА Ў 20-я гг.

- *Дзяржаўнае будаўніцтва ў 1921-1927 гг.*
- *Палітыка беларусізацыі*
- *Развіццё нацыянальнай культуры*
- *Станаўленне таталітарнага рэжыму*

**Дзяржаўнае будаўніцтва ў 1921-1927 гг.** Вялікае значэнне для краіны мела нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва. У перыяд грамадзянскай вайны склаўся ваенна-палітычны саюз савецкіх рэспублік. Пераход да міру патрабаваў новых падыходаў у вырашэнні нацыянальна-дзяржаўнага пытання. Аднаўленне народнай гаспадаркі патрабавала больш цесных эканамічных адносін паміж рэспублікамі.

Саветызацыя нацыянальных раёнаў былой Расійскай імперыі, падпарадкаванне іх партыйнаму кантролю цэнтра паскорылі працэс аб'яднання. Беларусь была абвешчана Савецкай Рэспублікай. 16 студзеня 1921 года быў падпісаны дагавор паміж РСФСР і БССР, паводле якога прызнаваўся суверэнітэт і незалежнасць Беларусі. Ствараліся аб'яднаныя наркаматы ваенных і марскіх спраў, УСНГ, знешняга гандлю, фінансаў, працы, шляхоў зносін, пошты і тэлеграфа. Адначасова было створана прадстаўніцтва БССР пры ўрадзе РСФСР для каардынацыі дзейнасці ў галіне гаспадарчага і культурнага будаўніцтва.

Але канчаткова адносіны паміж дзяржавамі, якія ўзніклі на тэрыторыі былой Расійскай імперыі, былі нявызначаныя. Такое становішча выклікала незадаволенасць як у Маскве, так і сярод насельніцтва, нацыянальных арганізацый у рэспубліках. Неабходна было выпрацаваць такія формы аб'ядняня, якія б не дэстабілізавалі сітуацыю. Патрэбна было захаваць некаторыя атрыбуты незалежнасці, адмежавацца ад нічым не прыкрытай унітарнасці дарэвалюцыйнай Расіі. Важна было правесці аб'яднанне так, каб не вызваць новы развал і новую грамадзянскую вайну ў нацыянальных раёнах. І.В. Сталін прапанаваў уключыць савецкія дзяржавы у склад РСФСР на правах аўтаномных рэспублік (план "аўтанамізацыі"). У.І. Леніну ўдалося накіраваць работу па аб'яднанню рэспублік у адносна бяспечнае рэчышча: стварэнне федэратыўнага саюза раўнапраўных дзяржаў з правам выхаду з гэтага саюза.

Працэс стварэння саюзнай дзяржавы павінен быў прадэманстраваць поўны разрыў з мінулым. Не адзіная дзяржава а саюз

нацыянальных рэспублік, што замацоўвалася ў новай назве – Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік (СССР). у адпаведнасці з лозунгам аб праве нацый на самавызначэнне бальшавікі ў аснову стварэння СССР закладвалі нацыянальны прынцып. Рэспублікі захоўвалі атрыбуты дзяржаўнасці: саўнаркомы, наркаматы, ЦВК, ЦК нацыянальных кампартый. Частка паўнамоцтваў перадавалася цэнтральным органам улады. Падрыхтоўка афіцыйнага абвяшчэння саюзнай дзяржавы здзяйснялася па партыйных каналах. Легітымнасць, адабрэнне народа таксама забяспечвалася партыйнымі структурамі праз адпаведныя органы.

Ідэя аб'яднання шырока прапагандавалася сярод насельніцтва Беларусі. Завяршылася гэтая камііанія IV Усебеларускім з'ездам Саветаў, які адбыўся 14-18 снежня 1922 г. 242 дэлегаты з'езда, у тым ліку 120 беларусаў, прынялі рашэнне аб неабходнасці ўтварэння Саюза ССР. Была выбрана дэлегацыя на X Усерасійскі з'езд Саветаў у складе 33 чалавек. Сярод дэлегатаў былі А.Р. Чарвякоў – старшыня ЦВК і СНК БССР, кіраўнік дэлегацыі, В.А. Багуцкі, Ш.Ш. Ходаш, А.С. Славінскі, Я.А. Адамовіч, У.М. Ігнатоўскі і інш.

I Усесаюзны з'езд Саветаў, які адкрыўся 30 снежня 1922 г. прыняў Дэкларацыю і Дагавор аб утварэнні Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік у складзе РСФСР, УССР, БССР і ЗСФСР. У выбраны з'ездам ЦВК СССР ад БССР увайшло 7 чалавек. А.Р. Чарвякоў стаў адным з чатырох старшынь Прэзідыума ЦВК СССР.(336) У кампетэнцыю вышэйшых органаў улады СССР адышлі знешняя палітыка, межы, узброеныя сілы, транспарт, сувязь, планаванне народнай гаспадаркі, фінансы, аб'яўленне вайны і заключэнне міру. Асноўныя палажэнні Дагавора зацвердзіла Канстытуцыя СССР, якая была прынята на II з'ездзе Саветаў СССР у 1924 г. Канстытуцыя давала магчымасць РСФСР мець перавагу ў ЦВК, бо Савет Саюза складаўся з дэпутатаў прапарцыянальна колькасці насельніцтва, а ў РСФСР пражывала 75% усяго насельніцтва Саюза, і ён быў больш ціматлікім, чым Савет нацыянальнасцяў.

Стварэнне СССР выклікала ў многіх народаў краіны надзею на больш справядлівае і дэмакратычнае вырашэнне нацыянальнага пытання. Саюз садзейнічаў нацыянальна-дзяржаўнай кансалідацыі яго народаў. Але, як паказала практыка, ён не змог вырашыць нацыянальнае пытанне ў поўным аб'ёме. Жорсткая цэнтралізацыя ўлады фактычна прывяла да сталінскай "аўтанамізацыі" Савецкіх рэспублік, што не ўма-цоўвала, а, наадварот, аслабляла Савецкі Саюз.

Нягледзячы на тое, што БССР увайшла ў склад СССР, яе гаспадарчае, дзяржаўнае і культурнае развіццё стрымлівалася

абмежаванымі матэрыяльнымі рэсурсамі і малой тэрыторыяй, як і штучным разрывам гаспадарчых і культурных сувязей паміж рэгіёнамі, што складаліся на працягу стагоддзяў. Вядома, што вясной 1919 г. па ваенна-палітычных меркаваннях адпаведная частка тэрыторыі Беларусі адышла да РСФСР. На сумежных тэрыторыях знаходзілася больш беларусаў, чым непасрэдна ў Беларускай ССР, якая ўключала толькі 6 паветаў Мінскай губерні: Бабруйскі. Барысаўскі, Ігуменскі (з 1923 г. Чэрвеньскі), Мазырскі, частка Мінскага і Слуцкага.

Напярэдадні падпісання Рыжскага мірнага дагавора 1 лютага 1921 г. у Цэнтральнае Бюро КП(б)Б паступіла запіска, падісаная 32 камуністамі, у якой падкрэслівалася неабходнасць далучэння да БССР Віцебскай, Гомельскай губерняў і тых уездаў Магілёўскай губерні, якія былі далучаны да Смаленскай губерні. Але кампартыя Беларусі не паставіла гэтае пытанне перад ЦК РКП(б).(337) Пасля ўтварэння СССР VIII з'езд кампартыі Беларусі I і II сесія ЦВК БССР (сакавік 1923 г.) выказаліся за ўзбуйненне БССР. У чэрвені 1923 г. ЦБ КП(б)Б накіравала дакладную запіску аб тым, што неабходна пашырыць тэрыторыі Бела-русі за кошт далучэння Віцебскай і Гомельскай губерняў і тых паветаў, што прылягаюць да Смаленскай губерні. У верасні 1923 г. Палітбюро ЦК РКП(б) прымае пастанову аб неабходнасці далучэння да БССР усёй Віцебскай губерні большасці паветаў Гомельскай, а таксама Мсціслаўскага і Горацкага паветаў, якія былі ў складзе Смаленскай губерні.

Вяртанню беларускіх зямель папярэднічала вялікая падрыхтоўчая работа. Былі створаны розныя камісіі. Гэтае пытанне разглядалася на губернскіх з'ездах Саветаў у Гомелі і Віцебску, V з'ездзе Саветаў Беларусі, на пасяджэнні Усерасійскага Цэнтральнага Выканаўчага камітэта, у Прэзідыуме ЦВК СССР, у кіруючых органах РКП(б). У канцы 1923 г. у Віцебскую, Гомельскую і Смаленскую губерні былі накіраваны работнікі ЦВК БССР і ЦК КП(б)Б, каб растлумачваць неабходнасць узбуйнення Беларусі.

3 сакавіка 1924 г. ЦВК РСФСР прыняў пастанову аб перадачы Беларускай ССР наступных паветаў Віцебскай, Гомельскай і Смаленскай губерняў: Аршанскага, Быхаўскага, Віцебскага, Гарадоцкага, Горацкага, Дрысненскага, Калінінскага (Клімавіцкага), Лепельскага, Магілёўскага, Мсціслаўскага, Полацкага, Рагачоўскага, Сенненскага, Суражскага, Чавускага, Чэрыкаўскага. Тры паветы Віцебскай (Себежскі, Веліжскі, Невельскі) і пяць паветаў Гомельскай (Гомельскі, Рэчыцкі, Суражскі, Старадубскі, Навазыбкаўскі) губерняў засталіся ў складзе РСФСР. IV Надзвычайны з'езд Саветаў Беларусі, які адбыўся 13-16 сакавіка 1924 г., ухваліў аб'яднанне тэрыторыі з

большасцю беларускага насельніцтва. Тэрыторыя Савецкай Беларусі павялічылася да 110 тыс. км'. г. зн. больш чым у два разы, а насельніцтва – да 4,2 млн. чалавек.

Другая сесія ЦВК БССР, якая адбылася 10-17 жніўня 1924 г., увяла новы адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел рэспублікі. Губерні, паветы, воласці ліквідаваліся, а замест іх ствараліся акругі, раёны, сельсаветы. У пачатку 1925 г. рэспубліка была падзелена на 10 акруг: Аршанская, Бабруйская, Барысаўская, Віцебская, Калінінская, Мінская, Магілёўская, Мазырская, Полацкая і Слуцкая, 100 раёнаў і 1202 сельскія саветы. У месцах кампактнага пражывання нацыянальных меншасцяў ствараліся нацыянальныя сельскія Саветы. у 1928 г. налічвалася Саветаў: 23 яўрэйскіх, 19 польскіх, 16 рускіх, 5 латышскіх, 2 украінскіх і 2 нямецкіх.

Але гэтым узбуйненнем поўнасцю не была вырашана праблема вяртання ўсходніх этнічных беларускіх зямель. У маі 1926 г. ПБ КП(б)Б звярнулася ў ЦК УКП(б) аб далучэнні да БССР усёй Гомельскай губерні (у складзе пяці паветаў) і трох паветаў (Веліжскі, Себежскі, Невельскі) Пскоўскай губерні. Пытанне аб паветах Пскоўшчыны не знайшло падтрымкі ў вышэйшых колах СССР. Для даследавання Гомельшчыны была створана спецыяльная камісія. На падставе матэрыялаў камісіі Палітбюро ЦК УКП(б) 18 лістапада 1926 г. вырашыла лічыць, што большасць насельніцтва Гомельскага і Рэчыцкага паветаў – беларусы, і прызнала неабходным далучыць іх да Беларусі. У снежні 1926 г. Прэзідыум ЦВК БССР уключыў гэтыя паветы ў склад рэспублікі, перайменаваў іх у акругі, а воласці ў раёны. У выніку другога ўзбуйнення тэрыторыя БССР павялічылася на 25 тыс. км$^2$, а насельніцтва – на 649 тыс. чалавек. Пасля двух узбуйненняў БССР яе тэрыторыя на пачатку 1927 г. складала амаль 125 950 км$^2$ з насельніцтвам каля 5 млн. чалавек. Значна ўзмацніўся эканамічны патэнцыял рэспублікі, былі створаны рэальныя магчымасці для культурнага і нацыянальнага развіцця.

У 20-я гады ў Беларусі, як і ва ўсім СССР, склалася аднапартыйная сістэма, якая прывяла да ўсталявання дыктатуры сталінскага рэжыму. Поспехі ажыццяўлення нэпа і нацыянальна-культурнага будаўніцтва, з аднаго боку, і пастаянны ціск кампартый, з другога, аслабілі нацыянальна-дэмакратычныя партыі і рухі. У сакавіку 1921 г. самаліквідаваўся Бунд, у снежні 1921 г. распалася Яўрэйская камуністычная партыя. Адна частка яе ўступіла ў КП(б)Б, а другая арганізавалася ў Яўрэйскую камуністычную рабочую партыю якая дзейнічала да 1928 г.

Найбольш уплывовай была Беларуская партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў. У пачатку 1921 г. яна налічвала 20 тыс. чалавек, мела свае партыйныя арганізацыі. У лютым 1921 г. яна была разгромлена, 860 яе дзеячаў былі арыштаваны чэкістамі. Потым усе арыштаваныя былі вызвалены і перапраўлены на тэрыторыю Заходняй Беларусі. Частка іх у 1922 г. стварыла Беларускую рэвалюцыйную арганізацыю якая ўступіла затым у кампартыю Заходняй Беларусі. 8 чэрвеня 1924 г. у Мінску адбыўся з'езд былых членаў БПС-Р, які заявіў аб спыненні яе дзейнасці.

Ліквідацыя апазіцыйных сіл у БССР аслабіла пазіцыі ўрада Беларускай Народнай Рэспублікі ў эміграцыі. Да таго ж у ліпені 1923 г. Цэнтральныя Выканаўчыя Камітэты Саюза ССР і БССР прынялі сумесную пастанову аб аб'яўленні амністыі ўсім удзельнікам антысавецкіх нацыянальных арганізацый і фарміраванняў, беларускім палітычным і культурным дзеячам, членам беларускіх нацыянальных урадаў і беларускіх партый, якія не прымалі актыўнага ўдзелу ва ўзброенай барацьбе з Савецкай уладай і заявілі аб лаяльных да яе адносінах. У кастрычніку 1925 г. на II (Берлінскай) канферэнцыі Рада БНР аб'явіла аб роспуску сваіх палітычных цэнтраў і спыненні барацьбы з Савецкай уладай. Канферэнцыя прызнала, што БССР стала месцам кансалідацыі беларускага народа, а Мінск з'яўляецца адзіным цэнтрам нацыянальна-дзяржаўнага адраджэння Беларусі.

Нягледзячы на тое, што апазіцыйны рух быў ліквідаваны, унутры самой партыі бальшавікоў узмацнілася палітычная барацьба. Барацьба фракцый і груповак за чысціню сваіх радоў, з "левым" і "правым" ухіламі, апартуністамі і нацыяналістамі суправаджалася так званымі чысткамі партыі. У 1921 г. у БССР было выключана з партыі амаль 20% усяго яе складу, 4,2% было выключана ў 1924 г. Яшчэ 3717 чалавек было выключана з КП(б)Б у 1929 г. Выключанымі з партыі ў першую чаргу аказаліся прыхільнікі нэпа, каго можна было аднесці да прыхільнікаў "левага" і "правага" ўхілу, так званыя беларускія нацыянал-дэмакраты.

Сталінскае кіраўніцтва пільна сачыла за грамадска-палітычнымі абставінамі ў рэспубліках і кантралявала іх, назначаючы на пабоτу партыйныя, савецкія і гаспадарчыя кадры. У 1921 г. з іншых рэспублік у БССР было накіравана 928 членаў партыі, у 1922 г. яшчэ 574 камуністы. З 1924 г. да пасляваенных часоў усах першых сакратароў ЦК КП(б)Б і кіраўнікоў КДБ прысылалі з цэнтра. Правядзенне найбольш важных мерапрыемстваў кантралявалася адпаведнымі партыйнымі структурамі ў Маскве праз іх упаўнаважаных ці спецыяльна створанымі камісіямі.

У першыя гады нэпа ўтварыўся пэўны разрыў паміж Саветамі і працоўнымі. Гэта праявілася ў нізкай яўцы насельніцтва на выбарах у Саветы. якія адбыліся ў 1924 г. Усяго на Беларусі ў выбарах прынялі ўдзел 35,4% выбаршчыкаў. З мэтай іх ажыўлення пры сельскіх і местачковых Саветах ствараліся пастаянныя камісіі па сельскай гаспадарцы, добраўпарадкаванню, а таксама культурна-асветныя, фінансава-падатковыя і іншыя, якія абмяркоўвалі пытанні мясцовага жыцця. У канцы 20-х гадоў сталі арганізоўвацца дэпутацкія групы – аб'яднанні Саветаў розных узроўняў, якія працавалі на адным прадпрыемстве.

У гады нэпа змяніліся функцыі прафсаюзаў. Галоўнай задачай іх стала абарона класавых інтарэсаў пралетарыяту ў барацьбе з нэпманаўскай буржуазіяй. Асобы, якія ўдзельнічалі ў атрыманні прыбытку, у прафсаюз не прымаліся. Прафсаюзы займаліся галоўным чынам пытаннямі вытворчасці, праводзілі вытворчыя нарады.

Агульнаадукацыйным і палітычным узроўнем моладзі займаўся камсамол, які значна пашыраў свой уплыў сярод юнакоў і дзяўчат.

У грамадскае жыццё ўключаліся жанчыны. У працоўных калектывах выбіралі дэлегатак, якія затым праводзілі дэлегацкія сходы. Пэўную ролю ў палітычным жыцці адыгрывалі шэфскія таварыствы, якія ствараліся ў гарадах, каб аказваць дапамогу вёсцы, абароннае таварыства Асаавіяхім, розныя фізкультурныя аб'яднанні і інш.

Усё гэта адлюстроўвала пэўны дэмакратызм грамадска-палітычнага жыцця.

**Палітыка беларусізацыі.** Каб заваяваць давер народа і ўмацаваць сваю ўладу, кампартыя павінна была ўлічваць інтарэсы, асаблівасці нацыянальнага складу, праявы нацыянальнай свядомасці ў савецкіх рэспубліках і садзейнічаць ім у нацыянальна-культурным будаўніцтве. Нацыянальная палітыка распрацоўвалася ў вышэйшых партыйных структурах і праводзілася з улікам асаблівасцей кожнага рэгіёна. На месцах яна атрымала назвы – беларусізацыя, украінізацыя, татарызацыя і нават германізацыя ў Паволжы. Гэтая палітыка была прыстасавана да эканамічных, сацыяльных, этнаграфічных умоў, гістарычных і культурных традыцый народаў. Яна фармулявалася пад уздзеяннем ідэй і практыкі нацыянальнага руху.

У рэзалюцыі X з'езда РКП(б) "Аб чарговых задачах партыі ў нацыянальным пытанні" (сакавік 1921 г.) падкрэслівалася, што неабходна дабівацца даверу раней прыгнечаных нацый, развіваць на іх роднай мове органы ўлады, судовыя органы, курсы і школы як

агульнаадукацыйнага, так і прафесіянальна-тэхнічнага напрамку, культурна-асветныя ўстановы, прэсу, тэатр. XII з'езд РКП(б) (красавік 1923 г.) зыходзіў ужо з факта існавання СССР. Ён вызначыў канкрэтныя практычныя меры: фарміраванне органаў улады нацыянальных рэспублік з мясцовых людзей, якія валодалі б мовай, ведалі быт, звычаі народаў. забяспечвалі ўжыванне роднай мовы ва ўсіх дзяржаўных органах і ўстановах. Прадугледжвалася правядзенне мерапрыемстваў па арганізацыі нацыянальных вайсковых часцей і інш.

Палітыка нацыянальна-дзяржаўнага і нацыянальна-культурнага будаўніцтва на Беларусі мела вытокі ў беларускім нацыянальна-вызваленчым руху, у ідэях беларускага нацыянальнага адраджэння. У час рэвалюцыі і грамадзянскай вайны ў КП(б)Б улілося шмат дзсячаў нацыянальна-вызваленча(342)га руху. Многія з іх увайшлі ў склад вышэйшых партыйных і савецкіх органаў. Сярод іх: А.Р. Чарвякоў – старшыня ЦВК і ГНК БССР, З.Х. Жылуновіч – рэдактар газеты "Савецкая Беларусь", У.М. Ігнатоўскі – нарком асветы, А.Л. Бурбіс - намеснік наркома замежных спраў, А.В. Баліцкі – намеснік наркома асветы, з 1926 г. – нарком асветы БССР, П В. Ільючонак – загадчык аддзела Наркамата асветы і інш. Яны стварылі своеасаблівае ядро, вакол якога згуртавалася творчая інтэлігенцыя і стала генератарам ідэй беларусізацыі.

У лютым 1921 г. ЦВК Беларусі звярнуўся з заклікам да раскіданых вайной культурных работнікаў вярнуцца на Радзіму. У сувязі са зваротам СНК РСФСР прыняў спецыяльны дэкрэт, на аснове якога "культурнікі-беларусы" адкамандзіроўваліся на Радзіму. Да канца 1921 г. каля 300 чалавек вярнуліся ў БССР. Сярод іх С. Некрашэвіч, М. Грамыка, М. Піятуховіч і інш.

Пры правядзенні беларусізацыі трэба было ўлічваць некаторыя асаблівасці нацыянальнага складу насельніцтва ў розных рэгіёнах і іх долю ва ўладных структурах. Паводле перапісу 1926 г. беларусы складалі 80%, яўрэі – 8,2%, рускія – 7,7%, палякі – каля 2%, украінцы – 0,7%, латышы – 0,3%, татары –0,1%, іншыя – 0,2%». Беларусы жылі пераважна ў вёсцы, яўрэі ў гарадах складалі ад 40 да 60% жыхароў. У гарадах пражывала значная частка рускіх. Гэта ўносіла спецыфіку ў моўную сітуацыю: рускамоўны горад і беларускамоўная вёска.

Нізкі ўзровень развіцця эканомікі, пасляваенная разруха ў лерапляценні са шматгадовай палітыкай паланізацыі і русіфікацыі мелі вынікам адносную неразвітасць формаў культуры, фарміравалі ў свядомасці сялян комплекс непаўнацэннасці роднай мовы, як мовы мужыцкай. Доля бе-ларусаў у складзе партыйных, савецкіх і

гаспадарчых органаў не дасягала і паловы. Так, з 13 членаў Цэнтральнага Юро КП(б)Б у 1922 г. беларусаў было 5, яўрэяў – 6, іншых – 2. З членаў павятовых камітэтаў партыі 31 (41.8%)) былі беларусы, 34 (45,9%) – яўрэі, 9 (12,1%,) – іншыя нацыянальнасці. Гэтыя акалічнасці ўскладнялі правядзенне беларусізацыі. У лютым 1921 г. ЦВК БССР па дакладу Наркамата асветы прыняў шэраг пастаноў, якія прадвызначылі ўвесь наступны ход беларусізацыі. Быў пацверджаны дэкрэт урада Літоўска-Беларускай ССР аб раўнапраўі ў якасці дзяржаўных беларуекай, рускай, яўрэйскай і польскай моў, вызначаны меры па стварэнню сістэмы дашкольнага выхавання і школьнай адукацыі, прафесійна-тэхнічных вучылішчаў і тэхнікумаў на роднай мове выкладання, шырокай сеткі беларусазнаўства.

У 1921 г. адкрыўся Беларускі дзяржаўны універсітэт. Праз год быў адкрыты інстытут сельскай гаспадаркі. Па ініцыятыве У. Ігнатоўскага пры Наркамаце асветы ў 1921 г. была створана Навукова-тэрміналагічная камісія, на базе якой у наступным годзе арганізаваны Інстытут беларускай культуры (Інбелкульт). Старшынёй камісіі, а потым і Інбелкульта стаў мовазнаўца С. Некрашэвіч. Пры Наркамаце асветы БССР адкрыліся курсы беларусазнаўства для падрыхтоўкі настаўнікаў, якія ўзначаліў Я. Лёсік. У 1922 г. каля чвэрці ўсіх школ перайшлі на беларускую мову выкладання, у астатніх яна была ўведзена як абавязковая для вывучэння.

З заснаваннем у 1920 г. выдавецтва "Беларусь", а ў 1922 г. кааператураўнага выдавецтва "Белтрэстдрук" з'явілася магчымасць выдання газет, часопісаў, падручнікаў, кніг на беларускай мове і мовах іншых народаў. З 1 снежня 1920 г. па 1 спежня 1921 г. было надрукавана 5 падручнікаў на беларускай мове. Да сярэдзіны 1922 г. па ўсёй тэрыторыі Беларусі было размеркавана каля 150 тыс. беларускіх кніг. Сярод іх "Разразная азбука", "Роднае слова", "Правапіс беларускае мовы" Я. Лёсіка, "Граматыка для школ" Б. Тарашкевіча, "Ле-мантар" С. Некрашэвіча і інш.

Беларусізацыя набірала моц, прымала мэтанакіраваны характар, станавілася афіцыйнай палітыкай. У сакавіку 1923 г. на VII з'ездзе КП(б)Б і ў ліпені на Пленуме ЦК КП(б)Б былі сфармуляваны асноўныя прынцыпы беларусізацыі, вызначаны комплекс мерапры-емстваў па адраджэнью краю, тэрытарыяльнаму самавызначэнню, развіццю беларускай мовы і культуры, вылучэнню і выхаванню кадраў. 15 ліпеня 1924 г. II сесія ЦВК БССР прыняла пастанову "Аб практычных мерапрыемствах па правядзенню нацыянальнай палітыкі", у выніку якой беларусізацыя стала дзяржаўнай палітыкай. Прэзідыум ЦВК у ліпені 1924 г. сфарміраваў спецыяльную камісію па

ажыццяўленню нацыянальнай палітыкі на чале з д. Хацкевічам. Аналагічныя камісіі ствараліся пры акруговых выканкамах, у буйных гарадах і раёнах.

У шырокім сэнсе беларусізацыя ўвасабляла сабой развіццё беларускай культуры, вылучэнне беларусаў на партыйную, савецкую, прафесійную і грамадскую работу, перавод справаводства партыйнага, дзяржаўнага, прафсаюзнага і кааператыўнага апарату на беларускую мову.

Цэнтральнае месца ў палітыцы беларусізацыі займала праблема мовы. На тэрыгорыі БССР прызнаваліся раўнапраўнымі беларуская, руская, яўрэйская і польская мовы. Але з прычыны значнай перавагі насельніцтва беларускай нацыянальнасці беларуская мова вызначалася як мова пераважна для зносін паміж дзяржаўнымі, прафесійнымі і грамадскімі ўстановамі і арганізацыямі. Мовай зносін оргакаў БССР з органамі СССР і саюзных рэспублік прызнавалася руская.

Паколькі асаблівае значэнне надавалася беларускай мове, то ўзнікла пагрэба планамернага ўводу яе ў сферу грамадскага жыцця і ў першую чаргу ў дзейнасць рэспубліканскага Дзяржаўпага і партыйнага апарату. Згодна з рэзалюцыяй другой сесіі ЦВК БССР, беларусізацыю апаратаў самога ЦВК, Саўнаркама, Наркамасветы, Наркамзема планавалася завяршыць за адзін год, усіх астатніх за 2-3 гады. Супрацоўнікамі гэтых апаратаў ажыццяўлялася вывучэнне беларускай мовы (пры абавязковым веданні рускай) і перавод на яе справаводства. Аб выніках гэтай работы сведчаць наступныя дадзеныя. Калі ў 1925 г. беларускую мову ў цэнтральных установах ведала не больш 20% служачых, то ў 1927 г. – 80%, у акруговых і раённых адпаведна 36% і 70%. Былі вытрыманы тэрміны пераводу на беларускую мову справаводства. Асноўныя рэспубліканскія дакументы друкаваліся на чатырох мовах, агульнасаюзныя на беларускай і рускай мовах, грамадска-прававыя дакументы – на беларускай і адной з трох раўнапраўных моў. Пры гэтым за кожным грамадзянінам захоўвалася права звяртацца ў любую ўстанову на роднай мове і на ёй атрымаць адказ.

Зыходным прынцыпам беларусізацыі школ вызначаўся прынцып забеспячэння правоў і магчымасцяў кожнай нацыі, што пражывалі на Беларусі, навучання дзяцей на роднай мове. Агульнымі прынцыпамі пры гэтым служылі суадносіны іх удзельнай вагі ў агульнай колькасці насеяьніцтва і жаданне бацькоў. Да 1928 г. каля 80% школ было пераведзена на беларускую мову навучання. Разам з тым адчыняліся школы з роднай мовай выкладання для прадстаў-

нікоў нацыянальных меншасцяў: рускай, польскай, яўрэйскай, украінскай і інш. У 1927 г. выкладанне ў школах БССР вялося на васьмі нацыянальных мовах.

На рабфаках, у вячэрніх школах для дарослых, школах рабочай і сялянскай моладзі, а таксама ў савецка-партыйных школах уводзілася абавязковае вывучэнне гісторыі, эканомікі і геаграфіі Беларусі, беларускай мовы і літаратуры. Выкладанне гэтых і некаторых іншых дысцыплін у вышэйшых навучальных установах паступова пераводзілася на беларускую мову, якая на ўсіх факультэтах вывучалася ў абавязковым парадку.

Станоўчыя зрухі прыкметна абазначыліся і на ўсіх астатніх напрамках беларусізацыі. Агульнымі намаганнямі вучоных, пісьменнікаў былі падрыхтаваны і выдадзены тэрміналагічныя слоўнікі па асноўных галінах навукі, распрацоўкі па лексіцы і граматыцы беларускай мовы, дапаможнікі для школ, тэхнікумаў, інстытутаў. Вялікая ўвага надавалася развіццю гісторыі, філасофіі, эканомікі Беларусі. На адпаведных кафедрах Інбелкульта, Універсітэта, Гістпарта рыхтаваліся кадры, вяліся даследаванні па праблемах грамадскіх навук. Шырокае развіццё атрымала краязнаўства. У 1926 г. у БССР дзейнічала 240 краязнаўчых арганізацый з ахопам каля 10 тыс. чалавек. Развіццё мовы і пашырэнне сферы яе ўжывання патрабавалі адпаведнай перабудовы выдавецкай справы, перыядычнага друку. Паступова павялічваліся тыражы газет і часопісаў, выпуск падручнікаў, слоўнікаў, навуковай і мастацкай літаратуры на беларускай мове. Разам з тым выдаваліся газеты і часопісы на мовах нацыянальных меншасцей. У 1927 г. з 11 рэспубліканскіх газет 4 выходзілі на рускай, 3 – на беларускай, па 2 – на польскай і яўрэйскай мовах. 311 часопісаў: 4 – на беларускай, 3 – на рускай, 2 – на беларускай і рускай, 2 – на яўрэйскай мовах.

Адным з цэнтральных кірункаў беларусізацыі з'яўлялася так званая "карэнізацыя" – выхаванне і вылучэнне кадраў з карэннага насельніцтва на партыйную, савецкую, гаспадарчую і грамадскую работу. Гэта было найбольш складанае пытанне. Тут лягчэй за ўсё маглі ўзнікнуць крыўды, непаразуменні на глебе супрацьпастаўлення інтарэсаў адной нацыянальнасці другой. Згодна з агульнай задумай ставілася задача вылучэння прадстаўнікоў карэннага насельніцтва не па нацыянальнай прыкмеце, а па дзелавых якасцях, веданні ўмоў і асаблівасцей Беларусі, дасканалым валоданні беларускай і рускай мовамі.

Вось чаму доля беларусаў у 1929 г. у партыйных, дзяржаўных і грамадскіх органах у параўнанні з 1925 г. амаль што не змянілася. У

1929 г. доля беларусаў у адміністрацыйных установах па-ранейшаму складала 51,3%, рускіх – 18, яўрэяў – 24,8, палякаў – 0,1, іншых – 5,8. У гаспадарчых установах доля беларусаў раўнялася 30,8%, рускіх – 13,1, яўрэяў – 49,3, палякаў – 1,1, іншых – 5,7. У судовых установах беларусы займалі 26,3% месцаў, рускія – 21,1, яўрэі – 42,1, іншыя – 11,5%.

Што датычыцца Чырвонай Арміі, то, на тэрыторыі рэспублікі была сфарміравана 2-я тэрытарыяльная дывізія і створана аб'яднаная школа камандзіраў. Да 1927 г. яны былі на 70% укамплектаваны беларусамі. На беларускай мове ў іх вяліся палітзаняткі, выпускаліся насценныя газеты. У іншых вайсковых злучэннях, якія базіраваліся на тэрыторыі БССР, уводзілася вывучэнне беларускай мовы. Пад уплывам вынікаў беларусізацыі ў 1927 г. вялікая група дзеячаў беларускай эміграцыі прыняла запрашэнне Савецкага ўрада і прыехала ў БССР. Сярод іх былі В. Ластоўскі, А. Цвікевіч, І. Краскоўскі. Усе яны атрымалі работу ў адпаведнасці з іх адукацыяй і кваліфікацыяй, галоўным чынам, у сферы культуры, асветы, навукі. В. Ластоўскі працаваў дырэктарам Беларускага дзяржаўнага музея, вучоным сакратаром акадэміі, узначальваў этнаграфічную навуку ў рэспубліцы. А. Цвікевіч – старшынёй камісіі Інстытута беларускай культуры.

Нягледзячы на поспехі, палітыка беларусізацыі мела свае супярэчнасці, цяжкасці, недахопы. Гэтая палітыка не заўсёды прымалася з задавальненнем усімі слаямі насельніцтва. Значная частка рускіх і яўрэйскіх чыноўнікаў ставілася да беларусізацыі адмоўна, трактуючы яе як прымусовае абеларушванне.

Фарсіраванне тэмпаў беларусізацыі, адміністрацыйныя метады яе правядзення, парушэнне прынцыпу добраахвотнасці ў карыстанні той ці іншай мовай давалі падставы для незадаволенасці. Да кіраўнікоў ведамстваў, устаноў і арганізацый, якія не праяўлялі актыўнасці ў ажыццяўленні дэкрэтаў па нацыянальнай палітыцы, прымяняліся меры ўздзеяння: папярэджванне, вымова, адданне дысцыплінарнаму суду, перамяшчэнне на ніжэйшую пасаду, зняцце з работы. У верасні 1928 г. Бюро ЦК КП(б)Б за невыкананне пастановы аб поўнай беларусізацыі аб'явіла вымову кіраўнікам шэрагу трэстаў. Патрабаванне ведання беларускай мовы, у асобных выпадках, адсоўвала на другі план дзелавыя якасці людзей. Гэта спрыяла ажыўленню вялікадзяржаўных, нацыяналістычных і сіяністкіх элементаў. Правакацыйны характар на Беларусі мела дзейнасць сіяністкіх арганізацый, якія беспадстаўна сцвярджалі, што яўрэяў у першую чаргу выкідваць з кіруючых органаў улады.

Нягледзячы на некаторыя недахопы і перакосы, беларусізацыя дапамагла паселыгіцтву Беларусі ўсвядоміць сябе нацыяй. абудзіла яго палітычную і грамадскую актыўнасць. У канцы 20-х гадоў у нацыянальнай палітыцы вызначыліся тэндэнцыі да згортвання беларусізацыі. Аб гэтым сведчыла распачатая кампанія па разгрому так званага "нацыянал-дэмакратызму".

Прычынамі такога павароту была адмова ад новай зканамічнай палітыкі, пераход да адміністрацыйна-камандных метадаў кіравання. Трэба адзначыць і незадаволенасць часткі інтэлігенцыі нацыянальных меншасцяў ажыццяўленнем нацыянальнай палітыкі.

XI з'езд КП(б)Б (лістапад 1927 г.) заявіў, што дробнабуржуазны нацыяналізм і нацыянал-дэмакратызм на Беларусі, які ў мінулым быў прагрэсіўнай з'явай, змагаўся з самадзяржаўем, ва ўмовах дыктатуры пралетарыяту зрабіўся контррэвалюцыйнай з'явай. Таму супраць яго трэба весці барацьбу. Абвастрэнне класавай барацьбы пранізвала рашэнні XII з'езда кампартыі Беларусі (люты 1929 г.). Прадпісвалася цвёрда праводзіць пралетарскую лінію ў культурным будаўніцтве, сачыць за класавым зместам літаратуры і мастацтва, весці бязлітасную барацьбу з варожай пралетарыяту ідэалогіяй на культурным фронце. Інтэлігенцыя была штучна падзелена на прыхільную партыі Савецкай уладзе і буржуазную, якой аб'яўлялася рашучая барацьба.

У хуткім часе тэрміну "нацыянал-дэмакратызм" была нададзена новая трактоўка. Пад ім стала разумецца правая небяспека ў культурным будаўніцтве, тэндэнцыя ставіць нацыянальныя інтарэсы вышэй класавых. Нацыянал-дэмакратызм пачалі параўноўваць з нацыянал-фашызмам, атаясамліваць з правым ухілам, аб'яўляць варожай Савецкай уладзе ідэалогіяй і практыкай, якія мелі на мэце рэстаўрацыю капіталізму. Сацыяльнай асновай "нацдэмаўшчыны" было аб'яўлена кулацтва.

У чэрвені 1929 г. у Беларусі дзейнічала камісія ЦК УКП(б) на чале з У. Затонскім па аналізу практыкі правядзення нацыянальнай палітыкі. Камісія зрабіла высновы аб тым, што ў рэспубліцы нацыянал-дэмакратызм выкарыстоўвае тактыку адкрытага наступу і не атрымоўвае дастатковага адпору, а большая частка інтэлігенцыі настроена антысавецкі і стрымлівае тэмпы саветызацыі. Пасля гэтага абследавання ў кіраўніцтве ЦК КП(б)Б пачалі браць верх сілы, для якіх дырэктывы сталінскага цэнтра былі вышэй нацыянальных інтарэсаў. Першых сакратароў ЦК КП(б)Б Я. Гамарніка і Р. Піляра, якія супраціўляліся выяўленню ворагаў народа, адазвалі з Беларусі. На іх месца прыслалі К. Гея і Р. Рапапорта, якія запусцілі машыну барацьбы

з ворагамі народа. Першымі нападкам падвергліся А. Чарвякоў, З. Жылуновіч і У. Ігнатоўскі.

Прыхільнасць да беларускай мовы і культуры станавілася важкім аргументам для абвінавачвання ў нацыянал-дэмакратызме. У пачатку 30-х гадоў сам тэрмін "беларусізацыя" знікае з ужытку і амаль на паўстагоддзя трапляе пад забарону. Пачалося скарачэнне колькасці беларускамоўных школ, народных дамоў, зменшылася выданне беларускіх кніг, пачаўся перавод справаводства ва ўстановах на рускую мову. Разгром нацыянал-дэмакратаў быў лагічным вынікам фарміравання таталітарнага рэжыму.

**Развіццё нацыянальнай культуры.** Важнае месца ў культурным будаўніцтве займала ліквідацыя непісьменнасці. Паводле дэкрэта СНК РСФСР ад 26 снежня 1919 г. усе ва ўзросце ад 8 да 50 гадоў, хто не ўмеў чытаць і пісаць, павінны былі вучыцца грамаце на роднай' ці рускай мовах. 11 снежня 1920 г. была створана Надзвычайная камісія па ліквідацыі непісьменнасці ў Беларусі, потым такія камісіі пачалі дзейнічаць у паветах і валасцях. У 1924 г. у БССР пачалі ствараца ячэйкі таварыства "Прэч непісьменнасць", якія вялі актыўную дзейнасць сярод працоўных, адкрывалі пункты ліквідацыі непісьменнасці. У 1928/29 навучальным годзе ў Беларусі працавала 309 такіх пунктаў, 1319 школ малапісьменных. З усіх лікпунктаў 93,4% з'яўляліся беларускімі, 2% - яўрэйскімі, 1,2% - польскімі. Аднак у даваенны час непісьменнасць у БССР не была цалкам ліквідавана, у 1939 г. сярод дарослага насельніцтва заставалася каля 20% непісьменных. Вырашыць праблему ліквідацыі неііісьменнасці было нельга без стварэння новай сістэмы адукацыі. У 1922 г. у БССР праведзена рэарганізацыя сістэмы агуль-наадукацыйнай школы. Былі створаны тыпы школ: пачатковая з чатырохгадовым тэрмінам навучання, дзевяцігадовыя школы рэарганізаваны ў сямігадовыя. Аднак да 1924 г. развіццё школьнай адукацыі і культурнае будаўніцтва стрымліваліся з-за недахопу сродкаў, якія ў першую чаргу ішлі на аднаўленне прамысловасці і транспарту. Таму ў 1922/23 навучальным годзе Наркамасветы ўвёў плату за вучобу ў сямігодках, курсах, ВНУ. Пэўную дапамогу аказвалі прафсаюзы, прадпрыемствы, таварыства "Сябра дзяцей". Праводзіліся суботнікі, тыдні дапамогі школе. У сельскай мясцовасці сяляне ўтрымлівалі школы за свой кошт.

Рашэннем XV з'езда УКП(б) (1927 г.) у СССР было ўведзена ўсеагульнае абавязковае пачатковае навучанне. БССР адна з першых саюзных рэспублік ажыццявіла ўсеагульнае пачатковае навучанне: у 1931/32 навучальным годзе 98% дзяцей ва ўзросце 8-11 гадоў былі

ахоплены пачатковым навучаннем. У 1927/28 навучальным годзе ў школах працавала 12,7 тыс. настаўнікаў, а ў 1931/32 – 19,5 тыс.

Да сярэдзіны 30-х гадоў, пасля шэрагу эксперыментаў, ішло фарміраванне савецкай сістэмы народнай адукацыі. Былі ўведзены абавязковыя дзяржаўныя праграмы навучання, стабільныя падручнікі, жорсткі расклад навучальнага працэсу. Школа падраздзялялася на пачатковую (чатырохгадовы тэрмін навучання), няпоўную сярэднюю (сямігодка), сярэднюю (з 1932 г.), сярэднюю спецыяльную, вышэйшую. Значна ўзрасла колькасць вучняў, настаўнікаў, навучальных устаноў.

У рэспубліцы прымаліся меры па падрыхтоўцы нацыянальных кадраў вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Склаліся тры тыпы навучальных устаноў: прафесійна-тэхнічная школа, тэхнікум, інстытут. У 20-я гады адкрываліся індустрыяльна-тэхнічныя, сельскагаспадарчыя, эканамічныя, педагагічныя, медыцынскія, музычныя, мастацкія навучальныя ўстановы.

Цэнтрам падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі быў Беларускі дзяржаўны універсітэт, адкрыты ў Мінску 30 кастрычніка 1921 г. Народны камісарыят асветы РСФСР накіраваў у БДУ вядомых вучоных М.А. Прыляжаева, М.М. Нікольскага, У.М. Перцава, У.І. Пічэту, М.Б. Кроля і іншых. Рэктарам БДУ стаў вядомы гісторык-славіст У.І. Пічэта. У першы год у БДУ навучалася студэнтаў – 1250, працавала выкладчыкаў – 81, у тым ліку 14 прафесараў.

У снежні 1920 г. у Мінску на базе політэхнічнага вучылішча быў адкрыты Беларускі політэхнічны інстытут, у 1922 г. на яго базе быў адкрыты Беларускі дзяржаўнь інстытут сельскай і лясной гаспадаркі, апошні ў 1925 г. быў аб'яднаны з Горацкім земляробчым інстытутам у складзе Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках. У 1924 г пачаў працаваць у Віцебску ветэрынарны інстытут. Падрых-тоўкай кадраў партыйных і савецкіх работнікаў займаліся губернскія савецкія і партыйныя школы, якія працавалі ў Мінску, Віцебску, Гомелі і Магілёве. У 1925 г. Мінская вышэйшая партыйная школа была рэарганізавана ў Камуністычны універсітэт імя У. І. Леніна, а ў 1932 г. апошні быў пераўтвораны ў Вышэйшую камуністычную сельскагаспадарчую школу Беларусі. Працавалі навучальныя ўстановы мастацкага накірунку. У 1939/40 навучальным годзе ў БССР дзейнічала 22 вышэйшыя (15,4 тыс. студэнтаў) і 102 сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы (133,6 тыс. навучэнцаў). Каля 20 тыс. займалася на завочных аддзяленнях і курсах.

У аснову камплектавання ВНУ і тэхнікумаў быў пакладзены класавы прынцып, калі перавага аддавалася рабочым і сялянам. Гэта

палітыка атрымала назву "пралетарызацыі". Паступленню ў навучальныя ўстановы працоўнай моладзі садзейнічалі адкрытыя рабочыя факультэты пры ВНУ, дзе слухачы паскорана праходзілі курс сярэдняй школы. У 1926/27 навучальным годзе працавалі 4 рабфакі, дзе вучылася 845 чалавек. Калі ў 1925/26 навучальным годзе рабочыя складалі 11,6%, сяляне – 39,5% ад агульнай колькасці студэнтаў, то ў 1932 г. гэтыя паказчыкі былі адпаведна 49,5 і 25,4%.

Станаўленне беларускай навукі ў 20-я гады адбывалася ў вышэйшых навучальных і навукова-даследчых установах. 30 студзеня 1922 г. на базе Навукова-тэрміналагічнай камісіі, якая дзейнічала з лютага 1921 г. з мэтай распрацоўкі беларускай тэрміналогіі, быў створаны Інстытут беларускай культуры (Інбелкульт). У арганізацыі і рабоце Інбелкульта прынялі ўдзел Я. Дыла, З. Жылуновіч, У. Пічэта, Я. Карскі, Я. Купала, Я. Колас, Я. Лёсік і інш. Спачатку былі створаны дзве секцыі – гуманітарная і прыродазнаўчая, у 1926 г. дзейнічала пяць секцый – лінгвістычная, літаратурна-мастацкая, гісторыка-археалагічная, прыродазнаўчая, сацыяльна-эканамічная. Старшынямі Інбелкульта былі вядомыя вучоныя С.М. Некрашэвіч (1922-1924), У.М. Ігнатоўскі (1924-1931).

1 студзеня 1929 г. на аснове Інбелкульта была адкрыта Акадэмія навук. У 1932 г. у яе складзе налічвалася 14 навукова-даследчых інстытутаў, дзе працавала 22 правадзейныя члены БАН і 150 навуковых супрацоўнікаў. У канцы 30-х гг. у рэспубліцы было 40 навукова-даследчых устаноў, у якіх налічвалася звыш 1,5 тыс. навуковых супрацоўнікаў. Навукова-даследчыя ўстановы накіроўвалі свае намаганні ў першую чаргу на вывучэнне вытворчых сіл рэспублікі (працы М.Ф. Бліадухі, М.А. Прыляжаева, У.В. Шкатэлава, Ц.М. Годнева, А.У. Фядзюшына, М.А. Дарожкіна і інш.). Праводзіліся даследаванні ў галінс гуманітарных навук. Работы археолагаў А.М. Ляўданскага, С.А. Дубінскага, К.М. Палікарповіча і іншыя прывялі да адкрыцця ў Беларусі археалагічных помнікаў верхняга палеаліту, пашырылі веды аб насельніцтве эпохі жалезнага веку. Гісторыкі У.І. Пічэта, Д.А. Дудкоў, К.І. Кернажыцкі, В.К. Шчарбакоў апублікавалі работы па гісторыі Беларусі.

У 20-я гады адбываўся росквіт у беларускай літаратуры. Побач са сталымі пісьменнікамі і паэтамі (Я. Колас, Я. Купала, З. Бядуля, Ц. Гартны) паўсталі і маладыя (К. Чорны, К. Крапіва, А. Бабарэка, У. Дубоўка, М. Зарэцкі, М. Лынькоў і інш.). У 20-я гады фарміруюцца і дзейнічаюць некалькі літаратурных аб'яднанняў: беларускія ("Маладняк", "Узвышша", "Полымя"), рускія ("Звенья", "Минский перевал"), яўрэйскія ("Юнгер арбайтер"). Іх узнікненне было выклікана

пошукамі новых шляхоў у мастацтве. Адносна дэмакратычны перыяд літаратурнага жыцця закончыўся ў канцы 20-х гг. Творчасць усё больш заганялася ў рамкі ўстановак і патрабаванняў бальшавіцкай ідэалогіі. Да літаратараў, якія выступалі супраць абмежавання свабоды слова і творчасці, прымаліся карныя акцыі. Ужо ў 1930 г улады выслалі за межы рэспублікі М. Гарэцкага, У. Дубоўку Я. Пушчу, А. Бабарэку, М. Грамыку, А. Гурло і іншых. У чэрвені 1934 г. у Мінску адбыўся І з'езд пісьменнікаў Беларусі, а ў жніўні 1934 г. Усесаюзны з'езд пісьменнікаў у Маскве, дзе запатрабавалі ад пісьменнікаў прытрымлівацца прынцыпу сацыялістычнага рэалізму.

У беларускай літаратуры 20-30-х гг. знайшлі адлюстраванне тыя перамены, якія адбыліся ў гістарычным лёсе беларускага народа. У гэты час выйшлі творы Я. Купалы (паэмы "Безназоўнае", "Над ракой Арэсай"), Я. Коласа (паэмы "Новая зямля" і "Сымон-музыка", аповесці "У глыбі Палесся", "Дрыгва"), М. Чарота (паэмы "Босыя на вогнішчы", "Марына"), З. Бядулі (раман "Язэп Крушынскі"), А. Дудара (зборнікі вершаў "Беларусь бунтарская", "Вежа"), Ц. Гартнага (раман "Сокі цаліны"), М. Зарэцкага (раман "Сцежкі-дарожкі"), П. Галавача (аповесць "Спалох на загонах"), К. Крапівы (раман "Мядзведзічы", п'еса "Партызаны"), М. Лынькова (раман "На чырвоных лядах", аповесць "Міколка-паравоз"), К. Чорнага (раманы "Бацькаўшчына", "Трэцяе пакаленне") і інш.

20-я гады – час станаўлення нацыянальнага тэатральнага мастацтва. У жніўні 1920 г. у Мінску адкрыўся тэатр пад кіраўніцтвам У. Галубка, які працягваў традыцыі І. Буйніцкага. З 1926 г. ён быў ператвораны ў Беларускі дзяржаўны вандроўны тэатр. Большая частка пастановак напісана самім Уладзіславам Галубком. Усе спектаклі вызначаліся нацыянальным каларытам, шырока выкарыстоўваліся музыка, песні, танцы. Сярод першых акцёраў былі У. Галубок, Я. Галубок, А. Дудар, М. Чарот, У. Дзядзюшка. У верасні 1920 г. быў адкрыты ў Мінску Першы Беларускі дзяржаўны тэатр (БДТ-1), мастацкім кіраўніком якога ў 1921-1931 гг. быў рэжысёр Е. Міровіч. У тэатры пастаўлены спектаклі "Рысь" Э.Ажэшкі, "Вяселле" А. Чэхава, "Паўлінка" і "Раскіданае гняздо" Я. Купалы, "Машэка", "Кастусь Каліноўскі", "Каваль-ваявода" Е. Міровіча. Тут працавалі таленавітыя акцёры У. Крыловіч, Г. Глебаў, Б. Платонаў, Л. Ржэцкая, У. Уладамірскі.

Для падрыхтоўкі акцёрскіх кадраў у 1921 г. у Маскве была заснавана беларуская драматычная студыя, якую закончылі 34 чалавекі. На яе базе ў Віцебску ў 1926 г. адкрыўся Другі Беларускі дзяржаўны тэатр (БДТ-2), на сцэне якога пачалі працаваць П.

Малчанаў, С. Станюта, А. Ільінскі і інш. У 1937 г. у рэспубліцы дзейнічала 15 тэатраў.

У міжваенны перыяд значных поспехаў дасягнула беларускае музычнае мастацтва. Пры БДТ-1 і тэатры У. Галубка ў 1922-1925 гг. працавалі сімфанічны аркестр, харавая і балетная трупы. У пачатку 20-х гг. у Мінску, Віцебску, Гомелі былі створаны музычныя тэхнікумы. У 1924 г. у Магілёве была пастаўлена першая беларуская савецкая опера М. Чуркіна "Вызваленне працы". Беларускія дудары выступілі ў 1925 г. у Парыжы на мастацкай выстаўцы, спявачка Л. Александроўская і цымбаліст С. Навіцкі – на Міжнароднай выстаўцы ў Франкфурце-на-Майне ў 1927 г.

У 1932 г. адбылося адкрыццё Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі, а ў 1933 г. – Беларускага тэатра оперы і балета. Важную ролю ў развіцці музычнага мастацтва адыграла адкрытая ў 1937 г. у Мінску Беларуская дзяржаўная філармонія. У яе склад увайшлі сімфанічны аркестр і аркестр народных інструментаў, ансамбль народнай песні і танца, харавая капэла. У 1936-1938 гг. былі напісаны оперы "Кветка шчасця" А. Туранкова, "У пушчах Палесся" А. Багатырова, Міхась Падгорны" Я. Цікоцкага. Перад вайной у 1939 г. паставілі першы беларускі балет "Салавей" М. Крошнера.

Перыяд 1921-1928 гг. – час узнікнення і станаўлення беларускага кіно. Кінавытворчасць рэспублікі пачалася з кінахронікі. На працягу 1925-1926 гг. аператар М. Лявонцьеў зняў каля 30 стужак, у тым ліку "Меліярацыя БССР", "У здаровым целе – здаровы дух". У 1926 г. была створана першая(355) мастацкая стужка "Лясная быль" па сцэнарыю М. Чарота рэжысёрам Ю. Тарычам (Аляксеевым). Гэта быў фільм аб грамадзянскай вайне на Беларусі. Ю. Тарыч у 1930 г. стварыў першую гукавую кінапраграму "Пераварот". Развіццё беларускага кінематографа было звязана з імёнамі Ю. Тарыча, У. Корш-Сабліна, У. Гардзіна, І. Бахара, П. Малчанава.

У 20-я гг. разгортваецца дзейнасць культурна-асветніцкіх устаноў: рабочых клубаў, хат-чытальняў, чырвоных куткоў, дамоў культуры, бібліятэк. Для кіраўніцтва палітыка-асветніцкай работай восенню 1920 г. пры Наркамасветы БССР быў створаны Галоўпалітпрасвет. У 1927 г. у рэспубліцы налічвалася 271 хата-чытальня і 95 народных дамоў. У кастрычніку 1921 г. пачала працаваць Беларуская дзяржаўная бібліятэка.

Вялікую работу па прапагандзе беларускай гісторыі, народнай творчасці праводзіў Беларускі дзяржаўны музей у Мінску, які быў створаны на аснове трох мінскіх музеяў: царкоўна-археалагічнага, Таварыства аматараў прыроды і археалогіі, абласнога музея. БДМ у

1928 г. налічваў каля 30 тыс. экспанатаў і меў аддзелы: гісторыка-археалагічны, нумізматычны і сфрагістычны, этнаграфічны, царкоўна-археалагічны і мастацкі. З 14 музеяў, што меліся ў рэспубліцы ў 1937 г., большасць былі краязнаўчымі.

Важным сродкам інфармацыі з'яўляўся друк. У канцы 30-х гадоў у БССР выдавалася 10 рэспубліканскіх, 4 акруговыя, 5 гарадскіх, 81 раённая, 96 шматтыражных газет.

Для выяўленчага мастацтва ў паслякастрычніцкія гады былі характэрны разнастайныя плыні па стылях і жаырах, пошукі новых напрамкаў. У 1919 г. пачала дзейнічаць у Віцебску народная мастацкая школа. Яе арганізатарам і дырэктарам (1919-1921) быў Марк Шагал. У школе выкладалі ў розныя гады мастакі-рэалісты Ю. Пэн, А. Бразер, С. Юдовін, Я. Мінін, экспрэсіяніст М. Шагал, супрэматыст К. Малевіч, канструктывісты У. Пуні, Л. Лісіцкі, сезаніст Р. Фальк, кубіст Д. Якерсон, імпрэсіяніст Л. Купрын, футурыст В. Ермалаева і інш.

Акрамя аддзяленняў жывапісу і графікі ў вучылішчы існавалі майстэрні прыкладных мастацтваў – рукадзелля, ца(356)цак, пераплётная. У 1923 г. школа была ператворана ў мастацкі тэхнікум. Ідэі віцебскіх авангардыстаў вызначылі ў далейшым многія знаходкі і дасягненні сусветнай архітзктуры, дызайну, кніжнай і прамысловай графікі.

Мастацка-вытворчыя майстэрні "Выяўленчае мастацтва" былі адкрыты ў Мінску. Тут працавалі М. Філіповіч, П. Гуткоўскі, У. Кудрэвіч і інш. У верасні 1921 г. у Мінску адбылася першая выстаўка мастакоў. У жанры жывапісу пачынае дамінаваць тэматычная карціна (В. Волкаў, І. Ахрэмчык, Я. Зайцаў, А. Шаў-чэнка, Я. Ціхановіч, М. Манасзон). Важнае месца належала партрэту (Волкаў, Ахрэмчык, Філіповіч, М. Тарасікаў, М. Станюта, Р. Семашкевіч). У жанры пейзажу па-ранейшаму вядучае месца належала В. Бялыніцкаму-Бірулі. Самабытнасцю, цікавасцю да этнаграфіі, фальклору, жаданнем знайсці новыя сродкі выразнасці вызначаецца творчасць М. Піліповіча (карціны "Вясна", "Скокі праз вогнішча", "На казачны матыў", "Вясновае свята").

Багатыя і цікавыя традыцыі мае беларуская графіка. У 20-30-я гг. яна стала масавым мастацтвам. Атрымалі пашырэнне агітацыйны плакат, газетная і часопісная графіка, сатырычныя малюнкі (Я. Драздовіч, К. Урублеўскі, П. Гуткоўскі, А. Ахола-Вало), станковая гравюра (А. Астаповіч, А. Тычына), кніжная ілюстрацыя (Б. Малкін, Я. Мінін, В. Ціхановіч. І. Гембіцкі).

У развіцці скульттуры пэўную роль адыграў так званы ленінскі план манументальнай прапаганды. Адметны след у беларускай скульптуры пакінулі А. Грубэ, А. Бразер, З. Азгур, А. Бембель, А. Глебаў, А. Арлоў, М. Манізер. У гэты час ствараюцца помнікі, скульптурныя партрэты, а ў 30-я гады – шматфігурныя кампазіцыі. Адным з лепшых творчых дасягненняў з'явілася афармленне Дома ўрада, выкананае ў 1933-1937 гг. скульптарамі М. Керзіным, А. Бембелем, З. Азгурам, А. Глебавым, Г. Ізмайлавым пад кіраўніцтвам М. Манізера.

У 20-30 гг. значны шлях прайшла беларуская архітэктура. Ствараюцца праекты забудоў гарадоў, рабочых пасёлкаў, Унікальныя манументальныя аб'екты: Дзяржбанк (1927-1929, Г. Гольц, М. Паруснікаў), універсітэцкі гарадок (1928-1931) І. Запарожац, Г. Лаўроў), унікальныя будынкі архітэктара І. Лангбарда (Дома ўрада, Дома Чырвонай Арміі, Тэатра оперы і балета БССР, галоўнага корпуса АН БССР), архітэктара Г. Лаўрова (Нацыянальная бібліятэка Беларусі, корпус Беларускага політэхнічнага інстытута), А. Воінава (гасцініца "Беларусь"). Творчыя пошукі майстроў архітэктуры Беларусі былі цесна звязаны з традыцыямі беларускага дойлідства: стрыманасцю выяўленчых сродкаў пры выразнасці прасторавай кампазіцыі.

Дасягненні беларускага народа ў галіне нацыянальна-культурнага будаўніцтва былі азмрочаны палітычнымі рэпрэсіямі 30-х гадоў. Яны закранулі многіх вядомых у рэспубліцы дзеячаў мастацтва, ускладнялі і стрымлівалі развіццё беларускай культуры.

**Станаўленне таталітарнага рэжыму.** Гісторыкам яшчэ належыць дэталёва даследаваць падзеі тых часоў. Але сёння зразумела галоўнае, што з пераходам да фарсіраванай індустрыялізацыі і суцэльнай калектывізацыі завяршыўся пераход ад палітычнага рэжыму, у якім генеральная лінія выпрацоўвалася ў ходзе супастаўлення і барацьбы думак, да рэжыму, у якім палітычнае кіраўніцтва ажыццяўлялася на аснове ваеннай ці паўваеннай дысцыпліны. У краіне ўсталяваўся таталітарны рэжым. Не толькі ў эканоміцы, але і на ўсіх накірунках грамадскага жыцця стаўка была зроблена на дыктат.

Характэрная рыса таталітарных дзяржаў – панаванне ў іх адной палітычнай арганізацыі. Аднапартыйнасць у БССР (як і ў СССР увогуле) усталявалася пасля 1922 г., калі ў асяроддзі найбуйнейшай апазіцыйнай бальыавікам партыі эсэраў прайшлі масавыя арышты. Камуністычная партыя, узяўшы ўладу, страціла рысы грамадскай арганізацыі і стала своеасаблівай часткай дзяржаўных структур: партыйныя мерапрыемствы ўскосна ці наўпрост фінансаваліся з дзяржаўнага бюджэту, пастановы партыйных органаў былі

абавязковыя для ўсіх дзяржаўных устаноў, а камуністычная ідэалогія стала афіцыйнай. Ужо ў першай палове 30-х гадоў прайшло фактычнае адзяржаўленне грамадскіх арганізацый. Дазваляліся толькі тыя, якія ў сваіх статутах прадугледжвалі дапамогу дзяржаве ва ўсталяванні сацыялізму. Кіраўнікі буйных арганізацый падбіраліся партыйнымі органамі, уваходзілі ў партыйна-дзяржаўны наменклатурны спіс.

З другой паловы 20-х гадоў палітыка УКП(б) у адносінах да прыватнага прадпрымальніцтва пачынае змяняцца.

Грамадзяне БССР не мелі права свабодна змяніць месца свайго жыхарства. У 1932 г. была ўведзена прапіска, якая не давала магчымасці жыць і працаваць без абмежаванняў. Выезд за межы СССР, часткай якой з'яўлялася наша краіна, для абсалютнай большасці грамадзян да пачатку 90-х гадоў рэгламентаваўся.

Сярод іншых адметных рыс таталітарнай дзяржавы – размеркавальная сістэма, пабудаваная на дзяржаўнай уласнасці, і жорсткі кантроль над усімі сферамі грамадскага жыцця.

Найбольшыя бедствы мелі палітычныя рэпрэсіі, якія каштавалі жыццяў тысячам людзей і якія скалечылі лёсы дзесяткам тысяч. "Рэпрэсіі ў галіне сацыялістычнага будаўніцтва, - прызнаваў Сталін, - з'яўляюцца неабходным элементам наступлення..." І сапраўды, на вялікіх будоўлях "сталінскіх пяцігодак" пачала матэрыялізавацца ідэя выкарыстання прымусовай працы. Інструментам яе правядзення ў жыццё стаў развіты рэпрэсіўны апарат і папраўча-працоўныя лагеры. Ідэі ішлі зверху. Органы дзяржаўнай бяспекі і ўнутраных спраў распрацоўвалі методыку рэпрэсій і праводзілі гэтую палітыку ў жыццё.

У катэгорыю ахвяр палітычных рэпрэсій увайшлі грамадзяне, прыцягнутыя судовымі або несудовымі органамі па палітычных, сацыяльных, нацыянальных, рэлігійных і іншых матывах да крымінальнай адказнасці за дзяржаўныя (контррэвалюцыйныя) злачынствы, а таксама па гэтых самых матывах зняволеныя, высланыя, накіраваныя на спецпасяленне, выдаленыя за межы Рэспублікі Беларусь у адміністрацыйным парадку. Правядзенне палітычных рэпрэсій было скіравана на тое, каб трымаць народ у страху перад таталітарнай сістэмай, паралізаваць спробы супраціўлення рэжыму, забяспечыць паднявольнай, таннай рабочай сілай буйныя будоўлі, дзе выкарыстаць працу вольнанаёмных грамадзян было складана.

Пачынаючы з 20-х гадоў, як у цэлым па СССР, так і ў Беларусі сфарміраваўся своеасаблівы рэпрэсіўны механізм, які ўключаў у сябе

як заканадаўчую базу, так і сістэму судовых, несудовых органаў і папраўча-працоўных лагераў (ГУЛАГ). Непасрэдна ажыццяўлялі на справе палітыку рэпрэсій у розныя часы органы УНК (Усесаюзная надзвычайная камісія), АДПУ (Аб'яднанае дзяржаўнае палітычнае ўпраўленне), НКУС (Народны камісарыят унутраных спраў), НКДБ (Народны камісарыят дзяржаўнай бяспекі), МДБ (Міністэрства дзяржаўнай бяспекі), КДБ (Камітэт дзяржаўнай бяспекі).

З канца 20-х гадоў пачынаюцца палітычныя рэпрэсіі па абвінавачванню ў т. зв. нацыянал-дэмакратызме. Яны выліліся ў расправу над прадстаўнікамі беларускай навукі, літаратуры, мастацтва, работнікамі шэрагу наркаматаў рэспублікі. З 826 чалавек, якія праходзілі па спісу ўдзельнікаў беларускага нацыянальнага руху 1917-1924 гг., былі рэпрэсіраваны ўсе, хто застаўся пражываць на тэрыторыі СССР. Больш паловы свайго складу ў 30-я гг. пазбавіўся ў выніку рэпрэсій Саюз пісьменнікаў Беларусі. Практычна поўнасцю, ў 30-я гады была разгромлена Беларуская акадэмія навук. У гэты перыяд было рэпрэсіравана 26 акадэмікаў і 6 чле-наў-карэспандэнтаў Акадэміі.

Вяршыняй расправы над нацыянальнай інтэлігенцыяй (1930) стала справа аб "Саюзе вызвалення Беларусі" (СВБ), па якой было арыштавана 108 лепшых прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі. У 1933 г. прадстаўніцтвам АДПУ па БССР была "выкрыта" яшчэ адна "нацдэмаўская" арганізацыя – "Беларускі нацыянальны цэнтр". Сярод вядомых сёння другіх "спраў" - Працоўная сялянская партыя – беларускі філіял (арыштавана 59 чалавек), Прампартыя – беларускі філіял (30 чалавек), саюзнае бюро РСДРП-меншавікоў (30 чалавек), Партыя вызвалення сялян (110 чалавек), а таксама "контррэвалюцыйныя, шкодніцкія" арганізацыі амаль ва ўсіх сферах народнай гаспадаркі: наркаматах земляробства, аховы здароўя, асветы, трактарацэнтры, у галіне нарыхтоўкі сельгаспрадуктаў, папяровай прамысловасці і інш.

Грамадзян Беларусі неабгрунтавана прыцягвалі да адказнасці як удзельнікаў антысавецкіх дыверсійна-тэрарыстычных, контррэвалюцыйных арганізацый, агентаў замежных разведак, за антысавецкую агітацыю, за прыналежнасць да антысавецкай групы, за распаўсюджванне контррэвалюцыйных чутак, як членаў сям'і "ворага народа" і г. д.

Па загаду з Цэнтра гэтымі справамі займаліся партыйныя і савецкія органы БССР. У чэрвені 1937 г. на XVI з'ездзе Кампартыі Беларусі пытанне аб дзейнасці "ворагаў народа" было галоўным. Першы сакратар В. Шаранговіч і іншыя прамоўцы абвінавачвалі сваіх калег і сяброў у антысавецкай дзейнасці. У выніку старшыня

ЦВК БССР А. Чарвякоў застрэліўся ў сваім кабінеце. А праз невялікі прамежак часу былі рэпрэсіраваныя сам В. Шаранговіч і іншыя кіраўнікі мясцовых уладаў.

Усяго з 1917 да пачатку 50-х гадоў ахвярамі палітычных рэпрэсій сталі каля 600 тыс. грамадзян Беларусі. З іх звыш 240 тыс. асуджаныя судовымі органамі ці пакараны рашэннямі несудовых органаў ("двоек", "троек", асобых нарадаў, калегій АДПУ, НКУС і інш.), каля 250 тыс. сялян рэпрэсіраваны ("раскулачаныя") у адміністрацыйным парадку, звыш 100 тысяч нашых суайчыннікаў высланыя з тэрыторыі заходняй часткі рэспублікі ў 1939-1941 гг. і ў пасляваенныя гады (1944-1953). З лістапада 1917 па красавік 1953 гг. за "контррэвалюцыйныя злачынствы" да вышэйшай меры пакарання было прыгаворана болей 35 тыс. чалавек. Найбольшы пік палітычных рэпрэсій прыйшоўся на 1937-1938 гг. У 1935-1940 гг. былі расстраляны больш за 28 тыс. нашых суайчыннікаў.

Хрушчоўская "адліга" сярэдзіны 50-х гадоў паклала пачатак масавай рэабілітацыі ахвяр палітычных рэпрэсій. З пачатку 90-х гадоў у нашай дзяржаве пачала фарміравацца свая заканадаўчая база па пытаннях рэабілітацыі. На яе аснове яраходзіць рэабілітацыя і забяспечваюцца правы беларускіх грамадзян, пацярпелых у гады рэпрэсій. На пачатак 2001 г., У Рэспубліцы Беларусь было рэабілітавана звыш 200 тыс. неабгрунтавана рэпрэсіраваных грамадзян.

ЛЕКЦЫЯ 19

## САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫЯ ПЕРАЎТВАРЭННІ Ў 20-30-я гг.

- *Новая эканамічная палітыка на Беларусі*
- *Індустрыялізацыя*
- *Калектывізацыя сялянства*

**Новая эканамічная палітыка на Беларусі.** Пасля заканчэння грамадзянскай вайны Савецкая дзяржава апынулася ў крызісным стане. У знешнепалітычным плане ён праявіўся ў палітычнай ізаляцыі. Урады большасці краін адносіліся да яе варожа. Эканамічных сувязяў з замежнымі дзяржавамі таксама не было. Перспектывы сусветнай сацыялістычнай рэвалюцыі аказаліся маларэальнымі. Эканамічнай дапамогі звонку Савецкая дзяржава атрымаць не магла і павінна была разлічваць на свае ўнутраныя рэсурсы. Ва ўнутрыпалітычным становішчы Савецкай дзяржавы крызіс праявіўся ў страце правячай партыяй даверу ў масах і ўзнікненні супярэчнасцяў паміж радавымі членамі і кіруючымі вярхамі, у сістэме кіравання, бюракратызацыі, адсутнасці дэмакратыі.

Вынікам палітычнага і сацыяльна-эканамічнага крызісу было павелічэнне ўзброеных выступленняў супраць Савецкай улады і яе палітыкі "ваеннага камунізму". Кульмінацыяй незадаволенасці стала Кранштацкае паўстанне ў лютым-сакавіку 1921 г. Паўстанцы выступілі супраць партыйнай дыктатуры бальшавікоў, засілля бюракратаў, за перадачу кіравання краінай у рукі працоўнага народа. Іх лозунгам стаў заклік "Улада саветам, а не партыям!". У паўстанні прынялі ўдзел тыя, хто ўдзельнічаў у рэвалюцыі і грамадзянскай вайне і былі апорай дыктатуры пралетарыяту.

Вельмі цяжкае было становішча ў Беларусі. Эканоміка рэспублікі была разбурана. З 715 прамысловых прадпрыемстваў Беларусі пасля вайны засталося 235. Многія з-за адсутнасці сыравіны і паліва не працавалі. Быў разбураны чыгуначны транспарт. Пасяўная плошча скарацілася ў параўнанні з даваенным часам больш як на 36,5%, паменшылася ўраджайнасць, зменшылася пагалоўе жывёлы. Не хапала хлеба, тавараў народнага спажывання. Цяжкае эканамічнае становішча рэспублікі ўзмацнялася масавым палітычным і крымінальным бандытызмам, крадзяжамі.

Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае становішча ўскладнялася парушэннем традыцыйных эканамічных сувязяў рэспублікі па прычыне істотнага абмежавання яе дзяржаўных межаў,

прыгранічным становішчам БССР, непасрэдным суседствам з краінамі іншай палітычнай і эканамічнай арыентацыі. Урад Польшчы, нягледзячы на спыненне ваенных дзеянняў, працягваў падтрымліваць антысавецкія акцыі. З восені 1920 да верасня 1921 гг. на тэрыторыі БССР зарэгістравана каля 250 пагромаў і бандыцкіх налётаў.

Вельмі шырока распаўсюдзіліся нелегальныя (кантрабандныя) гандлёвыя адносіны з прыгранічнымі раёнамі Польшчы, Латвіі, Літвы. Патрэбна было вырашаць праблему бежанцаў і ваеннапалонных, вялікая колькасць якіх сабралася на тэрыторыі рэспублікі.

Галоўнай асаблівасцю сацыяльна-эканамічнага крызісу ў краіне з'яўлялася тое, што вытворца-селянін не мог больш мірыцца з харчраскладкай і ўсёй палітыкай "ваеннага камунізму" – гвалтоўнымі метадамі кіравання эканомікай. Парушалася ўзаемаразуменне паміж Савецкай уладай і сялянствам, якое складала больш як 80% насельыгіцтва краіны. Насельніцтва стамілася ад пабораў і рэквізіцый. У другой палове 1920 г. на савецкай тэрыторыі былі нацыяналізаваны фактычна ўсе прамысловыя прадпрыемствы, але з іх дзейнічала менш паловы. Рабочыя пакідалі галодны горад, імкнучыся ўладкавацца на вёсцы, дзе і без іх хапала рабочых рук. Вясковае насельніцтва абіралі ўсе – вайсковыя часці, харчовыя атрады і проста грабежнікі.

Адсутнасць эканамічных стымулаў росту вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі ў сялян спрыяла далейшай сацыяльнай напружанасці і голаду.

Кіраўніцтва бальшавіцкай партыі паўстала перад выбарам: ці ісці на новую грамадзянскую вайну, якую ў дадзеных умовах яна выйграць не магла, ці прызнаць свае памылкі, і пайсці на адмову ад ваеннага камунізму, і прыняць радыкальную праграму пераадолення крызісу. Менавіта гэтыя прычыны і абумовілі пераход Савецкай дзяржавы да новай эканамічнай палітыкі (нэп).

Афіцыйна новая эканамічная палітыка была прынята па дакладу У. Леніна на X з'ездзе РКП(б) у сакавіку 1921 г. Галоўная задача нэпа заключалася ў стварэнні спрыяльных умоў для хуткага аднаўлення эканомікі, паскоранага развіцця вытворчых сіл краіны і павышэння на гэтай аснове матэрыяльнага і культурнага ўзроўню народа.

Галоўным звяном нэпа было рэфармаванне сельскагаспадарчай вытворчасці. У адпаведнасці з дэкрэтам ад 21 сакавіка 1921 г. харчраскладка як сііосаб дзяржаўных нарыхтовак прадуктаў, сыравіны і фуражу была заменена натуральным падаткам, які аб'яўляўся напярэдадні пасяўной. Сяляне атрымоўвалі права распараджацца сваёй прадукцыяй, якая заставалася пасля выплаты

падаткаў. Спачатку прадугледжвалася, што лішкі выкарыстоўваць маглі сяляне для абмену на прамысловыя тавары ў межах мясцовага гаспадарчага абароту. Але непасрэднага таваравбмену не атрымалася, таму што абмен хлеба на прамысловыя тавары праводзіўся па заніжаных цэнах і быў нявыгадны для селяніна.

За аснову налічэння харчпадатку бралася колькасць ворнай зямлі і едакоў у сям'і, ураджайнасць. Усе гаспадаркі падзяляліся на 7 груп: ад 0,5 дзесяціны на едака да 4 дзесяцін і болей, па ўраджайнасці – 11 разрадаў. На тэрыторыі Беларусі забараняўся свабодны мясцовы абмен на падставе дэкрэта ад 28 сакавіка 1921 г. Улічваючы памеры раскладкі, на яе тэрыторыі харчпадатак быў устаноўлены амаль удвая большы. Для збору падатку ў Беларусі быў сфарміраваны штат з 288 інспектараў, мабілізавана 120 камуністаў, 40 членаў павятовых ваенкамаў і 6 адказных партработнікаў – членау ЦВК (па адным на кожны павет). На кожны павет былі створаны па дзве спецыяльных выязных сесіі рэўтрыбунала. якія мелі права ў судовым парадку прыцягваць да адказнасці неплацельшчыкаў падатку. Выязныя сесіі каралі неплацельшчыкаў ад аднаго да трох гадоў турмы з канфіскацыяй маёмасці.

З 1 жніўня 1922 г. уводзіўся адзіны натуральны падатак, які здаваўо; шасцю асноўнымі прадуктамі ў пераліку на збожжавыя адзінкі. Калі ў 1921 г. кожная гаспадарка павінна была здаваць ад 13 да 18 відаў харчавання, то новы падатак павінен здавацца хлебам, бульбай, мясам, сенам, маслам і алейнымі культурамі. Істотнай рысай новага падатку сталі льготы беднаце, інвалідам, сем'ям чырвонаармейцаў. У гэтым самым годзе ўводзіліся грашовыя падаткі, якія складалі амаль 21% ад натуральнага. Адразу вызначаліся і меры пакарання для неплацельшчыкаў: арышт ад 7 сутак да аднаго года з канфіскацыяй маёмасці. На пачатку 1923 г. у рэспубліцы існавала яшчэ 20 відаў ускосных падаткаў.

У 1923 г. замест усіх відаў падаткаў уводзіўся адзіны сельгаспадатак. Часткова ён мог выплачвацца прадуктамі, часткова – грашыма, налічваўся ў залежнасці ад колькасці ворыва, дарослых членаў сям'і, ураджайнасці. Для кожнага павета вызначаліся абавязковыя адносіны грашовай і натуральнай частак, якія збіраліся рознымі ўстановамі: Наркаматам фінансаў і Наркаматам харчавання. З 1 студзеня 1924 г. падатак збіраўся толькі чырвонцамі ў памеры каля 5% прыбытку з гаспадаркі.

Увядзенне нэпа на Беларусі супала па часе з перадачай зямлі сялянам. У студзені 1921 г. была зацверджана інструкцыя Наркамзема БССР аб парадку часовага размеркавання былых

памешчыцкіх зямель. У выніку ў 1921 г. сялянства павялічыла сваё землекарыстанне на 11,4%. Але прырэзка зямлі аказалася нязначнай, у сярэднім не больш як на 1 дзесяціну. Таму сярэдняя забяспечанасць аднаго двара заставалася на ўзроўні да 1917 г.

У верасні 1922 г. Прэзідыум ЦВК БССР зацвердзіў закон аб працоўным землекарыстанні, які абвяшчаў свабоду выбару формаў землекарыстання. Законнымі прызнаваліся арцелі, Фыватныя ўладанні ў выглядзе вотрубаў і хугароў. Дазвалялся здача зямлі ў арэнду і выкарыстанне наёмнай працы пры ўмове, што члены сям'і наймальніка таксама працуюць. Заахвочвалася развіццё кааперацыі.

Здзяйсненне гэтага закона патрабавала правесці ўпарадкаванне зямель. Мэтай яго было стварэнне лепшых умоў для развіцця сельскай гаспадаркі. У першую чаргу праводзілася землеўпарадкаванне калектыўных і дзяржаўных гаспадарак (камун, калгасаў і саўгасаў). З мэтай ліквідацыі цераспалосіцы і дальназямелля на аснове добраахвотнасці сяляне перася-ляліся з вёсак на хутары і дробныя пасёлкі. Лічылася, што сялянская гаспадарка ў пасёлку будзе блізка знаходзіцца ад сваёй зямлі, зможа ўвесці мнагапольныя севазвароты і будзе спрыяць пераходу да калектыўнай гаспадаркі. Тым не менш сялянства больш ахвотна перасялялася на хутары. За 1923-1928 гг. у Беларусі на хутары выйшла 25% сялянскіх гаспа-дарак. На патрэбы хутарызацыі было зрасходавана 4,8 млн. рублёў і адпушчана 6 млн. рублёў крэдыту.

У наступныя гады землеўпарадкаванне працягвалася. Але зямельны голад не знікаў з-за росту сельскага насельніцтва і дзялення гаспадарак. Землезабеспячэнне адной гаспадаркі мела тэндэнцыю да скарачэння. Калі ў 1917 г. на адну гаспадарку прыходзілася 10,6 дзесяцін усёй зямлі, то ў 1925 г. - 8,51 дзесяцін. За гэты перыяд колькасць гаспадарак павялічылася на 21%, а ўся плошча іх зямель – на 19%. Гэта абвастрыла вырашэнне аграрнага пытання. На пачатку 1925 г. 6,5% сялянскіх гаспадарак заставаліся беззямельнымі, 25,7% - мелі толькі да 0,5 дзесяцін на едака. Больш за 38,2% двароў мелі зямельныя надзелы ніжэй мінімальнай спажывецкай нормы (5,6 дзесяцін зямлі). Аграрная перанаселенасць вёскі і нізкая агракультура прадвызначылі спажывецкі характар большасці сялянскіх гаспада-рак. Таварнасць сельскай гаспадаркі складала 13,2%. Таму ў 1925-1928 гг. праводзілася дадатковае надзяленне малазямельных сялян за кошт пераразмеркавання зямлі. З гэтай мэтай быў створаны спецыяльны зямельны фонд з лясных, дзяржаўных зямель і абрэзкаў лішкаў зямлі ў кулакоў, які ў пачатку 1926 г. налічваў у БССР 537

тыс. дзесяцін. У вёсцы пачаўся чарговы перадзел зямлі. Абвастрыліся адносіны паміж рознымі сацыяльнымі групамі.

Па меры аднаўлення сельскай гаспадаркі рос попыт на наёмную рабочую сілу. З другога боку, у сувязі з драбленнем сялянскіх гаспадарак расла сярод сялян патрэба знайсці работу па найму і арандаваць зямлю. Арэнда зямлі і наёмная праца дапускаліся як у грамадскай ці калектыўнай, так і аднаасобнай гаспадарках. Здача земель дзяржаўнага фонду аднаасобным арандатарам была кароткатэрміновай (не больш за тры гады), а калектыўным аб'яднанням сялян – доўгатэрміновай (да 12 гадоў). Дзяржарэндай карысталіся 3,1% сялянскіх гаспадарак. Нязначнай была і колькасць гаспадарак, ахопленых арэндай на надзельнай сялянскай зямлі. Часцей здавалі зямлю ў арэнду самыя дробныя гаспадаркі з плошчай пасеву да 1 дзесяціны, бо не мелі чым яе апрацоўваць. Самі ж сяляне ішлі працаваць па найму. У цэлым арэнда ў сялянскай гаспадарцы БССР у 20-я гады не атрымала шырокага распаўсюджвання. Арэндай зямлі ў 1925 г. карысталася 7,7%, у 1927 г. – 11% сялян. Самай шматлікай групай арандатараў былі гаспадаркі з плошчай пасеву ад 2 да 6 дзесяцін, якія мелі коней і інвентар. На іх долю прыпадала каля 70% усіх арандатараў. У 1929 г. у сельскай гаспадарцы працавалі 81,1 тыс. наёмных работнікаў. Арэнда зямлі і наём рабочай сілы давалі магчымасць больш поўна выкарыстоўваць працоўныя рэсурсы і сродкі вытворчасці.

У гады нэпа ў рэспубліцы ўзмацнілася роля крэдытнай сельскагаспадарчай кааперацыі. Для падтрымкі кааперацыі ў 1923 г. быў створаны Беларускі сельскагаспадарчы банк з трыма аддзяленнямі ў Бабруйску, Мінску, Слуцку. У 1924 г. былі зменены тэрміны і ўмовы крэдытавання. Гэта значна пашырыла магчымасці карыстацца крэдытамі. Ішоў хуткі рост кааперацыі. Калі ў 1921 г. сетка сельскагаспадарчых кааператываў налічвала 19 кааператыўных таварыстваў, то Ў 1929 г. было 3348 таварыстваў, якія аб'ядноўвалі 341,5 тыс. членаў. Сярод простых сродкаў сельскагаспадарчай кааперацыі пераважалі меліярацыйныя –1268, насенняводчыя – 931, машынныя – 634, крэдытныя – 320 і інш. Шырока развівалася спажывецкая кааперацыя, якая ахоплівала каля 30% дарослага насельніцтва.

Побач з простымі сродкамі сельскагаспадарчай кааперацыі існавалі створаныя ў першыя гады савецкай улады калектыўныя гаспадаркі: камуны, сельскагаспадарчыя арцелі і таварыствы па сумеснай апрацоўцы зямлі. У 1921 г. на тэрыторыі БССР налічвалася 710 калектыўных гаспадарак. У 1922-1924 гг. у сувязі з падзелам

памешчыцкай зямлі большасць сялян выйшла з іх, і многія калектыўныя гаспадаркі распаліся. У 1921 г. на тэрыторыі БССР налічвалася 710 калектыўных гаспадарак. У 1924 г. іх засталося 324. Затым пачаўся нязначны рост. У 1925 г. ужо меліся 433 калектыўныя гаспадаркі, якія былі створаны ў асноўным на землях дзяржаўнага зямельнага фонду. Калгасы рэдка ўтвараліся на надзельных сялянскіх землях. Большасць сялян насцярожана ставіліся да калектыўных гаспадарак. У 1927 г. ў рэспубліцы працавала 227 саўгасаў, зямельная плошча якіх складала 108,5 тыс. дзесяцін і было занята ў іх 17,2 тыс. работнікаў.

Каб павысіць прадукцыйнасць сельскай гаспадаркі, улады праводзілі работы па прымяненню шматпольных севазваротаў, мінеральных угнаенняў, пашырэнню пасеваў тэхнічных культур, стваралі паказальныя ўчасткі і гаспадаркі, арганізоўвалі выстаўкі дасягненняў. Ствараліся камітэты сялянскай узаемадапамогі.

Да 1927 г. сельская гаспадарка была адноўлена, а па пасяўной плошчы, пагалоўʼю буйной рагатай жывёлы пераўзышла даваенны ўзровень. Сярэдняя ўраджайнасць збожжавых да 1925-1928 гг. узрасла да 7,4 ц супраць 6,5 ц у 1910-1915 гг. Павялічыўся дабрабыт сялян.

Вызначальнай рысай новай эканамічнай палітыкі стала развіццё свабоднага гандлю. Права абмену, куплі і продажу распаўсюджвалася не толькі на сельскагаспадарчую прадукцыю, а таксама на тавары саматужнай дробнай прамысловасці. У гады нэпа існавалі розныя віды гандлю: прыватны, кааператыўны і дзяржаўны. Усе яны адкрыта канкурыравалі паміж сабой. Дзяржгандаль утрымліваў вядучыя пазіцыі ў аптовым гандлі. Кааператыўны ажыццяўляў аптоварознічны гандаль, галоўным чынам, прадметамі шырпатрэбу, сельгасмашынамі, сыравінай. Прыватны гандаль развіваўся вельмі інтэнсіўна. Прыватнік добра ведаў рынак, абарачэнне капіталу ў яго складала 10-15 абаротаў у год. Дзяржаўны і кааператыўны не ў стане былі ахапіць увесь рынак з-за адсутнасці матэрыялаў, дарагавізны гандлёвага апарату. У 1922-1923 гаспадарчым годзе ў Беларусі прыватнікам належала 90% усіх – гандлёвых прадпрыемстваў і 85% абароту, а на долю дзяржаўнага і кааператыўнага гандлю – адпаведна 10 і 15% . У замежным гандлі практычна была ўсталявана дзяржаўная манаполія. Увесь экспарт і імпарт тавараў ажыццяўляўся праз спецыяльна створаны камісарыят знешняга гандлю РСФСР.

У галіне фінансаў і крэдытаў нэп прадугледжваў стабілізацыю рубля, які амаль абясцэніўся. Вось чаму была праведзена грашовая рэформа. Першым практычным крокам з'явілася ажыццяўленне

дзвюх дэнамінацый грашовых знакаў. У 1922 г. былі выпушчаны новыя дзяржаўныя грашовыя знакі, т. зв. саўзнакі. Адзін новы рубель адпавядаў 10 тысячам дарэформенных. Другая дэнамінацыя была праведзена ў наступным годзе. Адзін рубель узору 1923 г. раўняўся 1 млн. дарэформенных рублёў, або 100 рублям узору 1922 г. У канцы 1922 г. Дзяржбанк выпусціў новыя грашовыя знакі – чырвонцы, якія абменьваліся на золата (1 чырвонец раўняўся 10 дарэвалюцыйным залатым рублям, або 7,74 г чыстага золата), а таксама банкаўскія білеты Дзяржбанка. Яны на 25% забяспечваліся золатам, у астатняй частцы – каштоўнымі паперамі і таварамі. Паралельна з чырвонцамі былі выпушчаны папяровыя саўзнакі для пакрыцця бюджэтнага дэфіцыту, але з першага красавіка іх выпуск быў спынены. У лютым 1924 г. былі выпушчаны новыя казначэйскія білеты вартасцю 1, 3, 5 рублёў золатам, разменныя сярэбраная і медная манеты.

У гады нэпа склалася сетка крэдытных установ. У яе ўваходзілі Дзяржбанк у Мінску і 9 філіялаў у акруговых цэнтрах, Беларуская кантора Прамбанка ў Мінску з аддзяленнем у Віцебску, Беларуская Кантора Усекамерцыйнага банка ў Мінску, Беларускі камунальны банк у Мінску, а таксама спецыялізаваныя, камерцыйныя і інш. У сістэме ашчадбанкаў былі адменены ўсе абмежаванні на сумы ўкладаў, якія маглі захоўваць грамадзяне і арганізацыі. Уклады ў ашчадных касах не маглі быць канфіскаваны, гарантавалася іх тайна.

Нэп ахапіў і прамысловую сферу. Уведзена была новая сістэма ўпраўлення буйной нацыяналізаванай прамысловасцю. Дзяржава ў асобе УСНГ і яго мясцовых органаў забяспечвала кіраванне яго асобнымі галінамі вытворчасці і вызначанымі буйнымі прадпрыемствамі, якія пераводзіліся на гаспадарчы разлік. У падпарадкаванне СНГ БССР з 219 прадпрыемстваў, што дзейнічалі, былі перададзены толькі 88. Віцебскі губсаўнаргас атрымаў 85 прадпрыемстаў з 267, Гомельскі – 56 з 454. Прадпрыемствы, нездадзеныя ў арэнду і кіраўніцтва якімі дзяржава не брала на сябе, падлягалі закрыццю. Рабочыя, якія засталіся без работы, размяркоўваліся паміж працуючымі прадпрыемствамі, а тыя, хто заставаўся без працы, атрымоўвалі дапамогу ад дзяржавы.

Радыкальныя змены адбыліся ў кіраванні дзяржаўнымі прадпрыемствамі. Главкі былі ліквідаваны, замест іх створаны трэсты – аб'яднанні аднародных ці звязаных паміж сабой прадпрыемстваў, якія атрымлівалі поўную гаспадарчую і фінансавую незалежнасць. Ствараліся сіндыкаты-аб'яднанні трэстаў, якія займаліся збытам, забеспячэннем, крэдытаваннем, знешнегандлёвымі аперацыямі.

СНГ Беларусі ператвараўся ў каардынацыйны цэнтр. Ён ажыццяўляў агульнае кіраўніцтва 16 гаспадарча-разліковымі групавымі ўпраўленнямі і 15 заводаўпраўленнямі. У Віцебскай губерні дзейнічала 12 групавых аб'яднанняў. Прадпрыемствы Гомельскага саўнаргаса былі аб'яднаны ў галіновыя трэсты. Змянілася структура саўнаргасаў. Шматлікія аддзелы і секцыі былі ліквідаваны. Замест іх былі створаны аддзелы: вытворча-тэхнічны, гандлю і забеспячэння, цэнтральная бухгалтэрыя. Адначасова прадпрыемствы пераводзіліся на гаспадарчы разлік. Пасля абавязковых фінансавых узносаў у дзяржбю-джэт яны самі адказвалі за вынікі сваёй гаспадарчай дзейнасці, самастойна выкарыстоўвалі прыбыткі і пакрывалі страты. Гаспадарчы разлік дазваляў прыпыніць практыку дзяржавы браць на сваё ўтрыманне стратныя прадпрыемствы. Матэрыяльнае стымуляванне рабочых і служачых гаспадарча-разліковых прадпрыемстваў ставілася ў поўную залежнасць ад прыбытковасці. Была адноўлена грашовая аплата працы, уведзены тарыфы зарплаты, зняты абмежаванні на павелічэнне заробкаў пры росце выпрацоўкі.

Ва ўмовах нэпа дзяржава стала падтрымліваць дробныя і сярэднія прыватныя і кааператыўныя прадпрыемствы. Адмяняліся дэкрэты, што абмяжоўвалі іх свабоду дзеянняў. Яны атрымалі правы юрыдычных асоб, маглі выкарыстоўваць наёмную працу, атрымліваць крэдыты. Значнае развіццё дробнай вытворчасці было адной з асаблівасцяў Беларусі. Аграрная перанаселенасць вёскі, малазямелле, лішак свабодных рабочых рук сярод насельніцтва мястэчак і гарадоў спрыялі развіццю кустарна-рамесніцкіх промыслаў. У 1923 г. у Беларусі было 3212 прыватных прадпрыемстваў, гадавы абарот якіх складаў 5432,1 тыс. рублёў. Гэта былі пераважна прадпрыемствы скураной, швейнай, харчовай, метала- і дрэваапрацоўчай прамысловасці, на кожным з якіх працавала да 20 чалавек.

Нэп даваў першыя вынікі ў аднаўленні прамысловасці. У 1921 г. у Мінску пачаў дзейнічаць завод "Энергія" (цяпер станкабудаўнічае вытворчае аб'яднанне). На ім выраблялiся жалезныя плугі, лыжкі, вёдры, было асвоена чыгуннае ліццё. У 1921-1922 гаспадарчым годзе аднавілі вытворчасць Мінскі і Старэўскі (Слуцкі павет) шклозаводы, лесазаводы ў Бабруйску, запалкавая фабрыка "Бярэзіна" ў Барысаве, многія гарбарныя і вінакурныя заводы. Адкрывалася мноства кравецкіх, шавецкіх, слясарных і дрэваапрацоўчых майстэрняў, пякарняў, якія забяспечвалі хуткі рост тавараў першай неабходнасці. Побач з першымі поспехамі з'явіліся і праблемы. Ужо вясной 1922 г. у рэспубліцы пачаў адчувацца крызіс збыту. Ён быў выкліканы імкненнем дзяржавы шляхам устанаўлення высокіх цэн на

прамысловыя тавары атрымаць за кошт сялянства неабходныя сродкі для аднаўлення буйной прамысловасці. У 1923 г. цэны на прамысловыя тавары ў Беларусі ў параўнанні з сельскагаспадарчымі выраслі прыкладна ў 5 разоў. Калі ў пачатку 1922 г. пуд збожжа каштаваў 2 рублі золатам, то ў снежні 1923 г. – 31 капейку. У 1913 г. селянін мог купіць боты за 3-4 пуды збожжа, у 1923 г. – за 15-20 пудоў. З прычыны такой дарагоўлі сяляне амаль перасталі купляць вы-рабы фабрычна-заводскай вытворчасці.

У выніку змяншэння збыту пачалося затаварванне прадпрыемстваў. Абвастралася фінансавая праблема. Прадпрыемствам не хапала грошай на нарыхтоўку сыравіны і паліва, выплату заработной платы. Многія заводы і фабрыкі вымушаны былі зачыняцца, значна скарачаць вытворчасць, звальняць частку рабочых, што нярэдка прыводзіла да канфліктаў і забастовак.

Патрабаваліся спецыяльныя дзяржаўныя меры для ліквідацыі крызісу. 29 лютага 1924 г. Савет Працы і Абароны СССР зацвердзіў пастанову "Аб зніжэнні цэн". Цэны на сельскагаспадарчую прадукцыю былі павышаны, а на прамысловую паніжаны. Былі ўстаноўлены цвёрдыя цэны на некаторыя тавары ў прыватным сектары. Адной з галоўных задач ліквідацыі крызісу было павышэнне вытворчасці працы і зніжэнне сабекошту прадукцыі. Тым больш што рост вытворчасці працы адставаў ад тэмпаў росту заработнай платы. У трэцім квартале 1923-1924 гаспадарчага года рост заработнай платы апярэджваў рост вытворчасці працы на 25%. Прадпрыемствы ўзмацнілі матэрыяльную зацікаўленасць, шырока сталі ўкараняць здзельную аплату працы. Паступова разрыў паміж узроўнем зарплаты і прадукцыйнасцю працы скарачаўся. З 1923 да 1926 гг. Прадукцыйнасць працы павялічылася на 50%, пры росце зарплаты на 40%. Пашыралася маральнае заахвочванне працоўных. Перадавікам вытворчасці прысвойвалася ганаровае званне "Герой працы", іх імёны заносіліся на Дошку пашаны, аб'яўляліся падзякі і інш.

Крызіс збыту быў пераадолены. Пачаўся хуткі рост прамысловай вытворчасці. Былі адноўлены і пабудаваны дзесяткі фабрык і заводаў, у іх ліку гарбарны завод "Бальшавік" і шпалерная фабрыка ў Мінску, Віцебская картонная фабрыка, абутковая і кандытарская фабрыкі ў Гомелі, цвікавы завод "Чырвоны Кастрычнік" у Оршы і інш. У 1925 г. у рэспубліцы працавала 40 электрастанцый. Усяго за гады аднаўлення было пабудавана 106 новых прадпрыемстваў. Да канца 1925 г. валавы прадукт цэнзавай прамысловасці перавысіў узровень 1913 г. на 28,5%.

У цэлым, прамысловасць мела паўсаматужны характар і базіравалася на мясцовай сыравіне. Пры адносна вялікай колькасці ўсіх найбольш буйных прамысловых прадпрыемстваў , якія знаходзіліся ў распараджэнні УСНГ, налічвалася ў 1925 г. – 76, з якіх дзейнічала – 67. Асноўны капітал рэспубліканскай дзяржаўнай прамысловасці на 1 кастрычніка 1925 г. складаў 9,57 млн. руб., ці ў сярэднім на адно прадпрыемства 126 тыс. руб. У 1926 г. у дробнай прамысловасці было занята 73% рабочых, на яе долю прыходзілася каля 58% валавой вытворчасці.

Працягваўся працэс каапрыравання дробнай вытворчасці. Ён паскорыўся пасля стварэння ў 1925 г. арганізацыйна-эканамічнага цэнтра "Белсаматужпрамсаюз". На 1 кастрычніка 1927 г. у рэспубліцы налічвалася 265 вытворча-прамысловых арцеляў. Але ў аб'ёме прадукцыі дробнай прамысловасці кааператыўны сектар займаў толькі 5,6%. Асноўная маса прадпрымстваў належала прыватным асобам або здавалася ў арэнду. Прадпрыемствы, якія здаваліся ў арэнду, былі невялікія. Здаваліся яны на кароткі тэрмін. Да 1926 г. было 536 дробных прадпрыемстваў. На кожным з іх працавала да 20 чалавек. Памер арэнднай платы вызначаўся ад кошту маёмасці на таргах.

Нягледзячы на некаторыя поспехі ў развіцці прамысловасці рэспублікі, яе магчымасці для далейшага пашырэння вытворчасці былі абмежаваны. Каб забяспечыць эканамічную стабільнасць, неабходна было правядзенне індустрыялізацыі.

Аднаўленне прамысловасці і сельскай гаспадаркі з'явілася не толькі вынікам эфектыўнасці новай эканамічнай палітыкі, але і гераічных намаганняў рабочага класа і сялянства. Па меры аднаўлення ўмоў працы і быту, павышаўся жыццёвы ўзровень, пашыралася грамадска-палітычная актыўнасць народа.

Паскарэнню аднаўлення і далейшага развіцця прамысловасці Беларусі садзейнічала і ўзаемадапамога савецкіх рэспублік. З РСФСР і Украіны Беларусь атрымлівала метал, станкі, вугаль, рознае абсталяванне, з Азербайджана – нафтапрадукты і г. д. У сваю чаргу, БССР пастаўляла ў другія рэспублікі драўніну, фанеру, дрожджы, запалкі і льнопрадукцыю і інш.

Разам з тым новая эканамічная палітыка мела шэраг супярэчнасцяў. Нэп ажыццяўляўся без адпаведнага рэфармавання палітычнай сістэмы грамадства, улады, ва ўмовах манаполіі адной палітычнай партыі. Вострай стала супярэчнасць паміж патрабаваннямі нэпа і сістэмай улады ў грамадстве. Нэп базіраваўся не на аб'ектыўных эканамічных законах, а на сацыяльным заказе, ілюзіях.

Гэтая дваістасць нэпа, якая ўмацоўвалася на аснове супярэчнасцяў паміж абагуленай і прыватнакапіталістычнай гаспадаркай, абумовіла дастаткова вузкія рамкі для свабоднага рынку, прыватнай ініцыятывы, а таксама шэрагу сацыяльна-эканамічных крызісаў, нарастаючую тэндэнцыю да згортвання гэтай палітыкі.

Сутнасць галоўнай супярэчнасці заключалася ў тым, што тая частка эканомікі, якая была апорай правячых колаў і якая павінна была даказаць сваю эфектыўнасць (дзяржпрамысловасць) на практыцы, уступала прыватнаму капіталу, не магла канкурыраваць з ім. У працэсе пашырэння рынку ўзмацнілася барацьба паміж дзяржаўным, кааператыўным і прыватным гандлем. Дзяржава імкнулася выцесніць нэпманаў, рэгуляваць цэны не толькі эканамічнымі, але і адміністрацыйнымі метадамі. У 1926 г. быў узяты курс на павелічэнне падаткаў, адзяржаўленне дробнай вытворчасці і гандлю. Праводзілася рэзкае скарачэнне грашовага і таварнага крэдыту прыватнікам, касаваліся арэндныя дагаворы, павялічваліся падаткі. Гэта прывяло да згортвання дзейнасці прыватных прамысловых і гандлёвых прадпрыемстваў. Доля прыватніка ў валавой прамысловай прадукцыі з 1925/26 па 1927/28 гаспадарчы год зменшылася ў БССР з 49,2% да 28,6%. Толькі за адзін 1927/28 справаздачны год колькасць прыватных гандлёвых прадпры-емстваў зменшылася больш чым на 5 тыс.

У перыяд нэпа абвастрылася палітычная барацьба ў верхніх эшалонах улады, у цэнтры якой былі пытанні пабудовы новага грамадства СССР пры адсутнасці сусветнай рэвалюцыі. Якім шляхам будаваць такое грамадства, як быць з нэпам, як пераадолець сацыяльныя і эканамічныя крызісы? У выніку гэтай барацьбы ўсталявалася асабістая ўлада Сталіна і камандна-адміністрацыйная сістэма ў кіраванні грамад-ствам, якая вырашыла лёс нэпа. Каб пераадолець крызіс хлебных нарыхтовак, Сталін патрабаваў прымяняць надзвычайныя меры – прыцягваць да судовай адказнасці тых, хто адмаўляецца здаваць хлеб дзяржаве. Ён прапанаваў паскорыць стварэнне калгасаў. Так закончыўся нэп.

**Індустрыялізацыя.** У сярэдзіне 20-х гадоў у СССР ішла вострая ўнутрыпартыйная барацьба за выбар далейшага шляху развіцця краіны. У гэтай барацьбе атрымала перамогу дактрына Сталіна аб фарсіраванай пабудове сацыялізму ў СССР ва ўмовах капіталістычнага акружэння. Яна імкнулася ліквідаваць многаўкладнасць у эканоміцы і рынкавых адносінах, правесці паскораную індустрыялізацыю, калектывізацыю, культурную рэвалюцыю, умацаванне палітычнай сістэмы.

Планавая мадэрнізацыя краіны прадугледжвала хуткае скарачэнне разрыву ва ўзроўні эканамічнага развіцця паміж СССР і заходнімі краінамі, закладала фарсіраваныя тэмпы стварэння індустрыяльнага патэнцыялу. Вядомыя словы Сталіна: "Мы адсталі ад перадавых краін на 50-100 гадоў. Мы павінны прабегчы гэтую адлегласць за дзесяць гадоў". Працэсы мадэрнізацыі і рацыяналізацыі прамысловай вытворчасці ў вядучых капіталістычных краінах у 20-я гады паставілі перад кіраўніцтвам Савецкага Саюза пытанне аб тэмпах і метадах далейшага эканамічнага развіцця. Існаванне краіны залежала ад поспехаў індустрыяльных пераўтварэнняў з апорай на ўнутраныя сілы краіны, паскораны тэмп якіх патрабаваў дзяржаўнага кіраўніцтва. У справаздачным дакладзе ЦК XIV з'езду партыі (снежань 1925 г.) Сталін адзна-чыў неабходнасць хутчэйшай індустрыялізацыі дзяржавы. У рэзалюцыі красавіцкага Пленума ЦК УКП(б) 1926 г. канстатавалася, што "індустрыялізацыя краіны з'яўляецца той задачай, паспяховае вырашэнне якой вызначае далейшы рост усёй гаспадаркі ў цэлым на шляху да перамогі сацыялізму".

Савецкі Саюз у канцы 20-х гадоў знаходзіўся на пачатко-вых этапах індустрыялізацыі. У буйной тагачаснай прамысловасці да пачатку першай пяцігодкі стваралася толькі 20-25% нацыянальнага даходу СССР. У аграрнай вытворчасці было занята амаль 80% працоўнага насельніцтва краіны. Узровень вытворчасці савецкай прамысловасці ў разліку на душу насельніцтва ў 5-10 разоў быў ніжэй душавой вытворчасці індустрыяльна развітых краін. У СССР не выраблялася большая частка абсталявання для металургіі, хімічнай вытворчасці. станкоў, машын для харчовай і лёгкай прамысловасці. У прамысловасці выкарыстанне старога абсталявапня наблізілася да 100% дарэвалюцыйнага ўзроўню. Далейшы рост быў пастаўлены ў залежнасць ад новага будаўніцтва і рэканструкцыі прамысловых прадпрыемстваў.

Галоўнай мэтай індустрыялізацыі было пераўтварэнне СССР у эканамічна незалежную дзяржаву, якая б вырабляла ўсе неабходныя тавары, у першую чаргу сродкі вытворчасці. Для гэтага вызначалася пераважнае развіццё цяжкай індустрыі, якая павінна была забяспечыць пераўзбраенне ўсіх галін народнай гаспадаркі, дастатковы ўзровень абараназдольнасці краіны.

У Беларусі індустрыялізацыя была часткай адзінага працэсу індустрыялізацыі СССР. Нягледзячы на дасягнутыя поспсхі ў аднаўленні прамысловасці, Беларусь заставалася недастаткова развітай у прамысловых адносінах рэспублікай. Займаючы 0,6% тэрыторыі і 3,4% насельніцтва СССР, Беларусь давала ўсяго 1,6% прамысловай

прадукцыі краіны. Доля прамысловай прадукцыі ва ўсёй народнай гаспадарцы рэспублікі складала 23,5% (у СССР - 39,1%). Асноўныя галіны прамысловасці спецыялізаваліся на перапрацоўцы лясной сыравіны і прадуктаў сельскай гаспадаркі. У 1926 г. дробныя саматужнікі выпускалі 41,1% усёй прамысловай прадукцыі і складалі амаль 3/4 усіх рабочых. На прамысловае развіццё адмоўна ўплывалі недастатковасць энергетычных магутнасцяў, недахоп кваліфікаваных рабочых і інжынерна-тэхнічных кадраў.

Зыходзячы з асаблівасцяў прамысловай вытворчасці, наяўнасці сельскагаспадарчай сыравіны, аграрнай перанаселенасці беларускай вёскі, беспрацоўя ў гарадах (каля 50 тыс. чалавек), X з'езд КП(б)Б у снежні 1925 г. і красавіцкі Пленум ЦК 1926 г. вызначылі курс на развіццё прамысловасці па перапрацоўцы мясцовай сыравіны, галін па вытворчасці спажывецкіх тавараў. Было намечана таксама развіццё асобных галін прамысловасці, якія базіраваліся на прывазной сыравіне, у тым ліку сельскагаспадарчага ма-шынабудавання.

За тры гады (1925-1928) у прамысловасць Беларусі было ўкладзена 40 млн. рублёў. Амаль 60% гэтых сродкаў пайшло на рэканструкцыю і рамонтныя работы. Асноўныя капіталаўкладанні былі накіраваны ў паліўную, дрэваапрацоўчую, тэкстыльную і швейную галіны. Частка сродкаў выдзялялася на развіццё прамысловасці будаўнічых матэрыялаў, машынабудавання і энергетыкі. За гэты перыяд у рэспубліцы было пабудавана 150 прамысловых прадпрыемстваў. Сярод іх мінскія заводы "Энергія", "Камунар", гарбарны завод "Бальшавік", фанерны завод у Віцебску, швейная фабрыка ў Гомелі. У маі 1927 г. непадалёку ад Оршы пачалося будаўніцтва БелДРЭС.

У адпаведнасці з рашэннямі XV з'езда УКП(б) быў распрацаваны пяцігадовы план развіцця народнай гаспадаркі БССР – 1928/29-1932/33 гг. Яго кантрольныя лічбы ў лютым 1929 г. прыняў XII з'езд КП(б)Б, а ў маі 1929 г. зацвердзіў IX Усебеларускі з'езд Саветаў. Асноўнай задачай пяцігодкі з'яўлялася стварэнне прамысловасці і рост нацыякальных кадраў прамысловых рабочых, рэканструкцыя ўсёй народнай гаспадаркі, выкараненне капіталістычных элементаў у горадзе і вёсцы. Асноўныя фонды дзяржаўнай прамысловасці рэспублікі планавалася павялічыць у 4,4 раза, тады як у цэлым па краіне – у 2,9 раза. У пяцігадовым плане было закладзена больш хуткае развіццё лёгкай прамысловасці. Пры агульным росце валавой прадукцыі буйной прамысловасці на 331,8% павелічэнне па групе "А" вызначалася на 184,9%, у той час як па групе "Б" – на 427,8%. Пяцігадовы план быў хаця і напружаны, але збалансаваны.

Першыя два гады пяцігодкі далі адчувальныя вынікі. Прамысловасць рэспублікі значна вырасла, змяніліся псіхалогія і палітычныя погляды рабочага класа Беларусі. На адно буйное прадпрыемства на пачатак пяцігодкі прыходзілася каля 250 рабочых, а праз два гады – ўжо 870. Шмат паказчыкаў было перавыканана, аб чым сведчылі вынікі вытворчасці.

У другой палове 1929 г. Сталін пачаў ажыццяўляць "вялікі скачок" у развіцці дзяржавы. Аптымальны план першай пяцігодкі быў адкінуты як састарэлы і былі навязаны павышаныя заданні. На завяршальны 1932 г. планаваўся прырост прамысловай прадукцыі БССР на 22,3% больш, чым было прадугледжана заданнем. Неўзабаве было аб'яўлена, што цэлы шэраг галін прамысловасці можа выканаць пяцігодку за 3 гады. Менавіта ў гэты перыяд абвастрылася праблема накапленняў. Але ў выніку фарсіравання калектывізацыі знізілася сельскагаспадарчая вытворчасць. Па сыравіннай базе быў нанесены сур'ёзны ўдар, які ў многім ускладніў выкананне пяцігадовага плана.

У Беларусі, як і па Саюзе ў цэлым, высокія тэмпы не адпавядалі фінансавым магчымасцям краіны і ўнутранаму аб'ёму рынку. Тым не менш партыйнае кіраўніцтва краіны замест зніжэння тэмпаў прамысловага будаўніцтва пайшло на злом рынку. Дадатковымі крыніцамі фінансавання становяцца эмісія грошай, пашырэнне віннa-гарэлачнай вытворчасці, штучнае павышэнне цэн на прамысловую прадукцыю і зніжэнне на сельскагаспадарчую, павелічэнне падаткаў насельніцтва.

Узрасла доля дзяржаўных унутраных пазык. Яны сталі штогадовымі, размяшчаліся арганізавана па падпісцы сярод насельніцтва пад кантролем партыйных і дзяржаўных органаў. У 1928 г. залаты рубель (чырвонец) перастаў быць канвертаваным. У абарачэнні засталіся толькі папяровыя грошы і дробная разменная манета. Рэальная вартасць рубля за першую пяцігодку знізілася на 60%. Адбываўся хуткі рост цэн. Рэальная заработная плата да канца першай пяцігодкі знізілася амаль на 20%.

У выніку рост прадукцыйнасці працы стаў адставаць ад зададзеных тэмпаў, сабекошт прадукцыі заставаўся высокім. Сур'ёзнай праблемай стаў выпуск бракаванай, нядобраякаснай прадукцыі. У БССР многія галіны вытворчасці не выканалі пяцігадовы план (прамысловасць будаўнічых матэрыялаў, хімічная, паліўная, энергетычная). Патрабавалася змена сістэмы метадаў у розных сферах дзейнасці. Уводзілася камандна-адміністрацыйная сістэма кіравання, якая прадугледжвала дырэктыўнае планавае размеркаванне рэсурсаў і прадукцыі, устанаўленне цэн зверху.

У 1932 г. XVII канферэнцыя УКП(б) канчаткова адмяніла апошнія стымулы кэпа, падкрэсліўшы ў сваёй рэзалюцыі "поўную несумяшчальнасць з палітыкай партыі і інтарэсамі рабочага класа буржуазна-нэпманскіх скажэнняў прынцыпу гаспадарчага разліку". На аснове рашэння ЦВК СССР ад 5 студзеня 1932 г. "Аб рэарганізацыі саўнаргасаў" беларускі Саўнаргас быў пераўтвораны ў Наркамат лёгкай прамысловасці БССР. Прадпрыемствы цяжкай і лясной прамысловасці перападпарадкаваны адпаведным саюзным наркаматам. Фактычна аднаўлялася жорсткая цэнтралізаваная сістэма кіравання прамысловасцю перыяду "ваеннага камунізму". У пачатку 30-х гг. трэсты спынілі сваё існаванне. Гандаль стаў замяняцца размеркаваннем рэсурсаў "зверху" па фондах і нарадах. Забеспячэнне індустрыялізацыі грашовымі сродкамі ўскладалася на Наркамат фінансаў, матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне прадпрыемстваў – на Дзяржплан і галіновыя наркаматы. У выніку непасрэднай крыніцай фінансавання буйнамаштабнага капітальнага будаўніцтва стала не вытворчасць, а сфера размеркавання і абарачэння – падатак з абароту і пазык, якія размяшчаліся сярод насельніцтва.

Тым не менш вынікі пяцігодкі былі значныя. Было ўведзена ў дзеянне 538 прадпрыемстваў, з іх 78 буйных. У тым ліку Гомсельмаш, швейныя фабрыкі ў Віцебску, Гомелі, Магілёве і Бабруйску, Магілёўская фабрыка штучнага валакна, Бабруйскі і Гомельскі дрэваапрацоўчыя камбінаты, БелДРЭС і інш. Удзельная вага буйной прамысловасці ўзрасла з 41,3% да 67%. Выгіуск прамысловай прадукцыі павялічыўся ў 2,7 раза (паводле плана ў 3,8). На Беларусі былі створаны паліўная, машынабудаўнічая, хімічная галіны ловасці, наладзілася вытворчасць штучнага валакна, трыкатажу. Самым важным сацыяльным вынікам пяцігодкі была ліквідацыя беспрацоўя. Удзельная вага рабочага класа з 11,3% павялічылася да 20%. З прамысловасці былі выцеснены капіталістычныя элементы, дзяржава зрабілася манапольным уласнікам.

У гады другой пяцігодкі (1933-1937) было дасягнута павелічэнне валавой прадукцыі ў 1,9 раза. Гэты паказчык быў ніжэй занланаванага (у 3,8 раза). Сярэднегадавы рост іірадукцыі знізіўся з 21,6% у першай пяцігодцы да 13,9%. У строй дзеючых уступілі Гомельскі шкляны і Крычаўскі цэментавы заводы, Гомельскі тлушчакамбінат, Аршанскі льнокамбінат і інш.

За гады першых пяцігодак у БССР была створана новая матэрыяльна-тэхнічная база, пабудавана звыш тысячы прадпрыемстваў, у тым ліку да 400 буйных, якія выпускалі 90% прадукцыі. Грунтоўна змянілася структура прамысловасці. Былі створаны новыя

галіны вытворчасці: станкабудаванне, сельскагаспадарчае машынабудаванне, маторабудаванне, вытворчасць радыёапаратуры. У буйныя індустрыяльныя цэнтры ператварыліся Мінск, Віцебск, Магілёў, Гомель, Бабруйск, Барысаў, Орша, Рэчыца. Кадры рабочага класа выраслі ў 3,3 раза і склалі больш як 700 тыс. чалавек. Падвоілася колькасць інжынераў і тэхнікаў і дасягнула 9 тыс. чалавек.

У канцы 30-х гадоў структура прамысловай вытворчасці адпавядала ролі, якая была адведзена ёй у агульнасаюзным падзеле працы. Складаючы каля 3% ад усяго насельніцтва СССР, БССР выпускала ад агульнасаюзнай вытворчасці 34,7% фанеры, 28,6% запалак, 25% дражджэй, 10% металарэзных станкоў, 17% панчошнатрыкатажных вырабаў, 14% бялізны і інш. Здабыткі ў развіцці прамысловасці былі дасягнуты не толькі працай рабочага класа рэспублікі, яны з'явіліся таксама вынікам эканамічнага супрацоўніцтва і ўзаемадапамогі народаў СССР. З РСФСР, Украіны, Казахстана, іншых рэспублік у Беларусь ішлі вугаль, станкі, абсталяванне, аўтамабілі, збожжа. У ВНУ і на прадпрыемствах Расіі і Украіны рыхтаваліся для рэспублікі кадры інжынерна-тэхнічных работнікаў і кваліфікаваных рабочых. Сотні спецыялістаў і рабочых другіх рэспублік удзельнічалі ў будаўніцтве БелДРЭС, "Гомсельмаша" і іншых прамысловых аб'ектаў.

У індустрыялізацыі выкарыстоўвалася замежная тэхніка і тэхналогіі, падрыхтоўка рабочай сілы вялася па заходніх узорах. 80-85% машын і абсталявання прадпрыемстваў, пабудаваных, рэканструяваных у 30-я гады, складала імпартная тэхніка. Пры адсутнасці замежных інвестыцый сродкі для індустрыялізацыі знаходзілі за кошт абмежавання спажывецкіх патрэб народа. У развітых краінах доля накаплення ў нацыянальным набытку складала 5-10%. У СССР у 30-я гады сектар накагшенняў сюіадаў: у 1930 г. – 29%, у 1931 г. – 40%, у 1932 г. – 44%.

Пагоршылася матэрыяльнае становішча ўсіх слаёў грамадства, асабліва сялянства. Хлеб, які поўнасцю выграбалі з калгасаў, з'яўляўся важнай крыніцай валюты для набыцця прамысловага абсталявання. Цэны на збожжа і шэраг іншых прадуктаў у 10-12 разоў ніжэйшыя за рознічныя і не пакрывалі затрат на іх вытворчасць. Рэзка пагоршылася і становішча гарадскога насельніцтва. Індэкс рознічных цэн у 1940 г. у 6,3 раза перавышаў узровень 1928 г. У 1932-1940 гг. цэны на асноўныя харчовыя тавары выраслі ў 2,2-5,7 раза. Рэальная зарплата рабочых дасягнула ўзроўню 1928 г. толькі ў 1940 г.

Важную ролю ў вырашэнні задач індустрыялізацыі адыграў масавы працоўны энтузіязм рабочага класа. Ён быў абумоўлены тым,

што ў 30-я гады мінімум тых сацыяльна-культурных паслуг, якія даваў горад, быў для многіх учарашніх сялян каштоўным падарункам савецкага ладу. Больш таго, станоўчыя перамены на фоне эканамічнага крызісу, які бушаваў у капіталістычных краінах у 1929-1933 гг., былі асабліва яркімі. Шырока выкарыстоўвалася маральнае стымуляванне працы. Актыўна вялася палітыка-выхаваўчая работа. Навізна перамен была такой незвычайнай, што перабівала ў свядомасці людзей бязладдзе жыцця, параджала высокі аптымізм і энтузіязм.

Вялікае значэнне мела масавае сацыялістычнае спаборніцтва ў такіх яго формах, як ударніцтва, рух гаспадарча-разліковых брыгад, сустрэчнае планаванне і інш. З восені 1935 г. разгарнуўся стаханаўскі рух за высокую прадукцыйнасць працы, удасканаленне арганізацыі вытворчасці, больш эфектыўнае выкарыстанне тэхнікі.

Услед за ростам прадукцыйнасці працы асобных рабочых адміністрацыяй павышаліся нормы выпрацоўкі, зніжаліся расцэнкі, што выклікала незадаволенасць рабочых. У пачат-ку 30-х гадоў на шэрагу прадпрыемстваў рэспублікі мелі месца забастоўкі, выкліканыя нізкай аплатай працы, цяжкімі ўмовамі жыцця і быту. Каб спыніць незадаволенасць, кіраўніцтва краіны ў якасці громаадводу выкарыстоўвала "выкрыццё" так званых "злачынных" арганізацый тыпу "Прампартыі", сярод інжынерна-тэхнічных работнікаў на шахтах Данбаса, асобных буржуазных спецыялістаў.

Высокія тэмпы развіцця былі дасягнуты таксама за кошт пазаэканамічнага прымушэння. Сярод партыйных і савецкіх кіраўнікоў, супрацоўнікаў апарату кіравання ўсіх узроўняў былі пашыраны ідэі неабходнасці рэпрэсій супраць незадаволеных. У народнай гаспадарцы выкарыстоўвалася праца дзесяткаў мільёнаў зняволеных. Імі будаваліся Беламорска-Балтыйскі канал (300 тыс. зняволеных), канал Масква-Волга, БАМ (будоўля пачалася ў 1933 г.). Каля 3 млн. зняволеных людзей будавалі Дальстрой, Магнітку, Нарыльск, здабывалі золата і інш.

Перад вайной была прынята цэлая серыя надзвычайных мер, сярод якіх рашэнні 1938 г. аб умацаванні працоўнай дысцыпліны, у 1940 г. – аб замацаванні рабочых і служачых за прадпрыемствамі і аб крымінальнай адказнасці за выпуск няякаснай і некамплектнай прадукцыі. Але гэтыя меры не вырашылі ўсіх праблем нізкай якасці і эфектыўнасці. Ва ўрадзе былі вымушаны зноў загаварыць пра гаспадарчы разлік, эканамічныя стымулы, матэрыяльнае заахвочванне.

Такія метады далі пэўныя вынікі. Да пачатку Вялікай Айчыннай вайны па абсалютных паказчыках важнейшых відаў прамысловай

прадукцыі СССР наблізіўся ці перасягнуў валавыя паказчыкі Германіі, Англіі, Францыі. Была створана моцная матэрыяльная база. Але не вырашана галоўная для сацыялізму задача – не была забяспечана вышэйшая ў параўнанні з капіталізмам прадукцыйнасць працы.

**Калектывізацыя сялянства.** Цяжкім і драматычным напрамкам пераўтварэнняў, праведзенных пад сцягам пабудовы сацыялізму, з'явілася калектывізацыя сельскай гаспадаркі. У другой палове 20-х гадоў тэмпы сельскагаспадарчай вытворчасці пачалі замаруджвацца. У 1927 г. у краіне ўзнік крызіс хлебанарыхтовак. Краіна недабрала 128 млн. пудоў збожжа. План хлебанарыхтовак у Беларусі быў выкананы толькі на 71,5%. Крызіс хлебанарыхтовак узнік як вынік рыначных хістанняў, а не як адлюстраванне крызісу сельскагаспадарчай вытворчасці. Безумоўна, скарачэнне дзяржаўных нарыхтовак збожжа стварала пагрозу планам прамысловага будаўніцтва, ускладняла эканамічнае становішча, абвастрала сацыяльныя канфлікты ў горадзе і вёсцы.

Па праблеме ўзнікнення крызісу збожжанарыхтовак і шляхоў яго пераадолення выявіліся карэнныя разыходжанні ў пазіцыях Бухарына і Сталіна. Для Сталіна крызіс хлебана-рыхтовак тлумачыўся "кулацкай стачкай": "Мы маем ворагаў унутраных. Мы маем ворагаў знешніх. Аб гэтым нельга забываць... ні на адну хвіліну". Шляхі ў пераадоленні цяжкасцей бачыліся яму ў бязлітасным знішчэнні ворагаў, сярод якіх на першым месцы стаялі кулакі.

Прапановы Бухарына аб выхадзе з крызісу на шляхах нэпа (адмова ад "надзвычайных мер", захаванне курсу на ўздым сялянскай гаспадаркі, развіццё гандлёва-крэдытных форм каапераціі, павышэнне цэн на хлеб і інш.) былі адхілены як уступка кулаку і праяўленне правага апартунізму. Перавод сельскай гаспадаркі на шляхі буйной абагуленай вытворчасці стаў разглядацца як сродак рашэння збожжавай праблемы і адначасова ліквідацыі кулацтва як галоўнага ворага Савецкай улады.

У Беларусі прыхільнікам так званых "праваўхілісцкіх" тэорый былі навешаны жорсткія палітычныя ярлыкі "прышчэпаўцаў" і "кіслякоўцаў" (прафесар Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі І.А. Кіслякоў). Іх абвінавачвалі ў ідэі насаджэння хутароў, кулацкіх гаспадарак, недаацэнцы складанай машыннай тэхнікі, перспектыў калгасна-саўгаснага будаўніцтва. Пры гэтым зусім забываўся той факт, што савецкае заканадаўства дапускала свабодны выбар формаў землекарыстання. Дз. Прышчэпава, а таксама 29 іншых "правы апартуністаў" з ліку кіруючых работнікаў, выключылі з партыі і рэпрэсіравалі.

Барацьба з правым ухілам суправаджалася фарсіраваннем калектывізацыі, наступленнем на кулака. "Тэарэтычным" яго абгрунтаваннем з'явіўся артыкул Сталіна "Год вялікага пералому", апублікаваны 7 лістапада 1929 г. У ім сцвяржалася, што ў калгасы быццам пайшлі асноўныя, серадняцкія масы сялянства, што ў сацыялістычным пераўтварэнні сельскай гаспадаркі ўжо атрымана "рашаючая перамога" (на самай справе ў калгасах тады знаходзілася 6-7% сялянскіх гаспадарак).

Пасля лістападаўскага Пленума ЦК УКП(б) 1929 г. пачалося нарошчванне тэмпаў калектывізацыі. Калі ў лістападзе 1929 г. у калгасах Беларусі знаходзілася 77,7 тыс. Сялянскіх гаспадарак, працэнт калектывізацыі складаў 9,8%, то ў пачатку 1930 г. колькасць сялянскіх гаспадарак, уцягнутых у калгасы, была даведзена да 165,3 тыс., а працэнт калектывізацыі ўзняты да 20,9%. На працягу месяца, такім чынам, паказчыкі павялічыліся больш чым удвая.

5 студзеня 1930 г. ЦК УКП(б) прыняў пастанову "Аб тэмпах калектывізацыі і мерах дапамогі дзяржавы калгаснаму будаўніцтву". Да восені 1930 г. калектывізацыю прадугледжвалася завяршыць у важнейшых збожжавых раёнах краіны, да восені 1931 – вясны 1932 гг. у асноўных раёнах і ў цэлым па Саюзу – на працягу пяцігодкі. Нягледзячы на тое, што Беларусь не адносілася да вытворцаў збожжа, студзеньскі (1930 г.) Пленум ЦК КП(б)Б прыняў рашэнне да канца 1931 г. завяршыць калектывізацыю ўсіх бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Больш таго, у лютым 1930 г. Бюро ЦК Кампартыі Беларусі вырашыла калектывізаваць да веснавой сяўбы 75-80% сялянскіх гаспадарак. 10 лютага гэтага ж года ЦК КП(б)Б адправіў у ЦК УКП(б) дакладную запіску з прапановаю прызнаць БССР рэспублікай суцэльнай калектывізацыі.

Для правядзення калектывізацыі ў вёску былі накіраваны сотні ўпаўнаважаных, якія не ведалі патрэб сялян, чынілі яшчэ большае самавольства, чым мясцовыя ўлады. На кіруючыя пасады ў калектыўныя гаспадаркі былі пастаўлены рабочыя-дваццаціпяцітысячнікі. Растлумачальная і арганізацыйная работа падмянялася грубым націскам, пагрозамі, дэмагагічнымі абяцаннямі. Раскулачваць пачалі не толькі кулакоў, але і сераднякоў – тых, хто не хацеў уступаць у калгасы. Найгрубейшыя скажэнні дапускаліся пры абагульненні сродкаў вытворчасці. Узровень калектывізацыі імкліва павышаўся. Да 1 сакавіка 1930 г. у Беларусі ў калгасах налічвалася 457,7 тыс. сялянскіх гаспадарак – 58% іх агульнай колькасці.

Галоўным вынікам насілля пры стварэнні калгасаў сталі масавая незадаволенасць і адкрытыя пратэсты сялян, аж да антысавецкіх

узброеных выступленняў. Толькі ў Беларусі ў 1930 г. было больш як 500 сялянскіх выступленняў. Перад уступленнем у калгас сяляне рэзалі жывёлу. Да мая(385) 1930 г. пагалоўе буйной рагатай жывёлы скарацілася больш чым на чвэрць.

Фарсіраванне тэмпаў калектывізацыі ў канцы 1929 г. і ў першыя месяцы 1930 г. суправаджалася актывізацыяй барацьбы з кулацтвам. 30 студзеня 1930 г. была прынята пастанова ЦК УКП(б) "Аб мерапрыемствах па ліквідацыі кулацкіх гаспадарак у раёнах суцэльнай калектывізацыі". Прадпісвалася правесці канфіскацыю ў кулакоў сродкаў вытворчасці, жывёлы, гаспадарчых і жылых будынкаў, якія перадаваліся ў калгасы. Пастанова вызначала, што колькасць раскулачаных па раёнах не павінна перавышаць 3-5% ад усіх сялянскіх гаспадарак. Для раёнаў суцэльнай калектывізацыі, у тым ліку Беларусі, прадугледжвалася выслаць у аддаленыя раёны краіны 210 тыс. гаспадарак.

Імкненне да перавыканання спушчаных зверху "кантрольных лічбаў" па раскулачванню паўсюдна распаўсюдзілася. Ужо да канца мая 1930 г. ў Беларускай ССР было раскулачана 15 629 сялянскіх гаспадарак. За дзейнасць, накіраваную супраць калгаснага ладу, за межы рэспублікі было выслана 6 тыс. кулакоў, што склала 0,74% ад агульнай колькасці сялянскіх гаспадарак.

Перагібы ў абагульненні жывёлы рэзка абвастрылі сітуацыю ў краіне. Шматлікія пісьмы ў партыйныя органы са скаргамі, пратэстамі, апісаннямі бязладдзя, прымусілі партыйнае кіраўніцтва ў другой палове лютага 1930 г. даць дырэктывы аб ліквідацыі спешкі пры арганізацыі калгасаў. 2 сакавіка "Правда" апублікавала перапрацаваны прыкладны статут сельскагаспадарчай арцелі, які ў пэўнай ступені ўлічваў настроі сялян. У тым самым нумары газеты з'явіўся артыкул Сталіна "Галавакружэнне ад поспехаў", у якой уся адказнасць за дапушчаныя "скрыўленні" перакладвалася на мясцовых работнікаў. 17 красавіка 1930 г. бюро ЦК КП(б)Б прыняло рэзалюцыю "Аб барацьбе з перагібамі ў калгасным руху". Пасля гэтых рашэнняў адбыўся адток сялян з калгасаў. Зніклі "папяровыя" і насільна створаныя калгасы. Да ліпеня 1930 г. іх засталося толькі 11%. Незаконна раскулачаных пачалі вяртаць назад. Аднак праведзеная работа па абагульненню гаспадарак была прызнана правільнай.

Адступленне ў сакавіку было тактычным ходам, які аслабіў напружанне ў вёсцы. Увосень пачалася новая хваля калектывізацыі. Кастрычніцкі (1930 г.) Пленум ЦК КП(б)Б зноў прызнаў неабходным "паскорыць" тэмпы калектывізацыі, а ў пачатку 1931 года Бюро ЦК КП(б)Б прыняло рашэнне аб завяршэнні калектывізацыі пад вясну

гэтага ж года. Да канца пяцігодкі ў БССР было калектывізавана 43,3% сялянскіх гаспадарак і абагулена 47,1% пасяўных плошчаў.

Важным накірункам калектывізацыі стала стварэнне машынна-трактарных станцый (МТС). Першая МТС у нашай рэспубліцы была створана ў канцы 1929 г. у Койданаўскім (цяпер Дзяржынскім) раёне. У канцы пяцігодкі ў Беларусі налічвалася 57 МТС, якія мелі 1469 трактароў. Яны абслугоўвалі 33,1% усіх калектыўных гаспадарак. МТС рабілі калгасы поўнасцю залежнымі ад дзяржавы.

Дзяржава падтрымлівала калгасы. Ім даваліся істотныя падатковыя льготы, выдзяляліся грашовыя крэдыты. З сялян, якія ўступілі ў калгас, скасоўвалася запазычанасць па землеўпарадкаванню. Затое для аднаасобнікаў былі павялічаны стаўкі сельскагаспадарчага падатку, уведзены аднаразовыя падаткі. Павялічыўся таксама аб'ём дзяржаўных нарыхтовак, якія набывалі абавязковы характар.

Рабіліся захады па арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаванню калгасаў, па падрыхтоўцы кіруючых калгасных кадраў, па стварэнню ўнутранай структуры сельгасарцеляў, наладжванню дысцыпліны грамадскай працы, уліку і аплаце працы і інш. Быў усталяваны працадзень, які дазваляў перайсці на здзельную аплату.

Прымяняліся розныя адміністрацыйныя меры. 7 жніўня 1932 г. прымаецца закон аб ахове сацыялістычнай уласнасці. За крадзёж калгаснай і кааператыўнай маёмасці ўводзіўся расстрэл з канфіскацыяй усёй маёмасці, а пры змякчаючых віну акалічнасцях – пазбаўленне волі на тэрмін не ніжэй чым 10 гадоў з канфіскацыяй усёй маёмасці. Амністыя за такія правіннасці была забаронена. У БССР на працягу 1933-1934 гг. па гэтаму закону было асуджана больш за 10 тыс. чалавек.

З пачатку 1933 г. улада ў вёсцы фактычна перайшла да надзвычайных органаў – палітаддзелаў МТС, якія пачалі арганізоўвацца па рашэнню студзеньскага 1933 г. аб'яднанага Пленума ЦК КП(б)Б і ЦК УКП(б). У Беларускай ССР да канца 1933 г. было створана 57 палітаддзелаў, а ў 1934 г. іх колькасць павялічылася да 72. За гады сваёй работы яны выключылі з калгасаў 2700 "кулакоў-шкоднікаў", знялі з работы за "варожую дзейнасць" 1544 работнікі. Актыўны ўдзел прынялі палітаддзелы ў чыстцы партыі, што была праведзена ў 1933 г. Толькі ў Беларусі было выключана звыш 6 тыс. камуністаў, 13,7 тыс. кандыдатаў, што складала адпаведна 15,6 і 25% усяго ліку партыйнай арганізацыі рэспублікі. Праіснавалі палітаддзелы да канца 1934 года.

У гады другой пяцігодкі калектывізацыя ў Беларусі фактычна завяршылася. У калгасы было аб'яднана 87,5% сялянскіх двароў і

абагулена 96% пасяўных плошчаў. У лютым 1936 г. II Усесаюзны з'езд калгаснікаў-ударнікаў прыняў Статут сельскагаспадарчай арцелі, які гарантаваў існаванне асабістай падсобнай гаспадаркі калгаснікаў і гэтым самым даваў некаторую палёгку ім.

Паступовa адбываецца аднаўленне сельскагаспадарчай вытворчасці. На калгасных палях працавала больш як 8 тыс. трактароў, 600 камбайнаў і іншых сельскагаспадарчых машын. Але вытворчыя паказчыкі пад канец 30-х гадоў заставаліся на ўзроўні дакалгаснай вёскі. Ураджайнасць збожжавых культур склала ў 1933 г. 6,3 ц з 1 га, у 1940 г. – 7 ц, а надой на адну карову – адпаведна – 810 і 834 л малака. Ды і сам памер сельскагаспадарчай арцелі быў невялікі. Ён складаўся ў сярэднім з 75 гаспадарак, з пасяўной плошчай каля 400 га. Калгаснікі заставаліся самай нізкай па аплаце катэгорыяй насельніцтва.

Калектывізацыя сельскай гаспадаркі азначала карэнныя змены ўсяго ладу жыцця асноўнай масы насельніцтва рэспублікі. Яе вынікам з'явілася ліквідацыя шматукладнасці ў эканоміцы і стварэнне калектыўных гаспадарак. Самадзейнасць калгасаў з самага пачатку была абмежавана, што тармазіла іх ініцыятыву, гаспадарчы рост. З калгаснай вёскі ішла пастаянная мабілізацыя чалавечых і матэрыяльных рэсурсаў на розныя дзяржаўныя патрэбы. У 1933 г. былі ўведзены абавязковыя пастаўкі калгаснай прадукцыі дзяржаве, якія мелі характар падатку. Цэны на збожжа і большую частку іншых сельскагаспадарчых прадуктаў былі ў некалькі разоў ніжэйшыя за рыначныя. Важнейшыя сродкі вытворчасці, а таксама кваліфікаваныя кадры былі сканцэнтраваны ў дзяржаўных МТС, якія апрацоўвалі калгасныя палі за натуральную плату, прычым памеры яе вызначаліся зверху.

Гэта таксама аддаляла вытворцаў і ад сродкаў вытворчасці, і ад вынікаў працы. Складвалася сістэма планавання і камандавання калгасамі з боку апарату. Калгаснікі не мелі пашпартоў, што выключала магчымасць свабоднага перамяшчэння, юрыдычна прывязвала да калгаса, надавала іх працы прымусовы характар. Калгасы ў пераважнай большасці не з'явіліся вынікам натуральнага развіцця сельскагаспадарчых адносін.

Сацыяльна-эканамічныя вынікі гаспадарчага будаўніцтва ў канцы 20-30-х гг. былі супярэчлівыя. З аднаго боку, гаспадарчае будаўніцтва дазволіла стварыць у СССР гаспадарчы комплекс, што выводзіла краіну на рубяжы сусветнага тэхнічнага прагрэсу. На закладзенай у 30-я гады тэхнічнай базе стала магчымай перамога ў вайне і аднаўленне пасляваеннага будаўніцтва. Індустрыяльнае

будаўніцтва прывяло да павышэння культурна-тэхнічнага ўзроўню грамадства. З другога боку, сацыялістычнае будаўніцтва суправаджалася велізарнымі матэрыяльнымі і людскімі стратамі, былі ліквідаваны розныя формы ўласнасці, дзяржава стала адзіным манапалістам у сферы вытворчасці і размеркаванні, сфарміраваўся затратны механізм гаспадарання, усталявалася каманднаадміністрацыйныя сістэма кіравання ўсімі сферамі грамадскага жыцця.

## ТЭМА VI. ЗАХОДНЯЯ БЕЛАРУСЬ У СКЛАДЗЕ ПОЛЬШЧЫ

**Гістарыяграфія, крыніцы.** У гістарыяграфіі гісторыі Заходняй Беларусі можна выдзеліць некалькі перыядаў. Аўтары артыкулаў і брашур, якія паявіліся на першым этапе распрацоўкі праблемы ў 20-30-я гг., з'яўляліся, як правіла, кіраўнікамі камуністычнага і нацыянальна-вызваленчага руху І.К. Лагіновіч (П. Корчык), С.Т. Мілер (У.Р. Валевіч), М.А. Блінчыкаў (Л. Якаўлеў), Л.І. Родзевіч (А. Сталевіч), А.А. Альшэўскі (Д. Пружанскі), М.С. Арэхва (Я. Крыўда), Б.А. Тарашкевіч, П.В. Мятла і інш. Яны рабілі першыя спробы навуковага аналізу, тэарэтычнага асэнсавання практыкі рэвалюцыйна-вызваленчай барацьбы. Напісаныя па гарачых слядах падзей, гэтыя работы ўяўляюць цікавасць, галоўным чынам, як крыніцы. Аўтары разглядалі беларускія нацыянальна-дэмакратычныя партыі, арганізацыі польскіх і яўрэйскіх сацыял-дэмакратычных партый (ППС, "Стронніцтво людовэ", Бунд), як частку польскага рэакцыйнага лагера. Перабольшваўся ўзровень рэвалюцыйнасці працоўных мас.

У 1931 г. пры Заходнім сектары Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КП(б)Б была створана гісторыка-рэвалюцыйная камісія па вывучэнню Заходняй Беларусі. Планавалася выданне перыядычнага гістарычнага зборніка. Аднак у сувязі з тым, што пачаліся рэпрэсіі, зборнік не быў апублікаваны, а ў 1934 г. выйшла падрыхтаваная Ф. Фрышманам грунтоўная праца "Промышленность Западной Белоруссии" (Мн., 1934). Супрацоўнікі камісіі падрыхтавалі і выдалі зборнік артыкулаў пад рэдакцыяй члена бюро ЦК КПЗБ С. Мертэнса (С. Скульскага) "Политические партии в Польше, Западной Белоруссии и Западной Украине" (Мн., 1935). Але ў гэтай працы аналіз палітычных падзей і дзейнасць палітычных партый падаваліся праз прызму распаўсюджанай у канцы дваццатых-трыццатых гадоў так званых тэорый "нацыянал-фашызму" і "нацыянал-апартунізму".

Менавіта па прычыне ідэалагічнага характару змястоўныя працы дзеячаў нацыянальнага руху А. Стэповіча "Беларусь і дзяржаўная незалежнасць" (Вільня, 1929), Ад. Станкевіча "Да гісторыі беларускага палітычнага вызвалення" (Вільня, 1934), яго ж "Беларускі хрысціянскі рух" (Вільня, 1939) і іншыя, прысвечаныя гісторыі нацыянальна-вызваленчага руху ў краі, паказу ролі ў ім беларускіх дэмакратычных партый і арганізацый, засталіся невядомымі для грамадскасці.

Пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі **з** БССР у Маскве, а затым і ў Мінску выйшлі навуковыя працы Г. Ягорава "Западная Белоруссия" (М., 1939), В. Мінаева "Западная Украина и Западная Белоруссия под

гнетом панской Польши" (М., 1939), І. Лочмеля "Очерк истории борьбы белорусского народа против польских панов" (М., 1940), зборнік "Заходняя Беларусь пад панскім гнётам і яе вызваленне" (Мн., 1940). Яны ставілі мэту паказаць правамернасць далучэння заходнебеларускіх і заходнеўкраінскіх зямель. Таму ў іх асноўная ўвага звярталася на каланіяльны стан эканомікі гэтых зямель, бяспраўнае нацыянальнае і палітычнае становішча заходнебеларускага і заходнеўкраінскага насельніцтва ў часы польскай улады. Рэвалюцыйна-вызваленчы рух трактаваўся як стыхійны працэс.

Схематычны, заідэалагізаваны падыход да асвятлення гісторыі Заходняй Беларусі быў характэрны і для першага пасляваеннага дзесяцігоддзя. У кнізе тагачаснага сакратара ЦК КПБ Ц. Гарбунова "Воссоединение белорусского народа в едином Советском социалистическом государстве" (М., 1948) былі дадзены памылковыя ацэнкі развіцця рэвалюцыйна-вызваленчага руху і дзейнасці яго кіраўнікоў.

Рэабілітацыя незаконна рэпрэсіраваных дзеячаў камуністычнага і нацыянальна-вызваленчага руху вызначыла якасна новы перыяд у гістарыяграфіі Заходняй Беларусі. У 1966 г. апублікавана калектыўная манаграфія "Революционный путь Компартии Западной Белоруссии” (1921-1939 гг.)", асноўныя палажэнні якой не страцілі сваёй навуковай вартасці і ў наш час. Аднак у гэтай працы многія складаныя працэсы рэвалюцыйна-вызваленчага руху падаюцца праз прызму заідэалагізаванасці. У працах У. Палуяна і І. Палуяна "Революционное и национально-освободительное движение в Западной Белоруссии в 1920-1939 гг." (Мн., 1962), У.А. Палуяна "Беларуская сялянска-рабочая грамада" (Мн., 1967), "Революционно-демократическое движение в Западной Белоруссии 1927-1939 гг." (Мн., 1978), А.М. Мацко "Революционная борьба трудящихся Польши и Западной Белоруссии против гнета буржуазии и помещиков" (Мн., 1972). А.А. Сарокіна "Аграрный вопрос в Западной Белоруссии 1920-1939 гг." (Мн., 1968), У.Ф. Ладысева "Шлях да свабоды. З гісторыі рэвалюцыйна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі" (Мн., 1978) на аснове выкарыстання новага дакументальнага матэрыялу былі адлюстраваны многія маладаследаваныя пытанні гісторыі рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху, вызначаны склад і сацыяльная структура яго ўдзельнікаў, накірункі і формы нацыянальна-вызваленчай барацьбы.

Сацыяльна-палітычным пераўтварэнням у краі пасля ўз'яднання прысвечаны даследаванні І.0. Царук "В братском союзе. Социалистические преобразования экономики в западных областях БССР. Сентябрь 1939 - нюнь 1941 гг." (Мн., 1976), Я.А. Місарэвіча "На

освобожденной земле: Политическая работа в западной области Белоруссии. Сентябрь 1939 – июнь 1941 гг." (Мн., 1989).

Ідэалагічныя ўстаноўкі прадвызначалі праблематыку навуковых работ 60-80-х гг., у якіх пераважала гісторыка-партыйная тэматыка. Розным аспектам дзейнасці Кампартыі Заходняй Беларусі былі прысвечаны даследаванні Г.Б. Ватковіча "КПЗБ в борьбе за интернациональное единство трудящихся. 1929-1933 гг." (Мн., 1975), П.І. Зялінскага, М.А. Ракевіча "Печать КПЗБ в борьбе за свободу" (Мн., 1977), П.І. Зялінскага "Политическая работа КПЗБ в массах" (Мн., 1986), С.В. Кабяка "Под знаменем пролетарской солидарности: Компартия Западной Белоруссии в борьбе за интернациональное сплочение трудящихся. 1923-1929 гг." (Мн., 1979) і іншыя. Паслабленне ідэалагічнага дыктату ў канцы 80-х гадоў садзейнічала паяўленню даследаванняў, у якіх больш грунтоўна разглядалася дзейнасць беларускіх нацыянальна-дэмакратычных партый і арганізацый, паказвалася іх роля ў супрацьдзеянні палітыкі паланізацыі. У.Ф. Ладысеў "В борьбе за демократическне права н свободы" (Мн., 1988); І.В. Палуян "Западная Белоруссня в период экономического кризиса 1929-1933 гг." (Мн., 1991). Але поўнасцю адысці ад ранейшага канцэптуальнага ідэлагізаванага падыходу іх аўтары не змаглі.

З прац польскіх гісторыкаў перыяду 50-80-х гг., у якіх знайшлі адлюстраванне асобныя праблемы станаўлення і развіцця руху ў Заходняй Беларусі, навуковую вартасць прадстаўляе шэраг зборнікаў "Sprawy białoruskie w II Rzeczpospolitej" (Warszawa, 1984); а таксама зборнік "Ruch robotniczy na Białostoczczyznie. Studie i materially." (Warszawa, 1987); "Materiały z sesji popularno-naukowej, poświenconej działalności Komunistycznej Partii Polski na terene Białostocczyzny " (Bia1ystok, 1960). Прычым ацэнка польскімі гісторыкамі асімілятарскага характару палітыкі кіруючых колаў Польшчы ў асноўным супадала з пазіцыяй беларускіх гісторыкаў.

Новыя падыходы характэрны для навуковых прац 90-х гадоў. Пачалося пераасэнсаванне метадалогіі даследаванняў, больш аб'ектыўнымі сталі ацэнкі асобных партый, рухаў, дзеячаў Заходняй Беларусі. Гэта знайшло адлюстраванне ў зборніку матэрыялаў першай Усебеларускай канферэнцыі гісторыкаў "Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь", (ч. І. Гісторыя Беларусі. Мн., 1994), у артыкулах А.М. Вабішчэвіча "Нацыянальная школа ў Заходняй Беларусі 1921-1939 гг." // Беларускі гістарычны часопіс. 1994. № 3 і "Таварыства беларускай школы 1921-1936 гг." // Беларускі гістарычны часопіс. 1997. № 1; А. Васільевай "Беларуская

хрысціянская дэмакратыя: першыя крокі" // Старонкі гісторыі і культуры Беларусі (Мн., 1997), У.Ф. Ладысева "Цяжкі шлях выпрабаванняў" // Беларускі гістарычны часопіс. 1994. № 1, "Іосіф Каэтанавіч Лагіновіч: нарыс жыцця і палітычнай дзейнасці" // Беларускі гістарычны часопіс. 1996. № 3, 4 і інш., А. Хацкевіча "Арышты і дэпартацыі ў заходніх абласцях Беларусі 1939-1941 гг." // Беларускі гістарычны часопіс. 1994. № 1, 2. У публікацыях канца 90-х гадоў практычна ўпершыню знайшлі асвятленне ваенныя падзеі верасня 1939 г. у сувязі з падрыхтоўкай і правядзеннем ваеннай аперацыі войскаў Беларускага фронту (У.Ф. Ладысеў "Ваенныя падзеі верасня 1939 г. у лёсе беларускага народа" // Беларускі гістарычны часопіс. 1999. № 3), а таксама аб'ектыўны аналіз здзейсненых палітычных і сацыяльна-культурных пераўтварэнняў у заходніх абласцях Беларусі ў верасні 1939 - чэрвені 1941 гг.: Зб. "Назаўсёды разам". Да 60-годдзя ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР (Мн., 1999).

Важным дасягненнем беларускай гістарыяграфіі было пашырэнне крыніцазнаўчай базы даследаванняў. Гэтаму садзейнічала апублікаванне зборнікаў успамінаў удзельнікаў рэвалюцыйна-вызваленчага руху: "У суровыя гады падполля: Успаміны былых членаў КПЗБ – актыўных удзельнікаў рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі" (Мн., 1958); "Вильнюсское подполье. Воспоминания участников революционного движения в Вильнюсском крае 1920-1939 гг." (Внльнюс, 1966); "Они не сталн на колени": Сб. материалов н документов о концлагере Берёза Картузская (Мн., 1966); "Годы испытаний н мужества" (Мн., 1973); "Жизнь, отданная народу: статьн н речн С.О. Притыцкого, документы н воспомннання о нем" (Мн., 1978); Н.С. Арэхва "Дела и людн КПЗБ: Воспоминания" (Мн., 1978); "Komuniscі Bialostocczyzny. Wspomnenia." (Białystok, 1960).

Асаблівае значэнне мае зборнік дакументаў і матэрыялаў аб сацыяльна-эканамічным, палітычным становішчы насельніцтва краю, дзейнасці палітычных партый і арганізацый, забастовачным і нацыянальна-вызваленчым руху "Борьба трудяшихся Западной Белоруссии за социальное н национальное освобождение и воссоединение с БССР". Документы и материалы. Т. 1 (1921-1929 гг.) (Мн„ 1962); Т. 2 (1929-1939 гг.) (Мн„ 1972). На сённяшні дзень гэта пакуль што адзінае дакументальнае выданне па гісторыі Заходняй Беларусі.

ЛЕКЦЫЯ 20

## УМОВЫ ЖЫЦЦЯ НАСЕЛЬНІЦТВА КРАЮ Ў СКЛАДЗЕ ПОЛЬШЧЫ

- *Прававы і эканамічны стан Заходняй Беларусі*
- *Культура і асвета*

**Прававы і эканамічны стан Заходняй Беларусі.** Згодна з другім артыкулам Рыжскага дагавора ад 18 сакавіка 1921 г. да Польшчы адышлі Гродзенская губерня, Навагрудскі, Пінскі, частка Слуцкага, Мазырскага і Мінскага ўездаў Мінскай губерні, а таксама Ашмянскі, Лідскі, Вілейскі і Дзісненскі ўезды Віленскай губерні. Яшчэ раней у пачатку кастрычніка 1920 г. захопленыя Л. Жалігоўскім тэрыторыі Віленскага, Свянцянскага і Трокскага ўездаў Віленскай губерні, т. зв. Сярэдняя Літва таксама былі далучаны да Польшчы. Гэтыя тэрыторыі атрымалі ў гістарычнай літаратуры назву Заходняя Беларусь. У афіцыйных польскіх дакументах ужываецца назва "крэсы ўсходнія", што азначае "ўсходнія ўскраіны" Другой Рэчы Паспалітай. Пастановай польскага ўрада яны былі раздзелены на 4 ваяводствы: Палескае, Навагрудскае, Беластоцкае і Віленскае (апошняе да снежня 1925 г. насіла афіцыйную назву Віленская адміністрацыйная акруга).

У ранейшай беларускай гістарычнай літаратуры па Заходняй Беларусі тэрыторыя, якая павінна была адпавядаць гэтай назве, і адпаведна колькасны лік насельніцтва штучна перабольшваліся, што выклікае крытычныя заўвагі польскіх гісторыкаў. У яе склад уключаліся некаторыя этнічныя польскія паветы Беластоцкага ваяводства, а таксама Камень-Кашырскі Палескага ваяводства з пераважаючым складам ук-раінскага насельніцтва, на якія распаўсюджвалася сфера дзейнасці Кампартыі Заходняй Беларусі. Гаворка можа весціся толькі аб усіх сямі паветах Навагрудскага ваяводства, пяці ўсходніх паветах Беластоцкага ваяводства (Гродзенскім, Ваўкавыскім, Аўгустоўскім, часткова Беластоцкім і Сакольскім), васьмі з дзевяці паветаў Палескага і чатырох паветаў Віленскага ваяводства (Ашмянскім, Браслаўскім, Вілейскім і Дунілавіцкім), часткова Віленска-Трокскім, Свянцянскім і Дзісненскім. Тэрыторыя гэтых паветаў паводле падлікаў беларускага даследчыка 20-х гадоў Р. Паўстынскага, які ўлічваў дадзеныя перапісу 1919 г. па Віленскай адміністрацыйнай акрузе і перапісу 1921 г., складала 98 815 квадратных кіламетраў (25,4% тэрыторыі Польшчы) з насельніцтвам 3171 тыс. чалавек.

Колькасць беларускага насельніцтва па перапісу 1921 года штучна заніжана, што прызнаюць і многія польскія даследчыкі. Называюцца лічбы ад 1,5 млн. чалавек (К. Сракоўскі), да 2 млн. (Е. Тамашэўскі). Згодна з падлікамі беларускага даследчыка Р. Паўстынскага беларусы складалі 2 млн. 371 тыс. чалавек (звыш 74% насельніцтва краю). Яны ў асноўнай сваёй масе (каля 88%) пражывалі ў вёсцы. Яўрэйскае насельніцтва пражывала найбольш у гарадах і мястэчках і складала – 385 109 чалавек (12,1%). Польскае насельніцтва на азначанай вышэй тэрыторыі налічвала звыш 311 тыс. чалавек. Літоўцы пражывалі ў асноўным у Віленскім ваяводстве. Дэмаграфічная структура насельніцтва краю ў сярэдзіне 20-х гг. змяні-лася ў сувязі з рэпатрыяцыяй часткі бежанцаў, галоўным чынам, беларускага паходжання, якія ў гады першай сусветнай вайны былі выселены ў глыб Расіі. На 1 ліпеня 1924 г. вярнулася на Радзіму каля 500 тыс. чалавек.

Сярод польскіх і беларускіх гісторыкаў ідуць вострыя дыскусіі аб эканамічным становішчы заходнебеларускіх зямель у міжваенны перыяд. Некаторыя з іх імкнуцца даказаць, што не ўсё было дрэнна на "ўсходніх крэсах", а эканоміка краю ў той час развівалася па законах рынку ў залежнасці ад эканамічнай кан'юнктуры. Таму такія з'явы, як згортванне традыцыйных галін прамысловасці ў Заходняй Беларусі, продаж яе прыродных багаццяў замежным манаполіям, тлумачаць эканамічнай інтэграцыяй, сусветным эканамічным крызісам, нежаданнем інвестараў укладваць свае капіталы ў развіццё заходнебеларускіх зямель. З такімі аргументамі можна пагадзіцца толькі часткова. Галоўную ролю ў цяжкім эканамічным становішчы Заходняй Беларусі адыгралі не гэтыя з'явы, а канкрэтныя мерапрыемствы польскіх уладаў, якія разглядалі анексіраваныя землі як сыравінны прыдатак. Пасля далучэння Заходняй Беларусі да Польшчы адбыўся фактычны эканамічны падзел дзяржавы на: а) цэнтральныя і заходнія ваяводствы, б) усходнія "крэсы" (ускраіны). У першай частцы Польшчы заахвочвалася развіццё прамысловасці, транспарту і гандлю. У другой – эканоміка аднаўлялася марудна, новыя прадпрыемствы амаль не будаваліся. На эканоміцы краю адмоўна адбіліся ўведзеныя льготныя чыгуначныя тарыфы па вывазу з Заходняй Беларусі сыравіны і ўвозу туды прамысловых тавараў з цэнтральных і заходніх ваяводстваў Польшчы. Пераважная большасць прамысловых прадпрыемстваў Заходняй Беларусі насіла дробны характар. Так, у 1928 г., найлепшай эканамічнай кан'юнктуры, дзейнічала каля 2 тыс. прадпрыемстваў. Большасць з гэтых прадпрыемстваў былі дробнымі, на 80 працэнтаў з іх працавала ад 5

да 20 чалавек. Згодна з афіцыйнай статыстыкай удзельная вага буйных прадпрыемстваў была вельмі нязначнай. Было зарэгістравана ў 1928 г. адно буйное прадпрыемства ў Навагрудскім ваяводстве з колькасцю звыш 1000 рабочых; 8 прадпрыемстваў ад 500 да 1000 чалавек (Беластоцкім ваяводстве – 4, Віленскім – 2). У дрэваапрацоўчай, тэкстыльнай, будматэрыялаў і галінах лёгкай прамысловасці налічвалася толькі 89 прадпрыемстваў з колькасцю 100 і больш рабочых. На долю харчовай, мясаперапрацоўчай прамысловасці прыходзілася 2/3 прадпрыемстваў і рабочых.

Разам з тым польскі ўрад з улікам стратэгічных інтарэсаў сваёй дзяржавы ўносіў змены ў эканамічную палітыку ў Заходняй Беларусі. У лістападзе 1936 г. быў прыняты дэкрэт аб накіраванні інвестыцыйнага руху ва ўсходнія ваяводствы. Прадугледжвалася змяншэнне тэрмінам на 5 гадоў падаткаў з прыбыткаў ва "ўсходніх крэсах" Намячалася будаўніцтва дарог.

Адзінай галіной прамысловасці краю, якая набыла значнае развіццё, была дрэваапрацоўчая, што прывяло да нястрымнай эксплуатацыі лясных багаццяў замежнымі манаполіямі. З 1921 па 1936 гг. плошча лясоў краю зменшылася на 400 тыс. га. Выключнае месца займалі прадпрыемствы па вырабу фанеры, паколькі 3/4 усёй іх прадукцыі ішло на экспарт. Фабрыкі размяшчаліся ў асноўным у Белавежскай пушчы і на Палессі. Яны бесперапынна працавалі нават у гады эканамічнага крызісу. На лесараспрацоўках у Белавежскай пушчы ў асобныя гады працавала да 17 тыс. чалавек. Найбольш буйнымі прадпрыемствамі з'яўляліся запалкавая фабрыка "Прагрэс-Вулкан" у Пінску, тытунёвая і фанерная ў Гродне, фанерная фабрыка ў Мастах, шклозавод "Нёман" у Лідскім павеце і фабрыка гумавых вырабаў "Ардаль" у Лідзе.

Самым буйным прамысловым цэнтрам краю быў Беласток і яго прыгарады, дзе канцэнтраваліся прадпрыемствы тэкстыльнай прамысловасці. На іх працавала ў сярэднім да 5 тыс. чалавек.

У прамысловасці, на транспарце колькасць рабочых у паўночна-ўсходніх ваяводствах згодна з перапісам 1931 г. складала 128 тыс. Гэта было значна менш у параўнанні з агульнапольскімі паказчыкамі. Большасць з іх было занята ў дрэваапрацоўчай і харчовай прамысловасці. Прычым, эканамічнае становішча рабочых гэтага рэгіёна было горшым, чым у цэнтральных і заходніх ваяводствах краіны. Яго характэрнымі рысамі з'яўляліся дамінаванне ручной працы, амаль поўная адсутнасць тэхнікі бяспекі, фактычна неабмежаваны рабочы дзень, антысанітарныя ўмовы працы, нізкі ўзровень заработ-най платы. У 1925 г. зарплата рабочых-

паліграфістаў у Вільні складала 9,38 злотых, а ў Варшаве - 16,72 злотых у тыдзень. На жнівень 1935 г. сярэдні заробак па Беластоцкаму ваяводству складаў 0,55 злотых, Віленскаму – 0,58 злотых, Навагрудскаму – 0,28 злотых, Палескаму – 0,42 злотых, у той час як у Варшаўскім - 0,66 злотых, а для ўсёй Польшчы – 0,63 злотых у гадзіну. Шырока распаўсюджаная сістэма штрафаў яшчэ больш змяншала заробкі рабочых.

Пастаянным спадарожнікам прамысловага развіцця было хранічнае беспрацоўе. У выніку крызісу 1929-1933 гг. Спынілі працу 230 прадпрыемстваў, а колькасць рабочых у 1933 г. зменшылася больш чым на 40% .

Пераход ад эканамічнага крызісу да ажыўлення прамысловасці праходзіў марудна. Толькі ў 1938 г. колькасць прамысловых рабочых наблізілася да ўзроўню 1928 г. і склала 83,5% у параўнанні з 1913 г.

Трэба адзначыць, што прыкметна развівалася ў краі мясная і малочная прамысловасць. У Баранавічах, Беластоку і Ваўкавыску працавалі мясакансервавыя заводы, якія належалі англійскай фірме "Крэсэкспарт". Пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР у дакладной запісцы наркама мясной і малочнай прамысловасці БССР на імя сакратара ЦК КП(б)Б П.К. Панамарэнкі падкрэслівалася, што толькі адна Палеская вобласць у 1939 г. вырабіла 1500 тон масла, а Навагрудская вобласць у 1940 г. можа даць сыру каля 1400 тон. Такая колькасць адпавядала ўсёй праграме Беларусі. Аналагічна выглядала Беластоцкая вобласць па вырабу масла.

Між тым сяляне пакутавалі ад малазямелля і беззямелля, падатковага прыгнёту і чыноўніцкага самавольства. Больш паловы ўсёй зямлі краю належала 3866 памешчыкам, зямельныя ўладанні складалі 4 209 584 га. Гэтая група памешчыкаў у асноўным польскага паходжання налічвала толькі каля 1% зямельных уласнікаў. Такой канцэнтрацыі зямельнай уласнасці не было ні ў адной з тагачасных краін Еўропы. Асобныя зямельныя магнаты, як Радзівіл, Патоцкі, Сапега, Тышкевіч, Мейштовіч, Рачкевіч і іншыя, валодалі дзесяткамі тысяч гектараў зямлі. Уладанні князя К. Радзівіла ў Столінскім павеце складалі 155 200 га. Гаспадарак дробных памешчыкаў, заможных сялян плошчай у 50-100 гектараў налічвалася 2912 (зямельная плошча такіх гаспадарак складала 197 000 гектараў).

Найбольшую групу 450 591 прыватных сялянскіх гаспадарак у сярэдзіне 20-х гадоў складалі ўладанні памерам менш 50 га. Ім належала 3066886 га зямлі, г. зн. 41% прыватнага землеўладання. Прычым гаспадарак, якія мелі ад 20 да 50 га зямлі, налічвалася толькі 4,2 % (18 827).

Гаспадарак, якія мелі надзелы ад 8 да 18 га і ўтрымлівалі 2-3 каровы, аднаго-двух коней, налічвалася каля 13% . У перыяд сезонных работ частка іх карысталася наёмнай працай.

Большую групу складалі гаспадаркі зямельнай плошчай ад 2 да 5 га - 34,2% (153944) і ад 5 да 10 га - 32,8 (147961). Гаспадаркі з зямельнымі надзеламі ніжэй 7-8 га не заўсёды мелі магчымасць пракарміць сям'ю. Гаспадаркі ніжэй 2 га зямлі складалі 14,3% (64 417 сялянскіх гаспадарак). Гэта была паўпралетарская група катэгорыі сялян.

Лішак свабодных рабочых рук у сялянскіх гаспадарках з'яўляўся крыніцай папаўнення таннай "арміі" сельскагаспадарчых рабочых, якіх у розныя гады налічвалася ад 80 да 100 тыс. чалавек.

Існавалі рэшткі феадальных адносін: арэнда зямлі за адпрацоўкі або за частку ўраджаю, адпрацоўкі за права карыстання пашай, нарыхтоўкі дроў, натуральная плата за працу, наяўнасць сервітутаў, сістэма павіннасцяў па пракладцы новых дарог, будаўніцтву і рамонту мастоў.

Усё гэта перашкаджала развіццю прадукцыйных сіл заходнебеларускай вёскі. Каб знізіць сацыяльную напружанасць, польскі ўрад пайшоў на аграрныя пераўтварэнні. Яны знайшлі сваё здзяйсненне ў парцэляцыі (продажы праз зямельны банк часткі памешчыцкай і дзяржаўнай зямлі), камасацыі (звядзенне ў адзін участак дробных сялянскіх палосак з адначасовым высяленнем на хутар) і ліквідацыі сервітутаў (сумеснае карыстанне сялян і памешчыкаў выганамі, сенажацямі, пашамі).

Закон аб аграрнай рэформе быў прыняты польскім сеймам яшчэ ў 1919 г. Ён прадугледжваў стварэнне дзяржаўнага зямельнага фонду са свабодных зямель, што засталіся без гаспадароў, а таксама дзяржаўных і часткі памешчыцкіх, якія складалі лішак над устаноўленым максімальным памерам маёнтка. Гэтыя невялікія ўчасткі (парцэлы) прызначаліся для свабоднага продажу. У ліпені 1925 г. быў прыняты "Закон аб ажыццяўленні зямельнай рэформы". Змест гэтай рэформы заключаўся ў продажы дробнымі ўчасткамі некаторай часткі памешчыцкіх зямель і камасацыі (хутарызацыі) сялянскіх гаспадарак з ліквідацыяй сервітутаў.

На аснове закона "Аб надзяленні зямлёй салдат польскай арміі" (снежань 1920 г.) польскі ўрад праводзіў палітыку засялення заходнебеларускіх зямель ваеннымі каланістамі, былымі афіцэрамі і унтэр-афіцэрамі польскай арміі, так званымі "асаднікамі". Яны атрымлівалі дарма ці па невысокай цане зямельныя ўчасткі памерам ад 15 да 45 га. Ужо да канца 1924 г. у Заходняй Беларусі налічвалася

звыш 5 тыс. асаднікаў. Асаднікі былі узброеныя, сяліліся хутарамі, найчасцен выконвалі абавязкі солтысаў, войтаў, засядацеляў, з'яўляліся палітычнай апорай польскай улады на "ўсходніх крэсах". Большасць з іх здавалі зямлю ў арэнду сялянам, што яшчэ больш абвастрала сацыяльную напружанасць.

Распрадажа ішла па двух напрамках. Па лініі дзяржаўнай парцэляцыі праз сельскагаспадарчы банк і спекуляцыйнай парцэляцыі, якой займаліся памешчыкі і гандляры. Пры гэтым урад прадастаўляў, галоўным чынам, зямельныя ўчасткі асобам польскай нацыянальнасці. Так, у Навагрудскім і Віленскім ваяводствах сярод тых, хто атрымаў зямлю ў 1919-1932 гг., беларусаў было толькі 42,1% .

Купіць зямлю незаможным сялянскім гаспадаркам было вельмі складана з-за яе вялікага кошту. Сярэдняя цана 1 гектара зямлі па прыватнай парцэляцыі дасягала 610-830 злотых. Дзяржаўны банк за крэдыты на куплю зямлі браў не менш 12% гадавых. Акрамя таго памешчыкі выкарыстоўвалі права выбару пакупніка і патрабавалі за зямлю больш высокую цану, і нярэдка ў доларах.

Згодна з афіцыйнымі дадзенымі заходнебеларуская вёска да 1935 г. у параўнанні з 1921 г. у сярэднім павялічыла свае землеўладанні: бядняцкія гаспадаркі – 2,1 га, серадняцкія – 2,7 га, заможныя – 3,9 га. Буйное памешчыцкае землеўладанне ў выніку праведзенай дзяржаўнай і ўласнай парцэляцыі скарацілася прыкладна на 17% .

Камасацыя праводзілася на аснове закона аб ліквідацыі цераспалосіцы, прынятага сеймам у 1923 г. Аб'ектыўна камасацыя была прагрэсіўнай з'явай і з'яўлялася працягам вядомай сталыпінскай аграрнай рэформы. Аднак усе расходы, звязаныя з правядзеннем камасацыі, дзяржава ўсклала на сялянства. Сяляне павінны былі плаціць за камасацыю кожнага гектара ад 14 да 20 злотых, за складанне праектаў меліярацыі, утрыманне землеўпарадчыкаў, пераносенне дарог і г. д. Пагэтаму камасацыя першапачаткова праходзіла марудна. Да 1927 г. ёю было ахоплена больш за 60 тыс. гаспадарак, якія атрымалі каля 600 тыс. га хутарской зямлі. Аднак у мэтах пашырэння сацыяльнай базы сярод заходнебеларускага сялянства ўрад паскорыў правядзенне хутарызацыі як праз эканамічныя рычагі (выдача грашовых ссуд праз крэдытныя таварыствы пад паручыцельства багатага селяніна), так і ў прымусовым парадку. У выніку да 1935 г. было хутарызавана каля 50% сялянскіх гаспадарак.

Аграрная рэформа садзейнічала ліквідацыі паўпрыгонніцкіх адносін, канцэнтрацыі сельскагаспадарчай вытворчасці. Умацаваліся пазіцыі заможнага сялянства, паскорыўся працэс расслаення вёскі.

Частка бяднейшых сялян у пошуках лепшай долі выехала ў Заходнюю Еўропу, ЗША, Канаду, краіны Лацінскай Амерыкі. Толькі ў першыя гады эканамічнага крызісу 1929-1931 гг. з Заходняй Беларусі ў пошуках працы выехала 53 тыс. чалавек. Па розных падліках з 1921 па 1939 гг. былі вымушаны пакінуць Заходнюю Беларусь каля 130 тыс. чалавек. Гэта была другая вялікая хваля беларускай эміграцыі.

Сацыяльная напружанасць у заходнебеларускім грамадстве паглыблялася рэжымам жорсткай палітычнай і нацыянальнай дыскрымінацыі. Згодна з дадатковым пратаколам да 93 параграфа Версальскага трактата, падпісанага ў чэрвені 1919 г. паміж Польшчай і краінамі Антанты, нацыянальным меншасцям гарантавалася права на маёмасць і ахову яе з боку дзяржавы, свабода веравызнання, права навучання на роднай мове, ужыванне яе ў судах і г. д. Гэтыя правы гарантаваліся таксама артыкулам VII Рыжскага дагавора, Канстытуцыяй Рэчы Паспалітай 1921 г. Аднак на практыцы ўсё было інакш. Беларусаў вельмі рэдка прымалі на працу ў адміністрацыю, дзяржаўныя ўстановы. У дзяржаўных установах не дазвалялася карыстацца беларускай мовай. Рабочыя і служачыя беларускай і яўрэйскай нацыянальнасцяў на чыгунцы, камунальных прадпрыемствах замяняліся палякамі. У гмінных радах, павятовых сейміках кіравалі назначаныя адміністрацыйнымі ўладамі асобы польскай нацыянальнасці.

Рэакцыйная палітыка асабліва востра праявілася ў справе школьнай адукацыі. Да ўключэння ў склад Польшчы на беларускіх землях функцыяніравала 359 беларускіх школ, 2 настаўніцкія семінарыі ў Барунах і Свіслачы, 5 агульнаадукацыйных гімназій у Вільні, Радашковічах, Навагрудку, Клецку і Нясвіжы. Урад існаванне беларускіх навучальных установ палічыў несумяшчальным з інтарэсамі дзяржавы. Таму да 1924 г. засталося толькі 37 беларускіх школ і 4 гімназіі з абмежаванымі правамі. Пад націскам нацыянальна-вызваленчага руху польскі сейм вымушаны быў прыняць 31 ліпеня 1924 г. распрацаваны ўрадам У. Грабскага "Закон аб мове і арганізацыі школьнай справы для нацыянальных меншасцяў". Беларуская дзяржаўная школа магла быць адкрыта ў паветах, дзе беларусы складалі 25% насельніцтва, і калі гэтага жадалі не менш 40 бацькоў дзяцей школьнага ўзросту. Аднак закон замацаваў няроўнасць беларускай і польскай школ. Пры наяўнасці 20 подпісаў за навучанне па-польску адкрывалася двухмоўная (польска-беларуская) школа. Але нават і гэтае заканадаўства з перашкодамі ўводзілася ў дзеянне.

Вясной 1927 г. польскі ўрад зрабіў некаторыя захады, каб паменшыць антыпольскія настроі. Міністр веравызнання і публічнай асветы Г. Дабруцкі загадаў увесці вывучэнне беларускай мовы ў польскіх гімназіях, дзе пераважала беларускае насельніцтва, прысвоіў статус публічных школ дзвюм беларускім гімназіям у Вільні і Навагрудку, дазволіў стварыць звыш двух дзесяткаў школ з беларускай мовай навучан-ня і звыш 40 двухмоўных. Пачалася падрыхтоўка праграм і падручнікаў для школ з беларускай мовай навучання. У перыяд праведзеных муніцыпальных выбараў беларусы атрымалі каля 20% месцаў у гарадскіх і гмінных радах.

Аднак у 1928 г. мясцовая адміністрацыя атрымала ўсе правы самастойна праводзіць нацыянальна-дзяржаўную палітыку. Адкрытыя 18 беларускіх і 32 польска-беларускія школы з цягам часу былі амаль усе закрыты. Паводле дадзеных афіцыйнай статыстыкі ў 1933/34 нав. г. на тэрыторыі Заходняй Беларусі налічвалася ўсяго 16 школ, дзе вывучалася беларуская мова, а ў 1939 г. налічвалася каля 5.

Польскіх школ таксама было недастаткова. У выніку толькі 2/3 насельніцтва Заходняй Беларусі было пісьменным. На верасень 1939 г. 129 тыс. дзяцей школьнага ўзросту заставаліся без аніякай адукацыі. Большасць прыпадала на беларускамоўную вёску. Высокая плата за навучанне, беднасць і перашкоды з боку ўладаў абмяжоўвалі доступ у сярэднія школы. На працягу 1932-1934 гг. Радашковіцкая, Навагрудская і Клецкая беларускія гімназіі былі закрыты, а Віленская была пераўтворана ў польска-беларускі філіял дзяржаўнай гімназіі. У адзінай у краі ВНУ – Віленскім універсітэце – доля беларусаў вагалася ў межах 1-2,8% ад агульнай колькасці.

Беларускія газеты і часопісы радыкальнага напрамку часта забараняліся і канфіскоўваліся, а друкарні, у якіх яны выдаваліся, штрафавалі. Калі ў 1927 г. легальна выдаваліся 23 беларускія газеты і чашггісы, то ў 1930 г. – 12, а ў 1939 г. – 8. Засталіся ў асноўным праўрадавыя клерыкальныя выданні. Закрываліся нешматлікія клубы, бібліятэкі, хаты-чытальні, створаныя ў мінулыя гады намаганнямі беларускай грамадскасці.

Адной з праяў нацыянальнага ўціску была рэлігійная не-цярпімасць польскага ўрада да праваслаўнага насельніцтва Заходняй Беларусі. У 1924 г. ураду ўдалося дамагчыся аб'яўлення аўтакефаліі праваслаўнай царквы і вывядзення праваслаўя ў Польшчы з-пад юрысдыкцыі Маскоўскага патрыярхату. Праваслаўная царква апынулася ў поўнай залежнасці ад адміністрацыйных уладаў. Да 1936 г. больш 1300 праваслаўных цэркваў былі пераўтвораны ў касцёлы.

Каталіцкае польскае духавенства стала моцным сродкам паланізацыі насельніцтва.

Палітыка прававой дыскрымінацыі нацыянальных меншасцяў атрымала сваё лагічнае завяршэнне ў афіцыйнай заяве міністра замежных спраў Ю. Бека на пасяджэнні Лігі Нацый у Жэневе ў верасні 1934 г., што Польшча адмаўляецца ад дадзеных раней гарантый аб ахове правоў нацыянальных меншасцяў. Гэты дэмарш санацыйнага рэжыму з'явіўся высновай па актывізацыі дзеянняў у правядзенні масіраванай палітыкі далейшага апалячвання беларускага насельніцтва. У кастрычніку 1936 г. Міністэрства ўнутраных спраў падрыхтавала праект паскарэння асіміляцыі беларусаў. Пачаўся ўзмоцнены працэс закрыцця беларускіх нацыянальных арганізацый. У канцы 1938 г. у Польшчы іх фактычна не засталося. У чэрвені 1939 г. беластоцкі ваявода Генрых Асташэўскі падаў у Міністэрства ўнутраных спраў дэталёвую запіску па канчатковай паланізацыі "ўсходніх крэсаў".

**Культура і асвета.** Нягледзячы на неспрыяльныя ўмовы, культурнае жыццё ў краі працягвала развівацца. Заставаўся галоўны яе носьбіт – народ.

Цэнтрамі культурна-асветніцкага жыцця краю з'яўляліся нешматлікія беларускія гімназіі: у Вільні, Навагрудку, Клецку і Радашковічах. Яны фарміравалі кадры нацыянальнай інтэлігенцыі. Віленскую гімназію скончылі ў розныя часы мастакі М. Васілеўскі, Р. Семашкевіч, В. Сідаровіч, паэты Н. Арсеннева, Х. Ільяшэвіч, А. Салагуб, дзеячы грамадска-палітычнага і культурнага жыцця Заходняй Беларусі І. Дварчанін, Я. Шутовіч, А. Клімовіч і інш. З Радашковіцкай гімназіяй звязаны жыццёвы шлях М. Таіжа. У Навагрудскай гімназіі вучыліся сусветнавядомыя вучоныя Л. Барысаглебскі, Б. Кіт.

З канца 20-х гадоў нязначныя ўступкі ў галіне асветы змяніліся хваляй рэпрэсій. Так у 1931 г. больш за 20 навучэнцаў Клецкай гімназіі за ўдзел у нацыянальна-вызваленчым руху былі асуджаны на розныя тэрміны турэмнага зняволення. Палітычныя мэты ўладаў сталі асноўнымі задачамі школьнай рэформы 30-х гадоў і прывялі да поўнага заняпаду беларускія школы. Ідэя выхавання моладзі ў "актыўных лаяльных адносінах да польскай дзяржавы" стала асноўнай у(405) дзейнасці навучальных устаноў. Заходнебеларускае грамадства страціла шанцы значна паправіць свой адукацыйны ўзровень. Шматступеньчатае навучанне, высокая плата за вучобу і іншыя новаўвядзенні яшчэ больш абмежавалі доступ у сярэднія школы, ВНУ. У Заходняй Беларусі разгортвалі сваю дзейнасць розныя польскія

культурна-асветніцкія арганізацыі і ўстановы, якія прапагандавалі шавіністычныя, вялікадзяржаўныя ідэі.

У процівагу гэтаму курсу вялікую асветніцкую работу праводзіла культурна-асветніцкая арганізацыя – Таварыства беларускай школы. Акрамя правядзення школьных кампаній, таварыства дапамагала ўтрымліваць беларускія гімназіі, адкрывала клубы, бібліятэкі, хаты-чытальні, стварала гурткі мастацкай самадзейнасці, народныя хоры.

Культурна-асветніцкую работу праводзіў Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры, адчынены ў 1926 г. Пад яго эгідай дзейнічала ў 1927 г. 22 бібліятэкі-чытальні, а ў 1929 г. – 37 бібліятэк. Інстытут праводзіў мерапрыемствы, прыстасаваныя да розных падзей беларускай гісторыі і культуры. У 1930 г. урачыста былі адзначаны 30-я ўгодкі смерці Ф. Багушэвіча, 25-я ўгодкі творчасці Я. Купалы, творчыя вечары, прысвечаныя памяці В. Эпімах-Шыпілы, М. Нікіфароўскага, мерапрыемствы з нагоды абвяшчэння БНР.

Значная ўвага надавалася арганізацыі самадзейных і музычных калектываў. У 20-30-я гг. плённа працаваў рэлігійны хор у Вільні. Летам 1927 г. пры віленскім гуртку БІГіК быў створаны народны тэатр, а ў 1929 г. гургкі вёсак Шатвічы, Свірыдавічы і Галяшчынкі Ашмянскага павета заснавалі тэатральную аб'яднаную труііу пад кіраўніцтвам Войцэха Шутовіча. Рэпертуар драматычных суполак звычайна складаўся з п'ес К. Каганца, Я. Купалы, Л. Родзевіча, Рушчанца, Ф. Аляхновіча і іншых аўтараў. У 30-я гг. арганізацыя паказу беларускіх спектакляў натыкаецца на перашкоды мясцовай адміністрацыі. Гэта прывяло да таго, што ўдругой палове 30-х гг. дзейнасць тэатральных суполак амаль спынілася.

У Вільні працавала Беларускае навуковае таварыства (БНТ). У вытокаў гэтай установы былі дзеячы нацыянальнага адраджэння В. Ластоўскі, Іван і Антон Луцкевічы. Члены БНТ займаліся распрацоўкай беларускай навуковай тэрміналогіі, перакладам на беларускую мову педагагічнай, мастацкай літаратуры, выступалі з дакладамі і паведамленнямі па гісторыі, літаратуры, фальклору і этнаграфіі Беларусі.

Пры таварыстве ў 1921 г. быў адкрыты Віленскі беларускі гісторыка-этнаграфічны музей імя Івана Луцкевіча. На працягу свайго існавання фонды музея істотна папаўняліся. З археалагічных знаходак тут былі каменныя сякеры, пярсцёнкі з пячаткамі полацкіх князёў Усяслава і Барыса, пячатка Міндоўга і іншыя матэрыялы з раскопак 18 беларускіх паветаў. У музеі была цікавая калекцыя манет, медных крыжоў XI ст., старадаўняй зброі, калекцыі кніг і грамат. Сярод апошніх былі такія каштоўныя экспанаты, як

Наваградскае Евангелле XIV ст., ілюстраванае Жухавіцкае Евангелле XIV ст., рукапісныя кнігі XVI ст., Аль-Кітаб, шэраг іншых грамат вялікіх князёў літоўскіх, каралёў Рэчы Паспалітай, частка пражскага выдання Бібліі Ф. Скарыны, Статут ВКЛ 1588 г. з друкарні Мамонічаў і іншыя каштоўныя экспанаты. Бібліятэка музея налічвала больш за 14 тыс. тамоў. Пры музеі існаваў багаты беларускі архіў. Музей шмат зрабіў у справе папулярызацыі культурна-гістарычнай спадчыны. У чэрвені 1945 г. як адзінае цэлае музей быў ліквідаваны, калекцыі падзелены паміж шэрагам музеяў, архіваў і бібліятэк.

Да актывістаў БНТ належаў грамадска-палітычны дзеяч, гісторык і публіцыст Ад. Станкевіч. Яго намаганнямі была створана ў Вільні беларуская друкарня імя Ф. Скарыны. Няпоўны спіс выдадзеных у ёй кніг складаў больш 146 назваў. Ад. Станкевіч унёс пэўны ўклад у грамадскую думку Заходняй Беларусі. З'явіліся яго працы "Да гісторыі беларускага палітычнага вызвалення" (Вільня, 1934) і "Хрысціянства і бе-ларускі народ. Спробы сінтэзы" (Вільня, 1940). У іх паказана месца беларускага народа, яго дзяржаўнасці і культуры ў агульнаеўрапейскай супольнасці. Не страцілі сваёй навуковай вартасці і працы В. Гадлеўскага – "Патрэба нацыянальнай ідэі", "Народ-нацыя", "Аб славянскай ідэі" і іншыя, апублікаваныя ў другой палове трыццатых гадоў.

Значны ўплыў на грамадскую думку аказала беларуская літаратура. Ігнат Абдзіраловіч (сапр. Ігнат Канчэўскі) у сваёй кнізе "Адвечным шляхам: Дасьледзіны беларускага сьветагляду" (1921) падсумаваў уклад беларусаў у анталогію сусветнай думкі.

Працы Максіма Гарэцкага "Гісторыя беларускай літаратуры" (1920), і "Хрэстаматыя беларускае літаратуры:, XI век – 1905 год" (1922) шырока выкарыстоўваліся ў нацыянальных гімназіях.

Галоўнай тэндэнцыяй у літаратуры 20-х гг. стаў рамантызм. Станоўчы ўплыў на беларускую паэзію аказала творчасць Уладзіміра Жылкі (1900-1933). Вершы яго зборнікаў "На ростані", "З палёў Заходняй Беларусі" ўзбагацілі патрыятычную сімволіку лірыкі.

Уздым нацыянальна-вызваленчага руху ў другой палове 20-х гадоў выклікаў ажыўленне літаратурнага жыцця. У паэзію прыйшла кагорта маладых сіл – Міхась Васілёк, Алесь Салагуб, Піліп Пестрак, Валянцін Таўлай, Міхась Машара. Новая плынь мела рэвалюцыйна-дэмакратычны характар і знаходзілася пад уплывам Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ). Вершы Міхася Васілька "У бой на акупанта", "Як я пана перанёс" і іншыя сталі праграмнымі творамі вызваленчага руху.

Ідэямі класавага змагання Алесь Салагуб захапіўся пасля адыходу ад рамантычнага ўспрымання свету. "Лукішскі дзённік" А. Салагуба стаў узорам тагачаснай публіцыстыкі. У заходнебеларускім камуністычным падполлі складваўся і светапогляд В. Таўлая. Напісаная яшчэ ў час вучобы ў Віленскай беларускай гімназіі паэма "Непераможныя" заклікала да мужнасці ў змаганні.

У 1927 г. Ігнат Дварчанін выдаў "Хрэстаматыю новай беларускай літаратуры (ад 1905 году)". Па ёй вучылася не адно пакаленне заходнебеларускай моладзі. Багатую публіцыстычную і літаратуразнаўчую спадчыну пакінуў А. Луцкевіч.

У 30-я гг. у літаратурным жыцці значнае месца займалі творы Х. Ільяшэвіча, Ф. Грышкевіча, А. Іверса, Ф. Аляхновіча.

Моцнае ўздзеянне на свядомасць грамадства аказала публіцыстыка. Сярод твораў заходнебеларускай публіцыстыкі ў першую чаргу трэба назваць працы Б. Тарашкевіча. Знаходзячыся ў польскай турме, ён перапрацаваў "Беларускую граматыку для школ", пераклаў на беларускую мову "Пана Тадэвуша" А. Міцкевіча, "Іліяду" Гамера. Публіцыстычнай завостранасцю і навуковай дакладнасцю вызначаліся таксама многія артыкулы палітычнага сакратара ЦК КПЗБ І. Лагіновіча, якія змяшчаліся пад псеўданімамі: Лаўрыновіч, Кумельган у беларускіх дэмакратычных выданнях. У жанры публіцыстыкі выступалі таксама М. Краўцоў (Касьцевіч), У. Самойла. Верш М. Краўцова "Мы выйдзем шчыльнымі радамі" (на музыку У. Тэраўскага) стаў своеасаблівым гімнам у Заходняй Беларусі.

У творчасці заходнебеларускіх мастакоў П. Сергіевіча, Я. Драздовіча, М. Сеўрука, Р. Семашкевіча, М. Васілеўскага адлюстроўвалася прыгажосць роднай прыроды, самабытнасць беларускай культуры. У пачатку 30-х гадоў Я. Драздовіч карцінамі-цыкламі "Жыццё на Марсе", "Жыццё на Сатурне", "Жыццё на Месяцы" першым паклаў пачатак касмічнай тэме ў беларускім выяўленчым мастацтве.

У культурным жыцці Заходняй Беларусі значнае месца займала тэатральнае мастацтва. Тэатральныя пастаноўкі ў пачатку 20-х гг. у Вільні ладзіла Беларуская драматычная майстроўня, якую ўзначальваў Л. Родзевіч. Яе традыцыі ў другой палове 20-х гадоў працягвалі гурткі ТБШ, БІГіК. У сельскай мясцовасці значна пашырыўся рух мастацкай самадзейнасці. Найбольш вядомым сярод самадзейных калектываў быў хор з в. Нягневічы на Навагрудчыне. Аматарскія спектаклі і канцэрты ператвараліся ў сапраўдныя святы.

Шмат карыснага ў справе прапаганды беларускай народнай музыкі зрабіў Рыгор Шырма. Ён стварыў некалькі мастацкіх

калектываў, кіраваў хорамі ў Пружанах, у Віленскай беларускай гімназіі.

Нястомным прапагандыстам беларускай народнай песні быў выдатны спявак Міхась Забэйда-Суміцкі з сям'і беззямельнага селяніна в. Несцяровічы каля Ружан. Многія яго выступленні (рэпертуар уключаў песні на 16 мовах свету) трансліраваліся па радыё ў Парыжы, Празе, Нью-Йорку, Лондане і іншых гарадах.

Такім чынам, нягледзячы на палітыку абскурантызму ўладаў, былі створаны вялікія духоўныя каштоўнасці, якія з'яўляюцца арганічнай часткай агульнанацыянальнай культурна-гістарычнай спадчыны Беларусі і Еўропы.

ЛЕКЦЫЯ 21

## НАЦЫЯНАЛЬНА-ВЫЗВАЛЕНЧЫ РУХ

- *Вызваленчы рух пасля Рыжскага міру*
- *Дзейнасць палітычных партый і арганізацый краю*
- *Пошук шляху да адзінства дзеянняў*

**Вызваленчы рух пасля Рыжскага міру.** Усталяваныя ў краі пасля Рыжскага міру эканамічныя, грамадска-палітычныя і нацыянальныя адносіны абумовілі масавы вызваленчы рух. Асноўныя сілы яго складалі дэмакратычная інтэлігенцыя, палітычна актыўная частка рабочага класа і сялянства. У ім удзельнічалі таксама прадстаўнікі дробнай і сярэдняй беларускай нацыянальнай буржуазіі. Спецыфіка на-цыянальна-вызваленчага руху Заходняй Беларусі заключалася ў тым, што барацьба народных мас супраць сацыяльнага прыгнёту фактычна зліваласяз барацьбой за нацыянальнае вызваленне.

Нацыянальна-вызваленчы рух краю быў неаднародным па свайму характару і мэтах. Лідэры яго памяркоўнага, правага крыла Б. Тарашкевіч, А. Луцкевіч, А. Смоліч, Ад. Станкевіч, Л. Дубяйкоўскі, Ф. Ярэміч лічылі, што змаганне з польскай дзяржавай можа толькі пагоршыць сітуацыю беларусаў. Галоўным павінна стаць змаганне за асвету на роднай мове, стварэнне вытворчых кааператываў, удзел у парламенцкіх выбарах. Нават Б. Тарашкевіч першапачаткова быў перакананы, што парламентарызм і польская дэмакратыя створаць беларусам магчымасць поўнага нацыянальнага жыцця.

Іншую пазіцыю ў адносінах да польскай дзяржавы займалі беларускія нацыянальныя дзеячы, верныя эміграцыйнаму ўраду БНР у Коўне. Яны прадстаўлялі левы, радыкальны спектр нацыянальна-вызваленчага руху, рашуча выступалі за перагляд Рыжскага мірнага дагавора, патрабавалі аднаўлення незалежнай Беларусі ў яе этнаграфічных межах. Па ініцыятыве В. Ластоўскага ў канцы верасня 1921 г. у Празе была склікана Беларуская нацыянальна-палітычная нарада. Большасць удзельнікаў (18 з 37) складалі дэлегаты Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў. Удзельнікі нарады распрацавалі план дзеянняў у новых палітычных умовах. У прынятай рэзалюцыі падкрэслівалася, што Беларусь павінна быць непадзельнай і незалежнай дзяржавай. Рыжскі дагавор характарызаваўся як трактат аб падзеле, а ўсталяваны парадак па абодва бакі рыжскай мяжы – акупацыяй Беларусі дзвюма суседнімі дзяржавамі. Таму "ўсе актыўныя беларускія сілы" заклікаліся да барацьбы, выкарыстоўваючы ўсе магчымыя сродкі супраць падзелу Беларусі. Было вырашана накіра-

ваць пратэст у Лігу Нацый з патрабаваннем адкінуць "польскі імперыялізм за лінію рэк Нарэва і Буга". Курс, узяты беларускімі эсэрамі на ўзброенае паўстанне, быў падтрыманы. У спецыяльна прынятай рэзалюцыі нарады Ст. Булак-Балаховіч быў названы аферыстам і ўзурпатарам, абвінавачаны ў злачынствах і грабяжах над беларускім і яўрэйскім мірным насельніцтвам. Супраць гэтай рэзалюцыі галасавалі дэлегаты прапольскай арганізацыі П. Алексюка "Беларуская нацыянальная сувязь".

Першапачаткова вызваленчы рух набыў пераважна ўзброеную, партызанскую форму барацьбы. У паўночна-заходніх паветах на Гродзеншчыне і Беласточчыне партызанскі рух разгортваўся над кіраўніцтвам Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў. ЦК БПС-Р яшчэ летам 1921 г. стварыў Цэнтральны беларускі паўстанцкі камітэт на чале з У. Пракулевічам. Для аператыўнага кіраўніцтва партызанскім рухам быў створаны Галоўны беларускі штаб.

Літоўскі ўрад таксама падтрымаў лінію беларускіх эсэраў на ўзброеную барацьбу, каб вырашыць пытанне аб "сярэдняй Літве" на сваю карысць. З Літвы паступала паўстанцам зброя, амуніцыя, выбуховыя рэчывы, грошы. На літоўска-польскай мяжы ў мястэчку Мерач быў размешчаны штаб, які кіраваў партызанскім рухам. Камандаванне штабоў астатніх паўстанцкіх груп размяшчалася ў Аранах, Уцянах і Вільні. Некаторыя з партызанскіх атрадаў і злучэнняў былі даволі шматлікімі і добра арганізаванымі. У партызанскае злучэнне пад камандаваннем Г. Шыманюка ("Скамарох"), якое дзейнічала на Беласточчыне, уваходзіла 12 партызанскіх атрадаў і складала звыш 1000 чалавек. Пры партызанскім злучэнні выдавалася газета "Беларускі партызан".

У падпольных паўстанцкіх структурах, якія ўзначальвалі эсэры, згодна з дадзенымі Галоўнага штаба беларускіх партызан, налічвалася ад 8 да 10 тыс. чалавек. Праўда, значная частка іх займалася земляробствам і не прымала ўдзелу ў арганізаваных эсэраўскімі камандзірамі падрыўных акцыях. У адпаведнасці з дырэктывай Галоўнага штаба беларускія паўстанцкія структуры павінны былі ў канспіратыўных мэтах дзейнічаць як асветныя гурткі, кааператыўныя арганізацыі, царкоўныя брацтвы.

Пазіцыю эсэраў на разгортванне партызанскага руху ў краі падзялялі члены падпольных арганізацый КП(б)Б. З Савецкай Беларусі на падпольную работу былі накіраваны ўдзельнікі рэвалюцыйных падзей 1917 г. і грамадзянскай вайны С.А. Дубовік, С.Т. Мілер, М.А. Блінчыкаў, І. Гордзін (А. Леановіч) і іншыя. Яны сталі затым кіраўнікамі падпольных партыйных камітэтаў у Беластоку,

Брэсце, Вільні. На Палессі, Навагрудчыне і Віленшчыне партызанскі рух разгортваўся галоўным чынам пад кіраўніцтвам камуністаў. Ён з самага пачатку набыў выразны класавы характар. Сярод вядомых кіраўнікоў партызанскай барацьбы былі камуністы К.П. Арлоўскі, С.А. Ваўпшасаў, В.З. Корж, А.М. Рабцэвіч, Д.І. Балашка, Д.Ф. Яблонскі, К. Н. Такушэвіч і іншыя.

Сацыяльную базу партызанскага руху складалі беларускае сялянства, сельская інтэлігенцыя і рамеснікі. Асноўнымі аб'ектамі нападу партызан з'яўляліся памешчыцкія маёнткі, сядзібы асаднікаў і паліцэйскія ўчасткі. Так, узброеныя сяляне Вілейскага павета ў 1922 г. зрабілі напад на маёнтак "Вішнёўка" і забілі яго ўладальніка. У час разгрому паліцэйскага гарнізона (у снежні 1922 г.) былі знішчаны ў валасным упраўленні спісы сялян-нядоімшчыкаў. У маёнтку "Шчэкаўшчына" таго ж павета праходзіў сход мясцовых памешчыкаў. Сюды з'явіліся партызаны і папярэдзілі памешчыкаў, што калі яны будуць і далей жорстка абыходзіцца з парабкамі і сялянамі, то і іх чакае лёс уладальніка маёнтка "Вішнёўка".

У ваколіцах мястэчак Араны, Радунь у 1922 г. дзейнічалі ўзброеныя групы літоўскіх сялян, якія рабілі напады на памешчыцкія сядзібы. Выступленні літоўскіх сялян супраць польскай адміністрацыі ахапілі ўсю паўднёва-заходнюю частку Віленшчыны і шэраг гмін Свянцянскага павета.

Хроніка партызанскай барацьбы на Гродзеншчыне лета-восені 1922 года, адлюстраваная ў газеце "Беларускі партызан", стракацела наступнымі звесткамі: разгромлена сядзіба польскага асадніка каля мястэчка Скідаль, узарваны вузкакалейны мост па рацэ Котра і разбурана на працягу аднаго кіламетра чыгуначнае палатно, па якому лесапрамыслоўцы вывозілі лес. У 1922 г. адбыліся 878, а ў 1923 г. – 503 партызанскія напады.

Польскі ўрад у адказ узмацніў паліцэйскі тэрор. Многія тысячы сялян падвергліся арыштам і жорсткім катаванням у паліцэйскіх участках і ў дэфензіве. Беларускі і польскі друк таго часу падаваў жудасныя сцэны катаванняў, якія не ўступалі сярэдневяковай інквізіцыі. Бацька Генрыха Шыманюка – Дзям'ян Шыманюк, - арыштаваны ў чэрвені 1922 г. разам з 19 аднасяльчанамі, пасля перанесеных катаванняў звар'яцеў, а жонка Генрыха - Альжбета – "інтэлігентная і адукаваная дама", па сведчанню польскага "Дзённіка Гродзенскага", таксама ўся была збіта, у сіняках і з пераламанай рукой.

У пачатку 1922 года польская дэфензіва з дапамогай правакатараў, засланых у эсэраўскую паўстанцкую арганізацыю, раскрыла яе структуру і правяла масавыя арышты. Частка кіраўнікоў паўстан-

цкага эсэраўскага руху вымушана была пакінуць тэрыторыю Заходняй Беларусі і засталася ў Літве.

Мноства сялян было кінута ў турмы. У канцы 1923 г. у турмах Заходняй Беларусі знаходзілася 1300 палітзняволеных. Большасць з іх абвінавачвалася за ўдзел у партызанскім руху. У маі 1923 г. у Беластоку адбыўся першы такі працэс над 45 беларускімі партызанамі, сярод якіх былі два дэпутаты сейма эсэры С. Баран і С. Якавюк. А ў красавіку 1925 г. адбыўся "працэс 72-х" у Гродне над другой групай беларускіх партызан, следства над якімі цягнулася звыш двух гадоў.

Партызан судзілі не толькі акруговыя, але і надзвычайныя ваенна-палявыя суды. Яны выносілі смяротныя прыгаворы. Так, ваенна-палявы суд у Беластоку 23 мая 1923 г. прыгаварыў да расстрэлу партызанаў А. Тамашука, Я. Сахарчука, Я. Піцелюка, Д. Мартынюка і непаўналетняга П. Нічыпарука за напад на паліцэйскі ўчастак у мястэчку Кляшчэлі Бельскага павета. Усяго да смяротнай кары ў Польшчы ў 1923 г., па сведчанню старшыні Беларускага пашльскага клуба Б. Тарашкевіча, было прыгаворана 109 ча-лавек. Большасць асуджаных – жыхары Заходняй Беларусі і Валыні.

Якасна новы этап развіцця нацыянальна-вызваленчага руху быў звязаны з утварэннем у лістападзе 1922 г. беларускай нацыянальнай фракцыі ў польскім сейме.

Напярэдадні выбараў беларускія нацыянальныя палітычныя партыі ўтварылі Беларускі цэнтральны выбарчы камітэт на чале з А. Луцкевічам для выпрацоўкі агульнай выбарчай платформы і падтрымкі кандыдатаў у дэпутаты (паслы) сейма. А. Луцкевіч з'яўляўся таксама прадстаўніком камітэта ў створаным у Варшаве Цэнтральным выбарчым камітэце нацыянальных меншасцяў. У яго склад, акрамя беларусаў, ува-ходзілі прадстаўнікі іншых нацыянальнасцяў: украінцы, літоўцы, немцы і яўрэі.

Беларускае сялянства падтрымала блок нацыянальных меншасцяў, які сабраў у Заходняй Беларусі 286 тыс. галасоў. У кастрычніку 1922 г. у сейм было абрана 11 дэпутатаў. А. Аўсянік, П. Мятла, Б. Тарашкевіч, Ф. Ярэміч прадстаўлялі сацыял-дэмакратаў, С. Баран, С. Якавюк, У. Каліноўскі – сацыялістаў-рэвалюцыянераў, Ад. Станкевіч – БХД, С. Рак-Міхайлоўскі – прадстаўнік незалежных сацыялістаў, М. Ка-хановіч і В. Рагуля з'ўляліся беспартыйнымі. Яны разам з сенатарамі В. Багдановічам ад (БХД), А. Назарэўскім і А. Уласавым (беспартыйныя) стварылі нацыянальную пасольскую фракцыю ў сейме. Тактыка Беларускага пасольскага клуба (БПК) была накіравана ў першую чаргу на адстайванне нацыянальных і

сацыяльных правоў беларускага народа шляхам унясення сацыяльных законапраектаў. Ужо ў снежні 1922 г. беларускія паслы і сенатары запатрабавалі ад польскага ўрада выканання ўмоў культурна-асветнага характару, прадугледжаных Версальскім і Рыжскім дагаворамі. На працягу 1922-1924 гг. БПК было накіравана польскаму ўраду 12 запытаў аб гвалтах і ганеннях у гэтай галіне. Беларускія парламентарыі дамагаліся адкрыцця беларускіх школ і курсаў, настаўніцкіх семінарый, допуску беларускай мовы ў дзяржаўныя ўстановы. Іх захады не заўсёды давалі станоўчыя вынікі, аднак польскі сейм вымушаны быў прыняць "Закон аб мове і арганізацыі школьнай справы для нацыянальных меншасцяў".

Шырокі водгук у грамадскасці атрымалі запыты дэпутатаў у сувязі з фактамі паліцэйскай самавольнасці над жыхарамі "ўсходніх крэсаў", якія затым публікаваліся на старонках дэмакратычнай беларускай прэсы. Моцны рэзананс выклікалі сустрэчы паслоў з насельніцтвам беларускіх сёл і мястэчак. У маі-чэрвені 1924 г. адбыліся такія сустрэчы з жыхарамі Лідскага, Баранавіцкага, Слонімскага, Сакольскага, Вілейскага і Наваг-рудскага паветаў. На іх былі абмеркаваны пытанні сацыяльна-эканамічнага, культурнага і рэлігійнага характару, прыняты адпаведныя рэзалюцыі. Сабраны матэрыял склаў аснову "Інтэрпеляцый беларускіх паслоў", выдадзеных БПК у снежні 1924 г. у колькасці 5000 экзэмпляраў, распаўсюжаных затым у Беластоку, Брэсце, Пінску, Баранавічах і Варшаве.

Нягледзячы на непаслядоўнасць у тактыцы БПК, разыходжанні ў вырашэнні сацыяльна-эканамічных праблем і нацыянальнага пытання, дзейнасць клуба аказвала ўплывовае ўздзеянне на грамадска-палітычнае жыццё, выхаванне нацыянальнай і палітычнай самасвядомасці насельніцтва. На факты паліцэйскага тэрору і нацыянальнага ўціску ў Польшчы рэагавала французская прэса, і гэта ўлічвалі ўрадавыя колы Польшчы. Парламенцкія легальныя сродкі барацьбы сталі часткай нацыянальна-вызваленчага руху краю.

Актывізаваліся рабочыя, каб абараняць свае інтарэсы. З патрабаваннямі павысіць заработную плату выступілі рабочыя Гродна, Брэста, Пінска і іншых гарадоў. Найбольш буйнай была ўсеагульная забастоўка беластоцкіх тэкстыльшчыкаў у студзені-лютым 1923 г. У ёй удзельнічала звыш 12 тыс. рабочых, уключаючы і дробных рамеснікаў. Па дадзеных інспектарата працы ў Заходняй Беларусі было зарэгістравана ў 1923 г. 590 калектыўных канфліктаў, у якіх прынялі ўдзел 126 тыс. чалавек. Дынаміка развіцця рабочага руху ў краі супадала з працэсамі палітычнага развіцця ў Заходняй Еўропе.

Улады вымушаны былі канстатаваць, што ініцыятарамі і арганізатарамі выступленняў рабочых з'яўляюцца ў першую чаргу камуністы.

**Дзейнасць палітычных партый і арганізацый краю.** На характар нацыянальна-вызваленчага руху ў пачатку 20-х гг. моцнае ўздзеянне аказвала Беларуская партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў. Праграмныя патрабаванні БПС-Р: падзел без выкупу памешчыцкіх зямель паміж сялянамі, нацыянальнае раўнапраўе і дэмакратычныя свабоды, утварэнне незалежнай Беларускай дэмакратычнай рэспублікі ў яе этнаграфічных межах і ў федэрацыі з Літвой спрыялі радыкалізацыі грамадства. Пасля таго як чэкісцкія органы БССР у лютым 1921 г. арыштавалі 860 актыўных членаў БПС-Р, уключаючы членаў ЦК і Мінскага губкама, а затым дэпартавалі арыштаваных за яе межы, беларускія эсэры вымушаны былі абмежаваць сваю дзейнасць пераважна на тэрыторыі Заходняй Беларусі і Літвы. У 1921-1923 гг. БПС-Р заставалася найбольш масавай і ўплывовай беларускай палітычнай партыяй, у шэрагах якой налічвалася звыш 10 тыс. чалавек. Частка яе кіраўніцтва – Т. Грыб, П. Бадунова, Я. Мамонька – знаходзілася ў Празе, В. Ластоўскі, А. Трафімаў, А. Цвікевіч – у Коўна, В. Маслоўская і іншыя – нелегальна ў Вільні. ЦК БПС-Р у другой палове 1921 г. праявіў ініцыятыву аб'яднаць усе беларускія дэмакратычныя сілы на барацьбу супраць польскай акупацыі беларускіх зямель.

Ва ўмовах развіцця рэвалюцыйна-вызваленчага руху з левага крыла БПС-Р вылучылася і ў ліпені 1922 г. Аформілася як самастойная Беларуская рэвалюцыйная арганізацыя. На чале яе стаялі вядомыя ў той час дзеячы нацыянальна-вызваленчага руху: удзельнік слуцкага паўстання публіцыст І. Лагіновіч, паэт і публіцыст Л. Родзевіч, грамадскі дзеяч А. Канчэўскі, удзельнік грамадзянскай вайны А. Капуцкі. Яе кіраўнікі ставілі задачу арганізацыі ўзброенага паўстання ў Заходняй Беларусі і яе ўз'яднання з БССР. У сваіх тэарэтычных поглядах зыходзілі з канцэпцыі безбуржуазнасці беларускага грамадства і самабытнага шляху развіцця рэвалюцыі ў Беларусі. Нацыянальнае вызваленне Беларусі, на іх думку, аўтаматычна прывядзе і да сацыяльнага. Праз свой часопіс "Наш сцяг", які неаднаразова закрывалі польскія ўлады, таму ён выходзіў пад рознымі назвамі, прапагандавалі ідэю стварэння рабоча-сялянскага ўрада, патрабавалі канфіскацыі памешчыцкай зямлі і перадачы яе без выкупу сялянам, 8-гадзіннага рабочага дня. Гэта паступова збліжала яе ідэйна з падпольнымі камуністычнымі арганізацыямі краю.

Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя абапіралася, галоўным чынам. на беларускую інтэлігенцыю. Уплыў партыі на беларускае сялянства быў нязначны. Ва ўмовах польскай акупацыі партыя не змагла выпрацаваць паслядоўную лінію ў нацыянальна-вызваленчым руху. Выступала як палітычная апазіцыя, імкнучыся парламенцкімі сродкамі дабіцца ад польскіх уладаў культурна-нацыянальнай аўтаноміі Заходняй Беларусі, адчужэння зямлі ў буйных памешчыкаў і перадачы яе малазямельным сялянам, дэмакратычных свабод. Будучыня краю бачылася ў мірным эвалюцыйным шляху развіцця беларускага грамадства, захаванні дробнай сялянскай гаспадаркі, аб'яднанай у кааперватывы і гаспадарчыя саюзы. Паміж яе лідэрамі А. Луцкевічам, Б. Тарашкевічам, С. Рак-Міхайлоўскім – з аднаго боку, П. Алексюком, Л. Дубяйкоўскім, А. Більдзюкевічам, Паўлюкевічам – з другога, узніклі вострыя рознагалоссі з-за таго, што апошнія з пералічаных адкрыта супрацоўнічалі з польскімі ўладамі. П. Аляксюк у снежні 1921 г. арганізаваў з'езд так званых прадстаўнікоў Заходняй Беларусі ў Вільні, для таго каб прызнаць польскую дзяржаўнасць. Былі пасланы прывітальныя тэлеграмы Ю. Пілсудскаму з падзякай за "вызваленне" Заходняй Беларусі. Аднак арыентацыя на Польшчу не была папулярнай у беларускім асяроддзі. Таму супрацьстаянне закончылася ў верасні 1924 г. расколам і фактычнай самаліквідацыяй партыі.

Набірала моц Беларуская хрысціянская дэмакратыя (БХД), створаная яшчэ ў маі 1917 г. Яна прайшла складаны эвалюцыйны шлях развіцця ад нешматлікай клерыкальнай арганізацыі ў 20-я гады да масавай свецкай партыі ў сярэдзіне 30-х гадоў. Ідэолагі і арганізатары партыі каталіцкія ксяндзы, беларусы па паходжанню, Ф. Абрантовіч, Ад. Станкевіч, В. Гадлеўскі, Л. Хвецька, адмаўляючы капіталізм як лад жыцця, разам з тым негатыўна ставіліся да савецкай улады і тэорыі класавай барацьбы. У пачатку 30-х гадоў выступілі з абгрунтаваннем трэцяга, прамежкавага, эвалюцыйнага шляху развіцця грамадства.

У аснову практычнай дзейнасці БХД была пакладзена тэорыя самабытнасці развіцця беларускай нацыі, прынцып самавызначэння народаў, адмаўленне класавай барацьбы. Беларускі народ разглядаўся як бяскласавы, цалкам працоўны, "сярмяжны" люд. Патрабаванні перадачы зямлі беззямельным і малазямельным сялянам без выкупу ва ўласнасць, 8-гадзіннага рабочага дня, дэмакратычных свабод, адстойванне права беларускага народа на самастойнасць у яго этнаграфічных межах мелі водгук сярод насельніцтва краю, у першую чаргу каталіцкага веравызнання. БХД выступала супраць аддзялення

царквы ад дзяржавы, супраць выкарыстання рэлігіі ў палітычных мэтах, за абавязковасць вывучэння рэлігіі ў школах. У 1926 г. дзеячы БХД разам з кіраўнікамі Беларускага сялянскага саюза (БСС) стварылі арганізацыю культурна-гаспадарчага характару "Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры". Шляхам арганізацыі сельскагаспадарчай асветы, заснаваннем сельскагаспадарчых кааператываў, стварэннем машынных станцый на вёсках кіраўнікам БХД удалося значна паўплываць на бядняцка-серадняцкія сялянскія масы, частку беларускай інтэлігенцыі каталіцкага веравызнання. Да 1930 г. функцыяніравала 51 аддзяленне Інстытута ў розных мясцовасцях Віленскага і Навагрудскага ваяводстваў.

Супраць дзейнасці БХД выступалі дзяржаўныя і царкоўныя ўлады. Цэнтральны друкаваны орган БХД "Беларуская крыніца" нярэдка канфіскоўваўся, а ксяндзы, якія пропаведзі гаварылі на беларускай мове, падвяргаліся паліцэйскім рэпрэсіям. Аднаго з лідэраў БХД Вінцэнта Гадлеўскага двойчы (у 1926 г. і 1927 г.) арыштоўвалі польскія ўлады, і потым асудзілі на два гады турэмнага зняволення.

Летам 1925 г. дэпутаты Беларускага пасольскага клуба Ф. Ярэміч і В. Рагуля стварылі палітычную арганізацыю – Беларускі сялянскі саюз. У сакавіку 1926 г. была прынята палітычная праграма, якая змяшчала шэраг радыкальных патрабаванняў: раздзел памешчыцкіх зямель і перадачу іх ва ўласнасць малазямельным і беззямельным сялянам па працоўнай норме, скасаванне асадніцтва, самастойнасць беларускага народа ва ўсіх яго этнаграфічных землях і інш. Аднак неакрэсленасць у пытаннях тактыкі, адкрытая канфрантацыя лідэраў БСС з рэвалюцыйна-дэмакратычнымі арганізацыямі не спрыялі пашырэнню ўплыву саюза сярод беларускага сялянства. У канцы 1928 г. БСС распаўся.

Найбольш уплывовай з'яўлялася Камуністычная партыя Заходняй Беларусі. Яна была ўтворана 30 кастрычніка 1923 г. на канферэнцыі Беластоцкага, Брэсцкага і Віленскага акруговых камітэтаў Камуністычнай рабочай партыі Польшчы, што адбылася нелегальна ў Вільні. КПЗБ уваходзіла ў склад Кампартыі Польшчы на правах тэрытарыяльна-аўтаномнай арганізацыі, таму асобнай праграмы і статута не мела. У практычнай дзейнасці зыходзіла з тактычных установак, якія былі прыняты на I (1928) і II (1935) з'ездах партыі і канферэнцыях. Яны прадугледжвалі ажыццяўленне сацыялістычнай рэвалюцыі ў краіне, ліквідацыю памешчыцкага землеўладання і перадачу зямлі сялянам без выкупу, права на самавызначэнне Заходняй Беларусі і далучэнне да БССР. Апошняя частка гэтага

патрабавання (далучэнне да БССР) была знята ў чэрвені 1931 г. на V пленуме ЦК КПЗБ у сувязі з падрыхтоўкай савецка-польскага дагавора аб ненападзе.

Першымі арганізатарамі партыі былі С. Мертэнс (Скульскі), А. Славінскі (Адам), С. Мілер (Шлёмка), С. Дубовік, А. Тамашэўскі (Стары). У час стварэння КПЗБ у яе шэрагах налічвалася 528 чалавек. Важнае значэнне для камуністычнага руху ў краі мела прыняцце 31 снежня 1923 г. у склад КПЗБ Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі. Кіраўнікі БРА І. Лагіновіч (П. Корчык), А. Канчэўскі (Владэк) і А. Капуцкі (Лёкса) згодна з дасягнутай дамоўленасцю былі кааптаваны ў склад ЦК КПЗБ. У шэрагах БРА на момант аб'яднання налічвалася каля 300 чалавек, звыш 500 спачуваючых. І. Лагіновіч, які ў часы польскай акупацыі зведаў лагер інтэрніраваных і беспрацоўе, хутка эвалюцыяніраваў ад эсэраўскай да марксісцкай ідэалогіі. У снежні 1925 г. стаў палітычным сакратаром ЦК КПЗБ.

Зліццё падпольнага камуністычнага руху з эсэраўскім пашырыла сацыяльную базу нацыянальна-вызваленчага руху. Нягледзячы на нелегальнае становішча, рэпрэсіі паліцэйскіх уладаў, ішоў працэс арганізацыйнага ўмацавання КПЗБ. **У** канцы 1924 г. налічвалася 2296 камуністаў, у 1927 г. – 3254. Прыкладна трэцяя частка складу КПЗБ пастаянна знаходзілася ў турмах, а пазней – у створаным для "небяспечных элементаў лагеры ізаляцыі" Бяроза Картузская.

У практычнай дзейнасці КПЗБ аказвалася падтрымка (ідэйная, фінансавая і арганізацыйная) з боку савецкіх уладаў. У гэтых мэтах у ліпені 1924 г. было створана Бюро дапамогі Кампартыі Заходняй Беларусі, якое затым у 1925 г. было рэарганізавана ў Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ пры ЦК КП(б)Б. У Мінску функцыяніравала падпольная школа падрыхтоўкі кадраў для нелегальнай работы ў краі. ЦК КПЗБ здолеў наладзіць дзейнасць нелегальных друкарняў, выданне з лістапада 1924 г. газеты "Чырвоны сцяг", часопіса "Бальшавік" і іншыя выданні на беларускай, польскай, яўрэйскай і літоўскай мовах. У вялікай колькасці друкаваліся брашуры, лістоўкі, адозвы. У апазіцыі да ўрадавага лагера знаходзіліся арганізацыі Польскай сацыялістычнай партыі і сялянскай партыі "Вызваленне", якія існавалі легальна. Яны ўплывалі, галоўным чынам, на рабочых, часткова інтэлігенцыю і сялянства польскай нацыянальнасці Беластоцкага, Бельскага, Сувалкаўскага, часткова Гродзенскага і Лідскага паветаў Беластоцкага ваяводства, а таксама Палесся і Віленшчыны.

Актыўна дзейнічалі прафесійныя, кааператыўныя і культурна-асветныя арганізацыі краю. У 1921 г. было арганізавана Таварыства

беларускай школы (старшыня Б. Тарашкевіч). ТБШ намагалася адкрыцця прыватных беларускіх школ, народных дамоў, клубаў-чытальняў. Гэтая мэтанакіраваная акцыя ахапіла ў хуткім часе 157 сёлаў, 14 паветаў Заходняй Беларусі.

У сувязі з разгромам дэфензівай паўстанцкіх структур эсэраў кіраўніцтва партызанскім рухам у другой палове 1924 г. узначаліла кампартыя. Другая канферэнцыя КПЗБ 30 лістапада 1924 г. узяла курс на падрыхтоўку ўзброенага паўстання. Партызанская барацьба ахапіла практычна ўсю Заходнюю Беларусь. Атрады партызан нападалі на мястэчкі, чыгуначныя станцыі і нават на павятовыя цэнтры. Так, у ліпені 1924 г. партызаны пад камандаваннем Д. Балашкі разграмілі паліцэйскі ўчастак у мястэчку Вішнёва Валожынскага павета. Уначы з 3 на 4 жніўня 1924 г. партызанскі атрад пад камандаваннем С. Ваўпшасава зрабіў напад на мясцовую турму ў Стаўбцах і вызваліў затрыманых пры нелегальным пераходзе савецка-польскай граніцы члена ЦК КРПП С. Мертэнса і члена ЦК КПЗБ І. Лагіновіча. Шырокі рэзананс у краіне атрымаў напад партызанскага атрада К. Арлоўскага на пасажырскі цягнік на раз’ездзе Парахонск чыгуначнай дарогі Пінск-Лунінец. Партызаны раззброілі паліцэйскіх і афіцэраў, затрымалі ў цягніку палескага ваяводу Даўнаровіча. Перапалоханы, палітычна скампраметаваны ваявода быў вымушаны падаць у адстаўку. У кастрычніку партызаны зрабілі напад на маёнтак і паліцэйскі ўчастак Кажан-Гарадка Столінскага павета. Многія акцыі праводзіліся пад імем легендарнага ў той час партызанскага важака Мухі-Міхальскага, былога харунжага польскай арміі, вобраз якога тагачасная прэса атаясамлівала з пушкінскім Дуброўскім. Толькі з красавіка 1924 па лістапад 1925 гг. партызаны правялі каля 280 баявых аперацый.

У адказ польскія ўлады ўзмацнілі паліцэйскія рэпрэсіі. У дапамогу паліцыі быў сфарміраваны "Корпус аховы граніц", каб разам весці барацьбу з партызанскім рухам. Паўсюль дзейнічалі надзвычайныя суды і карныя экспедыцыі. У Палескім ваяводстве за 9 месяцаў 1924-1925 гг. было расстраляна 57 чалавек, яшчэ больш асуджана на пажыццёвае турэмнае зняволенне.

Рэчаіснасць паказвала, што тактыка далейшай партызанскай барацьбы была бесперспектыўнай. Яна ставіла пад удар мясцовае жыхарс'гва, бо карныя экспедыцыі прымянялі "пацыфікацыі", пад час якіх разбурэнням падвяргаліся пабудовы сялян, а таксама жорсткім катаванням жыхары за малейшае спачуванне партызанам. У сакавіку 1923 г. Савет Антанты прызнаў усходнюю мяжу Польшчы. Пачалося палітычнае збліжэнне Масквы і Варшавы. Таму восенню

1925 г. ЦК КПЗБ даў дырэктыву мясцовым арганізацыям спыніць партызанскі рух, перайсці да новых метадаў барацьбы. III канферэнцыя КПЗБ, якая адбылася ў студзені 1926 г. у Маскве, афіцыйна асудзіла курс на ўзброенае паўстанне. Яна вызначыла новую тактычную лінію на спалучэнне нелегальнай дзейнасці з легальнай работай у масавых арганізацыях, заваёву пераважаючага ідэйнага ўплыву сярод працоўнага насельніцтва краю, актывізацыі барацьбы ў абарону штодзённых нацыянальна-дэмакратычных патрабаванняў.

**Пошук шляху да адзінства дзеянняў.** Кіраўніцтва КПЗБ пачало актыўныя захады па згуртаванню левых сіл нацыянальна-вызваленчага руху. Па ініцыятыве ЦК КПЗБ са складу Беларускага пасольскага клуба ў чэрвені 1925 г. выйшлі Б. Тарашкевіч, С. Рак-Міхайлоўскі, П. Мятла, П. Валошын і ўтварылі асобную фракцыю – Беларускую сялянска-работніцкую граміаду. На нелегальнай сустрэчы ў Сопаце ў жніўні 1925 г. кіраўнікоў ЦК КПЗБ, ЦК КП(б)Б, ЦК КПП з кіруючым актывам БСРГ Б. Тарашкевічам, П. Мятлой, Р. Астроўскім і М. Марцінчыкам была дасягнута дамоўленасць аб стварэнні шырокай арганізацыі рэвалюцыйна-дэмакратычнага вызваленчага характару, вызначаны асноўныя аспекты яе палітычнай праграмы.

Праграма была апублікавана вясной 1926 г. і ўключала дэмакратычныя і сацыяльна-эканамічныя патрабаванні: свабода сходаў і палітычных арганізацый, права свабоднага абрання органаў самакіравання, перадачы памешчыцкіх і царкоўных зямель сялянам без выкупу, скасаванне асадніцтва, перакладанне налогаў на маёмасныя класы і вызваленне ад падаткаў беззямельных і малазямельных сялян, 8-гадзіннага рабочага дня, аплачваемага водпуску, дапамогі беспрацоўным у памеры пражытачнага мінімуму, права народаў на самавызначэнне і аб'яднанне ўсіх беларускіх зямель у адзінай рэспубліцы пад уладай рабочых і сялян.

У хуткім часе БСРГ ператварылася ў масавую арганізацыю, сацыяльную базу якой складала беларускае сялянства. У арганізацыю ўступалі таксама рабочыя, рамеснікі, прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі. У студзені 1927 г. у яе шэрагах налічвалася звыш 100 тыс. чалавек, аб'яднаных у суполкі.

БСРГ мела свае друкаваныя органы "Беларуская справа", "Жыццё беларуса", "Народная справа", "Наша воля", "Народны звон", сатырычны часопіс "Маланка". Аб папулярнасці друку БСРГ сведчаць такія факты, калі многія сяляне-беднякі выпісвалі газеты ў складчыну, наладжвалі калектыўныя чыткі.

Значна актывізавала ў гэты перыяд сваю дзейнасць Таварыства беларускай школы. Колькасць гурткоў ТБШ у 1927 г. дасягнула 450. Яны аб'ядноўвалі каля 16 тыс. чалавек. У Гродне, Глыбокім, Слоніме, Лідзе, Міры і іншых гарадах былі створаны акруговыя ўправы ТБШ. Кружкі і ўправы ТБШ разгарнулі шырокую культурна-асветніцкую дзейнасць у сёлах і мястэчках: чыталіся даклады, адкрываліся бібліятэкі-чытальні, ставіліся спектаклі, будаваліся народныя дамы.

На глебе сумеснай працы намецілася далейшае збліжэнне камуністычнага руху з беларускім нацыянальна-дэмакратычным. Выкарыстоўваючы легальныя магчымасці павятовых камітэтаў БСРГ і акруговых упраў ТБШ, ЦК КПЗБ разгарнуў шырокую кампанію барацьбы за амністыю палітзняволеных і адкрыццё школ на роднай мове. Была праведзена работа па адкрыццю Беларускага кааператыўнага банка. На мэты яго ўтварэння Бюро ЦК КП(б)Б выдаткавала 30 тыс. рублёў. Банк узначальваў у 1925-1926 гг. дырэктар Віленскай беларускай гімназіі і віцэ-старшыня БСРГ Р. Астроўскі. У канцы 1926 г. банк налічваў каля 900 укладчыкаў і меў свае аддзяленні ў Пінску і Глыбокім. Ён аказваў малаёмасным сялянам дапамогу ў крэдытах за невялікі працэнт.

У гарадах і сёлах Заходняй Беларусі пракацілася шырокая хваля мітынгаў і дэманстрацый, на якіх прымаліся рэзалюцыі з патрабаваннямі вызвалення з турмаў палітзняволеных і адкрыцця школ на беларускай мове. У другой палове 1926 г. пад патрабаваннямі вызвалення палітзняволеных было сабрана 100 тыс. подпісаў. Акрамя збору подпісаў, падачы "школьных дэкларацый" кружкі Грамады і ТБШ арганізоўвалі байкот польскай школы беларускімі дзецьмі, адкрывалі прыватныябеларускія.

Мясцовая адміністрацыя імкнулася аслабіць барацьбу беларускага насельніцтва. Пасля майскага дзяржаўнага перавароту 1926 г. і ўсталявання ў краіне аўтарытарнага рэжыму Пілсудскага былі ўзмоцнены рэпрэсіі супраць арганізацый нацыянальна-вызваленчага характару. Непрымірымую пазіцыю да Грамады занялі А. Мяйштовіч – тагачасны міністр юстыцыі, крэсавыя памешчыкі.

У студзені 1927 г. польскія ўлады арыштавалі кіраўнікоў БСРГ Б. Тарашкевіча, С. Рак-Міхайлоўскага, П. Валошына і П. Мятлу, а таксама звыш 400 яе актывістаў. Зняволенне парламентарыяў супярэчыла законам. У сакавіку БСРГ была аб'яўлена незаконнай арганізацыяй, сялян сілай прымушалі здаваць членскія білеты. Узмацніліся рэпрэсіі супраць іншых беларускіх кааператыўных і культурна-асветніцкіх арганізацый.

Шырокі рэзананс у грамадскасці атрымаў "паказальны" працэс над 56 кіраўнікамі і актывістамі Грамады, якія праходзіў у Вільні ў лютым-маі 1928 г. Суд прыгаварыў Б. Тарашкевіча, С. Рак-Міхайлоўскага, П. Валошына і П. Мятлу да 12 гадоў, М. Бурсевіча – да 8, астатніх 32 актывістаў ад 3 да 6 гадоў турмы.

Адначасова з рэпрэсіўнымі мерамі Пілсудскі ў прапагандысцкіх мэтах выступіў з праграмай дробных уступак нацыянальным меншасцям. Увядзеннем некалькіх гадзін радыёперадач на беларускай мове на віленскай радыёстанцыі, выдзяленнем грашовых субсідый асобным арганізацыям гаспадарчага і культурна-асветніцкага характару, выданнем цыркуляра аб вывучэнні мясцовай адміністрацыяй і польскімі настаўнікамі беларускай мовы, іншымі мерамі рэжым "санацыі" імкнуўся адцягнуць беларускую інтэлігенцыю і сялянства ад камуністычных палітычных структур. Некаторыя беларускія нацыянальныя дзеячы і арганізацыі, як Беларускі сялянскі саюз, фармальна застаючыся ў апазіцыі да ўрада, фактычна пайшлі на супрацоўніцтва з ім. Аднак гэта было хутчэй выключэннем, чым правілам, бо такая пазіцыя не атрымала падтрымкі ў беларускага сялянства і інтэлігенцыі. У 1928 г. урад адкінуў абвешчаныя раней сціплыя дэкларацыі ў вырашэнні беларускага пытання.

Разам з тым актыўная барацьба ў абарону сацыяльных патрэб і нацыянальных правоў розных сацыяльных пластоў беларускага грамадства садзейнічала росту аўтарытэту КПЗБ. Аб гэтым сведчылі вынікі выбараў у сейм восенню 1928 г. За яе кандыдатаў прагаласавала 26,8% выбаршчыкаў (328832), што значна перавышала колькасць галасоў, аддадзеных за іншыя беларускія палітычныя партыі.

У выніку выбараў КПЗБ стварыла ў польскім сейме легальную фракцыю – беларускі пасольскі клуб "Змаганне". Дэпутаты клуба Я.А. Гаўрылік (старшыня клуба), І.С. Дварчанін, Я.М. Грэцкі, Ф.І. Валошын, П.С. Крынчык, які змяніў А. Стагановіча, праз парламенцкую трыбуну адстойвалі сацыяльна-эканамічныя патрабаванні працоўных і нацыянальныя правы беларускага народа. У верасні 1930 г. дэпутатаў клуба "Змаганне" арыштавалі польскія ўлады.

Узмацніліся пазіцыі КПЗБ у прафсаюзах, у тым ліку ва ўрадавых і хрысціянскіх, што дало ёй магчымасць актывізаваць барацьбу рабочых. Згодна з афіцыйнымі дадзенымі ў 1927-1928 гг. у Беластоцкім, Палескім, Віленскім і Навагрудскім ваяводствах адбылося 370 забастовак, у якіх удзельнічала каля 49 тыс. рабочых. Аднак забастовачная барацьба ў гэты перыяд была крыху слабейшай,

у параўнанні з перыядам 1923-1924 гг., на што паўплывала пэўная стабілізацыя сістэмы капіталізму.

У сувязі з усталяваннем аўтарытарнага рэжыму Пілсудскага на I з'ездзе КПЗБ (чэрвень-ліпень 1928 г.) была ўдакладнена тактычная лінія партыі ў нацыянальна-вызваленчым руху. Акцэнт рабіўся на неабходнасць узмацнення барацьбы ў абарону дэмакратычных правоў і свабод, разгортвання масавага апазіцыйнага руху на аснове патрабаванняў дэмакратычнага характару. У сялянскім пытанні падкрэслівалася неабходнасць спалучэння барацьбы працоўнага сялянства за зямлю без выкупу з першачарговымі патрэбамі сялян (аблягчэнне налогавага цяжару, супраць ліквідацыі сервітутаў і г. д.).

Таму развіццё нацыянальна-вызваленчага руху ў канцы 20-х гадоў характарызавалася далейшай палярызацыяй класавых сіл. Высокага размаху дасягнулі палітычныя выступленні рабочых і сялян. Сведчаннем чаму былі першамайскія дэманстрацыі і мітынгі.

Актывізавалася барацьба сялянства супраць мерапрыемстваў, якія праводзілі ўлады ў галіне зямельнай палітыкі. Сяляне праганялі землеўпарадчыкаў, знішчалі межавыя знакі, нярэдка адбываліся сутычкі з паліцыяй. Антыўрадавыя выступленні сялян адбыліся ў той перыяд у Гродзенскім, Віленскім, Ашмянскім, Слонімскім, Маладзечанскім, Баранавіцкім, Пружанскім, Кобрынскім, Косаўскім і іншых паветах краю. Асабліва бурны характар набылі выступленні сялян у мясцовасцях, дзе панаваў голад у выніку неўраджаю 1928 года.

Напрыканцы 20-х гадоў на нацыянальна-вызваленчым руху адмоўна адбіліся спробы кіраўніцтва КПЗБ фарсіраваць рэвалюцыйны працэс з разлікам на абвастрэнне барацьбы рабочых і сялян. ЦК КПЗБ імкнуўся надаць культурна-асветніцкай дзейнасці ТБШ ярка выражаны рэвалюцыйны характар. Пасля працяглай арганізацыйнай барацьбы, у якую былі ўцягнуты амаль усе нізавыя гурткі і акруговыя ўправы таварыства, на з'ездзе ТБШ у маі 1929 г. быў абраны новы склад Галоўнай управы. У яе ўвайшлі ў асноўным члены КПЗБ Ф. Стэцкевіч (старшыня), Р. Шырма (сакратар), І. Дварчанін, Ф. Валынец і іншыя. Ад кіраўніцтва ТБШ былі адхілены вядомыя беларускія дзеячы А. Луцкевіч, Р. Астроўскі, Я. Станкевіч, І. Шнаркевіч, А. Трэпка і іншыя. Раскол у лагеры нацыянальна-вызваленчага руху, а таксама ўзмоцненыя рэпрэсіі з боку польскіх уладаў адмоўна паўплывалі на практычную дзейнасць ТБШ. Калі ў 1930 г. налічвалася 7 акруговых упраў Таварыства, то ў 1931 г. іх засталося толькі 3 – Беластоцкая, Косаўская і Ваўкавыская. Зменшылася колькасць членаў ТБШ з 10 тыс. у 1930 г. да 4 тыс. у 1932 г.

Лявацка-сектанцкі ўхіл у дзейнасці КПЗБ быў адной з прычын спаду нацыянальна-вызваленчага руху ў пачатку 30-х гадоў. Аднак забастовачны рух рабочага класа, нягледзячы на кароткачасовы спад у 1929-1930 гг., нарастаў. Мяняўся характар эканамічных забастовак. Калі ў 1929-1930 гг. яны былі накіраваны на абарону раней дасягнутых заваёў, то ў 1931-1933 гг. забастоўкі мелі папяраджальны характар. Бастуючыя выкарыстоўвалі спецыфічны метад – заняцце прадпрыемстваў. У 1932 г. узмацнілася барацьба супраць прыняцця антырабочага заканадаўства.

З кастрычніка 1932 г. па люты 1933 г. праходзіла забастоўка рабочых лясной прамысловасці Белавежскай пушчы, у якой удзельнічала больш 7 тыс. чалавек (4 тыс. рабочых і 3 тыс. сялян-сезоннікаў). Яна была спынена пасля павышэння заработнай платы на 30% . Праз год (з лістапада 1933 г. па люты 1934 г.) рабочыя лясной галіны зноў аб'явілі масавую забастоўку. Усяго ў 1932 г. у Заходняй Беларусі адбылася 51 забастоўка, з удзелам 32,4 тыс. рабочых, у 1933 г. – 81 забастоўка і адпаведна 36,7 тыс. рабочых.

Эканамічныя стачкі ўсё часцей перарасталі ў палітычныя. Яны праходзілі пад знакам пралетарскага адзінства, супраць урадавай знешняй і ўнутранай палітыкі. У 1933 г. адбылося звыш 14 палітычных забастовак, якія суправаджаліся шматлюднымі мітынгамі і дэманстрацыямі, нярэдка завяршаліся сутычкамі з паліцыяй.

Выступленні сялян супраць памешчыкаў, камасацыі і ліквідацыі сервітутаў, падатковага цяжару ў 1931-1932 гг. адбыліся больш чым у 160 сёлах Беластоцкага, Брэсцкага, Гродзенскага, Віленскага, Пінскага і Навагрудскага паветаў. Каб задушыць сялянскія выступленні, улады пасылалі карныя экспедыцыі, праводзілі "пацыфікацыі", якіяператвараліся ў бязлітасныя расправы над сялянамі. У верасні 1931 г. былі ўведзены надзвычайныя, фактычна ваенна-палявыя суды, бо іх прыгаворы абскарджанню не падлягалі.

У адказ на дзеянні паліцыі сяляне стваралі атрады самаабароны, а ў некаторых выпадках станавіліся на шлях партызанскай барацьбы. У сакавіку 1932 г. адбылося ўзброенае выступленне сялян вёскі Асташына. Паліцыя жорстка расправілася з сялянамі. На дапамогу асташынцам прыбылі жыхары з 8 навакольных вёсак. Па прыгавору надзвычайнага суда сяляне І. Бахар, А. Гаўраш, А. Малец, В. Стасевіч былі павешаны, пяць чалавек прыгавораны да пажыццёвага зняволення, 44 чалавекі атрымалі па 5-6 гадоў турмы.

У ліпені 1933 г. адбылося ўзброенае выступленне сялян Кобрынскага павета. Кобрынскі і суседнія з ім паветы былі аб'яўлены на асадным становішчы, а 8 арганізатараў узброенага выступлення, у

тым ліку і сакратар Брэсцкага акруговага камітэта КПЗБ Рэгіна Каплан, былі аддадзены ваенна-палявому суду. У выніку разгорнутай кампаніі салідарнасці, праведзенай не толькі ў краі, але таксама ў Варшаве і Лодзі, смяротная кара была заменена пажыццёвым турэмным зняволеннем. У чэрвені 1934 г. быў створаны лагер "ізаляцыі" ў Бярозе Картузскай. Праз лагер да 1939 г. "прайшло" звыш 10 тыс. чалавек, у асноўным удзельнікі рэвалюцыйна-вызваленчага руху Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

Паліцэйскія праследаванні, адміністрацыйныя перашкоды, таксама лявацка-сектанцкая пазіцыя ЦК КПЗБ значна звузлі магчымасці нацыянальна-вызваленчага руху. У 1933 г. функцыяніравала толькі Беластоцкая акруговая ўправа ТБШ і калі 50 гурткоў. Супраць кіраўнікоў ТБШ – Ф. Стэцкевіча, Р. Шырмы і М. Пяткевіча – КПЗБ разгарнула чарговую кампанію па абвінавачванню ў нацыянал-апартунізме і бяздзейнасці. На развіцці нацыянальна-вызваленчага руху таксама адмоўна адбіліся рэпрэсіі, якім у 1933 г. падвергліся ў БССР былыя кіраўнік) БСРГ і пасольскага клуба "Змаганне": П. Валошын, Ф. Валынец, Я. Гаўрылік, І. Грэцкі, І. Дварчанін, П. Крынчык, С. Рак-Міхайлоўскі, а крыху пазней Б. Тарашкевіч. У адпаведнасці пагадненнем, заключаным паміж Польшчай і СССР па абмен палітзняволенымі, яны ў 1932 г. прыехалі ў БССР, дзе ў хуткіі часе былі абвінавачаны ў "контррэвалюцыйнай змове і антысавецкай дзейнасці". Разам з імі былі арыштаваны кіруючыя работнікі ЦК КПЗБ: Я. Бабровіч, А. Капуцкі, С. Клінцэвіч Л. Родзевіч і інш. З гэтага часу органамі НКУС пачынаецца адпрацоўка версіі аб засмечанасці КПЗБ, як і КПП "агентамі польскай дэфензівы".

Пад уплывам гэтых абвінавачванняў ЦК КПЗБ у 1934 г. прыняў памылковыя рззалюцыі, у якіх з левасектанцкіх пазіцый разглядалася дзейнасць партыі па кіраўніцтву нацыянальна-вызваленчым рухам, а прынятая ў партыю БРА кваліфіквалася як нацыяналістычная агентура ў камуністычным руху.

У трыццатыя гады ў нацыянальна-вызваленчым руху ўсё большую ролю пачалі адыгрываць беларускія нацыянальна-дэмакратычныя партыі і іх каардынуючы орган – Беларускі нацыянальны камітэт. Група А. Луцкевіча – Р. Астроўскага, якая з канца 1929 г. дзейнічала пад сцягам беспартыйнасці, накіроўвала работу розных нацыянальных культурна-асветных, грамадскіх і маладзёжных арганізацый: Таварыства беларускай асветы, Беларускага навуковага, дабрачыннага жаночага таварыстваў, Беларускага студэнцкага саюза, мемарыяле да прэзідэнта Польшчы І. Масціцкага дзеячы групы, якая атрымала іранічную назву

"Беларуская санацыя", заявілі аб "маральным раззбраенні з абодвух бакоў" і неабходнасці пагаднення з урадам. У аснову яго было пакладзена патрабаванне выдзеліць Віленскае, Навагрудскае і Палескае ваяводствы ў асобную адміністрацыйную адзінку, з чым звязвалася надзея на пэўную аўтаномію. У жніўні 1930 г. кіраўнікі групы зрабілі спробу кансалідаваць разрозненыя групоўкі беларускага дэмакратычнага лагера ў адзіную арганізацыю пад назвай "Цэнтрасаюз". Аднак няўдача на выбарах у сейм у лістападзе 1930 г., рознагалоссі ў тактычных пытаннях прывялі да яго хуткага расколу.

Пашырыла свой уплыў Беларуская хрысціянская дэмакратыя, галоўным чынам праз гурткі сваёй арганізацыі – Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры. У 1934 г. 80 гурткоў БІГіК аб'ядноўвалі звыш 1200 чалавек. Да іх нярэдка далучаліся члены ліквідаваных уладамі гурткоў ТБШ. Каб надаць свецкую накіраванасць дзейнасці БХД у студзені 1936 г. была прынята новая палітычная праграма і зменена назва на Беларускае народнае аб'яднанне (БНА). У гэтай праграме па-ранейшаму адстойвалася незалежнасць Беларусі, гаварылася аб барацьбе супраць "дыктатуры капіталізму, фашызму і камунізму". Праграма арыентавала насельніцтва на "трэці шлях" развіцця грамадства праз арганізацыю кааператываў, асветніцка-гаспадарчых гурткоў, бібліятэк-чытальняў і інш. Прадстаўнікі гэтай партыі таксама выступалі з пратэстам супраць праследаванняў і здзекаў над дзеячамі культуры і навукі ў БССР, якія абвінавачваліся ў нацыянал-дэмакратызме і контррэвалюцыйнай дзейнасці.

Істотна актывізаваў палітычную дзейнасць створаны ў 1921 г. Беларускі нацыянальны камітэт. У яго склад у 1934 г. уваходзіла 26 прадстаўнікоў розных палітычных партый і арганізацый, галоўная роля сярод якіх належала БХД. Старшынёй БНК быў абраны галоўны рэдактар "Беларускай крыніцы" і старшыня Прэзідыума БНА Ян Пазняк. У новым Статуце БНК, які быў прыняты ў чэрвені 1935 г., падкрэслівалася, што камітэт з'яўляецца прадстаўніком усяго арганізаванага беларускага насельніцтва Заходняй Беларусі і дамагаецца права народа на самавызначэнне.

Сярод часткі заходнебеларускай інтэлігенцыі пасля прыходу да ўлады Гітлера ў Германіі пашырыліся ўплывы ідэалогіі нацыянал-сацыялізму. Сведчаннем гэтаму з'явілася арганізацыя ў 1934 г. Ф. Акінчыцам і У. Казлоўскім "Беларускай нацыянал-сацыялістычнай партыі". Аднак на працягу пяці гадоў свайго існавання яна з'яўлялася немшматлікай арганізацыяй.

Прыняцце ў 1935 г. новай канстытуцыі, якая заканадаўча абмяжоўвала дэмакратычныя правы і свабоды грамадзян, збліжэнне з гітлераўскай Германіяй (у 1934 г. быў заключаны германа-польскі пакт аб ненападзе) сведчылі аб узмацненні палітычнай рэакцыі ў краіне. У гэтых умовах кіраўніцтва КПЗБ адыходзіць ад ранейшых сектанцкіх пазіцый. Рашаючы паварот быў зроблены на II з'ездзе КПЗБ (8-18 мая 1935 г.). ЦК КПЗБ вызначыў задачу стварэння шырокага дэмакратычнага, антыфашысцкага народнага фронту шляхам уцягвання ў яго арганізацый сацыял-дэмакратычных партый, БХД на аснове агульнай барацьбы за дэмакратычныя свабоды, надзённыя сацыяльна-эканамічныя патрабаванні насельніцтва.

У жніўні-верасні 1935 г. адбыліся тры афіцыйныя сустрэчы прадстаўнікоў ЦК КПЗБ і ЦК БХД. Была дасягнута дамоўленасць па сумеснаму збору дэкларацый за адкрыццё беларускіх школ, выданню беларускай граматыкі. Створаны Цэнтральны школьны сакратарыят распаўсюдзіў у вёсцы звыш 127 тыс. дэкларацый, 1259 заяў і 1205 інструкцый на адкрыццё дзяржаўных пачатковых беларускіх школ. Беларускае пытанне набывала значнасць і выходзіла на шырокую палітычную арэну, стала прадметам дыскусій у польскім сейме. Адбывалася радыкалізацыя інтэлігенцыі і студэнцкай моладзі. У 1935-1936 гг. у Вільні дзейнічала легальная антыфашысцкая арганізацыя – Саюз студэнцкай лявіцы "Фронт", які аб'ядноўваў студэнтаў і прадстаўнікоў інтэлігенцыі Вільні розных нацыянальнасцяў. Арганізацыя выступала за ажыццяўленне дэмакратычных і сацыяльных пераўтварэнняў, падтрымала права на самавызначэнне Заходняй Беларусі. Узначальвалі арганізацыю прадстаўнікі польскай прагрэсіўнай інтэлігенцыі Г. Дэмбінскі і С. Ендрыхоўскі. Яна выдавала газету "Папросту".

КПЗБ рабіла захады па ўстанаўленню адзінства дзеянняў з арганізацыямі ППС, Бунда і "Стронніцтва людовага" Вільні, Беластока, Гродна, Баранавіч, Ліды, Сувалак і Ваўкавыска. У аснову былі пакладзены асноўныя дэмакратычныя і сацыяльна-эканамічныя патрабаванні. На працягу канца 1935-пачатку 1936 г. агульныя камітэты і камісіі былі створаны на некаторых прадпрыемствах Беластока, Вільні, Гродна, Бара-навіч, Ваўкавыска. У 1936 г. адбыліся 184 забастоўкі, у якіх удзельнічала каля 40 тыс. рабочых. Палітычныя выступленні працоўных, мітынгі і дэманстрацыі, як правіла, каардынаваліся адзінафрантавымі камітэтамі. Узмацнялася барацьба сялян, накіраваная на адтэрміноўку падаткаў, супраць камасацыі і канчатковай ліквідацыі сервітутаў. Шырокі рэзананс атрымала забастоўка нарачанскіх сялян-рыбакоў, якая пачалася вясной 1935 г. У ёй удзельнічала каля 5 тыс. сялян з больш чым 40 навакольных вёсак.

У жніўні 1937 г. пачалася агульнапольская забастоўка сялян, якая ахапіла каля 10 млн. чалавек. Яе падтрымалі сяляне Бельскага, Гродзенскага і Слонімскага паветаў.

У той самы час праводзілася акцыя ў абарону С. Прытыцкага, які, выконваючы прысуд КПЗБ, страляў у правакатара, агента дэфензівы Стральчука ў зале Віленскага акруговага суда. Хваля пратэсту супраць смяротнага прысуду, якая праводзілася і ў БССР, вымусіла польскія ўлады замяніць смяротнае пакаранне пажыццёвым зняволеннем.

На ўздым нацыянальна-вызваленчага руху польскія кіруючыя колы адказалі чарговай хваляй рэпрэсій. У пачатку 1936 г. быў арганізаваны судовы працэс над членамі арганізацыі "Фронт" і беларускімі літаратарамі. У снежні таго самага года была забаронена дзейнасць ТБШ і БІГіКа. Такі лёс спасціг у 1937 г. Саюз беларускіх настаўнікаў, у 1938 г. Беларускі нацыянальны камітэт, іншыя беларускія арганізацыі. Моцны ўдар вызваленчаму руху нанёс роспуск Выканкамам Камінтэрна ў жніўні 1938 г. Кампартыі Польшчы і яе састаўных частак: Кампартыі Заходняй Беларусі і Кампартыі Заходняй Украіны. Ён быў праведзены на аснове абвінавачвання аб пранікненні ў кіруючы актыў партыі агентаў дэфензівы. Роспуску папярэднічалі рэпрэсіі ў 1937 г. яго кіруючага актыву. Яшчэ ў лютым 1936 г. органамі НКУС БССР быў арыштаваны палітычны сакратар ЦК КПЗБ І. Лагіновіч, пазней двойчы, у 1938 і 1939 гг., яму выносіліся смяротныя прысуды. Рэпрэсіям падвергліся А. Славінскі, С. Мертэнс, А. Альшэўскі, Р. Вольф, М. Майскі, М. Маслоўскі, А. Розеншайн, І. Сяменікаў, М. Словік, якія знаходзіліся ў БССР ці былі выкліканы ў Мінск.

Такім чынам, у складаны час напярэдадні другой сусветнай вайны вызваленчы рух краю быў пазбаўлены кіруючага цэнтра. Тым не менш, ён працягваўся, садзейнічаў развіццю нацыянальнай і палітычнай самасвядомасці беларускага насельніцтва, стрымліваў працэс паланізацыі нацыі.

## ТЭМА VII
## БЕЛАРУСЬ У ПЕРЫЯД ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

**Гістарыяграфія, крыніцы.** Пачатак другой сусветнай вайны супаў з важнай падзеяй у гісторыі беларускага народа – уз'яднаннем Заходняй Беларусі з БССР. Гэтая знамянальная падзея выявілася ў шэрагу прац, апублікаваных напярэдадні Айчыннай вайны. У апошнія гады пачалося паглыбленае вывучэнне ваенных падзей 1939 г. і сацыяльна-палітычных пераўтварэнняў у перадваенны перыяд у заходніх абласцях БССР. Яны знайшлі асвятленне ў артыкулах У. Палуяна, У. Ладысева, Л. Лыча, В. Селяменева, Я. Бараноўскага, А. Вялікага, іншых аўтараў, змешчаных у зборніках: "Назаўсёды разам. Да 60-годдзя ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР" (Мн., 1999) і "Праблемы ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР. Гісторыя і сучаснасць". Матэрыялы міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі 17-18 верасня 1999 г. (Мн., 2000).

Цэнтральнае месца сярод даследаванняў па гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны займае гістарыяграфія вайсковых аперацый на тэрыторыі рэспублікі. Першыя працы, прысвечаныя ваенным дзеянням савецкіх войскаў супраць вермахта на Беларусі, з'явіліся ў канцы 40 - пачатку 50-х гг. Іх аўтарамі былі І.Р. Караткоў і С. М. Шышкоў "Победа Красной Армнн в Белоруссии" (М., 1946), Я. Салдаценка "Советская Армия – освободительница Белоруссии" (Мн., 1948), М.М. Мінасян "Победа в Белоруссии: Пятый Сталинскнй удар!" (М., 1952). Ваенныя дзеянні супраць нямецкіх захопнікаў разглядаліся праз прызму пераможных аперацый Чырвонай Арміі на Беларусі ў 1943-1944 гг.

У 60-80-х гг. паявіліся працы, у якіх упершыню навукова аналізаваліся прычыны няўдач Чырвонай Арміі летам 1941 г. Трагічным падзеям пачатковага перыяду Айчыннай вайны прысвяцілі свае даследаванні В.А. Анфілаў "Начало Великой Отечественной войны" (М. 1962), "Провал "блицкрига" (М. 1974), М.К. Андрушчанка "Народное ополчение Белоруссии".(435) (Мн. 1980), "На земле Белоруссии летом 1941 г." (М. 1985), Я.С. Паўлаў "В суровом сорок первом" (Мн. 1985) і іншыя.

Найбольш распрацаваным у айчыннай гістарыяграфіі з'яўляецца гісторыя партызанскага руху на Беларусі супраць нямецкіх акупантаў. Першыя працы – гэта брашуры і артыкулы партыйных і дзяржаўных кіраўнікоў, арганізатараў партызанскага руху – П.К. Панамарэнкі, М.В. Зімяніна, Ц.С. Гарбунова. З канца 40-х гг. пачалі з'яўляцца і навуковыя даследаванні ў выглядзе кандыдацкіх дысертацый С.Ф.

Ажгірэя, Н.Е. Гракава, Ф.В. Круглікава, П.Я. Цярэнцева і іншых аўтараў. У навуковы абарот быў уведзены фактычны матэрыял па праблеме партызанскага руху. У 1951 г. з'яўляецца калектыўная праца беларускіх гісторыкаў "Всенародная партизанская война в Белоруссии против фашистских захватчиков" у двух тамах. Аўтарства прысвоіў Л. Цанава, тагачасны міністр Дзяржбяспекі БССР. У манаграфіі выкарыстана шырокая крыніцазнаўчая база, дэтальна распрацаваны пытанні стварэння і дзейнасці партызанскіх фарміраванняў, палітыкі нямецкіх акупацыйных уладаў. Упершыню асветлена дзейнасць Арміі Краёвай на тэрыторыі рэспублікі.

Звыш 40 манаграфій і 100 кніг мемуарнага характару, якія былі прысвечаны пытанням партызанскага руху і падпольнай барацьбы на Беларусі, з'явілася ў 50 80-я гады. Асаблівае месца сярод іх займае зборнік дакументаў і матэрыялаў у трох тамах "Всенародная борьба в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 – июль 1944)", трохтомнік "Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашнстских захватчиков", чацвёрты том "Гісторыі Беларускай ССР" (Мн., 1975), які цалкам прысвечаны падзеям другой сусветнай вайны на Беларусі.

Значнае месца займаюць даследаванні нямецкага акупацыйнага рэжыму на Беларусі ў 1941-1944 гг. Па адзначанай праблеме выдадзены дзесяткі зборнікаў дакументаў і матэрыялаў, манаграфій. Сярод іх працы М.М. Загарулькі, А.Ф. Юдзянкова "Крах экономических планов фашистской Германии на временно оккупированной территории СССР" (М., 1970), І.С. Краўчанкі, А.І. Залескага, В.П. Раманоўскага "Немецко-фашистский оккупационный режим (1941-1944 гг.)" (Мн., 1965), А.А. Фактаровіча "Крах аграрной политики немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии" (Мн., 1979) і інш. Прадстаўнікі беларускай эміграцыі займаліся выданнем зборнікаў, дакументаў, мемуараў і навуковых прац: "Другі ўсебеларускі кангрэс" (Мюнхен, 1954), "За дзяржаўную незалежнасць Беларусі" (Лондан, 1960), К. Акула "Змагарныя дарогі" (Мюнхен, 1962), Я. Малецкі "Пад знакам Пагоні. Успаміны" (Таронта, 1976), І. Касяк "З гісторыі праваслаўнай царквы беларускага народу" (Нью-Йорк, 1956), А. Калодка "Напад палякаў на Жодзішкі" // Зважай (Канада, 1979, № 4.) Шнэк У. "Беларуская Краёвая Абарона" (Мельбурн, 1984) і інш.

Новы этап у беларускай гістарыяграфіі Другой сусветнай вайны пачаўся ў 90-х гадах. Характэрнай з'явай гэтага перыяду стала спроба асэнсавання дасягненняў сучаснай гістарычнай навукі, ліквідацыі некаторых "белых плям" гісторыі антыфашысцкага руху на Беларусі. У першую чаргу гэта тычыцца гісторыі стварэння і дзейнасці

польскай Арміі Краёвай у Заходняй Беларусі. Па гэтай тэматыцы з'явіліся кнігі Ю. Весялкоўскага "Што прывяло Армію Краёву на Беларусь" (Лондан, 1995), В.І. Ермаловіча, С.У. Жумара "Огнём и мечом: хроника польского националистического подполья в Белоруссии (1939-1953 гг.)" (Мн., 1994) і Я.І. Сямашкі "Армія Краёва на Беларусі" (Мн., 1994). Праблеме беларускага калабарацыянізму прысвечана кніга А.К. Салаўёва "Белорусская Центральная Рада: создание, деятельность, крах" (Мн., 1995), манаграфія А. А. Кавалені "Прагерманскія саюзы моладзі на Беларусі 1941-1944: Вытокі. Структура. Дзейнасць" (Мн., 1999). Сістэма акупацыйнай прапаганды на Беларусі ў 1941-1944 гг. была прааналізавана ў манаграфіі С.У. Жумара "Оккупационная периодическая печать на территории Беларуси в годы Великой Отечественной войны" (Мн., 1996).

Па-новаму пачынаюць ставіцца гісторыкі і да асобных старонак антыфашысцкай барацьбы на Беларусі. У 1992 г. была апублікавана манаграфія К.І. Дамарада "Партийное подполье и партизанское движение в Минской области 1941-1944", пазней калектыўная праца "Мінскае антыфашысцкае падполле" (Мн., 1995). На старонках гэтых кніг многа новых звестак аб мінскім падполлі 1941-1944 гг., дзейнасці яго ўдзельнікаў. Асобнае месца займае "справа Кавалёва", дзе ідзе размова аб вяртанні добрага імя аднаму з кіраўнікоў савецкага падполля ў г. Мінску.

Адметнай асаблівасцю вылучаюцца працы, прысвечаныя армейскім аперацыям на тэрыторыі Беларусі, - гэта манаграфіі І.В. Цімаховіча "Битва за Белоруссию 1941-1944 гг." (Мн., 1994), У.І. Лемяшонка "Вызваленне – без грыфа "Сакрэтна!" (Мн., 1996). Трагічным падзеям чэрвеня-ліпеня 1941 г., звязаным з акружэннем войскаў Заходняга фронту, прысвечана манаграфія І. А. Басюка "Навагрудскі кацёл" (Мн., 1998).

У апошнія гады з'явіліся манаграфіі У. Е. Снапкоўскага "Знешнепалітычная дзейнасць Беларусі 1944-1953 гг." (Мн., 1997), А.В. Шаркова "Военнопленные и интернированные на территории Беларусн (1944-1951 гг.)" (Мн., 1997), у якіх асвятляюцца пытанні ўсталявання беларуска-польскай дзяржаўнай мяжы ў 1944 г., лёс нямецкіх ваеннапалонных на Беларусі.

Разам з тым многія гістарычныя сюжэты яшчэ чакаюць сваіх даследчыкаў. Сярод іх змаганне беларусаў у складзе польскай арміі ў гады Другой сусветнай вайны, савецкая ваенная палітыка на Беларусі, стан гаспадаркі рэспублікі ў час нямецкай акупацыі, палітыка нямецкіх уладаў, вайсковыя аперацыі ў 1941-1944 гг. на Беларусі патрабуюць больш дасканалага вывучэння.

## ЛЕКЦЫЯ 22

## ПЕРШЫ ЭТАП ВАЙНЫ

- *Германа-польская вайна*
- *Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР*
- *БССР у перадваенныя гады*

**Германа-польская вайна.** Лёс беларускага народа быў цесна звязаны з падзеямі другой сусветнай вайны, якая пачалася з нападу Германіі на Польшчу 1 верасня 1939 г. Менавіта ў гэты час адбылося ўз'яднанне беларускага народа ў адзінай нацыянальнай дзяржаве.

Другая сусветная вайна пачалася ва ўмовах новай расстаноўкі сіл ва ўсходняй і цэнтральнай Еўропе. Мюнхенскае пагадненне паміж урадамі Германіі, Італіі, Англіі і Францыі ў верасні 1938 г. адкрыла шлях для экспансіі гітлераўскай Германіі на ўсход. Дагавор аб узаемным ненападзе паміж СССР і Германіяй ад 23 жніўня 1939 г. сведчыў, што дзве вялікія краіны абышліся з суверэннай Польшчай прыкладна так, як урадавыя колы Польшчы з тэрытарыяльнай цэласнасцю Беларусі ў час рыжскіх перамоў у 20-я гады.

Згодна з дадатковым сакрэтным пратаколам, прыкладзеным да савецка-германскага пакта аб ненападзе, германскія войскі не павінны былі перасякаць устаноўленую мяжу па лініі рэк Нарэў, Вісла і Сан на выпадак ваеннага канфлікту Германіі з Польшчай. Гэта азначала, што Заходняя Беларусь, уключаючы заходнія паветы Беластоцкага ваяводства, у выпадку акупацыі тэрыторыі Польшчы Германіяй павінна была адысці да БССР.

У першыя дні германа-польскай вайны, якая пачалася 1 верасня 1939 г. нападам гітлераўскай Германіі на Польшчу, савецкае кіраўніцтва, нягледзячы на спробы Гітлера падштурхнуць Сталіна да ваенных дзеянняў з Польшчай, заняло пазіцыю чакання. Масква дала зразумець, як інфармаваў германскае кіраўніцтва пасол граф Ф.-В. фон дэр Шуленбург, што яе інтарэс – гэта заходнія раёны Беларусі і Украіны. 6 верасня Савецкі Саюз правёў частковы прызыў рэзервістаў, а 11 верасня быў аддадзены загад наркама абароны К. Варашылава аб утварэнні Беларускага і Украінскага франтоў.

Ва ўмовах, калі амаль усе жыццёва важныя цэнтры Польшчы былі заняты нямецкімі войскамі (14 верасня быў акружаны г. Брэст, а 15 верасня паў Беласток і пад пагрозай захопу апынуўся Львоў), былі апублікаваны пастановы ваенных саветаў Беларускага і Украінскага франтоў. У іх ставілася задача "пакласці канец прыгнёту працоўных

Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, прадаставіць поўную бяспеку працоўным гэтых абласцей".

Раніцай 17 верасня войскі Чырвонай Арміі перайшлі савецка-польскую мяжу. Беларускі фронт налічваў 200 802 салдат і афіцэраў. Войскам фронту супрацьстаяла 45 тыс. польскіх салдат і афіцэраў, з якіх прыкладна палова не была ўзброена і не зведзена ў канкрэтныя воінскія адзінкі. Уздоўж мяжы з БССР вузкай лініяй размяшчаліся польскія часці, якія ўваходзілі ў склад корпуса пагранічнай аховы лікам 8 тыс. чалавек і маракоў Пінскай рачной флатыліі колькасцю каля 2 тыс. чалавек. Сур'ёзнай збройнай сілы, якая магла б супрацьстаяць як войскам Беларускага фронту, так і нямецкім войскам на тэрыторыі Заходняй Беларусі не было.

Урад Польшчы прызнаў, што стану вайны краіны з СССР няма. СССР таксама не аб'яўляў вайны Польшчы. Таму ў загадзе Вярхоўнага галоўнакамандуючага ўзброеных сіл Польшчы маршала Э. Рыдз-Смiглы 17 верасня польскім войскам прадпісвалася не ўступаць у баі з савецкімі воінскімі падраздзяленнямі, за выключэннем спроб раззбраення, ці яўных баявых дзеянняў. Камандзіры польскіх часцей павінны весці перамовы "ў мэтах выхаду гарнізонаў у Румынію ці Венгрыю".

Становішча ўскладнялася тым, што сярод ваеннаслужачых польскай арміі на "крэсах усходніх" знаходзілася шмат рэзервістаў з ліку беларусаў, мабілізаваных яшчэ ў красавіку-чэрвені 1939 года. Так, 20-я пяхотная дывізія польскай арміі, што размяшчалася на ўскраінах Слоніма, складалася выключна з беларусаў. Не хапала ўзбраення, ваеннай амуніцыі. Часткі дывізіі былі перакінуты ў ваколіцы Плонска і Млавы, што на мяжы з Усходняй Прусіяй. Па сведчанню польскіх крыніц у баях з часцямі вермахта беларусы праявілі мужнасць і адвагу. Прыклад мужнасці праявілі таксама мабілізаваныя беларусы ў баях на ўзбярэжжы Гдыні, пры абароне Модліна і Хеля.

Гераічнай старонкай удзелу беларусаў у польска-нямецкай вайне 1939 г. стала абарона Брэсцкай крэпасці. У час верасnёўскіх баёў 1939 г. гарнізон Брэсцкай крэпасці амаль на 40% быў з рэзервістаў-беларусаў, якія замянілі кадравыя часці 9-й, 20-й і 30-й польскіх пяхотных дывізій.

Баі за крэпасць вяліся з 14 па 18 верасня 1939 г. Абаронцы на чале з брыгадным генералам К. Плісоўскім адбілі 7 варожых атак. Аднак, не атрымаўшы падмацавання, гарнізон крэпасці быў вымушаны з 17 на 18 верасня пакінуць пазіцыі і адысці ў паўднёва-заходнім накірунку. Дакладных звестак аб стратах, якія панеслі

абаронцы Брэсцкай крэпасці, няма. З польскіх і нямецкіх крыніц вядома, што польская вайсковая групоўка "Брэст", якая з баямі пакінула крэпасць, налічвала каля 2 тыс. салдат і афіцэраў з ранейшых 4 тыс. абаронцаў. Нямецкі генерал Г. Гудэрыян у сваіх успамінах аб баях за Брэст у 1939 г. адзначыў, што падначаленыя яму войскі ў час штурму крэпасці ўзялі ў палон 8 афіцэраў і 980 салдат і малодшых камандзіраў польскай арміі.

Такім чынам, для беларусаў узброенае змаганне з нямецкімі войскамі пачалося яшчэ амаль за 2 гады да пачатку Вялікай Айчыннай вайны. З 300 тыс. польскіх вайскоўцаў, што трапілі ў нямецкі палон, 40 тыс. назваліся беларусамі. Па меры развіцця нямецкага наступлення ва ўмовах разрыву сувязі паміж воінскімі часцямі многія камандзіры дэмабілізоўвалі салдат.

Загад Э. Рыдз-Сміглы садзейнічаў таму, што ваенных дзе-янняў паміж польскімі і савецкімі войскамі фактычна не было. Згодна з польскімі крыніцамі было зафіксавана каля 40 выпадкаў супраціўлення пагранічных патрулёў, а таксама баі польскіх ваенных фарміраванняў у паласе Беларускага фронту пад Кобрынам, Гродна, Вільнюсам, Сапоцкінам. Найбольш упартыя баі разгарнуліся 20-21 верасня ў Гродне, дзе было забіта 47 чалавек і 156 паранена. Усяго страты Беларускага фронту склалі 316 забітых і 642 параненых.

Некалькі тысяч беларусаў у складзе польскіх ваенных часцей перабралася на Захад, у Францыю, Англію. Немалая іх колькасць апынулася на Захадзе разам з арміяй Андэрса. Беларусы прынялі актыўны ўдзел на франтах Заходняй Еўропы. Яны штурмавалі Монтэ-Касіна ў Італіі, вызвалялі Нарвегію і Францыю. Пасля заканчэння вайны адны з іх засталіся на Заходзе, другія вярнуліся ў Беларусь. Многія з гэтых мужных вайскоўцаў толькі ў 90-х гадах атрымалі баявыя ўзнагароды і прызначаныя ім урадамі Польшчы і іншых еўрапейскіх дзяржаў.

**Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР. У** ходзе ваеннай аперацыі 1939 г. войскі Беларускага фронту 19 верасня занялі Вільна. Брэст і Беласток, занятыя да гэтага часу нямецкімі войскамі, 22 верасня былі перададзены савецкаму камандаванню. 24 верасня войскі Чырвонай Арміі занялі Маларыту, дзе было інтэрніравана да 6 тыс. польскіх вайскоўцаў, 25 верасня Бельск-Падляску і Браньск. Яшчэ 22 верасня было падпісана савецка-германскае камюніке, згодна з якім дэмаркацыйная лінія паміж германскай і савецкай арміямі павінна была праходзіць уздоўж рэк Піса, Нарэў, Буг, Сан. Аднак гэтая мяжа праіснавала ўсяго адзін тыдзень. У адпаведнасці з сакрэтным дадатковым пратаколам, прыкладзеным да дагавора аб

дружбе і мяжы паміж СССР і Германіяй ад 28 верасня 1939 г., усходняя частка Варшаўскага ваяводства і Люблінскае адыходзілі Германіі. У сферу інтарэсаў савецкай дзяржавы ўключалася тэрыторыя Літвы.

У канчатковым варыянце савецка-германскіх перамоў да заходнебеларускіх этнічных зямель былі далучаны заходнія паветы Беластоцкага ваяводства з пераважна польскім насельніцтвам (без Сувалкаўскага павета і большай часткі Аўгустоўскага), а таксама поўнасцю Ломжынскі павет, усходнія часткі Астралэнцкага і Востраў-Мазавецкага паветаў Варшаўскага ваяводства.

Большасць сялян, рабочых, рамеснікаў, інтэлігенцыі Заходняй Беларусі сустракалі Чырвоную Армію як вызваліцельніцу. Яшчэ да прыходу савецкіх вайсковых часцей у некаторых месцах ствараліся партызанскія атрады, адбывалася раззбраенне паліцыі, асаднікаў. У сёлах і мястэчках фарміраваліся рэўкамы, якія бралі ўладныя функцыі.

Амаль адначасова з прасоўваннем войскаў Чырвонай Арміі ў глыб Заходняй Беларусі пачалася праца па наладжванню новага ладу жыцця. У ваяводствах і ўсіх павятовых цэнтрах былі створаны часовыя ўпраўленні, як органы новай улады, у сельскай мясцовасці – сялянскія камітэты. Часовыя ўпраўленні ўводзілі на фабрыках і заводах камітэты рабочага кантролю, забяспечвалі насельніцтва харчаваннем, наладжвалі медыцынскае абслугоўванне, рэгулявалі цэны на тавары і прадукты, вялі барацьбу са спекуляцыяй, адчынялі школы. Часовыя ўпраўленні з'яўляліся цэнтрамі палітычнага, гаспадарчага і культурнага жыцця краю. Пры іх ствараліся атрады рабочай гвардыі.

Сялянскія камітэты дзялілі памешчыцкую, асадніцкую, царкоўную землі, бралі на ўлік маёмасць, інвентар, жывёлу і запасы збожжа ў маёнтках. Малазямельныя і беззямельныя сяляне атрымалі 431 тыс. га ворнай зямлі, 14 тыс. коней і 33,4 тыс. кароў, ім выдзелілі зерне на пасеў. У выніку было ліквідавана памешчыцкае землеўладанне, значна павялічылася серадняцкая праслойка ў вёсцы.

Ужо восенню 1939 г. было адкрыта шмат новых школ. У 1940 г. у заходніх абласцях працавалі 5643 сярэднія, сямігадовыя і пачатковыя школы, з іх 4278 – з беларускай мовай навучання. Дзесяткі тысяч дзяцей сялян і рабочых пайшлі вучыцца ў школы. Адкрыліся бальніцы, амбулаторыі, медыцынскія пункты, якія бясплатна абслугоўвалі насельніцтва.

20 верасня арганізацыйна-інструктарскі аддзел ЦК склаў спісы работнікаў для часовых упраўленняў, былі падабраны кандыдатуры

на кіруючыя партыйныя і савецкія пасады. Усяго да кастрычніка 1940 г. на працу ў Беластоцкую вобласць было накіравана 12 396 чал., Брэсцкую – 5989.

Практычна ўсе асноўныя пытанні краю вырашаліся ў Маскве. Аб гэтым сведчыць пастанова Палітбюро ЦК УКП(б) ад 1 кастрычніка 1939 г. "Пытанні Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны", якая складалася з 33 пунктаў. Пастанова абавязвала склікаць Украінскі і Беларускі Народныя сходы з выбарных, вызначала змест рашэнняў, якія павінны былі прымацца на сходах.

Для правядзення выбараў было створана 929 акруг па прынцыпу: 5 тыс. выбаршчыкаў на акругу. Права вылучэння кандыдатаў у дэпутаты Народнага сходу атрымалі Часовыя ўпраўленні, сялянскія камітэты, сходы рабочых на прадпрыемствах і байцоў рабочай гвардыі, а таксама прадстаўнікоў інтэлігенцыі.

Выбары ў Народны сход праводзіліся пры надзвычай высокай палітычнай актыўнасці насельніцтва краю. Гэта быў усенародны плебісцыт, пераважная большасць удзельнікаў якога выказалася ў падтрымку ўсталявання Савецкай улады, палітыкі правядзення радыкальных сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў, за ўз'яднанне беларускага народа ў адзінай нацыянальнай дзяржаве. У выбарах 22 кастрычніка з агульнай колькасці 2763 190 выбаршчыкаў у галасаванні ўдзельнічала 2672280 чалавек (96,71%). Было абрана 929 дэпутатаў. Супраць галасавалі 247 245 выбаршчыкаў (9,3%), Прызнаны несапраўднымі 14 932 бюлетэні. У двух выбарчых акругах Высока-Мазавецкага павета кандыдаты не атрымалі большасці, і выбары былі праведзены паўторна. Мела месца выстаўленне кандыдатаў, незалежна ад прапанаваных уладамі, спробы зрыву перадвыбарных сходаў.

Сярод абраных дэпутатаў Народнага сходу пераважалі былыя актыўныя ўдзельнікі рэвалюцыйна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі: П. Дзмітрук, В. Каляда, В. Ласковіч, І. Малец, С. Малько, М. Машара, С. Пацяруха, П. Пестрак, М. Піскун, С. Прытыцкі, В. Пырко, І. Райскі, Ф. Савіцкі, М. Серада, А. Свяргун, Р. Сяржант, А. Федасюк, У. Царук, Г. Шагун, Л. Шайкоўскі і інш. Некаторыя з іх у якасці палітзняволеных правялі па 10 і больш гадоў у турмах Польшчы. Па сацыяльнаму складу сярод абраных дэпутагаў пераважалі црадстаўнікі сялянства – 563, рабочых – 197, інтэлігенцыі – 112, служачых – 29, саматужнікаў – 25. Сярод іх беларусаў налічвалася 621, палякаў – 127, яўрэяў – 72, украінцаў – 53, рускіх – 43 і 13 прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцяў. Пасяджэнні Народнага сходу пачаліся 28 кастрычніка ў гарадскім тэатры Беластока ў святочнай

атмасферы. На сходзе прысутнічалі прадстаўнікі ўрада БССР, народныя паэты Беларусі Я. Купала, Я. Колас. Па дакладу дэпутата С. Прытыцкага, якога польскія ўлады ў 1936 г. прыгаварылі двойчы да смяротнага пакарання, сход 29 кастрычніка адзінагалосна прыняў дэкларацыю аб народнай уладзе. У ёй абвяшчалася аб устанаўленні Савецкай улады на тэрыторыі Заходняй Беларусі, якая будзе "належаць працоўным горада і вёскі ў асобе Саветаў дэпутатаў працоўных". Таксама адзінагалосна была прынята дэкларацыя аб уваходжанні Заходняй Беларусі ў склад БССР. У ёй змяшчаўся зварот да Вярхоўных Саветаў СССР і БССР аб прыняцці Заходняй Беларусі ў склад Савецкага Саюза і Беларускай ССР, аб'яднанні беларускага народа ў адзіную дзяржаву ў мэтах "пакласці канец раз'яднанню беларускага народа".

У апошні дзень работы сходу 30 кастрычніка таксама адзінагалосна былі прыняты дэкларацыі аб нацыяналізацыі банкаў і буйной прамысловасці і канфіскацыі памешчыцкіх зямель. Сход выбраў паўнамоцную камісію ў складзе 66 чалавек для паездкі ў Маскву, каб перадаць рашэнне адносна ўступлення Заходняй Беларусі ў склад Савецкага Саюза. 17 верасня Народны сход абвясціў Днём усенароднага свята.

Нечарговая пятая сесія Вярхоўнага Савета СССР на апошнім пасяджэнні 2 лістапада прыняла Закон аб уключэнні Заходняй Беларусі ў склад СССР і аб'яднанні з БССР. Працэс юрыдычна-прававога афармлення прыняцця Заходняй Беларусі ў склад БССР быў завершаны 12 лістапада 1939 г. на нечарговай трэцяй сесіі Вярхоўнага Савета БССР.

Тэрыторыя, якая ўвайшла ў склад Беларускай ССР, складала амаль 100 тыс. $км^2$ з насельніцтвам 4,7 млн. чалавек. Плошча БССР павялічылася да 225,6 тыс. $км^2$, а насельніцтва да 10,3 млн. чалавек. 5 снежня 1939 г. Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР увёў новае адміністрацыйна-тэрытарыяльнае дзяленне. Было створана 5 абласцей: Баранавіцкая, Беластоцкая. Брэсцкая, Вілейская, Пінская і 101 раён у разліку на 35-50 тыс. жыхароў. Канчатковае фарміраванне органаў улады завяршылася толькі ў канцы года, калі адбыліся выбары ў сельскія, раённыя, гарадскія, абласныя Саветы дэпутатаў працоўных.

Але разам са станоўчымі момантамі ў жыцці жыхароў краю паявіліся некаторыя праблемы. У шэрагу выпадкаў накіраваныя на працу ў Заходнюю Беларусь работнікі ігнаравалі мясцовы лад жыцця, традыцыі насельніцтва. Здаралася неабгрунтаванае адхіленне ад працы спецыялістаў польскай нацыянальнасці, прымусовая рэарганізацыя

польскіх школ у беларускія ці рускія, ігнараванне патрэб гаспадарак аднаасобнікаў.

Адмоўна была ўспрынята жыхарамі Заходняй Беларусі передача Сталіным Літве 10 кастрычніка 1939 г. Вільгі і вобласці (Віленска-Трокскі, частка тэрыторыі Свянцянскага і Браслаўскага паветаў) агульнай плошчай 6900 км$^2$.

БССР у перадваенныя гады. За два перадваенныя дзесяцігоддзі БССР дасягнула значных поспехаў у развіцці народнай гаспадаркі, культуры і адукацыі. Яна ператварылася з аграрнай у індустрыяльна-аграрную краіну. З'явіліся машынабудаўнічая, дрэваапрацоўчая, тэкстыльная і іншыя новыя галіны прамысловасці.

Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР паскорыла эканамічнае развіццё гэтага рэгіёна. На прамысловае будаўніцтва ў заходніх абласцях былі асігнаваны значныя сумы. Аднаўляліся і пашыраліся прамысловыя прадпрыемствы, вялося будаўніцтва новых. Праз год пасля ўз'яднання ў заходніх абласцях рэспублікі дзейнічалі 392 прадпрыемствы, на кожным з якіх працавала рабочых больш чым па 20 чалавек. Аб'ём прамысловай прадукцыі павялічыўся ў канцы 1940 г. амаль у 2 разы ў параўнанпі з 1938 г. і склаў 27,6% прамысловай вытворчасці рэспублікі. У другой палове 1940 г. у заходніх абласцях пачалося інтэнсіўнае будаўніцтва аэрадромаў, мастоў, віядукаў, пад'язных дарог.

Улічваючы прыіранічнае размяшчэнне рэспублікі, Савецкае кіраўніцтва ў мэтах ўмацавання абараназдольнасці надавала асаблівае значэнне развіццю транспарту. У кастрычніку 1939 г. была прынята пастанова ЦК УКП(б) і Саўнаркама СССР аб перакладцы чыгуначнага палатна Негарэлае-Брэст, а таксама Львоў-Перамышль і павелічэнні іх прапускной здольыіасці. Працягласць чыгункі на тэрыторыі БССР у 1940 г. дасягнула 5,7 тыс. км супраць 3,8 тыс. км у 1913 г. За кароткі час была рэканструявана ўся чыгуначная гаспадарка. Грузаабарот беларускай чыгункі ў параўнанні з 1913 г. павялічыўся ў 4 разы. Рачны флот папоўніўся новымі буксірамі і самаходнымі суднамі. Была створана сетка суднарамонтных і суднабудаўнічых верфяў.

Адначасова праходзіла будаўніцтва новых і рэканструкцыя старых аўтамабільных дарог. Даўжыня аўтадарог з цвёрдым пакрыццём перавысіла 11 тыс. км. Шашэйныя дарогі звязалі Мінск з абласнымі і многімі раённымі цэнтрамі. Ішоў бесперапынны працэс папаўнення аўтамабільнага парка рэспублікі новымі машынамі. Напярэдадні вайны аўтапарк Беларусі налічваў звыш 21 тыс. аўтамабіляў.

Разам з тым прамысловасць Беларусі перад вайной сутыкнулася з пэўнымі цяжкасцямі і складанасцямі. Павялічылася колькасць недабудаваных прамысловых і сацыяльных аб'ектаў. Многія прадпрыемствы працавалі нерытмічна. У 1940 г. прамысловасць будаўнічых матэрыялаў, папяровая і лясная галіны не выканалі пастаўленых планаў.

У канцы 30-х гадоў удалося стабілізаваць становішча ў сельскай гаспадарцы. Партыйныя камітэты набылі вопыт кіравання і арганізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці. Удалося падрыхтаваць кадры дырэктараў МТС, старшынь калгасаў. У 1941 г. на палях 10 тыс. калгасаў працавала больш за 13 тыс. трактароў, 1590 камбайнаў, каля 3 тыс. сеялак, 1340 бульбасаджалак і бульбакапалак, звыш 1240 ільноцерабілак. У сельскай гаспадарцы рэспублікі ў 1940 г. працавала больш за 6 тыс. грузавых аўтамабіляў. Дзякуючы гэтаму тэхнічнаму парку ўдалося павысіць ураджайнасць сельскай гаспадарчай вытворчасці. Павялічылася і пагалоўе жывёлы.

Аднак працэс механізацыі ў сельскай гаспадарцы стрымліваўся недахопамі ў рабоце машынна-трактарных станцый. Адчуваўся значны недахват механізатараў, не хапала кадраў спецыялістаў.

Партыйна-савецкае кіраўніцтва не ставіла задачу суцэльнай калектывізацыі на далучаных тэрыторыях. У адносінах да заможных сялян праводзілася палітыка абмежавання шляхам павышэння грашовых і натуральных падаткаў. Былі ўстаноўлены нормы землекарыстання ў памеры 10, 12 і 15 га зямлі ў залежнасці ад урадлівасці глебы і складу сям'і. Адначасова ўжо з восені 1939 г. пачалося фарміраванне калгасна-саўгаснай сістэмы. Калгасы і саўгасы ствараліся на аснове маёмасці памешчыкаў. У калгасы запісваліся маламаёмасныя слаі сялянства, бо бачылі ў гэтым выйсце, як выратавацца ад беднасці. Да чэрвеня 1941 г. была створана 1115 калгасаў і 28 саўгасаў, якія аб'ядноўвалі каля 7% гаспадарак і 7,8% зямлі. Іх абслугоўвалі 101 МТС, у якіх налічвалася 997 трактароў, 368 сеялак і 193 аўтамашыны.

Галоўнай праблемай беларускай вёскі ў даваенны час было тое, што калектыўныя гаспадаркі былі рэзка абмежаваны ў самастойнасці. Сістэма дырэктыўнага планавання, абавязковыя пастаўкі прадукцыі дзяржаве, бюракратычнае камандаванне калгасамі – вось асноўныя прычыны іх маруднага развіцця.

Афіцыйная статыстыка ў даваенныя гады паказвала рост рэальных даходаў працоўных. Аднак матэрыяльнае становішча ўсіх слаёў савецкага грамадства, у тым ліку і насельніцтва Беларусі, не палепшылася. У параўнанні з перыядам нэпа беларускі селянін у

канцы 30-х гг. меней ужываў хлеба, мяса, малака. Цэны на збожжа і шэраг іншых прадуктаў харчавання не кампенсавалі выдаткаў на іх вытворчасць. Яны былі ў 10-12 разоў ніжэйшыя за рыначныя. Пагоршылася становішча і гарадскога насельніцтва. Індэкс рознічных цэн у 1940 г. быў у 6,3 раза вышэйшы ў параўнанні з 1928 г., павялічыліся цэны на асноўныя харчовыя прадукты, прамысловыя тавары. Рэальная заработная плата дасягнула ўзроўню 1928 г. толькі ў 1940 г.

Сваю незадаволенасць выказвалі жыхары заходніх абласцей Беларусі. У першыя месяцы Савецкай улады матэрыяльнае становішча сельскага насельніцтва выразна палепшылася. Паўплывала на гэта галоўным чынам змяншэнне павіннасцяў, зніжэнне цэн на прамысловыя тавары. Мясцовыя органы ўлады дазвалялі сялянам (бясплатна ці танна) карыстацца былымі панскімі лясамі для будаўніцтва жылля або гаспадарчых пабудоў. Але даступнасць да танных тавараў аказалася кароткатэрміновай. Пасля некалькіх месяцаў, калі вычарпаліся запасы на былых польскіх складах і былі абмежаваны пастаўкі прамысловых тавараў з СССР, узніклі забытыя тут чэргі.

Вялікай памылкай з'явілася нацыяналізацыя аб'ектаў гандлю, дробных прадпрыемстваў. Гэта прывяло да дэфіцыту тавараў шырокага спажывання, росту цэн на іх.

Вядома, што паспяховае развіццё эканомікі, абараназдольнасць краіны непасрэдна залежаць ад стану развіцця адукацыі і навукі. Невыпадкова ў 1940 г. у Беларусі студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў у разліку на 10 тыс. жыхароў было больш, чым у Англіі, Германіі, Францыі і Італіі; БССР мела 51 навукова-даследчую ўстанову. Значная ўвага ўдзялялася ахове здароўя насельніцтва. У гарадах і вёсках БССР працавала каля 5 тыс. урачоў, што амаль у 5 разоў больш, чым да рэвалюцыі. На тэрыторыі рэспублікі працавалі звыш 4 тыс. масавых бібліятэк, 20 тэатраў, 4 тыс. клубаў і 25 музеяў.

У Заходняй Беларусі, дзе практычна адсутнічалі вышэйшыя навучальныя ўстановы, у 1940 г. пачалі працаваць педагагічны і вячэрні настаўніцкі інстытуты ў Беластоку, настаўніцкія інстытуты ў Гродне, Баранавічах і Пінску, настаўніцкія курсы ў Брэсце, Маладзечне і Лідзе. Функцыяніравала таксама 8 медыцынскіх і 7 народнагаспадарчых тэхнікумаў. Працавалі 5 драматычных тэатраў, 220 бібліятэк, 100 кінатэатраў, 92 дамы культуры.

У адпаведнасці з патрабаваннямі часу кіраўніцтва Беларусі імкнулася шырока разгарнуць дзейнасць грамадскіх абарончых арганізацый. Толькі ў Асаавіяхіме ў 1940 г. налічвалася звыш 200 тыс. чалавек, было падрыхтавана напярэдадні вайны каля 500

парашутыстаў, 6450 кулямётчыкаў, 500 снайпераў, а таксама 720 тыс. "варашылаўскіх стралкоў" і значкістаў "Гатоў да працы і абароны", "Гатоў да проціпазетранай і проціхімічнай абароны". Аэраклубы БССР толькі ў 1939 г. падрыхтавалі 1112 лётчыкаў. Праўда, якасны стан работы жадаў лепшага. Падзеі Вялікай Айчыннай вайны паказалі, што ваенна-эканамічны патэнцыял краіны не быў выкарыстаны ў поўнай меры для ўмацавання абараназдольнасці.

Напружанасць у грамадстве выклікалі арышты і дэпартацыі ў заходніх абласцях рэспублікі. Яшчэ ў канцы верасня 1939 г. былі арыштаваны вядомыя беларускія нацыянальныя дзеячы – А. Луцкевіч, В. Багдановіч, У. Самойла, Ян Пазняк, Ад. Станкевіч, М. Касцевіч і іншыя, якія не прымалі сацыялістычнай ідэі, але актыўна ўдзельнічалі ў вызваленчым руху. Згодна з рашэннем кіраўніка НКУС СССР Л. Берыі ад 5 снежня з заходніх абласцей Беларусі высяленню падлягалі работнікі лясной аховы і ваенныя асаднікі. З лютага 1940 г. па 20 чэрвеня 1941 г. было рэпрэсіравана больш як 125 тыс. чалавек. Сярод дэпарціраваных былі не толькі асаднікі, работнікі лясной аховы, члены іх сямей, але арыштаваныя раней паліцэйскія, жандармы, фабрыканты, памешчыкі і асобы, якія падазраваліся ў прыналежнасці да антысавецкіх арганізацый.

Складаным было і ваенна-палітычнае становішча на Беларусі ў 1939-1941 гг. З восені 1939 г. у заходніх раёнах Беларусі пачало дзейнічаць польскае падполле, якое імкнулася адрадзіць польскую дзяржаву ў даваенных межах. Самай уплывовай падпольнай арганізацыяй быў "Саюз узброенай барацьбы". Сумесна з арганізацыямі "Саюз польскіх патрыётаў", "Стральцы", "Сокал", "Вызваленцы", "Партызанка" вялі антысавецкую прапаганду, стваралі тайныя арсеналы зброі, праводзілі асобныя тэрарыстычныя акты супраць ваеннаслужачых Чырвонай Арміі, супрацоўнікаў НКУС і актывістаў савецкіх устаноў. Напрыклад, у час аднаго з мерапрыемстваў у гарадскім Доме культуры Аўгустова Беластоцкай вобласці, у якім удзельнічалі мясцовая моладзь і савецкія ваеннаслужачыя, баявікі з польскага падполля кінулі ў вокны некалькі гранат. У выніку – шмат ахвяр.

Загадзя рыхтаваўся да вайны і нямецкі бок. На плануемым тэатры баявых дзеянняў немцы стварылі шырокую разведвальную сетку. Склалася вельмі напружанае становішча на дзяржаўнай граніцы. Толькі на ўчастку 17-га Брэсцкага пагранатрада (працягам у 180 км) у 1940 г. затрымана 1242 варожыя лазутчыкі і дыверсанты. Многія агенты здолелі прабрацца на тэрыторыю БССР і стварыць там

свае дыверсійныя цэнтры. Асабліва актывізавалася нямецкая разведка ў чэрвені 1941 г. Пераапранутыя ў грамадзянскае адзенне або уніформу міліцыі, узброеных сіл, яны вялі збор разведвальнай інфармацыі, парушалі камунікацыі сувязі, сеялі чуткі і паніку сярод насельніцтва. За некалькі гадзін да пачатку вайны 21 чэрвеня 1941 г. нямецкія дыверсійныя групы пашкодзілі амаль усе лініі вайсковай сувязі ў прыгранічных раёнах. У выніку была страчана сувязь армейскіх, карпусных, дывізійных і нават палкавых штабоў з вайсковымі часцямі і падраздзяленнямі. Безумоўна, усё гэта адбілася на ходзе баявых дзеянняў на пачатку Вялікай Айчыннай вайны.

ЛЕКЦЫЯ 23
# НЯМЕЦКАЯ АКУПАЦЫЯ БЕЛАРУСІ

- *Напад Германіі на СССР*
- *Акупацыйны рэжым*
- *Калабарацыя на Беларусі*

**Напад Германіі на СССР.** Вядома, што з першых дзён свайго прыходу да ўлады А. Гітлер паставіў задачу ўзяць рэванш за паражэнне Германіі ў Першай сусветнай вайне, кампенсаваць панесеныя краінай страты. Хаця СССР не лічыўся краінай-пераможцай і не з’яўляўся першачарговай перашкодай германскім планам, урад Гітлера ўсё ж улічваў, што, па меры ўзмацнення Германіі, яе палітычныя і эканамічныя інтарэсы раней ці пазней сутыкнуцца з непасрэднымі інтарэсамі СССР. Таму ў германскіх кіруючых колах пачаў распрацоўвацца план вайны супраць СССР, які ў снежні 1940 г. быў зацверджаны пад назвай "Барбароса". Дырэктыва Вярхоўнага камандавання германскіх узброеных сіл № 32 ад 11 чэрвеня 1941 г. сведчыць аб намеры правядзення шырокай каланіяльнай экспансіі ў Еўропе, Афрыцы, на Бліжнім Усходзе, Міжземнамор'і і іншых раёнах свету. Неабходнай перадумовай для дасягнення сусветнага панавання быў разгром СССР.

Другая прычына пачатку Вялікай Айчыннай вайны – ідэалагічная. Распачынаючы савецка-германскую вайну, германскі фашызм спадзяваўся знішчыць савецкі дзяржаўны лад, камуністычную ідэалогію, як найбольш варожую і небяспечную для яго палітычную плынь сусветнага маштабу.

Адной з істотных прычын, якія прывялі да савецка-германскай вайны, з'яўляецца таксама знешняя палітыка Англіі, Францыі і ЗША напярэдадні вайны. Яны імкнуліся ўцягнуць Германію і СССР у вайну паміж сабой, стымулявалі гітлераўскі ўрад да агрэсіі на Усходзе.

Свой уклад у абвастрэнне адносін паміж СССР і заходнімі краінамі ўнесла кіраўніцтва Камінтэрна. Чацвёрты кангрэс Камінтэрна ў 1936 г. паставіў перад кампартыямі галоўную задачу: пры ўсіх абставінах перш за ўсё бараніць "дзяржаву рабочых і сялян", г. зн. Савецкі Саюз. Гэтая палітыка, канешне, не засталася па-за ўвагай заходніх дзяржаў.

22 чэрвеня 1941 г. на світанку нямецкія ўзброеныя сілы атакавалі дзяржаўную граніцу СССР ад Чорнага да Баранцава мораў.

Асабліва трагічная абстаноўка ў першыя дні і нават гадзіны Вялікай Айчыннай вайны склалася для савецкіх войскаў на Беларусі.

Тут на 450-кіламетровым участку дзяржаўнай граніцы германскае ваеннае камандаванне выкарыстала сваю самую магутную групоўку войскаў – групу армій "Цэнтр" (камандуючы генерал-фельдмаршал фон Ф. Бок). Групоўка "Цэнтр" налічвала 50 дывізій, укамплектаваных па штату ваеннага часу (з іх 9 танкавых і 6 матарызаваных), або 820 тыс. салдат і афіцэраў, 1800 танкаў, 14 300 гармат і мінамётаў, 1680 баявых самалётаў.

Германскім войскам з савецкага боку супрацьстаялі войскі Заходняй Асобай ваеннай акругі, якая 22 чэрвеня 1941 г. стала называцца Заходнім фронтам (камандуючы генерал арміі Д.Р. Паўлаў да 30 чэрвеня 1941 г.). У колькасных адносінах Заходні фронт складаў 44 дывізіі (24 стралковых, 12 танкавых, 6 матарызаваных і 2 кавалерыйскія), 3 брыгады, 8 умацаваных раёнаў і Пінская ваенная флатылія. Агульная колькасць войскаў Заходняга фронту складала 627 300 салдат і афіцэраў, 2202 танкі, 10 087 гармат і мінамётаў, 1789 баявых самалётаў. Пры гэтым адзначым, што самалётаў новых канструкцый (МІГ-3 і ЯК-1) на ўзбраенні савецкіх войскаў у Беларусі было толькі 303 адзінкі, танкавы парк Заходняй Асобай ваеннай акругі налічваў 383 машыны маркі КВ і Т-34.

Пралікі ў палітыцы кіраўніцтва СССР у перадваенны час у значнай ступені абумовіла трагедыю краіны і яе ўзброеных сіл у першыя месяцы савецка-германскай вайны. Рэпрэсіі супраць афіцэрскіх кадраў Чырвонай Арміі ў канцы 30-х гг. пазбавілі Узброеныя Сілы краіны больш за 40 тыс. чалавек, сярод якіх было 7 з 9 маршалаў, 600 генералаў (для параўнання: у гады Вялікай Айчыннай вайны страты савецкага генералітэту склалі 423 чалавекі). Маршал Савецкага Саюза А.М. Васілеўскі, згадваючы гэтыя абставіны пасля вайны, зазначыў, што каб не масавыя рэпрэсіі камандуючых кадраў, то, "мабыць, і не было б увогуле вайны ў сорак першым годзе". Германская разведка і генштаб добра ведалі пра становішча і цалкам выкарысталі ўсе сродкі, каб здзейсніць свае планы ў 1941 г.

Сталін і яго паплечнікі, безумоўна, рыхтаваліся да вялікай вайны. Уся палітыка індустрыялізацыі была скіравана на стварэнне цяжкай прамысловасці, ваенна-прамысловага комплексу. У канцы 30-х гг. распачалося пераўзбраенне арміі, значна павялічана яе колькасць, тэрмін ваеннай службы працягнуты да трох гадоў.

Аднак кіраўнікі Савецкага Саюза далёка не ў поўнай меры скарысталі тыя перавагі, што меліся ў іх. Не быў выкарыстаны такі важны тэрытарыяльны фактар, як далучэнне да СССР Заходняй Беларусі, Заходняй Украіны і Прыбалтыкі, калі граніца СССР адсунулася далёка на Захад. Распачатае будаўніцтва абарончых

аб'ектаў на новай савецка-германскай мяжы ішло марудна, прычым адначасова суправаджалася актыўным дэмантажом аналагічных умацаванняў на старой савецка-польскай дзяржаўнай мяжы. Напярэдадні вайны войскі Чырвонай Арміі нават не былі прыведзены ў стан баявой гатоўнасці ў адпаведнасці з патрабаваннямі часу.

Сталін меў рацыю, калі лічыў, што Германія не можа выйграць вайну ў Еўропе на два франты. На Захадзе яе моцным праціўнікам заставалася Англія, якая да таго ж карысталася падтрымкай ЗША. Суадносіны сіл паміж Германіяй і СССР не давалі падстаў спадзявацца на хуткую і лёгкую перамогу Германіі. А па ацэнках савецкага Генштаба суадносіны ўвогуле былі на карысць СССР.

Сталін ігнараваў верагоднасць хуткага нападу гітлераўскай Германіі на Савецкі Саюз. Данясенні савецкіх разведчыкаў, дзе ўказваліся дні і нават гадзіны пачатку вайны, патанулі ў хвалі нямецкай дэзінфармацыі. Быў стратэгічны пралік у тэрмінах магчымага пачатку вайны, зроблены асабіста Сталіным і яго акружэннем.

Савецкія войскі на пачатку вайны не былі гатовыя да адбіцця нападу фашысцкай Германіі. Дырэктыва Наркамата абароны і Генштаба, накіраваная позна вечарам у ваенныя акругі 21 чэрвеня "быць у поўнай баявой гатоўнасці, сустрэць магчымы раптоўны ўдар немцаў або іх саюзнікаў", ужо нічога не магла вырашыць. Адначасова ў гэтай дырэктыве гаварылася, што нападзенне можа пачацца з правакацыйных дзеянняў, "Задача нашых войскаў – не паддавацца ніякім правакацыйным дзеянням, якія могуць выклікаць вялікія ўскладненні...".

Галоўны ўдар па савецкіх войсках у Беларусі германская армія нанесла ў раёнах Брэста і Гродна ў паласе абароны 3-й і 4-й савецкіх армій. Тут колькасць нямецкіх войскаў у жывой сіле і тэхніцы пераўзыходзіла савецкія войскі ў 5 разоў. Гэтыя два ўдарныя кулакі павінны былі зламаць супраціўленне Чырвонай Арміі з наступным выхадам на аператыўную прастору і авалоданнем гарадамі Мінск і Смаленск.

З самага пачатку нападу германскія войскі адчулі на сабе моц супраціўлення, чаго яны не сустракалі ў час ваенных дзеянняў у Еўропе. Ужо ў першыя гадзіны інтэрвенцыі на Гродзенскім напрамку для нямецкіх войскаў склалася неспрыяльная абстаноўка. Нягледзячы на тое, што часці Чырвонай Арміі 23 чэрвеня 1941 г. пакінулі Гродна і адышлі за раку Нёман, 29-я танкавая дывізія контратакавала праціўніка і адкінула яго на некалькі кіламетраў на захад. Тэмп германскага наступлення ўдалося замарудзіць. Генерал-інспектар пяхоты От паведамляў галоўнаму камандаванню вермахта аб баях у

раёне Гродна наступнае: "Упартае супраціўленне рускіх прымушае нас весці бой па ўсіх правілах нашых баявых статутаў. У Польшчы і на Захадзе мы маглі дазваляць сабе пэўныя вольнасці і адыходы ад статутных прынцыпаў, цяпер гэта рабіць стала ўжо немагчыма".

На шэрагу ўчасткаў Брэсцкага накірунку, дзе дыслацыраваліся войскі 4-й арміі (камандуючы генерал-маёр А.А. Карабкоў), нямецкія войскі таксама сустрэлі ўпартае супраціўленне. Асабліва жорсткія баі вяліся ў раёне Брэсцкай крэпасці. Колькасць абаронцаў крэпасці. што на доўгі час прыкавала 45-ю, 31-ю і 34-ю нямецкія пяхотныя і 2-ю танкавую дывізіі, складала ўсяго каля 4 тыс. байцоў. Праціўнік меў амаль у дзесяць разоў большую перавагу. Гарнізон крэпасці з першых гадзін вайны змагаўся ў поўным акружэнні. Баі ў Брэсцкай крэпасці працягваліся да канца ліпеня 1941 г.

Мужна змагаліся з ворагам пагранічнікі. Яны з гонарам выканалі свой воінскі абавязак. Прыклады гераізму паказалі абаронцы мяжы з 17-га Брэсцкага пагранатрада. Да канца стаялі байцы 86-га Аўгустоўскага, 87-га Ломжынскага і 88-га Шапятоўскага пагранатрадаў. Гераічна змагаліся пагранічнікі заставы пад камандаваннем лейтэнанта В.М. Усава. Яны 10 гадзін вялі няроўны бой з пераважаючымі сіламі праціўніка.

І ўсё ж, нягледзячы на ўпартае супраціўленне часцей Заходняга фронту, войскі вермахта за два дні прасунуліся ў глыб тэрыторыі Беларусі больш чым на 100 кіламетраў.

У першыя дні вайны быў дапушчаны стратэгічны пралік савецкага ваеннага камандавання. На Беластоцкім выступе было сканцэнтравана 26 савецкіх дывізій, у тым ліку 8 танкавых і 4 матарызаваных (каля 2 тыс. танкаў і 350 тыс. салдат і афіцэраў). Флангавыя ўдары германскіх войскаў на Брэсцкім і Гродзенскім напрамках прывялі да таго, што гэтыя сілы трапілі ў аператыўнае акружэнне і амаль не паўплывалі на падзеі ў заходніх прыгранічных раёнах Беларусі ў пачатку вайны.

26 чэрвеня 1941 г. нямецкія механізаваныя часці ўжо падступілі да сталіцы Беларусі. Пачалася бітва за Мінск. Войскі 13-й арміі (камандуючы генерал-лейтэнапт П.М. Філатаў), асабліва 64-я, 108-я, 161-я стралковыя дывізіі ўтрымлівалі рубяжы да 28 чэрвеня. Гераічна змагаліся воіны 100-й стралковай дывізіі пад камандаваннем генерал-маёра І.М. Русіянава, якія ў баях за Мінск знішчылі больш як 100 танкаў і бронемашын праціўніка. Аднак становішча абаронцаў Мінска пагаршалася. З паўднёвага захаду да сталіцы прарваўся 47-мы матарызаваны корпус з групы Гудэрыяна. 28 чэрвеня для войскаў 13-й арміі ўзнікла пагроза акружэння. Адзіным рашэннем у гэтых

умовах быў адвод войскаў арміі на Усходнім напрамку. Лёс Мінска ў ваенна-стратэгічных адносінах быў вырашаны, хаця баі ў горадзе і яго прыгарадах працягваліся яшчэ некалькі дзён.

Трагічнай была абстаноўка і ў самім Мінску ў час яго абароны. На горад часта налятала нямецкая авіяцыя, усё навокал гарэла. Эвакуацыя з горада не праводзілася, кожны ратаваўся як мог. 24 чэрвеня штаб Заходняга фронту, кіраўнікі кампартыі і ўрада рэспублікі накіраваліся ў г. Магілёў. Аб тым, наколькі спешным быў ад'езд, сведчыць той факт, што не эвакуіравалі нават архіў Савета Народных Камісараў БССР, а Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета Н.Я. Наталевіч у спешцы не паспеў забраць са свайго сейфа спіскі членаў урада, кіруючых работнікаў Вярхоўнага Савета, ЦК ЛКСМБ з указаннем хатніх адрасоў і пералічэннем членаў іх сем'яў. Гэтыя дакументы каштавалі жыццяў многіх людзей.

Са стратай Мінска ў акружэнне трапілі войскі 3-й, 4-й, 10-й і значная частка сіл 13-й савецкіх армій. Па звестках нямецкага камандавання ў аперацыях пад Беластокам, Брэстам і Мінскам часці вермахга захапілі ў палон 330 тыс. ваеннаслужачых, больш за 3000 гармат і 3332 танкі, а таксама шмат боепрыпасаў і вайсковай маёмасці. У выніку гэтага баяздольнасць Заходняга фронту істотна паменшылася.

Між тым праціўнік працягваў тараніць танкавымі клінамі савецкую абарону на асобных участках фронту. Але з кожным днём супраціўленне Чырвонай Арміі ўзмацнялася, і павялічваліся страты вермахта. Нягледзячы на тое, што германскія войскі акружылі савецкую групоўку каля Мінска, спроба з ходу фарсіраваць водны рубеж на Бярэзіне і выйсці да Дняпра не завяршылася поспехам. Баі ў раёне Барысава ішлі тры дні, і толькі 1 ліпеня часці 47-га германскага танкавага корпуса змаглі авалодаць пераправай і прарвацца на ўсходні бераг Бярэзіны.

Упарта абараняліся часці 47-га стралковага корпуса пад камандаваннем генерал-маёра С.І. Паветкіна і 4-га паветрана-дэсантнага корпуса генерал-маёра А.С. Жадава ў раёне Бабруйска. Баі на Бярэзіне далі магчымасць замарудзіць тэмпы руху нямецкіх дывізій. Гэта дазволіла заняць баявыя рубяжы савецкім дывізіям, падцягнутым на лінію Дняпра з цэнтральных раёнаў краіны.

Вельмі напружаныя баі вяліся на Смаленскім накірунку. 12-16 ліпеня цяжкія баі за Оршу вялі войскі 18-й (камандзір палкоўнік П.К. Жывалёў) і 73-й (камандзір палкоўнік А.І. Акімаў) стралковых дывізій са складу 20-й арміі Заходняга фронту, а таксама знішчальны батальён з ліку 1200 мясцовых жыхароў. Пад Оршай 14 ліпеня

ўпершыню нанесла ўдар па ворагу батарэя рэактыўных установак ("кацюш") пад камандаваннем капітана І.А. Флёрава.

З 3 па 26 ліпеня савецкія войскі гераічна абаранялі Магілёў. Каб хутчэй захапіць горад, праціўнік сканцэнтраваў тут 4 пяхотныя і 1 танкавую дывізіі, матарызаваны полк СС "Вялікая Германія" і іншыя вайсковыя фарміраванні. Ім супрацьстаялі часці 61-га стралковага корпуса (камандзір генерал-маёр Ф.А. Бакунін) і байцы народнага апалчэння. Толькі воінамі 172-й дывізіі (камандзір генерал-маёр М.Ц. Раманаў) за 10 дзён баявых дзеянняў было знішчана 179 танкаў і бронетранспарцёраў, каля 4 тыс. салдат і афіцэраў праціўніка. У гэты ж час кровапралітныя баі ішлі на подступах да Віцебска і Гомеля.

Разам з воінамі Чырвонай Арміі на беларускай зямлі супраць захопнікаў змагаліся і дзесяткі тысяч мясцовых жыхароў. На тэрыторыі Віцебскай, Гомельскай, Магілёўскай і Палескай абласцей было створана больш як 200 фарміраванняў народнага апалчэння, якое налічвала 33 тыс. чалавек і 78 знішчальных батальёнаў колькасцю 13 067 чалавек. Гомель абаранялі 6700 апалчэнцаў і 19 знішчальных батальёнаў колькасцю 2643 байцы. Потым частка з іх адышла з часцямі Чырвонай Арміі, на базе некаторых былі створаны партызанскія атрады.

Адначасова з абарончымі баямі камандаванне Чырвонай Арміі летам 1941 г. правяло шэраг наступальных аперацый. З мэтай умацавання сваіх пазіцый на рубяжы рэк Заходняя Дзвіна-Днепр 6 ліпеня 1941 г. войскі 20-й арміі (камандуючы генерал-лейтэнант П.А. Курачкін) сіламі 5-га і 7-га механізаваных корпусаў нанеслі контрудар у напрамку Сянно-Лепель. Адбылася буйнейшая танкавая бітва з пачатку Другой сусветнай вайны, у якой з абодвух бакоў удзельнічала больш як 1500 танкаў і бронемашын. Праціўнік быў адкінуты ў напрамку Лепеля на 30-40 кіламетраў. Нягледзячы на тое, што германскія войскі панеслі тут значныя страты, савецкім войскам дасягнуць пастаўленай задачы ў поўным аб'ёме не ўдалося. 7-мы механізаваны корпус быў спынены войскамі 47-га нямецкага матарызаванага корпуса на подступах да Лепеля, а 5-ты савецкі корпус апынуўся ў складаных умовах аператыўнага акружэння. У ходзе цяжкіх кровапралітных баёў напрыканцы дня 10 ліпеня 1941 г. з акружэння ў раён Оршы выйшла толькі частка савецкіх войскаў, што ўдзельнічалі ў аперацыі.

Другой значнай наступальнай аперацыяй савецкіх войскаў на Беларусі летам 1941 г. з'яўляецца Рагачоўска-Жлобінская аперацыя, праведзеная войскамі 21-й арміі (камандуючы генерал-палкоўнік Ф.І. Кузняцоў). На вастрыні ўдару знаходзіўся 63-ці стралковы корпус пад

камандаваннем генерал-лейтэнанта Л.Р. Пятроўскага. 13 ліпеня ён правёў контрудар, вызваліў гарады Рагачоў і Жлобін. Нямецкія войскі былі адкінуты на 20-30 кіламетраў у напрамку Бабруйска, але ў баі загінуў генерал Пятроўскі. Контрудар войскаў 21-й арміі скаваў сілы 8 нямецкіх дывізій, што не дазволіла ім хутка фарсіраваць Днепр і выйсці на аператыўную прастору ў напрамку Рослаўль-Смаленск.

Баявыя дзеянні часцей Чырвонай Арміі, атрадаў народнага апалчэння і знішчальных батальёнаў на Беларусі выклікалі трывогу ў стаўцы вярхоўнага галоўнакамандавання Германіі.

Нямецкія войскі спынілі наступленне ў канцы ліпеня 1941 г. на Смаленскім напрамку і перайшлі да ўмацавання флангаў групы армій "Цэнтр". У гэтых умовах Гомельскі напрамак набыў выключнае значэнне. Ён прыкрываў стык паміж Заходнім і Паўднёва-Заходнім франтамі. Улічваючы гэту акалічнасць, савецкае камандаванне, каб зручней кіраваць войскамі, 24 ліпеня на базе 21-й і 13-й армій стварыла Цэнтральны фронт. Камандуючым якога быў прызначаны генерал-палкоўнік Ф.І. Кузняцоў.

З самага пачатку войскі створанага фронту апынуліся ў цяжкіх умовах. У першай дэкадзе жніўня нямецкае камандаванне, сканцэнтраваўшы супраць войскаў фронту звыш 25 дывізій, галоўным чынам танкавых і матарызаваных, разгарнула наступленне. Баі за Гомель працягваліся амаль 20 дзён. Пад сценамі горада вермахт страціў звыш 80 тыс. сваіх салдат і афіцэраў, каля 200 танкаў і 100 самалётаў. І толькі ў ноч з 19 на 20 жніўня 1941 г. Гомель быў пакінуты савецкімі войскамі і апалчэнцамі. Да пачатку верасня 1941 г. уся тэрыторыя Беларусі была акупіравана нямецкімі войскамі.

Апраўдваючы няўдачы і страты на пачатковым этапе вайны, кіраўніцтва Савецкага Саюза на чале з Сталіным абвінавацiла ва ўсіх грахах камандаванне Заходняга фронту з яго камандуючым Д.Р. Паўлавым. Военачальнікі былі асуджаны і расстраляны.

У ходзе абарончых баёў войскі Чырвонай Арміі страцілі 1,5 млн. чалавек забітых, параненых і тых, што трапілі ў палон, а таксама 10 тыс. гармат і мінамётаў, 5 тыс. танкаў і 2 тыс. баявых самалётаў. Аднак быў нанесены адчувальны ўрон групе армій "Цэнтр". Вермахт страціў у 1941 г. на Беларусі каля 1000 танкаў і 150 тыс. ваеннаслужачых забітымі і параненымі.

Абарончыя баі ў Беларусі далі магчымасць савецкаму камандаванню разгарнуць войскі другога стратэгічнага эшалона на рубяжы рэк Заходняя Дзвіна-Днепр, дазволілі мабілізаваць непасрэдныя рэзервы краіны, каб даць адпор ворагу. Намечаныя камандаваннем вермахта тэрміны захопу Смаленска і Масквы былі сарваны.

Адначасова з ваеннымі дзеяннямі ішла інтэнсіўная работа па мабілізацыі людскіх і тэхнічных рэсурсаў рэспублікі. неабходных для барацьбы з германскімі захопнікамі. З першага дня вайны раённыя ваенкаматы і пункты мабілізацыі на Беларусі распачалі прызыў усіх рэзервістаў у дзеячую армію.

Звыш 27 тыс. жыхароў беларускай сталіцы з 23 па 27 чэрвеня 1941 г. папоўнілі колькасны склад 2-га і 44-га стралковых корпусаў, якія абаранялі горад. Частка з іх увайшла ў склад 1-га Мінскага палка, які быў сфарміраваны 27 чэрвеня на чыгуначнай станцыі Калодзішчы. Многія з іх загінулі, абараняючы родны горад.

Мабілізацыя прайшла на тэрыторыі Віцебскай, Гомельскай, Магілёўскай і Палескай абласцей. У заходніх абласцях былі прызваны толькі асобныя катэгорыі каманднa-палітычнага складу. Хуткі рух нямецкіх войскаў не дазволіў адпаведным чынам рэалізаваць мабілізацыйны план на ўсёй тэрыторыі рэспублікі. У ліпені-жніўні часці Чырвонай Арміі папоўніліся амаль на 500 тыс. чалавек з ліку прызваных у дзеючую армію жыхароў Беларусі.

Чырвоная Армія атрымала ад гаспадарчых прадпрыемстваў і ўстаноў Беларусі ў чэрвені-жніўні 1941 г. звыш 20 тыс. аўтамашын, каля 10 тыс. трактароў, 35 тыс. коней, 20 тыс. тон прадуктаў харчавання і фуражу. Акрамя таго, на будаўніцтве абарончых аб'ектаў працавалі каля 2 млн. жыхароў Беларусі. За кароткі прамежак часу былі створаны абарончыя рубяжы вакол Магілёва, Гомеля, Віцебска, Оршы, Быхава, а таксама на берагах Дняпра, Заходняй Дзвіны і Сожа. Так, за некалькі дзён жыхары г. Гомеля выкапалі вакол горада процітанкавы роў працягласцю звыш 25 кіламетраў. Штодзённа на будаўніцтве абарончых аб'ектаў горада працавала болей 10 тыс. гамяльчан.

У адпаведнасці з дырэктывай ЦК КП(б)Б аб арганізацыі барацьбы з варожымі дыверсантамі і парашутыстамі ад 23 чэрвеня 1941 г. пачалі ствараць знішчальныя батальёны і атрады самаахововы. 15 ліпеня 1941 г. на тэрыторыі Беларусі ўжо дзейнічала 78 знішчальных батальёнаў (13 067 чал.), 300 атрадаў і груп самаахововы (26 862 чал.). Аднак самаахова была недастаткова забяспечана ўзбраеннем для ўдзелу ў баявых дзеяннях супраць вайсковых фарміраванняў праціўніка.

Насельніцтва Беларусі імкнулася матэрыяльна дапамагчы абаронцам Радзімы. Летам 1941 г. на тэрыторыі рэспублікі распачаўся збор грашовых сродкаў, матэрыяльных каштоўнасцяў і прадуктаў харчавання. Напрыклад, жыхары Гомеля ўнеслі ў фонд абароны больш як 250 тыс. рублёў, 18 тон каляро-вых металаў.

Насельніцтва Палескай вобласці да 12 жніўня 1941 г. сабрала каля 412 тыс. рублёў, а жыхары чатырох раёнаў Магілёўскай вобласці да 9 жніўня – 120 тыс. рублёў.

У ліпені-жніўні 1941 г. было эвакуіравана ў тыл 1,5 млн. спецыялістаў народнай гаспадаркі і членаў іх сямей, 124 буйныя прамысловыя прадпрыемствы, у тым ліку 37 з Віцебскай вобласці, 38 – Гомельскай, 15 –Магілёўскай і 19 – Палескай вобласці. Сярод іх былі "Гомсельмаш", гомельскі станкабудаўнічы імя С.М. Кірава і паравозарамонтны заводы, Магілёўскі завод авіяцыйнага маторабудавання, віцебскія абутковыя фабрыкі "Прагрэс" і "Чырвоны Кастрычнік", Аршанскі льнокамбінат і іншыя. Эвакуіраваныя прадпрыемствы да вайны выраблялі 46,6% усёй электраэнергіі, 40,9% машынабудавання і металаапрацоўкі, 63,7% тэкстылю.

Эвакуіраваныя з Беларусі прадпрыемствы размяшчаліся пераважна ў Паволжы, на Урале, у Сібіры. Рабочыя, інжынерна-тэхнічныя работнікі на новых месцах паказвалі прыклад сапраўднага працоўнага гераізму. Ужо ў пачатку 1942 г. большасць эвакуіраваных беларускіх прадпрыемстваў пачалі выпуск ваеннай прадукцыі, за адзін месяц правялі мантаж абсталявання, перабудавалі тэхналогію вытворчасці і наладзілі, як, напрыклад, гомсельмашаўцы, выпуск у Чалябінскай вобласці мінамётаў. У складаных умовах беларускае сялянства праводзіла эвакуацыю матэрыяльных каштоўнасцяў. Вяскоўцы Віцебскай, Гомельскай, Магілёўскай, Мінскай і Палескай абласцей эвакуіравалі і перадалі насельніцтву звыш 750 тыс. галоў жывёлы з грамадскага сектара ўласнасці. Акрамя таго ў савецкі тыл вывезена 93,6 тыс. Тон збожжа, каля 5 тыс. трактароў, 600 камбайнаў і іншай сельскагаспадарчай тэхнікі. У 1941 г. з Беларусі былі эвакуіраваны 60 навукова-даследчых інстытутаў і лабараторый, 20 вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў, 6 тэатраў.

**Акупацыйны рэжым.** У пачатку верасня 1941 г. на ўсёй тэрыторыі Беларусі ўсталяваўся нямецкі акупацыйны рэжым. Акупацыйная палітыка нямецкіх уладаў была загадзя распрацавана ў "Інструкцыі аб асобных абласцях да дырэктывы № 21" (план "Барбароса"), выдадзенай яшчэ 13 сакавіка 1941 г. На нарадзе вышэйшых службовых асоб 16 ліпеня 1941 г. Гітлер заявіў, што савецкія тэрыторыі павінны быць навечна далучаны да рэйха.

Нямецкія ўлады ўвялі свой адміністрацыйны падзел Беларусі. Частка яе разам з Літвой, Латвіяй, Эстоніяй восенню 1941 г. была ўключана ў склад рэйхскамісарыята "Остланд". Яго адміністрацыйны цэнтр знаходзіўся ў г. Рызе.

Беластоцкую вобласць акупацыйныя ўлады далучылі да Усходняй Прусіі. На гэтан тэрыторыі дзейнічалі нормы нямецкага права. Кіраўніцтва ва ўсіх структурах улады ажыццяўлялі нямецкія чыноўнікі.

Паўднёвыя раёны Брэсцкай, Гомельскай, Палескай і Пінскай абласцей былі далучаны да рэйхскамісарыята "Украіна". Туды ж адышлі гарады Брэст, Пінск, Мазыр, а таксама ўсе раёны, што знаходзіліся на поўдзень ад чыгункі Брэст-Гомель. Усё справаводства на гэтых тэрыторыях вялося толькі на ўкраінскай і нямецкай мовах. Беларуская мова была забаронена. Разліковым грашовым сродкам былі нямецкія акупацыйныя маркі і ўкраінскія карбованцы, якія ўвёў у абарачэнне Ровенскі эмісійны банк.

На тэрыторыі Віцебскай, Гомельскай, Магілёўскай абласцей і ўсходніх раёнаў Мінскай акупанты ўтварылі так званую вобласць армейскага тылу групы армій "Цэнтр", якая падпарадкоўвалася нямецкай ваеннай адміністрацыі. Ваенна-адміністрацыйныя функцыі тут выкопвалі створаныя вермахтам палявыя і мясцовыя камендатуры.

У склад генеральнай акругі "Беларусь" былі ўключаны Баранавіцкая, значная частка Вілейскай, заходнія і паўночныя раёны Мінскай вобласці, а таксама паўночныя раёны Пінскай вобласці (усяго 68 раёнаў з 192, што былі ў складзе БССР перад пачаткам вайны). Плошча генеральнай акругі "Беларусь" складала не больш трэці даваеннай тэрыторыі Беларусі. Паводле звестак акупацыйных уладаў на 4 снежня 1941 г. тут пражывала 3 млн. 138 тыс. чалавек.

Нямецкую акупацыйную адміністрацыю на Беларусі з 17 ліпеня 1941 г. да апошняга дня свайго жыцця (22 верасня 1943 г.) узначальваў генеральны камісар (гаўляйтэр) В. Кубэ. Пасля таго, як партызаны забілі В. Кубэ, генеральны камісарыят узначаліў генерал паліцыі К. Готберг.

Уся тэрыторыя так званай "генеральнай акругі" была падзелена на 10 акруг (гебітскамісарыятаў): Баранавіцкую, Барысаўскую, Вілейскую, Ганцавіцкую ("Прыпяць"), Глыбоцкую, Лідскую, Мінскую, Навагрудскую, Слонімскую і Слуцкую. На чале гэтых акруг стаялі нямецкія чыноўнікі (гебітскамісары). Горад Мінск знаходзіўся ў час нямецкай акупацыі на палажэнні асобнага камісарыята і падпарадкоўваўся толькі генеральнаму камісарыяту Беларусі. Апарат генеральнага і акружных камісарыятаў камплектаваўся выключна нямецкімі служачымі. Разам з органамі нямецкага кіравання ў акругах ствараліся ўправы, у якіх працавалі прадстаўнікі мясцовай калабарацыі. Звычайна аддзелы ўправы дубліравалі назвы і функцыі

нямецкіх аддзелаў акруговых камісарыятаў. Напрыклад, у складзе Мінскай гарадской управы былі створаны аддзелы прамысловасці, гаспадаркі, працы і аховы здароўя. Аднак без санкцыі нямецкіх акупацыйных уладаў адміністрацыя ўправы не магла вырашаць нават самыя звычайныя пытанні гаспадарчага і грамадскага жыцця ў гарадах і іншых населеных пунктах адміністрацыйных акруг.

Адміністрацыя ў раёнах стваралася з ліку мясцовых калабарацыяністаў. На чале ўсёй раённай адміністрацыі стаяў бургамістр. Звычайна бургамістры прызначаліся з ліку беларускіх эмігрантаў.

На тэрыторыі сельсаветаў акупанты стварылі воласці, якія ўзначальвалі прызначаныя імі бургамістры. У вёсках акупацыйную ўладу прадстаўлялі старасты. Уся вертыкаль створанай сістэмы ўлады кантралявалася нямецкімі чыноўнікамі.

Адначасова са стварэннем структуры "новай" улады, акупанты пачалі займацца і гаспадаркай. Каб паставіць на службу рэйха эканоміку Беларусі, акупанты ўжо на працягу ліпеня 1941 г. правялі рэгістрацыю працаздольнага насельніцтва ў гарадах. Усе прадпрыемствы і ўстановы Беларусі былі ўзяты на ўлік, была праведзена іх дэталёвая інвентарызацыя. Напрыклад, у г. Мінску гэта акцыя была завершана да 20 ліпеня 1941 г. У выніку праведзеных акупантамі мерапрыемстваў ужо 1 снежня 1941 г. у Мінску працавала 73 прадпрыемствы, у снежні 1942 г. – 117, а ў красавіку 1943 г. – 150. Сярод іх было 20 прадпрыемстваў металургічнага профілю, 14 тэкстыльных, 21 транспартнае, 7 хімічнай і будаўнічай вытворчасці, 6 дрэваапрацоўчых, 3 электрастанцыі і г. д. Рабочыя і служачыя падвяргаліся жорсткай эксплуатацыі. Працоўны дзень у сярэднім складаў 12 гадзін у суткі.

Трэба адзначыць, што разам з каманднa-адміністрацыйнымі метадамі акупанты выкарыстоўвалі і эканамічныя метады кіравання гаспадаркай. На 1 ліпеня 1942 г. на тэрыторыі генеральнай акругі "Беларусь" працавала 33 банкі, а ў 1943 г. іх было ўжо каля 100. Акрамя збору грашовых лішкаў банкі праводзілі крэдытаванне гаспадаркі, узаемаразлікі паміж прадпрыемствамі розных рэгіёнаў Беларусі, праводзілі аперацыі з каштоўнымі паперамі і г.д.

Вясной 1942 г. на тэрыторыі генеральнай акругі "Беларусь" акупацыйныя ўлады правялі зямельную рэформу. Усе калгасы былі ліквідаваны, а іх зямля і інвентар перайшлі да ўжытку сялян у рамках так званых "кааператываў". На тэрыторыі Усходняй Беларусі калгасы па-ранейшаму існавалі. Яны, па меркаванню акупацыйных уладаў,

былі надзейным сродкам забеспячэння харчовых патрэб Германіі і фронту.

Значныя страты ў вайне супраць СССР патрабавалі ад Германіі вялікіх падмацаванняў для дзеючай арміі. Кіраўніцтва рэйха выкарыстоўвала працоўныя рэсурсы акупіраваных тэрыторый, у тым ліку і Беларусі, у якасці рабочай сілы для прамысловасці і сельскай гаспадаркі Германіі. Працэс гэты пачаўся з канца 1941 г., але буйныя памеры набыў на пачатку 1943 г. Дастаткова адзначыць, што толькі гаспадарчая інспекцыя групы армій "Цэнтр" і генеральнай акругі "Беларусь" штодзённа накіроўвалі на працу ў рэйх 500-1000 рабочых. Усяго за гады вайны нямецкія акупацыйныя ўлады накіравалі на работы ў Германію звыш 400 тыс. жыхароў Беларусі, з якіх прымусовым шляхам былі накіраваны каля 380 тыс. чалавек.

У адносінах да мясцовага насельніцтва нямецкія ўлады з першых дзён свайго гаспадарання распачалі палітыку генацыду. Праграма каланізацыі акупіраваных усходнеславянскіх тэрыторый прадугледжвала прымусовае высяленне і знішчэнне 75% насельніцтва Беларусі і засяленне "вызваленых" зямель нямецкімі каланістамі.

Яшчэ ў маі 1940 г. Г. Гімлер у службовай запісцы "Аб некаторых думках пра адносіны да мясцовага насельніцтва ўсходніх абласцей" паведамляў, што важнейшай справай усходняй палітыкі з'яўляецца ачышчэнне далучаных да рэйха тэрыторый на Усходзе ад асоб "чужой расы". У гэтым самым дакуменце патрабавалася не лічыцца з абставінамі, выкарыстоўваючы сілу, ісці напралом пры ажыццяўленні каланізацыі і вынішчэнні славянскіх народаў.

У "Загадзе аб выкарыстанні ваеннай юрысдыкцыі ў раёне "Барбароса" і аб асобных мерапрыемствах у войсках ад 13 мая 1941 г." паведамлялася: "За дзеянні, учыненыя супраць варожых грамадзянскіх асоб, не існуе ніякага прымусовага праследавання нават у тым выпадку, калі дзеянні з'яўляюцца адначасова ваенным злачынствам або правапарушэннем".

Практычнаму ажыццяўленню злачынных задум нямецкага фашызму супраць славянскіх народаў спрыяла беспрапынная ідэалагічная апрацоўка салдат вермахта і войскаў СС. Магутны апарат нацысцкай прапаганды на працягу некалькіх гадоў метадычна атручваў свядомасць грамадзян рэйха ідэямі ваеннай агрэсіі і расавай перавагі. За 1941 г. нямецкія акупанты знішчылі на беларускай зямлі каля 100 тыс. мірных жыхароў, спалілі 120 вёсак разам з 3945 іх жыхарамі.

У 1942 г. забойствы і катаванні мірнага насельніцтва Беларусі пабылі сістэмны характар. За акрэслены перыяд акупанты спалілі 772

вёскі, разам з 46 992 жыхарамі. Беларуская зямля ў час вайны была пакрыта густой сеткай лагераў смерці, дзе за гады варожага панавання было знішчана звыш мільёна савецкіх ваеннапалонных і жыхароў Беларусі. Для яўрэйскага насельніцтва былі створаны гета. Яны сталі месцам масавай бойні, дзе загінулі сотні тысяч яўрэяў.

З набліжэннем лініі фронту да Беларусі акупанты ўзмацнілі расправу над насельніцтвам, вывозілі ў рэйх тэхналагічнае абсталяванне і сыравіну. 7 верасня 1943 г. нямецкая армія атрымала загад ператварыць тэрыторыю, якую яна пакідае, у "зону пустыні". У загадзе, у прыватнасці, гаварылася: "Усе без выключэння дамы неабходна паліць, печы ў дамах падрываць з дапамогай ручных гранат. Калодзежы прыводзіць у непрыгоднасць шляхам знішчэння пад’ёмных прыстасаванняў, а таксама кідаючы ў іх нечыстоты. Стагі саломы і сена, а заадно ўсялякага роду запасы паліць, сельскагаспадарчыя машыны і тэлеграфныя слупы падрываць, паромы, лодкі тапіць". Адступаючы, нямецкія войскі з педантычнасцю выконвалі гэты загад. І, як вынік, у 1943 г. акупанты спалілі 2653 вёскі разам з 84 188 жыхарамі. Асабліва цярпелі ад ворага прыфрантавыя раёны. За перыяд нямецкага генацыду на Беларусі гарадское насельніцтва рэспублікі страціла звыш 1063 тыс. жыхароў, беларуская вёска – 445594 мірных жыхароў, 155 594 з якіх згарэлі разам з 5454 вёскамі. На беларускай зямлі нямецкія акупанты закатавалі звыш 810 тыс. савецкіх ваеннапалонных.

**Калабарацыя на Беларусі.** Калабарацыяністы (ад франц. *collaboration-супрацоўнітцтва)* - асобы, якія супрацоўнічалі з акупацыйнымі ўладамі. У гістарыяграфіі заходнееўрапейскіх краін і ЗША дзейнасць калабарацыяністаў класіфікуецца як палітычнае, ідэалагічнае і ваеннае супрацоўніцтва з акупантамі. Айчынная гістарыяграфія разглядае калабарацыю як здраду сваёй радзіме і пераход на шлях супрацоўніцтва з ворагам. Такім чынам, згодна з крытэрыямі айчыннай і замежнай гістарыяграфіі, да калабарацыяністаў на Беларусі можна аднесці супрацоўнікаў інстытутаў мясцовага самакіравання і паліцыі, у іх ліку Беларускай народнай самапомачы (БНС), Беларускага корпуса самааховы (БКС), Саюза беларускай моладзі (СБМ). Беларускай цэнтральнай рады (БЦР) і Беларускай краёвай абароны (БКА). Па розных звестках, калабарацыяніецкі рух на Беларусі налічваў 80-100 тыс. чалавек, значная колькасць з якіх была далучана да яго акупантамі і іх памагатымі шляхам прымусу.

Беларуская народная самапомач была створана 22 кастрычніка 1941 г. па загаду генеральнага камісара Беларусі В. Кубэ. Ствараючы Беларускую народную самапомач, нямецкія акупацыйныя ўлады ха-

целі паказаць пэўным колам мясцовага насельніцтва, што на Беларусі пачалося будаўніцтва нацыянальнага інстытута самакіравання.

Кіруючым органам Беларускай ыароднай самапомачы з'яўлялася Цэнтральная рада, якой падпарадкоўваліся акруговыя, раённыя і валасныя аддзелы. Склад Цэнтральнай рады БНС зацвярджаў В. Кубэ. Акруговыя і раённыя праўленні, а таксама старшыні валасных аддзелаў прызначаліся адпаведнымі кіраўнікамі мясцовай нямецкай адміністрацыі.

Практычна БНС займалася вырашэннем толькі сацыяльных пытанняў: зборам грашовых і матэрыяльных каштоўнасцяў, прадуктаў харчавання і вопраткі, аказвала матэрыяльную дапамогу пацярпелым ад вайны. Напачатку такая дзейуасць БНС у пэўнай ступені адпавядала інтарэсам германскіх акупацыйных уладаў. Але паступова Беларуская народная самапомач ператварылася ў палітычны рух.

У сакавіку 1943 г. на з'ездзе Цэнтральнай рады і акруговых кіраўнікоў БНС быў выпрацаваны мемарандум, які патрабаваў ад нямецкіх уладаў аўтаноміі Беларусі і стварэння беларускага ўрада і беларускага войска. Падкрэслівалася, што "ўрад абвесціць аддзяленне Беларусі ад СССР і аб'явіць яму вайну, як ворагу беларускага народа". Падобныя дзеянні кіраўніцтва БНС не спадабаліся нямецкай адміністрацыі. У выніку кіраўнік БНС І. Ермачэнка быў зняты з пасады і высланы з Беларусі. Яго месца заняў В. Іваноўскі. Паводле распараджэння германскіх уладаў ад 18 сакавіка 1943 г., дзейнасць БНС у далейшым абмяжоўвалася толькі аховай здароўя і матэрыяльнай дапамогай насельніцтву. У чэрвені 1943 г. Беларуская народная самапомач была рэарганізавана ў Беларускую самапомач, дзейнасць якой была абмежавана зборам ахвяраванняў, вярбоўкай новых членаў.

Асаблівая ўвага з боку нямецкіх акупацыйных уладаў і кіруючых колаў калабарацыі надавалася стварэнню Беларускага корпуса самааховы (БКС), які пачаў фарміравацца летам 1942 г., як вайсковая структура беларускіх калабарацыяністаў. Гэта была ініцыятыва генеральнага камісара Беларусі В. Кубэ. У афіцыйным пасланні В. Кубэ да старшыні БНС І. Ермачэнкі ад 29 чэрвеня 1942 г. адзначалася: "Вы павінны падрыхтаваць са сваімі супрацоўнікамі зварот да беларускага насельніцтва з заклікам да ўступлення мужчынскага насельніцтва ў беларускі вольны корпус самааховы". Практычная работа па арганізацыі БКС даручалася вайсковай камісіі, якая была ўтворана загадам І. Ермачэнкі. Адпаведныя камісіі былі арганізаваны і ў акругах генеральнага камісарыята "Беларусь".

Планавалася стварыць у кожным раёне адзінкі БКС ад роты да батальёна, усяго 3 дывізіі. І. Ермачэнка, які быў прызначаны камандуючым БКС, і яго паплечнікі разгарнулі актыўную дзейнасць. Былі арганізаваны курсы па падрыхтоўцы афіцэраў-беларусаў, праводзілася шырокая прапагандысцкая кампанія. Германскія акупацыйныя ўлады не бачылі **ў** БКС нейкай баяздольнай узброенай сілы для барацьбы супраць партызан і Чырвонай Арміі. Створаныя фарміраванні самааховы так і не былі ўзброены немцамі належным чынам. Усяго ж з чэрвеня 1942 па красавік 1943 гг. было створана 20 батальёнаў самааховы. У выніку слабага ўзбраення атрады БКС былі небаяздольнымі і лёгка разганяліся партызанамі.

Восенню 1942 г. цікавасць немцаў да БКС пачала слабець. Замест гэтаіа яны вырашылі стварыць беларускія паліцэйскія батальёны на чале са сваім камандным складам. Вясной 1943 г. германскія ўлады наогул расфарміравалі атрады БКС. Актыўную пазіцыю займалі кіруючыя колы калабарацыі ў справе ажыццяўлення прагерманскай маладзёжнай палітыкі. 22 чэрвеня 1943 г. у Мінскім гарадскім тэатры адбылося ўрачыстае пасяджэнне, на якім было аб'яўлена аб стварэнні Саюза беларускай моладзі. На ім прысутнічалі В. Кубэ і іншыя вышэйшыя кіраўнікі нямецкай акупацыйнай адміністрацыі. На гэтым пасяджэнні былі прыняты статут і праграма СБМ, зацверджаныя пасля гаўляйтэрам Беларусі.

Вышэйшым кіруючым органам СБМ з'яўляўся Цэнтральны штаб на чале з М. Ганько і Н. Абрамавай, які знаходзіўся да ліпеня 1944 г. у Мінску, а потым перабраўся ў Берлін. Пры штабе было 4 аддзелы, у тым ліку і "Працоўная група" па вярбоўцы і адпраўцы моладзі на работу ў Германію. На месцах былі створаны акруговыя і раённыя штабы СБМ.

Дзейнасць гэтай маладзёжнай арганізацыі вызначалі нямецкія акупацыйныя ўлады: выхаванне праваднікоў германскай палітыкі, падрыхтоўка беларускай моладзі для працы на ваенных заводах Германіі, служба ў ваенна-дапаможных чао цях вермахта. Члены арганізацыі насілі спецыяльную форму, мелі свой друкаваны часопіс "Жыве Беларусь" і інш. Саюз беларускай моладзі знаходзіўся пад кантролем аддзела моладзі генеральнага камісарыята "Беларусь".

СБМ налічваў у 1944 г. 12 635 чалавек, з якіх, па розных звестках, ад 3,5 да 5 тыс. былі накіраваны на работу і вучобу ў Германію.

У снежні 1943 г., калі быў вызвалены ад нямецкіх акупантаў шэраг раёнаў Усходняй Беларусі, акупацыйныя ўлады аб'явілі аб стварэнні дапаможнага дарадчага органа нямецкага кіравання на

Беларусі – Беларускай Цэнтральнай Рады. У БЦР акупанты бачылі сродак мабілізацыіі сіл беларускага народа для барацьбы з партызанамі і Чырвонай Арміяй і больш эфектыўнага выкарыстання беларускай эканомікі ў сваіх інтарэсах. Пэўныя колы беларускай калабарацыіі, з свайго боку, спадзяваліся стварыць беларускую дзяржаўнасць пад пратэктаратам Германіі.

У склад БЦР уваходзіла 14 чалавек. Яе кіруючым органам быў прэзідыум, у які ўваходзілі Р. Астроўскі (прэзідэнт), С. Кандыбовіч, Ф. Кушаль, У. Родзька, Ю. Сабалеўскі, М. Шкялёнак. Структурна БЦР складалася з 12 аддзелаў.

Фармальна германскія акупацыйныя ўлады перадалі ў сферу падпарадкавання БЦР справы сацыяльнага забеспячэння, культуры, адукацыіі і Беларускай краёвай абароны, хаця на месцах усе гэтыя накірункі па-ранейшаму знаходзіліся ў руках германскай акупацыйнай адміністрацыіі.

Адным з найбольш значных мерапрыемстваў БЦР быў ІІ Усебеларускі кангрэс, які адбыўся 27 чэрвеня 1944 г. у Мінску. Ён быў скліканы па прапанове Р. Астроўскага з дазволу генеральнага камісара Беларусі К. фон Готберга. Удзельнікі ІІ Усебеларускага кангрэса накіравалі прывітальную тэлеграму А. Гітлеру.

Калі ўлічыць ваенна-палітычнае становішча ў 1944 г., то можна зрабіць выснову, што ІІ Усебеларускі кангрэс больш нагадваў спектакль, які паставілі акупацыйныя ўлады разам з артыстамі з БЦР.

30 чэрвеня 1944 г. большасць членаў БЦР пакінула Мінск і накіравалася ў Кёнігсберг, а адтуль у Берлін.

З'яўленне Беларускай краёвай абароны (БКА) звязана з загадам гаўляйтэра фон Готберга ад 23 лютага 1944 г., у якім гаварылася: "На прапанову Прэзідэнта Беларускай Цэнтральнай Рады ад 18.02.44 г. загадваю аб утварэнні Беларускай краёвай абароны для барацьбы супраць бальшавізму". Аналагічны загад БЦР, якая называла сябе беларускім урадам, аб стварэнні БКА быў выдадзены 6 сакавіка 1944 г.

Аснову БКА складала прымусова мабілізаванае мужчынскае насельніцтва 1908-1924 гг. нараджэння. За няяўку ў вызначаны тэрмін прадугледжвалася смяротная кара. У выніку праведзенай мабілізацыіі Беларуская краёвая абарона на канец красавіка-май 1944 г. складала 45 батальёнаў (39 стралковых і 6 сапёрных), якія налічвалі прыкладна каля 30 тыс. чалавек. Але, як сведчыць хроніка Беларускай Цэнтральнай Рады, пераважная большасць структур БКА ў гэты час знаходзілася толькі ў стадыіі арганізацыіі. Шэфам галоўнага камандавання БКА быў прызначаны маёр Ф. Кушаль, а яго намеснікам – лейтэнант В. Мікула.

Галоўная мэта БКА – барацьба разам з паліцыяй супраць партызан. Але створаныя батальёны не апраўдалі надзей немцаў. Большасць беларускага насельніцтва адмоўна ставілася да ідэй стварэння БКА. Многія з тых, каму пагражала мабілізацыя, уцякалі ў лясы да партызан. Пад уплывам агітацыі партызан і падпольшчыкаў адбылося масавае дэзерцірства вайскоўцаў з пераходам іх са зброяй да партызан. Відаць, таму немцы перасталі забяспечваць створаныя батальёны зброяй і ваеннай амуніцыяй. Фарміраванні БКА выкарыстоўваліся ў асноўным для аховы складоў і іншых гаспадарчых мэт.

Пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў частка фарміраванняў БКА апынулася ў Германіі. Калі ў 1945 г. у Германіі кіраўнікі БЦР пачалі ствараць брыгаду СС "Беларусь", у яе ўступіла 1094 чалавекі. Палову з іх склалі былыя вайскоўцы з БКА.

Перамога Чырвонай Арміі на франтах вайны, актыўная дзейнасць беларускіх партызан і падпольшчыкаў, патрыятызм і разважлівасць насельніцтва рэспублікі не дазволілі нямецкім акупантам і мясцовай калабарацыі ажыццявіць у поўнай меры свае мэты на беларускай зямлі.

ЛЕКЦЫЯ 24

## АНТЫФАШЫСЦКАЯ БАРАЦЬБА

- *Партызанскі рух*
- *Вызваленне Беларусі і Еўропы. Завяршальны этап вайны*

**Партызанскі рух.** Антыфашысцкая барацьба на Беларусі ў гады Другой сусветнай вайны распачалася з першых дзён нямецкай акупацыі рэспублікі. Галоўнай сілай антыфашысцкага супраціўлення на Беларусі стаў партызанскі рух.

Слова "партызан" (ад франц. *partisan* - член атрада, арганізаванага з прадстаўнікоў народных мас для барацьбы з ворагам на акупіраванай тэрыторыі) шырока вядома з часоў сярэдневякоўя ў Еўропе. Пазней партызанамі пачалі называць удзельнікаў узброенай барацьбы супраць іншаземных захопнікаў у варожым тыле.

Партызанскі рух не з'яўляецца толькі нацыянальнай беларускай з'явай. Справа ў іншым – дзейнасць партызанскіх атрадаў і злучэнняў на Беларусі ў гады Другой сусветнай вайны набыла асабліва значныя памеры. Супраць акупантаў змагаліся не асобныя атрады дыверсантаў, на барацьбу падняўся ледзь не ўвесь народ. У радах антыфашысцкага руху на тэрыторыі рэспублікі налічвалася каля 444 тыс. партызан і падпольшчыкаў. 374 тыс. чалавек з'ўляліся байцамі 1255 партызанскіх атрадаў, большасць з якіх былі аб'яднаны ў 213 брыгад. Колькасць беларусаў у партызанскіх атрадах складала 71,1%, рускіх – 19,3%, украінцаў – 3,9% і 5,7% былі прадстаўнікамі іншых нацыянальнасцяў.

Ужо на пачатку нямецкай акупацыі Беларусі ў чэрвені 1941 г. пачалі дзейнічаць першыя партызанскія атрады. Сярод арганізатараў былі Ц. П. Бумажкоў, В. З. Корж, Ф. І. Паўлоўскі і інш.

26 чэрвеня 1941 г. першы сакратар Акцябрскага РК КП(б)Б Гомельскай вобласці Ц.П. Бумажкоў і ўпаўнаважаны Наркамата нарыхтовак па Акцябрскаму раёну Ф.І. Паўлоўскі стварылі партызанскі атрад "Чырвоны Кастрычнік". Сумесна з часцямі Чырвонай Арміі ён вёў баі з нямецкімі войскамі на р. Пціч. Партызаны правялі шэраг удалых аперацый, у час якіх знішчылі 30 нямецкіх танкаў, 55 адзінак аўтабранятэхнікі праціўніка, узарвалі некалькі мастоў. 18 ліпеня 1941 г. пры агнявой падтрымцы бранепоезда № 52 (камандзір – лейтэнант Калакольцаў) партызаны атрада разграмілі штаб нямецкай дывізіі ў в. Воземля. У баі праціўнік страціў 80 салдат і афіцэраў, былі захоплены значныя трафеі і вельмі карысныя дакументы, якія партызаны перадалі камандаванню савецкіх войскаў.

За гераізм і ўмелае кіраўніцтва партызанскай барацьбой камандзіру атрада Ц. П. Бумажкову і камісару Ф. І. Паўлоўскаму, першым з беларускіх партызан, 6 жніўня 1941 г. было прысвоена званне Героя ў Савецкага Саюза.

Нягледзячы на вышэй прыгаданыя факты, колькасныя памеры і баяздольнасць антыфашысцкага супраціўлення на Беларусі ў 1941 г. была нязначнай.

З 16 партызанскіх атрадаў, якія былі сфарміраваны Пінскім аб- комам партыі ў ліпені 1941 г. на тэрыторыі вобласці, увосень застаўся толькі адзін атрад, які налічваў 60 байцоў, пад камандаваннем В.З. Каржа. Астатнія партызаны альбо выйшлі ў савецкі тыл, альбо разышліся па хатах.

Летам 1941 г. на тэрыторыі Гомельскай вобласці было арганіза- вана 65 партызанскіх атрадаў. Колькасць партызан перавышала 1770 чалавек. У снежні 1941 г. засталося 10 фарміраванняў і складалі яны прыкладна 150 чалавек.

Зімой 1941 г. колькасць партызан не перавышала 3 тыс. чалавек. Насельніцтва Беларусі на працягу першых месяцаў нямецкай акупацыі было ў разгубленасці. Кіраўнік аператыўнай групы Шклоўскага раёна Я.А. Сляпцоў адзначаў у дакладной запісцы ў адрас ЦК КП(б)Б: "Настрой большасці калгаснікаў упадніцкі, яны страцілі ўсялякую веру ў нашу перамогу. ...Гавораць, што ў справаздачах падкрэслівалі, што нас ніхто не пераможа, а зараз што зрабілася – і самі ўсе пазбеглі, а нас пакінулі на здзекі немцам".

Трэба ўлічваць і той факт, што з першых дзён нямецкія акупанты распачалі мэтанакіраваную палітыку тэрору, чым наводзілі жах на насельніцтва. Ужо 16 ліпеня 1941 г. Гітлер зрабіў заяву на нарадзе ў сваёй стаўцы: "Рускія аддалі загад аб партызанскай вайне ў нашым тыле. Гэта партызанская вайна мае і свае перавагі. Яна дазваляе нам знішчаць усё тое, што паўстае супраць нас". Праз тры дні галоўнакамандуючы сухапутных войскаў вермахта генерал-фельдмаршал Браўхіч атдаў загад аб мерах супраць асоб, якія належалі да партызанскіх атрадаў, а таксама супраць усіх, хто спачувае і дапамагае партызанам. Акупанты накіравалі на Беларусь у 1941 г. 221-ю, 286-ю, 403-ю ахоўныя і 339-ю, 707-ю пяхотныя дывізіі і некалькі іншых дапаможных часцей. У ліпені-жніўні 1941 г. адбылася першая буйнамаштабная карная экспедыцыя пад кодавай назвай "Прыпяцкія балоты". Карнікі прайшліся з захаду на ўсход па Брэсцкай, Мінскай, Пінскай і Палескай абласцях, знішчылі 14 тыс., галоўным чынам, мірных жыхароў. Усяго ж на тэрыторыі Беларусі ў 1941 г. акупанты знішчылі каля 100 тыс. чалавек.

У 1941 г. не было вопыту вядзення партызанскай вайны. У 20-першай палове 30-х гг. на Беларусі праводзілася пэўная праца па падрыхтоўцы партызанскіх атрадаў і баз для іх забеспячэння на выпадак вайны. На тэрыторыі БССР былі сфарміраваны Бабруйскі, Барысаўскі, Мінскі, Мазырскі, Полацкі і Слуцкі атрады. Кожны атрад налічваў ад 300 да 500 чалавек, меў свой штаб, камандзіра. У беларускіх лясах для атрадаў былі зроблены закладкі зброі і боепрыпасаў, у тым ліку 50 тыс. вінтовак і 150 кулямётаў. Камандзірамі атрадаў з'яўляліся С.А. Ваўпшасаў, В.З. Корж, К.П. Арлоўскі, А.М. Рабцэвіч.

Аднак напярэдадні Другой сусветнай вайны падрыхтоўка да партызанскіх дзеянняў прыпынілася. Змянілася савецкая ваенная дактрына. Створаныя партызанскія атрады былі расфарміраваны, а заложаныя ў тайнікі зброя і боепрыпасы былі зняты. Больш таго, у 1937-1938 гг. былі рэпрэсіраваны амаль усе партызанскія кадры. Засталіся толькі тыя, хто змяніў месца свайго жыхарства, або, як В.З. Корж, К.П. Арлоўскі, С.А. Ваўпшасаў, А.М. Рабцэвіч і іншыя, трапілі ў Іспанію, дзе набывалі вопыт сучаснай партызанскай вайны.

Нягледзячы на вялікія цяжкасці зімы 1941-1942 гг., партызанскі рух на Беларусі выжыў. Паспяховыя дзеянні першых партызанскіх атрадаў, перамога савецкіх войскаў пад Масквой спрыялі таму.

Акупанты таксама пачынаюць лічыць партызан за рэальную сілу. Калі ў першыя месяцы акупацыі немцы прапаноўвалі за злоўленага партызана літр шнапсу і пару пачак махоркі, або 100 руб. грашыма, то па меры таго, як актывізаваліся партызанскія дзеянні зімой 1941-1942 гг., гэтая цана вырасла да 5000 руб. У хуткім часе партызанскі рух на Беларусі набыў такія маштабы, што з ім ужо нельга было справіцца нават шляхам карных экспедыцый з прыцягненнем вялікай колькасці войскаў.

Важную ролю ва ўзмацненні партызанскага руху на Беларусі адыгралі падпольныя арганізацыі. Восенню-зімой 1941 г. у рэспубліцы ўжо актыўна дзейнічалі Мінская, Аршанская, Асіповіцкая, Асінторфская (Дубровенскі раён Віцебскай вобласці), Брэсцкая, Віцебская, Гродзенская, Магілёўская, Пінская і іншыя падпольныя антыфашысцкія арганізацыі, якія па няпоўных дадзеных налічвалі ў сваім складзе звыш 1100 чалавек. Амаль палова падпольшчыкаў у 1941 г., або 540 чалавек дзейнічалі ў Мінску.

Антыфашысцкае падполле на Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны налічвала каля 70 тыс. чалавек. Беларусы складалі ў яго радах 74,4%, рускія – 17,5%, украінцы – 2,2%, яўрэі – 2,3%, палякі – 1,7% і 1,9% - былі прадстаўнікі іншых нацыянальнасцяў.

У час бітвы пад Масквой падпольшчыкі знішчылі дзве вадакачкі на Мінскім чыгуначным вузле. У выніку гэтай дыверсіі 50 цягнікоў былі пашкоджаны. Падпольшчыкі Оршы пад кіраўніцтавм К.С. Заслонава з лістапада 1941 па люты 1942 гг. вывелі са строю 170 цягнікоў і пусцілі пад адхон дзесяткі варожых саставаў з жывой сілай і тэхнікай. Падпольшчыкі не толькі праводзілі дыверсіі на аб'ектах і камунікацыях праціўніка, аказвалі матэрыяльна-тэхнічную дапамогу партызанам, забяспечвалі іх каштоўнай інфармацыяй, але і ўмацоўвалі колькасна і якасна склад партызанскіх фарміраванняў. Падпольшчыкі г. Мінска ў лістападзе 1941 - лютым 1942 гг. накіравалі звыш 450 чалавек у партызанскія атрады.

На працягу 1941 г. папаўненне партызанскіх атрадаў адбывалася з ліку камуністаў і камсамольцаў, ваеннаслужачых, якія апынуліся ў варожым тыле. Пазней узмацніўся прыток насельніцтва ў партызаны, гэтаму ў значнай ступені паспрыялі самі акупанты. У сакавіку 1942 г. камандаванне вермахта выдала загад аб вяртанні ў лагеры для ваеннапалонных былых савецкіх ваеннаслужачых, якім было дазволена ў зімовы час пражываць у вёсках у сваіх родных і блізкіх. Большасць ваеннапалонных, якія на зімоўку былі адпушчаны з лагераў, пайшлі ў партызанскія атрады, а дзе іх яшчэ не было, то і самі стваралі гэтыя атрады. Калі на пачатку 1942 г. колькасны склад партызанскіх атрадаў на Беларусі налічваў каля 3 тыс. чалавек, то ў канцы года ў іх радах было ўжо каля 50 тыс. байцоў. Чвэрць партызанскай арміі складалі кадравыя вайскоўцы з ліку акружэнцаў. Такім чынам, у 1942 г. стварылася арганізацыйнае ядро партызанскага руху на Беларусі, што дазволіла разгарнуць на тэрыторыі рэспублікі сапраўдную народную вайну супраць нямецкіх акупантаў.

Важную ролю ва ўмацаванні партызанскага руху на Беларусі мела забеспячэнне партызан зброяй і боепрыпасамі з савецкага тылу. Гэты працэс пачаўся ў лютым 1942 г., калі войскі Калінінскага і Заходняга франтоў на Віцебскім напрамку ўступілі на тэрыторыю Беларусі. Воіны 249-й дывізіі разам з партызанамі вызвалілі дзесяць вёсак Суражскага і Мехаўскага раёнаў Віцебскай вобласці. 6 лютага 1942 г. Чырвоная Армія на гэтым накірунку перайшла да абароны, аднак на 40-кіламетровым участку фронту на стыку пазіцый нямецкіх армейскіх груповак "Поўнач" і "Цэнтр", што паміж Веліжам і Усвятамі, захаваўся пралом у лініі нямецкай абароны. У выніку ўтварыліся так званыя "Суражскія вароты", якія праіснавалі да 28 верасня 1942 г. Праз "Суражскія вароты" партызанскі рух Беларусі папоўніўся больш чым 2 тыс. арганізатарамі і спецыялістамі па вядзенню дыверсій.

Партызанам рэспублікі перапраўлялася зброя і боепрыпасы. Праз "Суражскія вароты" партызаны атрымалі 4250 вінтовак, 630 аўтаматаў, 402 кулямёты, 138 супрацьтанкавых ружжаў (СТР), 280 мінамётаў, 10 860 дыверсійных мін, каля 2 млн. патронаў для зброі, 18 тыс. ручных гранат і 40 тон толу.

У верасні 1942 г. быў створаны кіруючы і каардынуючы цэнтр партызанскага руху на тэрыторыі рэспублікі – Беларускі штаб партызанскага руху (БШПР). Яго ўзначаліў другі сакратар ЦК КП(б)Б П. З. Калінін. Працэс забеспячэння партызан зброяй і боепрыпасамі набыў шырокамаштабны характар. З 15 верасня 1942 г. па 1 студзеня 1943 г. беларускім партызанам савецкая авіяцыя перакінула 3762 аўтаматы, 2106 карабінаў, 2207 вінтовак, 444 кулямёты, 212 СТР, 294 мінамёты, 16 тон выбуховых рэчываў і інш. У далейшым гэтая дапамога працягвалася. Усяго ж за 1942-1944 гг. для ўзмацнення партызанскага руху з савецкага тылу ў Беларусь было накіравана звыш 11 тыс. ваенных спецыялістаў і арганізатараў партызанскай вайны.

У другой палове 1942 г. партызаны пачалі праводзіць супраць акупантаў значныя па сваіх памерах баявыя аперацыі. Напрыклад, у жніўні 1942 г. партызанскі атрад пад камандаваннем А.І. Петракова і А.В. Раманава знішчыў чыгуначны мост праз р. Дрысу. З-за гэтага чыгуначны рух на лініі Полацк-Даўгаўпілс быў прыпынены на 16 дзён, пазней прапускная здольнасць на гэтым участку чыгункі знізілася з 60 да 8 эшалонаў у суткі.

Аналагічную аперацыю правялі партызанскія атрады Мінскай і Палескай абласцей. У ноч на 3 лістапада 1942 г. быў знішчаны 132-метровы чыгуначны мост праз р. Пціч. Варожыя перавозкі па чыгунцы Брэст-Гомель былі прыпынены на 18 дзён.

28 жніўня 1942 г. аб'яднанымі сіламі 8-га, 24-га і 36-га партызанскіх атрадаў Магілёўскай вобласці быў знішчаны варожы гарнізон і камунікацыі на чыгуначнай станцыі Слаўнае. У час аперацыі партызаны разграмілі гарнізон, знішчылі будынак станцыі, нямецкія казармы, 6 складаў з ваеннай маёмасцю і харчаваннем, 2 вайсковыя эшалоны з тэхнікай і ўсё чыгуначнае абсталяванне на станцыі. Праціўнік страціў каля 120 салдат і афіцэраў забітымі.

Папаўненне партызанскіх фарміраванняў узмацнілася ў сувязі з мабілізацыяй беларускай моладзі на работы ў Германію. Так. у адпаведнасці з дырэктывай, атрыманай 11 сакавіка 1943 г., было запатрабавапа каля 1 млн. жанчын і мужчын з акупіраваных усходніх абласцей. Доля Беларусі ў пазначаных пастаўках павінна была складаць каля 1000 чалавек штодзённа. Дзесяткі тысяч маладых

людзей, ратуючыся ад гвалтоўнага ўгону ў Германію, ішлі ў партызаны. У лістападзе 1943 г., згодна з дадзенымі БШПР, колькасць партызан складала ўжо 122 тыс. чалавек.

Узмацненне партызанскага руху на Беларусі, якое адбылося ў 1943 г., дазволіла народным мсціўцам рэспублікі перайсці да правядзення шырокамаштабных баявых аперацый супраць нямецкіх акупантаў, такіх як, напрыклад, "Рэйкавая вайна". Аперацыя праводзілася партызанамі Беларусі, Украіны, Літвы, Латвіі, Ленінградскай, Калінінскай, Смаленскай і Арлоўскай абласцей. Галоўнай яе задачай было разбурэнне чыгуначных камунікацый у тыле праціўніка напярэдадні наступальных аперацый Чырвонай Арміі. Распрацаваў аперацыю "Рэйкавая вайна" Цэнтральны штаб партызанскага руху. На Беларусі "Рэйкавая вайна" праводзілася ў тры этапы. Першы этап пачаўся ў ноч на 3 жніўня 1943 г. і працягваўся да сярэдзіны верасня 1943 г. Асноўная мэта аперацыі – садзейнічаць контрнаступленню Чырвонай Арміі пад Курскам. У вызначаны час 74 тыс. партызан Беларусі нанеслі мноства магутных удараў па чыгуначных камунікацыях праціўніка. У выніку былі поўнасцю выведзены са строю чыгуначныя лініі ў раёне Бабруйска, Жлобін-Калінкавічы, Цімкавічы-Асіповічы; чыгунка на ўчастках Полацк-Маладзечна не дзейнічала 15 дзён, Мінск-Маладзечна – 10 дзён, на лініях Магілёў-Крычаў, Магілёў-Жлобін рух быў спынены на працягу ўсяго жніўня. За час першага этапа партызаны Беларусі пусцілі пад адхон 833 варожыя эшалоны і 3 бронепаязды, узарвалі 184 чыгуначныя масты і 556 мастоў на аўтамабільных дарогах. знішчылі 1429 аўтамашын і тэлефонна-тэлеграфных ліній працягласцю 392 кіламетры. Правялі шэраг паспяховых аперацый па разгрому варожых гарнізонаў.

Другі этап "рэйкавай вайны" пад умоўнай назвай "Канцэрт" праводзіўся з 19 верасня да пачатку лістапада 1943 г. За гэты прамежак часу партызаны падарвалі 90 тыс. чыгуначных рэек, 1041 эшалон, 72 чыгуначныя масты. У выніку праціўнік, нягледзячы на складанае становішча на савецка-германскім фронце, быў вымушаны падвоіць колькасць войскаў на Беларусі для аховы стратэгічных камунікацый свайго тылу.

Трэці этап "рэйкавай вайны" быў распачаты ў ноч на 20 чэрвеня 1944 г., незадоўга да правядзення савецкімі войскамі аперацыі "Баграціён". На гэтым этапе партызаны Беларусі непасрэдна ўзаемадзейнічалі з наступаючымі войскамі Чырвонай Арміі. У ходзе аперацыі яны падарвалі 61 тыс. рэек (у першы дзень 40 775), знішчылі 8 чыгуначных мастоў. Былі поўнасцю выведзены са строю

асноўныя чыгуначныя лініі, часткова паралізаваны варожыя перавозкі амаль па ўсіх дарогах Беларусі.

Аперацыя "Рэйкавая вайна" дапамагла разграміць фашысцкія войскі на розных участках фронту ў 1943-1944 гг.

Значную работу па пераўтварэнню партызанскага руху ў масавую народную вайну супраць іншаземнага нашэсця выканалі падпольныя органы кампартыі рэспублікі, якія карысталіся аўтарытэтам сярод насельніцтва Беларусі. У тыле ворага ў гады вайны выдавалася каля 170 падпольных газет, тыраж якіх налічваў мільёны экзэмпляраў. За гады вайны было выдадзена і распаўсюджана 28,5 млн. лістовак. Падпольны савецкі друк заклікаў да ўзброенай барацьбы супраць акупантаў. Ён выклікаў у насельніцтва рэспублікі не толькі інфармацыйную цікавасць, але і знаходзіў належны практычны водгук.

444 тыс. партызан і падпольшчыкаў дзейнічалі на Беларусі. Але гэта далёка не адлюстроўвае ўсяго ўдзелу насельніцтва рэспублікі ў антыфашысцкай барацьбе. Не ўсе жадаючыя змаглі стаць байцамі партызанскіх атрадаў з-за вострага недахопу зброі. Камісар Ельскага партызанскага атрада Палескай вобласці, сакратар падпольнага райкома партыі З. Я. Чарнаглаз у справаздачы начальніку БШПР П.З. Калініну ад 15 красавіка 1943 г. падкрэсліваў: "...Кожны дзень у партызанскі атрад прыходзяць людзі – просяць узяць іх у атрад, але з-за адсутнасці зброі мы іх накіроўваем назад дадому. і яны вымушаны ісці ў партызанскія атрады Украінскай ССР, каторыя знаходзяцца на тэрыторыі нашай вобласці (атрады Сабурава, Фёдарава і Мельнікава)".

У справаздачы камандавання партызанскай брыгады імя Варашылава, якая дзейнічала на тэрыторыі Баранавіцкай вобласці, паведамлялася: "...Пры наяўнасці зброі асабісты састаў брыгады мог бы быць у 4-5 разоў большм, чым існуючы".

На тэрыторыі Заходняй Беларусі партызанскі рух быў менш інтэнсіўным, чым ва ўсходніх рэгіёнах рэспублікі. Фарміраванне антыфашысцкага руху там ішло больш марудна. Яно пачалося са стварэння падпольных арганізацый, якія займаліся падборам кадраў і падрыхтоўкай матэрыяльна-тэхнічнай базы для далейшага разгортвання партызанскай барацьбы. Ядро антыфашысцкага падполля складалі ўдзельнікі нацыянальна-вызваленчага руху Заходняй Беларусі, з ліку членаў КПЗБ, КСМЗБ, і савецкія вайскоўцы-акружэнцы.

Летам 1942 г. Брэсцкая абласная падпольная антыфашысцкая арганізацыя стварыла 7 партызанскіх атрадаў у Бярозаўскім,

Брэсцкім, Камянецкім, Косаўскім, Пружанскім і Ружанскім раёнах. У пачатку 1943 г. склад гэтых атрадаў налічваў 1400 чалавек. У пачатку 1943 г. на тэрыторыі Беларусі дзейнічала 56,7 тыс. партызан, у заходніх жа раёнах рэспублікі, якія да 1939 г. знаходзіліся ў складзе Польшчы, іхналічвалася каля 11 тыс. чалавек.

Істотныя складанасці і цяжкасці беларускаму партызанскаму руху стварала на абшарах Заходняй Беларусі дзейнасць польскага падполля Арміі Краёвай (АК).

Польскія падпольныя арганізацыі нацыяналістычнага характару пачалі стварацца прадстаўнікамі эміграцыйнага ўрада Другой Рэчы Паспалітай, у тым ліку і на тэрыторыі Заходняй Беларусі, ужо восенню 1939 г. Самай вялікай і ўплывовай сярод іх быў Саюз узброенай барацьбы. Гэта арганізацыя стала ядром польскай ваеннай арганізацыі – Арміі Краёвай, утворанай у лютым 1942 г. Галоўнай мэтай АК было адраджэнне незалежнай польскай дзяржавы ў межах 1939 г. Таму значныя сілы АК праводзілі свае ўзброеныя акцыі на Беларусі як супраць нямецкіх акупантаў і мясцовых беларускіх калабарацыяністаў, так і супраць савецкіх партызан і падпольшчыкаў, асабліва пасля разрыву ў красавіку 1943 г. адносін паміж СССР і польскім эмігранцкім урадам у Лондане. За асенне-летні перыяд 1943-1944 гг. атрады Навагрудскай акругі АК правялі 81 аперацыю супраць беларускіх партызан. Асаблівай актыўнасцю адрознівалася Стаўбцоўскае злучэнне пад камандаваннем А. Пільха, якое за адзначаны вышэй час правяло 32 аперацыі і ніводнай супраць немцаў. Пры гэтым размова ідзе не толькі аб дробных сутычках беларускіх партызан і АК, але і аб баявых дзеяннях, у якіх удзельнічалі сотні байцоў з абодвух бакоў. Так, 8 мая 1944 г. каля в. Целяшэвічы Дзяржынскага раёна адбылося ўзброенае сутыкненне асноўных сіл Стаўбцоўскага злучэння АК і некалькіх атрадаў партызанскай брыгады імя І. Сталіна, у якім прымалі ўдзел 500 чалавек злучэння Арміі Краёвай і 200 беларускіх партызан. У выніку польскі бок страціў 40 чалавек забітымі і столькі ж параненымі, не абышлося без страт і ў беларускіх партызан.

Адначасова з разгортваннем барацьбы супраць беларускіх партызан па ініцыятыве польскага боку з канца 1943 г. пачалося супрацоўніцтва камандавання атрадаў АК з германскімі акупацыйнымі ўладамі. Яно праявілася ў прыпыненні распачатага ў 1942 г. нямецкімі акупацыйнымі ўладамі антыпольскага палітычнага курсу на Беларусі, у забеспячэнні зброяй і амуніцыяй злучэнняў АК. Атрыманыя зброя і амуніцыя ішлі ў распараджэнне камандуючага Навагрудскай акругі АК падпалкоўніка Я. Праўдзіча-Шляскага. Ёсць

матэрыялы, якія сведчаць і аб супрацоўніцтве АК з германскімі ўладамі на тэрыторыі Вілейскай вобласці. Напярэдадні ажыццяўлення Чырвонай Арміяй аперацыі "Баграціён" у чэрвені 1944 г. узброеныя фарміраванні Арміі Краёвай на тэрыторыі Заходняй Беларусі налічвалі каля 20 тыс. салдат і афіцэраў. Найбольш буйнымі атрадамі АК на Беларусі былі фарміраванні Навагрудскай акругі, якія аб'ядноўвалі звыш 7 тыс. чалавек асабовага складу.

У адносінах да ўсіх сацыяльных слаёў і палітычных плыняў беларускага грамадства, якія не падтрымлівалі або адкрыта выступалі супраць ідэі адраджэння польскай дзяржаўнасці ў межах 1939 г., войскі АК выкарыстоўвалі тактыку агню і зброі. Асабліва шырока гэтую тактыку атрады АК выкарыстоўвалі ў апошнія гады нямецкай акупацыі Беларусі (1943-1944), калі стала відавочным паражэнне фашысцкай Германіі. Так, у 1944 г. атрад АК спаліў вёску Лукашы Заслаўскага раёна Мінскай вобласці разам з жыхарамі. 24 і 25 лютага 1944 г. былі знішчаны вёскі Турэйск і Забор'е Жалудоцкага раёна Баранавіцкай вобласці.

Легіянерамі Стаўбцоўскага злучэння АК, - піша ў мемуарах А. Пільх, - са снежня 1943 г. да канца чэрвеня 1944 г. было забіта каля 6 тыс. бальшавікоў, гэта значыць сваякоў савецкіх партызан і прадстаўнікоў нацыянальна свядомай беларускай інтэлігенцыі, галоўным чынам, старых, жанчын, дзяцей. Такое ж назіралася і на тэрыторыі Лідскай акругі, дзе за люты-красавік 1944 г. ад рук польскага падполля Арміі Краёвай загінула некалькі тысяч чалавек.

Не спынялася дзейнасць АК нават і перад забойствам праваслаўных беларускіх святароў. Па ініцыятыве вядомага беларускага дзеяча протаіерэя, настаяцеля прыхода ў Крэве Міхаіла Леванчука была адчынена беларуская школа, дзе настаўнікамі былі яго дачка і пляменніца. Патрыятычная дзейнасць айца Міхаіла выклікала злосць у падпольшчыкаў АК. Яны неаднойчы папярэджвалі і нават пагражалі. У адзін з вечароў 1943 г. атрад АК акружыў яго дом. На вачах родных святара М. Леванчука застрэлілі, а потым забілі яго дачку і пляменніцу.

Узброеныя акцыі фарміраванняў Арміі Краёвай на Беларусі падчас нямецкай акупацыі Беларусі былі накіраваны супраць патрыятычна настроенага карэннага насельніцтва. Ахвярамі дзейнасці польскага нацыяналістычнага падполля на Беларусі ў гады Другой сусветнай вайны сталі 10 тыс. грамадзян БССР. У асноўным гэта былі мірныя жыхары, партызанскія сем'і, прадстаўнікі нацыянальнай беларускай інтэлігенцыі.

ЦК КП(б)Б і БШПР прынялі рашэнне аб узмацненні партызанскіх фарміраванняў на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Восенню 1943 г. туды было перакінута з усходніх і цэнтральных раёнаў рэспублікі 9 партызанскіх брыгад і 10 асобных атрадаў, што ўзмацніла сілы беларускіх партызан. Іх колькасць узрасла з 11,1 тыс. да 36,8 тыс. чалавек.

Акрамя ўзброенай барацьбы партызан і падпольшчыкаў, назіраліся і іншыя формы супраціўлення насельніцтва варожаму нашэсцю. Найбольш распаўсюджанай з іх была такая форма супраціўлення як сабатаж гаспадарчых мерапрыемстваў акупацыйных уладаў. Германскія ўлады кваліфікавалі сабатаж як правядзенне дыверсіі. Так, у загадзе Прапойскай раённай управы Магілёўскай вобласці ад 21 ліпеня 1942 г. паведамлялася: "За апошні час зусім прыпынілася паступленне яек, малака і іншых прадуктаў харчавання, амаль ад усіх валасцей раёна, не гаворачы аб рабочай і цяглавай сіле, неабходнай для будаўніцтва ў Прапойску". Аб гэтай з'яве сведчыць і загад № 21 ад 27 студзеня 1943 г. Чачэрскай раённай управы Гомельскай вобласці: "Нягледзячы на неаднаразовыя распараджэнні раённага ўпраўлення і мясцовай камендатуры аб выкананні плана лесанарыхтовак і лесавывазак, - гаварылася ў ім, - даведзены да насельніцтва план выконваецца зусім нездавальняюча. З Залескай, Бердыжскай валасцей на працягу шасці дзён (з 18 па 23 студзеня 1943 г.) не выслана ніводнага лесаруба і ніводнай падводы на лесанарыхтоўкі і лесавывазкі. З Глыбоцкай воласці 19, 22, 23 студзеня не было выслана ніводнага лесаруба на работу. Астатнія воласці раёна выслалі за гэты перыяд усяго толькі 10 працэнтаў рабочай і гужавой сілы на выкананне плана лесанарыхтовак і лесавывазак, што з'яўляецца відавочным злачынствам, якое пагражае невыкананнем ваеннага задання..." І такіх прыкладаў на акупіраванай праціўнікам тэрыторыі Беларусі было шмат.

Партызаны і падпольшчыкі Беларусі сваёй дзейнасцю ў гады Другой сусветнай вайны нанеслі нямецкім акупантам значныя страты ў жывой сіле і тэхніцы, дэмаралізавалі дзейнасць варожага тылу, чым істотна паспрыялі поспеху Чырвонай Арміі на франтах Вялікай Айчыннай вайны. За гераізм і адвагу каля 140 тыс. партызан і падпольшчыкаў былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі, 88 з іх прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Асаблівай старонкай гісторыі Другой сусветнай вайны з'яўляецца ўдзел нашых суайчыннікаў у антыфашысцкай барацьбе, якая разгарнулася ў Еўропе. З пачатку Вялікай Айчыннай вайны складвалася польска-савецкае супрацоўніцтва. У адпаведнасці з

ваенным пагадненнем ад 14 жніўня 1941 г. паміж СССР і Польшчай прадугледжвалася стварэнне на тэрыторыі СССР польскай арміі. З канца жніўня 1941 г. пачалася практычная рэалізацыя пагаднення. Камандуючым арміі польскі эміграцкі ўрад прызначыў генерала У. Андэрса. Першапачаткова планавалася стварыць 30-тысячную польскую армію, аднак добраахвотнікаў з'явілася значна больш. У сакавіку 1942 г. польская армія ў СССР налічвала звыш 75 тыс. салдат і афіцэраў, з якіх каля 10% былі ўраджэнцамі Заходняй Беларусі. Цікава, што ў складзе польскай арміі, якая была сфарміравана ў СССР у 1943-1944 гг. пад камандаваннем генерала З. Берлінга, колькасць нашых суайчыннікаў была амаль такой самай.

Са згоды Савецкага ўрада польская армія генерала Андэрса была эвакуіравана ў 1942 г. у паўднёвыя раёны Ірана і Ірака. У чэрвені 1943 г. з яе складу быў вылучаны 2-гі корпус для ўдзелу ў баявых аперацыях саюзных войскаў. Значную частку гэтага злучэння складалі ўраджэнцы Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі. Польскі корпус у складзе 8-й брытанскай арміі вызначыўся ў Італіі ў бітве за Монтэ-Касіна. У гэтай бітве вырашаўся лёс наступлення англа-амерыканскіх войскаў на Рым. Баявая аперацыя пачалася 17 студзеня, а завяршылася 1 мая 1944 г., калі салдаты 2-га польскага корпуса прарвалі нямецкую абарону, так званую "Лінію Густава", і авалодалі цэнтрам варожага супраціўлення – горным кляштарам Монтэ-Касіна. У час наступлення корпуса вызначылася вялікая колькасць беларусаў (І. Буглак, Р. Буслак, І. Віршыч, С. Голуб, І. Драчынскі, Т. Купрыян, Б. Шчыкоўскі, У. Пашкоўскі, І. Станкевіч, П. Сыч, А. Цаюн, У. Юргілевіч, С. Янкоўскі). Многія з іх атрымалі высокія брытанскія і польскія баявыя ўзнагароды. Поспех 2-га польскага корпуса пад Монтэ-Касіна быў аплачаны вялікай крывёю. Ён страціў 70% асабовага складу.

У гады Вялікай Айчаннай вайны дзесяткі тысяч нашых землякоў апынуліся ў нямецкім палоне ці былі вывезены ў акупіраваныя германскімі войскамі краіны Еўропы. Многія з іх збеглі з палону і працягвалі барацьбу супраць фашызму ў еўрапейскім руху Супраціўлення. Яны змагаліся ў антыфашысцкіх атрадах Італіі, Францыі, Югаславіі, Славакіі, Чэхіі і Польшчы. Дзесяткі ўраджэнцаў Беларусі былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі гэтых краін. Так, у дэпартаменце Марбіян у Францыі ў французскім Супраціўленні змагаўся ўраджэнец Магілёўшчыны лейтэнант Ф. Кажамякін. Пасмяротна ён быў адзначаны вышэйшай узнагародай Францыі – ордэнам Ганаровага легіёна.

Інжынер з Дзяржынска А. Варанкоў удзельнічаў у стварэнні партызанскага атрада з былых савецкіх ваеннапалонных у Бельгіі, быў начальнікам штаба гэтага атрада, а потым – інтэрнацыянальнай антыфашысцкай брыгады "За Радзіму". У ліку 30 іншых савецкіх партызан быў узнагароджаны вышэйшым бельгійскім ваенным ордэнам.

Ураджэнец Віцебшчыны В.А. Квіцінскі камандаваў Асобай партызанскай брыгадай імя К. Готвальда, якая вызначылася ў Славацкім нацыянальным паўстанні 1944 г. За ўмелае камандаванне брыгадай і асабістую мужнасць у час паўстання В.А. Квіцінскаму было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. За актыўны ўдзел у барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі на славацкай зямлі Героем Савецкага Саюза таксама стаў гамельчанін Б.Ф. Калач.

Вядома ў Еўропе імя ўраджэнца Магілёўшчыны В. Мяшкова, які ўзначальваў партызанскі атрад "Ягуар". Атрад дзейнічаў на тэрыторыі паўночнай Францыі і паўднёвай Бельгіі. На яго баявым рахунку шмат удалых аперацый, у тым ліку і знішчэнне нямецкай радыёлакацыйнай станцыі пад Клермонам, адкуль праводзілася карэкціроўка палётаў нямецкіх ра-кет "ФАУ-1" і "ФАУ-2" у час бамбардзіроўкі імі Лондана. Падобных прыкладаў барацьбы нашых суайчыннікаў супраць агульнага ворага ў краінах Еўропы шмат.

**Вызваленне Беларусі і Еўропы. Завяршальны этап вайны.** Разгром нямецкіх войскаў летам 1943 г. на Курска-Арлоўскай дузе дазволіў Чырвонай Арміі перайсці ў стратэгічнае наступленне і ўжо ў верасні 1943 г. распачаць шырокамаш-табную аперацыю вызвалення Украіны і Беларусі. 23 верасня 1943 г. часці 8-й (камандзір – палкоўнік П.А. Гудзь) і 74-й (камандзір – генерал-маёр А.А. Казаран) дывізій 15-га стралковага корпуса Цэнтральнага фронту фарсіравалі Днепр і вызвалілі ад нямецкіх акупантаў першы раённы цэнтр Палескай вобласці – гарадскі пасёлак Камарын. 20 воінам, якія вызначыліся пры фарсіраванні Дняпра ў раёне Камарына, было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

А праз некалькі дзён злучэнні 65-й арміі на ўчастку Карповічы-Уборкі фарсіравалі раку Сноў і з баямі 27 верасня вызвалілі раёны цэнтр Цярахоўка Гомельскай вобласці.

У ходзе правядзення Смаленскай аперацыі войскі Заходняга і Бранскага франтоў 26 верасня ўступілі на зямлю Беларусі і вызвалілі раённы цэнтр Хоцімск Магілёўскай вобласці. Праз два дні ў час цяжкіх баёў войскі 49-й арміі фарсіравалі раку Сож і вызвалілі г. Мсціслаў. 29 верасня войскі 50-й арміі Бранскага фронту авалодалі г.

Крычавам. 1 кастрычніка былі вызвалены райцэнтры Магілёўскай вобласці Чэрыкаў і Краснаполле.

Стаўка Вярхоўнага Галоўнакамандавання паставіла задачу перад войскамі трох франтоў: Калінінскага, Заходняга і Цэнтральнага (апошні 20 кастрычніка 1943 г. перайменаваны ў Беларускі фронт) – разграміць нямецкую армейскую групоўку "Цэнтр" і вызваліць ад ворага ўсю тэрыторыю Беларусі. У адпаведнасці з дырэктывай Стаўкі Калінінскаму фронту прадпісвалася нанесці ўдар у напрамку Віцебск-Полацк-Даўгапілс, маючы на мэце авалоданне сталіцай Латвіі. Войскі Заходняга фронту павінны былі нанесці ўдар у напрамку Орша-Магілёў, вызваліць гэтыя гарады і ў далейшым працягваць наступленне на Барысаў, Маладзечна, авалодаць Вільнюсам. Беларускаму фронту ставілася задача наступаць на Жлобін, Бабруйск і ў далейшым вызваліць Мінск.

Стаўка Вярхоўнага Галоўнакамандавання зыходзіла з меркавання, што вермахт у летняй кампаніі 1943 г. панёс вялікія страты, канчаткова дэмаралізаваны і таму не зможа стрымаць пераможнага наступлення Чырвонай Арміі на беларускім напрамку. Аднак вермахт восенню 1943 г. паказаў, што яшчэ не страціў сваёй баяздольнасці.

6 кастрычніка 1943 г. пачалося наступленне савецкіх войскаў на Віцебскім напрамку. Ужо на другі дзень часці 3-й і 4-й савецкіх армій вызвалілі ад немцаў Невель і 320 іншых населеных пунктаў. Войскі Калінінскага фронту атрымалі плацдарм для наступлення на Віцебск і Полацк. Аднак замацаваць свой поспех яны не здолелі. Германскае камандаванне перакінула ў раён Гарадка з іншых участкаў фронту 7 пяхот-ных і 1 танкавую дывізіі. Наступленне войскаў Калінінскага фронту было спынена. У дырэктыве Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандавання ад 16 кастрычніка 1943 г. адзначалася: "Войскі Калінінскага фронту сваёй задачы не выканалі. Да 10 кастрычніка г. Віцебскам не авалодалі".

Гарадоцкая наступальная аперацыя была адноўлена толькі ў снежні 1943 г. Гарадок быў вызвалены 24 снежня 1943 г. часцямі 11-й гвардзейскай і 43-й армій. Страты войскаў Калінінскага фронту на Віцебскім намрамку ў кастрычніку-снежні 1943 г. склалі 169 тыс. чалавек.

У асенне-зімовай кампаніі 1943-1944 гг. войскі Беларускага фронту (камандуючы генерал арміі К. К. Ракасоўскі) удала правялі Гомельска-Рэчыцкую і Калінкавіцка-Мазырскую аперацыі, у выніку якіх 18 лістапада 1943 г. быў вызвалены горад Рэчыца, 26 лістапада – Гомель і 14 студзеня 1944 г. – Мазыр. На поўдні рэспублікі войскі Беларускага фронту прасунуліся больш як на 200 кіламетраў у глыб

варожай абароны ў паласе шырынёй звыш 100 кіламетраў. У той самы час савецкія войскі вызвалілі яшчэ некалькі раёнаў Віцебскай і Магілёўскай абласцей.

На пачатку лета 1944 г. лінія фронту на Беларусі праходзіла на ўсход ад Полацка, Віцебска, Оршы, Магілёва, Жлобіна, Бабруйска, далей на захад ад Мазыра і па рацэ Прыпяць да Ковеля. Канчатковае выгнанне нямецка-фашыскіх акупантаў з беларускай зямлі пачалося ў чэрвені 1944 г., калі Чырвоная Армія прыступіла да практычнага ажыццяўлення буйной стратэгічнай аперацыі пад кодавай назвай "Баграціён". Працягвалася яна з 23 чэрвеня па 29 жніўня 1944 г. Планавалася прарваць абарону нямецкіх войскаў на цэнтральным участку савецка-германскага фронту, расчляніць групу армій "Цэнтр" (камандуючы генерал-фельдмаршал Э. Буш, якога 28 чэрвеня 1944 г. змяніў генерал-фельдмаршал Э. Модэль) і разграміць іх паасобку.

Савецкаму боку ў гэтай аперацыі супрацьстаяла магутная групоўка армій "Цэнтр", дзве армейскія групоўкі "Поўнач" і "Паўночная Украіна". Агульная колькасць праціўніка складала каля 1,2 млн. салдат і афіцэраў (63 дывізіі і 3 брыгады). На ўзбраенні іх было 9500 гармат і мінамётаў, 900 танкаў і штурмавых гармат, 1350 баявых самалётаў. З савецкага боку для ўдзелу ў аперацыі "Баграціён" былі прыцягнуты войскі 1-га, 2-га і 3-га Беларускіх франтоў (камандуючыя: генерал арміі, з 29 чэрвеня Маршал Савецкага Саюза К.К. Ракасоўскі, генерал арміі Г.Ф. Захараў і генерал-палкоўнік І.Д. Чарняхоўскі), а таксама войскі 1-га Прыбалтыйскага фронту (камандуючы генерал арміі І. Х. Баграмян). Агульная колькасць савецкіх войскаў складала 2,4 млн. салдат і афіцэраў, 36 400 гармат і мінамётаў, 5200 танкаў і самаходных артылерыйскіх установак і 5300 самалётаў (без уліку авіяцыі далёкага дзеяння). Савецкія войскі перавышалі праціўніка ў жывой сіле ў 2 разы, у гарматах і мінамётах у 3,8 раза, у танках і самалётах у 3,9 раза. Да таго ж, у тыле ворага дзейнічалі 150 партызанскіх брыгад і 49 асобных атрадаў агульнай колькасцю больш за 143 тыс. чалавек.

У адпаведнасці з планам асаблівае значэнне ў аперацыі "Баграціён" надавалася разгрому найбольш моцных флангавых нямецкіх вайсковых груповак. 23 чэрвеня 1944 г. войскі 43-й арміі 1-га Прыбалтыйскага фронту прарвалі абарону нямецкіх войскаў на паўночным захадзе ад Віцебска. Войскі 39-й арміі 3-га Беларускага фронту прарвалі абарону праціўніка і абышлі г. Віцебск з паўднёвага і паўднёва-заходняга напрамку. Ноччу 25 чэрвеня часці 43-й і 39-й армій злучыліся каля в. Гняздзілавічы Бешанковіцка-га раёна, канчаткова замкнуўшы акружэнне віцебскай групоўкі нямецкіх

войскаў. Удар савецкіх войскаў пад Віцебскам быў моцным і нечаканым для праціўніка, аб чым сведчыць камандзір 197-й нямецкай пяхотнай дывізіі палкоўнік Проя, які трапіў у палон: "Нашы войскі не вытрымалі знішчальных udараў рускіх і пачалі адступаць, не маючы на тое загаду. Рускія праследавалі нас, расчлянялі нашы палкі і наносілі ім цяжкія страты. Палкі знішчаліся літаральна на вачах. Салдаты кідалі гарматы, транспартныя сродкі, боепрыпасы, ваенную маёмасць і нават асабістую зброю і, як шалёныя, разбягаліся".

У Віцебскі "кацёл" трапіла 5 дывізій 3-й нямецкай танкавай арміі, якія на 27 чэрвеня 1944 г. былі знішчаны. Праціўнік страціў там каля 20 тыс. салдат і афіцэраў забітымі, больш за 10 тыс. палоннымі.

Аперацыя па акружэнню і знішчэнню варожай групоўкі пад Віцебскам мела свае асаблівасці. Яна была праведзена агульнавайсковымі арміямі пры падтрымцы авіяцыі і без удзелу буйных танкавых злучэнняў. Баявыя дзеянні насілі скарацечны характар. Ужо на трэці дзень варожая групоўка трапіла ў акружэнне, а на чацвёрты спыніла сваё існаванне. 26 чэрвеня Віцебск быў вызвалены ад акупантаў.

Амаль адначасова з падзеямі пад Віцебскам 3-я, 48-я, 65-я арміі 1-га Беларускага фронту ў ходзе Бабруйскай аперацыі акружылі 6 дывізій нямецкай арміі. Важнейшай асаблівасцю аперацыі па знішчэнню бабруйскай групоўкі праціўніка было масіраванае выкарыстанне авіяцыі фронту. 526 самалётаў 16-й паветранай арміі 1-га Беларускага фронту на працягу некалькіх гадзін групамі па 25-30 самалётаў наносілі ўдары па акружанай групоўцы. 28 чэрвеня 1944 г. варожая групоўка колькасцю ў 40 тыс. салдат і афіцэраў была ліквідавана.

Працягваючы паспяхова распачатае наступленне войскі 3-га Беларускага фронту 3 ліпеня 1944 г. вызвалілі сталіцу Беларусі. Першым у Мінск уварваўся танк малодшага лейтэнанта Д.Г. Фролікава 2-га гвардзейскага танкавага корпуса. У 2 гадзіны 30 мінут 3 ліпеня 1944 г. ён перадаў па радыё: "Я – Фролікаў, я – Фролікаў, знаходжуся ў Мінску...". А ўжо праз некалькі хвілін пасля паведамлення Д.Г. Фролікава ў Мінск літаральна ўварваліся асноўныя сілы 4-й гвардзейскай танкавай брыгады 2-га гвардзейскага танкавага корпуса (камандзір – генерал-маёр А.С. Бурдзейны).

Услед за танкістамі рушылі ў бой за вызваленне Мінска часці 11-й і 31-й агульнавайсковых армій. Геаічна змагаліся на вуліцах Мінска воіны перадавых батальёнаў 220-й і 352-й стралковых дывізій. Першым у будынак чыгуначнага вакзала ўварваўся старшы сяржант

А.Г. Ляпусцін. Ён ва ўпор расстраляў варожых салдат, што ўмацаваліся там, гранатай знішчыў варожы кулямёт і ўзняў над будынкам Чырвоны сцяг перамогі. Радавы Сувораў з 1315-га стралковага палка першым уварваўся ў Дом Урада, устанавіў над ім дзяржаўны сцяг і зрабіў надпіс: "Здесь воевал Суворов из подразделення Мирошникова". У другой палове дня 3 ліпеня 1944 г. у Мінску не было ўжо ніводнага варожага салдата.

Адначасова на ўсходзе ад Мінска была акружана 105-тысячная групоўка нямецкіх войскаў, якая 11 ліпеня 1944 г. перастала існаваць. Такім чынам, на першым этапе аперацыі за 12 дзён наступлення савецкія вайсковыя злучэнні прасунуліся наперад на 225-280 кіламетраў. Галоўныя сілы групы армій "Цэнтр" былі разбіты. У паласе савецка-германскага фронту з'явіўся пралом шырынёй звыш 400 кіламетраў. Спробы ліквідаваць яго не прынеслі поспеху германскаму камандаванню.

Пасля вызвалення Мінска пачаўся другі этап аперацыі (5 ліпеня - 29 жніўня 1944 г.), падчас якога Чырвоная Армія завяршыла знішчэнне акружанага каля Мінска праціўніка. Як развіццё плана "Баграціён", былі ажыццёўлены таксама наступальныя аперацыі – Віленюская, Беластоцкая, Люблін-Брэсцкая і Шаўляйская. Вызваленнем 28 ліпеня г. Брэста было завершана выгнанне нямецка-фашысцкіх войскаў з тэрыторыі Беларусі.

У выніку рэалізацыі другога этапа Беларускай аперацыі была поўнасцю разгромлена групоўка армій "Цэнтр", нанесена рашаючае паражэнне групоўкам "Поўнач" і "Паўночная Украіна" і рэзервовым войскам, што былі перакінуты ў Беларусь з Германіі, Нарвегіі, Італіі, Галандыі. Да канца жніўня Чырвоная Армія прасунулася на захад на 500-600 кіламетраў у паласе шырынёй 1100 кіламетраў і дасягнула прыгарада Варшавы – Прагі. Вялікае значэнне для забеспячэння паспяховых баявых дзеянняў савецкіх войскаў напярэдадні і ў ходзе аперацыі мела добра наладжанае ўзаемадзеянне франтавых фарміраванняў з беларускімі партызанамі. Дастаткова сказаць, што толькі за час трэцяга этапа аперацыі "рэйкавая вайна", распачатай партызанамі за тры дні да аперацыі "Баграціён", было падарвана 61 тыс. рэек, 8 чыгуначных мастоў.

Поўнасцю выведзены са строю асноўныя чыгуначныя магістралі рэспублікі.

У ходзе Беларускай аперацыі былі разгромлены 17 дывізій і 3 брыгады праціўніка, а 50 дывізій – страцілі звыш паловы свайго складу. Агульныя страты нямецкіх войскаў і іх саюзнікаў склалі каля 500 тыс. салдат і афіцэраў. Урон з савецкага боку быў таксама

істотным: Чырвоная Армія страціла 765 815 салдат і афіцэраў (з якіх 178 507 чалавек забітымі).

У выніку аперацыі "Баграціён" Чырвоная Армія вызваліла Беларусь, частку Літоўскай і Латвійскай ССР, уступіла на тэрыторыю Польшчы і падступіла да межаў Усходняй Прусіі. Германскае камандаванне было вымушана перакінуць з Заходняга фронту ў Еўропе на беларускі тэатр ваенных дзеянняў 46 дывізій і 4 брыгады, што значна паспрыяла паспяховаму правядзенню аперацый англа-амерыканскіх войскаў у Францыі.

На працягу ўсёй Беларускай наступальнай аперацыі салдаты і афіцэры Чырвонай Арміі паказвалі ўзоры масавага гераізму. Кожны дзень у баях за Беларусь савецкія воіны здзяйснялі сотні геройчных учынкаў. 17 гадзін вёў няроўны бой у г. Барысаве экіпаж легендарнага танка Т-34 у складзе П.М. Рака (камандзір), А А. Пятраева, А.І. Данілава, які 30 чэрвеня 1944 г. імкліва праскочыў мост на рацэ Бярэзіне. У выніку былі падбіты 2 варожыя танкі, знішчана камендатура, штаб і вызвалены з няволі 200 савецкіх ваеннапалонных. Экіпаж танка загінуў у няроўным баі. Танкістам пасмяротна было прысвоена званне Герояў Савецкага Саюза.

У баі за вёску Сычкава Бабруйскага раёна здзейсніў подзвіг сяржант М.Р. Селязнёў. 30 чэрвеня 1944 г. рота, у складзе якой ваяваў Селязнёў, вяла бой за авалоданне вёскай. Калі воіны ўжо ўварваліся ў варожыя акопы, праціўнік адкрыў знішчальны агонь з дзота, які знаходзіўся на флангу наступаючага савецкага падраздзялення. Рухацца да вёскі было немагчыма. Рота залягла. Знішчэнне агнявой кропкі было даручана аддзяленню пад камандаваннем М.Р. Селязнёва. У агнявой дуэлі з варожым дзотам воіны расходавалі ўсе патроны і гранаты, але зусім блізка падпаўзлі да яго. А вораг працягваў весці шчыльны агонь па баявых парадках роты, сеючы смерць сярод усё новых дзесяткаў таварышаў па зброі. У гэты крытычны момант бою сяржант Селязнёў кінуўся да дзота і закрыў амбразуру сваім целам. Нямецкі кулямёт замаўчаў. Рота выканала баявую задачу, страціўшы некалькі дзесяткаў байцоў, сярод іх і сына ўдмурцкага народа Міхаіла Рыгоравіча Селязнёва. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР яму пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Яшчэ адзін подзвіг цаной свайго жыцця пры выкананні воінскага абавязку здзейсніў лётчык 75-га гвардзейскага штурмавога авіяпалка лейтэнант М.І. Кірэеў. Буйная групоўка нямецкіх войскаў, спрабуючы вырвацца з акружэння 5 ліпеня 1944 г., пачала пераправу праз р. Волму. Лётчыкі палка атрымалі загад разбамбіць пераправу.

Лейтэнант Кірэеў першым узняўся ў паветра. Варожы снарад трапіў у матор самалёта. Кірэеў накіраваў ахоплены полымем самалёт на калону варожай тэхнікі. Такі ж подзвіг пад Мінскам здзейсніў і камандзір звяна 74-га гвардзейскага авіяпалка лейтэнант І.В. Бярэзін. Наогул, у баях за Беларусь вызначылася больш за 402 тыс. воінаў Савецкай Арміі, якія былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі, а больш як 1500 салдатам, афіцэрам і генералам было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Акрамя таго ў час Беларускай бітвы вызначыліся 600 вайсковых часцей і злучэнняў, якія атрымалі ганаровыя імёны па назвах гарадоў і геаграфічных аб'ектаў нашай рэспублікі – "Віцебскіх", "Барысаўскіх", "Магілёўскіх" і інш.

Такім чынам, у выніку аперацыі "Баграціён" стратэгічнае становішча на Усходнім фронце карэнным чынам змянілася на карысць Чырвонай Арміі. Савецкія войскі ўступілі на тэрыторыю Польшчы, непасрэдна наблізіліся да дзяржаўнай мяжы з Германіяй. Вялікая Айчынная вайна савецкага народа супраць фашысцкай Германіі ўступіла ў сваю канчатковую стадыю.

Пасля завяршэння аперацыі "Баграціён" было праведзена 20 буйных наступальных аперацый, якія вызначылі канчатковую перамогу краін антыгітлераўскай кааліцыі над нямецка-фашысцкім блокам і мілітарысцкай Японіяй.

У ходзе летне-асенняга наступлення 1944 г. толькі ў трох ваенных аперацыях – Беларускай, Львоўска-Сандамірскай і Яска-Кішынёўскай – на фронце працягласцю 2200 кіламетраў – ад Заходняй Дзвіны да Чорнага мора – было разгромлена звыш 170 дывізій праціўніка. Амаль поўнасцю была вызвалена тэрыторыя СССР. Выведзены з вайны саюзнікі Германіі – Румынія, Балгарыя, Фінляндыя і Венгрыя.

У час зімне-вясенняй наступальнай кампаніі 1945 г. Вялікай Айчыннай вайны пры вызваленні Еўропы вызначыліся тысячы воінаў-беларусаў.

12 студзеня 1945 г. войскі шасці франтоў, у тым ліку трох Беларускіх, пачалі Усходне-Прускую, Вісла-Одэрскую і Заходне-Карпацкую наступальныя аперацыі. Савецкае камандаванне змагло забяспечыць значную перавагу над праціўнікам у жывой сіле, а таксама ў тэхніцы.

Наступленне пачалося раней запланаванага тэрміну па просьбе саюзнікаў, якія трапілі ў цяжкае становішча ў раёне Ардэн, але праходзіла паспяхова. У выніку гэтых аперацый было знішчана і разгромлена больш за 100 дывізій, вызвалена амаль уся Польшча і

частка Чэхаславакіі. Савецкія войскі прасунуліся на захад больш чым на 500 кіламетраў, выйшлі на р. Одру за 60 кіламетраў ад Берліна.

Пры вызваленні польскай сталіцы – Варшавы – вылучыліся салдаты і афіцэры 47-й арміі, якой камандаваў ураджэнец Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці, генерал-лейтэнант Ф.І. Перхаровіч. Пад яго кіраўніцтвам войскі прарвалі добра ўмацаваную абарону праціўніка і хутка фарсіравалі раку Віслу, чым у значнай ступені паспрыялі поспеху ўсёй Вісла-Одэрскай аперацыі. За ўмелае кіраўніцтва войскамі і асабістую мужнасць генерал-лейтэнант Ф.І. Перхаровіч быў удастоены звання Героя Савецкага Саюза.

Гераічна змагаліся на польскай зямлі тысячы салдат і малодшых камандзіраў, выхадцаў з Беларусі. Радавы П.В. Касцючык, баец 218-га стралковага палка, ураджэнец Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці 15 студзеня 1945 г. у крытычны момант бою закрыў сабой амбразуру варожага дзота каля вёскі Мішаўры Радамскага ваяводства. П.В. Касцючык цаной свайго жыцця забяспечыў паспяховае наступленне савецкіх войскаў. Яму было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. А ўсяго 61 воін-беларус за свае гераічныя ўчынкі, здзейсненыя пры вызваленні Польшчы быў удастоены вышэйшай узнагароды краіны. Ім было нрысвоена званне Герояў Савецкага Саюза. Сярод іх 8 генералаў, 40 афіцэраў і 13 салдат і сяржантаў.

У выніку цяжкіх баёў у лютым-сакавіку 1945 г. на тэрыторыях Усходняй Памераніі, Сілезіі, Аўстрыі, Польшчы, Венгрыі і Чэхаславакіі савецкімі войскамі былі вырашаны буйныя стратэгічныя задачы і створаны ўмовы для штурму Берліна.

Савецкае камандаванне з гэтай мэтай падрыхтавала магутную армейскую групоўку ў складзе 1-га Беларускага, 2-га Беларускага, 1-га Украінскага франтоў, Дняпроўскай ваеннай флатыліі, а таксама 1-й і 2-й армій Войска Польскага. Гэта групоўка мела ў сваім складзе каля 2,5 млн. чалавек, больш за 41 000 гармат і мінамётаў, больш за 6250 танкаў і 7500 самалётаў. Суадносіны ў сілах у параўнанні з немцамі складалі: у людзях – 2,5:1, у артылерыі – 4:1, у танках і САУ – 4,1: 1, у авіяцыі – 2,3:1.

Штурм Берліна пачаўся 16 красавіка 1945 г. Дзесяць дзён спатрэбілася савецкім войскам, каб пераадолець абарону немцаў на подступах да горада. Больш за тыдзень доўжыліся баі ў самім Берліне. 8 мая 1945 г. у прыгарадзе Берліна, Карлсхорсце, у прысутнасці прадстаўнікоў камандавання саюзных армій, немцамі быў падпісаны акт аб безагаворачнай капітуляцыі.

Тысячы нашых землякоў удзельнічалі ў баях на тэрыторыі Германіі. 70-ці з іх было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. У

іх ліку вызначылася 7 генералаў і адміралаў, 50 афіцэраў і 12 салдат і малодшых камандзіраў.

26 лётчыкаў-беларусаў за праяўленую мужнасць у небе Германіі атрымалі званне Героя Савецкага Саюза. У час баёў над Усходняй Прусіяй атрымаў другую Залатую Зорку героя П.Я. Галавачоў. На вышыні 9000 метраў ён пратараніў варожы самалёт і здолеў вярнуцца на свой аэрадром на пашкоджаным самалёце. За гады вайны П.Я. Галавачоў зрабіў 457 баявых вылетаў, удзельнічаў у 127 паветраных баях, асабіста знішчыў 31 нямецкі самалёт.

Заключнай аперацыяй Узброеных Сіл СССР у Другой сусветнай вайне былі ваенныя дзеянні на Далёкім Усходзе. У жніўні 1945 г. за 23 дні савецкія воіны прымусілі капітуліраваць мільённую японскую Квантунскую армейскую групоўку. Тысячы беларусаў вызначыліся і ў гэтай бітве, у тым ліку войскі, якімі камандаваў ураджэнец Ляхавіцкага раёна Брэсц(496)кай вобласці генерал Г.С. Здановіч. Падначаленая яму 203-я стралковая дывізія з упартымі баямі прайшла 1350-кіламетровы марш па цяжкапраходнай мясцовасці Маньчжурскага плато Вялікага Хінгана, фарсіравала р. Ляохэ, авалодала горадам Фусінь. За здзейснены подзвіг Г.С. Здановічу прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

2 верасня 1945 г., у Такійскай бухце, на борце амерыканскага лінкора "Місуры", быў падпісаны акт аб безагаворачнай капітуляцыі Японіі. Другая сусветная вайна закончылася.

На ўсіх этапах Вялікай Айчыннай вайны беларускі народ уносіў свой уклад у перамогу над фашызмам.

Звыш 1,3 млн. жыхароў Беларусі былі мабілізаваны і добраахвотна ўступілі ў рады Чырвонай Арміі, у тым ліку больш чым 194 тыс. чалавек з расфарміраваных партызанскіх злучэнняў рэспублікі ў 1944 г. Толькі ў 1944-1945 гг. у Чырвоную Армію было мабілізавана звыш 755 тыс. жыхароў Беларусі. Сотні тысяч беларусаў загінулі на франтах вайны, у партызанскіх атрадах і падполлі.

З ўраджэнцаў Беларусі вызначылася многа таленавітых палкаводцаў: начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл СССР, генерал арміі, кавалер ордэна "Перамога" А.І. Антонаў; маршалы Савецкага Саюза В.Д. Сакалоўскі і І.І. Якубоўскі, маршал авіяцыі С.А. Красоўскі, генералы арміі І.І. Гусакоўскі, В.П. Маргелаў, І.Я. Шаўроў, генерал-палкоўнікі А.Р. Бацюня, У.Р. Вашкевіч, І.П. Камера, Ф.І. Кузняцоў, М.В. Паўлоўскі, А.В. Петрушэўскі, віцэ-адмірал В.П. Дрозд, контр-адміралы В.Е. Ананіч, А.І. Гурын – усяго 217 генералаў і адміралаў. Толькі ў складзе Ваенна-паветраных Сіл СССР у гады

Вялікай Айчыннай вайны налічвалася 5305 і ў бранятанкавых войсках звыш 2500 афіцэраў беларусаў па паходжанню.

Звыш 300 тыс. воінаў-беларусаў былі адзначаны ўрадавамі ўзнагародамі СССР. 443 беларусы сталі Героямі Савецкага Саюза. Двойчы вышэйшую ўзнагароду краіны атрымалі ўраджэнцы Буда-Кашалёўскага раёна, генерал-маёр авіяцыі П.Я. Галавачоў; Крычаўскага раёна, камандзір танкавай бры(497) гады (з 1968 г. – генерал арміі) І.І. Гусакоўскі; Глускага раёна, камандзір танкавай брыгады, палкоўнік С.Ф. Шутаў; Горацкага раёна, камандзір танкавай брыгады (з 1967 г. – маршал Савецкага Саюза) І.І. Якубоўскі. 65 салдат і сяржантаў з Беларусі сталі кавалерамі ордэна Славы трох ступеняў.

Сотні тысяч беларусаў самаахвярна працавалі ў савецкім тыле, у прамысловасці і сельскай гаспадарцы, забяспечвалі Чырвоную Армію зброяй, боепрыпасамі, амуніцыяй, харчовымі прадуктамі і г. д. Дзесяткі тысяч нашых суайчыннікаў за свой працоўны подзвіг у час Вялікай Айчыннай вайны былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі. Пяцёра машыністаў-чыгуначнікаў сталі Героямі Сацыялістычпай Працы: А.В. Глебаў, М.А. Макараў. І.П. Першукевіч, А.М. Чухнюк, А.А. Янкоўскі.

27 красавіка 1945 г. Міжнародная канферэнцыя ў Сан-Францыска, скліканая для заснавання Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, прыняла рашэнне аб уключэнні БССР у лік краін-заснавальніц гэтай арганізацыі, што з'явілася прызнаннем міжнароднай супольнасцю вялікага ўкладу народа Беларусі ў разгром фашызму ў гады Другой сусветнай вайны.

## ТЭМА VIII. **РАЗВІЦЦЁ БССР У 1945-1985 гг**

**Гістарыяграфія, крыніцы.** Першыя працы, у якіх прадпрымалася спроба асэнсаваць арганізацыйную і працоўную дзейнасць па аднаўленню і развіццю народнай гаспадаркі Беларусі, з'явіліся ўжо ў пасляваеннае дзесяцігоддзе. Сярод іх кнігі і брашуры С.Н. Маліпіна, М.Д. Маліненкі, Я.Е. Ігудэсмана, А.Е. Шавельскага. Больш грунтоўнаму вывучэнню актуальных праблем пасляваеннага жыцця перашкаджала адсутнасць дастатковай колькасці крыніц і празмерная ідэалагізацыя гістарычных даследаванняў.

Новы этап у беларускай гістарыяграфіі прыпадае на другую палову 50-першую палову 80-х гг. Гісторыкі атрымалі магчымасць пашырыць праблематыку даследаванняў. У навуковы зварот былі ўведзены шматлікія архіўныя матэрыялы. Пошуку даследчыкаў садзейнічала выданне зборнікаў, дакументаў і статыстычных матэрыялаў. З'явіліся працы па гісторыі рабочага класа (І.Я. Марчанкі, Л.М. Лыча, Н.Г. Лабаценкі, У.К. Коршука, Э.А. Забродскага і інш.), калгаснага сялянства (А.П. Белязо, Г.А. Барадача, К.І.Дамарада і інш.). У 1985-1987 гг. былі выдадзены апошнія два тамы калектыўнага даследавання "Гісторыя рабочага класа Беларускай ССР" (т. 3-4), якія прысвечаны пасляваеннаму перыяду. Пытанні развіцця народнай гаспадаркі і матэрыяльнага дабрабыту знайшлі адлюстраванне ў абагульняючых працах эканамістаў: "Экономика Советской Белоруссии 1917-1967 гг." (Мн., 1967); "Развитие экономики Белоруссии в 1961-1970 гг." (Мн., 1978); Развитие общественного производства и рост народного благосостояния" (Мн., 1983). Міжнароднай дзейнасці Беларускай ССР прысвечаны манаграфіі С.Д. Вайтовіча, М.С. Верабʼя, Г.Г. Сяргеевай Э.А. Лейкіна, Л.П. Мірачыцкага, У.Е. Снапкоўскага. Шэраг работ прысвечаны грамадскаму жыццю і існаваўшай тады палітычнай сістэме. У кнізе С.А. Лукашова распавядаецца аб ідэалагічнай рабоце Кам(499)партыі Беларусі ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе. П.Ц. Петрыкаў высвятляе ролю Саветаў у барацьбе за стварэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізму. У манаграфіі У.М. Фаміна раскрываецца дзейнасць прафсаюзаў на прамысловых прадпрыемствах Беларусі. Гэтыя праблемы ўздымаюцца таксама і ў абагульненых працах, якія былі прысвечаны дзейнасці КПБ, прафсаюзаў і камсамола Беларусі. Шмат работ было напісана па праблемах гісторыі культуры. У кнігах І.М. Ільюшына, С.А. Умрэйкі, П.Я. Кісялёва, М.І. Красоўскага раскрываюцца праблемы развіцця адукацыі. У сваёй манаграфіі С.В. Марцалеў паспрабаваў паказаць

гістарычны вопыт і заканамернасці развіцця культуры ў рэспубліцы за гады Савецкай улады. У 1960-я гг. з'явіліся асобныя выданні, якія прысвячаліся гісторыі навукі, кіно, мастацтва. Аднак ва ўсіх гэтых работах праблемныя з'явы ў развіцці эканомікі, грамадска-палітычнага жыцця і культуры асветлены недастаткова.

Пэўным выключэннем з'явіліся працы А.П. Белязо і А.Е. Казлоўскай, прысвечаныя адпаведна падзеям аднаўлення беларускай вёскі ў першыя пасляваенныя гады і матэрыяльнаму становішчу рабочых ў 1946-1970 гг. Яны ўтрымліваюць вельмі цікавы фактычны матэрыял, які не заўсёды ўпісваецца ў тыя стэрэатыпы, што фарміраваліся ў савецкай гістарычнай літаратуры.

У 1960-1980 гг. было падрыхтавана шмат абагульняючых прац па гісторыі Беларусі. У 1958 г. выйшаў у свет другі том двухтомнага выдання "Гісторыя Беларускай ССР". У 1975 г. з'явіўся апошні том новага выдання "Гісторыя Беларускай ССР" (у 5 т.), які цалкам прысвечаны пасляваеннаму перыяду. Скарочаны варыянт гэтага выдання ў аднатомніку "История Белорусской ССР" быў выдадзены ў 1977 г. У іх паказана стваральная праца беларускага народа па развіццю эканомікі і культуры. Але метадалагічныя падыходы засталіся старымі. Што тычыцца крыніц названага перыяду, то найбольш даступнымі для студэнтаў застаюцца матэрыялы перыядычнага друку. Пры іх выкарыстанні неабходна ўлічваць прыналежнасць выдання да пэўнай структуры (партыйнай, савецкай і інш.), органам якой з'яўляліся газета ці часопіс.

Чарговы этап у гістарыяграфіі вывучаемага перыяду акрэсліваецца ў другой палове 80-х гг. У выніку радыкальных сацыяльна-эканамічных і грамадскіх пераўтварэнняў была ліквідавана манаполія марксісцка-ленінскай метадалогіі, большасць навукоўцаў уключылася ў работу над пераасэнсаваннем мінулага. У 1991 г. выйшаў у свет зборнік "Актуальныя пытанні гісторыі БССР", у якім, побач з іншымі, закраналіся праблемы пасляваеннай гісторыі. Поўная рэабілітацыя ахвяр таталітарнага рэжыму выклікала з'яўленне цікавай кнігі У. Адамушкі, у якой упершыню распавядалася аб палітычных рэпрэсіях 20-50-х гг. У 1990 і 1992 гг. на кафедры гісторыі Беларусі Белдзярж-універсітэта былі выдадзены вучэбна-метадычныя дапаможнікі па курсу гісторыі Беларусі пасляваеннага часу. У іх з новых пазіцый разглядаюцца сацыяльна-эканамічныя праблемы і развіццё культуры Беларусі. У 1998 г. выкладчыкамі гістарычнага факультэта Белдзярж-універсітэта быў выдадзены дапаможнік па гісторыі Беларусі для паступаючых у вышэйшыя навучальныя ўстановы. Пасляваенны перыяд гісторыі Беларусі разглядаецца ў 2-х частках "Нарысаў

гісторыі Беларусі" (1995) і ў IX раздзеле другой часткі "Гісторыі Беларусі" пад рэдакцыяй Я.К. Новіка і Г.С. Марцуля (1998) На жаль, асвятленне пасляваеннай гісторыі засталося і ў названых выданнях пераважна схематычным, нягледзячы на пэўныя разыходжанні ў ацэнках падзей і тэрміналогіі.

## **ЛЕКЦЫЯ** 25

## АДНАЎЛЕННЕ ГАСПАДАРКІ І РАЗВІЦЦЁ БССР У ПЕРШАЕ ПАСЛЯВАЕННАЕ ДЗЕСЯЦІГОДДЗЕ

- *Аднаўленне гаспадаркі*
- *Матэрыяльнае становішча насельніцтва*
- *Палітычная сітуацыя*
- *Дзейнасць БССР на міжнароднай арэне*

**Аднаўленне гаспадаркі.** СССР у цэлым і БССР у прыватнасці ўнеслі важкі ўклад у збаўленне свету ад пагрозы фашысцкага панавання. Але перамога дасталася дарагой цаной. СССР страціў каля 1/3, а БССР больш паловы нацыянальнага багацця. Нічым нельга вымераць чалавечыя страты. А на Беларусі загінуў амаль кожны трэці яе жыхар.

Па агульнаму ўзроўню развіцця эканоміка рэспублікі была адкінута да ўзроўню 1928 г., поўнасцю альбо часткова разбураны гарады і больш 9000 сельскіх населеных пунктаў. Пасля вызвалення ўрад БССР запатрабаваў ад Германіі выплаты рэпарацый на суму 1 млрд. 500 млн. долараў ЗША, што складала каля 10% панесеных рэспублікай страт. БССР змагла атрымаць толькі нязначную частку запатрабаваных сродкаў.

Аднаўленне народнай гаспадаркі пачалося адразу пасля вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў усходніх раёнаў рэспублікі (восень 1943 г.) і працягвалася да пачатку 1950 г. Адраджэнне разбуранай вайною гаспадаркі вызначылася як працяг адкрэсленага яшчэ XVIII з'ездам кампартыі (1939) курсу на завяршэнне пабудовы сацыялізму і паступовы пераход да камуністычнага грамадства. Гэтаму тэзісу надавалася вялікае прапагандысцкае значэнне. Ён заклікаяны быў стаць сродкам мабілізацыі працоўных намаганняў народа на выкананне грандыёзных заданняў чацвёртай пяцігодкі (1946-1950). Умовы былі больш складаныя, чым на пачатку 1920-х гг. (памеры разбурэнняў, недахоп рабочых рук, сыравіна). Але змены ў геапалітычным становішчы Беларусі (савецкія войскі ў цэнтры Еўропы, фарміраванне там прасавецкіх урадаў, імкненне прадэманстраваць перавап сацыялізму) садзейнічалі таму, што ў БССР пачаў імкліва разгортвацца працэс пасляваеннай індустрыялізацыі. Кіраўніцтва Савецкага Саюза выкарыстала ў гэтых мэтах рэпарацыі з Германіі ў выглядзе машын, станкоў, абсталявання і нават цэлых заводаў. У верасні 1946 г. адбылася VIII сесія Вярхоўнага Савета БССР першага склікання, на якой быў прыняты Закон аб плане

аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі рэспублікі на 1946-1950 гг. Новы пяцігадовы план з'яўляўся састаўной часткай агульнасаюзнага плана. Да заканчэння 4-й пяцігодкі прамысловая прадукцыя БССР павінна была не толькі дасягнуць даваеннага ўзроўню, але і перавысіць яго. Істотнай асаблівасцю пяцігадовага плана стала стварэнне ў рэспубліцы аўтамабілебудавання, выпуск гідратурбін, матацыклаў, веласіпедаў і іншых вырабаў, што было немагчыма без узнаўлення энергетыкі. Планавалася поўнасцю аднавіць БелДРЭС, пабудаваць новыя буйныя электрастанцыі, увесці ў строй шэраг торфапрадпрыемстваў.

Складаным было пытанне падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў для прамысловасці і транспарту Беларусі. Яно вырашалася рознымі шляхамі, найперш праз навучальныя ўстановы сістэмы дзяржаўных працоўных рэзерваў. За 1946-1950 гг. яны падрыхтавалі каля 80 тыс. маладых рабочых. Вытворча-тэхнічнае навучанне вялося непасрэдна на фабрыках і заводах. Значная частка інжынерна-тэхнічнага персаналу і рабочых была падрыхтавана і накіравана з прадпрыемстваў Расійскай Федэрацыі. Да 1950 г. колькасць рабочых і служачых Беларусі павялічылася ў параўнанні з 1945 г. амаль у 2 разы і склала каля 1 млн. чалавек.

Вырашалася праблема замацавання на прадпрыемствах маладых рабочых. У маі 1948 г. ЦК КП(б)Б прыняў пастанову, у якой вызначаліся мерапрыемствы, накіраваныя на паляпшэнне арганізацыі працы і быту моладзі, аплаты працы і г. д. Але галоўны акцэнт быў зроблены на абавязковае размеркаванне і канкрэтны тэрмін адпрацоўкі выпускнікоў рамесных, чыгуначных вучылішчаў, школ ФЗН.

Эканоміка Беларусі аднаўлялася і развівалася ў першыя пасляваенныя гады як частка народнагаспадарчага комплексу Савецкага Саюза. Развіццё цяжкай індустрыі ў БССР забяспечвалася пераважна за кошт сродкаў саюзнага бюджэту. На ўскраіне Мінска на базе аўтазборачнага завода хуткімі тэмпамі будаваўся аўтамабільны завод па выпуску грузавых машын. І ўжо ў 1947 г. з варот завода выйшлі першыя пяць шасцітонных грузавых аўтамабіляў.

У адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў СССР ад 29 мая 1946 г. пачалося будаўніцтва Мінскага трактарнага завода. У 1948 г. навукова-тэхнічны Савет аўтатрактарнай прамысловасці СССР ухваліў праект колавага трактара, падрыхтаваны групай інжынераў і канструктараў. У наступным годзе ў эксперыментальным цэху быў сабраны першы трактар, а ў лістападзе 1950 г. завод пачаў серыйны выпуск трактароў "Кіравец Д-35". Напачатку гэта былі гусенічныя ма-

шыны (тралёвачныя і іншыя) для патрэб лясной гаспадаркі. Першыя колавыя трактары "Беларусь" выйшлі з варот завода ў 1953 г.

Летам 1947 г. непадалёку ад чыгуначнай станцыі Жодзіна і аўтастрады Мінск-Масква пачалося будаўніцтва завода тарфянога машынабудавання, які ў 1951 г. быў пераўтвораны ў завод дарожных і меліярацыйных машын "Дормаш". Праз 7 год менавіта на базе "Дормаша" і быў створаны Беларускі аўтамабільны завод (БелАЗ) па вытворчасці цяжкавагавых аўтамабіляў.

У 1947 г. далі прадукцыю веласіпедны і інструментальны заводы ў Мінску, лакамабільны завод і металаапрацоўчы камбінат у Магілёве, гомельскі завод "Рухавік рэвалюцыі", швейная фабрыка "Сцяг індустрыялізацыі" ў Віцебску, абутковая фабрыка ім. Калініна ў Мінску, пачала працаваць БелДРЭС.

Беларусь паступова пераўтваралася ў зборачны цэх СССР. Безумоўна, хуткі рост цяжкай нрамысловасці садзейнічаў аднаўленню народнай гаспадаркі. Дзякуючы намаганням усіх рэспублік СССР, прамысловасць Беларусі была адноўлена на даволі высокім тэхнічным і тэхналагічным узроўні.

Калі прасачыць за паказчыкамі, то можна заўважыць, што эканамічнае развіццё заходніх абласцей БССР ішло больш хуткімі тэмпамі, чым у цэлым па рэспубліцы. Тут аднаўляліся старыя і будаваліся новыя прадпрыемствы машынабудавання, будаўнічай індустрыі, дрэваапрацоўчай, гарбарнай, абутковай, харчовай і іншых галін. У іх ліку былі Ваўкавыскі цэментны завод, Лідскі завод сельскагаспадарчага машынабудавання, Мастоўскі фанерны камбінат, шклозавод "Нёман", тонкасуконны камбінат і інш. Ужо ў 1948 г. валавая прадукцыя прамысловасці заходніх абласцей БССР амаль у 1,5 раза перавысіла даваенны ўзровень, а яе ўдзельная вага ў агульным аб'ёме прадукцыі рэспублікі павялічылася ў 2,5 раза.

Адзначаючы пэўныя поспехі ў аднаўленні і развіцці прамысловасці ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе, неабходна падкрэсліць арганізатарскую ролю партыйных камітэтаў у спалучэнні з цвёрдай вытворчай дысцыплінай, што захавалася з ваенных часоў. Нельга таксама адмаўляць і значнасць розных формаў спаборніцтваў: рух за эканомію сыравіны, матэрыялаў, выпуск дадатковай прадукцыі, за калектыўнасць наватарства – пераход ад дасягненняў асобных рабочых да высокапрадукцыйнай працы брыгад, цэхаў, прадпрыемстваў. Энтузіязм адраджэння ўмела выкарыстоўваўся партыйна-савецкім кіраўніцтвам, што дазволіла ў сціслыя тэрміны вырашыць праблемы аднаўлення і развіцця прамысловасці.

Дзякуючы развіццю машынабудавання і металаапрацоўкі прамысловасць рэспублікі ў 1950 г. перавысіла даваенны ўзровень на 20%. Але перакос у бок вытворчасці сродкаў вытворчасці прывёў да таго, што ў заняпадзе засталіся традыцыйныя для Беларусі лёгкая, харчовая галіны, прамысловасць будаўнічых матэрыялаў. Абсталяванне прадпрыемстваў азначаных галін фізічна і маральна састарэла, не адпавядала патрабаванням навукова-тэхнічнага прагрэсу. Гэта негатыўна адбівалася на забеспячэнні насельніцтва самым неабходным.

Па розных прычынах больш складаным і супярэчлівым было адраджэнне сельскагаспадарчай вытворчасці. Памер разбурэнняў тут таксама быў велізарным. У жыццё беларускай вёскі, здавалася, вярнулася XIII ст. – рагаціна і лучына, драўляныя бароны, даматканае адзенне.

Для веснавога севу 1946 г. не хапала насення, мінеральных угнаенняў, інвентару і машын, а МТС не былі здольны поўнасцю выканаць вялікі аб'ём сельскагаспадарчых работ у калгасах, таму што іх было прыкладна ў тры разы менш, чым у даваенны час. З-за недахопу коней і трактароў у якасці цяглавай сілы на веснавой сяўбе выкарыстоўваліся каровы. У плуг запрагаліся нават людзі, па 3-4 жанчыны, дзеці – так узорвалі, засявалі значныя зямельныя плошчы.

Адной з найбольш істотных праблем, з якой сутыкнулася сельскагаспадарчая вытворчасць БССР, стаў недахоп людскіх рэсурсаў. Многія салдаты, што вярнуліся з вайны, былі калекамі, няздольнымі выконваць цяжкую сялянскую работу; іншыя, пажыўшы месяц-другі, падаваліся ў горад, рабочыя пасёлкі, уладкоўваліся на працу ў МТС. Там прадуктовыя карткі забяспечвалі рабочага і яго сям'ю харчаваннем, а гро-шы давалі магчымасць набыць нейкае адзенне. Асноўную частку грашовых даходаў сельгасарцелям даводзілася выдаткоўваць на вытворчыя патрэбы, набыццё жывёлы і сельскагаспадарчых прылад, гаспадарчае і грамадскае будаўніцтва. Ва ўмовах экстэнсіўнага развіцця асноўнай крыніцай павелічэння збораў збожжа і іншай прадукцыі паляводства з'яўлялася пашырэнне пасяўных плошчаў. Вырашыць гэтую складаную задачу без значнай колькасці рабочай сілы, без механізацыі было немагчыма. Фонд аплаты працы аказваўся нязначным, і энтузіязм асобных калгаснікаў вельмі слаба падмацоўваўся матэрыяльнымі стымуламі. Калгас амаль нічога не даваў земляробам за іх самаадданую працу. Большасць калгаснікаў не атрымлівала заработную плату. Заставалася толькі асабістая гаспадарка, але і з яе амаль увесь прыбытак ішоў на выплату падаткаў. Спусташэнне і голад панавалі на вёсцы.

Партыйныя органы спрабавалі палепшыць справы ў сельскай гаспадарцы адміністрацыйнымі метадамі. У верасні 1946 г. Савет Міністраў СССР, ЦК УКП(б) прынялі пастанову "Аб мерах па ліквідацыі парушэнняў Статута сельскагаспа(506)дарчай арцелі ў калгасах". У спецыяльным пункце пастановы ўказвалася: "Устанавіць, што работнікі савецкіх, партыйных і зямельных органаў і старшыні калгасаў, вінаватыя ў раскраданні і незаконным размеркаванні калгаснай маёмасці, грамадскай зямлі, грашовых сродкаў, будуць здымацца з пасад і аддавацца пад суд, як парушальнікі закона і ворагі калгаснага ладу". Зразумелае ўсім вызначэнне "ворагі" дзейнічала больш эфектыўна, чым пагроза парушэння закона. Пастанова вызначала "незаконным размеркаваннем калгаснай маёмасці" атрыманне сялянамі зямельных участкаў для асабістай гаспадаркі, падсобных гаспадарак, агародаў для рабочых і служачых. Але ж у той галодны час толькі з гэтай зямлі і кармілася значная частка насельніцтва. Да сакавіка 1947 г. звыш 100 тыс. га зямлі вярнулі калгасам. Акрамя таго, калгасам вярнулі сотні галоў жывёлы, грамадскіх будынкаў, вялікую колькасць сельскагаспадарчай прадукцыі і каля мільёна рублёў.

У лютым 1947 г. быў праведзены Пленум ЦК УКП(б), дзе абмяркоўваўся даклад А. А. Андрэева "Аб мерах па ўздыму сельскай гаспадаркі ў пасляваенны перыяд". Меркавалася ўмацаваць кадрамі кіраўніцтва, палепшыць выхаваўчую работу. Меліся і канкрэтныя эканамічныя прапановы, якія на некаторы час маглі змяніць становішча ў сельскай гаспадарцы: ліквідацыя ўраўнілаўкі ў аплаце працы калгаснікаў, паляпшэнне работы МТС, шырокая падрыхтоўка кадраў для вёскі і г. д.

Разам з тым адзначым, што для працаўнікоў беларускай вёскі другі год пасляваеннай пяцігодкі, нягледзячы на павелічэнне колькасці працуючых, аказаўся найбольш напружаным. У 1946 г. усходнія і паўднёвыя раёны СССР напаткала засуха, што прынесла гаспадаркам вялікія страты. Калгасам Беларусі быў даведзены павышаны план збожжавых паставак. Сельгасарцелям, якія атрымалі нядрэнны ўраджай, нормы паставак павялічылі на 50 %. Таму многія з іх, разлічыўшыся з дзяржавай, не змаглі забяспечыць сябе фуражом і насенным фондам. Дзяржаўныя пастаўкі ў гады чацвёртай пяцігодкі былі вельмі высокімі, часта без умоў канкрэтных магчымасцяў той ці іншай гаспадаркі, што адмоўна ўплывала на эканоміку калгасаў і аплату працы.

Цяжкім было становішча ў жывёлагадоўлі. Грамадскае пагалоўе ў калгасах расло хутчэй, чым прадукцыйнасць жывёлы. Нарыхтоўка

кармоў была нездавальняючай. План пасеву кармавых культур штогод не выконваўся, а ў некаторых гаспадарках ён рэалізоўваўся толькі напалову. Сена было нарыхта-вана ў 1949 г. на 300 тыс. тон менш даваеннага, а пагалоўе буйной рагатай жывёлы набліжалася да ўзроўню 1940 г. Разам з парушэннем элементарных умоў утрымання, захворваннямі жывёлы гэта прывяло да рэзкага зніжэння надояў малака. Рост яго вытворчасці пры нізкай прадукцыйнасці мог адбыцца, галоўным чынам, за кошт павелічэння колькасці жывёлы. Для калгасаў апошняе было эканамічна нявыгадна, але пагалоўе планавалася зверху і лічбы ўвесь час павялічваліся. Згодна з пастановай Савета Міністраў СССР і ЦК УКП(б) у 1949 г. планавалася павялічыць колькасць грамадскай буйной рагатай жывёлы не менш чым у 2,5 раза. Гэта пацвярджае, што развіццё сельскай гаспадаркі адбывалася на экстэнсіўнай аснове.

Нягледзячы на павелічэнне ў калгасах пагалоўя ў параўнанні з даваенным перыядам на 1/3, мяса было атрымана ў 1950 г. не менеей чым у 1940 г. Вытворчасць малака не дасягнула 60% даваеннага ўзроўню. Адставанне ў вытворчасці жывёлагадоўчай прадукцыі ўскладнялі і нарыхтоўкі, якія раслі больш высокімі тэмпамі. Усё гэта стварала вядомыя цяжкасці ў забеспячэнні насельніцтва прадукцыяй сельскай гаспадаркі пасля адмены картачнай сістэмы.

Буйным недахопам, які адчувальна адбіваўся на эканоміцы калгасаў, было тое, што сродкі ад рэалізацыі дзяржаве сельскагаспадарчай прадукцыі пакрывалі толькі невялікую частку выдаткаў гаспадаркі. Сельскагаспадарчая прадукцыя пастаўлялася дзяржаве па цэнах намнога ніжэйшых яе сабекошту. Асабліва значным быў разрыў паміж дзяржаўнымі закупачнымі цэнамі і сабекоштам прадукцыі жывёлагадоўлі. Малако калгасы павінны былі пастаўляць па цэнах у пяць разоў ніжэйшымі за сабекошт. Яшчэ большай была разніца паміж дзяржаўнымі закупачнымі цэнамі і сабекоштам прадукцыі па мясу. Яна дасягала двух дзесяткаў разоў. Цэны на прадукты жывёлагадоўлі на калгасным рынку былі ў 10-12 разоў вышэйшыя за закупачныя, але ніжэйшымі сабекошту прадукцыі і для калгасаў і саўгасаў, і для сялян.

Збожжавых сапраўды высявалася больш, чым прадугледжвалася планам, але паколькі ўраджайнасць была нізкая (4,5–5,0 цэнтнераў), то сабралі на многа менш, чым меркавалася. Бульбы замест 14,4 млн. тон атрымалі 9,5 млн. тон (пры ўраджайнасці 55 цэнтнераў). Асноўнымі прычынамі нізкай ураджайнасці ў калгасах былі недастатковы ўзровень механізацыі вытворчых працэсаў, невыкананне аграмерапрыемстваў, няправільнае планаванне пасяўных плошчаў, а даволі

часта і няўмелае вядзенне гаспадаркі. Істотна адчуваліся вынікі вайны. Пры ўсіх намаганнях працаўнікі сяла, а яны ў большасці працавалі самаадданa, настойліва і добрасумленна, не маглі хутка аднавіць тое, што так бязлітасна знішчылі ворагі.

І ўсё ж вынікі маглі быць больш значнымі. Аб тым гаворыць хоць бы той факт, што ў некаторых калгасах у 1950 г. з 3 тыс. працаздольных членаў сельгасарцеляў рэальна працавалі 600 чалавек, ці 20% наяўнага складу. Многія імкнуліся перабрацца ў горад на прамысловыя прадпрыемствы, транспарт і ў іншыя галіны народнай гаспадаркі, дзе заробак быў гарантаваны. І толькі адсутнасць пашпартоў у калгаснікаў была прычынай невялікай колькасці такіх добраахвотнікаў у вёсках.

У грамадстве шмат гаварылася аб дапамозе вёсцы. Але, па сутнасці, у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе вынікі развіцця сельскай гаспадаркі былі нездавальняючымі. На пачатку 1950-х гг. паказчыкі развіцця сельскай гаспадаркі БССР былі ніжэй, чым у першы пасляваенны 1946 год. Яна аказалася ў крызісным стане не толькі ў выніку ваенных разбурэнняў, але і страт, нанесеных ёй калектывізацыяй. У заходнебеларускай вёсцы стварэнне калгасаў пачалося ў 1939-1940 гг. У першыя пасляваенныя гады гэты працэс праходзіў даволі марудна. Да канца 1946 г. было адноўлена і арганізавана ўсяго 133 калгасы (0,56% усіх сялянскіх гаспадарак). Аднак у лютым 1949 г. XIX з'езд КП(б)Б абвясціў у заходніх абласцях масавую калектывізацыю. Для ажыццяўлення справы пераўтварэння сельскай гаспадаркі па вопыту 1930-х гг. былі створаны палітаддзелы МТС (студзень 1950 г.).

Калектывізацыя праводзілася даволі энергічна. На працягу1949 г. узровень калектывізацыі дасягнуў 40%, на 1 студзеня 1950 г. у заходніх абласцях налічвалася каля 5000 калгасаў. Да канца 1950 г. калгасы аб'ядналі больш 80% усіх сялянскіх гаспадарак. Згодна афіцыйных звестак калектывізацыя ў заходняй частцы Беларусі была завершана на працягу 1951-1952 гг. У гэты ж час была сселена большасць хутароў, ліквідаваны заможныя гаспадаркі, узмоцнены падатковы прэс на аднаасобнікаў. Разбураўся жыццёвы ўклад сялянства. У нядаўна створаных калгасах адносіны сялян да працы былі не лепшымі. Звыклыя шмат працаваць і працаваць на сябе, калгаснікі заўважалі, што ў выніку ўсім трапляе пароўну: і абібокам, і руплівым. Яшчэ большае расчараванне чакала іх восенню, калі калгаснікі амаль нічога не атрымалі на свае працадні.

Дадаткова прадуманым з'явілася так званае ўзбуйненне калгасаў. Яно ажыццяўлялася ва ўмовах, калі тэхніка знаходзілася ў

падначаленні МТС. Таму стварэнне калгасаў-гігантаў нічога па сутнасці не змяняла. Сельскагаспадарчая вытворчасць на пачатку 1950-х гг. была ў крызісным стане. Збожжавая гаспадарка знаходзілася на самым нізкім узроўні за ўсе пасляваенныя гады. Палі засяваліся тытунём, кок-сатызам (каўчукавая культура), а кармоў не хапала. Надоі ад каровы ў сярэднім не перавышалі 800 кг (узровень пачатку XX ст.). Рэзка скарачалася вытворчасць у падсобных гаспадарках калгаснікаў (яна ў 1953 г. усё ж давала каля 2/3 вытворчасці мяса і 4/5 малака).

Са зменай кіраўніцтва СССР у 1953 г. былі зроблены адпаведныя захады, каб палепшыць сітуацыю ў сельскай гаспадарцы: павялічаны закупачныя цэны і вытворчасць сельскагаспадарчай тэхнікі, спісана запазычанасць з калгасаў, зменена сістэма падаткаабкладання асабістага надзелу вяскоўца (плата з памеру зямельнай плошчы, а не з таго, што на ёй вырошчвалася). Гэта, безумоўна, мела станоўчыя вынікі.

**Матэрыяльнае становішча насельніцтва.** Нямецка-фашысцкая акупацыя, ваенныя дзеянні на Беларусі цяжка адбіліся на матэрыяльным становішчы насельніцтва. Мільёны людзей засталіся без прытулку, не хапала адзення, абутку, іншых прадметаў, неабходных для забеспячэння элементарнай жыццядзейнасці чалавека. Дапамога накіроўвалася з іншых рэспублік СССР, але ў большасці эканоміка СССР у 1944-1945 гг. працавала на армію. Паляпшэнне матэрыяльнага становішча насельніцтва Беларусі найперш магло адбыцца толькі за кошт аднаўлення народнай гаспадаркі.

У першым пасляваенным плане аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі заяўлялася аб тым, што на аснове росту вытворчасці да 1950 г. даваенны ўзровень дабрабыту народа будзе не толькі дасягнуты, але і перавышаны. Ажыццявіць гэта было складаней. Развіццё народнай гаспадаркі БССР пасля сусветнай вайны характарызавалася рэзкім паваротам у бок сродкаў вытворчасці. На гэтых напрамках акцэнтавалася ўвага савецкіх і партыйных органаў, сюды накіроўваліся асноўныя людскія і матэрыяльныя рэсурсы, што не магло не адбіцца на развіцці лёгкай прамысловасці і забеспячэнні насельніцтва таварамі масавага спажывання. На дабрабыт жыхароў Беларусі адмоўна ўплывалі і цяжкасці ў развіцці сельскай гаспадаркі. Да таго ж паўднёвыя раёны СССР (у тым ліку і частку Гомельскай вобласці) у 1946 г. ахапіла засуха. Таму першыя пасляваенныя гады былі асабліва цяжкімі. У 1946-1947 гг. захоўвалася нарміраванае забеспячэнне. Хлебныя карткі ў ліпені 1946 г. атрымлівалі звыш 2,3 млн. чалавек. Іншымі харчовымі таварамі забяспечвалася толькі насельніцтва Мінска.

Паступова асноўнай крыніцай даходаў жыхароў горада станавілася заработная плата. У 1946 г. яна была павялічана ў вядучых галінах прамысловасці. Нізкааплатныя катэгорыі рабочых і служачых, студэнты і пенсіянеры атрымалі так званую "хлебную надбаўку". Яна была ўведзена адначасова з павышэннем пайковых цэн на хлеб у сувязі з падрыхтоўкай да адмены картачнай сістэмы (снежань 1947 г.) і пераходам да "свабоднага гандлю". Адмена картачнай сістэмы спалучалася з грашовай рэформай. Апошняя ўключала, па-першае, замену старых грашовых знакаў новымі, па-другое, ліквідацыю вынікаў інфляцыі часоў вайны шляхам скасавання так званых "непрацоўных даходаў" на ашчадных кніжках (толькі ўклады да 3 тыс. рублёў абменьваліся 1:1); па-трэцяе, устанаўленне адзіных дзяржаўных цэн (да 1948 г. існавалі два ўзроўні: камерцыйныя і пайковыя). У выніку грашовай рэформы адбылося зніжэнне цэн. Потым цэны зніжаліся на большасць тавараў у 1949-1950 гг. Гэта з'яўлялася ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе асноўнай крыніцай павышэння дабрабыту гарадскога насельніцтва. Аднак трэба звярнуць увагу на тое, што за гады вайны і першыя пасляваенныя гады да грашовай рэформы цэны ўзраслі настолькі, што нават пасля трохразовага (1947, 1949, 1950 гг.) зніжэння яны былі яшчэ значна вышэй даваенных. Пакупная здольнасць беларускіх гараджан да пачатку 1950-х гг. не падымалася вышэй мяжы гараджан у другой палове 1920-х гг.

Аб'ём рознічнага тавараз вароту дзяржаўнага і кааператыўнага гандлю ў БССР у 1950 г. пры павялічанай наяўнасці грошай у звароце (у 1,5 раза) узняўся толькі крыху больш за 90% даваеннага ўзроўню. Нават у 1950 г. на яго долю прыпадала толькі чвэрць агульнага рознічнага тавараз вароту. Тлумачылася гэта тым, што вясковае насельніцтва, якое складала больш за дзве трэці ад усяго насельніцтва БССР, не мела шмат карысці ад грашовай рэформы. Больш таго, пры яе правядзенні страты ў 20% ад усёй колькасці выдаткаў спісваліся за кошт грошай, авансаваных на развіццё вёскі: лічылася, што яна "нажылася" за гады камерцыйнага гандлю.

У першыя пасля вайны гады дэмабілізаваныя воіны імкнуліся вяртацца ў горад. Не адбылося істотных змен і з адменай картачнай сістэмы. Калгасам даводзілася выдаткоўваць асноўную частку грашовых даходаў на вытворчыя патрэбы, набыццё жывёлы і сельскагаспадарчых прылад, гаспадарчае і грамадскае будаўніцтва. Фонд аплаты працы аказваўся нязначным, і энтузіязм калгаснікаў слаба падмацоўваўся матэрыяльнымі стымуламі. Не зацікаўлены быў селянін і ў развіцці сваёй асабістай гаспадаркі, бо кожнае новае

дрэўца, жывёліна і іншае прыводзілі да значнага росту падаткаў. Толькі ў сярэдзіне 1950-х гг., калі было зменена падаткаабкладанне, апошнія адчулі істотнае паляпшэнне свайго жыцця.

Адной з асноўных праблем на вёсцы і ў горадзе, быў недахоп жылля. У разглядаемы перыяд жыллёвае будаўніцтва ішло высокімі тэмпамі. Дзяржаўныя і кааператыўныя арганізацыі (без калгасаў) на гэтыя мэты затрацілі на 53% больш сродкаў, чым за ўсе папярэднія гады Савецкай улады. Толькі ў 1946-1950 гг. з зямлянак і неўпарадкаваных памяшканняў перасялілася ў адбудаваныя дамы каля 2 млн. жыхароў рэспублікі. Але жыллёвае будаўніцтва стрымлівалася адсутнасцю будаўнічых матэрыялаў і рабочай сілы, якая накіроўвалася найперш на прамысловае будаўніцтва, нізкай механізацыяй работ, а таксама нездавальняючай арганізацыяй працы. У выніку даваенны жыллёвы фонд Мінска быў адноўлены крыху больш за 80% , а ў іншых гарадах – толькі на 50% .

Праблемай, што патрабавала першачарговага вырашэння, з'яўлялася ахова здароўя. За гады вайны было разбурана больш за 80% медыцынскіх устаноў, на 60% скарацілася колькасць дактароў. У многіх раёнах лютавалі масавыя інфекцыйныя захворванні, асабліва тыф і малярыя. Улічваючы гэта, урад БССР выдзеліў значныя сродкі на ахову здароўя. У Беларусь ішла дапамога з іншых рэспублік, з боку ААН. У выніку ўжо да 1949 г. поўнасцю аднавілася сетка медыцынскіх устаноў. Але забяспечанасць бальнічнымі ложкамі і медыцынскім персаналам у рэспубліцы заставалася ніжэй сярэднесаюзнага ўзроўню.

Такім чынам, на працягу першага пасляваеннага дзесяцігоддзя, дзякуючы самаадданай працы насельніцтва, дапамозе саюзнага кіраўніцтва, матэрыяльнае становішча беларускага народа няўхільна палягшалася. Цяжкасці ж на гэтым шляху разглядаліся як часовыя.

**Палітычная сітуацыя.** У пасляваенны час, як і ў 1930-40-я гг., уся паўната ўлады была сканцэнтравана ў руках камуністычнай партыі і, у выніку спецыфічнай пабудовы апошняй, у руках яе кіраўніка – І. Сталіна. Адзяржаўленне і ідэалагізацыя ўсіх сфер жыцця вызначалі шырокі спектр палітычнай дзейнасці КПБ: сельская гаспадарка, культура, адукацыя і іншыя сферы жыцця. Кіраўніцтва Камуністычнай партыі аператыўна рэагавала на змены ў настроях грамадства. Дзеля гэтага мелася мноства каналаў інфармацыі і рычагоў уздзеяння: ад рэпрэсіўных да прапагандысцкіх мер.

Першы пасляваенны 1946 год пачынаўся разам з агітацыйнай кампаніяй па выбарах у Вярхоўны Савет СССР. Па ўсёй рэспубліцы, на прадпрыемствах і ва ўстановах праходзілі мітынгі, на якіх

вылучаліся кандыдаты ў дэпутаты. На пачатку студзеня 1946 г. усе калектывы прадпрыемстваў і ўстаноў у ліку першых кандыдатаў называлі Сталіна, Молатава, Варашылава, Жданава, Берыю, Маленкова, Хрушчова. Кіраўнікі дзяржавы 9 студзеня 1946 г. накіравалі пісьмо выбаршчыкам, дзе паведамлялі, у якіх акругах яны будуць балаціравацца. К. Варашылаў праходзіў па Мінскай выбарчай акрузе. З гэтай нагоды на большасці прадпрыемстваў Мінска прайшлі мітынгі, дзе рабочыя слухалі ўсхваляваныя прамовы аб сваім выбранніку.

Сапраўды, выбары ў Вярхоўны Савет СССР (1946), у Вярхоўны Савет БССР (1947), у мясцовыя Саветы (1948), вызначаліся партыйнымі ўладамі як шырокая прапагандысцкая акцыя, як свята. Насельніцтва ж, змарнаванае вайной, разглядала іх як першую рэальную прыкмету мірнага жыцця. Здавалася, самае страшнае мінула – астатняе будзе дасягнута працай. Жаданне гэтай працы, жаданне хутчэй аднавіць разбуранае вайной ахоплівала пераважную большасць беларусаў. Многія з той моладзі, што не трапіла на фронт, з зайздрасцю сустракалі сваіх аднагодкаў з баявымі ўзнагародамі і імкнуліся вызначыцца ў працы. У студзені 1946 г. адбыўся пленум ЦК ЛКСМБ, які заслухаў пытанне "Аб удзеле камсамольцаў і моладзі Полацкай вобласці ў падрыхтоўцы выбараў у Вярхоўны Савет СССР". З дакладам выступіў першы сакратар ЦК ЛКСМБ К.Т. Мазураў. На ўрачыстым пасяджэнні пленума Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Н.Я. Наталевіч уручыў Ленінскаму Камуністычнаму Саюзу моладзі Беларусі ордэн Чырвонага Сцяга "за мужнасць, самаадданасць, праяўленую камсамолам у гады вайны".

У канцы лютага 1946 г. былі зніжаны цэны ў камерцыйным гандлі харчовымі таварамі ад 10-20% (мяса) да 40-50% (кава, гарбата, хлеб). Адначасова акрэслівалася неабходнасць падпіскі на пазыку, што мела добраахвотна-прымусовы характар. Прапагандаваліся прыклады С. Станюты, якая ахвяравала два сваіх заробкі, Я. Коласа, які падпісаўся на 30 тыс. рублёў і г. д.

Праяўляючы клопат аб насельніцтве, улады яшчэ раз падкрэслівалі, што магло б быць лепш, каб не ворагі ў краіне і па-за яе межамі. Час сапраўды быў складаны і супярэчлівы. Былым саюзнікам ужо не патрэбна была моц краіны Саветаў. У ЗША паступова разгортвалася антыкамуністычная істэрыя. Разам з тым І. Сталін дзейнічаў таксама з пазіцыі сілы.

Цэнтральныя ўлады акрэслівалі асабісты недавер і падазронасць да вызваленых народаў. Л. Цанава, які напярэдадні і ў першыя пасляваенныя гады ўзначальваў рэпрэсіўны апарат НКУС БССР,

лічыў: усе тыя, хто не прымаў актыўнага ўдзелу ў партызанскай барацьбе – здраднікі. У той самы час без удакладнення фактаў альбо на сфальсіфікаванай падставе ў турму былі кінуты многія мінскія падпольшчыкі, партызанскія сувязныя, былыя ваеннапалонныя (для прыкладу – герой абароны Брэсцкай крэпасці маёр П.М. Гаўрылаў). Асабліва напружаным было становішча ў заходніх абласцях Беларусі, дзе пад час вайны і ў першыя пасляваенныя гады дзейнічалі атрады Арміі Краёвай. Менавіта тут бачылася НКУС "гняздо нацыяналізму і кулацтва". Недавер распаўсюджваўся нават на партызан і партыйных кіраўнікоў – мясцовых ураджэнцаў. Быў арыштаваны шэраг дзеячаў Кампартыі Заходняй Беларусі. Сітуацыя яшчэ больш ускладнілася з пачаткам масавай калектывізацыі ў гэтых раёнах. Недавер да беларускага насельніцтва перакінуўся на мясцовае партыйна-савецкае кіраўніцтва. У 1946 г. прозвішчы І. Сталіна і П. Панамарэнкі ў рэспубліканскім друку яшчэ сустракаліся побач. Але ў іх адносінах ужо адчувалася напружанне. Панамарэнка з 1944 г. з'яўляўся не толькі першым сакратаром ЦК КП(б)Б, але і старшынёй Урада рэспублікі. Да таго ж партызанскія кадры, што складалі ў 1944-1945 гг. пераважную частку партыйна-савецкай бюракратыі ў БССР, забяспечылі яму тут як былому кіраўніку ЦШПР трывалыя пазіцыі. Такое становішча не задавальняла І. Сталіна. Ён імкнуўся не дапускаць умацавання пазіцый кіраўнікоў на месцах.

У студзені 1947 г. першым сакратаром КП(б)Б быў прызначаны сакратар Пермскага абкама партыі М. Гусараў. П. Панамарэнка захаваў на працягу 1947 г. толькі пасаду Старшыні Савета Міністраў. Разгарнулася закулісная барацьба паміж гэтымі кіраўнікамі, што, дарэчы, адлюстроўвала барацьбу ў Маскве за ўплыў на І. Сталіна. М. Гусараў паступова фарміруе сваю партыйную каманду. Ад абавязкаў сакратара ЦК КП(б)Б па кадрах быў вызвалены М. Аўхімовіч (замест яго прызначаны М. Зімянін), з Бюро ЦК КП(б)Б быў выведзены і Г. Эйдзінаў – да гэтага часу Старшыня Дзяржплана БССР. Абодва яны – вядомыя арганізатары падпольнай і партызанскай барацьбы на Беларусі. Беларусы ў групоўцы М. Гусарава прысутнічалі. Найбольш яркай асобай з іх быў на той час М. Іаўчук, які адказваў за ідэалагічную работу. Ён нарадзіўся ў 1908 г. у в. Занужаўе (сучаснага Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці). Пасля заканчэння Акадэміі камуністычнага выхавання і работы ў ЦК УКП(б) у 1947 г. быў прызначаны сакратаром ЦК КП(б)Б. Былых партызанскіх кіраўнікоў паступова замянялі маладыя кадры, не звязаныя асабістымі адносінамі з П. Панамарэнкам. Прысутнічалі таксама і тыя, хто быў запрошаны М. Гусаравым з Пермскай вобласці. Дарэчы, М. Гусараў

(па словах П. Панамарэнкі) так акрэсліваў кадравую палітыку свайго папярэдніка: "Як на Беларусі ўзніклі органы ўлады? Узялі па Ваньку ад партызанскага атрада – вось і ўсё".

Новае кіраўніцтва разумела сваё прызначэнне: актывізаваць барацьбу з нацыянальным рухам і паскорыць працэсы калектывізацыі ў заходніх абласцях Беларусі. Сапраўды, у 1944-1946 гг. на тэрыторыі Заходняй Беларусі дзейнічалі не толькі атрады Арміі Краёвай. У розных кутках яе – у Слоніме, Навагрудку, Баранавічах, Глыбокім, Паставах, Брэсце і ў іншых гарадах і мястэчках ствараліся групоўкі, а потым і арганізацыі апазіцыйна настроенай беларускай моладзі. Так, вясной 1946 г. была створана беларуская патрыятычная арганізацыя ў Слоніме (для канспірацыі яе назвалі "Чайка"). Арганізацыя павінна была аб'яднаць "перадавое студэнцтва, беларускую інтэлігенцыю, свядомую рабочую і сялянскую моладзь". Галоўнай мэтай была абарона нацыянальных правоў і свабод, барацьба за захаванне і развіццё беларускай культуры, мовы і гісторыі. Распрацоўваліся таксама і праекты пабудовы незалежнай Беларусі. У хуткім часе "Чайка" аб'ядналася з патрыятычнай групай у Баранавіцкім настаўніцкім інстытуце, што пашырала сферу яе ўплыву.

У гэты ж час на тэрыторыі заходніх абласцей Беларусі актывізуе дзейнасць ужо сталая нацыянальная арганізацыя: Беларуская незалежніцкая партыя (М. Вітушка), распачынаюць работу групы ў Брэсцкім чыгуначным і Жыровіцкім сельскагаспадарчым тэхнікумах, Ганцавіцкім і Пастаўскім педвучылішчах. У Навагрудку склаўся гурток моладзі, што выбраў назву "Саюз вызвалення Беларусі" (яго філіялы дзейнічалі падпольна ў Мінску, Гродне і іншых гарадах). Напрыканцы 1946 г. – у самым пачатку 1947 г. была зроблена нават спроба аб'яднаць падпольны рух. Можна меркаваць, што Міністэрства дзяржбяспекі ўжо ў гэты час мела звесткі аб дзейнасці падпольных арганізацый і сваю агентуру ў іх. Аднак актыўныя дзеянні ведамства Л. Цанавы распачало ў лютым 1947 г. і невыпадкова прымеркавала іх да выбараў у Вярхоўны Савет БССР і мясцовыя саветы, якія павінны былі адбыцца ў нядзелю 9 лютага 1947 г. МДБ распаўсюджвала версію аб тым, што "Саюз беларускіх патрыётаў" (арганізацыі ў Глыбоцкім педвучылішчы і Паставах) меркаваў здзейсніць у гэты дзень шэраг тэрактаў. Разгром падпольных арганізацый паставіў сабе ў заслугу Л. Цанава і на XIX з'ездзе КП(б)Б акрэсліў іх як групоўкі, створаныя "агентамі імперыялізму".

Сапраўды, ва ўмовах "халоднай вайны" заходнія дзяржавы былі зацікаўлены ў разгортванні антысавецкага руху ў СССР і здольны былі яго падтрымліваць. Аднак звужаць праблему толькі да гэтага нельга.

Пераважная частка ўдзельнікаў беларускіх арганізацый самастойна прыходзіла да ўсведамлення сваёй адказнасці за лёс краіны. Калі б 20 мая 1947 г. Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР не адмяніў смяротную кару, многія з удзельнікаў паплаціліся б жыццём за сваю апазіцыйную дзейнасць. Аднак гады сібірскай катаргі вытрымалі далёка не ўсе.

На пачатку 1947 г. у ЦК КП(б)Б быў утвораны аддзел культуры. 27-28 жніўня на сходзе партыйнага актыву Мінскай гарадской арганізацыі КП(б)Б выступіў сакратар ЦК КП(б)Б М.Г. Іаўчук. Ён заклікаў пакончыць з нізкапаклонствам перад Захадам, з памылковым поглядам на тое, што нібы менавіта адтуль ішло святло культуры на Беларусь, выступіў супраць тэорыі "залатога веку" (перыяд Вялікага княства Літоўскага. - *Заўвага аўт.)* як "нацыяналістычнай ідэалагізацыі мінулага". Выступаўшы на нарадзе прэзідэнт АН БССР А.Н. Жэбрак ухіліўся ад пастаноўкі такога пытання.

Аднак ужо ў снежні 1947 г. А. Н. Жэбрак не выбіраецца нават у акадэмікі АН БССР. Пад лозунгам барацьбы супраць "праяўленняў безыдэйнасці і апалітычнасці", "за чысціню марксісцка-ленінскага светапогляду", "за няўхільнае кіраванне ленінскімі прынцыпамі класавасці і партыйнасці" ліквідаваліся цэлыя навуковыя галіны і школы, укараняўся дагматызм, падаўляліся любыя праяўленні іншадумства.

У лютым 1948 г. на адной з вуліц Мінска быў знойдзены мёртвым кіраўнік маскоўскага дзяржаўнага тэатра, былы старшыня яўрэйскага антыфашысцкага камітэта ў 1941-1945 гг. С. Міхоэлс. Як сведчаць дакументы, гэта была аперацыя па забойству.

У лютым 1949 г. упершыню пасля вайны адбыўся чарговы XIX з'езд Камуністычнай партыі Беларусі, на якім побач з гаспадарчымі разглядаліся і ідэалагічныя пытанні. З'езд вырашыў распачаць калектывізацыю ў заходніх абласцях Беларусі. Ён ухваліў барацьбу з касмапалітызмам, з "ворагам савецкага рэалістычнага мастацтва Меерхольдам". На арганізацыйным Пленуме Першым сакратаром ЦК КПБ(б) зноў быў абраны М. Гусараў.

Гэты ж 1949 г. святкаваўся як год 70-годдзя Сталіна. Ён спалучаўся з другім святам - 800-годдзем сталіцы СССР – Масквы. 1 студзеня 1950 г. многія рэспубліканскія выданні побач са штогадова традыцыйным навагоднім партрэтам І. Сталіна змясцілі яму віншаванне ад імя беларускага народа.

У студзені 1950 г. было надрукавана новае Палажэнне аб выбарах у Вярхоўны Савет БССР. Выбарам быў прысвечаны сход актыву Мінскай вобласці, на якім выступіў М. Гусараў, шматлікія

мітынгі, арганізаваныя на прадпрыемствах і ўстановах. Аднак вылучэнне кандыдатаў адбывалася па старому сцэнарыю. Першым усюды вылучаўся І. Сталін, толькі зараз больш спрактыкавана: унізе пад яго прозвішчам пісалі прозвішча рэальнага кандыдата, і гэта ўжо нагадвала пэўны рытуал.

Выбары 14 сакавіка 1950 г. праходзілі як свята, пад музыку і песні. А напярэдадні для святочнага настрою на ўсю шырыню першых старонак газет было змешчана разам з партрэтам І. Сталіна паведамленне аб зніжэнні цэн на ўсе харчовыя і прамысловыя тавары. 15 сакавіка ў звестках аб выбарах называліся лічбы ўдзельнікаў галасавання між 99-100% .

6 ліпеня 1950 г. пачалося пасяджэнне VIII сесіі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР. Толькі з 1950 па 1956 гг. Вярхоўны Савет БССР прыняў звыш 90 законаў і пастаноў. Нягледзячы на некаторыя хібы, яны сталі важным сродкам рэгулявання і ўдасканалення грамадскіх адносін, гаспадарчых, сацыяльна-культурных працэсаў.

Спецыфічнай заставалася роля камсамола і прафсаюзаў, якія не столькі павінны былі выяўляць і абараняць інтарэсы працоўных, моладзі, колькі накіроўваць іх гераічную працу. Адначасова камсамол з'яўляўся кузняй кадраў для партыі. Вядома, што першыя пасляваенныя кіраўнікі камсамола Беларусі (у 1945-1947 гг. – К.Т. Мазураў, са снежня 1947 па ліпень 1954 гг. – П.М. Машэраў) сталі вядомымі палітычнымі дзеячамі.

Акрамя прафсаюзаў і камсамола ў рэспубліцы дзейнічалі агульнасаюзныя грамадскія арганізацыі (ДТСААФ – добраахвотнае таварыства садзейнічання арміі, авіяцыі і флоту, спартыўныя і культурныя ўстановы і іншыя), членства ў якіх для большасці працаздольнага насельніцтва было абавязковым.

Трэба адзначыць, што на пачатку 1950-х гг. зноў узмацніліся супярэчнасці паміж звышдзяржавамі, пачалося ўзаемнае нарошчванне ядзерных арсеналаў. Таму Пастаянны камітэт сусветнага кангрэса прыхільнікаў міру прыняў адозву да кіраўнікоў дзяржаў аб забароне атамнай зброі. Збор подпісаў ахапіў і грамадзян Беларусі. Людзі, якія толькі што перажылі жудасную вайну, новай не жадалі. Па ўсёй рэспубліцы прайшлі мітынгі. Была створана Рэспубліканская камісія садзейнічання Савецкаму камітэту абароны міру па правядзенню збору подпісаў пад адозвай Пастаяннага камітэта. Старшынёй Рэспубліканскай камісіі быў абраны Я. Колас, намеснікамі – Ц. Гарбуноў і П. Машэраў. Пры пэўным фармалізме гэты рух стаў значнай падзеяй у грамадска-палітычным жыцці Беларусі першай паловы 1950-х гг.

На пачатку 1950 г. стала бачна, што сельская гаспадарка далёка не дасягне намечаных рубяжоў пяцігодкі. У ліпені 1950 г. Пленум ЦК УКП(б) заслухаў паведамленне сакратара ЦК УКП(б) П. Панамарэнкі "Аб недахопах у кіраўніцтве ЦК КП(б)Б сельскай гаспадаркай". Пленум вызваліў ад абавязкаў першага сакратара М.І. Гусарава і выбраў на гэтую пасаду М.С. Патолічава, які да абрання працаваў першым сакратаром Растоўскага абкама і гаркама УКП(б)). Нельга сказаць, што гэта адразу прывяло да змен у грамадска-палітычнай сітуацыі на Беларусі. М. Патолічаў, больш спрактыкаваны палітык, напачатку вымушаны быў мірыцца з той велізарнай уладай, што меў міністр Дзяржбяспекі БССР Л. Цанава. Апошні ў гэты час быў узнагароджаны ордэнам Леніна ў сувязі са сваім 50-годдзем.

Працягваліся арышты, барацьба з касмапалітызмам і нацыяналізмам. Быў арыштаваны як "югаслаўскі шпіён" міністр адукацыі П. В. Саевіч.

У сярэдзіне 1950-х гг. нацыянальны аспект стаў прадметам палітычнай барацьбы. У сакавіку 1953 г. памёр І.В. Сталін. Імкнучыся заручыцца падтрымкай "нацыянальных" партыйных кіраўнікоў, Л. Берыя выступіў з прапановай аб змене кіраўнікоў з цэнтра на мясцовых. У Мінск з рашэннем аб зняцці з пасады М. Патолічава накіроўваецца М. Зімянін. Аднак абмеркаванне пытання 25-27 чэрвеня 1953 г. пайшло па нечаканаму сцэнарыю. Пры той справядлівай крытыцы "аб выгнанні з ужытку беларускай мовы" (даклад М. Зімянін упершыню чытаў на беларускай мове, і выявілася, што амаль усе ўдзельнікі валодаюць ёй), Пленум выказаўся супраць адстаўкі М. Патолічава і фактычна ўпершыню не падпарадкаваўся рашэнню з цэнтра. Праўда, тут паўплывала і паведамленне аб арышце Л. Берыі.

Пасля Пленума адносіны з боку партыйных ідэолагаў да беларускай культуры пэўным чынам змяніліся. Барацьба з "нацыяналізмам" закончылася, і афіцыйныя ўлады сталі больш лаяльна адносіцца да нацыянальна-культурнага развіцця. XXI з'езд КП(б)Б, які праходзіў 10-13 лютага 1954 г., адзначыў, што "пры агульным росце беларускай літаратуры па-ранейшаму адстае драматургія, творчыя саюзы пісьменні-каў і кампазітараў, тэатр оперы і балета слаба займаюцца стварэннем новых нацыянальных твораў". Але гэта быў не паварот, а толькі памякчэнне афіцыйнага курсу.

Не адбылося істотных зрухаў і ў адносінах дзяржавы да канфесій. Калі ў дачыненні да праваслаўнай царквы ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны і першыя пасляваенныя гады можна было

назіраць пэўную лібералізацыю, то вельмі жорсткімі, непрымірымымі заставаліся адносіны да іншых канфесій, найперш каталікаў і іудзеяў.

**Дзейнасць БССР на міжнароднай арэне.** Другая сусветная вайна карэнным чынам змяніла палітычную карту Еўропы.

На Тэгеранскай канферэнцыі (лістапад-снежань 1943 г.) кіраўнікі краін антыгітлераўскай кааліцыі прымаюць рашэнне аб утварэнні міжнароднай арганізацыі, якая была б здольна кваліфікавана і аўтарытэтна вырашаць глабальныя праблемы сусветнага жыцця, быць гарантам захавання міру і бяспекі. Кожная з вялікіх краін была заклапочана тым, каб як мага грунтоўней абараніць свае інтарэсы, чаго можна было б дасягнуць наяўнасцю ў будучай арганізацыі пэўнай колькасці галасоў. Верагодна, менавіта з гэтай нагоды СССР уздымае перад саюзнікамі пытанне аб тым, каб у камісіі Аб'яднаных Нацый па ваенных злачынствах індывідуальнае членства атрымалі сем савецкіх рэспублік. Вялікабрытанія і ЗША да гэтай ініцыятывы аднесліся адмоўна і сваю пазіцыю слушна аргументавалі тым, што рэспублікі-члены СССР не маюць канстытуцыйных падстаў для заняткаў міжнароднай дзейнасцю.

Кіраўніцтва СССР добра разумела неабходнасць належнага прадстаўніцтва на міжнароднай арэне і вырашае тэрмінова выправіць становішча. Праблема разглядаецца на студзеньскім (1944 г.) Пленуме ЦК УКП(б), рашэнні якога заканадаўча афармляе ў лютым 1944 г. X сесія Вярхоўнага Савета СССР 1-га склікання. Канстытуцыя СССР карэктуецца, у яе ўносіцца палажэнне аб тым, што саюзныя рэспублікі маюць права: "уступаць у непасрэдныя зносіны з замежнымі дзяржавамі, заключаць з імі пагадненні і абменьвацца дыпламатычнымі прадстаўнікамі".

У сакавіку 1944 г. VI сесія Вярхоўнага Савета БССР 1-га склікання прымае Закон аб утварэнні Народнага камісарыята замежных спраў БССР. Канстытуцыйна былі замацаваны знешнепалітычныя прэрагатывы вышэйшых уладных інстанцый рэспублікі.

БССР улетку 1944 г. праводзіць непасрэдныя перагаворы з Польшчай, звязаныя са зменамі дзяржаўнай мяжы паміж краінамі-суседзямі. Тым не менш гэта не вырашала праблему прызнання БССР у якасці суб'екта міжнароднага права. 28 жніўня 1944 г. кіраўнік дэлегацыі СССР на канферэнцыі ў Думбартан-Оксе (ЗША) А.А. Грамыка ўнёс прапанову аб уключэнні ўсіх 16 савецкіх рэспублік у лік першапачатковых членаў будучай ААН. Ініцыятыва СССР выклікала адмоўную рэакцыю як з боку дэлегацый Вялікабрытаніі і ЗША, так і кіраўніцтва гэтых краін.

Прэзідэнт ЗША Ф. Рузвельт у пасланні І. Сталіну адзначаў, што савецкія прапановы ставяць пагрозу ўтварэнню міжнароднай арганізацыі, і вылучыў прапанову звярнуцца да гэтай праблемы пасля стварэння ААН. Савецкі бок не прыняў амерыканскія прапановы і падкрэсліў, што шэраг савецкіх рэспублік, у першую чаргу УССР і БССР, значна пераўзыходзяць памерам, колькасцю насельніцтва асобныя краіны, чыё членства ў ААН не выклікае ніякіх спрэчак.

Праблема была перанесена на Крымскую канферэнцыю (Ялта, люты 1945 г.) кіраўнікоў Вялікабрытаніі, ЗША і СССР. Вынікам напружаных перагавораў і ўзаемных кампрамісаў стала рашэнне аб тым, што СССР адмаўляецца ад членства 16 рэспублік і прапануе 2-3 рэспублікі, сярод якіх БССР і УССР. Менавіта гэтыя дзяржавы сталі першымі ахвярамі германскай агрэсіі, панеслі выключныя страты і ўнеслі вялікі ўклад у барацьбу з фашысцкім блокам. Дамоўленасць аб БССР і УССР была ўнесена ў сакрэтны пратакол канферэнцыі.

Звяртае на сябе ўвагу тая акалічнасць, што гэтыя ініцыятывы кіраўніцтва СССР прапаноўваліся без ведама кіраўніцтва беларускага і ўкраінскага народаў.

Нарэшце пачалі дзейнічаць і самі рэспублікі. У сакавіку 1945 г. улады БССР і УССР, якія не былі запрошаны на ўстаноўчую канферэнцыю Аб'яднаных Нацый у Сан-Францыска, абвясцілі, што накіруюць туды свае дэлегацыі. Гэта выклікала ўсплёск дыпламатычных перагавораў, якія скончыліся згодай Вялікабрытаніі, ЗША і Кітая падтрымаць ініцыятыву СССР аб афіцыйным запрашэнні прадстаўнікоў БССР і УССР на канферэнцыю.

27 красавіка 1945 г., праз два дні пасля пачатку працы, канферэнцыя прымае рашэнне аб уключэнні УССР і БССР у лік першапачатковых членаў арганізацыі. 30 красавіка прымаецца рашэнне аб запрашэнні дэлегацый БССР і УССР на ўстаноўчую канферэнцыю ААН.

У хуткім часе дэлегацыя БССР – К.В. Кісялёў, нарком замежных спраў БССР (кіраўнік), А.Р. Жэбрак, В.Н. Перцаў, Г.І. Байдукоў, Ф.П. Шмыгаў – удзельнічала ў рабоце ўстаноўчай сесіі ААН. 26 чэрвеня 1945 г. дэлегацыя БССР падпісала Статут Усеагульнай міжнароднай арганізацыі для падтрымкі міру і бяспекі; яго ратыфікацыя Вярхоўным Саветам БССР адбылася 30 жніўня таго года. БССР станавілася паўнамоцным суб'ектам міжнароднага права.

Аб'ектыўна шлях БССР у ААН быў адлюстраваннем яе ўкладу ў барацьбу Аб'яднаных Нацый з гітлераўскай кааліцыяй. Варта адзначыць, гэта адбылося не з-за натуральнага асэнсавання краінамі

сусвету гэтага факта, а тлумачыцца складанымі геапалітычнымі разлікамі вялікіх краін.

Ёсць падстава гаварыць аб тым, што існавалі планы знешне самастойных паводзін дэлегацый БССР і УССР, нават магчымасць усталявання дыпламатычных адносін БССР з замежнымі краінамі. Аб гэтым сказаў кіраўнік беларускай дэлегацыі К.В. Кісялёў на сваёй першай прэс-канферэнцыі. Аднак рэчаіснасць была іншай. Ва ўмовах цэнтралізаванай партыйна-дзяржаўнай сістэмы знешнепалітычная дзейнасць была манаполіяй саюзнага цэнтра, а рэспубліканскія наркаматы (з 1946 г. – міністэрствы) замежных спраў, іх прадстаўнікі на міжнародных форумах павінны былі ісці ў фарватэры саюзнай палітыкі. Напрыклад, на пасяджэнні Палітычнага камітэта, дзе абмяркоўвалася карэйскае пытанне, кіраўнік беларускай дэлегацыі Кісялёў зімправізіраваў і вельмі негатыўна выказаўся аб выступленні кітайскага дэлегата (ад урада Чан-Кай-Шы). Хаця выступленне цалкам супадала з генеральнай пазіцыяй СССР, кіраўнік дэлегацыі СССР А.Я. Вышынскі застаўся вельмі незадаволеным тым, што з ім не ўзгаднілі змест выступлення беларускага дыпламата. І толькі нечаканае адабрэнне выступлення К. Кісялёва з боку І. Сталіна ўратавала яго ад расправы.

БССР актыўна ўдзельнічала ў вырашэнні надзённых і складаных праблем міжнароднага супольніцтва. Беларуская дэлегацыя стала ініцыятарам прыняцця на І сесіі Генеральнай Асамблеі ААН (1946) рэзалюцыі аб выдачы і пакаранні ваенных злачынцаў.

БССР становіцца членам многіх спецыялізаваных міжнародных устаноў: Міжнароднага саюза электрасувязі (1947), Сусветнай метэаралагічнай арганізацыі (1948), Сусветнай арганізацыі працы (1948), Міжнароднай арганізацыі працы (1954), Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па справах адукацыі, навукі і культуры – ЮНЕСКА (1954). Але прадстаўнікі БССР дзейнічалі выключна ў накірунку саюзных ініцыятыў.

ЛЕКЦЫЯ 26

## ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЕ ЖЫЦЦЁ Ў 1950-1980-х гг.

- *Палітычная "адліга"*
- *Знешнепалітычная дзейнасць Беларусі*
- *Культура*

**Палітычная "адліга".** У гісторыі краіны прамежак часу пасля смерці Сталіна (5 сакавіка 1953 г.) і да адстаўкі М.С. Хрушчова ў кастрычніку 1964 г. называюць дзесяцігоддзем палітычнай "адлігі". Жыццё паставіла ў парадак дня неабходнасць рашэння комплексу пытанняў: ліквідацыя таталітарнага рэжыму і пераход да калектыўнага кіраўніцтва, спыненне масавых рэпрэсій і рэабілітацыі ахвяр сталінскага тэрору, змяненне эканамічнай палітыкі, змяненне знешнепалітычнай дактрыны і многае іншае.

Рашэнні XX з'езда КПСС (люты 1956 г.) пацвердзілі змяненні палітычнага курсу, разрыў з многімі сталінскімі пастулатамі і традыцыямі. На закрытым пасяджэнні з'езда з дакладам "Аб кульце асобы і яго выніках" выступіў М.С. Хрушчоў. Гэта была першая спроба палітычнага кіраўніцтва краіны падняць заслону над сталінскімі злачынствамі, паказаць шкоду, якую прынёс культ асобы развіццю грамадства. Вынясенне даклада на з'езд азначала пачатак пераходу ад таталітарызму да лібералізацыі.

Спроба зрабіць больш глыбокі аналіз культу асобы Сталіна ў жыцці грамадства была зроблена ў пастанове ЦК КПСС "Аб пераадоленні культу асобы і яго вынікаў" (30 чэрвеня 1956 г.). Але да канца раскрыць гэты феномен не ўдалося. У вышэйшых органах партыйнага і дзяржаўнага кіраўніцтва стаялі людзі, якія неслі адказнасць за злачынствы. Іх выкрыццё не закранала сутнасці аўтарытарна-бюракратычнай сістэмы, яе сацыяльнай прыроды.

Пасля XX з'езда КПСС на Беларусі пачаўся працэс рэабілітацыі ахвяр сталінскіх рэпрэсій. З 1955 па 1963 гг. было рэабілітавана 5619 чалавек. Сярод іх партыйныя, дзяржаўныя, ваенныя і грамадскія дзеячы В.Г. Кнорын, М.Ф. Гікала, М.М. Галадзед, А.І. Крыніцкі і інш. Была рэабілітавана група работнікаў навукі, культуры, рабочых і сялян. Аднак рэабілітацыя праходзіла складана, выбарачна. Да 1988 г. улады не згаджаліся на партыйную рэабілітацыю Дз. Жылуновіча. У першую хвалю рэабілітацыі цалкам не была адноўлена справядлівасць у адносінах да В. Ластоўскага, Я. Лёсіка, У. Ігнатоўскага, А. Баліцкага і інш. З прыходам да вышэйшай улады Л.І. Брэжнева рэабілітацыя

была амаль спынена. З 1972 па 1988 гг. было рэабілітавана толькі 169 чалавек.

Грамадска-палітычнае жыццё тых часоў было складаным і супярэчлівым, адлюстроўвала барацьбу двух тэндэнцый: дэмакратычнай, якая імкнулася да вызвалення ўсіх сфер жыцця ад скажэнняў сталінскай эпохі, і кансерватыўнай, якая імкнулася зберагчы і прыстасаваць старыя рычагі да новых рэалій грамадскай свядомасці. Пачаўся складаны, для многіх людзей і трагічны, працэс разбурэння стэрэатыпаў і поглядаў, якія склаліся.

Працэс лібералізацыі, што закрануў розныя сферы грамадскага жыцця, пачаўся перш за ўсё з дэмакратызацыі дзейнасці партыі. Было наладжана рэгулярнае скліканне партыйных з'ездаў і пленумаў ЦК КПСС і саюзных рэспублік. Стала шырока практыкавацца абмеркаванне партыйных і дзяржаўных дакументаў у друку і на сходах працоўных калектываў. Па важнейшых пытаннях развіцця розных галін народнай гаспадаркі пачалі склікацца нарады з прыцягненнем шырокага кола спецыялістаў.

У тыя часы партыйную арганізацыю Беларусі ўзначальвалі К.Т. Мазураў, П.М. Машэраў, Савет Міністраў – Ц.Я. Кісялёў, Вярхоўны Савет – С.В. Прытыцкі, Ф.А. Сурганаў. Усе яны шмат зрабілі для развіцця эканомікі, культуры, паляпшэння дабрабыту насельніцтва, мелі свае погляды на вырашэнне тых ці іншых праблем развіцця Беларусі, карысталіся павагай народа.

У дзейнасці кампартыі Беларусі, саветаў, прафсаюзаў, камсамола паглыблялася калегіяльнасць і рабіліся пэўныя захады па пашырэнню ўдзелу насельніцтва ў іх рабоце. У 1957-1958 гг. Вярхоўны Савет БССР зацвердзіў палажэнне аб сельскім, пасялковым, раённым, гарадскім Саветах дэпутатаў працоўных. Яно было накіравана на паляпшэнне дзейнасці Саветаў у эканоміцы і грамадска-палітычным жыцці. У выніку Саветы атрымалі больш шырокія правы. У практыцы іх работы вялікае значэнне набылі шматлікія камісіі, да ўдзелу ў якіх на грамадскіх пачатках прыцягваліся прадстаўнікі рабочых, сялянства і інтэлігенцыі. Аднак карэнных змен у дзейнасці Саветаў не адбылося. Яны па-ранейшаму рэальнай уладай не валодалі.

Курс на дэмакратызацыю грамадства павінен быў знайсці адпаведны працяг і ў эканоміцы. Эканамічныя перабудовы былі накіраваны на пашырэнне гаспадарчых правоў саюзных рэспублік шляхам перадачы ім пытанняў, якія раней вырашаліся ў цэнтры. Толькі ў 1956 г. у распараджэнне ўрада БССР было перададзена 356 прадпрыемстваў, а ў 1957 – больш 500 прадпрыемстваў. 11 сакавіка

1957 г. Вярхоўны Савет СССР прыняў закон, паводле якога рэспублікі самі маглі вырашаць пытанні абласнога і краявога адміністрацыйна-тэрытарыяльнага будаўніцтва. Пашырыліся заканадаўчыя правы саюзных рэспублік. У іх кампетэнцыю ўвайшло прыняцце грамадзянскага, крымінальнага і працэсуальнага кодэксаў.

У 1962 г. была праведзена рэарганізацыя кіруючых органаў кампартыі Беларусі. Яны падзяляліся на прамысловыя і сельскія. Былі створаны Прэзідыум ЦК КПБ, Бюро ЦК па кіраўніцтву прамысловасцю і будаўніцтвам, Бюро ЦК па кіраўніцтву сельскай гаспадаркай, а таксама адзіны кантрольны орган – Камітэт партыйна-дзяржаўнага кантролю ЦК КПБ і СМ БССР. Былі арганізаваны 12 абкамаў, 25 гаркамаў, 23 камітэты па прамысловых зонах і 77 – па вытворчых калгасна-саўгасных упраўленнях. Па такому прынцыпу былі падзелены савецкія, камсамольскія, прафсаюзныя і грамадскія арганізацыі. Гэта структура не апраўдала сябе і ў 1964 г. была ліквідавана.

Многія эканамічныя праблемы тых гадоў спрабавалі вырашыць чыста палітычнымі прыёмамі і метадамі. Выкарыстоўваліся прыёмы непасрэднага звароту да свядомасці. У 1959 г. камсамольскія арганізацыі Беларусі накіравалі на будоўлі Сібіры, Закаўказзя 7,5 тыс. юнакоў і дзяўчат, у наступным годзе яшчэ 3,9 тыс.

У 1959 г. у краіне набірала сілу новая грамадзянская ініцыятыва – нараджаўся рух за камуністычную працу. Ён праходзіў у прывычных традыцыях сацыялістычнага спаборніцтва. Спробы рэальна звязаць энтузіязм і эканамічную зацікаўленасць (пачатак брыгаднага падраду) успрымаліся галоўным чынам як "сквапнасць" і амаль што "капіталізм" у эканоміцы.

Адміністрацыйна-камандная сістэма не магла функцыянаваць без штодзённых мабілізацый сваіх грамадзян для дасягнення самых розных мэт. Вось чаму ў кастрычніку 1961 г. на XXII з'ездзе КПСС была прынята новая партыйная праграма, якая паставіла мэту ўжо праз 20 гадоў пабудаваць камуністычнае грамадства і "забяспечыць самы высокі жыццёвы ўзровень у параўнанні з любой іншай краінай капіталізму". Пастаноўка непрадуманых задач прыводзіла да расчаравання ў грамадстве. Адсутнасць рэальнай справы змянялася нарастаннем рытуальнасці, дасягнуўшай у часы Брэжнева сваёй кульмінацыі.

Лібералізацыя станоўча паўплывала на развіццё духоўнай сферы. Праходзіў працэс раскансервацыі "закрытага грамадства". Пашыраліся міжнародныя кантакты. У Маскве адбыўся сусветны фестываль моладзі і студэнтаў (1957). Грамадскі ўздым выклікаў

нараджэнне новых творчых напрамкаў у літаратуры і мастацтве. Увогуле ў гады "адлігі" навука і культура развіваліся ў межах, якія вызначаліся ім партыйнымі органамі. Значную ролю працягвалі адыгрываць асабістыя прадузятасці партыйных кіраўнікоў. Некаторыя пісьменнікі абвінавачваліся ў "ачарніцельстве сацыяльнай рэчаіснасці" (В. Дудзінцаў "Не хлебам адзіным", Д. Гранін "Асабістыя меркаванні", Б. Пастэрнак "Доктар Жывага", А. Кулакоўскі "Тры зоркі" і інш.). Пагромнай крытыцы падвяргаліся і дзеячы мастацтва за творы, якія не спадабаліся Хрушчову. Такім чынам, аўтарытарная сістэма працягвала жорсткі кантроль над духоўнай сферай грамадства.

Палітыкай Хрушчова была незадаволена партыйная бюракратыя. Старая наменклатура не магла даравацць выкрыцця культу асобы Сталіна. Вайсковыя вярхі былі незадаволены скарачэннямі ўзброеных сіл, дзеячы навукі і культуры – грубым умяшаннем у іх творчасць. Сялянства не магло пагадзіцца з палітыкай ліквідацыі многіх вёсак, скарачэннем асабістых гаспадарак. Нягледзячы на тое, што рэформы не знялі кардынальных праблем грамадскага развіцця, перыяд "адлігі" быў моцным ударам па таталітарнай сістэме сталінізму.

Пачаткам новага этапа савецкай гісторыі з'яўляецца кастрычніцкі (1964 г.) Пленум ЦК КПСС. Ён вызваліў М.С. Хрушчова ад займаемых пасад. Першым сакратаром быў абраны Л.І. Брэжнеў. Паколькі сістэма мела іерархічны характар, першая асоба ў складзе вышэйшага эшалона ўлады мела вызначальны характар. На XXIII з'ездзе КПСС (1966 г.) Брэжнеў стаў Генеральным сакратаром партыі. Паступова ён засяродзіў у сваіх руках усю паўнату ўлады: становіцца Старшынёй Савета абароны, у 1977 г. заняў пасаду Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР.

Павышэнне кіруючай ролі партыі абвяшчалася універсальным сродкам рашэння ўсіх эканамічных і сацыяльных праблем. XXIV з'езд (1971) унёс у статут палажэнне аб праве кантролю партыйнымі арганізацыямі дзейнасці адміністрацыі. Партыйныя органы дублiравалі органы гаспадарчага кіраўніцтва. Завяршала гэту палітыку замацаванне ў 6-м артыкуле Канстытуцыі СССР (1977) палажэння аб кіруючай ролі партыі ў грамадстве.

Абвешчаны курс на стабільнасць набываў рысы палітыкі стагнацыі. У палітычны лексікон увайшло паняцце "развіты сацыялізм", афіцыйную выснову аб якім зрабіў Л.І. Брэжнеў у юбілейным дакладзе да 50-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі і вызначэнне якому было дадзена ў Канстытуцыі СССР (1977). Новая канцэпцыя прызвана была вырашыць супярэчнасці паміж дэкларацыяй аб блізкай

перамозе камунізму і нерэалізаваным яго ўвасабленнем у жыццё. Уся сістэма грамадскіх адносін пачала разглядацца з пункту гледжання адпаведнасці "крытэрыям спеласці". Пачалася падгонка жывых працэсаў пад новую схему. З грамадска-палітычнай літаратуры зніклі недахопы, цяжкасці. Уведзенае ў гэты час вызначэнне "новай гістарычнай супольнасці – савецкага народа" ігнаравала існуючую сацыяльную дыферэнцыяцыю, нацыянальныя асаблівасці.

У грамадстве складваўся кантраст паміж лозунгамі і рэальнымі справамі. Усё больш мацнелі заклікі да працоўных мабілізаваць сродкі, павысіць актыўнасць, адрадзіць стаханаўскі рух, пачалі раздавацца пагрозы ў адрас вінаватых. Усе гэтыя сцвярджэнні па сутнасці адкрыта заклікалі вярнуцца да мінулага. У рамках новых установак пачала гаснуць і паступова заціхла крытыка Сталіна.

Між тым у краіне наспявала незадавальненне, сфарміравалася апазіцыя. Частка інтэлігенцыі пачала выступаць з крытыкай сістэмы. Вышэйшае палітычнае кіраўніцтва краіны ўсё рабіла для таго, каб скончыць з палітычнай "адлігай". Рэзка ўзмацніліся цэнзурныя абмежаванні пасля прыняцця пастановы ЦК КПСС "Аб павышэнні адказнасці кіраўнікоў органаў друку, радыё, тэлебачання, кінематаграфіі, устаноў, культуры і мастацтва за ідэйна-палітычны ўзровень публікуемых матэрыялаў і рэпертуараў" (1969). Меры па выкананню гэтай пастановы ў Беларусі зацвердзіла ў сакавіку 1969 г. Бюро ЦК КПБ. Любыя адхіленні ад афіцыйных установак падлягалі асуджэнню. Пад барацьбу з іншадумствам была падведзена прававая аснова. У Крымінальны кодэкс БССР быў уведзены артыкул 67, які прадугледжваў за агітацыю ці прапаганду ў мэтах падрыву ці паслаблення Савецкай улады, распаўсюджванне, выраб і захоўванне ў тых самых мэтах літаратуры такога зместу – пакаранне пазбаўленнем волі на тэрмін ад шасці месяцаў да сямі гадоў з высылкай на тэрмін ад двух да пяці гадоў.

Людзей, якія выступалі супраць несправядлівасці, парушэнняў правоў чалавека, сталі называць "дысідэнтамі". Адным з ідэолагаў дэмакратычнага руху быў акадэмік Дз. Сахараў, які асудзіў увод савецкіх войскаў у Афганістан, за што быў сасланы, пазбаўлены ўсіх узнагарод. Пасля выхаду кнігі "Архіпелаг ГУЛАГ" пісьменнік А. Салжаніцын у 1974 г. быў пазбаўлены грамадзянства СССР і высланы за межы краіны. Дысідэнцтва на Беларусі было слабым. Але і тут некаторыя прадстаўнікі інтэлігенцыі выступалі за пашырэнне дэмакратычных правоў і свабод.

Адміністрацыйна-камандная сістэма скоўвала ініцыятыву Саветаў, якія не выступалі паўнамоцнымі органамі народаўладдзя,

страчвалі аўтарытэт у вырашэнні многіх пытанняў дзяржаўнага і грамадскага жыцця. Аказаліся скажонымі і асноўныя функцыі прафсаюзаў. Яны практычна пераўтварыліся ў адно са звёнаў партыйна-дзяржаўнай сістэмы ўлады. Супярэчлівыя працэсы адбываліся і ў камсамольскай арганізацыі Беларусі. З аднаго боку, яна праводзіла значную работу па ідэйна-палітычнаму, працоўнаму і маральнаму выхаванню моладзі. З другога, многія формы працы адставалі ад патрабаванняў жыцця, не адпавядалі інтарэсам юнакоў і дзяўчат. Ініцыятыва камсамольскіх арганізацый была пад кантролем партыйных камітэтаў.

Адміністрацыйныя метады кіравання не спрыялі павышэнню прэстыжнасці сумленнай працы. Усё больш заяўляла аб сабе тэндэнцыя абязлічвання грамадскай уласнасці, чым у значнай ступені тлумачыліся абыякавыя адносіны да яе. Нерацыянальна выкарыстоўваліся матэрыяльныя рэсурсы, пашыраўся крадзеж народнага багацця, марнатраўства і безгаспадарчасць.

Прыняцце многіх рашэнняў па барацьбе са службовымі злоўжываннямі поспеху не мелі. З высокіх трыбун гаварылі аб абавязку, гонары і сумленні камуніста. Але ішло размыванне маральных крытэрыяў, па якіх арганізоўвалася жыццё грамадства. Аўтарытэт партыі зменшыўся, многія кіраўнікі вышэйшага эшалона ўлады ў народзе сталі непапулярнымі.

Пошукі шляхоў выхаду з крызісу былі зроблены пасля лістападаўскага Пленума ЦК КПСС (1982 г.), на якім Генеральным сакратаром ЦК КПСС выбралі Ю.У. Андропава. Па-новаму быў пастаўлены шэраг пытанняў тэарэтычнага, сацыяльна-эканамічнага характару. Пачалася барацьба з карупцыяй, кампанія па навядзенню парадку і дысцыпліны, хаця ў ёй былі перагібы. Суадносіны сіл у структуры ўлады на карысць кансерватыўнага крыла адбыліся пасля смерці Ю.У. Андропава. На пасаду Генсека быў абраны К.У. Чарненка (1984). Працэс стагнацыі зайшоў так далёка, што ствараў пагрозу для стабільнасці палітычных структур. Грамадства стаяла на парозе непазбежных перамен.

**Знешнепалітычная дзейнасць Беларусі.** У сярэдзіне 50-х гадоў адбылася змена знешнепалітычнага курсу СССР. XX з'езд КПСС (1956 г.) прыняў рад палажэнняў у знешняй палітыцы, якія ішлі ўразрэз з догмамі сталінскай эпохі. Ад імя партыі Хрушчоў заявіў, што мірнае суіснаванне дзяржаў – не часовы ход, а нязменная палітычная лінія краін сацыялізму. Важным быў вывад аб магчымасці прадухілення войнаў у сучасную эпоху. Пасля XX з'езда партыі знешнепалітычная дзейнасць КПСС і Савецкай дзяржавы набыла

дынамізм, у многім процілеглы той застыласці, дагматызму, якія былі характэрны для папярэдніх гадоў.

Практычныя крокі па прарыву "жалезнай заслоны" пашырылі магчымасці ўдзелу БССР у знешнепалітычнай дзейнасці. Яна праходзіла ў рэчышчы міжнароднай дзейнасці СССР, скаардынаванай палітыкі краін – членаў Варшаўскага дагавору і Савета Эканамічнай Узаемадапамогі. Усе пытанні адносін з замежнымі дзяржавамі, міжнароднымі арганізацыямі вырашаліся Савецкім урадам і саюзнымі органамі. Дэлегацыі СССР, БССР, УССР выказвалі свае меркаванні і ўзгаднялі пазіцыі з саюзнікамі на рэгулярных нарадах напярэдадні сесіі Генеральнай Асамблеі ААН, канферэнцыі ЮНЕСКА, якія затым супольна адстойвалі.

Характар і маштабы знешнепалітычнай дзейнасці рэспублікі вызначаліся агульнымі працэсамі развіцця міжнароднай абстаноўкі, процiборствам двух сістэм і іх знешнепалітычных саюзаў. Абедзве сістэмы свае ідэалагічныя рознагалоссі пераносілі на міжнародныя адносіны, ігнаравалі палітычныя сродкі вырашэння праблем, арыентаваліся на нарошчванне і ўдасканальванне ўзбраення. Паміж краінамі Захаду і Усходу ў гой ці іншай форме працягвалася "халодная вайна", якая перапынялася шматлікімі перыядамі змякчэння міжнароднай напружанасці. "Адліга" другой паловы 50-х гадоў змянілася абвастрэннем савецка-амерыканскіх адносін: уварванне амерыканскіх наймітаў на Кубу ў 1961 г., берлінскі крызіс таго самага года. У 1962 г. разгарэўся карыбскі крызіс, у выніку якога свет аказаўся на валаску ад ядзернай вайны.

Дасягненне ў канцы 60-х гг. раўнавагі паміж СССР і ЗША аб'ектыўна ўмацавала мір, хаця ён заставаўся нетрывалым. Палітыка разрадкі была замацавана ў Хельсінскім Заключным акце нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе (жнівень 1975 г.) у Хельсінкі.

З канца 1970 да сярэдзіны 1980-х гадоў разрадка змянілася новым турам гонкі ўзбраенняў, канфрантацыі. Рэвалюцыя ў тэхніцы ўзбраенняў прывяла да магчымасці знішчэння чалавечай цывілізацыі. Рэальнасці патрабавалі новых падыходаў у міжнародных адносінах. У гэты перыяд брэжнеўскае кіраўніцтва дапусціла рад буйнейшых знешнепалітычных пралікаў. Сур'ёзным падрывам даверу да Савецкага Саюза з'явілася афганская вайна (1979-1989 гг.), якая прынесла вялікія чалавечыя і матэрыяльныя страты як народам Саюза ССР, у тым ліку беларускаму, так і Афганістана. Гэтая акцыя падвергласся рэзкаму асуджэнню сусветнай супольнасці. Дэлегацыя БССР была ў ліку тых, хто не падтрымаў патрабавання ААН аб вывадзе савецкіх войскаў з гэтай краіны.

У дадзены перыяд Беларусь пашырыла знешнепалітычную дзейнасць. Рэспубліка заключыла шэраг міжнародных дагавораў, актывізавалася дзейнасць беларускіх дэлегацый у міжнародных арганізацыях. Калі ў канцы 50-х гадоў рэспубліка была ўдзельніцай 54 міжнародных дагавораў, канвенцый і пагадненняў, у сярэдзіне 80-х гадоў – больш як 160. Яна прымала ўдзел у рабоце амаль 70 міжнародных арганізацый і іх органаў. Для падтрымання кантактаў з імі былі створаны пастаянныя прадстаўніцтвы БССР пры ААН у Нью-Йорку (1958), Еўрапейскім аддзяленні ААН у Жэневе (1962), міжнародных арганізацыях у Вене. У 1974-1975 гг. БССР была пастаянным членам Савета Бяспекі.

Па ініцыятыве і пры ўдзеле дэлегацый БССР у міжнародных арганізацыях прынята было нямала канструктыўных рашэнняў, якія спрыялі пашырэнню ўзаемаразумення паміж народамі. У 1959 г. на XIV сесіі ААН дэлегацыя БССР падтрымала прапанову СССР аб усеагульным і поўным раззбраенні. На наступных сесіях БССР адстойвала лінію на згортванне гонкі ўзбраенняў, забарону выпрабаванняў ядзернай зброі і другіх сродкаў масавага знішчэння людзей. БССР прымала ўдзел у распрацоўцы і прыняцці ў 1968 г. Дагавора аб нераспаўсюджванні ядзернай зброі. Па ўмовах гэтага Дагавора ўсе неядзерныя дзяржавы абавязваліся не выrabляць, не размяшчаць, не выкарыстоўваць ядзернай зброі. У выніку на мяжы 70-х гг. была значна аслаблена міжнародная напружанасць.

Мэтанакіраваная дзейнасць міралюбівых сіл садзейнічала вырашэнню некаторых праблем раззбраення. Выконваўся Маскоўскі дагавор 1963 г. аб забароне выпрабаванняў ядзернай зброі ў атмасферы, касмічнай прасторы і пад вадой. Пад гэтым дакументам стаіць подпіс БССР. Беларусь стала ўдзельніцай Канвенцыі аб забароне ваеннага ці другога варожага выкарыстання сродкаў уздзеяння на прыроднае асяроддзе.

БССР выступала ініцыятарам абмеркавання міжнароднымі арганізацыямі шэрагу праблем. Адной з такіх праблем было пытанне выдачы і пакарання ваенных злачынцаў. У сярэдзіне 60-х гадоў урад ФРГ прыняў рашэнне спыніць судовае праследаванне нацысцкіх ваенных злачынцаў на аснове заканчэння тэрміну даўнасці ў 20 гадоў па германскаму крымінальнаму кодэксу 1871 г. Па прапанове БССР Генеральная Асамблея ААН прыняла Канвенцыю аб непрымяненні тэрміну даўнасці да ваенных злачынцаў і злачынцаў супраць чалавецтва.

Выступаючы за сацыяльны прагрэс і захаванне правоў чалавека, БССР была сааўтарам Дэкларацыі сацыяльнага развіцця (1969), Дэ-

кларацыі аб выкарыстанні навукова-тэхнічнага прагрэсу ў інтарэсах міру і на карысць чалавецтва (1975). БССР стала ўдзельніцай Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах (1968), Міжнароднага пакта аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах, Міжнароднай канвенцыі аб ліквідацыі ўсіх формаў расавай дыскрымінацыі (1966) Беларусь падтрымала Дэкларацыю аб прадстаўленні незалежнасці каланіяльным краінам і народам (1960), а ў наступныя гады паслядоўна выступала за яе поўнае выкананне. Па прапанове дэлегацыі БССР Генеральная Асамблея ААН прыняла рэзалюцыю аб абароне асоб, якія затрыманы ці пазбаўлены волі за барацьбу супраць апартэіду, расізму і расавай дыскрымінацыі, каланіялізму, агрэсіі і замежнай акупацыі (1977). Праз міжнародныя і міжурадавыя арганізацыі і іх органы рэспубліка далучалася да сусветнага вопыту ў многіх сферах жыцця, умацоўвала свой аўтарытэт на міжнароднай арэне.

У галіне знешнеэканамічных сувязяў савецкіх рэспублік вырашальную ролю адыгрывала дзяржаўная манаполія знешняга гандлю СССР. Міністэрства знешняга гандлю СССР ажыццяўляла аперацыі з замежнымі краінамі праз спецыяльныя арганізацыі і ведамствы. Усесаюзныя знешнегандлёвыя аб'яднанні размяркоўвалі экспартныя заказы і паміж беларускімі прадпрыемствамі, арганізоўвалі пастаўкі ў рэспубліку імпартнага абсталявання і прамысловых вырабаў.

Маштабы знешніх сувязей рэспублікі вызначаліся яе прамысловым і навукова-тэхнічным патэнцыялам, зручным транспартна-геаграфічным становішчам, а таксама агульным станам эканамічных адносін СССР з замежнымі дзяржавамі.

Беларусь у параўнанні з іншымі рэспублікамі Саюза мела лепшыя паказчыкі гаспадарчага развіцця, у прыватнасці, па росту валавага грамадскага прадукту і нацыянальнага даходу, прадукцыйнасці працы. Многія тавары па сваёй якасці адпавядалі ці былі блізкімі сусветнаму ўзроўню. Гэта садзейнічала таму, што ў другой палове 50 – першай палове 80-х гадоў экспарт прадукцыі з рэспублікі павялічыўся ў шмат разоў. Калі ў 1956 г. больш 100 прадпрыемстваў рэспублікі пастаўлялі сваю прадукцыю 47 краінам, то ў 1985 г. - 300 прадпрыемстваў – больш чым 100 дзяржавам.

У мэтах пашырэння гандлёва-эканамічных сувязяў Беларуская ССР падпісала Канвенцыю аб міжнародных выстаўках. У 60-70-я гг. на выстаўках у Бруселі, Японіі, Лейпцыгу, Канадзе, Польшчы і іншых гарадах і краінах залатымі прызёрамі выставаў былі трактары МТЗ, БелАЗы, сіласаўборачныя камбайны і прычэпы. У 60-х гадах БССР прымала ўдзел больш як у 200 міжнародных выставах і кірмашах. За

гэты час 30 вырабаў 18 прадпрыемстваў атрымалі 37 ганаровых дыпломаў. БССР таксама праводзіла спецыялізаваныя міжнародныя выставы, што сведчыла аб прызнанні яе ўкладу ў тую або іншую галіну навукі і тэхнікі. У Мінску праходзілі выстаўкі: "Бульба-76", "Парашковая металургія-73, 77", "Холад-78" і інш.

Большая частка прадукцыі беларускіх прадпрыемстваў накіроўвалася краінам – членам СЭУ. Каля 10 % экспартных паставак у 70-я гг. прыпадала на долю краін Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі. На развітыя капіталістычныя краіны – 20 % экспартных паставак рэспублікі. Важнае месца ў экспарце краіны займалі беларускія трактары, грузавыя аўтамабілі, сіласаўборачныя камбайны, самаходныя скрэперы, наручныя гадзіннікі, станкі-паўаўтаматы, радыётэхнічныя прыборы, калійныя ўгнаенні, веласіпеды, тканіна і інш.

Абсталяваннем з Беларусі аснашчаліся новыя прадпрыемствы, якія будаваліся з дапамогай СССР у розных краінах свету. У іх ліку Бхілайскі металургічны камбінат у Індыі, Асуанская ГЭС у Егіпце, машынабудаўнічы завод у Алжыры, цэментны ў Йемене і інш. Беларускія трактарабудаўнікі перадалі эфіопскім спецыялістам тэхнічную дакументацыю, неабходнае абсталяванне, механізмы, аказалі дапамогу ў зборцы першых трактароў. Беларускія спецыялісты аказвалі дапамогу ў пошуку прыродных рэсурсаў і правядзенні геолагаразведачных работ у Афганістане, Іране, Мазамбіку, Сірыі, Малі і іншых краінах.

Імпартныя паступленні ў рэспубліку садзейнічалі аснашчэнню прадпрыемстваў, пэўнаму задавальненню патрэб насельніцтва на тавары шырокага ўжытку. Толькі з 1961 па 1969 гг. ў БССР паступіла больш за 120 камплектаў імпартнага абсталявання, якім аснашчана амаль 100 прадпрыемстваў, у тым ліку Гродзенскі і Полацкі хімічныя камбінаты, Светлагорскі завод штучнага валакна, Слуцкі і Жабінкаўскі цукровыя заводы, Пінскі камбінат верхняга трыкатажу, Магілёўскі камбінат сінтэтычнага валакна, Мінскі завод халадзільнікаў і іншыя.

З канца 70-х гадоў пачала падаць канкурэнтаздольнасць савецкіх вырабаў на сусветным рынку, зніжаўся на іх попыт, вываз пры адначасовым павелічэнні экспарту сыравіны і энерганосьбітаў. Калі ў заходніх краінах на базе "тэхнічнай рэвалюцыі ішоў працэс хуткага ўдасканалення тэхналогіі вытворчасці, аднаўлення наменклатуры, рэзкага павелічэння іх якасці, то ў СССР гэтыя працэсы ажыццяўляліся адміністрацыйнай сістэмай павольна і з вялікімі цяжкасцямі. З уводам савецкіх войскаў у Афганістан у 1979 г. заходнія краіны яшчэ больш абмежавалі эканамічныя сувязі з СССР.

Важнае месца ў адносінах з замежнымі краінамі мелі культурныя сувязі, якія ажыццяўлялі дзяржаўныя творчыя саюзы і калектывы, навучальныя ўстановы і навуковыя бібліятэкі, Беларускае таварыства дружбы і культурных сувязяў з замежнымі краінамі, Камітэт маладёжных арганізацый Беларусі. Прадстаўнікі БССР удзельнічалі ў рабоце Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры (ЮНЕСКА). Міжнародным саюзе электрасувязі (МСЭ), Міжнародным савеце архіваў, Міжнародным агенцтве па атамнай энергіі (МАГАТЭ) і інш.

У адпаведнасці са статутам ЮНЕСКА Беларуская ССР у 60 першай палове 80-х гадоў вяла падрыхтоўку кадраў для замежных краін. Да канца 1985 г. у рэспубліцы завяршылі навучанне каля 10 тыс. замежных грамадзян, у тым ліку каля 4 тыс. навучэнцаў атрымалі вышэйшую і больш 1 тыс. сярэднюю спецыяльную адукацыю, 2,5 тыс. сталі высокакваліфікаванымі рабочымі.

Узбагачэнню культуры садзейнічаў выпуск кніг замежных аўтараў у перакладзе на беларускую і рускую мовы. За пасляваенны перыяд агульны тыраж перакладзеных кніг замежных аўтараў склаў 10 млн. экзэмпляраў. За 1946-1985 гг. за межамі СССР надрукаваны 342 асобныя кніжкі 55 беларускіх пісьменнікаў. Сярод іх творы Я. Купалы, Я. Коласа, Я. Брыля, І. Мележа, У. Караткевіча, М. Танка і інш.

Культурныя і навуковыя сувязі ў гэтыя гады развіваліся з краінамі Усходняй Еўропы. Ва ўмовах канфрантацыі дзвюх грамадскіх сістэм, празмернай ідэалагізацыі культурных адносін, сувязі ў галіне навукі і культуры з капіталістычнымі краінамі былі нязначнымі. Шырокаму, свабоднаму міжнароднаму абмену ў галіне культуры і навукі перашкаджалі строгі кантроль і адбор людзей, якія выязджалі за межы СССР і прыязджалі ў рэспубліку.

**Культура.** Другая сусветная вайна з усёй відавочнасцю паказала ролю навукі, тэхнікі ва ўсіх сферах жыцця. Невыпадкова таму ў пасляваенны перыяд савецкае кіраўніцтва надае развіццю фундаментальнай навукі, рэфармаванню адукацыі, культурнаму будаўніцтву прыярытэтнае значэнне. За гады вайны на Беларусі была амаль поўнасцю знішчана матэрыяльна-тэхнічная база ўстаноў навукі, адукацыі і культуры, загінулі многія навукоўцы і выкладчыкі. Але да 1950 г. школьная сетка ў рэспубліцы была адноўлена.

Рэформа ў сістэме народнай адукацыі другой паловы 50-х гадоў праводзілася ў рэчышчы агульных палітычных пераўтварэнняў. Асноўным яе стрыжнем з'яўлялася ўвядзенне політэхнічнага навучання і цесная сувязь яго з працоўным выхаваннем. У снежні 1958 г. Вярхоўны Савет СССР прыняў Закон "Аб умацаванні сувязі школы з

жыццём і аб далейшым развіцці народнай адукацыі СССР", згодна з якім сямігадовыя школы пераўтвараліся ў васьмігадовыя, сярэднія – у агульнаадукацыйныя адзінаццацігадовыя з вытворчым навучаннем. Ствараліся школы-інтэрнаты, у якіх вучыліся дзеці-сіраты і дзеці з малазабяспечаных сем'яў. Ва ўсіх сярэдніх і большасці васьмігадовых школах былі адкрыты майстэрні. Школы пераходзілі на кабінетную сістэму. Аднак у 1964 г. школы былі зноў пераведзены на дзесяцігадовы тэрмін навучання. Прафесійная падрыхтоўка стала неабавязковай.

Новая хваля мадэрнізацыі ў народнай адукацыі пачалася ў другой палове 60-х і пачатку 70-х гг. У школах уводзіліся новыя праграмы. Пачатковая школа перайшла на трохгадовы тэрмін навучання. Дзіцячыя дашкольныя ўстановы пачалі ператварацца ў першую ступень падрыхтоўкі ў школу. Да 1975 г. быў завершаны пераход да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі.

Пашыралася падрыхтоўка кваліфікаваных рабочых праз прафесійна-тэхнічныя вучылішчы. Калі ў 1961 г. іх было 103, то ў 1985 г. - 240. У 70-я гады прафтэхвучылішчы рэспублікі перайшлі на сярэднюю сістэму адукацыі.

Развівалася вышэйшая і сярэдняя спецыяльная школы Беларусі. Былі адкрыты Беларускі тэатральны інстытут – 1945 г., Гродзенскі сельскагаспадарчы інстытут – 1951 г., Беларускі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту ў Гомелі – 1953 г., Беларускі інстытут механізацыі і сельскай гаспадаркі – 1954 г., Беларускі інстытут замежных моў. У 1950/51 навучальным годзе налічвалася 29 ВНУ, а студэнтаў было на 10 тыс. больш, чым перад вайной.

За 1960-1985 гг. колькасць сярэдніх навучальных устаноў павялічылася з 102 да 139, а навучэнцаў у іх – з 62,6 тыс. да 160,4 тыс. У 60-70-я гг. вышэйшая школа Беларусі развівалася вельмі дынамічна. Былі адкрыты новыя навучальныя ўстановы: Мінскі радыётэхнічны інстытут, Віцебскі тэхналагічны інстытут лёгкай прамысловасці, Брэсцкі інжынерна-будаўнічы, Мінскі інстытут культуры, Магілёўскі тэхналагічны, На-ваполацкі і Гомельскі політэхнічныя інстытуты. У 1969 г. на базе Гомельскага педагагічнага інстытута створаны Гомельскі дзяржаўны універсітэт. У 1977 г. Гродзенскі педагагічны інстытут быў пераўтвораны ў Гродзенскі дзяржаўны універсітэт. Цэнтрам універсітэцкай адукацыі заставаўся Белдзяржуніверсітэт, у якім навучалася 17 тыс. студэнтаў. У 1985 г. у 33 ВНУ навучалася 182 тыс. студэнтаў, а агульны лік выпускнікоў ВНУ вырас з 10 тыс. у 1960 г. да 31,9 тыс. у 1985 г.

Сярэднія спецыяльныя і вышэйшыя навучальныя ўстановы забяспечвалі патрэбнасці народнай гаспадаркі і культуры рэспублікі.

Значныя зрухі былі зроблены ў развіцці навукі. Праводзілася работа па пашырэнню сеткі навукова-даследчых устаноў, умацаванню матэрыяльна-тэхнічнай базы, падрыхтоўцы навуковых кадраў. Акадэмічныя ўстановы пачалі дзейнічаць у Гомелі, Магілёве, Гродне, Віцебску. Быў адкрыты шэраг новых інстытутаў і лабараторый у галіне фізіка-тэхнічных, хімічных, біялагічных і іншых навук. Далейшае развіццё атрымала галіновая навука. У 1970 г., напрыклад, у рэспубліцы працавала 18 спецыялізаваных навукова-даследчых інстытутаў у галіне сельскай гаспадаркі. Колькасць навуковых і навукова-педагагічных работнікаў павялічылася з 4,4 тыс. у 1956 г. да 42,4 тыс. у 1985 г. Лік дактароў навук павялічыўся са 134 да 1011, кандыдатаў – з 1606 да 13,1 тыс.

Станаўленне Беларусі як буйнога цэнтра машынабудавання, станка- і прыборабудавання выклікалі патрэбу ў паскораным развіцці фізіка-тэхнічных навук. У прыватнасці ў галіне спектраскапіі, люмінесцэнцыі, квантавай электронікі, парашковай металургіі, тэхнічнай кібернетыкі, фізікі ядзерных рэактараў вучоныя рэспублікі займалі значнае месца ў СССР. Беларускія геолагі распрацавалі асноўныя заканамернасці будовы зямной кары. Дзякуючы іх распрацоўкам у БССР былі знойдзены радовішчы калійнай солі, нафты, граніту.

На працягу 1956-1985 гг. вучоныя Беларусі атрымалі 26 Дзяржаўных прэмій СССР і 57 Дзяржаўных прэмій БССР. Званне Героя Сацыялістычнай Працы было прысвоена М. М. Аляксандраву, П.І. Альсміку, Т.В. Бірыч, М.А. Барысевічу, Т.Н. Кулакоўскай, В.Ф. Купрэвічу, М.Д. Мухіну, А.Н. Сеўчанку, Б.І. Сцяпанаву, Ф.І. Фёдараву, Б.Л. Шапашніку, М.П. Яругіну.

Пэўная работа праводзілася па інтэграцыі навукі з вытворчасцю. Пры інстытутах АН БССР, вышэйшых навучальных установах развівалася вопытна-эксперыментальная база, ствараліся навукова-вытворчыя аб'яднанні. Але праблема ўкаранення навуковых распрацовак у вытворчасць вырашалася марудна. На прадпрыемствах адсутнічалі эканамічныя стымулы. Эканамічна больш выгадным для іх з'яўлялася выкананне плана па валавых паказчыках пры нязначных наваўвядзеннях.

У гэты перыяд развівалася гуманітарная навука. Былі выдадзены "Гісторыя Беларускай ССР" у пяці тамах (1972-1975) і дванаццацітомная "Беларуская Савецкая Энцыклапедыя" (1969-1975).

Перамога ў Вялікай Айчыннай вайне аказала ўплыў на самасвядомасць людзей і тым самым умацоўвала ў іх пачуццё ўласнай годнасці. Гэта праявілася ў тэматыцы пасляваеннай літаратуры і ў мастацтве.

У беларускую літаратуру прыйшлі маладыя пісьменнікі. Сярод іх празаікі І. Шамякін, Я. Брыль, І. Мележ, А. Кулакоўскі, А. Васілевіч; паэты К. Кірэенка, А. Вялюгін, У. Корбан; драматургі А. Макаёнак, К. Губарэвіч і інш. Шырокае прызнанне ў рэспубліцы і за яе межамі атрымалі творы беларускай літаратуры і мастацтва. Сведчаннем высокага грамадскага прызнання з'явілася ўзнагароджанне Сталінскай прэміяй Я. Коласа, П. Броўкі, А. Куляшова, І. Шамякіна. Лепшыя творы беларускіх пісьменнікаў былі перакладзены на многія мовы народаў СССР і свету (каля 80 кніг).

Большасць празаічных твораў прысвячалася падзеям Вялікай Айчыннай вайны. У раманах "Глыбокая плынь" І. Шамякіна, "Мінскі напрамак" І. Мележа, "Расстаёмся ненадоўга" А. Кулакоўскага і асабліва ў рамане-эпапеі "Векапомныя дні" М. Лынькова адлюстраваны старонкі гераічнай барацьбы беларускага народа. Я. Колас скончыў працу над трылогіяй "На ростанях", прысвечанай прыходу беларускай інтэлігенцыі ў рэвалюцыю. Тонкі лірык і ўважлівы бытапісальнік, дасціпны гумарыст і мудры філосаф, натхнёны рамантык і бязлітасны сатырык – такім выступае Я. Колас у сваіх лепшых творах.

У беларускай пасляваеннай літаратуры пачаў развівацца мемуарны жанр. Удзельнікамі вайны і партызанскага руху былі напісаны творы "Партызанскі край" В. Лівенцава, "Людзі асобага складу" В. Казлова і інш.

Палітычная "адліга" спрыяла актывізацыі літаратурнага жыцця. Са сталінскіх засценкаў вярнуліся А. Александровіч, Р. Бярозкін, Ю. Гаўрук, С. Грахоўскі, У. Дубоўка, А. Звонак, А. Пальчэўскі, Я. Пушча, Я. Скрыган, М. Хведаровіч, С. Шушкевіч і інш. Яны прынеслі сваё бачанне праблем жыцця грамадства і краіны. З'явілася новае пакаленне літаратараў – А. Адамовіч, В. Быкаў, Р. Барадулін, В. Зуёнак, У. Караткевіч, І. Навуменка, І. Чыгрынаў і інш.

Беларускія пісьменнікі, паэты, драматургі пераасэнсоўвалі вострыя праблемы гісторыі і сучаснасці, больш праўдзіва паказвалі рэчаіснасць. Аб гэтым сведчаць раманы І. Гурскага "Вецер веку", І. Мележа "Людзі на балоце" і "Подых навальніцы", І. Шамякіна "Петраград-Брэст", аповесць С. Грахоўскага "Рудабельская рэспубліка" і інш.

Шырокую вядомасць атрымалі творы В. Быкава "Альпійская балада", "Жураўліны крык", "Трэцяя ракета", "Абеліск", "Воўчая зграя", "Сотнікаў" і інш. Разважанні аб жыцці, псіхалогіі чалавека на вайне гучаць у творах І. Навуменкі "Сасна пры дарозе", "Вецер у соснах", "Сорак трэці", І. Чыгрынава "Плач перапёлкі", "Апраўданне крыві", Я. Брыля "Птушкі і гнёзды". Гераічным летапісам з'яўляюцца мастацка-дакументальныя творы І. Новікава "Руіны страляюць ва ўпор", "Дарогі скрыжаваліся ў Мінску" і інш.

Гістарычная тэма ў беларускай прозе знайшла ўвасабленне ў творах У. Караткевіча "Дзікае паляванне караля Стаха", "Чорны замак Альшаыскі", "Зямля пад белымі крыламі", "Каласы пад сярпом тваім" і інш. Традыцыі, закладзеныя У. Караткевічам, прадоўжылі К. Тарасаў, В. Іпатава, Л. Дайнека і інш.

Шэраг цікавых твораў стварылі паэты, сярод якіх трэба адзначыць зборнікі "Між чырвоных рабін" П. Броўкі; "Новая кніга", "Сасна і бяроза" А. Куляшова; "Мой хлеб надзённы", "Глыток вады", "След бліскавіцы", "Нарачанскія сосны" М. Танка; "Пры святле маланак" П. Панчанкі. Творчай актыўнасцю адзначыўся С. Грахоўскі, які ў лютым 1956 г. прыехаў у Мінск. З'явіліся яго зборнікі вершаў "Дзень нараджэння", "Чаканне", "Табе зайздросціць сонца", "Памяць", "Паэма дарог" і інш. Крытычнае пераасэнсаванне вострых праблем гісторыі і сучаснасці прынесла новае пакаленне паэтаў. Шырокую вядомасць заваявалі зборнікі вершаў Н. Гілевіча "Песня ў дарогу", "Прадвесне ідзе па зямлі", "Неспакой", "Бальшак", "У добрай згодзе". З'явіліся зборнікі вершаў Р. Барадуліна "Рунець, красавацъ, налівацца!", "Нагбом", "Неруш", "Рунь". Плённа працавалі паэты А. Вярцінскі, Г. Бураўкін, А. Грачанінаў, В. Зуёнак, А. Лойка і інш.

Буйным укладам у скарбонку драматургіі з'явіліся п'есы К. Крапівы "Брама бессмяротнасці", А. Макаёнка "Лявоніха на арбіце", "Зацюканы апостал", "Трыбунал", "Таблетку пад язык", "Святая прастата", "Пагарэльцы"; А. Дзяледзіка "Выклік багам", "Начное дзяжурства"; А. Петрашкевіча " Адкуль грэх?", "Трывога", "Укралі кодэкс" і інш. У пачатку 80-х гг. сваімі п'есамі "Выбар", "Вечар", "Радавыя" заявіў аб сабе А. Дудараў.

Сведчаннем высокага грамадскага прызнання з'явілася прысваенне звання Героя Сацыялістычнай Працы П. Броўку, І. Шамякіну, К. Крапіве, М. Танку. Ленінскай прэміі былі ўдастоены народныя паэты і пісьменнікі Беларусі П. Броўка, М. Танк, І. Мележ, В. Быкаў.

Далейшае развіццё атрымала тэатральнае мастацтва. Беларускія тэатры імкнуліся ўвасобіць на сцэне вобраз сучасніка з яго складаным

і багатым духоўным светам. Паступова негатыўныя тэндэнцыі (прыхарошванне рэчаіснасці, схематызм вобразаў, павярхоўнае адлюстраванне жыццёвых канфліктаў) пераадольваліся. Лепшыя спектаклі паказвалі герояў, якія надзелены высокім пачуццём грамадзянскай адказнасці., духоўна багатых і стойкіх у дасягненні сваіх высакародных мэт.

Высокамастацкія вобразы стварылі таленавітыя беларускія акцёры С. Станюта, Л. Александроўская, Ц. Сяргейчык, Г. Глебаў, П. Малчанаў, Б. Платонаў, Л. Рахленка, В. Тарасаў, С. Бірыла, З. Стома, З. Браварская, З. Канапелька, Г. Макарава, У. Уладамірскі, Л. Ржэцкая, Р. Янкоўскі.

Творча працаваў Беларускі тэатр оперы і балета. На сцэне тэатра былі пастаўлены оперы "Яўген Анегін" і "Пікавая дама" П. Чайкоўскага, "Князь Іiар" А. Барадзіна, "Царская нявеста" М. Рымскага-Корсакава, "Іван Сусанін" М. Глінкі, "Кастусь Каліноўскі" Д. Лукаса, "Фауст" Ш. Гуно, "Кармэн" Ж. Бізэ, "Зорка Венера" Ю. Семянякі, "Альпійская балада" Я. Глебава, "Францыск Скарына" Дз. Смольскага. Балетная трупа опернага тэатра паставіла спектаклі "Арлекінада" Р. Дрыгі, "Дон Кіхот" Л. Мінкуса, "Лебядзінае возера" П. Чайкоўскага.

У 60-80-я гг. павялічылася колькасць тэатраў з 11 у 1960 г. да 17 у 1985 г. Значнай падзеяй у культурным жыцці рэспублікі было адкрыццё Дзяржаўнага тэатра музычнай камедыі БССР у 1971 г. і тэатра студыі кінаакцёра ў 1982 г. у Мінску. Дзяржаўны ансамбль танца БССР, вакальна-інструментальныя ансамблі "Песняры", "Верасы", "Сябры", фальклорна-харэаграфічны ансамбль "Харошкі" і інш.

У пасляваенны перыяд новымі музычнымі жанрамі авалодалі беларускія кампазітары. Яны асобую ўвагу ўдзялялі гераічнай тэматыцы. Былі напісаны оперы "Алеся" Я. Цікоцкага, "Надзея Дурава" А. Багатырова, "Машэка" і першая опера для дзяцей "Марынка" Р. Пукста, балет "Князь-возера" В. Залатарова і інш. Актыўна ствараліся масавыя песні (гімны, маршы, вальсы, гарадскія лірычныя песні: "Радзіма мая дарагая" і "Лясная песня" У. Алоўнікава, "Песня пра Нёман" Н. Сакалоўскага, "Ой, шумяць лясы зялёныя" Ю. **Се**мянякі і інш. Песня Н. Сакалоўскага "Мы – беларусы" на тэкст М. Клімковіча ў перапрацаваным выглядзе ў 1955 г. стала Дзяржаўным гімнам БССР. **У** наступныя гады ў беларускай музыцы з'явіліся новыя імёны: У. Алоўнікаў, І. Кузняцоў, С. Картэс, Я. Глебаў, І. Лучанок, Дз. Смольскі, В. Іваноў.

Пасляваеннае жыццё Беларусі адлюстравана ў выяўленчым мастацтве ў палотнах Ф. Дарашэвіча, Р. Кудрэвіч, В. Волкава, А. Малішэўскага, У. Стальмашонка, А. Шаўчэнкі і інш. Павялічылася цікавасць мастакоў да гістарычнага жанру: "Скарына ў рабочым кабінеце" П. Сергіевіч, "Кастусь Каліноўскі" А. Гугеля і Р. Кудрэвіч, "Паўстанне рыбакоў на возеры Нарач" В. Цвіркі.

Тонкім лірызмам, любоўю да беларускай прыроды прасякнуты пейзажы В. Цвіркі ("Каля млына", "Сакавік"), В. Бялыніцкага-Бірулі ("Зялёны май", "Пачатак лета"), З. Азгура ("Лагойскія ўзгоркі"), М. Дучыца, П. Данеліі, І. Карасева і інш. Умацоўваў свае пазіцыі жанр нацюрморта (В. Жолтак, М. Тарасікаў, А. Малішэўскі).

Прыход у мастацтва моладзі, якая ўдзельнічала ў вайне ці бачыла яе сваімі вачамі, прадвызначыў імкненне да перадачы рэчаіснасці ва ўсёй яе шматграннасці – драматызмам і гераізмам. Значным укладам у развіццё беларускага і сусветнага выяўленчага мастацтва з'явіліся работы М. Савіцкага "Партызанская мадонна", цыкл "Лічбы на сэрцы", у якім паказаны жахі фашысцкіх канцлагераў, асабіста перажытых мастаком. Роздуму пра лёс роднай зямлі, працы як асноўнай каштоўнасці зямлі прысвечаны яго палотны "Ураджай", "Хлябы", "У полі", "Сказ пра хлеб". Атрымалі шырокую вядомасць палотны Л. Шчамялёва "Маё нараджэнне", А. Малішэўскага "Дочкі", "Сёстры", Г. Вашчанкі "Маё Палессе" і інш.

Шырокай і разнастайнай тэматыкай вызначалася беларускае скульптурнае мастацтва. У партрэтным жанры – выдзяляюцца творы З. Азгура, А. Глебава, А. Бембеля, С. Селіханава. Ствараюцца помнікі-бюсты Ф. Дзяржынскаму, С. Грыцаўцу, Я. Купалу ў Мінску (З. Азгур), помнік К. Заслонаву ў Оршы (С. Селіханаў). Значным дасягненнем беларускіх скульптараў стаў завершаны ў 1945 г. ансамбль плошчы Перамогі ў Мінску. З. Азгур, А. Бембель, А. Глебаў і С. Селіханаў выканалі гарэльефы для абеліска-помніка воінам Савецкай Арміі і партызанам (архітэктары ансамбля У. Кароль і Г. Заборскі). Традыцыі беларускай скульптуры ўзбагаціліся новымі дасягненнямі ў творчасці маладых майстроў: Г. Мурамцава, В. Палійчука, А. Анікейчыка, Л. Гумілеўскага, І. Місько, Б. Маркава.

Дзеячы навукі, літаратуры і мастацтва ўнеслі значны ўклад у развіццё адукацыі, навукі і культуры, спрыялі падняццю агульнаадукацыйнага і культурнага ўзроўню працоўных.

Дамінуючай тэндэнцыяй у мастацтве становіцца манументалізм. У жанры скульптуры гэта прадвызначыла з'яўленне мемарыяльных комплексаў "Хатынь" (скульптар С. Селіханаў, архітэктары В. Занковіч, Л. Левін, Ю. Градаў), "Брэсцкая крэпасць-герой" (кіраўнік

творчага калектыву А. Кібальнікаў), Курган Славы Савецкай Арміі (скульптары А. Бембель, А. Арцімовіч, архітэктар А. Стаховіч), манумент у гонар маці-патрыёткі М.Ф. Купрыянавай у Жодзіна (М. Ражанкоў, А. Заспіцкі, І. Місько), помнікі народным паэтам Я. Купалу (А. Анікейчык, Л. Гуміleўскі, А. Заспіцкі) і Я. Коласу ў Мінску (З. Азгур), Ф. Скарыне ў Полацку (скульптар А. Глебаў, І. Глебаў, А. Заспіцкі, архітэктар В. Марокін).

Аднаўляліся беларускія вёскі і гарады. Праектныя арганізацыі распрацавалі генеральныя планы Мінска, Брэста, Віцебска і іншых гарадоў. Распрацоўшчыкі праектаў улічвалі гістарычную планіроўку, прадугледжвалі мерапрыемствы па іх рэканструкцыі, удасканальванню планіровачнай структуры, асновы комплекснага вырашэння сацыяльных, эканамічных, архітэктурна-мастацкіх задач. Былі створаны комплексныя групы з архітэктараў, інжынераў, эканамістаў, якія працавалі пры ўдзеле вядучых майстроў з Масквы і Ленінграда (А. Шчусева, А. Мардвінава, М. Колі, У. Сямёнава, І. Лангбарда і інш.). Рэалізацыя генплана Мінска вызначыла стварэнне новага гарадскога цэнтра, новых архітэктурных ансамбляў. У распрацоўцы праспекта (Сталінскі, Ленінскі, зараз – Францыска Скарыны) прынялі ўдзел архітэктары М. Паруснікаў, Н. Асмалоўскі, У. Кароль і інш. Будынкі ўзводзіліся пераважна на індывідуальных праектах, упрыгожваліся дэкорам, скульптурамі, прысутнічалі элементы лжэкласіцызму. У пасляваенныя гады будаўнічая вытворчасць, заснаваная на шырокім выкарыстанні ручной працы, цэглы і тынкоўкі. адносна лёгка мірылася з любымі традыцыйнымі формамі і дэкорам. Аднак з пашырэннем маштабу і тэмпаў будаўніцтва захапленне дэкаратыўнымі сродкамі стала тармазіць развіццё будаўнічай справы.

Вялікая ўвага надавалася развіццю культурна-асветніцкіх устаноў. У 1954 г. у рэспубліцы працавала 7873 бібліятэкі, 5181 клубаў, 2049 кінаўстановак, 28 музеяў. Павялічыўся выпуск газет, часопісаў і кніг. У 1985 г. выдавалася 212 газет, з іх 130 на беларускай мове, з 3431 кніг і брашур тыражом 53,5 млн. экзэмпляраў У гэтыя гады завяршылася радыёфікацыя населеных пунктаў. У пачатку 70-х гг. дзейнічала адзіная сістэма тэлебачання.

Такім чынам, у 50-80-я гг. у развіцці адукацыі, навукі і культуры рэспублікі былі зроблены значныя поспехі.

ЛЕКЦЫЯ 27

## САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ Ў 1950-1980-х гг.

- *Змены ў кіраванні прамысловасцю і транспартам*
- *Рэформы сярэдзіны 1960-х гг.*
- *Здабыткі і праблемы 1970-1980-х гг.*

**Змены ў кіраванні прамысловасцю і транспартам.** Цэнтралізаваная сістэма кіраўніцтва народнай гаспадаркай з'яўлялася даволі эфектыўнай у гады індустрыялізацыі, калектывізацыі, пасляваеннага аднаўлення. Яна забяспечвала высокія тэмпы росту эканомікі ва ўмовах шырокага выкарыстання экстэнсіўных формаў і метадаў развіцця. Аднак гэты механізм не адпавядаў часу НТР. Пошук новых шляхоў стымулявання вытворчасці адбываўся ў межах старой адміністрацыйна-каманднай сістэмы.

У адпаведнасці з законам "Аб далейшым удасканаленні арганізацыі кіравання прамысловасцю і транспартам" (май 1957 г.) у БССР па, сутнасці, была ўведзена тэрытарыяльная сістэма кіравання эканомікай, утвораны адзін эканамічны раён і ліквідавана дзевяць міністэрстваў. Для кіравання саюзна-рэспубліканскай прамысловасцю і будаўніцтвам быў створаны Савет народнай гаспадаркі БССР, падпарадкаваны Савету Міністраў рэспублікі.

Набліжэнне кіравання да вытворчасці мела пэўнае станоўчае значэнне, што выявілася ў павышэнні ролі мясцовых органаў, у разбурэнні ведамасных перашкод у межах беларускага эканамічнага раёна. Саўнаргасы садзейнічалі лепшаму выкарыстанню мясцовых рэсурсаў, узмацненню спецыялізацыі і кааперавання вытворчасцей, арганізацыі вытворчых аб'яднанняў.

Акцэнт быў зроблены на развіцці цяжкай прамысловасці, асабліва машынабудавання і металаапрацоўкі. На Магілёўскім металургічным заводзе ў 1957 г. выпушчаны першы беларускі пракат. Пасля арганізацыі вытворчасці аўтамабільных агрэгатаў і вузлоў на спецыялізаваных заводах у Гродна і Баранавічах з варотаў Мінскага аўтамабільнага завода выйшлі першыя 6-7-тонныя бартавыя машыны, самазвалы і цягачы. Вытворчасць аўтамабіляў грузападымальнасцю 25 тон і больш была сканцэнтравана на Беларускім аўтамабільным заводзе ў Жодзіне.

На Мінскім трактарным заводзе з 1963 г. пачалася вытворчасць новага трактара МТЗ-50. Па эксплуатацыйных якасцях ён перасягаў папярэднія маркі машын і не саступаў лепшым замежным узорам

трактароў свайго класа. Павялічыўся выпуск сельскагаспадарчай тэхнікі. Далейшае развіццё атрымала станкабудаванне.

Увод у эксплуатацыю Бярозаўскай ДРЭС (што давала ў 1965 г. амаль у 5 разоў больш энергіі, чым усе электрастанцыі рэспублікі ў 1940 г.), будаўніцтва новых ліній электраперадачы дазволілі стварыць адзіную Беларускую энергасістэму.

Узніклі і новыя галіны прамысловасці: радыёэлектронная, электратэхнічная, кабельная, нафтаперапрацоўчая, дакладнае прыборабудаванне, вытворчасць сінтэтычных смол. На аснове Старобінскага радовішча калійных соляў, прывазных кольскіх апатытаў і прыроднага газу з Украіны ў Салігорску пачала стварацца буйная база па выгворчасці мінеральных угнаенняў. Беларусь стала адным з галоўных раёнаў СССР па вытворчасці калійных угнаенняў.

Буйным аб'ектам вялікай хіміі стаў Гродзенскі азотнатукавы завод, першая чарга якога ўведзена ў строй у 1963 г. У гэтым самым годзе пачалося будаўніцтва Гомельскага суперфасфатнага завода. На карце рэспублікі з'явіліся новыя гарады – Наваполацк, Салігорск, Светлагорск.

Разам з тым ужо на XXV з'ездзе КПБ (1961) сур'ёзную трывогу выклікаў шэраг негатыўных з'яў у развіцці эканомікі. Адставала газіфікацыя, нездавальняючым было будаўніцтва ў хімічнай прамысловасці. Значная колькасць прадпрыемстваў выпускала прадукцыю састарэлых узораў, якая не карысталася попытам. Знізіліся тэмпы росту валавой прадукцыі прамысловасці.

На пачатку 1960-х гг. пачалі выяўляцца недахопы ў сістэме кіравання прамысловасцю па тэрытарыяльнаму прынцыпу. Шматступеньчатасць і паралелізм выклікалі многія непатрэбныя ўзгадненні. Укараненне новых узораў машын стрымлівалася з-за адсутнасці комплекснага планавання ме-рапрыемстваў па новай тэхніцы.

Недастатковай была ўвага да развіцця лёгкай прамысловасці. Рост галін групы "А" апярэджваў рост вытворчасці прадметаў народнага спажывання (група "Б") нават у большых памерах, чым было прадугледжана сямігадовым планам. Было недавыканана заданне сямігодкі па вытворчасці такіх прамысловых вырабаў, як ільновалакно, фотаапараты, хімічныя валокны і іншыя.

Галоўнай прычынай замаруджвання тэмпаў эканамічнага развіцця на пачатку 60-х гг. з'яўлялася вычарпанне магчымасцей экстэнсіўнага развіцця, неадпаведнасць паміж значным павелічэннем аб'ёму вытворчасці, узрослай складанасцю структуры гаспадаркі,

эканамічных сувязяў і тагачаснымі метадамі планавання і эканамічнага стымулявання вытворчасці.

Гэта можна праілюстраваць і на прыкладзе развіцця сельскай гаспадаркі Беларусі. На пачатку 1960-х гг. назіраецца зніжэнне ўраджайнасці сельскагаспадарчай прадукцыі, павялічваецца яе сабекошт.

Былі вычарпаны магчымасці нарошчвання жывёлагадоўчай прадукцыі шляхам росту пагалоўя. Ужо ў 1960-1961 гг. мяса было выраблена да запланаванага – 80% , малака – 81% . Пачынаючы з 1962 г., у калгасах і саўгасах рэспублікі ўсё менш атрымліваюць малака ад кожнай каровы, што адпаведна выклікала і змяншэнне валавога надою, нягледзячы на значны рост грамадскага стагка.

На становішчы спраў у сельскай гаспадарцы Беларусі ў першай палове 60-х гг. адмоўна адбіўся нізкі ўзровень кіравання, падрыхтоўкі сельскагаспадарчых кадраў, агранамічнай навукі. Да непажаданых вынікаў прывяла і паспешлівасць у рэарганізацыі МТС (пачалася з 1958 г.). Большасць калгасаў, не маючы сродкаў выкупіць адразу ўсю тэхніку, вымушана была залезці ў даўгі да дзяржавы. Адмоўным фактарам з'явілася адсутнасць у калгасаў сваіх механізатарскіх кадраў, бо значная частка былых работнікаў МТС засталася ў рамонтных службах ці знайшла іншую працу ў горадзе.

У пачатку 1960-х гг. разгарнулася кампанія па пераўтварэнню калгасаў у саўгасы. Зацікаўленыя гарантаванай аплатай працы ў саўгасе і пенсіяй калгаснікі не пратэставалі супраць страты "сваёй" калектыўнай уласнасці. А дзяржаве даводзілася шукаць новыя сродкі, якіх не хапала.

Істотную небяспеку для сельскай гаспадаркі ўяўляла кампанія па ліквідацыі асабістых гаспадарак, што разгарнулася пад лозунгам непасрэднага пераходу да камунізму. Вялікую шкоду калгаснай і саўгаснай вытворчасці нанеслі парушэнні ў палітыцы цэн на сельскагаспадарчыя прадукты, неабгрунтаваныя перабудовы органаў кіравання, а таксама шматлікія шаблонныя ўказанні па агратэхніцы і заатэхніі, структуры пасяўных плошчаў і іншых пытаннях, што даваліся зверху калгасам і саўгасам без уліку мясцовых умоў.

Пагоршылася становішча спраў у вытворчасці тавараў масавага попыту і сельскай гаспадарцы, што абвастрыла сацыяльныя канфлікты ў рэспубліцы. Асабліва напружаным быў 1962 г., калі на агульны невысокі ўзровень матэрыяльнага дабрабыту насельніцтва Беларусі накладаліся вынікі грашовай рэформы 1961 г. і павышэнне цэн на мяса-малочную прадукцыю. Апошняе, напрыклад,

падштурхнула да страйку работніц цэха Віцебскай швейнай фабрыкі "Сцяг індустрыялізацыі".

Сітуацыя ў 1962 г. настолькі накалілася, што Прэзідыум Савета народнай гаспадаркі БССР з 31 сакавіка да 14 жніўня гэтага года вымушаны быў 5 разоў звяртацца да сітуацыі на прадпрыемствах. Адзначалася, што ўзрасла колькасць выпадкаў адмаўлення ад работы. І ў вышэйшых эшалонах улады ўсё больш усведамлялася неабходнасць паступовага пераходу да эканамічна абгрунтаваных метадаў кіравання.

**Рэформы сярэдзіны 1960-х гг.** У сакавіку 1965 г. на Пленуме ЦК КПСС было разгледжана пытанне "Аб неадкладных мерах па далейшаму развіццю сельскай гаспадаркі СССР", у верасні – "Аб паляпшэнні кіравання прамысловасцю, удасканаленні планавання і ўзмацненні эканамічнага стымулявання прамысловай вытворчасці". Меры, якія ажыццяўляліся на аснове рашэнняў пленумаў, назвалі эканамічнай рэформай.

Фактычна рэформа складалася з дзвюх частак. Па-першае, у верасні 1965 г. было вырашана вярнуцца да галіновага прынцыпу кіраўніцтва прамысловасцю. На Беларусі ў кастрычніку 1965 г. замест аднаго саўнаргаса былі створаны 6 міністэрстваў саюзна-рэспубліканскіх і 3 рэспубліканскіх (мясцовай прамысловасці, тарфяной, сельскага будаўніцтва). Па-другое, вызначаліся мерапрыемствы па ўдасканаленню планавання і эканамічнага стымулявання прамысловай вытворчасці. Змянялася сістэма тэхніка-эканамічных паказчыкаў, якія даводзіліся прадпрыемствам зверху (замест 109 толькі 9). Вышэйстаячыя органы павінны былі планаваць толькі асноўныя заданні: аб'ём рэалізацыі прадукцыі, асноўную наменклатуру вырабаў, фонд зарплаты, прыбытак, рэнтабельнасць і інш. Прадпрыемствы атрымалі права самастойна вызначаць рост прадукцыйнасці працы, зніжэнне сабекошту прадукцыі, колькасць персаналу. Вытворчасць валавой прадукцыі, як асноўны паказчык, быў заменены на аб'ём яе рэалізацыі. Меркавалася, што гэта выкліча прамую зацікаўленасць у выпуску тавараў, якія б карысталіся попытам у спажыўца. Ва ўмовах гаспадарчай рэформы па-новаму вырашаліся пытанні матэрыяльнага заахвочвання работнікаў. З прыбытку прадпрыемстваў, акрамя фонду развіцця вытворчасці, ствараліся фонды для матэрыяльнага заахвочвання і правядзення сацыяльна-культурных мерапрыемстваў.

Такім чынам, прадугледжвалася адначасовае ўмацаванне цэнтралізаванага кіравання народнай гаспадаркай і пашырэнне гаспадарчай самастойнасці, ініцыятывы калектываў прадпрыем-

стваў. Зразумела, што такое спалучэнне эканамічных і дырэктыўных метадаў было цяжка сумяшчальным.

Новыя метады планавання і эканамічнага стымулявання, што ўкараняліся з 1966 г., з'явіліся адметнай рысай восьмага пяцігадовага нлана (1966-1970). Першым у рэспубліцы пачаў працаваць па-новаму калектыў Гомельскага шклозавода, а ўсяго ў 1966 г. – 40 прадпрыемстваў. Яны ў наступным годзе самі прасілі вышэйшыя органы павялічыць ім планавыя заданні па аб'ёму рэалізацыі больш чым на 60 млн. рублёў і па прыбытку – на 20 млн рублёў. Распаўсюджванне рэформы ўшыр на Беларусі ішло даволі паспяхова, бо першымі на новыя ўмовы гаспадарання сталі пераходзіць лепшыя ў сваіх галінах прадпрыемствы. Натуральна, яны мелі магчымасць захаваць сваіх рабочых. Але калі рэформа распаўсюдзілася на цэлыя галіны, то стала відавочным: міністэрствы па-ранейшаму забіраюць сродкі ў прадпрыемстваў перадавых і перадаюць адстаючым. Галоўным паказчыкам дзейнасці прадпрыемства заставаўся план. Перадавіком лічыўся не той, хто ўзяў больш напружанае заданне, а той, хто перавыканаў план. Усялякае перавыкананне плана між тым выклікала змену прапорцый, устаноўленых народнагаспадарчым планам і садзейнічала арытміі вытворчасці. Зразумела, што ўсё вышэйпералічанае вызывалася да жыцця паступовым узмацненнем адміністрацыйнай сістэмы. Міністэрствы захавалі ў сваіх руках важнейшы сродак уздзеяння на прадпрыемствы – цэнтралізаванае размеркаванне фондаў. Прадпрыемства не магло нават абскардзіць рашэнні вышэйстаячага кіраўніцтва, бо не быў выпрацаваны дакладны механізм юрыдычнай абароны правоў працоўнага калектыву.

Не дала неабходнага эфекту і механічная замена тэрытарыяльнага прынцыпу кіравання галіновым. Ужо ў восьмай пяцігодцы (1966-1970) асобныя міністэрствы парушылі тыя сувязі, якія склаліся ў рэспубліцы.

У другой палове 1960-х гг. асабліва выразна акрэсліліся супярэчнасці, увогуле характэрныя для развіцця беларускай прамысловасці ў пасляваенныя дзесяцігоддзі. З аднаго боку, высокія тэмпы развіцця электраэнергетыкі, нафтаздабываючай, нафтаперапрацоўчай, хімічнай, наліўнай прамысловасці, радыёэлектронікі, прыборабудаўніцтва, высокадакладнага станкабудавання. З другога, нізкі ўзровень механізацыі дапаможных працэсаў. Прыкладна палова ўсіх рабочых прамысловасці БССР была занята на дапаможных працэсах. У прадпрыемстваў не было эканамічнай зацікаўленасці ў зніжэнні ўдзельнай вагі ручной працы, у змяншэнні колькасці працуючых, бо

гэта было звязана з памяншэннем планавых памераў фонду заработнай платы. Апошні паказчык кіраўнікі заводаў і фабрык, наадварот, імкнуліся павялічыць, таму што ў працэнтах да яго вызначаліся фонды матэрыяльнага заахвочвання сацыяльна-культурных і жыллёвых мерапрыемстваў. Як вынік, 50% прыросту прамысловай прадукцыі ў 1966-1970 гг. было атрымана за кошт павелічэння колькасці працуючых. Адпаведна павялічылася міграцыя з вёскі ў горад, што сур'ёзна адбілася на вырашэнні жыллёвай праблемы, якасці бытавога абслугоўвання насельніцтва гарадоў.

У сярэдзіне шасцідзесятых гадоў БССР заставалася аграрна-індустрыяльнай краінай. Доля прамысловасці ў нацыянальным даходзе рэспублікі складала 43,8% (у цэлым па СССР – 50,7%). Большая частка насельніцтва рэспублікі па-ранейшаму жыла ў вёсцы. Таму важнае значэнне надавалася развіццю сельскай гаспадаркі. Прадугледжвалася паляпшэнне матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння і капітальнага будаўніцтва на вёсцы. Былі ажыццёўлены заходы супраць спроб адміністрацыйнымі метадамі скараціць дапаможную гаспадарку калгаснікаў. Вызначаўся шэраг мерапрыемстваў па стымуляванню калгасна-саўгаснай вытворчасці. Была спісана запазычанасць калгасам. Значная частка калгаснікаў поўнасцю вызвалялася ад выплаты падатку. Зацвярджаліся цвёрдыя пяцігадовыя планы закупкі сельскагаспадарчай прадукцыі. Той яе часткай, што заставалася пасля выканання дзяржаўнага плана, распараджаліся калгасы і саўгасы. Уводзіліся новыя закупачныя цэны на сельскагаспадарчую прадукцыю, павялічаныя ў сярэднім больш чым на 50%, а на прадаваемую прадукцыю дадаткова (звыш плана) яшчэ на 50%.

У выніку ў 1965 г. з усіх калгасаў рэспублікі нерэнтабельнымі засталіся толькі 6 гаспадарак, прадукцыйнасць працы ўзрасла на 12%. Рост грашовых даходаў даў магчымасць павялічыць аплату працы. У 1965 г. былі дасягнуты самыя высокія ў параўнанні з папярэднімі гадамі паказчыкі ў(555) сельскай гаспадарцы. Валавы збор збожжа перавысіў максімальныя зборы за лепшыя даваенныя і пасляваенныя гады. Значна ўзрасла ўраджайнасць бульбы. Рост вытворчасці мяса і надояў малака амаль у 2 разы перавысілі павелічэнне пагалоўя буйной рагатай жывёлы.

У 1960-я гады праводзяцца мерапрыемствы па асушэнню зямель і будаўніцтву саўгасаў на Палессі. За кошт меліярацыі фонд ворыўных зямель калгасаў і саўгасаў Беларусі павялічыўся на 900 тыс. гектараў (на 10%). У гэтай справе ўзніклі і непажаданыя з'явы. Недаацэнка зваротнага водарэгулявання прыводзіла да хуткага зносу тарфянікаў.

У 1969 г. была звернута ўвага на будаўніцтва больш дасканалых меліярацыйных сістэм, уводзіліся "гарантыйныя пашпарты" асушаных зямель, ствараліся дзяржаўныя камісіі.

Ва ўмовах адмаўлення прыватнай уласнасці павышэнне эфектыўнасці сельскагаспадарчай вытворчасці бачылася праз паглыбленне яе спецыялізацыі і канцэнтрацыі. З канца 1960 – пачатку 70-х гг. партыйнае кіраўніцтва рэспублікі пачынае праводзіць у жыццё курс на стварэнне буйных адкормачных комплексаў. Да працы ў гэтым напрамку натхняў як вопыт ГДР, так і асобных гаспадарак Беларусі, у якіх сабекошт кілаграма свініны склаў крыху больш рубля.

Капітальныя ўкладанні на будаўніцтва і сродкі механізацыі накіроўваліся перш за ўсё ў тыя галіны жывёлагадоўлі, на якіх спецыялізаваўся калгас або саўгас. Удасканальвалася спецыялізацыя жывёлагадоўлі ў залежнасці ад месцазнаходжання гаспадарак у адносінах да вялікіх гарадоў і прамысловых цэнтраў.

Пэўны плён спецыялізацыі і канцэнтрацыі жывёлагадоўлі выявіўся. Вытворчасць прадуктаў жывёлагадоўлі ў цэлым па рэспубліцы павялічылася, хаця сабекошт яе застаўся амаль без змяненняў.

Восьмая пяцігодка (1966-1970) была найбольш паспяховай за ўсю гісторыю СССР. Правядзенне эканамічнай рэформы дало штуршок развіццю прамысловасці, аднак закранула ў самой эканамічнай сістэме толькі знешнюю структуру. Саў(556)наргасы былі заменены міністэрствамі, адны паказчыкі другімі, скарацілася іх колькасць. Рэформа не закранула пытання аб функцыяніраванні грамадскай уласнасці, паколькі лічылі, што ў выглядзе, які склаўся, яна стварае ўсё неабходнае для паспяховага развіцця народнай гаспадаркі. Не падтрыманая палітычнай рэформай, эканамічныя пераўтварэнні не былі даведзены да заканчэння.

Здабыткі і праблемы 1970-1980-х гг. На пачатку ж 1970-х гг. экстэнсіўныя фактары сябе амаль вычарпалі. Партыйнае кіраўніцтва ўсё часцей гаварыла аб дэфіцыце працоўных рэсурсаў. Абсалютны сярэднегадавы прырост насельніцтва працаздольнага ўзросту ў 1971-1978 гг. быў вышэйшым, чым у 1961-1970 гг. Прыкметна павысіўся ўзровень адукацыі і прафесійнай падрыхтоўкі працоўных. Але ў сярэдзіне 70-х гг. была дасягнута высокая ступень уключэння ў грамадскую вытворчасць працаздольнага насельніцтва (звыш 90%), у выніку чаго рэзка скараціліся дадатковыя крыніцы рабочай сілы. Калі ўлічыць, што больш палавіны ўсіх рабочых прамысловасці была занята ручной працай, то можна адзначыць, што дэфіцыт рабочай сілы ў значнай ступені быў выкліканы штучна. Забеспячэнне тэмпаў росту прадукцыі прамысловасці шляхам пабудовы новых

прадпрыемстваў прыводзіла да распыленасці капітальных укладанняў, у выніку чаго з году ў год павялічваліся аб'ёмы незавершанага будаўніцтва. Улічваючы ўсе вышэйазначаныя недахопы, П.М. Машэраў на XXVII з'ездзе КПБ (1976) падкрэсліў, што "ў прамысловай, калгасна-саўгаснай і будаўнічай вытворчасці мы яшчэ не можам гаварыць аб сапраўдным, паўсюдным пераходзе на рэйкі ўсебаковай інтэнсіфікацыі". Барацьба за інтэнсіфікацыю грамадскай вытворчасці, карэннае паляпшэнне якасных параметраў у эканоміцы вызначыліся як галоўная задача на 1976-1980 гг.

Пачынаецца пошук шляхоў адміністрацыйнага стымулявання развіцця эканомікі, пошук новых эфектыўных паказчыкаў і адзнак іх выканання. Так, 1 студзеня 1975 г. быў уведзены новы парадак ацэнкі работы прадпрыемства, згодна з якім план па рэалізацыі лічыўся выкананым толькі тады, калі былі выкананы дагаворныя абавязкі перад заказчыкамі. Парушальнікі дысцыпліны паставак пазбаўляліся на 15-20 і больш працэнтаў фонду матэрыяльнага заахвочвання.

У другой палове 1970-х гг. былі пабудаваны дзесяткі новых буйных прадпрымстваў. У іх ліку Жлобінская фабрыка штучнага фут-ра, Слонімская камвольна-прадзільная фабрыка, Гродзенскае вытвор-чае прадзільна-нітачнае аб'яднанне. Ішло далейшае ўзмацненне кан-цэнтрацыі вытворчасці. У 1980 г. на Беларусі дзейнічала каля 200 вытворчых і навукова-вытворчых аб'яднанняў, на долю якіх прыхо-дзілася звыш 50% усяго аб'ёму рэаліза-ванай прадукцыі, тады як у 1975 г. іх было напалову менш.

Але разам з тым зніжаюцца асноўныя эканамічныя паказчыкі. У 1982 г. сярэднегадавы прырост нацыянальнага даходу паменшыўся да ўзроўню – 3,4%. Характэрнай рысай гаспадарчага механізму становіцца яго "затратнасць". Пераважна бюджэтнае фінансаванне капіталаўкладанняў і строга фондавае размеркаванне матэрыяльна-тэхнічных сродкаў прыводзіла да таго, што любыя выдаткі не закраналі непасрэдна інтарэсы вытворцаў. Усе страты, звязаныя з прастоем тэхнікі, наяўнасцю залішняга і не ўстаноўленага абсталя-вання, нерацыянальным выкарыстаннем матэрыяльных, энергетыч-ных рэсурсаў, "даўгабудам", цярпела дзяржава.

Узмацненне дысцыпліны на вытворчасці і шэраг іншых мерапрыемстваў дазволілі ў 1983 г. крыху палепшыць становішча ў эканоміцы рэспублікі.

Не ўдалося ў 1981-1985 гг. у поўнай меры ажыццявіць і вызначаную сацыяльную праграму. Нарастанне эканамічных цяжкасцяў не магло не паўплываць на яе вырашэнне. Але ў вачах

насельніцтва суседніх рэспублік Беларусь у сярэдзіне 80-х гг. заставалася ў ліку лепшых у сэнсе забяспечанасці харчовымі і прамысловымі таварамі.

Ужо ў канцы 60 - пачатку 70-х гг. камандна-адміністрацыйныя метады кіраўніцтва зноў пачалі ўзмацняцца і ў сельскай гаспадарцы. На кастрычніцкім (1968 г.)„ ліпеньскім (1970 г.) Пленумах ЦК КПСС была сфармулявана задача ўзмацніць кант(558) роль за фінансава-гаспадарчай дзейнасцю калгасаў. У сакавіку 1971 г. было адноўлена, адмененае ў 1969 г. права райвыканкамаў разглядаць планы калгасаў. Мясцовыя органы ўлады абавязваліся ўстанавіць дакладны кантроль за размеркаваннем прыбытку ў калгасах, за аплатай працы. У ліпені 1970 г. запатрабавалі, каб кожны саўгас і калгас прадаў дзяржаве звыш плана як мінімум 35% зерня за пяцігоддзе і не менш 8-10% жывёлагадоўчай прадукцыі штогод. Зноў гаспадаркам навязвалася структура пасяўных плошчаў, даводзіліся заданні адносна пагалоўя статка і яго прадукцыйнасці.

Хутка ўзрастала колькасць стратных гаспадарак. У пэўнай ступені гэта адбывалася ў выніку імклівага росту цэн на сродкі вытворчасці (з 1965 па 1985 гг. у сярэднім у 3,5 раза). Такі рост цэн далёка не супадаў з ростам прадукцыйнасці сельскагаспадарчай тэхнікі.

Паступова складвалася і неўспрымальнасць самой калгасна-саўгаснай сістэмы да колькі-небудзь радыкальных змен. Пачуццё гаспадара сярод вяскоўцаў было канчатова згублена. Адчужэнне працаўніка ад сродкаў вытворчасці стала рэальнасцю. Паскорыўся працэс міграцыі з вёскі ў горад. З 1970 па 1984 гг. вясковае насельніцтва ў БССР паменшылася амаль у 1,5 раза.

Адмоўна адбілася на забеспячэнні сельскагаспадарчай вытворчасці кваліфікаванымі кадрамі масавых прафесій "старэнне вёскі".

Недастатковая механізацыя вытворчых працэсаў і недахоп людскіх рэсурсаў значна пагаршалі ўмовы працы. Немагчыма было забяспечыць нават вызначаныя згодна закону водпускі. Ненармаваны працоўны дзень, нізкія заробкі садзейнічалі росту так званай "умоўнай міграцыі" – калі пэўная катэгорыя, пераважна мужчынскага насельніцтва, працягвала жыць у вёсцы, а працавала ў раённых цэнтрах, у бліжэйшых гарадах.

Разглядаючы пытанне аб стане сельскагаспадарчай вытворчасці на пачатку 1980-х гг., неабходна адзначыць, што традыцыйна значную таварную частку бульбы, мяса, малака, яек, гародніны складала прадукцыя асабістых гаспадарак (у 1961-1965 гг. – каля 69% усёй прадукцыі жывёлагадоўлі, у 1976-1980 гг. – 30% ).

Пэўныя спосабы паляпшэння спраў у сельскай гаспадарцы мелі месца ў 1982 г. Згодна з рашэннямі майскага Пленума ЦК КПСС быў замацаваны статус падсобных гаспадарак калгаснікаў і мерапрыемствы па іх развіццю. Была ліквідавана запазычанасць калгасаў дзяржаве, павышаны закупачныя цэны. Аднак не адбылося істотных змен і ў сферы матэрыяльнага заахвочвання калгаснікаў, набліжэння сельскага працаўніка да сродкаў вытворчасці. Таму небяспечныя тэндэнцыі, што выявіліся ў канцы 70- пачатку 80-х гг., працягвалі дзейнічаць.

Такім чынам, метады адміністрацыйна-каманднага кіраўніцтва ўжо ў сярэдзіне 60-х гг. былі прызнаны галоўным тормазам эканамічнага развіцця краіны. Аднак вынікі гаспадарчых рэформаў другой паловы 60-х гадоў не змаглі радыкальна змяніць сітуацыю. Было адноўлена кіраўніцтва па галіноваму прынцыпу, якое прывяло да ўтварэння шматлікіх саюзна-рэспубліканскіх і агульнасаюзных міністэрстваў. Праведзена рэ-арганізацыя апарату партыйнага кіраўніцтва. Але важнейшыя бакі эканамічнага жыцця рэгуляваліся не законамі, а вялізнай колькасцю адміністратыўных актаў, часта супярэчлівых, што не спрыяла больш паслядоўнаму і дынамічнаму развіццю краіны.

ТЭМА IX
## БЕЛАРУСЬ НА ШЛЯХУ СІСТЭМНЫХ ПЕРАЎТВАРЭННЯЎ

## ЛЕКЦЫЯ 28

## ДАСЯГНЕННЕ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ

- *Палітыка перабудовы*
- *Абвяшчэнне дзяржаўнага суверэнітэту*

**Палітыка перабудовы.** У сярэдзіне 80-х гадоў Беларусь уступіла ў перыяд радыкальных сацыяльна-палітычных пераўтварэнняў. Крызісныя з'явы ў жыцці савецкага грамадства хутка нарасталі. Перад вышэйшым партыйным і дзяржаўным кіраўніцтвам паўстала задача спыніць распад сістэмы сацыялізму.

У сакавіку 1985 г. пасля смерці К.У. Чарненкі генеральным сакратаром ЦК КПСС быў абраны М. С. Гарбачоў. У сваім выступленні на красавіцкім (1985 г.) Пленуме ЦК КПСС ён аб'явіў аб планах рэформ усебаковага абнаўлення грамадства. У гарбачоўскай адміністрацыі адсутнічала распрацаваная канцэпцыя таго, што трэба было зрабіць. Таму прымаемыя рашэнні не накіроўвалі працэсы, якія адбываліся ў грамадстве, а ў большасці выпадкаў ішлі за імі. Гэта тлумачылася запозненасцю рэформ, глыбінёй крызісу, які ахапіў усю сістэму.

Асноўная ідэя канцэпцыі "паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны" напачатку была разлічана на хуткі ўздым эканомікі за кошт пераразмеркавання фінансавых сродкаў і новай структурнай палітыкі. Гэта быў не нейкі новы метад, з дапамогай якога планавалася вырашыць наспеўшыя праблемы, а своеасаблівае спалучэнне прыёмаў, якія неаднойчы выкарыстоўваліся ў папярэднія часы.

Вынікі 1985 г. паказалі, што адміністрацыйныя меры ў эканоміцы вырашыць справы не могуць. Таму на XXVII з'ездзе КПСС, які адбыўся ў лютым 1986 г., прыйшлі да высновы, што канцэпцыю паскарэння трэба скіраваць і на грамадскія адносіны. З'езд зацвердзіў новую Праграму партыі, у якой замест палажэнняў аб пабудове камунізму, быў абвешчаны курс на ўдасканальванне сацыялізму. Была зацверджана стратэгічная мэта – да 2000 г. падвоіць эканамічны патэнцыял, а таксама кожнай сям'і даць асобную кватэру. Для вырашэння гэтых задач планавалася пераадолець прычыны, якія стрымлівалі дынамічнае развіццё эканомікі, павесці рашучую барацьбу з бюракратызмам і іншымі негатыўнымі з'явамі. У студзені 1987 г. адбыўся Пленум ЦК КПСС, на якім канстатавалася пашырэнне крызісных з'яў у грамадстве і выказана рашучасць каманды М.С.

Гарбачова прадоўжыць пераўтварэнні, якія цяпер атрымалі назву "курс на перабудову". Была выказана думка аб неабходнасці ўдасканальвання сацыялізму з дапамогай шырокіх працоўных мас, інтэнсіфікацыі эканомікі на падставе дасягненняў навукі і тэхнікі. Стрыжнем пераўтварэнняў аб'яўлялася дэмакратызацыя ўсіх сфер жыцця савецкага грамадства, рэфармаванне палітычных інстытутаў і на гэтым падмурку стварэнне новай мадэлі грамадства – сацыялізму з чалавечым тварам. Быў выстаўлены лозунг "Больш дэмакратыі, больш сацыялізму!".

Першапачаткова значную ролю ў дэмакратызацыі грамадскага жыцця адыграла абвешчаная ў сярэдзіне 1987 г. галоснасць. На старонках часопісаў і газет, у тэле- і радыёперадачах разгарнулася палеміка аб умовах грамадскага жыцця, шляхах абнаўлення сацыялізму і паскарэння рэформы. Развіццё публічнасці, якое пачалося зверху, даволі хутка ахапіла шырокія слаі грамадскасці і пераўтварылася ў магутную плынь, спыніць якую каманда М.С. Гарбачова ўжо не здолела. У краіне ўзнікаюць нефармальныя клубы і аб'яднанні, дзе вядуцца дыскусіі па ўсіх пытаннях палітычнага і грамадскага жыцця, была істотна абмежавана роля цэнзуры.

На Беларусі на хвалі публічнасці ўзрасла цікавасць да праблем нацыянальнай культуры і яе вытокаў. Гэта знайшло адлюстраванне ва ўтварэнні шматлікіх нефармальных аб'яднанняў па вывучэнню літаратурнай і гістарычнай спадчыны, клубаў па краязнаўству, сярод якіх вылучаліся "Талака", "Паходня", "Узгор'е", "Рунь" і іншыя. Арганізаваліся беларускія культурныя таварыствы ў Маскве, Літве, Латвіі і Эстоніі.

Вялікую зацікаўленасць выклікалі працэсы дэсталінізацыі грамадства і пазбаўлення яго ад рэцыдываў застойнага часу. У прэсе і артыкулах друкаваліся матэрыялы, у якіх ўтрымліваліся негатыўныя адзнакі не толькі Сталіна і яго эпохі, але і ролі Леніна, Кастрычніцкай рэвалюцыі, партыі бальшавікоў у першыя гады Савецкай улады. Пачаўся новы этап рэабілітацыі. У верасні 1987 г. была створана камісія Палітбюро ЦК КПСС па дадатковаму вывучэнню матэрыялаў, якія былі звязаны з рэпрэсіямі 30-40-х і пачатку 50-х гадоў.

14 чэрвеня 1988 г. рашэннем Савета Міністраў БССР была створана ўрадавая камісія, якая прыйшла да высновы аб знішчэнні ў лясным масіве Курапаты пад Мінскам на працягу 1937-1941 гг. не менш 30 тыс. грамадзян. Былі выяўлены месцы масавых расстрэлаў у Мазыры, Барысаве, Гомелі, Віцебску, Оршы і іншых мясцінах Беларусі.

У канцы 1987 г. рэспубліканская пракуратура пасля ўсебаковай праверкі спыніла крымінальную справу вядомага дзяржаўнага і

грамадскага дзеяча, Старшыні першага часовага рабоча-сялянскага ўрада Беларусі пісьменніка З. Жылуновіча (Цішкі Гартнага) за адсутнасцю ў яго дзеяннях саставу злачынства. Бюро ЦК КПСС прыняло рашэнне аб яго партыйна-палітычнай рэабілітацыі і аднаўленні ў партыі з кастрычніка 1918 г. Усяго ў 1988 г. на Беларусі было рэабілітавана 832 чалавекі, а на пачатку 1993 г. іх колькасць павялічылася да 130 тыс. такіх асоб. Прымаліся меры па забеспячэнню правоў рэабілітаваных і іх родных, кампенсацыі нанесеных матэрыяльных страт.

Пашырэнне дэмакратызацыі ў грамадстве было немагчыма без рэформы палітычнай сістэмы. На XIX канферэнцыі КПСС, якая адбылася ў чэрвені-ліпені 1988 г., падкрэслівалася, што няўдачы ў правядзенні рэформ звязаны з кансерватызмам партапарату, каманднa-адміністрацыйнай сістэмай, бюракратызмам, якія складалі галоўнае звяно "механізма тармажэння". Адсюль была зроблена высnова аб неабходнасці правядзення радыкальных змен палітычнай сістэмы з абавязковай адмовай партыі ад сваёй кіруючай функцыі і перадачай дзяржаўнай улады Саветам.

У снежні 1988 г. у адпаведнасці з рашэннямі XIX партканферэнцыі, 12-я нечарговая сесія Вярхоўнага Савета СССР прыняла Закон "Аб зменах і дапаўненнях Канстытуцыі (Асноўнага закона) СССР", згодна з якім было вырашана склікаць з'езд народных дэпутатаў і стварыць пастаянна працуючы Вярхоўны Савет СССР. Было вырашана абраць з'езд у колькасці 2250 народных дэпутатаў. Пры гэтым дзве трэці павінны былі абірацца насельніцтвам па тэрытарыяльных акругах на альтэрнатыўнай аснове, а трэцяя частка – прадстаўляць розныя грамадскія арганізацыі, у тым ліку і КПСС.

Падрыхтоўка да выбараў народных дэпутатаў СССР, якія былі прызначаны на сакавік 1989 г., у Беларусі, як і ва ўсёй краіне, праходзіла ў абставіыах вялікай актыўнасці насельніцтва, адкрытай і напружанай барацьбы. Гэта былі першыя за многія дзесяцігоддзі свабодныя выбары, калі грамадзяне атрымалі магчымасць вылучаць і выбіраць у вышэйшы орган дзяржаўнай улады сваіх прадстаўнікоў. Усяго ад Беларусі на з'езд было абрана 60 народных дэпутатаў.

25 мая 1989 г. пачаў сваю работу Першы з'езд народных дэпутатаў СССР, які стаў арэнай вострай палітычнай дыскусіі. З'езд абраў М.С. Гарбачова Старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР - пастаянна працуючага парламента, прыняў рашэнне аб неабходнасці распрацоўкі новай канстытуцыі, зацвердзіў вышэйшых дзяржаўных кіраўнікоў, утварыў парламенцкія камісіі. Пад час палітычнай дыскусіі радыкальна настроеныя дэпутаты запатрабавалі даць ацэнку афганскай вайне, вызначыць прычыны і знайсці выйсце

з канфлікту ў Нагорным Карабаху, зрабіць публічнымі дакументы, якія былі з пакта Молатава-Рыбентропа. Яны прапанавалі ўвесці пасаду прэзідэнта краіны пры прамым яго абранні і па найбольш важных жыццёвых пытаннях праводзіць рэферэндумы. З'езд закончыўся ўтварэннем двух накірункаў сярод прыхільнікаў перабудовы: памяркоўнага на чале з М.С. Гарбачовым і радыкальнага – у выглядзе арганізацыйна афармленай у канцы чэрвеня 1989 г. Міжрэгіянальнай дэпутацкай групы, у якую ўвайшлі Ю.Афанасьеў, А.Сабчак, Г. Папоў, Б. Ельцын і іншыя. Духоўным лідэрам групы стаў акадэмік А. Сахараў.

Міжрэгіянальная дэпутацкая група заявіла аб неабходнасці дэмантажу сістэмы і стала ў апазіцыю да ўлады. Пад уплывам так званых "аксамітных рэвалюцый", што пачаліся восенню 1989 г. у краінах Усходняй Еўропы, на II з'ездзе народныя дэпутаты патрабавалі адмены 6-га артыкула Канстытуцыі СССР аб кіруючай ролі КПСС у жыцці грамадства. Менавіта гэтай праблеме было прысвечана апошняе выступленне на з'ездзе акадэміка А. Сахарава, які раптоўна памёр 14 снежня 1989 г. Новы лідэр Міжрэгіянальнай групы Б. Ельцын прапанаваў сваю канцэпцыю рэформ, запатрабаваў ад урада правесці дэідэалагізацыю кіравання, узмацніць барацьбу з бюракратыяй.

М.С. Гарбачоў быў вымушаны манеўраваць і прыслухоўвацца да галасоў сваіх апанентаў. У пачатку 1990 г. ён пагадзіўся з патрабаваннем адмены 6-га артыкула Канстытуцыі і ўвядзеннем пасады прэзідэнта. Гэтаму ў значнай ступені садзейнічаў крызіс, што ахапіў КПСС. Ужо ў студзені 1990 г. у партыі ўзнікае Дэмакратычная платформа, арганізатарамі якой сталі рэктар Маскоўскай вышэйшай партыйнай школы В. Шастакоўскі і выкладчык В. Лысенка. У яе кіраўніцтва спачатку ўвайшлі і некаторыя члены Міжрэгіянальнай дэпутацкай групы – Ю. Афанасьеў, Б. Ельцын, Г. Папоў. Прыхільнікі Дэмакратычнай платформы арыентаваліся на адмену прынцыпу дэмакратычнага цэнтралізму і пераўтварэнне КПСС у партыю парламенцкага тыпу. Паралельна ў партыі ўзнікаюць цэнтрысцкая і артадаксальная плыні, што сведчыла аб паглыбленні крызісу. Пачынаецца масавы выхад з яе радоў. У такой сітуацыі лютаўскі Пленум ЦК КПСС (1990 г.) прыняў рашэнне адмовіцца ад манаполіі партыі на ўладу. У сярэдзіне сакавіка 1990 г. адбыўся III з'езд народных дэпутатаў, які адмяніў 6-ты артыкул Канстытуцыі СССР. Аднак асноўную ўвагу дэлегаты надавалі пытанню аб увядзенні пасады Прэзідэнта СССР. Частка дэпутатаў патрабавала, каб яго абранне адбылося ў выніку ўсенароднага галасавання, другая – з'ездам. Ва ўмовах, калі скараціўся давер да М.С. Гарбачова і партыі ў цэлым, адзіным сродкам, каб яму ўтрымацца пры ўладзе, станавілася

дасягненне прэзідэнцкай пасады. Абранне першага Прэзідэнта СССР адбылося непасрэдна на з'ездзе 15 сакавіка 1990 г. М.С. Гарбачоў атрымаў каля 60% галасоў народных дэпутатаў.

Важную ролю ў палітычнай рэформе адыграла абнаўленне выбарчай сістэмы ў саюзных і аўтаномных рэспубліках, у тым ліку і ў Беларусі. У кастрычніку 1989 г. сесія Вярхоўнага Савета БССР прыняла Закон аб выбарах народных дэпутатаў Беларускай ССР і аб выбарах народных дэпутатаў мясцовых Саветаў. Пашыраліся дэмакратычныя асновы выбараў і працоўныя атрымалі магчымасць абіраць дэпутатаў з некалькіх кандыдатур. Але па прыкладу саюзнага заканадаўства рэспубліканскі закон захаваў права абрання ў Вярхоўны Савет БССР 50 дэпутатаў ад грамадскіх арганізацый: Беларускай рэспубліканскай арганізацыі ветэранаў вайны і працы, таварыстваў інвалідаў.

Выбары па-новаму ў Вярхоўны Савет БССР і мясцовыя Саветы адбыліся 4 сакавіка 1990 г. У большасці выбарчых акруг на 310 месцаў у беларускім парламенце прэтэндавала 1769 кандыдатаў. Але толькі 98 народных дэпутатаў рэспублікі былі абраны пасля першага тура галасавання. Выбарчая кампанія ператварылася ў сапраўдны марафон і нават пасля некалькіх паўторных выбараў у канцы 1991 г. заставаліся вакантнымі 11 месцаў у Вярхоўным Савеце рэспублікі. Такая ж сітуацыя назіралася і ў мясцовых Саветах. Тым не менш, у выніку выбараў значна абнавіліся Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь, склад мясцовых Саветаў, ажывілася іх работа, узмацніліся сувязі з працоўнымі калектывамі.

У маі 1990 г. адбылася першая сесія Вярхоўнага Савета рэспублікі, на якой Старшынёй быў абраны М.І. Дземянцей. Вярхоўны Савет БССР разгарнуў заканадаўчую дзейнасць, скіраваную на рэфармаванне эканомікі, палітычнай сістэмы, усяго ладу жыцця. У прамысловасці важнае значэнне адыграла прыняцце законаў аб уласнасці і пераходзе да рынку, аб арэндзе, Нацыянальным банку. Разнастайнасць формаў уласнасці і заснаваныя на іх аснове формы гаспадарання былі замацаваны ў Кодэксе Беларускай ССР аб зямлі і Законе аб сялянскай (фермерскай) гаспадарцы. Значным крокам у развіцці пенсійнага заканадаўства стаў прыняты Вярхоўным Саветам СССР у 1990 г. Закон аб пенсіях, які прадугледжваў дыферэнцыраваны падыход і паэтапнае павелічэнне пенсій. У яго рамках у 1991 г. быў прыняты беларускі Закон аб сацыяльнай абароне інвалідаў.

Надзённай праблемай для рэспублікі стала ліквідацыя вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Вярхоўны Савет прыняў некалькі новых законаў па сацыяльнай падтрымцы людзей, што пацярпелі ад чарнобыльскай навалы. У гэтай сувязі можна адзначыць законы аб

сацыяльнай абароне грамадзян, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС і статуце забруджаных тэрыторый. У ходзе іх выканання толькі ў 1991 г. было асвоена капіталаўкладанняў на 500 млн. рублёў больш, чым за папярэднія чатыры гады.

У адпаведнасці з рэформай палітычнай сістэмы ў 1990 г. быў прыняты Закон СССР "Аб грамадскіх арганізацыях". Насельніцтва атрымала правы на стварэнне суполак і таварыстваў, а таксама палітычных партый. Але ў рэспубліцы нефармальныя аб'яднанні пачалі ўзнікаць значна раней. У чэрвені 1989 г. на з'ездзе ў Вільнюсе арганізацыйна аформіўся Беларускі народны фронт "Адраджэнне". У праграмнай заяве было падкрэслена, што БНФ выступае за перабудову грамадства на прынцыпах дэмакратыі і сацыяльнай справядлівасці, прававую дзяржаву, рэальны суверэнітэт Беларусі. Народны фронт стварыў у Вярхоўным Савеце парламенцкую апазіцыю. У лістападзе 1990 г. адбыўся ўстаноўчы з'езд Аб'яднанай дэмакратычнай партыі Беларусі (АДПБ). Галоўнай праграмнай мэтай партыя аб'явіла пабудову дэмакратычнага грамадства з прыярытэтам агульначалавечых каштоўнасцей. Па сваёй арыентацыі АДПБ стала арганізацыяй агульнадэмакратычнай на-кіраванасці і выступала за свабоду асобы, прыватную ўласнасць, сямейныя традыцыі.

Для абароны палітычных правоў і эканамічных інтарэсаў сялянства ў лютым 1991 г. была створана Беларуская сялянская партыя (БСП). Галоўнай сваёй задачай партыя прызнала ажыццяўленне зямельнай рэформы і ліквідацыю каманднa-адміністрацыйнай сістэмы ў сельскай гаспадарцы. Рэформа павінна была праходзіць па двух напрамках: стварэнне фермерскіх гаспадарак і пераўтварэнне калгасаў і саўгасаў у асацыяцыі і акцыянерныя таварыствы. Сялянам, лічыла БСП, трэба было вярнуць права ўласнасці на зямлю.

У рэспубліцы пачалі адраджацца і сацыял-дэмакратычныя традыцыі. Група народных дэпутатаў у Вярхоўным Савеце БССР, навукоўцаў і пісьменнікаў арганізавала сваю партыю – Беларускую сацыял-дэмакратычную грамаду (БСДГ), устаноўчы з'езд якой адбыўся ў 1991 г. У праграмнай заяве гаварылася, што задачы партыі заснаваны на агульначалавечых каштоўнасцях і традыцыях беларускай сацыял-дэмакратыі пачатку XX ст. Грамада асноўнай мэтай аб'явіла пабудову свабоднага і дэмакратычнага грамадства, заснаванага на прынцыпах свабоды, роўнасці, прыярытэту права. БСДГ выступіла за пераўтварэнне грамадства з дапамогай рэформ, без прымусу і насілля пры дасягненні сваіх мэт, абапіраючыся на Канстытуцыю і заканадаўства.

Утварэнне палітычных партый і аб'яднанняў сведчыла аб глыбокіх зменах у грамадскім жыцці і развіцці дэмакратыі. Нягледзячы на невялікі колькасны склад, яны садзейнічалі ўзнікненню ў рэспубліцы парламенцкай апазіцыі, пашырэнню правоў грамадзян, плюралізму мыслення, пошуку новых падыходаў да вызначэння складаных праблем грамадскага жыцця. Шматпартыйнасць азначала канец манаполіі камуністаў на ўладу. Пад уздзеяннем гэтых працэсаў пачалі ўзнікаць ідэі аб неабходнасці рэфармавання камуністычнай партыі ў напрамку яе дэмакратызацыі і пераўтварэння ў партыю парламенцкага тыпу. Аднак гэтыя спробы аказаліся безвыніковымі, бо сітуацыя ў краіне працягвала пагаршацца.

На палітыку перабудовы адмоўны ўплыў аказалі міжнацыянальныя канфлікты, што разгарэліся ў СССР. У 1988-1990 гг. абвастрыліся ўзаемаадносіны паміж Арменіяй і Азербайджанам з-за Нагорнага Карабаха, якія хутка выліліся ў працяглую вайну. У чэрвені 1989 г. адбыліся сутыкненні ўзбекаў з туркамі-месхецінцамі ў Фергане, дзе ахвярамі сталі сотні бязвінных людзей. Усю краіну ўразілі крывавыя падзеі ў Ошскай вобласці Кіргізіі ў 1990 г. Абвастрыліся ўзаемаадносіны Грузіі з Абхазіяй і Паўднёвай Асеціяй, прычым канфлікт з апошняй выліўся ў 1991 г. ва ўзброенае сутыкненне. Цяжкая сітуацыя склалася ў Малдавіі і Прыбалтыцы, дзе ўзрасла напружаннасць паміж карэнным і рускамоўным насельніцтвам.

Ва ўмовах жорсткіх сацыяльных узрушэнняў і міжнацыянальных канфліктаў узнікла пытанне аб існаванні Савецкага Саюза. У рэспубліках узмацніліся сепаратысцкія настроі. У лістападзе 1988 г. Эстонія прыняла Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце, якой абвясціла вяршэнства законаў рэспублікі над агульнасаюзнымі, рэспубліканскую ўласнасць на зямлю, нетры, асноўныя сродкі вытворчасці. Вярхоўны Савет СССР прызнаў гэты дакумент несапраўдным, але спыніць "парад суверэнітэтаў" было ўжо немагчыма. Пасля выбараў у рэспубліканскія і мясцовыя Саветы вясной 1990 г., на якіх большасць галасоў атрымалі прыхільнікі самастойнага развіцця рэспублік, дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце прынялі Вярхоўныя Саветы Літвы, Латвіі, Арменіі, Грузіі і Малдовы. 12 чэрвеня 1990 г. адпаведны дакумент з'явіўся ў Расіі, а 27 ліпеня 1990 г. – у Беларусі. Рэгіёны павялі з цэнтрам барацьбу, якая атрымала назву "вайна законаў". У яе падмурку ляжала права самастойна распараджацца сваёй уласнасцю і сродкамі, што адбівалася на стане народнагаспадарчага комплексу. Памкненне рэспублік да самастойнасці прымусіла кіраўніцтва СССР шукаць шляхі рэфармавання саюза і распрацаваць новы саюзны дагавор.

У студзені 1991 г. саюзныя ўлады паспрабавалі сілай спыніць сепаратызм у прыбалтыйскіх рэспубліках, наладзіўшы ў Вільнюсе і Рызе спробы ўзброенага перавароту. Але гэта выклікала негатыўную рэакцыю расійскага кіраўніцтва і прывяло да ўзмацнення канфрантацыі паміж Б.М. Ельцыным і М.С. Гарбачовым. Каб папраівіць сітуацыю і спыніць крызіс федэратыўных адносін, Вярхоўны Савет СССР вырашыў правесці 17 сакавіка 1991 г. Усесаюзны рэферэндум па пытанню аб неабходнасці захавання СССР. У ім прынялі ўдзел каля 80% грамадзян. За захаванне СССР выказаліся 76,4% удзельнікаў рэферэндуму. Цэнтр зрабіў выснову аб неабходнасці распрацоўкі новага саюзнага дагавора.

23 красавіка 1991 г. у рэзідэнцыі М.С. Гарбачова ў Нова-Агарове пад Масквой адбылася сустрэча кіраўнікоў дзевяці рэспублік (Расіі, Украіны, Беларусі, Казахстана, Узбекістана, Туркменіі, Кіргізіі, Таджыкістана, Азербайджана) і прэзідэнта СССР, атрымаўшая назву "9+1". Выйсце з крызісу федэратыўных адносін удзельнікі нарады знайшлі ў падрыхтоўцы тэксту новага саюзнага дагавора.

Пачаліся шматлікія сустрэчы па падрыхтоўцы гэтага дакумента, пад час якіх узнікалі разыходжанні рэспублік з цэнтрам. Масква вымушана была саступіць. На 20 жніўня 1991 г. была прызначана дата падпісання дагавора. Аднак жнівеньскі (1991 г.) путч спыніў гэты працэс, што, як высветлілася пазней, паскорыла распад СССР. Працэсы рэфармавання грамадства праходзілі ўжо ва ўмовах самастойнага і незалежнага развіцця рэспублік былога СССР.

**Абвяшчэнне дзяржаўнага суверэнітэту.** 27 ліпеня 1990 г. Вярхоўны Савет БССР мінімальнай большасцю галасоў абвясціў Дэклакрацыю аб дзяржаўным суверэнітэце БССР у складзе савецкай федэрацыі. Гэтае рашэнне з'явілася вынікам рэакцыі на знешнюю сітуацыю, прынясце 12 чэрвеня 1990 г. першым з'ездам народных дэпутатаў РСФСР Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Расійскай Федэрацыі. Прынятае рашэнне не вынікала з пераканання і волі большасці беларускага народа. Між тым яно адкрыла шлях сапраўднай незалежнасці рэспублікі.

У дваццатым артыкуле Дэкларацыі сцвярджалася, што "любыя гвалтоўныя дзеянні супраць нацыянальнай дзяржаўнасці Беларускай ССР з боку палітычных партый, грамадскіх аб'яднанняў ці асоб праследуюцца па закону". Згодна з другім артыкулам Дэкларацыі выступаць ад імя народа дазвалялася выключна Вярхоўнаму Савету. Урад рэспублікі атрымліваў права стварыць нацыянальную армію, міліцыю і службу бяспекі. Дэпутаты-камуністы прагаласавалі за адзінаццаты артыкул аб неабходнасці новай саюзнай дамовы паміж

рэспублікамі. Дэпутаты ад БНФ, якія выступалі супраць якіх-небудзь саюзаў з Расіяй, не ўдзельнічалі ў гэтай частцы пасяджэння.

Правал жнівеньскага путчу 1991 г. стварыў спрыяльныя ўмовы на шляху да рэалізацыі дзяржаўнага суверэнітэту. Паведамленні з Масквы аб перамозе Ельцына над путчыстамі і прыпыненне дзейнасці КПСС выклікалі паніку сярод беларускай партнаменклатуры.

Скліканая 24 жніўня пятая нечарговая сесія Вярхоўнага Савета БССР адклікала з пасады Старшыні Вярхоўнага Савета М.І. Дземянцея. 25 жніўня быў прыняты Закон "Аб наданні статуса канстытуцыйнага закона Дэкларацыі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі" і пастанова "Аб забеспячэнні палітычнай і эканамічнай самастойнасці Беларускай ССР". Гэтымі актамі аб'яўлялася палітычная і эканамічная незалежнасць рэспублікі. Ва ўласнасць Беларускай ССР пераходзілі прадпрыемствы, арганізацыі і ўстановы саюзнага падпарадкавання, размешчаныя на яе тэрыторыі. Выключэнне складалі тыя прадпрыемствы і арганізацыі, кіраўніцтва якімі засталося, згодна з заканадаўствам Беларускай ССР, за адпаведнымі органамі Саюза ССР.

Была зменена назва рэспублікі, а таксама адбылася замена дзяржаўнай сімволікі. 19 верасня прынялі рашэнне Беларускую Савецкую Сацыялістычную Рэспубліку надалей называць "Рэспубліка Беларусь", а ў скарочаных назвах "Беларусь". У той самы дзень былі прыняты законы "Аб дзяржаўным сцягу Рэспублікі Беларусь" і "Аб дзяржаўным гербе Рэспублікі Беларусь". Дзяржаўны сцяг з гэтага часу ўяўляў сабой прамавугольнае палотнішча бела-чырвонага колеру. Дзяржаўным гербам стаў старажытны герб "Пагоня" – выява конніка з занесеным над галавой мячом. Старшынёй Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь быў абраны С.С. Шушкевіч.

8 снежня 1991 г. у рэзідэнцыі беларускага ўрада Віскулі С. Шушкевіч разам з прэзідэнтамі Расіі Б. Ельцыным і Украіны Л. Краўчуком падпісалі пагадненне аб фармальнай ліквідацыі СССР і стварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД). Была пастаўлена апошняя кропка ў амаль 70-гадовай біяграфіі Савецкага Саюза.

Да сферы сумеснай дзейнасці дзяржаў у Садружнасці была аднесена каардынацыя знешняй палітыкі, супрацоўніцтва ў межах агульнай палітычнай прасторы, еўрапейскага і азіяцкага рынкаў, мытнай палітыкі, у развіцці транспарту і сувязі, у галіне абароны навакольнага асяроддзя, удзел у стварэнні ўсеабдымнай міжнароднай сістэмы эканамічнай бяспекі; пытанні міграцыйнай палітыкі, барацьба з арганізаванай злачыннасцю.

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь 10 снежня 1991 г. Ратыфікаваў пагадненне аб утварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Адначасова была прынята пастанова аб дэнансацыі дагавора 1922 г. аб утварэнні СССР. На сустрэчы ў Алма-Аце, якая адбылася 21 снежня, да гэтага пагаднення далучыліся яшчэ 8 дзяржаў – былых рэспублік СССР, за выключэннем Прыбалтыйскіх рэспублік і Грузіі. 11 дэлегацый суверэнных краін прынялі рашэнне аб стварэнні вышэйшага органа Садружнасці – Савета кіраўнікоў дзяржаў, а таксама Савета кіраўнікоў урадаў, падпісалі Дэкларацыю, у якой пацвердзілі іх аднолькавыя правы ў Садружнасці, прыхільнасць да супрацоўніцтва ў развіцці агульнай эканамічнай прасторы, агульнаеўрапейскага і еўраазіяцкага рынкаў, гарантыі выканання міжнародных абавязкаў былога Саюза ССР.

Нягледзячы на прынятыя дакументы і ўтварэнне дадатковых каардынацыйных органаў, у дзейнасці дзяржаў Садружнасці выявіліся рознагалоссі. Асабліва абвострана яны праявіліся паміж Расіяй і Украінай па пытанню раздзелу арміі і Чарнаморскага флоту. Многія рэспублікі выказвалі незадавальненне тым, што Расіі ў якасці правапераемніцы СССР адышла дыпламатычная сетка былога Саюза, большая частка маёмасці саюзных і партыйных структур, матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці, што ствараліся фактычна сіламі ўсіх рэспублік.

Станаўленне суверэннай дзяржавы патрабавала фарміравання органаў кіравання, стварэння ўласнага войска. Паводле закона ад 25 жніўня 1991 г. "Аб некаторых змяненнях у сістэме органаў дзяржаўнага кіравання Беларускай ССР" саюзна-рэспубліканскае Міністэрства ўнутраных спраў БССР было пераўтворана ў рэспубліканскае Міністэрства ўнутраных спраў. Яму былі падпарадкаваны ўнутраныя войскі і навучальныя ўстановы Міністэрства ўнутраных спраў СССР, размешчаныя на тэрыторыі рэспублікі. Саюзна-рэспубліканскі Камітэт дзяржаўнай бяспекі БССР быў пераўтвораны ў рэспубліканскі Камітэт дзяржаўнай бяспекі. Ён перадпарадкоўваўся Вярхоўнаму Савету Рэспублікі Беларусь. Былі перагледжаны функцыянальныя напрамкі дзейнасці камітэта, скасавана служба палітычнага вышуку, створана новае для гэтых сілавых ведамстваў падраздзяленне грамадскіх сувязяў. У забеспячэнні кадрамі стаўка была зроблена на прафесіяналаў.

Савету Міністраў Беларусі падпарадкоўваліся пагранічныя войскі Камітэта дзяржаўнай бяспекі. У пачатку 1992 г. пачало дзейнічаць Галоўнае ўпраўленне пагранічных войскаў пры Савеце Міністраў. За кароткі тэрмін Упраўленне пагранвойскаў правяло

работу па ўмацаванню пагранзастаў. На службу ў рэспубліку вернута 1400 беларусаў-пагранічнікаў. Была таксама праведзена работа беларуска-літоўскай і беларуска-латвійскай змешанымі Камісіямі па ўстанаўленню мяжы Рэспублікі Беларусь з Літвой і Латвіяй, створаны новыя пагранатрады.

У мэтах забеспячэння палітычнай і эканамічнай самастойнасці рэспублікі ў верасні 1991 г. Вярхоўны Савет прыняў пастанову "Аб мытнай службе Рэспублікі Беларусь". Беларускае ўпраўленне дзяржаўнага мытнага кантролю СССР было пераўтворана ў Дзяржаўны мытны камітэт Рэспублікі Беларусь. У яго падпарадкаванне перайшлі мытныя органы, якія размяшчаліся на тэрыторыі рэспублікі.

Важным крокам на шляху ўмацавання суверэннасці Беларусі з'явілася стварэнне ўласнага войска на аснове прыняцця Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь у верасні 1991 г. адпаведнай пастановы. У сакавіку 1992 г. пачало дзейнічаць Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь. Пастанова Савета Міністраў ад 6 мая 1992 г. паклала пачатак непасрэднаму стварэнню ўласных узброеных сіл. Беларуская ваенная акруга была скасавана. Усе яе часці і падраздзяленні, а таксама часці цэнтральнага падпарадкавання, якія не ўваходзілі ў склад стратэгічных сіл СНД, перайшлі ў падпарадкаванне Міністэрства абароны рэспублікі. Распрацаваная ў лістападзе 1992 г. ваенная дактрына зыходзіла з неабходнасці быць бяз'ядзернай, нейтральнай дзяржавай. У той час большасць каманднага саставу беларускай арміі, якая налічвала 130 тыс. ваеннаслужачых, складалі расіяне. 13 тыс. беларускіх афіцэраў, што праходзілі службу на тэрыторыі Расіі і іншых былых савецкіх рэспублік, заявілі аб сваім жаданні служыць у беларускім нацыянальным войску. Прынятая праграма рэарганізацыі ўзброеных сіл прадугледжвала скарачэнне колькасці салдат да 60 тыс.

Былі прыняты меры па ўзмацненню кантралюючых функцый дзяржавы. У адпаведнасці з прынятым у сакавіку 1992 г. Вярхоўным Саветам Законам "Аб Кантрольнай палаце Рэспублікі Беларусь" галоўнымі функцыямі створанай палаты з'яўляліся кантроль за выкананнем законаў Рэспублікі Беларусь, пастаноў Вярхоўнага Савета і адпаведных ім іншых актаў, якія рэгулююць узаемаадносіны дзяржаўных, прыватных і гаспадарчых органаў.

Ва ўмацаванні дзяржаўнага ладу Рэспублікі Беларусь важнае значэнне мела выпрацоўка і прыняцце Канстытуцыі. Падрыхтоўка законапраекта аб дзяржаўным ладзе Беларусі было даручана Канстытуцыйнай камісіі, старшынёй якой з кастрычніка 1992 г. быў абраны С. Шушкевіч. У Вярхоўным Савеце разгарэўся канфлікт паміж апазіцыяй, узначальваемай дэпутатамі БНФ, і большасцю

дэпутатаў, якія падтрымлівалі Прэм'ер-міністра В. Кебіча па пытанню прэзідэнтства. Апазіцыя намагалася мінімізаваць значэнне кіраўніка дзяржавы. На іх думку палітычная традыцыя Беларусі патрабавала парламенцкага кіравання. Апазіцыя прапанавала, каб прэзідэнт выбіраўся Вярхоўным Саветам. Праўрадавая большасць імкнулася да варыянта Канстытуцыі, у якой будучы прэзідэнт надзяляўся правамі поўнага кантролю за выканаўчай уладай.

На працягу 1992-1994 гг. Вярхоўны Савет стаў арэнай жорсткай фракцыйнай палітычнай барацьбы па абвостраных праблемах эканамічнага жыцця, вызначэння палітычнага статуса дзяржавы, будучага дагавора з Расіяй. Прэзідэнцкія выбары, прызначаныя на чэрвень 1994 г., прымушалі розныя палітычныя лагеры да ўзмоцненай палітычнай актыўнасці. У гэтай сітуацыі ўзрастаў палітычны рэйтынг А. Лукашэнкі, тагачаснага старшыні парламенцкай камісіі па барацьбе з карупцыяй. Ён абвінаваціў С. Шушкевіча і некалькіх звязаных з ім чыноўнікаў у раскрадanні дзяржаўнан маёмасці. 26 студзеня 1994 г. дэпутаты Вярхоўнага Савета (209 галасоў за і 39 супраць) адклікалі С. Шушкевіча з займаемай пасады. Старшынёй Вярхоўнага Савета некалькі дзён пазней стаў М.І. Грыб, які фарсіраваў працэс прыняцця канстытуцыі.

15 сакавіка 1994 г. Вярхоўны Савет рэспублікі прыняў новую Канстытуцыю – Асноўны закон Рэспублікі Беларусь. Паводле Канстытуцыі Беларусь з'яўляецца унітарнай дэмакратычнай сацыяльнай дзяржавай, якая валодае вяршэнствам і паўнатой улады на сваёй тэрыторыі. У рэспубліцы ўводзілася прэзідэнцкая форма кіравання. На чарзе стаяла пытанне –абранне прэзідэнта.

Кандыдатамі на пасаду прэзідэнта былі вылучаны 6 чалавек: А. Дубко, В. Кебіч, А. Лукашэнка, В. Новікаў, З. Пазняк, С. Шушкевіч.

Пераможцам першага тура выбараў 19 чэрвеня стаў А. Лукашэнка, які набраў 45% галасоў. В. Кебіча, хаця ён і выйшаў у другі тур, падтрымала толькі 17,4% выбаршчыкаў. Кандыдаты апазіцыі З. Пазняк і С. Шушкевіч атрымалі 13% і адпаведна 10% галасоў. В. Новікаў атрымаў 5% галасоў. У наступным туры выбараў 10 ліпеня амаль 80% выбаршчыкаў першым прэзідэнтам Беларусі абралі А. Лукашэнку. Насельніцтва Беларусі выказалася за грамадскую справядлівасць, радыкальныя змены, якія ў ходзе выбарчай кампаніі абяцаў будучы прэзідэнт.

З мэтай забеспячэння эфектыўнасці дзяржаўнай палітыкі было праведзена рэфармаванне сістэмы выканаўчай улады. У пачатку 1995 г. стварылася падпарадкаваная прэзідэнту скразная вертыкальная структура, якая ўключала выканаўчыя і распарадчыя

органы як у цэнтры, так і на месцах, т. зв. "вертыкаль" – строга цэнтралізаваная сістэма дзяржаўнага кіравання.

Аднак пераможаная на прэзідэнцкіх выбарах апазіцыя не адмовілася ад барацьбы за дзяржаўную ўладу. Рэванш яна меркавала ўзяць на парламенцкіх выбарах у маі 1995 года. У гэтых мэтах у лістападзе 1994 г. быў арганізаваны выбарчы блок апазіцыйных партый, у які, акрамя БНФ, увайшлі БСДГ, АДПБ, НДПБ і БСП.

Разам з выбарамі ў Вярхоўны Савет, прызначанымі на 14 мая 1995 г., у мэтах вырашэння некаторых спрэчных пытанняў, што ставіла палітычная апазіцыя і якія мелі прынцыповае значэнне для ўзаемнай дамоўленасці ў грамадстве, у адпаведнасці з перадвыбарнай платформай прэзідэнта быў праведзены рэспубліканскі рэферэндум. 14 мая абраных было толькі 18 дэпутатаў, хаця ў галасаванні ўдзельнічалі 64,7% выбаршчыкаў. Дэпутацкі мандат прысвойваўся толькі тым кандыдатам, якія ў аднамандатных акругах набралі звыш 50% галасоў пры больш чым 50-працэнтнай прысутнасці выбаршчыкаў. Паколькі за кожны мандат змагалася некалькі, а ў некаторых акругах нават больш дзесяці кандыдатаў, вылучэнне пераможца аказалася складанай справай.

Затое рэферэндум, на які было вынесена 4 пытанні, завяршыўся вялікай перамогай Прэзідэнта. За адабрэнне пытання аб наданні рускай мове роўнага статусу з беларускай прагаласавалі 83,3% прыняўшых удзел у галасаванні, за прапанову аб устанаўленні новых Дзяржаўнага сцяга і Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь – 75,1%. Дзеянні Прэзідэнта, накіраваныя на эканамічную інтэграцыю з Расійскай Федэрацыяй, адобрылі 83,3%. Згоду з неабходнасцю ўнясення змяненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, якія прадугледжвалі магчымасць датэрміновага спынення паўнамоцтваў Вярхоўнага Савета Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь у выпадках сістэматычнага або грубага парушэння Канстытуцыі, прагаласавала 77,7% грамадзян, прыняўшых удзел у галасаванні. Прэзідэнт атрымаў падтрымку большасці беларускага насельніцтва на далейшае правядзенне пачатай унутранай і знешняй палітыкі.

28 мая адбыўся другі тур выбараў у Вярхоўны Савет. Пасля двух тураў галасавання было абрана 119 дэпутатаў, галоўным чынам, у сельскіх акругах. У адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь парламент, які налічваў 260 дэпутатаў, мог пачаць работу пры ўкамплектаванні 2/3 дэпутацкіх месцаў.

У чэрвені 1995 г. Прэзідэнт падпісаў указ аб новай дзяржаўнай сімволіцы. Існуючы Вярхоўны Савет быў прызнаны нелігітымным. Ён не меў права прымаць новыя законы. Паўнамоцтвы парламента

папярэдняга склікання скончыліся з моманту абвяшчэння новых выбараў.

На двух турах дапаўняльных выбараў, якія адбыліся 29 лістапада і 10 снежня 1995 г., было абрана 79 дэпутатаў, у большасці беспартыйных. У новым парламенце дэпутаты, якія называлі сябе незалежнымі, мелі 96 мандатаў. На першай сесіі 60 незалежных дэпутатаў стварылі фракцыю "згода" для падтрымкі Прэзідэнта. Выбраны Старшынёй Вярхоўнага Савета С. Шарэцкі, як і пераважная большасць парламента, пагаджаліся з асноўным напрамкам палітыкі Прэзідэнта, накіраваным на аднаўленне сувязяў з рэспублікамі былога Савецкага Саюза. Аднак канфлікт паміж парламентам і Прэзідэнтам нарастаў з кожным месяцам. Сярод часткі дэпутатаў думка аб адкліканні Прэзідэнта, хаця і выразна не фармулявалася, знаходзіла ўсё больш прыхільнікаў.

Да бунту супраць Прэзідэнта заахвочвалі дэпутатаў дэманстрацыі, што мелі месца вясной 1996 г., арганізаваныя апазіцыяй.

Прэзідэнт А. Лукашэнка і Урад Рэспублікі Беларусь вызначылі палітычны курс, накіраваны на стварэнне сацыяльна арыентаванай эканомікі, забеспячэнне палітычнай стабільнасці і згоды ў грамадстве, паглыбленне інтэграцыі з Расіяй і іншымі дзяржавамі СНД, шматвектарнасць знешняй палітыкі рэспублікі, павышэнне дабрабыту народа, развіццё навукі, адукацыі і культуры. У чэрвені 1996 г. Прэзідэнт унёс у Вярхоўны Савет прапанову аб рэферэндуме наконт змен у Канстытуцыі – перанясенні нацыянальнага свята з 27 ліпеня (Дзень абвяшчэння суверэнітэту ў 1990 г.) на 3 ліпеня (Дзень вызвалення Мінска Чырвонай Арміяй у 1944г.), свабоднага абароту зямлі, адмены смяротнага пакарання, аб рэарганізацыі парламента, тэрміне паўнамоцтваў Кіраўніка дзяржавы.

Ва ўмовах абвостранай канфрактацыі ў грамадстве, спроб апазіцыі сарваць рэферэндум, а таксама няўдалай спробы правесці Вярхоўным Саветам 20 лістапада працэдуру імпічменту прэзідэнту адбыўся 24 лістапада 1996 г. другі рэспубліканскі рэферэндум. З 7,4 млн. чалавек, якія мелі права ўдзельнічаць у рэферэндуме, галасавалі каля 6,2 млн. чалавек, ці 84,4%. За прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. са змя-неннямі і дапаўненнямі (новая рэдакцыя Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь), прагаласавалі каля 5,2 млн. чалавек, ці 70,45% грамадзян, унесенных у спісы для галасавання. Паказальна, што за прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. са змяненнямі і дапаўненнямі, прапанаванымі дэпутацкімі фракцыямі камуністаў і аграрыяў, прагаласавалі толькі 582 тыс. чалавек, ці 7,93%. Яшчэ большая колькасць удзельнікаў галасавання –

88,18% (5,5 млн. чалавек) выказаліся за пераняссенне Дня незалежнасці Рэспублікі Беларусь з 27 ліпеня на 3 ліпеня. Грамадзяне Беларусі таксама выказаліся супраць свабоднага, без абмежаванняў куплі і продажу зямлі (5,2 млн. чалавек, ці 82,88%) і адмены смяротнай кары ў Рэспубліцы Беларусь (каля 5 млн. чалавек, ці 80,44%). Як бачна, палітычная апазіцыя пацярпела сакрушальнае паражэнне.

У адпаведнасці з новай рэдакцыяй Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь замест аднапалатнага Вярхоўнага Савета з 260 дэпутатамі быў сфарміраваны двухпалатны парламент – Нацыянальны сход, які з гэтага часу складаецца з Палаты прадстаўнікоў (110 дэпутатаў: выбіраюцца насельніцтвам) і Савета Рэспублікі (па 8 чалавек выбіраюцца ад кожнай вобласці і г. Мінска і 8 чалавек прызначаюцца прэзідэнтам). Канстытуцыйны суд адмяніў свае ранейшыя пастановы, прызнаў, што рэферэндум быў праведзены ў адпаведнасці з Канстытуцыяй.

Паводле новай рэдакцыі Канстытуцыі Прэзідэнт з'яўляецца кіраўніком дзяржавы, гарантам Канстытуцыі, правоў і свабод чалавека і грамадзяніна. Кіраўніком выканаўчай улады з'яўляецца Прэм'ер-міністр Урада, пашыраны правы і паўнамоцтвы Савета Міністраў, зменены парадак прызначэння асоб на некаторыя дзяржаўныя пасады і вызваленне гэтых асоб ад пасад у адпаведнасці з Канстытуцыяй і заканадаўствам.

Дзяржавы Заходняй Еўропы не прызналі ні вынікаў рэферэндуму, ні створанага Нацыянальнага сходу. Доўгі час адзіным легальным прадстаўніцтвам Беларусі яны лічылі Вярхоўны Савет, колькасць дэпутатаў апошняга пастаянна скарачалася (першапачаткова 85 чалавек).

У Беларусі апазіцыя не мела рэальнага ўплыву на сітуацыю ў рэспубліцы. Сведчаннем падтрымкі ўрадавага курса з'явіліся новыя выбары Прэзідэнта, якія адбыліся 9 верасня 2001 г. Яны зноў прынеслі ўнушальную перамогу А. Лукашэнку. Ён атрымаў 75,65% галасоў выбаршчыкаў, у той час, калі галоўны сапернік У. Ганчарык атрымаў 15,65%, С. Гайдукевіч – 2,48% галасоў удзельнікаў выбараў. Свае галасы ў падтрымку кандыдатаў у прэзідэнты аддалі 83,86% выбаршчыкаў, 2,2% былі прызнаны несапраўднымі. Палітычная апазіцыя ў чарговы час пацярпела паражэнне.

## ЛЕКЦЫЯ 29

## ЭКАНОМІКА, ПАЛІТЫКА, КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ:ТЭНДЭНЦЫІ РАЗВІЦЦЯ

- *Сацыяльна-эканамічнае развіццё*
- *Знешняя палітыка*
- *Паскарэнне гуманітарнага развіцця*

**Сацыяльна-эканамічнае развіццё. У** кастрычніку 1990 г. Вярхоўны Савет рэспублікі адобрыў распрацаваны Саветам Міністраў Беларускай ССР курс развіцця, у аснову якога была пакладзена радыкальная праграма пераходу да рынaчных рэформ эканамістаў С. Шаталіна і Р. Яўлінскага, вядомая пад назвай "500 дзён". Яна прадугледжвала шэраг надзвычайных стабілізацыйных мер, стварэнне асноўных рынaчных інстытутаў, прыватызацыю, дэманапалізацыю, змену сістэмы дзяржаўнага рэгулявання эканомікі. Паэтапная лібералізацыя цэн павінна была сумяшчацца з выкарыстаннем "сацыяльных амартызатараў", якія дазволілі б не дапусціць рэзкага падзення жыццёвага ўзроўню асноўнай масы насельніцтва.

Аднак ужо ў першыя гады рэфармавання эканомікі былі дапушчаны памылкі. Нацыянальны банк быў выведзены з падначалення ўрада. Пры стварэнні ўстаўных фондаў камерцыйных банкаў, былі выкарыстаны дзяржаўныя сродкі, пасля чаго банкі сталі прыватызаванымі. Урад В. Кебіча пазбавіўся магутнага ўздзеяння на вытворчасць, дзе яшчэ заставалася ў той час больш чым 90 працэнтаў дзяржаўнай уласнасці.

Разбурэнне эканамічных сувязяў пасля распаду СССР паскорыла негатыўныя працэсы ў эканоміцы рэспублікі. У 1991 г. у Беларусі адбылося падзенне вытворчасці прамысловай і сельскагаспадарчай прадукцыі. У наступныя гады для народнай гаспадаркі рэспублікі стала характэрным рэзкае абвастрэнне эканамічнага крызісу. Ён праявіўся ў значным зніжэнні ўсіх асноўных макраэканамічных паказчыкаў, падзенні грамадскай вытворчасці, павелічэнні дэфіцыту дзяржаўных фінансаў, росце інфляцыі, падзенні каштоўнасці беларускага рубля.

Скарачэнне маштабаў вытворчасці ў першай палове 90-х гг. было значным. З улікам нерэалізаваных таварных запасаў неаплачанай прадукцыі скарачэнне вытворчасці прамысловасці склала палову ўзроўню 1990 г.

| Макраэканамічны паказчык | 1990 г. | 1991 г. | 1992 г. | 1993 г. | 1994 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| Валавы ўнутраны прадукт | 100 | 98 | 89,3 | 80,8 | 69 |
| Нацыянальны даход | 100 | 97 | 87,6 | 78,5 | 68 |
| Прадукцыя прамысловасці | 100 | 99 | 89,7 | 80,7 | 68,5 |
| Прадукцыя сельскай гаспадаркі | 100 | 95 | 87 | 90 | 86 |

Асноўнымі прычынамі падзення аб'ёмаў вытворчасці ў прамысловасці стала перш за ўсё абвастрэнне праблемы збыту прадукцыі, рэзкае падаражанне матэрыяльных рэсурсаў, неплацяжы. Усё гэта абумовіла цяжкае фінансавае становішча большасці прамысловых прадпрыемстваў рэспублікі.

У сваю чаргу абвастрэнне праблемы збыту прадукцыі айчынных прамысловых прадпрыемстваў звязана таксама з нізкім узроўнем канкурэнтаздольнасці прадукцыі, што стала вынікам скарачэння інвестыцый у навуку і новыя тэхналогіі, стратай традыцыйных рынкаў збыту ў Расіі, краінах Азіі, Афрыцы і на Бліжнім Усходзе.

Правядзенне рэформ у 1991-1994 гг. дазволіла стварыць у Беларусі неабходны мінімум асноўных рыначных інстытутаў, нарматыўна-прававых дакументаў, пераўтварыць сістэму дзяржаўнага кіраўніцтва эканомікай у новую сістэму, якая ў пэўнай ступені абапіралася на рыначныя рэгулятары. Былі зроблены практычныя крокі па лібералізацыі гаспадарчых сувязяў, рэфармаванні адносін уласнасці. Паступова мяняліся сацыяльна-псіхалагічныя ўстаноўкі суб'ектаў гаспадарання, іх эканамічныя адносіны. Дэфіцыт тавараў на ўнутраным рынку ўступіў месца дэфіцыту грошай у насельніцтва. Свабоднымі сталі эканамічныя сувязі з замежнымі краінамі.

Разам з тым рыначныя пераўтварэнні ў Беларусі праводзіліся супярэчліва. Гэта было звязана з складанасцю пераходу ад планавай сацыялістычнай эканомікі да эканомікі рыначнага тыпу, жаданнем уладаў стварыць новы эканамічны базіс за кароткі тэрмін. Яскравымі прыкметамі эканамічнага жыцця таго часу стала раскручванне інфляцыйнай спіралі і катастрафічнае падзенне курсу беларускіх грошай, крытычнае становішча з забеспячэннем гаспадаркі энергарэсурсамі, галапіруючы рост цэн.

У надзвычайным становішчы апынулася сельская гаспадарка Беларусі. Нягледзячы на тое, што ў 1990-1994 гг. на патрэбы АПК выдзялалася 25-30% бюджэтных сродкаў і амаль столькі ж ён атрымліваў дадаткова ў выглядзе розных ільгот і датацый, аб'ёмы вытворчасці сельскай гаспадаркі скараціліся на 14%.

Вёска была пазбаўлена магчымасці абнаўлення сельскагаспадарчай тэхнікі. У 1994 г. больш чым у 3 разы зменшылася набыццё ўгнаенняў, у 2 разы было менш нарыхтавана арганічных удабрэнняў, да мінімуму скараціліся пастаўкі хімічных сродкаў абароны раслін.

Працэс станаўлення рыначных адносін у аграрным сектары эканомікі праходзіў у адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб зямлі, Законам "Аб праве ўласнасці на зямлю" і іншымі заканадаўчымі актамі. У сярэдзіне 1993 г. налічвалася 2700 калгасаў і саўгасаў, 2658 фермерскіх гаспадарак і 1 926 400 сельскіх падвор'яў. Плошча выдзеленых зямель для фермерскіх гаспадарак складала 51 959 га, ці 0,5% усіх сельгасугоддзяў рэспублікі (для параўнання: у Расіі на долю фермераў прыпадала больш за 3%). Сярэдняя плошча зямель калгасаў і саўгасаў складала 1994 га, фермерскіх гаспадарак – 19,9 га, прысядзібных участкаў – 0,42 га. У 1993 г. на кожную фермерскую гаспадарку Беларусі прыходзілася па 3,5 чалавека, у тым ліку 2 працаздольныя работнікі. Амаль 35% фермерскай зямлі выкарыстоўвалася неэфектыўна. Удзельная вага прадукцыі фермерскіх гаспадарак у агульным аб'ёме прадукцыі аграпрамысловага комплексу Беларусі складала менш за 1% , а таварнай прадукцыі толькі 0,3% .

Цяжкасці з фінансаваннем, адсутнасць вопыту і сельскагаспадарчых ведаў, непарытэт цэн на сельскагаспадарчую тэхніку і сельскагаспадарчыя прадукты, прывялі да банкруцтва многія фермерскія гаспадаркі.

У першай палове 90-х гг. рэзка знізіўся жыццёвы ўзровень насельніцтва рэспублікі. Адбыўся абвальны рост цэн на прадукты харчавання, тавары першай неабходнасці і паслугі. Намінальныя грашовыя даходы насельніцтва не паспявалі за расходамі. У 1994 г. за рысай мінімальнага спажывецкага бюджэту апынулася больш за 60% насельніцтва рэспублікі. На змену ўсеагульнай занятасці насельніцтва прыйшло беспрацоўе. У 1993 г. было зарэгістравана ў службе занятасці 54,9 тыс. беспрацоўных.

Ва ўмовах масавага збяднення насельніцтва ўрадам была прынята пастанова, згодна з якой пачалі выдавацца крэдыты на жыллёвае будаўніцтва. Карыстацца гэтым, вядома, маглі тыя, хто быў ва ўладзе і бліжэй да банкаў. Вакол Мінска, абласных і раённых цэнтраў пачалі расці цэлыя новыя пасёлкі.

Незадаволенасць насельніцтва рэспублікі мадэллю рыначных рэформ метадам "шокавай тэрапіі" ў яе беларускім варыянце, рэзкае зніжэнне даходаў насельніцтва з'явіліся асноўнымі прычынамі паражэння С. Шушкевіча і В. Кебіча на прэзідэнцкіх выбарах у чэрвені 1994 г. Правядзенне новага курсу рэформ у другой палове 90-

х гг. звязана з дзейнасцю Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Лукашэнкі. 29 верасня 1994 г. Кабінет Міністраў Рэспублікі Беларусь прапанаваў Вярхоўнаму Савету праграму неадкладных мер па вываду эканомікі з крызісу, якая была распрацавана па заданню Прэзідэнта рэспублікі. Праграма ўключала аздараўленне крэдытнай грашовай сістэмы, зніжэнне ўзроўню інфляцыі да канца 1994 г. да 10-11%, а да канца 1995 г. – да 3-4%, спыненне падзення вытворчасці і зніжэння жыццёвага ўзроўню народа, пераход ад палітыкі датацый усім без разбору да адрасных выплат.

У другой палове 90-х гг. кіраўніцтва Рэспублікі Беларусь прыклала шмат намаганняў, каб пераадолець крызісныя з'явы ў эканоміцы і грамадстве. Былі дасягнуты пэўныя пазітыўныя вынікі ў 1995-1996 гг. Адбылося запавольванне тэмпаў эканамічнага спаду, паніжэнне інфляцыі, ажыўленне вытворчасці ў асобных галінах і рэгіёнах. Так, у 1996 г. у параўнанні з 1995 г. павялічыўся валавы ўнутраны прадукт, аб'ём прамысловай вытворчасці, рознічны тавараабарот. Упершыню ўдалося ўтрымаць у вызначаных межах інфляцыю, беспрацоўе і стрымаць зніжэнне жыццёвага ўзроўню насельніцтва. Па выніках 1996 г. Беларусь займала першае месца сярод дзяржаў былога СССР па вытворчасці мяса і малака на душу насельніцтва і другое – па вытворчасці збожжа, уступаючы толькі Казахстану.

1997 г. быў найлепшым з пункту гледжання выканання намечаных сацыяльна-эканамічных паказчыкаў развіцця краіны. Упершыню быў сабраны рэкордны ўраджай збожжа. Яго аб'ём пасля дапрацоўкі перавысіў 6,5 млн. тон. А гэта было амаль на 630 тыс. тон больш, чым у 1996 г. Ураджайнасць збожжавых склала амаль 24 ц з гектара.

Аднак становішча ў сельскай гаспадарцы заставалася складаным. Калектыўныя і індывідуальныя гаспадаркі амаль поўнасцю спынілі закупку тэхнікі, мінеральных угнаенняў, хімічных сродкаў аховы раслін. Унясенне мінеральных угнаенняў скарацілася ў 12 разоў. У выніку значна павялічылася эрозія зямель, іх культурная і тэхнічная неўладкаванасць. У 1997 г. з 9,3 млн. га сельскагаспадарчых зямель інтэнсіўна выкарыстоўвалася толькі 8,5 млн. га. У гаспадарках засталося вельмі мала прыдатных для працы зерне-ўборачных камбайнаў і каля 55% аўтамабіляў ад іх ранейшай колькасці. Невыпадкова, што ў 1998 і 1999 гг. выявіўся недабор збожжа, пладоў, ягад, кармоў, а таксама асобных відаў агародніных культур.

Курс на сацыяльна арыентаваную рыначную эканоміку, ажыццяўленне эфектыўнай сацыяльнай палітыкі з'явіўся асновай унутрыпалітычнай дзейнасці кіраўніцтва краіны. За 1996-1998 гг. вытворчасць тавараў народнага спажывання павялічылася больш

чым напалову. Захоўвалася сацыяльная накіраванасць бюджэту – 64% яго сродкаў (1998) накіраваны ў сацыяльную сферу. Прыпыненне спаду вытворчасці, забеспячэнне некаторага эканамічнага росту садзейнічалі таму, што, пачынаючы з 1996 г., пачалося зніжэнне ўзроўню беспрацоўя: з 182,5 тыс. у 1996 г. да 151,1 тыс. у 1997 г. Аднак рост цэн па-ранейшаму апярэджваў павышэнне заработнай платы, таму яе рэальны ўзровень няўхільна зніжаўся. Патрабавалася павышэнне памеру мінімальных дзяржаўных сацыяльных гарантый, удасканаленне пенсійнага забеспячэння, узмацненне адраснай сацыяльнай падтрымкі канкрэтных груп насельніцтва.

Валютны крызіс у рэспубліцы ў сакавіку і жнівеньскі фінансавы крызіс 1998 г. у Расіі – усё гэта адмоўна адбілася на эканоміцы Беларусі, бо гандаль з Расіяй складаў звыш 60% агульнага тавараабароту.

У мэтах пераадолення наступстваў крызісу кіраўніцтва Беларусі зрабіла важныя крокі ў эканамічнай палітыцы: былі праведзены ўніфікацыя валютнага курса ў адносінах да беларускага рубля і частковая лібералізацыя цэн, узмоцнена жорсткасць бюджэтнай дысцыпліны, у значнай ступені ажыццёўлены пераход разлікаў на грашовую аснову, скарачэнне бартэра. Вынікам прынятых мер з'явілася зніжэнне інфляцыі з 251% у 1999 г. да 108% у 2000 г. Аб'ём валавога ўнутранага прадукту павялічыўся ў 2000 г. на 5,8%, а ў 2001 г. больш чым на 4%. Вытворчасць прамысловай прадукцыі ўзрасла на 5,5% і склала 106% да ўзраўню 1990 г. Таму Беларусь стала адзінай з былых краін на постсавецкай прасторы, якая па асноўных эканамічных паказчыках дасягнула ўзроўню 1990 г.

Нягледзячы на вельмі абмежаваныя рэсурсныя магчымасці Беларусі, дынамічна рэалізуецца асноўная задача – паэтапнае павышэнне жыццёвага ўзроўню народа. Толькі за 2001 г. рэальныя грашовыя даходы насельніцтва павялічыліся на 25%, а рэальная заработная плата – больш чым на 30%. Па індэксу развіцця чалавечага патэнцыялу эксперты ААН ставяць Беларусь на першае месца сярод краін СНД. Калі ў 1995 г. па гэтаму паказчыку Рэспубліка Беларусь займала амаль 70-е месца, то ў 2001 г. перамясцілася на 53-е.

Разам з тым трэба адзначыць, што ў 2001 г. намецілася тэндэнцыя замаруджвання эканамічнай актыўнасці. Узрастае аб'ем нерэалізаванай прадукцыі, застаецца нізкім узровень інвестыцый, трэць прадпрыемстваў з'яўляюцца стратнымі. Таму нявыкананай аказалася даходная частка бюджэту.

Кіраўніцтвам краіны была распрацавана праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2001-2005 гг., якая зацверджана на II Усебеларускім народным сходзе. У ліку яе прыярытэтаў: інавацыйныя

і інвестыцыйная дзейнасць, пашырэнне экспарту тавараў і паслуг, эфектыўнае і дынамічнае развіццё аграпрамысловага комплексу, жыллёвае будаўніцтва, ахова здароўя насельніцтва.

Рэалізацыя гэтых праграмных задач патрабуе фінансаванага аздараўлення эканомікі, яе структурнай перабудовы, развіцця навукаёмкай вытворчасці, рэсурсазберагаючых тэхналогій і г. д.

**Знешняя палітыка.** Пасля абвяшчэння незалежнасці Беларусі галоўным накірункам у знешняй палітыцы сталі адносіны з Расіяй. Станаўленне беларуска-расійскіх адносін адбывалася ва ўмовах глыбокага сацыяльна-эканамічнага крызісу. Трэба было прайсці шлях ад міжрэспубліканскіх стасункаў у складзе СССР да міждзяржаўных. Для гэтага пераходнага перыяду, які прыпадаў на 1991-1994 гг., былі характэрны непаслядоўнасць, ваганні, цяжкі пошук новых падыходаў да адносінаў паміж дзяржавамі.

Ва ўмовах адсутнасці знешнепалітычнай канцэпцыі сярод кіраўніцтва рэспублікі не было аднолькавага падыходу да адносін з Расіяй. "Партыя ўлады", якую ўзначальваў Старшыня ўрада В. Кебіч не асмельвалася ўзяць на сябе адказнасць за прыняцце лёсавырашальных пытанняў. Паглыбленне крызісу яна тлумачыла разрывам гаспадарчых сувязяў з Расіяй, іншымі дзяржавамі СНД і імкнулася ў сваёй практычнай дзейнасці да іх узнаўлення. У сваю чаргу апазіцыя БНФ і Старшыня Вярхоўнага Савета С. Шушкевіч выказалі сваё меркаванне наконт вырашэння існуючай праблемы. Незайздросны стан эканомікі рэспублікі, на іх думку, быў выкліканы змовай часткі кіраўнікоў Расіі з былой наменклатурай у Беларусі. Таму яны выступілі за памяншэнне эканамічнай і ваеннай залежнасці ад Расіі, умацаванне палітычных і гандлёвых сувязяў з еўрапейскімі краінамі.

У 1992 г. курс быў узяты на ўзнаўленне эканамічных адносін з Расіяй. Беларускае кіраўніцтва спрабавала выкарыстоўваць у гэтай справе кансалідацыю этнічных беларусаў, якія жылі ў Расіі, наладжваць сяброўскія і нефармальныя адносіны з яе дзяржаўнай, фінансавай і прамысловай элітай. Дзякуючы такім намаганням у 1992-1993 гг. паміж Беларуссю і Расіяй было падпісана 42 пагадненні, з якіх 31 – па эканамічных пытаннях, 6 – адносілася да палітычнай сферы, 5 – да ваеннай.

У красавіку 1993 г. беларускі парламент падтрымаў ініцыятыву В. Кебіча і даручыў С. Шушкевічу падпісаць дагавор аб калектыўнай бяспецы краін СНД. У ліпені 1993 г. спікер быў абвінавачаны ў няпоўным выкананні волі парламента, і Вярхоўны Савет правёў першае галасаванне аб даверу свайму Старшыні. А ў верасні 1993 г. па ініцыятыве прэм'ера быў падпісаны дагавор аб аб'яднанні

грашовых сістэм Беларусі і Расіі. Планавалася, што ў дзяржавах будзе ўведзена адзіная грашовая адзінка (расійскі рубель), будуць устаноўлены ўзгодненыя памеры крэдытнай эмісіі і бюджэтнага дэфіцыту, а Нацыянальны банк Беларусі захавае ўсе свае функцыі, у тым ліку і права грашовай эмісіі. Гэта ідэя ў сродках масавай інфармацыі падавалася як панацэя ад усіх бедаў.

Кастрычніцкія падзеі 1993 г. у Маскве паставілі беларускі ўрад у цяжкую сітуацыю. Абвясціўшы сваёй стратэгічнай мэтаю стварэнне "сацыяльна арыентаванай рыначнай эканомікі" з моцнай роляй дзяржавы, кабінет В. Кебіча апынууся ў становішчы, калі трэба было супрацоўнічаць з краінай, якая абрала рыначную мадэль развіцця. У такіх умовах былі магчымыя два варыянты: або правесці радыкальныя эканамічныя рэформы з "шокавай тэрапіяй" і страціць сваю папулярнасць сярод насельніцтва; або паспрабаваць інтэгравацца ў расійскую эканоміку са старым багажом і згубіць частку эканамічнага і палітычнага суверэнітэту. Абралі другі варыянт, і пасля парламенцскіх выбараў у Расіі пачалася падрыхтоўка дагавора аб "рублёвай зоне новага тыпу" з адзіным эмісійным цэнтрам, уніфікаваным банкаўскім і фінансавым заканадаўствам. Праект дагавора да красавіка 1994 г. быў падрыхтаваны. Аднак яго падпісанне не адбылося, бо старшыня Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь С. Багданкевіч адмовіўся паставіць свой подпіс, спаслаўшыся на 145 артыкул ужо зацверджанай Канстытуцыі, дзе, у прыватнасці, сцвярджалася, што выключным правам грашовай эмісіі на тэрыторыі краіны валодае Нацыянальны банк.

Складаная ўнутрыпалітычная сітуацыя і адсутнасць належнай палітычнай волі ў кіраўнікоў абедзвюх дзяржаў не дазволілі на першым этапе дасягнуць кардынальных перамен у адносінах паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй.

Палітыка Беларусі ў дачыненні да Расіі пачала змяняцца пасля прэзідэнцкіх выбараў, якія адбыліся ў ліпені 1994 г. А. Лукашэнка палічыў, што патрэбна надаць ім пэўны дынамізм і перавесці на якасна новы ўзровень. Але спачатку яму давялося вырашаць складаныя пытанні выплаты знешняй запазычанасці. Да канца 1994 г. адбыліся візіты А. Лукашэнкі ў Маскву, Сочы і Кіеў, падчас якіх беларускі прэзідэнт выступіў з жорсткай крытыкай урада В. Кебіча. Рэспубліка пачала плаціць за бягучыя пастаўкі паліва, а Расія без абмежаванняў яго пастаўляць.

Прэзідэнт краіны надаў інтэграцыйным працэсам канкрэтны характар. 6 студзеня 1995 г. у Мінску было падпісана пагадненне аб стварэнні Мытнага саюза паміж Расійскай Федэрацыяй і Рэспублікай

Беларусь, а крыху пазней прэзідэнты дзвюх краін А. Лукашэнка і Б. Ельцын заключылі дагавор аб сяброўстве, добрасуседстве і супрацоўніцтве тэрмінам на дзесяць гадоў. 25 мая 1995 г. Б. Ельцын выдаў указ аб адмене мытнага кантролю на расійска-беларускай мяжы, а на наступны дзень А. Лукашэнка і прэм'ер-міністр Расіі В. Чарнамырдзін сімвалічна ліквідавалі на ёй шлагбаум і пасадзілі бярозку.

Узмацненне расійскага напрамку ў знешняй палітыцы Беларусі адбылося пасля майскага (1995) рэферэндуму. З 64,8% грамадзян Беларусі, якія прынялі ў ім удзел, 82,4% падтрымалі ідэю аб эканамічнай інтэграцыі з Расіяй.

У лютым 1996 г. адбыўся афіцыйны візіт беларускага Прэзідэнта А. Лукашэнкі ў Маскву. У ходзе перагавораў з Б. Ельцыным галоўная ўвага надавалася абмеркаванню перспектыў паглыблення эканамічных, ваенных і культурных сувязяў, узаемадзеяння ў рамках Мытнага саюза. Прэзідэнты падпісалі сумесную заяву і далі даручэнне ўрадам сваіх краін падрыхтаваць праект дагавора, які вызначаў бы прынцыпы, асноўныя напрамкі і формы далейшага іх збліжэння.

Такі праект хутка падрыхтавалі і 2 красавіка 1996 г. у Крамлі быў падпісаны дагавор аб стварэнні Супольнасці суверэнных рэспублік. У дакуменце адзначалася, што бакі ўзгадняюць палітыку, агульныя пазіцыі па асноўных міжнародных пытаннях, узаемадзейнічаюць у забеспячэнні бяспекі, ахове граніц і барацьбе са злачыннасцю. Захоўваючы атрыбуты свайго суверэнітэту, дзяржавы выходзілі на сумеснае будаўніцтва структур, якія мелі агульную заканадаўчую базу. Былі сфарміраваны Вышэйшы Савет, Выканаўчы камітэт, Парламенцкі сход, Мытны камітэт, Расійска-Беларуская камісія па навукова-тэхнічнаму супрацоўніцтву, Камітэт па гідраметэаралогіі і маніторынгу забруджвання прыроднага асяроддзя, Грамадскі савет прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў пры Выканкаме Супольнасці. Планавалася, што да канца 1996 г. дзяржавы сфарміруюць агульную транспартную сістэму з адзінымі тарыфамі па перавозках грузаў і пасажыраў, аб'яднаюць энергасістэмы і будуць мець сумесныя навукова-тэхналагічную і інфармацыйную прасторы. На наступны год разлічвалі правесці сінхранізацыю этапаў, тэрмінаў і глыбіні эканамічных рэформаў, падрыхтаваць адзіную нарматыўна-прававую базу, правесці уніфікацыю грашова-крэдытных і бюджэтных сістэм, стварыць умовы для ўвядзення адзінай валюты.

Пасля ратыфікацыі дагавора аб стварэнні супольнасці Беларусі і Расіі 29 жніўня 1996 г., праводзіліся пасяджэнні Вышэйшага Савета і Выканаўчага камітэта, зацверджана Праграма першачарговых мерапрыемстваў па рэалізацыі дагавора. У 1996 г. адбылася першая

сесія Парламенцкага сходу, на якой было абрана кіраўніцтва, утворана 6 пастаянных камісій і зацверджана праграма на 1996-1997 гг. па стварэнню прававых асноў Супольнасці. Былі вырашаны ўсе арганізацыйныя пытанні па дзейнасці вышэйшых органаў.

Аднак бакі не дабіліся істотных поспехаў у справе рэальнага збліжэння краін. Цяжкасці ў пашырэнні інтэграцыі былі абумоўлены як эканамічным і сацыяльна-палітычным становішчам дзяржаў, так і адсутнасцю эфектыўнага механізма рэалізацыі прымаемых рашэнняў. Дзяржаўныя і грамадскія арганізацыі выступалі з праектамі, якія былі заснаваны на розных, а часам дыяметральна супрацьлеглых варыянтах інтэграцыі, Частка расійскіх палітыкаў пачала выказвацца аб неабходнасці абмежавання правоў Беларусі ў складзе супольнасці і нават пазбаўленні таго статуса, які быў у часы існавання БССР. Беларуска-расійскае збліжэнне было затармажана і ўнутрыпалітычным крызісам у Рэспубліцы Беларусь восенню 1996 г. Супрацьстаянне Прэзідэнта з Парламентам прывяло на гэты раз да рэферэндуму 24 лістапада 1996 г., пасля чаго змянілася Канстытуцыя, пачалася дыпламатычная блакада Беларусі з Захаду.

У студзені 1997 г. Б. Ельцын звярнуўся да А. Лукашэнкі з прапановай зрабіць канкрэтныя намаганні па рэальнай інтэграцыі і падрыхтаваць юрыдычны дакумент аб стварэнні адзінай дзяржавы. Пачаліся ўзаемныя кансультацыі па гэтаму пытанню. Важнае значэнне набыла сустрэча лідэраў у Крамлі 7 сакавіка 1997 г., на якой А. Лукашэнка пагадзіўся з тым, каб аднавіць дагавор ад 2 красавіка 1996 г. і стварыць Саюз дзвюх дзяржаў. Абодва бакі палічылі мэтазгодным распрацаваць Статут, у якім вызначаліся б функцыі наднацыянальных органаў, і пашырыць правы Вышэйшага Савета. Паступіла таксама прапанова аб тым, каб Выканаўчы камітэт узначальвала аўтарытэтная асоба, якая б не займала іншых пасад, а Парламецкі сход – прымаў законы, якія праводзіліся б хутка ў жыццё.

2 красавіка 1997 г. у Маскве А. Лукашэнка і Б. Ельцын падпісалі Дагавор аб Саюзе Беларусі з Расіяй. У дакуменце падкрэслівалася, што Расійская Федэрацыя і Рэспубліка Беларусь пры яго заключэнні зыходзілі з духоўнай блізкасці і агульнасці гістарычных лёсаў сваіх народаў, абапіраліся на іх волю да далейшай еднасці, імкнуліся эфектыўна выкарыстоўваць маральны і інтэлектуальны патэнцыял у інтарэсах сацыяльнага і эканамічнага прагрэсу. У Дагаворы адзначалася, што кожная краіна – удзельніца Саюза – захоўвае дзяржаўны суверэнітэт, незалежнасць і тэрытарыяльную недатыкальнасць, канстытуцыю, сцяг, герб і іншыя атрыбуты дзяржаўнасці. Галоўнымі мэтамі Саюза былі: умацаванне адносін братэрства, сяброўства і

ўсебаковага супрацоўніцтва паміж Расійскай Федэрацыяй і Рэспублікай Беларусь у палітычнай, эканамічнай, сацыяльнай, ваеннай, навуковай, культурнай і іншых галінах; павышэнне ўзроўню жыцця народаў і стварэнне спрыяльных умоў для ўсебаковага, гарманічнага развіцця асобы; устойлівае сацыяльна-эканамічнае развіццё дзяржаў-удзельніц Саюза на падставе аб'яднання іх матэрыяльнага і інтэлектуальнага патэнцыялаў, выкарыстоўвання рыначных механізмаў функцыяніравання эканомікі; збліжэнне нацыянальных прававых сістэм, фарміраванне прававой сістэмы Саюза; забеспячэнне бяспекі і падтрыманне высокай абараназдольнасці, сумесная барацьба са злачыннасцю;спрыянне забеспячэнню агульнаеўрапейскай бяспекі і развіццю супрацоўніцтва ў Еўропе і ва ўсім свеце.

Праект Статута Саюза Беларусі і Расіі 9 красавіка 1997 г. быў вынесены на грамадскае абмеркаванне і 23 мая падпісаны ў Маскве прэзідэнтамі А. Лукашэнкам і Б. Ельцыным. 10 чэрвеня 1997 г. Дагавор аб Саюзе Беларусі і Расіі быў ратыфікаваны ў Мінску і ў Маскве.

Так быў зроблены яшчэ адзін крок наперад у развіцці двухбаковых адносін. Аднак і пасля заключэння Саюза не ўсе праблемы паміж Беларуссю і Расіяй былі вырашаны. Шматлікія пагадненні не рэалізоўваліся на практыцы. У дзяржавах існавалі палітычныя сілы, якія часам імкнуліся да дэстабілізацыі саюзніцкіх адносін. У прэсе, іншых сродках масавай інфармацыі ў асобныя моманты ўзнікала своеасаблівая інфармацыйная вайна і праводзілася дыскрэдытацыя асобных кіраўнікоў, што падрывала развіццё беларуска-расійскай інтэграцыі.

Але, як гэта ні парадаксальна, негатыўныя моманты толькі падштурхнулі беларускае кіраўніцтва да паглыблення інтэграцыі з Расіяй. 25 снежня 1998 г. была падпісана Дэкларацыя аб аб'яднанні Беларусі з Расіяй у Саюзную дзяржаву, а праз год – 8 снежня 1999 г. – намер быў ажыццёўлены. 26 студзеня 2000 г. Дагавор аб стварэнні Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі быў ратыфікаваны. Старшынёй Вышэйшага дзяржаўнага Савета быў абраны А. Лукашэнка, Старшынёй Савета Міністраў стаў М. Касьянаў, Дзярж-сакратаром – П. Барадзін.

Палітыка інтэграцыі з Расіяй, якую на працягу 90-х гг. Беларускае кіраўніцтва імкнулася ажыццяўляць, была шматфункцыянальнай і, перш за ўсё, скіраванай на ўзнаўленне былых эканамічных сувязяў. Структура нацыянальнай эканомікі была такой, што ў 1991 г. каля 80% прамысловай прадукцыі Беларусі перапраўлялася за яе межы. Пры гэтым рэспубліка імпартавала з Расійскай Федэрацыі, краін СНД

70% выкарыстоўваемай сыравіны і энерганосьбітаў. Асаблівасць беларускай эканомікі заключалася ў тым, што яна ў свой час была сфарміравана саюзным цэнтрам у выглядзе буйной вытворчасці, і таму ў ёй цяжка праводзіць структурную перабудову, арыентаваць на новыя рынкі.

Пачынаючы праводзіць сваю незалежную знешнюю палітыку, Рэспубліка Беларусь пацвердзіла прыхільнасць да прынцыпаў Статута ААН, Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, далучылася да факультатыўнага пратакола Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах у тых выпадках, калі парушаюцца правы асобы. Такая пазіцыя садзейнічала росту яе аўтарытэту на міжнароднай арэне і забяспечыла хуткае дыпламатычнае прызнанне. Па стану на 1994 г. яе прызналі 123 краіны свету, 97 з іх устанавілі дыпламатычныя адносіны.

Рэспубліка Беларусь стала паўнапраўным членам больш 60 міжнародных арганізацый, у 10 атрымала статус наглядальніка. У 1991-1995 гг. яна падпісала больш за 600 двухбаковых міждзяржаўных і міжурадавых пагадненняў па пытаннях знешнепалітычнай і знешнеэканамічнай дзейнасці. Рэспубліка стала паўнапраўнай удзельніцай Нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе. Сярод дзяржаў СНД яна першай падпісала Парыжскую хартыю для новай Еўропы, увайшла ў Міжнародны валютны фонд і Сусветны банк рэканструкцыі і развіцця.

На момант распаду СССР Беларусь з'яўлялася адной з самых мілітарызаваных краін свету. Па колькасці цяжкіх узбраенняў яна апярэджвала многія краіны Еўропы, бо на яе тэрыторыі была размешчана 250-тысячная вайсковая групоўка. Да гэтага трэба яшчэ дадаць, што на тэрыторыі рэспублікі было размешчана 73 стратэгічныя ракеты з ядзернымі боегалоўкамі, вялікая колькасць тактычнай ядзернай зброі.

Выконваючы ўзятыя на сябе абавязкі ў галінах бяспекі і раззбраення, Беларусь актыўна ўключылася ў перагаворны працэс. Імкнучыся стварыць міжнародна-прававую базу пераходу да статуса бяз'ядзернай і нейтральнай дзяржавы, яна стала ўдзельніцай дагавораў аб нераспаўсюджванні ядзернай зброі, аб звычайных узброеных сілах у Еўропе, падпісала канвенцыю аб забароне хімічнага ўзбраення.

23 мая 1992 г. ЗША, Расія, Украіна, Беларусь і Казахстан падпісалі Лісабонскі пратакол да дагавора паміж СССР і ЗША аб скарачэнні стратэгічных наступальных узбраенняў (СНУ-2). Згодна з пратаколам Украіна, Беларусь і Казахстан бралі на сябе

абавязацельствы ліквідаваць або перадаць Расіі ўсе стратэгічныя ядзерныя боегалоўкі.

6 ліпеня 1992 г. дзевяць дзяржаў СНД (Рэспубліка Арменія, Рэспубліка Беларусь, Рэспубліка Казахстан, Кыртызская Рэспубліка, Рэспубліка Таджыкістан, Рэспубліка Узбекістан, Украіна, Рэспубліка Малдова і Туркменістан) пацвердзілі, што падтрымліваюць удзел Расіі ў дагаворы аб нераспаўсюджванні ядзернай зброі ў якасці дзяржавы як уладальніцы і заявілі, што гатовы далучыцца да гэтага дагавора ў якасці неядзерных дзяржаў. Такім чынам, юрыдычна было вырашана пытанне аб праваператемнасці, і Расійская Федэрацыя стала адзінай уладальніцай ядзернай зброі.

У адпаведнасці з падпісанымі пагадненнямі стратэгічныя ядзерныя сілы, якія былі размешчаны на тэрыторыі рэспублікі, пачалі выводзіць за яе межы. Беларусь абавязалася на працягу сямі гадоў поўнасцю пазбавіцца ад гэтых узбраенняў, па дамоўленасці з Расіяй скараціць тэрмін іх вываду. Тактычная ядзерная зброя была вывезена за межы рэспублікі ў 1992 г., а ў канцы лістапада 1996 г., напярэдадні сустрэчы кіраўнікоў дзяржаў – удзельніц АБСЕ, апошнія міжкантынентальныя балістычныя ракеты СС-25 пакінулі яе тэрыторыю. Беларусь цалкам выканала міжнародныя абавязацельствы і стала дэ-факта краінай бяз'ядзернай зброі.

У якасці самастойнага суб'екта міжнароднага права рэспубліка далучылася таксама да дагавора аб звычайных узброеных сілах у Еўропе, падпісала пагадненне па адкрытаму небу, канвенцыю аб забароне хімічнай зброі і прыступіла да іх выканання ў 1993 г. Згодна з пастановай Вярхоўнага Савета колькасць узброеных сіл не павінна была пераўзыходзіць 100 тыс. чалавек, што складала 1,01% ад усяго насельніцтва. У выніку праведзеных мерапрыемстваў па рэфармаванню арганізацыйна-штатных структур да 1995 г. удалося знізіць колькасць кадравага складу ўзброеных сіл да 85 тыс. чалавек, што атрымала высокую адзнаку міжнароднага супольніцтва.

Распад СССР і Варшаўскага дагавора цалкам змянілі стратэгічны баланс сіл. Старая сістэма бяспекі рухнула. Таму для Беларусі, як і іншых краін СНД, паўстала праблема пабудовы новай сістэмы бяспекі ў Еўропе і захавання свайго суверэнітэту. 15 мая 1992 г. у Ташкенце быў падпісаны Дагавор аб калектыўнай бяспецы, пад якім паставілі свае подпісы прадстаўнікі шасці краін СНД. Быў створаны Савет калектыўнай бяспекі ў складзе кіраўнікоў і ўведзена пасада Галоўнакамандуючага аб'яднанымі ўзброенымі сіламі СНД. У дапаўненне да гэтага дагавора 15 красавіка 1994 г. была прынята

Дэкларацыя аб захаванні суверэнітэту, тэрытарыяльнай цэласнасці і непахіснасці граніц дзяржаў СНД.

Ствараючы сістэму сваёй бяспекі, Беларусь улічвала рэаліі, якія ўзніклі ў сярэдзіне 90-х гадоў у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе. У зацверджанай у сакавіку 1994 г. Канстытуцыі былі вызначаны прынцыпы знешняй палітыкі. "Рэспубліка Беларусь у сваёй знешняй палітыцы, - падкрэслівалася ў Асноўным законе, - зыходзіць з прынцыпаў роўнасці дзяржаў, непрымянення сілы або пагрозы сілай, непарушнасці межаў, мірнага ўрэгулявання спрэчак, неўмяшання ва ўнутраныя справы і іншых агульнапрызнаных прынцыпаў і нормаў права". Развіваючы гэтыя палажэнні, Савет Бяспекі Рэспублікі Беларусь зацвердзіў 27 сакавіка 1995 г. Канцэпцыю нацыянальнай бяспекі краіны. У дакуменце адзначалася, што забеспячэнне нацыянальнай бяспекі Беларусі павінна ажыццяўляцца на падставе выканання нормаў міжнароднага права і нацыянальнага заканадаўства. Сярод жыццёва важных інтарэсаў Беларусі ў палітычнай сферы былі адзначаны не толькі суверэнітэт і незалежнасць краіны, непарушнасць яе граніц і тэрытарыяльнай цэласнасці, але і захаванне міру і стабільнасці ў еўрапейскім рэгіёне.

З самага пачатку атрымання незалежнасці Беларусь імкнулася ўстанавіць нармальныя ўзаемаадносіны з усімі краінамі свету і, у першую чаргу, з суседзямі. У гэтай сувязі асабліва важнае значэнне набывалі адносіны з Рэспублікай Польшча, якая першай прызнала незалежнасць Беларусі. У чэрвені 1992 г. адбыўся візіт у Польшчу Старшыні Вярхоўнага Савета С. Шушкевіча, у выніку чаго быў падпісаны дагавор аб добрасуседстве і супрацоўніцтве. У Варшаве было адчынена беларускае пасольства, пачаліся ўзаемныя візіты, а ў чэрвені 1993 г. Мінск сустракаў польскага прэзідэнта Л. Валенсу. Добрасуседскія ўзаемаадносіны садзейнічалі таму, што паміж дзяржавамі было падпісана звыш 30 урадавых і міжурадавых дагавораў, перагледжаны прававыя акты, якія ў свой час былі заключаны паміж СССР і Польшчай з тым, каб вызначыць іх правапераемнікаў. Пастуупова беларуска-польскія ўзаемаадносіны пачалі нармалізавацца па ўсіх накірунках. Паспяхова развівалася эканамічнае супрацоўніцтва, прыгранічны гандаль, быў уведзены бязвізавы рэжым.

Аднак пасля таго, як у 1993 г. Польшча актывізавала свае намаганні па ўступленню ў НАТА, а Беларусь узяла курс на інтэграцыю з Расіяй, адносіны паміж дзяржавамі сталі больш стрыманымі.

Існавала і другая прычына, якая істотна адбівалася на адносінах паміж дзяржавамі. Абедзве краіны прыступілі да сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў. На Беларусі было абвешчана аб пабудове сацыяльна арыентаванай эканомікі, а ў Польшчы пачаў рэалізоўвацца план сістэмнай трансфармацыі з элементамі "шокавай тэрапіі" Л. Бальцэровіча. Польская эканамічная сістэма пачала актыўна інтэгравацца з Захадам.

Тым не менш, супрацоўніцтва паміж дзяржавамі працягвала развівацца. Не спыніліся кантакты кіраўнікоў. У студзені 1995 г. Прэзідэнт Беларусі А. Лукашэнка наведаў Польшчу і ўдзельнічаў у траурных цырымоніях у былым канцлагеры Асвенцім. Пад час гэтага візіту адбылася яго сустрэча з польскім прэзідэнтам Л. Валенсам. У канцы 1995 г. у Варшаву прыязджаў Прэм'ер-міністр Беларусі М. Чыгір. У сакавіку 1996 г. у Белавежскай пушчы адбылася сустрэча А. Лукашэнкі і А. Квасьнеўскага.

У 90-я гады была створана неабходная прававая база для эканамічнага супрацоўніцтва, якая ўключала звыш 20 двухбаковых дакументаў. Было падпісана Мытнае пагадненне, дагаворы аб узаемнай падтрымцы і абароне інвестыцый, аб недапушчальнасці двайнога падаткаабкладання. У выніку стаў расці тавараварот. Прычым Беларусь атрымала станоўчае сальда. Польшча стала трэцім па значнасці гандлёвым партнёрам пасля Расіі і Украіны. У 1994 г. адбыўся спад, а затым зноў уздым. У 1996 г. тавараварот павялічыўся на 10,9%, скараціласся колькасць бартэрных аперацый. З 1997 г. гандаль зноў скарачаецца. Гэта было звязана з уступленнем Польшчы ў ЕС і стварэннем Беларуссю разам з Расіяй Мытнага саюза. Узніклі праблемы ва ўзаемаразліках і мытных зборах. У выніку Польдіча па значнасці стала чацвёртым гандлёвым партнёрам і яе доля ў знешнегандлёвых сувязях Беларусі склала на канец 1998 г. 2,9%. Паралельна развівалася банкаўскае супрацоўніцтва, павялічваліся ўклады польскага капіталу ў беларускую эканоміку. Па колькасці такіх прадпрыемстваў Польшча захавала першае месца на беларускім рынку. Польскія прадпрымальнікі ўклалі ў нацыянальную эканоміку звыш 80 млн. долараў ЗША. Такім чынам, нягледзячы на цяжкасці, узаемаадносіны паміж краінамі развіваліся дынамічна.

Пашырыліся гандлёвыя адносіны з краінамі далёкага замежжа. Таварная наменклатура экспарту рэспублікі ўключала амаль 1000 найменняў, у 1993 г. пастаўкі ажыццяўляліся ў 96 краін свету. Асноўнымі знешнеэканамічнымі партнёрамі Беларусі з'яўляліся еўрапейскія краіны. Самыя актыўныя гандлёвыя сувязі падтрымліваліся з Аўстрыяй, Польшчай, Германіяй, ЗША, Вялікабрытаніяй, Італіяй, Турцыяй. У

1994 г. па аб'ёму тавараздвароту сярод краін далёкага замежжа на першае месца выйшла Германія. У гэтым самым годзе было зарэгістравана 1438 сумесных і 499 замежных прадпрыемстваў з 66 краін свету. Агульная сума замежных крэдытаў складала 1049,5 млн. Долараў ЗША. З шэрагам развітых краін была заключана дамоўленасць аб абароне інвестыцый і ўхіленні двайнога падаткаабкладання.

Аднак паглыбленню знешнеэканамічных сувязяў з Захадам перашкаджалі палітыка двайных стандартаў заходніх краін, антыдэмпінгавыя квоты на калійныя солі і тэкстыль, імкненне замежных прадпрымальнікаў імпартаваць з Беларусі сыравіну, неканкурэнтаздольнасць некаторых вырабаў беларускіх прадпрыемстваў. У такіх абставінах асаблівае значэнне набыла праблема эфектыўнага выкарыстання традыцыйных рынкаў збыту.

Беларусь стала праводзіць курс на ўмацаванне эканамічнага ўзаемадзеяння краін СНД, фарміраванне ўсходнееўрапейскага рынку, развіццё ўсебаковых сувязяў з Расіяй. Дзякуючы такім намаганням толькі на ліквідацыю вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС рэспубліка атрымала ад Расіі сродкаў у 10 разоў больш, чым ад усіх краін Заходняй Еўропы, ЗША і міжнародных арганізацый. Стварэнне спачатку эканамічнага, а ў 1995 г. – Мытнага саюзу з Расіяй, адмена пошлін станоўча паўплывалі на гандаль.

У эканамічнай сферы ўзмацнілася тэндэнцыя па стварэнню міжнародных фінансава-прамысловых груп. Адной з першых у 1996 г. была заснавана ФПГ «Граніт», якая аб'яднала прадпрыемствы па вытворчасці прадукцыі ў сферы супрацьпаветранай абароны. У яе ўвайшло 28 прадпрыемстваў, сярод якіх былі і беларускія – НПА «Агат», «Окта», Барысаўскі рамонтны завод. Пачалі рэалізоўвацца праекты па заснаванню такіх ФПГ, як «Славянская папера», «Корманарыхтоўчая тэхніка», «Авіяфін», «БелРусАўта». У канцы 90-х гадоў Савет Міністраў Беларусі разгледзеў і падтрымаў 10 праектаў ФПГ з удзелам беларускіх і расійскіх прадпрыемстваў.

Эканамічнае супрацоўніцтва з Расіяй развівалася не толькі на міждзяржаўным, але і на міжрэгіянальным узроўнях. Добрыя адносіны склаліся ў рэспубліцы з Калінінградскай вобласцю. У 1996 г. аб'ём тавараздвароту складаў 8 млн. долараў ЗША. Беларусь выкарыстоўвала Калінінградскі порт для экспартна-імпартных аперацый. У 1997 г. была пастаўлена задача па стварэнню на яго базе нацыянальнага марскога флоту і сумеснай рыбалавецкай кампаніі. Супрацоўнічаючы з Яраслаўскай вобласцю, Беларусь дабілася рэалізацыі выгаднага пагаднення аб павелічэнні паставак камплектуючых для вытворчасці грузавых аўтамабіляў і далейшай іх рэалізацыі на

расійскім рынку. Рэгіянальнае супрацоўніцтва актыўна вялося з Мурманскам, Санкт-Пецярбургам, Ліпецкам, Цюменню і іншымі рэгіёнамі. У 1998 г. было падпісана 55 пагадненняў аб гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве з суб'ектамі Расійскай Федэрацыі. У выніку павялічваўся таваразварот, які дасягнуў у 1999 г. 11 124,4 млн. долараў ЗША, скарацілася адмоўнае сальда. На долю Расіі ў знешнім гандлі прыпадала 59,4%, што сведчыла аб пашырэнні эканамічных сувязяў.

Такім чынам, абвяшчэнне незалежнасці Рэспублікі Беларусь абумовіла пачатак прынцыпова новага этапа ў яе знешнепалітычнай і міжнароднай дзейнасці.

**Паскарэнне гуманітарнага развіцця.** Абвяшчэнне дзяржаўнай незалежнасці Беларусі выклікала сапраўдны пераварот у духоўным жыцці грамадства. Нацыянальная культура перастала быць часткай агульнай культуры савецкага народа, у выніку абставін яна самавызначылася як культура беларускага народа і дзяржавы. Статус дзяржаўнай быў нададзены беларускай мове, на ёй гаварылі ў парламенце, урадзе. Ідэямі дзяржаўнасці насычаліся навука, мастацтва, іншыя сферы інтэлектуальнай творчасці.

З мэтай стварэння спрыяльных умоў для далейшага развіцця нацыянальнай адукацыі і культуры у 1991 г. былі прыняты Закон аб адукацыі і Закон аб культуры, якімі былі гарантаваны свабода творчай дзейнасці, стварэнне ўмоваў дзеля ўсебаковага развіцця асобы, задавальненне адукацыйных запатрабаванняў кожнага чалавека, плюралізм напрамкаў і стыляў, абарона інтэлектуальнай уласнасці, гуманістычная накіраванасць, арыентацыя на агульначалавечыя каштоўнасці.

**Адукацыя.** Эканамічны крызіс, які суправаджаў пераходны перыяд, выразна адбіўся на сацыяльна-культурнай сферы. Так, бюджэтныя расходы Міністэрства культуры складалі ўсяго 0,6-1% расходнай часткі дзяржаўнага бюджэту, замест 3%, зафіксаваных у Законе аб культуры, а Міністэрства адукацыі – 5,5-6,5%, (згодна Закона аб адукацыі – 10%). Кіраўніцтва краіны рабіла захады, каб падтрымаць установы адукацыі і культуры, але сродкаў на гэта не заўсёды хапала. На нізкім узроўні знаходзілася аплата працы творчай інтэлігенцыі, што прывяло да выезду за межы краіны дзеячаў культуры і навукі.

Між тым, нягледзячы на гэта, у сферы адукацыі і культуры адбылося шмат станоўчых перамен. Удалося ў асноўным аднавіць былы ўзровень забяспечанасці дзяцей адпаведнага ўзросту дашкольнымі ўстановамі. Калі ў 1994 г. дзіцячыя сады і яслі наведвалі 58% дзяцей, то ўжо ў 2000 г. – 71%.

На працягу 90-х гг. былі зроблены захады па ўдасканаленню нацыянальнай сістэмы адукацыі. З 1998 г. пачалася рэформа 4,5 тыс. агульнаадукацыйных школ. Яе асноўнымі рысамі сталі: дэмакратызацыя сістэмы адукацыі, арыентацыя яе на агульначалавечыя каштоўнасці, стварэнне ўмоў для гарманічнага развіцця асобы, павышэнне якасці і эфектыўнасці адукацыі. Распачата работа па аптымізацыі тэрмінаў навучання і аб'ёму атрыманых ведаў. Пачаўся пераход школ на 12-гадовае навучанне, у т. л. абавязковае 10-гадовае. Узніклі новыя формы навучальных устаноў, з'явілася больш за 120 «элітарных» дзяржаўных гімназій, ліцэяў, каледжаў. Усё гэта дазваляе забяспечваць індывідуальную працу з вучнямі, стварае новыя магчымасці для больш ранняй спецыялізацыі і раскрыцця талентаў. Значная ўвага надаецца выкладанню замежных моў.

У краіне развіваецца сістэма сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі. У 156 каледжах, тэхнікумах і іншых установах сярэдняй спецыяльнай адукацыі навучаецца 150 тыс. юнакоў і дзяўчат. У 249 установах прафтэхадукацыі вучыцца больш за 135 тыс. чалавек.

У 90-я гг. пашырылася сетка вышэйшых навучальных устаноў. Сістэма дзяржаўнай вышэйшай адукацыі Беларусі аб'яднала 44 універсітэты, акадэміі. Побач з імі ўзніклі 20 недзяржаўных навучальных устаноў, навучанне ў якіх платнае. Выпрабаванне часам з іх вытрымалі толькі 12, аднак альтэрнатыўнасць формаў ВНУ стала фактам. За дзесяцігоддзе колькасць студэнтаў узрасла з 190 тыс. да 300 тыс. чалавек. У 2001 г. студэнтам стаў кожны другі выпускнік сярэдняй школы. Па колькасці студэнтаў у разліку на 10 000 насельніцтва Беларусь выйшла на сярэднееўрапейскі ўзровень (300 чалавек), што з'яўляецца найбольшым паказчыкам у гісторыі нашай краіны. Пералік спецыяльнасцяў дазваляе амаль поўнасцю задаволіць эканамічныя патрэбнасці рэспублікі ў кадрах. З 1995 г. колькасць аспірантаў павялічылася на 55%.

З мэтамі далейшага павышэння якасці вышэйшай адукацыі ў нашай краіне, неабходнасцю далучэння Беларусі да адукацыйнай прасторы СНД, Еўропы і сусвету, у вышэйшых навучальных установах Рэспублікі Беларусь па ініцыятыве Белдзяржуніверсітэта распачаты пераход да двухступеннай сістэмы падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй.

У Беларусі сфарміравалася нацыянальная сістэма вучэбнага кнігавыдання. Убачылі свет каля 3 тыс. падручнікаў, у тым ліку 1350 – для сярэдніх школ, 760 – для ВНУ, 155 – для тэхнікумаў, 80 – для сістэмы прафтэхадукацыі, 192 вучэбныя дапаможнікі – для

навучання дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. У 1997 г. узноўлена распрацоўка і вытворчасць картаграфічнай прадукцыі для агульнаадукацыйнай школы.

**Навука. У** 90-я гады складаныя працэсы адбываліся ў навуковай сферы. Тэмпы развіцця навуковага патэнцыялу знізіліся. Колькасць супрацоўнікаў, занятых у навуцы, паменшылася з 102,6 тыс. чалавек у 1990 г. да 43,7 тыс. у 1999 г., а фінансаванне з дзяржбюджэту – у 4 разы. Аднак і ў гэтых умовах у структуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі з'явіліся новыя навуковыя ўстановы: Інстытут праблем выкарыс-тання прыродных рэсурсаў і экалогіі, радыебіялогіі, сацыялогіі, малекулярнай і атамнай фізікі, прыкладной оптыкі і тэхналогіі металаў і інш. У 1993 г. Інстытут ядзернай энергетыкі пераўтвораны ў Акадэмічны навукова-тэхнічны комплекс «Сосны», у склад якога ўвайшлі інстытуты праблем энергетыкі, радыяцыйных фізіка-хімічных праблем і радыяэкалагічных праблем.

У сістэме іншых міністэрстваў і ведамстваў утвораны Інстытут радыяцыйнай бяспекі, Беларускі інстытут сістэмнага аналізу і інфармацыйнага забеспячэння навукова-тэхнічнай сферы, Беларускі НДІ дакументазнаўства і архіўнай справы, Інстытут сацыяльна-палітычных даследаванняў пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, НДІ пажарнай бяспекі і праблем надзвычайных сітуацый, шэраг цэнтраў і ўстаноў сельскагаспадарчага і медыцынскага профілю. З 1991 г. дзейнічае Фонд фундаментальных даследаванняў, які фінансава падтрымлівае творчыя калектывы і асобных навукоўцаў у вырашэнні актуальных навуковых праблем. Больш актыўная ў апошнія гады падтрымка з боку дзяржавы фундаментальных даследаванняў дазволіла часткова пераадолець крызіс у навуцы. Назіраецца тэндэнцыя звароту даследчыкаў да навукова-інавацыйных праектаў. Першынство ў гэтым напрамку належыць Беларускаму дзяржаўнаму універсітэту, які сцвердзіў сябе як буйнейшы навуковы і навукова-вытворчы цэнтр краіны.

Роля вядучай навуковай установы нададзена Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, у сценах якой сканцэнтравана каля 70% фундаментальных даследаванняў краіны. У 1993 г. быў прыняты Закон "Аб асновах дзяржаўнай навукова-тэхнічнай палітыкі», які ўсклаў на Акадэмію навук адказнасць за развіццё ў краіне фундаментальных навуковых даследаванняў.

Пашыраны функцыі Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях, удасканалена нарматыўна-прававая база развіцця навукі і тэхнікі, зацверджаны пералік і паслядоўнасць фарміравання і выканання дзяржаўных навукова-тэхнічных праграм. Для

пераадолення старэння прыборнага парка навуковых устаноў, актывізацыі працэсу яго папаўнення сучасным абсталяваннем, Дзяржаўным камітэтам па навуцы і тэхналогіях сумесна з іншымі органамі дзяржаўнага кіравання распрацавана і пачала выконвацца з 1997 г. праграма развіцця матэрыяльна-тэхнічнай базы навукі і арганізацыі цэнтраў калектыўнага карыстання навуковым абсталяваннем. Створана міжведамасная экспертная рада па развіццю навукі з ліку аўтарытэтных вучоных і арганізатараў навукі.

Распрацавана сістэма дзяржаўнай фінансавай падтрымкі навуковых даследаванняў, якія выконваюцца маладымі навукоўцамі. Удасканальваецца сістэма маральных і матэрыяльных стымулаў.

У апошнія гады навуковыя калектывы больш актыўна ажыццяўляюць канцэнтрацыю сіл і сродкаў на прыярытэтных напрамках, распрацоўках і рэалізацыі мерапрыемстваў па развіццю навукова-тэхнічнага прагрэсу. У 1996-2000 гг. на Беларусі распрацоўвалася 48 дзяржаўных праграм фундаментальных даследаванняў, у якіх удзельнічала 141 установа.

Апошняе дзесяцігоддзе азнаменавана далейшай інтэграцыяй беларускай навукі ў міжнародную навуковую супольнасць. У 1993 г. Акадэмія навук Беларусі прынята ў якасці нацыянальнага члена ў Міжнародную раду навуковых саюзаў (BCSU) – няўрадавую арганізацыю для развіцця на-вукі і аховы правоў і свабод вучоных. Рада аб'ядноўвае акадэміі навук 95 краін, 25 міжнародных саюзаў практычна па ўсіх галінах навукі. У 1998 г. падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве паміж ЮНЕСКА і НАН Беларусі, дзе ў якасці прыярытэтаў вызначаны фізіка і матэматыка, інфарматыка, камунікацыя, інжынерныя навукі, аднаўляльныя крыніцы энергіі і новыя тэхналогіі, хімія, геалогія, біялогія і біятэхналогіі, праблемы сацыяльных навук і культурнай спадчыны.

Выконваецца шэраг міждзяржаўных праграм. Пашыраны міжнародныя сувязі вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі. У 1999 г., напрыклад, дзейнічала 27 дагавораў і пагадненняў на міжакадэмічным узроўні, выконваліся 265 праектаў з замежнымі навуковымі ўстановамі.

**Культура. У** 90-я гады скарбніца беларускай культуры папоўнілася значнымі творамі літаратуры, мастацтва. Гучны рэзананс у культурным жыцці атрымала пастаноўка ў 1995 г. балета «Страсці» («Рагнеда») А. Мдывані і В. Елізар'ева. Аўтары пастаноўкі атрымалі Дзяржаўную прэмію Рэспублікі Беларусь (1996) і прэмію Міжнароднай асацыяцыі танца пад эгідай ЮНЕСКА (1996). Рэпертуар Нацыянальнага

акадэмічнага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь узбагацілі оперы «Князь Наваградскі», «Майстар і Маргарыта», «Візіт дамы» і інш.

Да мастацкага асэнсавання рэальных гістарычных падзей былі скіраваны сучасныя пастаноўкі Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы «Князь Вітаўт», «Звонне малітва», «Страсці па Аўдзею», «Саламея» і інш.

Поспеху беларускай драматургіі паспрыяла падтрымка ўрада, асабліва конкурсы на лепшую п'есу для драматычных, лялечных і дзіцячых тэатраў, якія раз у два гады праводзіць Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

Побач з прызнанымі ў свеце творчымі калектывамі акадэмічных тэатраў прафесійным майстэрствам вылучаюцца акцёрскія трупы Маладзёжнага тэатра, Тэатра кінаакцёра, тэатра-лабараторыі «Вольная сцэна», тэатра «Дзея», Альтэрнатыўнага тэатра, Мінскага абласнога драматычнага тэатра ў Маладзечне, тэатра-студыі «Абзац» і інш. Зараз у рэспубліцы дзейнічае 24 тэатры.

Традыцыйным стала правядзенне музычных фестываляў «Музычнае Палессе», «Музы Нясвіжа», Міжнародны фестываль арганнай музыкі ў Полацку, «Мінская вясна», «Беларуская сакавіца», беларускай песні і паэзіі ў Маладзечне і інш. Асаблівай папулярнасцю карыстаецца міжнародны фестываль «Славянскі базар у Віцебску».

У 90-х гг. развіваліся міжнародныя кантакты беларускіх творчых калектываў. Паспяхова гастралявалі ў краінах Еўропы розныя тэатральныя трупы.

У беларускай літаратуры 90-х гадоў прыкметна праявіліся спробы адысці ад празмерна ідэалагізаванага мастацтва і ўзрасла цікавасць да мінулых літаратурных эпох, мадэрнізму і постмадэрнізму. Новае пакаленне літаратараў ахвотна выкарыстоўвае ў сваёй творчасці разнастайныя жанравыя і стылёвыя формы замежнай літаратуры, і не толькі еўрапейскай. Звычайным стаў зварот пісьменнікаў да асэнсавання беларускай гісторыі. У актыўны ўжытак увайшлі паўзабытыя або недаступныя працы В. Ластоўскага, У. Ігнатоўскага, А. Цвікевіча, Я. Карскага, М. Доўнар-Запольскага і інш.

Літаратура вызначылася велізарным попытам на новыя этычныя і эстэтычныя каштоўнасці. Павышанай увагай да сацыяльнага боку рэчаіснасці, імкненнем выкрываць маральныя язвы грамадства вылучаюцца многія творы сучаснай тэматыкі. Адкрыта заяўленая грамадзянская пазіцыя, высокае гуманістычнае гучанне характэрна для шматлікіх твораў І. Шамякіна, В. Быкава, Я. Брыля, П. Панчанкі, І. Пташнікава, А. Разанава, А. Дударава, Я. Янішчыц і інш. Разам з тым, не збыліся пакуль што спадзяванні на

ўзлёт беларускай прозы ў сучасны перыяд. Літаратары не адшукалі яшчэ героя новага часу, а прадстаўнікі камерцыйнай генерацыі, якія прысутнічаюць у большасці твораў, такімі героямі не сталі.

У сучасным выяўленчым мастацтве выразна пашырыліся нефармальныя тэндэнцыі. Адкрыліся недзяржаўныя галерэі «Арт-творчасць», «Віта-нова», «Жыльбел», «Верхні горад» і інш. З'явіліся неафіцыйныя творчыя аб'яднанні. Традыцыйна высокім прафесіяналізмам вызначаецца беларуская школа графікі, у тым ліку работы В. Шаранговіча, А. Кашкурэвіча, М. Купавы, Ю. Герасіменка-Жызнеўскага і інш.

Асаблівы змест набыло мастацтва М. Савіцкага. Ім створаны цыкл карцін «Чорная быль». Сусветнае прызнанне атрымалі творы мастака Я. Батальёнка. Сем грандыёзных выстаў было наладжана мастаком А. Кузьмічом, асноўная тэма творчасці якога – стварэнне галерэі мадоннаў.

Крок наперад зрабіла беларускае кінамастацтва. У 2000 г. падрыхтавана кінастужка рэжысёра М. Пташука «У жніўні сорак чацвёртага...» Цікавыя творы зроблены ў анімацыйным кіно.

У маі 1993 г. быў прыняты Закон Рэспублікі Беларусь «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны». Помнікі культурнай спадчыны сканцэнтраваны ў 138 музеях і іх філіялах – гістарычных, краязнаўчых, гісторыка-археалагічных, літаратурна-мемарыяльных, мастацкіх. Іх фонды папоўніліся асабістымі архівамі шматлікіх вядомых дзеячаў літаратуры і мастацтва. Прадоўжылася рэстаўрацыя гістарычнай забудовы Верхняга горада ў Мінску, Мірскага замка, які на сесіі адпаведнага камітэта ЮНЕСКА быў уключаны ў спіс сусветнага культурнага наследства. Пашыраны рэстаўрацыйныя работы ў Гродне, Нясвіжы, Брэсце і інш.

Апошнім часам адраджаецца і актыўна развіваецца каля 40 відаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, дзейнічае больш 50 клубаў і дамоў рамёстваў, творчых майстэрняў народных майстроў.

Духоўны патэнцыял нацыі ўзбагаціўся шляхам далучэння да яго сіл і творчасці прадстаўнікоў беларускан дыяспары. Яскравы прыклад – дзейнасць лаўрэата Нобелеўскай прэміі Ж. Алфёрава, які падтрымлівае сувязі з навукай і грамадскім жыццём Беларусі.

Сталае месца ў нацыянальнай культуры ў 90-я гг. займаюць высокатэхналагічныя сучасныя сродкі камунікацыі: кабельнае і спадарожнікавае тэлебачанне, вытворчасць аўдыё- і відэа-прадукцыі, якія якасна змянілі рынак тавараў і паслуг культурнага прызначэння. Іх цесная сувязь з галіной электронікі прывяла да пашыранага разумення культурнай сферы. Сфера культуры цяпер нярэдка

разглядаецца не толькі як вытворца і захавальнік культурных каштоўнасцяў, але і як важны сектар эканомікі, які забяспечвае развіццё навукаёмкіх галін.

Такім чынам, час эканамічных і сацыяльна-палітычных перамен у грамадстве быў цесна звязаны з пошукамі і здабыткамі ў галіне адукацыі, навукі і культуры краіны.

## ХРАНАЛОГІЯ

1772 г. – Стварэнне Магілёўскай і Пскоўскай губерняў з уключэннем у іх склад тэрыторыі, далучанай да Расіі пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай.

1776 г. – Стварэнне Полацкай губерні замест Пскоўскай.

1778 г. – Заснаванне С.Г. Зорычам Шклоўскага шляхетнага вучылішча – першай расійскай ваеннай навучальнай установы на тэрыторыі Беларусі.

1788 г. – Загад аб адкрыцці народных вучылішчаў у Полацкай і Віцебскай губернях - пачатак ажыццяўлення на Беларусі адукацыйнага праекта П.В. Завадоўскага 1782 г.

1794 г., 23 чэрвеня – Вызначэнне мяжы яўрэйскай аседласці ў Расійскай імперыі ў межах 15 губерняў.

1793 г. - Заснаванне Мінскай губерні. 1796 г. – Утварэнне Віленскага і Слонімскага намесніцтваў.

1796 г., 12 (23) снежня - Правядзенне Паўлам I адміністрацыйна-тэрытарыяльнай рэформы. Утварэнне Беларускай (з Віцебскай і Магілёўскай) і Літоўскай (з Віленскай і Слонімскай) губерняў.

1796-1797 гг. - Дзейнасць Віленскай асацыяцыі – тайнага антыўрадавага згуртавання.

1796 г. - Маніфест Паўла I аб трохдзённай паншчыне.

1801 г., 9 (21) верасня - Указ аб аднаўленні пяці губерняў (у т. л. дзвюх "беларускіх" і дзвюх "літоўскіх") і аб падпарадкаванні памежных губерняў ваенным губернатарам. Скасаванне Літоўскай і Беларускай губерняў і падзел іх на Віленскую і Гродзенскую, Віцебскую і Магілёўскую губерні.

1802 г., 8 (20) верасня - Заснаванне ў Расіі міністэрстваў.

1802-1804 гг. - Ажыццяўленне ў Расіі адукацыйнай рэформы.

1803 г. – Адкрыццё Віленскага універсітэта і арганізацыя Віленскай навучальнай акругі.

1810 г. – Утварэнне ваенных пасяленняў на Беларусі.

1812-1820 гг. – Дзейнасць у г. Полацку езуіцкай акадэміі.

12 (24) чэрвеня 1812 г. – Нашэсце арміі Напалеона на Расію.

19 чэрвеня (1 ліпеня) 1812 г. – Утварэнне Камісіі Часовага ўрада Вялікага княства Літоўскага – органа адміністрацыйнага кіравання на акупіраванай войскамі Напалеона тэрыторыі заходніх губерняў Расіі.

1812 г., 14-16 (26-28) лістапада – Пераправа французскіх войскаў цераз р. Беразіну ў раёне в. Студзёнка (Барысаўскі р-н). Гібель "вялікай арміі".

1817-1823 гг. – Дзейнасць тайных студэнцкіх таварыстваў у Віленскім універсітэце.

1820 г. – Выгнанне езуітаў з Расійскай імперыі.

1825 г. – Дзейнасць на Беларусі таварыства "Ваенныя сябры" ў Літоўскім асобным корпусе.

1826-1841 гг. – Дзейнасць у г. Віцебску Беларускага вольнага эканамічнага таварыства.

1829-1850 гг. – Дзейнасць Беларускай навучальнай акругі.

1830-1831 гг. – Паўстанне ў Польшчы, на Беларусі, Правабярэжнай Украіне і ў Літве.

1831 г. – Скасаванне Статута Вялікага княства Літоўскага 1588 г. у Віцебскай і Магілёўскай губернях.

1832 г. – Закрыццё Віленскага універсітэта. 1835-1918 гг. Дзейнасць Полацкага кадэцкага корпуса.

1836 г. – Утварэнне Ф. Савічам нелегальнага студэнцкага "Дэмакратычнага таварыства" ў Віленскай медыка-хірургічнай акадэміі.

1838-1917 гг. – Выданне "Губернскнх ведомостей" у губернскіх гарадах Беларусі.

1838-1864 гг. – Жыццё і дзейнасць К. Каліноўскага.

1839 г. – Полацкі царкоўны сабор. Ліквідацыя уніяцкай царквы на Беларусі.

1840 г. – Адкрыццё ў мястэчку Горы-Горкі земляробчай школы (з 1848 г. - Горы-Горацкі земляробчы інстытут; дзейнічаў да 1864 г.).

1840 г. – Скасаванне Статута Вялікага княства Літоўскага 1588 г. у Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губернях.

1840-1850 гг. – Дзейнасць у Мінску тэатра, арганізаванага В.І. Дуніным-Марцінкевічам.

1842-1863 гг. – Дзейнасць Аляксандраўскага (Брэсцкага) кадэцкага корпуса.

1844 г. – Пачатак правядзення на Беларусі інвентарнай рэформы.

1844-1857 гг. – Перавод дзяржаўных сялян на аброчную сістэму.

1846-1849 гг. – Дзейнасць на Беларусі падпольнай арганізацыі "Саюз свабодных братоў".

1852 г., 21 лютага (5 сакавіка) – Пастаноўка ў Мінску трупай В.І. Дуніна-Марцінкевіча першай беларускай оперы "Ідылія" С. Манюшкі і К. Кжыжаноўскага.

1857 г., 20 лістапада (2 снежня) – Рэскрыпт Аляксандра II на імя віленскага генерал-губернатара У.І. Назімава аб стварэнні губернскіх камітэтаў па сялянскаму пытанню.

1861 г., 19 лютага (3 сакавіка) – Адмена прыгоннага права ў Расійскай імперыі.

1862 г. – Пачатак ажыццяўлення ваеннай рэформы. Утварэнне Віленскай ваеннай акругі.

1862 г., чэрвень – 1863 г., май – Выданне К. Каліноўскім газеты "Мужыцкая праўда" – першай нелегальнай рэвалюцыйна-дэмакратычнай беларускай газеты.

1862 г., лета - Стварэнне Літоўскага правінцыяльнага камітэта (ЛПК) у Вільні.

1863 г., студзень – 1864 г. – Паўстанне ў Польшчы, на Беларусі і ў Літве.

1863 г., 1(13) сакавіка – Указ царскага ўрада аб увядзенні абавязковага выкупу сялянскіх надзелаў у Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай, Мінскай губернях і ў інфлянцкіх паветах Віцебскай губерні.

1863 г., 18(30) кастрычніка – Цыркуляр М.М. Мураўёва аб прадастаўленні трохдзесяцiннага сямейнага надзелу сялянам, якія былі абеззямелены ў 1846 - 1856 гг., і аб вяртанні надзелаў сялянам, абеззямеленым пасля 1857 г.

1863 г., 2(14) лістапада – Указ аб увядзенні абавязковага выкупу сялянскіх надзелаў у Магілёўскай губерні і беларускіх паветах Віцебскай губерні.

1864 г., 29 студзеня (10 лютага) – Арышт К. Каліноўскага (пакараны смерцю 10 (22) сакавіка 1864 г.).

1864 г., 5(17) сакавіка – Палажэнне аб ільготах і перавагах пры куплі зямлі ў заходніх губернях асобам рускага паходжання.

1864 г., 10(22) ліпеня – Забарона яўрэям купляць зямлю па-за гарадамі і мястэчкамі заходніх і паўднёва-заходніх губерняў.

1864 г., 14(26) ліпеня – Прынятце "Палажэння аб пачатковых народных вучылішчах" і новага "Статута гімназій і прагімназій". Пачатак школьнай рэформы.

1864 - 1876 гг. – Адкрыццё настаўніцкіх семінарый у Маладзечне, Нясвіжы, Свіслачы і Полацку.

1865 г. – Прынятце новага цэнзурнага статута. Пачатак правядзення цэнзурнай рэформы.

1865 г., 10(22) снежня – Забарона асобам польскага паходжання купляць і арандаваць зямлю ў заходніх і паўднёва-заходніх губернях.

1867 г., 16(28) мая – Палажэнне аб пазямельным упарадкаванні дзяржаўных сялян заходніх губерняў.

1872 г. – Увядзенне міравых судоў. Пачатак ажыццяўлення на Беларусі судовай рэформы.

1873 - 1875 гг. – Узнікненне першых народніцкіх гурткоў у беларускіх гарадах.

1874 г., 1(13) студзеня – Увядзенне ўсеагульнай вайсковай павіннасці.

1875 г., красавік (май) – Рэформа гарадскога кіравання ў заходніх губернях.

1877 г. – Дзейнасць у Мінску гурткоў арганізацыі "Зямля і воля".

1879 - 1882 гг. – Дзейнасць у Мінску гурткоў арганізацыі "Чорны перадзел".

1881 г., 1(13) сакавіка – Забойства нарадавольцамі імператара Аляксандра II.

1882-1889 гг. – Дзейнасць у Мінску гурткоў "Народнай волі".

1882 г. – Забарона яўрэям пражываць па-за межамі гарадоў на тэрыторыі, уключанай у мяжу яўрэйскай аселасці.

1884 г. – Выданне нелегальнага часопіса "Гоман" – органа беларускіх нарадавольцаў.

1884-1889 гг. – Дзейнасць у г. Мінску першых рабочых гурткоў марксісцкага кірунку.

1886 г. – Адкрыццё ў Мінску філіяла Сялянскага пазямельнага банка.

1889 г. – Закон аб земскіх начальніках у Расіі. На Беларусі ўведзены ў 1900 г. у Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай, а ў

1904 г. – у Віленскай і Гродзенскай губернях.

1896 г., май – Утварэнне Рабочага саюза Літвы.

1897 г., верасень – Першы з'езд прадстаўнікоў яўрэйскіх сацыял-дэмакратычных арганізацый у Вільні. Утварэнне Усеагульнага яўрэйскага саюза ў Расіі і Польшчы (Бунда).

1897 г. – Першы Усеагульны перапіс насельніцтва ў Расійскай імперыі.

1898 г., 1-3 (13-15) сакавіка – Першы з'езд сацыял-дэмакратычных арганізацый Расіі ў Мінску. Стварэнне Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі (РСДРП).

1900 г., студзень – З'езд прадстаўнікоў Рабочага саюза Літвы ў Мінску. Аб'яднанне яго з сацыял-дэмакратыяй Каралеўства Польскага (з 1893 г.), утварэнне СДКПіЛ.

1901-1903 гг. – Дзейнасць у Мінску Яўрэйскай незалежнай рабочай партыі (ЯНРП).

Канец 1901 - пачатак 1902 гг. – Утварэнне Партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў (эсэраў).

1902 г., снежань – Утварэнне Беларускай сацыялістычнай грамады (БСГ).

1904 г., студзень-сакавік – Утварэнне Палескага і Паўночна-Заходняга камітэтаў РСДРП.

1905 г., 9(22) студзеня – "Крывавая нядзеля" ў Пецярбургу – пачатак першай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі ў Расіі.

1905 г., 6(19) жніўня – Падпісанне Маніфеста аб увядзенні ў Расіі "законадарадчай Дзяржаўнай думы" (т.зв. "Булыгінская дума").

1905 г., кастрычнік – Усерасійская палітычная стачка.

1905 г. кастрычнік – Утварэнне буржуазнай Канстытуцыйна-дэмакратычнай партыі (кадэтаў).

1905 г., 17(30) кастрычніка – Царскі маніфест аб скліканні заканадаўчай Думы і аб канстытуцыйных свабодах.

1905 г., 18(31) кастрычніка – Курлоўскі расстрэл у Мінску.

1905 г., лістапад – Узнікненне буржуазнай партыі "Саюз 17 кастрычніка" (акцябрысты).

1905 г., 2(15) снежня – Адмена крымінальнага пакарання за ўдзел у эканамічных стачках.

1905 г., снежань – Усерасійская палітычная стачка.

1905 г., 11(24) снежня – Апублікаванне новага выбарчага закона ў 1 Дзяржаўную думу.

1906 г., 4(17) сакавіка – Выданне закона аб легалізацыі прафсаюзаў.

1906 г., 27 красавіка (10 мая) – 8(21) ліпеня - Дзейнасць 1 Дзяржаўнай думы.

1906 г., 18(31) мая – Заснаванне ў Пецярбургу беларускай выдавецкай суполкі "Загляне сонца і ў наша ваконца".

1906 г.„ верасень - 1907 г., студзень – Выданне першай легальнай беларускай газеты "Наша доля".

1906 г., 9(12) лістапада – Указ аб выхадзе сялян з абшчыны (набыў моц закона 14(27) чэрвеня 1910 г.). Пачатак правядзення сталыпінскай аграрнай рэформы.

1906 г., 10(23) лістапада - 1915 г., 7(20) жніўня – Выданне легальнай беларускай газеты "Наша ніва".

1907 г., 20 лютага (5 сакавіка) - 2(15) чэрвеня – Дзейнасць II Дзяржаўнай думы.

1907 г., 3(16) чэрвеня - Роспуск II Дзяржаўнай думы. Пры-няцце новага выбарчага закона.

1907 г., 1(14) лістапада - 1912 г., 9(22) чэрвеня – Дзейнасць III Дзяржаўнай думы.

1910-1913 гг. – Дзейнасць першай беларускай тэатральнай трупы пад кіраўніцтвам І. Буйніцкага (заснавана ў 1907 г.).

1911 г., 14(27) сакавіка – Увядзенне земстваў у Віцебскай Магілёўскай і Мінскай губернях.

1911 г., 29 мая (11 чэрвеня) – Прыняцце палажэння аб землеўпарадкаванні сялян. Устанаўліваўся прымусовы выхад сялян з абшчыны і пераход да спадчыннага падворна-ўчастковага землеўладання.

1911-1916 гг. – Дзейнасць у Вільні Беларускага музычна-драматычнага гуртка (існаваў з 1910 г.).

1912 г., 27 студзеня (9 лютага) – Першая пастаноўка п'есы Я. Купалы "Паўлінка" ў Вільні.

1912 г., 15(28) лістапада – 1917 г., 6(19) кастрычніка – Дзейнасць IV Дзяржаўнай думы.

1914 г., 19 ліпеня (1 жніўня) – Аб'яўленне Германіяй вайны Расіі.

1915 г., жнівень – кастрычнік – Акупацыя войскамі Германіі тэрыторыі Беларусі да лініі Дзвінск - Паставы - Баранавічы - Пінск.

1916 г., сакавік – Наступальная аперацыя расійскіх войскаў у раёне в. Нарач.

1916 г., чэрвень - ліпень – Наступальная аперацыя расійскіх войскаў Заходняга фронту ў раёне Баранавіч.

1917 г., 27 лютага (12 сакавіка) – Перамога Лютаўскай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі ў Расіі; звяржэнне самадзяржаўя.

1917 г., першыя дні сакавіка – Адраджэнне Беларускай сацыялістычнай грамады.

1917 г., сакавік – Утварэнне Мінскага, Гомельскага, Віцебскага і іншых Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў.

1917 г., 25-27 сакавіка (7-9 красавіка) – З'езд беларускіх нацыянальных арганізацый у Мінску. Заснаванне Беларускага нацыянальнага камітэта (БНК).

1917 г.„ чэрвень – Утварэнне Заходняй вобласці (з верасня

1918 г. – Заходняя камуна).

1917 г. чэрвень (ліпень) – Наступальная аперацыя расійскіх войскаў Заходняга фронту.

1917 г., 8-10 (21-23) ліпеня – З'езд беларускіх нацыянальных партый і арганізацый. Стварэнне Цэнтральнай рады беларускіх арганізацый.

1917 г., 15-18 верасня (28 верасня - 1 кастрычніка) – Першая Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РСДРП (б) у Мінску. Утварэнне Паўночна-Заходняга абласнога камітэта РСДРП (б).

1917 г., 15-17 (28-30) кастрычніка – II сесія Цэнтральнай рады беларускіх арганізацый.

1917 г., 25 кастрычніка (7 лістапада) – Узброенае паўстанне ў Петраградзе пад кіраўніцтвам бальшавікоў. Звяржэнне Часовага ўрада.

1917 г., кастрычнік - лістапад – Устанаўленне Савецкай улады на неакупіраванай тэрыторыі Беларусі.

1917 г., 19-20 лістапада (2-3 снежня) – Ліквідацыя Стаўкі Вярхоўнага галоўнакамандуючага (у Магілёве).

1917 г., лістапад – Створаны Беларускі абласны камітэт (БАК) пры Усерасійскім Савеце сялянскіх дэпутатаў.

1917 г., 26 лістапада (9 снежня) – Утварэнне Абласнога выканаўчага камітэта Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў Заходняй вобласці і фронту (Аблвыкамзах) і Савета Народных Камісараў (СНК) Заходняй вобласці і фронту.

1917 г., 2(15) снежня – Падпісанне ў Брэст-Літоўску пагадненння аб перамір'і паміж Савецкай Расіяй і дзяржавамі германскага блока.

1917 г., 14-18 (28-31) снежня – Першы Усебеларускі з'езд (кангрэс) у Мінску. Разгон яго ў ноч на 18 (31) снежня па рашэнню СНК Заходняй вобласці і фронту.

1917 г., 18 (31) снежня – Утварэнне Прэзідыума Рады (Савета) Усебеларускага з'езда.

1917 г., 21 снежня (1918 г., 3 студзеня) – Прэзідыум Рады (Савета) Усебеларускага з'езда абраў Выканаўчы камітэт Рады (Савета) Усебеларускага з'езда.

1918 г., 12(25) студзеня – Пачатак антысавецкага мяцяжу корпуса генерала Доўнар-Мусніцкага на тэрыторыі Усходняй Беларусі.

1918 г., 31 студзеня – Дэкрэт аб стварэнні Беларускага нацыянальнага камісарыята (Белнацкам) пры Народным камісарыяце па справах нацыянальнасцяў РСФСР.

1918 г., 18 лютага – Пачатак наступлення германскіх войскаў і акупацыя цэнтральнай і Усходняй Беларусі.

1918 г., 21 лютага – Прыняцце Выканкамам Рады Усебеларускага з'езда 1-й Устаўной граматы, якой абвясціў сябе часовай уладай на Беларусі і ўтварыў Народны Сакратарыят Беларусі.

1918 г., 21 лютага - 10 снежня – Акупацыя г. Мінска войскамі кайзераўскай Германіі.

1918 г., 3 сакавіка – Заключэнне Брэст-Літоўскага мірнага дагавора (Брэсцкі мір) паміж Савецкай Расіяй і дзяржавамі германскага блока.

1918 г., 9 сакавіка – Прыняцце 2-й Устаўной граматы. Абвешчана ўтварэнне Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР).

1918 г., 18 сакавіка – Перайменаванне Рады Усебеларускага з'езда ў Раду БНР. Прынятыя Статут Рады, зацверджаны 1-я і 2-я Устаўныя граматы.

1918 г., 25 сакавіка – Выданне 3-й Устаўной граматы. Абвяшчэнне незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР).

1918 г., 27 жніўня – Падпісаны дадатковы (да Брэсцкага) савецка-германскі дагавор.

1918 г., 13 лістапада – Дэкрэт УЦВК абануляванні Брэсцкага мірнага дагавора.

1918 г., 21-23 снежня – Канферэнцыя беларускіх секцый РКП(б) у Маскве.

1918 г., 30-31 снежня – VI Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РКП (б) у Смаленску абвясціла сябе 1 з'ездам КП (б) Беларусі. Прыняцце пастановы аб утварэнні ССРБ.

1919 г., 1 студзеня – Стварэнне Часовага рабоча-сялянскага Савецкага ўрада Беларусі на чале з З. Жылуновічам. Апублікаванне Маніфеста Часовага рабоча-сялянскага ўрада Беларусі.

1919 г., 5 студзеня – Пераезд урада ССРБ са Смаленска ў Мінск.

1919 г., 16 студзеня – Рашэнне ЦК РКП (б) аб выхадзе Смаленскай, Віцебскай і Магілёўскай губерняў са складу ССРБ і аб'яднанні Мінскай і Гродзенскай губерняў з Літоўскай ССР.

1919 г., 2-3 лютага – 1 Усебеларускі з'езд Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў. Зацвярджэнне рашэння аб утварэнні ЛітБел. Прыняцце першай Канстытуцыі ССРБ. Выбары Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта (ЦВК) ССРБ.

1919 г., 17-21 лютага – I з'езд Саветаў Літвы. Зацвярджэнне рашэння аб утварэнні ЛітБел.

1919 г., 27 лютага – Аб'яднальнае пасяджэнне ЦВК Літоўскай ССР і ЦВК Беларускай ССР. Выбранне ЦВК і СНК Літоўска-Беларускай ССР.

1919 г., 4-6 сакавіка – З'езд кампартый Літвы і Беларусі. Выбранне сумеснага Цэнтральнага камітэта (ЦК).

1919 г., 24-29 сакавіка – Антысавецкі стракапытаўскі мяцеж у г. Гомелі.

1919 г., 28 красавіка - 17 ліпеня – Дзейнасць у г. Мінску ўрада Літоўска-Беларускай ССР.

1919 г., люты - 1920 г., кастрычнік – Польска-савецкая вайна.

1919 г., 8 жніўня - 1920 г., 11 ліпеня – Акупацыя г. Мінска польскімі войскамі.

1919 г. – Пачатак ажыццяўлення аграрнай рэформы ў Польшчы (Заходняй Беларусі).

1920 г., 11 ліпеня – Вызваленне г. Мінска ад польскіх войскаў у час ліпенькага наступлення войскаў Заходняга фронту.

1920 г., 12 ліпеня – Падпісанне ў Маскве дагавора паміж РСФСР і Літвой. Да Літвы адыходзілі Віленшчына і Гарадзеншчына.

1920 г., 31 ліпеня – Прыняцце "Дэкларацыі аб абвяшчэнні незалежнасці ССРБ".

1920 г., 12 кастрычніка – Падпісанне ў Рызе дагавора аб перамір'і і прэлімінарных умовах міра паміж Польшчай і Савецкай Расіяй.

1920 г., кастрычнік – Захоп генералам Л. Жалігоўскім Віленшчыны. Стварэнне Сярэдняй Літвы.

1920 г., лістапад-снежань – Слуцкае паўстанне.

1920 г., 17 снежня – Закон аб ваенным асадніцтве ў Польшчы (Заходняй Беларусі).

1920 г. – Стварэнне ў Мінску Беларускага дзяржаўнага тэатра (з 1926 г. – БДТ-1).

1921 г., сакавік – Х з'езд РКП (б). Пачатак новай эканамічнай палітыкі.

1921 г., 18 сакавіка – Падпісанне ў Рызе мірнага дагавора паміж РСФСР, УССР і Польшчай, паводле якога Заходняя Беларусь адышла да Польшчы.

1921 г., 11 ліпеня – Адкрыццё Беларускага дзяржаўнага універсітэта (пачаў працаваць з 30 кастрычніка 1921 г.).

1921-1937 гг. – Дзейнасць у Заходняй Беларусі Таварыства беларускай школы (ТБШ).

1922 г., 30 студзеня – Заснаванне ў Мінску Інстытута беларускай культуры (Інбелкульт).

1922 г., 14-18 снежня – IV Усебеларускі з'езд Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў Беларусі. Прынята рашэнне аб добраахвотным уваходжанні БССР у склад Саюза ССР.

1922 г., 30 снежня – I Усесаюзны з'езд Саветаў. Прыняцце Дэкларацыі і Дагавора аб утварэнні Саюза ССР. Выбраны вярхоўны заканадаўчы орган – Цэнтральны Выканаўчы Камітэт (ЦВК) СССР.

1923 г., 17 ліпеня – Закон аб камасацыі сялянскіх гаспадарак у Польшчы (Заходняй Беларусі).

1923 г., кастрычнік - Першая канферэнцыя камуністычных арганізацый Заходняй Беларусі. Стварэнне Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ).

1924 г., 3 сакавіка – Пастанова Прэзідыума УЦВК аб перадачы БССР 15 паветаў Віцебскай, Гомельскай і Смаленскай губерняў. Першае "ўзбуйненне" БССР.

1924 г., 15 ліпеня – Пастанова II сесіі ЦВК БССР "Аб практычных мерапрыемствах па правядзенню нацыянальнай палітыкі". Беларусізацыя была абвешчана дзяржаўнай палітыкай.

1924 г., жнівень – Увядзенне новага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу БССР.

1925 г., чэрвень-ліпень – 1927 г., 21 сакавіка – Дзейнасць у Заходняй Беларусі Беларускай сялянска-работніцкай грамады (БСРГ).

1925 г., 12-16 кастрычніка – Другая Усебеларуская (Берлінская) палітычная канферэнцыя аб'явіла аб роспуску ўрада БНР. Мінск прызнаны адзіным цэнтрам беларускага палітычнага і культурнага руху.

1925 г., 28 снежня – Закон аб ажыццяўленні зямельнай рэформы ў Польшчы (Заходняй Беларусі).

1926 г., 6 снежня – Пастанова Прэзідыума УЦВК аб скасаванні Гомельскай губерні і далучэнні да БССР Гомельскага і Рэчыцкага паветаў. Другое "ўзбуйненне" БССР.

1926 г. – Адкрыццё ў г. Віцебску Другога беларускага дзяржаўнага тэатра (БДТ-2).

1926-1932 гг. – Дзейнасць Беларускага дзяржаўнага вандроўнага тэатра пад кіраўніцтвам У.І. Галубка (існаваў з 1920 г., з 1932 г. – БДТ-3; ліквідаваны ў 1937 г.).

1926 г. – Стварэнне першага беларускага мастацкага фільма "Лясная быль".

1927 г., 5-12 красавіка – VIII з'езд Саветаў БССР. Прыняцце новай Канстытуцыі БССР.

1927 г., снежань - 1930 г., 30 жніўня – Дзейнасць у Заходняй Беларусі рэвалюцыйна-дэмакратычнай арганізацыі "Змаганне".

1928 г., 13 кастрычніка – Пастанова аб рэарганізацыі Інстытута беларускай культуры ў Акадэмію навук (адкрыта 1 студзеня 1929 г.).

Канец 1929-1930 гг. – Першая хваля рэпрэсій у БССР супраць прадстаўнікоў т.зв. нацыянал-дэмакратызму.

1932 г. – Падпісанне пакта аб ненападзе паміж СССР і Польшчай.

1932 г., 2 жніўня – Пастанова СНК БССР "Аб увядзенні на Беларусі ўсеагульнага абавязковага навучання для малапісьменных". 1933 г. – Адкрыццё ў Мінску Беларускага дзяржаўнага тэатра оперы і балета.

1936-1938 гг. – Чарговая хваля рэпрэсій у БССР.

1937 г., 19 лютага – Прыняцце новай Канстытуцыі БССР.

1938 г. – Роспуск Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі.

1939 г., 23 жніўня – Дагавор аб ненападзе паміж СССР і Германіяй. Падпісанне дадатковага сакрэтнага пратакола.

1939 г., 1 верасня – Напад фашысцкай Германіі на Польшчу. Пачатак Другой сусветнай вайны.

1939 г., 14-18 верасня – Абарона Брэсцкай крэпасці польскімі войскамі ад фашысцкіх захопнікаў.

1939 г., 17 верасня – Пераход Чырвонай Арміяй савецка-польскай граніцы.

1939 г., 28 верасня – Дагавор аб дружбе і граніцы паміж СССР і Германіяй. Пераразмеркаванне "сфер уплыву" ў адпаведнасці з новым сакрэтным дадатковым пратаколам.

1939 г., 10 кастрычніка – Перадача Вільні і Віленскай вобласці Літоўскай рэспубліцы на аснове падпісанага савецка-літоўскага дагавора аб узаемадапамозе.

1939 г., 28-30 кастрычніка – Народны (Нацыянальны) сход Заходняй Беларусі ў Беластоку. Прынята Дэкларацыя аб абвяшчэнні Савецкай улады.

1939 г., 2 лістапада – Прынящце нечарговай V сесіяй Вярхоўнага Савета СССР закона аб уключэнні Заходняй Беларусі ў склад СССР і аб уз'яднанні яе з Беларускай ССР.

1941 г., 22 чэрвеня – Вераломны напад гітлераўскай Германіі на СССР.

1941 г., 22 чэрвеня - канец ліпеня – Гераічная абарона Брэсцкай крэпасці.

1941 г., 3-26 ліпеня – Абарона Магілёва.

1942 г., люты – Створана Армія Краёва (АК).

1942 г., 9 верасня – Стварэнне Беларускага штаба партызанскага руху (БШПР).

1943 г., 3 жніўня - верасень – Першы этап "рэйкавай вайны".

1943 г., 19 верасня - пачатак лістапада – Другі этап "рэйкавай вайны" – аперацыя "Канцэрт".

1943 г., верасень-лістапад – Вызваленне ўсходніх раёнаў БССР ад фашысцкіх захопнікаў.

1944 г., 20 чэрвеня - ліпень – Трэці этап "рэйкавай вайны".

1944 г., 23 чэрвеня - 29 жніўня – Беларуская наступальная аперацыя "Баграціён".

1944 г., 27 чэрвеня – Другі Усебеларускі кангрэс, скліканы Беларускай Цэнтральнай Радай у Мінску.

1945 г., красавік – Уключэнне БССР у лік краін-заснавальніц Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (ААН).

1945 г., 8 мая – Капітуляцыя Германіі.

1945 г., чэрвень – Дэлегацыя БССР падпісала Статут ААН (ратыфікаваны 30 жніўня 1945 г.).

1945 г., 16 жніўня – Падпісанне ў Маскве дагавора аб дзяржаўнай граніцы паміж СССР і Польшчай. Перадача Польшчы 17 раёнаў Беластоцкай вобласці і 3 раёнаў Брэсцкай вобласці.

1945 г., 2 верасня – Капітуляцыя Японіі. Канец Другой сусветнай вайны.

1946 г., 11 верасня – Закон "Аб пяцігадовым плане аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі Беларускай ССР на 1946-1950 гг.".

1947 г., снежань – Адмена картачнай сістэмы. Грашовая рэформа ў СССР.

1948 г., снежань – Пачатак суцэльнай калектывізацыі ў Заходняй Беларусі.

1954 г. – Уступленне БССР у Міжнародную арганізацыю працы (АП) і Арганізацыю па пытаннях асветы, навукі і культуры (ЮНЕСКА).

1957-1965 гг. – Дзейнасць Савета народнай гаспадаркі (СНГ) БССР.

1965 г. – Вяртанне ад саўнаргасаў да міністэрстваў.

1965 г. – Прысваенне Брэсцкай крэпасці ганаровага звання "Крэпасць-герой".

1974 г. – Прысваенне Мінску ганаровага звання "Горад-герой".

1978 г., 14 красавіка – Прыняцце новай Канстытуцыі Беларускай ССР.

1986 г., 26 красавіка – Аварыя на Чарнобыльскай АЭС.

1988 г., 30 кастрычніка – Мітынг - рэквіем "Дзяды" ў Мінску.

1989 г., 24-25 чэрвеня – Устаноўчы з'езд Беларускага народнага фронту "Адраджэнне" (Вільнюс). Аднаўленне шматпартыйнай сістэмы.

1990 г., 26 студзеня – Прыняцце закона аб мовах у Беларускай ССР. Беларуская мова юрыдычна абвешчана дзяржаўнай.

1990 г., 4 сакавіка – Выбары ў Вярхоўны Савет БССР і мясцовыя саветы па новаму заканадаўству.

1990 г., 27 ліпеня – Вярхоўны Савет БССР прыняў "Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце БССР".

1991 г., 19-21 жніўня – Спроба дзяржаўнага перавароту ў Маскве.

1991 г., 25 жніўня – Вярхоўны Савет БССР надаў "Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР" статус канстытуцыйнага закона. Прыняты пастановы аб забеспячэнні палітычнай і эканамічнай самастойнасці БССР, аб дэпартызацыі органаў дзяржаўнай улады і кіравання, аб прыпыненні дзейнасці КПБ - КПСС.

1991 г., 19 верасня – Вярхоўны Савет БССР прыняў пастанову аб перайменаванні БССР у Рэспубліку Беларусь і законы аб новых Дзяржаўным сцягу і Дзяржаўным гербе Рэспублікі Беларусь.

1991 г., 8 снежня – Белавежскія пагадненні ад спыненні дзейнасці СССР і стварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД).

1991 г., 10 снежня – Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь ратыфікаваў Белавежскія пагадненні.

1993 г., ліпень – Першы з'езд беларусаў свету.

1994 г., 15 сакавіка – Прыняцце Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь Канстытуцыі (Асноўнага закона) Рэспублікі Беларусь.

1994 г., 10 ліпеня – Выбранне А.Р. Лукашэнкі першым Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

1995 г., 14 мая – Парламенцкія выбары і рэферэндум па пытаннях надання рускай мове роўнага статуса з беларускай, устанаўлення новых Дзяржаўнага сцяга і Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь, эканамічнай інтэграцыі з Расіяй, пашырэння паўнамоцтваў Прэзідэнта.

1996 г., 2 красавіка – Падпісанне ў Маскве паміж Расійскай Федэрацыяй і Рэспублікай Беларусь дагавора аб стварэнні Супольнасці суверэнных рэспублік.

1996 г., 19-20 кастрычніка – Першы Усебеларускі сход.

1996 г., 24 лістапада – Рэферэндум. Прыняцце новай рэдакцыі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

1997 г., 2 красавіка – Падпісанне ў Маскве Дагавора аб Саюзе Беларусі і Расіі (ратыфікаваны 10 чэрвеня 1997 г.).

2001 г., 18 мая – Другі Усебеларускі сход.

2001 г., 9 верасня – Перавыбранне А.Р. Лукашэнкі на другі тэрмін Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

## ЛІТАРАТУРА


Адамушка У. Абвінавачваюць лічбы. Гістарыяграфія і крыніцы па праблеме палітычных рэпрэсій 1920-1950-х гадоў на Беларусі // Бел. мінуўшчына. 1997. № 5.

Адамушка У. Васіль Шаранговіч: "Я – здраднік Радзімы" // Бел. мінуўшчына. 1997. №1. С. 58-60.

Адамушка У.І. Палітычныя рэпрэсіі 20-50-х гадоў на Беларусі. Мн.: Беларусь, 1994. 158 с.

Адраджэнне: Гістарычны альманах. Вып. 1 / Склад. і на-вук. рэд. А.П. Грыцкевіч. Мн.: Універсітэцкае, 1995. 259 с.

Аксамітаў А.С., Малаш Л.А. З душой славяніна: Жыццё і дзейнасць З.Я. Даленгі-Хадакоўскага. Мн.: Полымя, 1991. 151 с.

Андрэева Е.Г. Антон Баліцкі - педагог і стваральнік нацыянальнай школы на Беларусі // Адукацыя і выхаванне. 1996. № 9. С. 13-24.

Андрющенко Н.К. На земле Белоруссии летом 1941 года / Под. ред. Я.С. Павлова. Мн.: Наука и техника, 1985. 235 с.

Андрющенко Н.К. Народное ополчение Белоруссии / Науч. ред. П.П. Липило. Мн.: Наука и техника, 1980. 126 с.

Анішчанка Я. Падмуркі паліцэйскага сацыялізму // Спадчына. 1997. № 3. С. 31-41.

Анішчанка Я.К. Беларусь у часы Кацярыны II (1772-1796) / Пад. рэд. У.А. Сосна. Мн.: Веды, 1998. 220 с.

Антон Луцкевич: материалы следственного дела НКВД БССР / Науч. ред. В.Н. Михнюк; Подгот. к печати, введ. и коммент. В.Н. Михнюка и др. Мн.: БелНИИДАД, 1997. 203 с.

Арлоў У.А. Таямніцы полацкай гісторыі. Мн.: Беларусь, 1994. 463 с.

Архітэктура Беларусі: Энцыкл. даведнік / Рэдкал.: А.А. Воінаў і інш. Мн.: БелЭн, 1993. 620 с.

Асвета і педагагічная думка ў Беларусі: Са старажытных часоў да 1917 г. / М.А. Ткачоў, У.С. Пасэ, Г.Р. Сянькевіч і інш.; Пад рэд. М.А. Лазарука і інш. Мн.: Нар. асвета, 1985. 464 с. (625)

Багдановіч А. Праблемы нацыянальнай дзяржаўнасці: БНР, 1917-18 гг. // Бел. думка. 1996. № 7. С. 77-85.

Барабаш В.В. Поляки в антифашистской борьбе на территории Беларуси (1941-1944 гг.). Гродно: ГрГУ, 1998. 144 с.

Барадач Г.А., Дамарад К.І. Калектывізацыя сельскай гаспадаркі ў заходніх абласцях Беларускай ССР. Мн.: Дзяржвыд. БССР, 1959. 166 с.

Башко П.К. Советы рабочих, солдатских и крестьянских депутатов Белорусии (март - октябрь 1917) / Под ред. И.М. Игнатенко. Мн.: Наука и техника, 1987. 254 с.

Бейлькин Х. Ю. Аграрный кризис конца XIX века и структурная реконструкция сельского хозяйства Беларуси. Мн.: Бел. наука, 2001. 190 с.

Бейлькин Х. Ю. Сельскохозяйственный рынок Белоруссии 1861-1914 гг. / Научн. ред. М.О. Бич. Мн.: Наука и техника, 1989. 288 с.

Бейлькін Х. Некаторыя пытанні развіцця аграрнага капіталізму // Бел. гіст. часопіс. 1996. № 1. С. 71-79.

Беларускія рэлігійныя дзеячы XX ст.: Жыццярысы. Мартыралогія. Успаміны / Аўт.-укл. Ю. Гарбінскі; Навук.-рэд. савет: У. Конан (адк. рэд.) і інш. Паслясл. У. Конана. Мюнхен, Мн.: Бел. кнігазбор, 1999. 734 с.

Беларусь на мяжы тысячагоддзяў / І.М. Абрамаў, Я.М. Бабосаў, А.У. Верашчагіна і інш.; Рэдкал.: А.П. Вайтовіч і інш. Мн.: БелЭн., 2000. 429 с.

Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941-1945. Энцыклапедыя / Рэдкал. І.П. Шамякін (гал. рэд.) і інш. Мн.: БелСЭ, 1990. 679 с.

Белорусско-российские отношения: проблемы и перспективы: Матер. 2-го "круглого стола" белорус. и российск. ученых (Минск, 26-27 января 1999 г.) / Под. ред. В.Е. Снапковского, А.В. Шарапо. Мн.: БГУ, 2000. 166 с.

Белязо А.П. Беларуская вёска ў пасляваенныя гады (1945-1950). Мн.: Выд-ва БДУ, 1974. 175 с.

Бергман А. Слова пра Браніслава Тарашкевіча: Гіст. жыццяпіс / Пер. з польск. Я. Касцюка; Прадм. А. Ліса. Мн.: Маст. літ., 1996. 192 с. (626)

Березкина Н.Ю. Роль печати в распространении научных знаний в Белоруссни, 1861-1917 / Под ред. М.О. Бича. Мн.:Наука и техника, 1990. 112 с.

Бірукова В. Акупацыя ў дакументах // Бел. мінуўшчына. - 1997. № 1. С. 12-16.

Бич М.О. Рабочее движенне в Белоруссин в 1861-1904 гг. / Ред. И.М. Игнатенко. Мн.: Наука и техника, 1983. 280 с.

Бич М.О. Развитие социал-демократического движения в Белоруссии в 1883-1903 гг. Мн.: Наука и техника, 1973. 232 с.

Біч М. "... і думаў аб самастойнасці Літвы" // Бел. мінуўшчына. 1997. № 4. С. 37-41.

Блинова Т.Б. Иезуиты в Белоруссии. Мн. Беларусь, 1990. 110 с.

Болбас М.Ф. Промышленность Белоруссии: 1860-1900. Мн.: изд-во БГУ, 1978. 312 с.

Болбас М.Ф. Развитие промышленности в Белоруссии. (1795-1861 гг.). Мн.: Наука и техника, 1966. 268 с.

Бригадин П.И. Эсеры в Беларуси (конец XIX в. - февраль 1917 г.). Мн.: Згода, 1994. 152 с.

Брыгадзін П., Ладысеў У. "Іменем беларускага народу..." Матэрыялы і дакументы аб дзейнасці Міністэрства беларускіх спраў 1918-1919 // Бел. мінуўшчына. 1997. № 2. С. 26-31.

Брыгадзін П., Ладысеў У. Рада БНР пасля Рыжскага дагавора 1921 г., ці канец нацыянальнага рамантызму // Бел. гіст. часопіс. 1997. № 1. С. 48-59.

Брыгадзін П.І., Мацяс І.Д. Усевалад Ігнатоўскі: Палітычны дзеяч, вучоны. Мн.: Полымя, 1998. 95 с.

Букчин С.В. К мечам рванулись наши руки: Докум. повес-ти / Декабристы в Белоруссии. Для старшего школьного возраста. Мн.: Маст. літ., 1978. 288 с.

Бяспалая М. Эканамічнае развіццё беларускай вескі (20-я гг. XX ст.) // Бел. гіст. часопіс. 1997. №1. С. 35-47.

Бяспалая М.А. Беларуская вёска ў першыя гады нэпа (1921-1923 гг.). Мн.: БУК, 1999. 254 с.

Вабішчэвіч А. Нацыянальная школа ў Заходняй Беларусі (1921-1939 гг.) // Бел. гіст. часопіс. 1994. № 2. С. 38-43.

Вабішчэвіч А. Таварыства беларускай школы: першыя гады існавання // Спадчына. 1996. №5. С. 31-51. (Гл. таксама: Вабішчэвіч А. Таварыства беларускай школы (1921-1936) // Бел. гіст. часопіс. 1997. № 2. С. 86-92).

Васілеўская Н.У. Абвінавачваецца ў нацыянал-дэмакратызме: (Пра наркома асветы Беларусі А.В. Баліцкага) / Пад рэд. У.А. Палуяна. Мн.: Навука і тэхніка, 1995. 64 с.

Васіль Захарка - другі прэзідэнт БНР // Спадчына. 1994. № 1. С. 65-74.

Возвращенные имена. Сотрудники АН Беларусн, пострадавшне в период сталинских репрессий / Под ред. А.С. Махнача; Сост. Н.В. Токарев. Мн.: Наука и техника, 1992. 120 с.

Волацiч М. Лінія Керзона на фоне падзеяў і тэрытарыяльных зьменаў у Ўсходняй Еўропе // Спадчына. 1993. № 5. С. 4-21; № 6. С. 16-33.

Волкогонов Д.А. Семь вождей. Галерея лидеров СССР: В 2 кн. Кн. 1. В. Ленин, И. Сталин, Н. Хрущев. М., 1995. 496 с.; Кн. 2. Л. Брежнев, Ю. Андропов, К. Черненко, М. Горбачев. М., 1995. 479 с.

Восстанне 1863 г. и русско-польские революционные связн 60-х годов. Сб. статей и матерналов / Под ред. В.Д. Королюка и И.С. Миллера. М.: издво АН СССР, 1960. 731 с.

Врублевскнй А.П., Протько Т.С. Из исторнн репрессий про-тнв белорусского крестьянства. 1929-1934 гг. / Под ред. М.П. Костюка. Мн.: Наука и техника, 1992. 142 с.

Гарбачова В.В. Паўстанне 1830-1831 гадоў на Беларусі. Мн.: БДУ, 2001. 186 с.

Гарун А. Сэрцам пачуты звон: Паэзія, проза, драматургія, публіцыстыка / Уклад, прадм. і камент. У. Казберука. Мн.: Маст. літ., 1991. 359 с.

Геніюш Л. Споведзь. Мн.: Маст. літ., 1993. 271 с.

Гісторыя Беларусі: Дапам. для паступаючых у вузы / А.Л. Абецэдарская, П.І. Брыгадзін, Л.А. Жылуновіч і інш.; Пад рэд. Ю.Л. Казакова і інш. Мн.: Экаперспектыва, 1998. 494 с.

Гісторыя Беларусі. Навуч. дапам. / А.Г. Каханоўскі, С.М. Ходзін, А.А. Яноўскі і інш. Мн.: ФУАінфарм, 2001. 264 с.

Гісторыя беларускага мастацтва: У 6 т. / Рэдкал. С.В. Марцалеў (гал. рэд.) і інш. Мн.: Навука і тэхніка. 1980-1994. Т. 3-6.

Гісторыя беларускага тэатра: У 3 т. / Рэдкал. У.І. Няфёд (гал. рэд.) і інш. Мн.: Навука і тэхніка, 1983-1987. Т. 1-3.

Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: У 4 т. / Навук. рэд. У.В. Гніламёдаў, В.А. Каваленка. Мн.: Бел. навука, 1999. Т. 1-2.

Гісторыя Беларускай ССР: У 5 т. / Гал. рэд. калегія: І.М. Ігнаценка (старш.) і інш. Мн.: Навука і тэхніка, 1972-1975. Т. 2-5.

Гісторыя сялянства Беларусі: У 3 т. Т. 1. Гісторыя сялянства Беларусі ад старажытнасці да 1861 г. / Я.К. Анішчанка, Г.Я. Галенчанка, В.Ф. Голубеў і інш.: Пад рэд. В.І. Мялешкі і інш. Мн.: Бел. навука, 1997. 431 с.

Гніламёдаў У.В. Янка Купала: Новы погляд: Дапам. для настаўніка. Мн.: Нар. асвета, 1995. 176 с.

Горизонтов Л.Е. Парадоксы имперской политики: Поляки в России и русские в Польше (XIX - начало XX в.). М.: Индрик, 1999. 272 с.

Государственность Беларуси: Проблемы формированпя в программах политических партий / В.К, Коршук, Р.П. Платонов, И.Ф. Романовскнй, Е.Г. Богданович. Мн.: БГУ, 1999. 188 с.

Грицкевич В.П. От Немана к берегам Тнхого океана. Мн.:Полымя, 1986. 303 с.

Грыцкевіч А. Беларуска-літоўскія дачыненні: 1918-1922 // Спадчына. 1994. № 5. С. 58-63.

Давідовіч А.В. Грамадзянскі і творчы лёс З.Х. Жылуновіча // Веснік БДУ. Сер. 3. 1994. № 2. С. 10-13.

Дакументы па гісторыі Беларусі, якія зберагаюцца ў цэнтральных дзяржаўных архівах СССР / Рэд.-склад. А.М. Міхальчанка, Т.А. Вараб'ёва. Мн.: БелСЭ, 1990. 261 с.

Довнар-Запольский М.В. Народное хозяйство Белоруссии, 1861-1914 гг. Мн.: Изд-во Госплана БССР, 1926. 238 с.

Долготович Б.Д. Беларусь в годы Велнкой Отечественной войны в вопросах и ответах. Мн.: Полымя, 1994. 141 с.

Дорошевнч Э.К. Аниол Довгирд - мыслитель эпохи Просвещения. Мн.: Наука н техннка, 1967. 253 с.

Доўнар-Запольскі М.В. Гісторыя Беларусі / Пер. з рус. Т.М. Бутэвіч і інш.; Прадм. Дз. У. Карава, Я.І. Бараноўскага. Мн.: БелЭн, 1994. 510 с.

Дробов Л.Н. Живопись Белоруссии XIX - начала XX в. / Под ред. А.И. Мальдиса. Мн.: Вышэйш. школа, 1974. 334 с.

Дубянецкі Э.С. Унікальны мэнталітэт беларусаў // Бел. думка. 1994. № 12. С. 6-11.

Дубянецкі Э.С., Дубянецкі С.Ф. Цяжкі шлях адраджэння. Брэст: Лаўроў, 1997. 90 с.

Екабсон Э. Некаторыя аспекты ўзаемаадносін Літвы, Латвіі і Польшчы ў 1919-1920 гг. // Бел. гіст. часопіс. 1993. № 4. С. 77-83.

Елізарава Г., Елізараў С. "Пашыраная Беларусь" // Бел. мінуўшчына. 1996. № 5. С. 7-10.

Ермаловіч В.І. Стварэнне і дзейнасць саюза ўзброенай барацьбы ў Заходняй Беларусі (1939-1941 гг.) // Весці БДПУ. 2001. № 2. С. 125-133.

Ермаловіч В. З гісторыі беларуска-нямецкага грамадскага супрацоўніцтва ў 20-х гадах XX стагоддзя // Беларусіка = Albaruteniса: Кн. 7. Беларуска-нямецкае грамадска-культурнае ўзаемадзеянне: гісторыя, сучасныя перспектывы: 36. арт. Мн.: ННАЦ ім. Ф. Скарыны, 1996. С. 46-52.

Ермолович В.И., Жумарь С.В. Огнем и мечом: Хроника польского националистического подполья в Белоруссии (1939-1953 гг.). Мн.: БелНИИДАД, 1994. 112 с.

Ершова Э.Б. Исторические судьбы интеллигенции Белоруссии (1917-1941). М.: Россия молодая, 1994. 282 с.

Жумарь С.В. Оккупационная периоднческая печать на территории Беларуси в годы Великой Отечественной войны. Мн.: БелНИИДАД, 1996. 283 с.

Жытко А. Веравызнальны склад дваранства Беларусі 1861-1914 гг. // Бел. гіст. часопіс. 1998. № 3. С. 33-39.

З гісторыі палітычных партый: Вучэб. дапам. для студэн-таў / У.К. Коршук (адк. рэд.) і інш. Мн.: БДУ, 1993. 110 с.

З гісторыі уніяцтва ў Беларусі (да 400-годдзя Брэсцкай уніі) / Пад рэд. М.В. Біча, П.А. Лойкі. Мн.: Экаперспектыва, 1996. 134 с.

Забаўскі М.М. Расійская Дзяржаўная дума ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі (1906-1917 гг.). Мн.: БДПУ, 1999. 212 с.

Забаўскі М.М., Пуцік У.С. Прадстаўніцтва ад Беларусі ў Дзяржаўнай думе Расіі (1906-1917 гг.). Мн.: БДПУ, 1998. 157 с.

Заерка А. Турмы Беларусі 1929-1935 гг. // Спадчына. 1997. № 5. С. 167-181; № 6. С. 141-149.

Запартыко Г. Страчаныя скарбы манастырскіх бібліятэк // Спадчына. 1997. № 5. С. 40-53.

Запруднік Я. Гістарычныя і культурныя асновы беларускай нацыянальнай свядомасці // Спадчына. 1992. № 2. С. 87-91.

Зелинский П.М. Политинческая работа КПЗБ в массах, 1928-1938. Мн.: Университетское, 1988. 136 с.

Зубкова Е. Общественная атмосфера после войны (1945-1946) // Свободная мысль. 1992. № 6.

Зырянов П.Н. Петр Столыпин: политический портрет. М.: Высш. школа, 1992. 159 с.

Игнатенко И.М. Октябрьская революция и самоопределение Белоруссии. Мн.: Наука и техника, 1992. 254 с.

Иностранная военная интервенция в Белоруссии, 1917-1920 / И.М. Игнатенко, И.П. Ломако, Е.К. Прыгунова и др.; Отв. ред. И.И. Минц. Мн.: Навука і тэхніка, 1990. 342 с.

Институт истории Академии Наук Беларуси: Краткий очерк / Сост. Г.В. Корзенко и др. Мн.: Навука і тэхніка, 1992. 79 с.

История Беларуси. Учеб.-информ. пособие / Под ред. А.Г. Кохановского и О.А. Яновского. - Мн.: ФУАннформ; Белорнт, 2001. 446 с.

Іваноў М. Праблема прыналежнасці Вільні і беларускае нацыянальнае пытанне ў 1939 г. // Бел. гіст. часопіс. 1994. № 1. С. 32-38.

Ігнаценка І. Кастрычніцкая рэвалюцыя на Беларусі: Асаблівасці і вынікі. Мн.: БелНДЦДААС, 1995. 271 с.

Ількевіч М. Невядомыя факты аб Максіме Гарэцкім // Бел. гіст. часопіс. 1995. № 3. С. 84-89.

Інстытут беларускай культуры / М.П. Касцюк, П.Ц. Петрыкаў, М.У. Токараў і інш. Мн.: Навука і тэхніка, 1993. 255 с.

Іофе Э. Бацька беларусізацыі // Бел. мінуўшчына. 1995. № 2. С. 59-62.

Іофе Э. Колькі ж яўрэяў загінула на беларускай зямлі ў 1941-1945 гг. // Бел. гіст. часопіс. 1997. № 4. С. 49-52.

Каваленя А.А. Прагерманскія саюзы моладзі на Беларусі, 1941-1944: Вытокі. Структура. Дзейнасць. Мн.: БДПУ, 1999. 235 с.

Казбярук У. Загадка Каліноўскага // Бел. мінуўшчына. 1997. № 4. С. 32-36.

Калубовіч А. "Айцы" БССР і іхні лёс // Спадчына. 1990. № 3. С. 24-32; № 4. С. 56-62.

Калубович А. Восемь волн белорусской эмиграции // Неман. 1992. № 2. С. 136-150.

Калубовіч А. Крокі гісторыі: Дасл., арт., успаміны / Біяграф. нарыс і спіс публ. І. Каханоўскай. Беласток: ГаМакс; Вільня: Наша ніва; Мн.: Маст. літ., 1993. 288 с.

Кандыбовіч С.С. Разгром нацыянальнага руху ў Беларусі / Аўт. прадм. В. Скалабан. Мн.: Бел. Гіст. Агляд, 2000. 159 с.

Канфесіі на Беларусі (канец XVIII - XX ст.) / В.В. Грыгор'ева, У.М. Завальнюк, У.І. Навіцкі, А.М. Філатава; Нав. рэд. У.І. Навіцкі. Мн.: Экаперспектыва, 1998. 340 с.

Караў Дз. Пачаткі беларускага крыніцазнаўства // Спадчына. 1994. № 1. С. 4-14; № 5. С. 9-18.

Карбалевіч В. Гарачае лета 1953 года // Бел. мінуўшчына. 1996. № 6. С. 8-10.

Касцюк М.П. Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі. Мн.: Экаперспектыва, 2000. 307 с.

Каханоўскі Г.А. Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI-XIX стст. / Навук. рэд. Л.Д. Побаль. Мн.:Навука і тэхніка, 1984. 120 с.

Каханоўскі Г.А., Каханоўскі А.Г. Руплівец нашай старасветчыны: Яўстах Тышкевіч. Мн.: Навука і тэхніка, 1991. 63 с.

Кернажыцкі К.І. Гаспадарка прыгоннікаў на Беларусі ў канцы XVIII і першай палове XIX ст. (Да праблемы разлажэння феадалізма ў Беларусі). Мн.: БАН, 1935. 273 с.

Кіпель В. Беларусы ў ЗША. Мн.: Беларусь, 1993. 350 с.

Кісялёў Г. Апокрыфы змагання//Бел. мінуўшчына. 1997. №1-3.

Кісялёў Г. Героі і музы: Гіст.-літ. нарысы. Мн.: Маст. літ., 1982. 255 с.

Кісялёў Г. З думай пра Беларусь. Даследаванні і знаходкі з гісторыі бел. літ. і рэвал. руху другой паловы XIX ст. Мн.:Беларусь, 1966. 318 с.

Кісялёў Г. Радаводнае дрэва: Каліноўскі – эпоха – наступнікі. Мн.: Маст. літ., 1994. 303 с.

Кісялёў Г.В. На пераломе дзвюх эпох: Паўстанне 1863 г. на Міншчыне. Мн.: Полымя, 1990. 35 с.

Копцік Ю. "... учредить в белорусском городе Орше высшее учебное заведение" // Бел. мінуўшчына. 1996. № 5. С. 34-36.

Котаў І. Грамадска-культурная дзейнасць кааператыўных арганізацый БССР у 20-я гг.//Бел. гіст. часопіс. 1997. № 4. С. 93-96.

Крук У.П. Сялянскі рух на Беларусі, 1864-1900 гг. / Пад рэд. М.В. Біча. Мн.: Навука і тэхніка, 1993. 175 с.

Круталевич В.А. История Беларуси: становленне национальной державности (1917-1922 гг.). Мн.: Право и экономика, 1999. 385 с.

Круталевич В.А. На путях самоопределення: БНР – БССР – РБ. Мн.: Право и экономика, 1995. 139 с.

Крывічанін Л. Беларусізацыя пад №... / Уклад., падрыхт. тэксту, уступ. арт. Л. Юрэвіча. Нью-Йорк: Бел. ін-т навукі і мастацтва, 1998. 168 с.

Крыжовы шлях: Дапам. для вывучаючых гісторыю Беларусі / Л. Лойка, Т. Лойка, А. Рагалёў і інш. Мн.: Згода, 1993. 240 с. (Гіст. сшыткі; Сш. 1).

Крэчэўскі П. Мандаты БНР // Спадчына. 1993. № 1. С. 2-10.

Кузнецов М.Н., Шелкопляс В.А. История государства и права Беларуси. Мн.: Дикта, 1999. 272 с.

Куль-Сяльвёрстава С.Я. Беларусь на мяжы стагоддзяў і культур: Фарміраванне культуры Новага часу на Беларускіх землях (другая палова XVIII - 1820 гады). Мн.: БДУ, 2000. 260 с.(633)

Культура Беларусі: спадчына і сучаснасць: Тэз. дакл. на навук. канф. (18-19 крас. 1997 г.) / Рэдкал. Я.Д. Грыгаровіч (адк. рэд.) і інш. Мн.: БУК, 1997. 162 с.

Культура беларускага замежжа. Зборнік / Пад рэд. А. Сабалеўскага. Мн.: Навука і тэхніка; Бел. навука. Кн. 1. 1993. 192 с.; Кн. 2. 1994. 199 с.; Кн. 3. 1998. 192 с.

Культурна-нацыянальныя працэсы на Беларусі ў другой палове XIX - пачатку XX ст.: Зб. навук. прац / Пад агульн. рэд. М. Забаўскага, І. Канапацкага. Мн.: БДПУ, 1998. 188 с.

Кушнер В. Цяжкія шляхі адраджэння дзяржаўнасці // Бел. гіст. часопіс. 1993. № 3. С. 3-6.

Кушнер В., Паўлаў Я. Вызваленне Беларусі: на шляху да Вялікай Перамогі // Бел. гіст. часопіс. 1994. № 2. С. 3-12.

Ладысев В.Ф. В борьбе за демократическне права и свободы: (из исторического опыта Компартии Западной Белоруссии, 1926-1938 гг.). Мн.: Беларусь, 1988. 191 с.

Ладысеў У. І.К. Лагіновіч: Нарысы жыцця і палітычнай дзейнасці // Бел. гіст. часопіс. 1996. № 3. С. 149 159; № 4. С. 164-175.

Ладысеў У. Цяжкі шлях выпрабаванняў // Бел. гіст. часопіс. 1994. № 1. С. 181-188.

Ладысеў У.Ф., Брыгадзін П.І. На пераломе эпох: Станаўленне беларускай дзяржаўнасці (1917-1920 гг.). Мн.: БДУ, 1999. 128 с.

Лазько Р. Праблемы заключэння польска-савецкага саюзу ў 1938-1939 гг. // Бел. гіст. часопіс. 1997. № 4. С. 42-48.

Лазько Р., Мурашка М. На скрыжаванні вялікай палітыкі: аб вяртанні Гомельшчыны ў склад БССР // Бел. гіст. часопіс. 1996. № 1. С. 21-30.

Лемяшонак У.І. Вызваленне - без грыфа "сакрэтна!" Мн.:Полымя, 1996. 151 с.

Липинский Л.П. Классовая борьба в белорусской деревне, 1907-1914. Мн.: йзд-во БГУ, 1981. 176 с.

Липинский Л.П. Крестьянское двнжение в Белоруссии в 1914-1917 гг. Мн.: Изд-во БГУ, 1975. 184 с.

Липинский Л.П. Лукьянов Е.П. Крестьянское н солдатское двнженне в Белоруссии (1900-1907 гг.). Мн.: Наука и техника, 1968. 195 с.(634)

Липинский Л.П. Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии (II половнна XIX в.). Мн.: Наука н техннка, 1971. 254 с.

Липинский Л.П. Столыпинская аграрная реформа в Белоруссии. Мн.: Изд-во БГУ, 1978. 223 с.

Ліс Я. Палітыка Напалеона на Беларусі // Спадчына. 1996. № 5. С. 117-122.

Литвин А. Белорусская Краевая Оборона: К вопросу о созданнн белорусского национального войска в годы второй мнровой войны // Неман. 1994. № 4. С. 170-191.

Литвин А.М. "Белые пятна" второй мнровой: Польско-немецкие контакты на террнторнн Беларуси и Виленщины в отражении немецких документов // Неман. 1995. № 2. С. 125-137.

Лнтвнненок Р. Польское общественно-политическое днвжение в Беларуси и Лнтве и белорусский вопрос. Конец XIX -начало XX вв. // Гісторыя: праблемы выкладання. 1999. № 2.

Літвін А.М. Акупацыя Беларусі (1941-1944): Пытанні супраціву і калабарацыі. Мн.: Бел. кнігазбор, 2000. 288 с.

Літвін А.М. Армія Краёва на Беларусі // Бел. гіст. часопіс. 1994. № 1. С. 65-73; № 4. С. 65-69.

Літвінскі А. У плыні сцюдзёнай Бярэзіны // Бел. мінуўшчына. 1993. № 5-6. С. 435.

Луговцова С.Л. Политика российского самодержавия по отношению к дворянству Белоруссии в конце XVIII - первой половине XIX вв. Мн.: БГПУ, 1997. 78 с.

Лукашевич А.М. Развнтне сетнвоенно-учебных заведеннй на территории Беларусн в 30-40-х гг. XIX в. // Веснік БДУ. Сер. 3. 1999. № 1. С. 9-14.

Лыч Л. Вытокі беларускай нацыянальнай ідэі // Бел. гіст. часопіс. 1998. № 3. С. 11-19.

Лыч Л., Навіцкі У. Гісторыя культуры Беларусі. Мн.: Экаперспертыва, 1996. 453 с.

Лыч Л.М. Беларуская нацыя і мова: Літ.-гіст. арт. Мн.:Маст. літ., 1994. 277 с.

Люты А.М., Туміловіч Т.М. Дваранства Беларусі ў перыяд разлажэння і крызісу феадалізму (канец XVIII - першая палова XIX ст.); Вучэб.-метад. дапам. Мн.: БДПУ, 1991. 21 с.

Лютый А.М. Социально-экономическое развитие городов Белоруссии в конце XVIII - первой половнне XIX века / Под ред. В.В. Чепко. Мн.: Наука и техника, 1987. 181 с.

Макушнікаў А. Стары Гомель // Спадчына. 1997. № 2. С. 173-191.

Мальдзіс А. Падарожжа ў XIX стагоддзе. З гісторыі беларускай літаратуры, мастацтва і культуры. Навук.-папул. нарысы. Мн., 1969. 208 с.

Марозава С. Лёс культурнай спадчыны уніяцкай царквы ў Беларусі // Спадчына. 1996. № 6. С. 100-118.

Марозава С.В. Уніяцкая царква ў культурна-гістарычным развіцці Беларусі (1596-1839): Навуч. дапам. па аднайменнаму спецкурсу для студэнтаў спец. Г.0501 - "Гісторыя" з дадатковай спец. "Культуралогія" / Гродна: ГрГУ, 1996. 110 с.

Марчанка І. Гарады Беларусі: аднаўленне і развіцце // Бел. гіст. часопіс. 1994. № 3. С. 15-22.

Мезга М. Мяжа канфрантацыі // Бел. мінуўшчына. 1996. № 2. С. 29-31.

Мікуліч Т.М. Мова і этнічная самасвядомасць. Мн.: Навука і тэхніка, 1996. 159 с.

Мілеўскі Я.Е. Адносіны польскіх войск да насельніцтва Беларусі (1919-1920 гг.) // Бел. гіст. часопіс. 1996. № 4. С. 32-43.

Мілеўскі Я.Е. Заходняя Беларусь: да пытання тэрыторыі і насельніцтва // Бел. гіст. часопіс. 1998. № 3. С. 40-42.

МірановічЯ. Навейшая гісторыя Беларусі. Беласток,1999. 270с.

Митчем С. Фельдмаршалы Гитлера и их битвы / Пер. с англ. Н. Соколова, А. Бушуева, Т. Бушуевой, С. Минкина. Смоленск: Русич, 1998. 576 с.

Михальченко С.М. М.В. Довнар-Запольскнй: историк и общественный деятель // Вопросы истории. 1993. № 6. С. 162-170.

Мнхнюк В.Н. Социалистические преобразования в западных областях БССР (сентябрь 1939 - нюнь 1941 гг.). Историограф. очерк. Мн.: Наука и техника, 1979. 62 с.

Михнюк В.Н. Становление и развитие исторической науки Советской Белоруссии (1919-1941 гг.) / Под ред. П.Т. Петрикова. Мн.: Наука н техника, 1985. 286 с.

Михнюк В.Н., Петриков П.Т. Историческая наука БССР, 80-е гг. Мн.: Наука и техника, 1987. 120 с.

Михутина Н.В. Польско-советская война 1919-1920 гг. / Отв. ред. Ю.С. Новопашин. М.: ИСБ РАН, 1994. 323 с.

Міхнюк У. Справа Вацлава Ластоўскага //Маладосць.1993. № 8-9.

Міхнюк У., Паўлаў Я. Канстанцін Езавітаў: матэрыялы да біяграфіі // Маладосць. 1995. № 1. С. 215-219.

Міхнюк У.М. Арыштаваць у высылцы: Дак. нарыс пра А. Дудара. Мн.: БелНДІДАС, 1996. 149 с.

Міхнюк У.М. Захоўваць вечна: справа № 20951-с // Маладосць. 1992. № 6.

Міцкевіч В. Якуб Колас у Семкаве // Бел. мінуўшчына. 1997. № 5. С. 13-17.

Міцкевіч В. Якуб Колас: Жыццёвы шлях і творчасць // Маладосць. 1992. № 11.

Мохнач Н.Н. Идейная борьба в Белоруссии в 30-40-е годы XIX в. Мн.: Наука и техника, 1971. 157 с.

Мохнач Н.Н. Общественно-политическая и эстетическая мысль Белоруссии начала XIX в. / Под ред. А.С. Майхровича. Мн.: Наука и техника, 1985. 94 с.

Мохнач Н.Н. От просвещения к революционному демократизму. (Обществ.-политическая н философская мысль Белоруссии конца 10 - начала 50-х годов XIX в.) Мн.: Наука и техника, 1976. 184 с.

Мысліцелі і асветнікі Беларусі: Энцыкл. давед. Мн.: БелЭн, 1995. 672 с.

Мядзведзеў Р. М.С. Хрушчоў: Палітычны партрэт / Пер. з рус. мовы А.М. Лукашука. Мн.: Беларусь, 1989. 240 с.

Мяснікоў А. "Жывіце без мяне..." // Полымя. 1992. № 1.

Мяснікоў А.Ф. Нацдэмы: Лёс і трагедыя Ф. Шантыра, У. Ігнатоўскага і Я. Лёсіка. Мн.: Беларусь, 1993. 110 с.

На суд гісторыі: Успаміны, дыялогі / Укл., прадм. і звесткі пра аўтараў Б.І. Сачанкі. Мн.: Маст. літ., 1994. 303 с.

Навуменка І.Я. Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч. Мн.: Наука и техннка, 1992. 216 с.

Назаўсёды разам: Да 60-годдзя ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР / Укл. У.І. Навіцкі; Пад агул. рэд. М.П. Касцюка, І.Я. Навуменкі. Мн.: БелЭн, 1999. 253 с.

Наленч Д. н Наленч Т. Юзеф Пилсудский. Легенды и факты:

Сокр. пер. с польск. М.: Полнтнздат, 1990. 339 с.

Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. / Рэд. М.П. Касцюк і інш. Мн.: Беларусь, 1994-1995. Ч. 1-2.

Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі / Пад рэд. С.А. Умрэйкі. Мн.: Нар. асвета, 1986. 624 с.

Насытка Я. "Тыя ж беларусы...": Этнічныя межы беларусаў у XIX - пачатку XX ст. // Бел. мінуўшчына. 1994. № 4. С. 11-15.

Нацыянальная палітыка расійскага самадзяржаўя на Беларусі ў канцы XVIII - пачатку XIX стагоддзяў: Зб. навук. прац / Пад агул. рэд. А.М. Лютага. Мн.: БДПУ, 1995. 233 с.

Нут М. Калабарацыянізм // Спадчына. 1996. № 4. С. 210-218.

Павлов Я.С. "Болевые точкн" истории Беларуси: (Из научного наследия). Мн.: Арги-Фекс, 1997. 251 с.

Павлов Я.С. В суровом сорок первом. Мн. Беларусь,1985. 272 с.

Павлов Я.С. Советско-германскне договоры 1939-1941 годов: Трагедия тайных сделок. Мн.: БелНММДАД, 1996. 99 с.

Палітычныя партыі Беларусі: Дапам. для вывучаючых гісторыю Беларусі / П.І. Брыгадзін, М.С. Сташкевіч, У.Ф. Ладысеў і інш. Мн.: Згода, 1994. 262 с. (Гіст. сшыткі; Сш. 2).

Палітычныя рэпрэсіі на Беларусі ў XX стагоддзі: Матэр. навук.-практ. канф. (Мінск, 27-28 лют. 1998 г.) / Склад. і навук рэд. Н.І. Стужынская. Мн., 1998. 78 с.

Палуян У.А. Беларуская сялянска-рабочая грамада. Мн.:Навука і тэхніка, 1967. 223 с.

Пануцэвіч В. Кс. Вінцэсь Гадлеўскі – дзяржаўны муж і правадыр народу // Спадчына. 1993. № 3. С. 51-71; № 5. С. 81-94; № 6. С. 69-85.

Панцов А.В. Брестский мир // Вопросы нсторнн. 1990. № 2. С. 60-79.

Панютнч В.П. йз нсторнн формнровання пролетарната Белоруссии. 1861-1914 гг. Мн.: Наука н техннка, 1969. 190 с.(638)

Панютич В.П. Наемный труд в сельском хозяйстве Беларуси, 1861-1914 гг. / Под ред. П.Т. Петрикова. Мн.: Навука і тэхніка, 1996. 142 с.

Панютнч В.П. Социально-экономнческое развнтне белорусской деревнн в 1861- 1900 гг. / Науч. ред. П.Г. Козловскнй. Мн.: Навука і тэхніка, 1990. 374 с.

Панюціч В. Рэформы дзяржаўных сялян Беларусі (канец 50-х - 70-я гг. XIX ст.) // Бел. гіст. часопіс. 1996. № 3. С. 23-32.

Парсаданова В.С. Депортация населення из Западной Украины н Западной Белоруссии в 1939-1941 гг. // Новая и новейшая история. 1989. № 2. С. 26-44.

Патрыярх Ціхан і БНР // Спадчына. 1997. № 2. С. 101-118.

Першы Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь // Бел. гіст. часопіс. 1994. № 3. С. 3-5.

Пилсудский против Тухачевского. Два взгляда на советско-польскую войну 1920 г. М.: Воениздат, 1992. 253 с.

Платонаў Р. Лёсы: Гісторыка-дакументальныя нарысы аб людзях і малавядомых падзеях духоўнага жыцця ў Беларусі 20-30-х гг. Мн.: БелНДІДАС, 1998. 326 с.

Платонаў Р. Палітыкі. Ідэі. Лёсы: Грамадзянскія пазіцыі ва ўмовах нарастання ідэолага-палітычнага дыктату ў Беларусі 20-30-х гг. Мн.: БелНДІДАС, 1996. 382 с.

Платонаў Р., Сташкевіч М. Дзве аперацыі супраць "ворагаў народа" // Бел. гіст. часопіс. 1993. № 1. С. 73-80.

Платонаў Р.П. На крутым павароце: Ідэолага-палітычная барацьба на Беларугі ў 1929-1931 гг. Мн.: БелНИИДАД, 1999.

Платонов Р., Сташкевнч Н. Тернистый путь к свободе // Неман. 1992. № 10. С. 129-155; № 11. С. 131-161.

Платонов Р., Сташкевнч Н., Гесь А. Так начнналась национальная трагедня // Неман. 1992. № 9.

Платонов Р.П. Белоруссня, 1941-й: известный и неизвестный. По док. Национального архива Республики Беларусь. Мн.: БелНИИДАД, 2000. 208 с.

Полуян В.А. Революционно-демократнческое двнженне в Западной Белоруссии (1927-1939 гг.). Мн.: Наука н техннка, 1978. 359 с.(639)

Полуян В.А., Полуян И.В. Революционное и национально-освободительное двнжение в Западной Белоруссии в 1920-1939 гг. Мн.: Госиздат БССР, 1962. 222 с.

Полуян И.В. Западная Белоруссия в пернод экономического кризиса, 1929-1933 гг. / Под ред. М.П. Костюка. Мн.:Навука і тэхніка, 1991. 207 с.

Пономаренко П.К. Всенародная борьба в тылу немецко-фашистских захватчиков 1941-1944 / Отв. ред. А.М. Самсонов. М.: Наука, 1986. 440 с.

Праблемы ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР: Гісторыя і сучаснасць: Матэрыялы Міжнар. навук.-тэарэт. канф., 17-18 верас. 1999 г., Мінск / Адк. рэд. П.І. Брыгадзін, У.Ф. Ладысеў. Мн.: БДУ, 2000. 333 с.

Правда истории: память и боль / Сост. Н.М. Жилинский. Мн.: Беларусь, 1991. 432 с.

Прамысловасць дарэвалюцыйнай Беларусі / Аўт.-склад. М.Ф. Болбас. Мн.: БСЭ ім. П. Броўкі, 1988. 321 с. (Энцыкл. б-ка "Беларусь").

Пранчак Л.І. Беларуская Амерыка. Мн.: Полымя, 1994. 415 с.

Процька Т. "Ачыстка" заходніх рубяжоў БССР ад "класава-варожых элементаў" на пачатку 30-х гг. // Бел. гіст. часопіс. 1996. № 2. С. 72-81.

Прэзідэнты Рады Беларускае Народнае Рэспублікі // Спадчына. 1997. № 4. С. 3-14.

Пурышава Н. Дзяржаўная літаратурная палітыка ў БССР у 20-я гг. // Бел. гіст. часопіс. 1998. № 3. С. 97-103.

Пугем борьбы и труда: По матерналам науч. конф., посвящ. 70-летию образования БССР и Компартии Белоруссии / Сост. И.С. Карпенко и др.; Редкол. Р. Платонов и др. Мн. Беларусь, 1989. 238 с.

Ракашэвіч У. Пашырэнне тэрыторыі Беларусі. (Да пытання аб далучэнні Гомельскай губерні да БССР) // Палессе. 1996. № 1.

Раманоўскі І. Сучасныя палітычныя партыі на Беларусі // Бел. гіст. часопіс. 1998. № 1. С. 31-36.

Революционный путь Компартии Западной Белоруссии (1921-1939 гг.) / Под ред. А.Н. Мацко н В.Е. Самутина. Мн.:Беларусь,

1966. 403 с.(640) Рудовіч С. Утварэнне каардынацыйнага цэнтра беларускага нацыянальнага руху ў Менску (сакавік 1917) // Спадчына. 1996. № 3. С. 16-33.

Рудовіч С. Час выбару: Праблема самавызначэння Беларусі ў 1917 г. Мн.: Тэхналогія, 2001. 201 с.

Рудовіч С.С. Пошукі шляхоў да беларускай дзяржаўнасці (1917 г.) // Бел. гіст. часопіс. 1995. № 4. С. 30-48.

Русский консерватизм XIX столетия: Идеология и практика / В.Я. Гросул, Б.С. Итенберг, В.А. Твардовская и др.; Под ред. В.Я. Гросула. М.: Прогресс-Традиция, 2000. 440 с.

Русско-польскне революционные связи 60-х годов и восстание 1863 года. Сб. статей и материалов / Под ред. В.А. Дьякова, В.Д. Королюка и И.С. Миллера. М.: Изд-во АН СССР, 1962. 610 с.

Савицкий Э.М. Революционное движение в Белоруссии (август 1914 - февраль 1917 гг.) / Науч. ред. К.И. Шабуня. Мн.: Наука и техника, 1981. 182 с.

Сакалова М. Кансерватызм на Беларусі ў XIX ст. // Бел. гіст. часопіс. 1997. № 1. С. 22-34.

Самбук С.М. Политика царизма в Белоруссии во второй половине XIX в. / Под ред. В.П. Панютича. Мн.: Наука н техннка, 1980. 223 с.

Самбук С.М. Революционные народники Белоруссии (70-е - начало 80-х гг. XIX в.). Мн.: Наука н техника, 1972. 247 с.

Сарокін А.М. На ростанях айчыннай гісторыі: Беларуская вёска: Ад Дэкрэта да Кодэкса аб зямлі (1917-1990-я гг.). Мн., 1999. 301 с.

Сачанка Б.І. Беларуская эміграцыя. 2-е выд., дап. і папр. Мн., 1991. 111 с.

Сервачынскі І. Аграрная палітыка нацыстаў на Беларусі (1941-1944 гг.) // Бел. гіст. часопіс. 1996. № 4. С. 44-56.

Сидоревич А. Антон Луцкевич: Главы из кннги // Неман. 1990. № 7. С. 91-167.

Сідарэвіч А. Самавызначэнне беларускай нацыянал-дэмакратыі // Бел. гіст. часопіс. 1998. № 2. С. 24—32.

Скаруліс С. "Лістападаўская справа" і Якуб Колас // Полымя. 1992. № 11.(641)

Скрабіна Л. "... і верная дружба з Германіяй" // Бел. мінуўшчына. 1996. № 3. С. 57-59.

Славутыя імёны Бацькаўшчыны: Зборнік / Уклад. У. Гілепа і інш.; Рэдкал.: А.П. Грыцкевіч (гал. рэд.) і інш. Мн.: Бел. фонд культуры, 2000. Вып. 1. 383 с.

Слобожанин В.П. Земское самоуправление в Беларуси (1905-1917 гг.) / Ин-т философии и права АН Беларуси. Мн 1994. 85 с.

Смалянчук А. "Беларуская карта" ў дзейнасці царскай адміністрацыі (другая палова XIX - пачатак XX стст.) // Спадчына. 1996. № 4. С. 53-66.

Смалянчук А. Раман Скірмунт: шлях да Беларусі // Спадчына. 1994. № 6. С. 6-10.

Смалянчук А.Ф. Палякі Беларусі і Літвы ў рэвалюцыі 1905-1907 гг. Гродна: Гродз. абл. грамад. аб'яднанне "Ратуша", 2000 202с.

Смирнов А.Ф. Из истории освободительного движения в Белоруссии и Литве в 1840-1860-е годы // Из нстории рабочего класса и революционного движения. М.: Госполитиздат, 1958. С. 240-253.

Смяховіч М. Арганізацыя і асобы: паўстанне 1830-1831 гг. на Беларусі // Полымя. 1996. № 4. С. 218-234.

Смяховіч М. Нацыянальная ідэя беларусаў у XX ст. (гістарыяграфічны аналіз праблемы) // Бел. гіст. часопіс. 1998. № 3. 20-25.

Смяховіч М. Узаемаадносіны самадзяржаўя з каталіцкай царквой на Беларусі (1772-1867 гг.) // Бел. гіст. часопіс. 1995. № 1. С. 45-50.

Снапковский В.Е. Белорусская ССР в ООН (1945-1985 гг.) / Науч. ред. С.Д. Войтович. Мн.: Наука и техника, 1985. 104 с.

Снапковский В.Е. Путь Беларуси в ООН. 1944-1945 гг. / Под ред. А.С. Протопопова. Мн.: Навука і тэхніка, 1994. 141 с.

Снапкоўская С.В. Адукацыйная палітыка і школа на Бел-русі ў канцы XIX - пачатку XX стст. Мн.: НІА, 1998. 191 с.

Снапкоўскі У. Міжнародныя аспекты вызначэння савецка-польскай мяжы ў 1943-1945 гг.//Бел. гіст. часопіс. 1994. №3 С 9-14.

Снапкоўскі У.Е. Знешнепалітычная дзейнасць Беларусі 1944-1953 гг. / Пад рэд. Ю.П. Броўкі. Мн.: Бел. навука, 1997. 207 с.

Содружество Независимых Государств: портрет на фоне перемен / Авт.-сост. А. Белько и др., отв. ред. И.М. Коротченя. Мн.: Панграф, 1996. 366 с.

Соловьев А.К. Белорусская Центральная Рада: создание, деятельность, крах. Мн.: Навука і тэхніка, 1995. 176 с.

Сорокин А.Н. Эксперимент: человек и земля / Под ред. Л.М. Лыча. Мн.: Навука і тэхніка, 1994. 96 с.

Сосна У. "...с благочестивым свирепством всекал униат в православие" // Бел. мінуўшчына. 1996. № 4. С. 8-11.

Сосна У. Дзяржаўныя сяляне на Беларусі ў канцы XVIII-першай трэці XIX ст. // Бел. гіст. часопіс. 1996. № 2. С. 58-71.

Сосна У. Секвестр // Бел. мінуўшчына. 1996. № 2. С. 26-28.

Сосна У. Царскія падараванні сялян на Беларусі і іх сацыяльна-палітычныя наступствы // Бел. гіст. часопіс. 1999. № 2. С. 14-18.

Сосна У.А. Фарміраванне саслоўна-групавога складу сялянства Беларусі ў канцы XVIII - першай палове XIX ст. Мн. БДУ, 2000 115 с.

Станкевіч С. Янка Купала // Спадчына. 1998. № 3. С. 139-171.

Старонкі гісторыі савецкага грамадства: Факты, праблемы, людзі / Склад. Г.В. Клокава і інш.; Пад агул. рэд. А.Ц. Кінкулькіна. Мн.: Нар. асвета, 1990. 543 с.

Старцаў В. Расійская імперыя пачатку XX ст.: праблемы вывучэння // Бел. гіст. часопіс. 1994. № 2. С. 52-59.

Сташкевич Н.С. Приговор революции: Крушение антисоветского движения в Белоруссии, 1917-1925. Мн.: Университетское, 1985. 303 с.

Сташкевіч М. Перадумовы і працэс стварэння палітычных партый на Беларусі (канец XIX ст. - люты 1917 г.) // Бел. гіст. часопіс. 1999. № 3-4.

Страницы истории Компартии Белоруссии: суждения, аргументы, факты / Сост. Ю.П. Смирнов, Н.С. Сташкевич; Под ред. Р.П. Платонова. Мн.: Университетское, 1990. 446 с.

Суворов В. Ледокол. День "М". М.: АСТ, 1995. 576 с.

Сыны і пасынкі Беларусі / Уклад. С.В. Барыс. Мн.: Полымя, 1996. 416 с.

Сямашка Я. Армія Краёва на Беларусі. Мн.: Бел. выд. т-ва "Хата", 1994. 269 с.

Сяменчык М.Я. Грамадска-палітычнае жыццё на Беларусі ў перыяд Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый (сакавік 1917 - сакавік 1918 гг.). Мн.: БДПУ, 2001. Ч. 1. Грамадска-палітычнае жыццё ва ўмовах дэмакратычнага рэжыму. 199 с.;Ч. 2. Грамадска-палітычнае жыццё ва ўмовах складвання таталітарнага рэжыму. 158 с.

Сяргеева Г. Беларуская дыяспара і дзяржаўная палітыка: набыткі і праблемы // Бел. гіст. часопіс. 1993. № 2. С. 72-78.

Талкачоў В. Цяжкі студзень 1919 г. Да пытання аб стварэнні Літоўска-Беларускай ССР // Бел. думка. 1994. № 1. С. 67-69.

Таляронак С. Грамадска-палітычны рух на Беларусі (канец XVIII-30-я гг. XIX ст.). Зб. навук. арт. Мн.: ІСПД, 1998. 59 с.

Тарасаў К. Памяць пра легенды: Постаці беларускай мінуўшчыны. 2 выд., дап. Мн.: Полымя, 1994. 270 с.

Тимохович И.В. Битва за Белоруссию, 1941-1944. Мн.:Беларусь, 1994. 254 с.

Троицкий Н.А. 1812 Великий год России. М. Мысль, 1988 348с.

Туронак Ю. Беларускае пытанне ў палітыцы лонданскага лагеру (1941-1944) // Спадчына. 1997. № 3. С. 104-133.

Туронак Ю. Беларусь пад нямецкай акупацыяй /Пер. з польск. В. Ждановіч; Камент. А.М. Літвіна. Мн.: Беларусь, 1993. 236с.

Турук Ф. Белорусское движение: Очерк истории национального и революционного движения белорусов / Предисл. А. Кавки. Мн. Б.в., 1994. 144 с.

Улащик Н.Н. Грамотность в дореволюционной Белоруссии // История СССР. 1968. № 1. С. 110-112.

Улашик Н.Н. Предпосылки крестьянской реформы 1861 г. в Литве и Западной Белоруссии. М.: Наука, 1965. 479 с.

Фнляков В.Г. Революционные связи рабочих Белоруссии и России в конце XIX - начале XX в. / Под ред. М.О. Бича. Мн.: Наука и техника, 1987. 142 с.

Фришман В. Промышленность Западной Белоруссии: Статист.-эконом. описание. Мн.: Изд-во БАН, 1934. 134 с.

Хаўстовіч М. Ля вытокаў беларускай ідэі: (Аб беларускім літаратурна-грамадскім руху ў 40-я гг. XIX ст.) // Полымя. 1994. № 11. С. 163-175.

Хацкевіч А. Аб раззбраенні груповак АК у Нарачанскай і Налібокскай пушчах // Бел. гіст. часопіс. 1996. № 1. С. 96-105; № 3. С. 44-55.

Хацкевіч А. Арышты і дэпартацыі ў заходніх абласцях Беларусі (1939-1941 гг.) //Бел. гіст. часопіс. 1994 № 1 С. 89-94; № 2 С. 70-76.

Ходзін С.М. Крыніцы гісторыі Беларусі (гісторыка-генетычнае і кампаратыўнае вывучэнне): Вучэб. дапам. Мн.:БДУ, 1999. 193 с.

Цітоў А. "Узбуйненне" // Спадчына. 1991. № 5. С. 17-23.

Цуба М. Беларускі нацыянальны рух на пачатку XX ст. // Бел. гіст. часопіс. 1996. № 1. С. 182-192.

Цьвікевіч А. "Западно-руссизм": Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в. 2 выд. Мн.: Навука і тэхніка, 1993. 352 с.

Цярохін С.Ф. Многія прыйдуць пад імем маім: Езуіты на Беларусі. Мн.: Полымя, 1995. 143 с.

Чаропка В. За шчасце айчыны // Бел. мінуўшчына. 1997. № 3. С. 42-45.

Чепко В.В. Города Белоруссии в первой половнне XIX века (Экономическое развитие). Мн.: Изд-во БГУ, 1981. 143 с.

Чепко В.В. Классовая борьба в белорусской деревне в первой половнне XIX в. Мн.: Наука н технпка, 1972. 267 с.

Чепко В.В. Сельское хозяйство Белоруссии в первой половине XIX века. Мн.: Наука и техника, 1966. 220 с.

Шабуня К.И. Аграрный вопрос и крестьянское движене в Белоруссии в революции 1905-1907 гг. Мн.: Изд-во Мин-ва высш. н сред. спец. и проф. образов. БССР, 1962. 435 с.

Шадурский В.Г. Культурные связн Беларуси со странами Центральной и Западной Европы (1945-1990-е годы) /Под науч. ред. В.И. Новицкого, А.В. Шарапо. Мн.: БГУ 2000. 286 с.

Шалькевич В.Ф. Кастусь Калиновский: Страннцы биографии. Мн.: Университетское, 1988. 240 с.

Шарапа А., Гардзейчык А. Да пытання аб людскіх стратах у другой сусветнай вайне // Бел. гіст. часопіс. 1996. № 2. С. 35-44.

Шарков А.В. Военнопленные и интернированные на территории Беларуси: Роль органов внутреннпх дел в их содержании и трудовом использовании (1944-1951) / Науч. ред. В.П. Павлов. Мн.: Акад. МВД РБ, 1997. 159 с.

Швед В.В. Беларускія старонкі дзекабрыстаў. Мн.: БелНДІДАС, 1998. 132 с.

Швед В.В. Паміж Польшчай і Расіяй: Грамадска-палітычнае жыццё на землях Беларусі (1772-1863 гг.). Гродна: ГрГУ, 2001 416 с.

Шибеко З.В. Минск в конце XIX - начале XX вв.: Очерк социально-экономнческого развития / Науч. ред. К.И. Шабуня, М.О. Бич. Мн.: Наука и техника, 1985. 151 с.

Ширяев Е. Беларусь: история и территория//Неман 1991. № 7.

Шкляр Е.Н. Борьба трудящихся Литовско-Белорусской ССР с иностранными интервентами и внутренней контрреволюцией (1919-1920 гг.). Мн.: Госиздат БССР, 1962. 178 с.

Эканамічная гісторыя Беларусі: Вучэб. дапам.: 3 выд., дап. і перапрац. / В.І. Галубовіч, Р.І. Ермашкевіч. Г.П. Бушчык і інш.; Пад агул. рэд. В.І. Галубовіча. Мн.: Экаперспектыва, 1999. 454 с.

Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 1-5; Т. 6. Кн. 1. Мн.: БелЭн, 1993-2001.

Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: У 5 т. Мн.: БелСЭ, 1982-1987.

Юхо Я. Беларускія ўрады 1918-1921 гг. і іх паўнамоцтвы // Бел. гіст. часопіс. 1993. № 4. С. 63-68.

Янушкевіч Я. Неадменны сакратар адраджэння: Вацлаў Ластоўскі. Мн.: Навука і тэхніка, 1995. 68 с.

## КРЫНІЦЫ


Адамушко В.И., Иванова Н.В. "Помилуйте...": Документы по репрессиям 1939-1941 гг. в Вилейской областн. Мн.:Главн. архнв. управл. при Совете Министров Республики Беларусь, 1992. 98 с.

Аляхновіч Ф. Як з мяне зрабілі вучыцеля // Спадчына. 1997. № 1. С. 205-211.

Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі / Уклад., пад-рыхт. Тэксту, уступ. арт., камент., пер., паказ. С. Шупы. Вільна, Нью-Ёрк, Менск, Прага: Бел. ін-т навукі і мастацтва; Т-ва бел. пісьменства "Наша ніва", 1998. Т. 1: Фонд № 582 Дзяржаўнага архіва Літвы ("Рада Міністраў Беларускай На-роднай Рэспублікі"). Кн. 1. 866 с.; Кн. 2. 874 с.

Беларуская справа падчас польскай акупацыі 1919-1920 гг. // Спадчына. 1994. № 6. С. 50-87.

Белоруссия в эпоху капитализма: Сборник документов и материалов. Мн.: Наука и техника, 1983-1990. Т. 1-2.

Белоруссия в эпоху феодализма: Сборник документов и материалов. Мн.: Изд-во АН БССР, 1961-1979. Т. 3-4.

Белорусская ССР за 50 лет: Статистический сборник. Мн.:Беларусь, 1968. 260 с.

Белорусские остарбайтеры. Документы и материалы / Сост. Г.Д. Кнатько (рук.) и др.; Редкол.: В.И. Адамушко и др. Мн.: НАРБ, 1996-1998. Кн. 1-2; Кн. 3. Ч. 1-2.

Борьба за Советскую власть в Белоруссии. 1918-1920 гг. Сб. документов и материалов / Ред. А.И. Азаров, С.З. Почанин. Мн.: Беларусь, 1968-1971. Т. 1-2.

Борьба трудящихся Западной Белоруссии за социальное и национальное освобождение и воссоединенне с БССР. Документы и материалы / Ред. кол. В.И. Гурский и др. Мн.: Госиз-дат БССР; Беларусь, 1962-1972. Т. 1-2.

Валахановіч А.І., Міхнюк У.М. Споведзь у надзеі застацца жывым: Аўтабіяграфія Б. Тарашкевіча / Мн.: БелНДІДАС, 1999. 197 с. (Гл. таксама: Браніслаў Тарашкевіч. Аўтабіяграфія // Спадчына. 1996. № 4. С. 92-132; № 5. С. 130-186).

В лесах Белоруссии: Воспоминания советских партизан и немецких антифашистов / Ред. И.М. Игнатенко, А.В. Семенова. Мн.: Беларусь, 1977. 383 с.

В непокоренном Миске: Документы и материалы о подпольной борьбе советских патриотов в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 - июль 1944) / Ред. кол. Р.П. Платонов (пред.); Сост. Л.В. Аржаева, В.П. Липило. Мн.: Беларусь, 1987. 238 с.

Восстание в Литве и Белоруссии 1863-1864 гг. / Ред. кол. В. Дьяков и др.; текст к печатн под. Л. Аржаева н др.Wroclaw, М.: Наука, 1965. 587 с.

Восстановление народного хозяйства БССР (1921-1925 гг.):Сб. документов и матерналов / Под ред. З.И. Гиоргидзе н др. Мн.: Беларусь, 1981. 270 с.

Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны. Документы и материалы / Гл. редкол. А.Т. Кузьмин (пред.) и др. Мн.: Беларусь, 1983-1985. Т. 1-3.

Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 - июль 1944). Документы и материалы. Мн.: Беларусь, 1967-1982. Т. 1-3.

"Всеподданнейшнй отчет..." виленского, гродненского и ковенского генерал-губернатора П.Д. Святополк-Мирского Николаю II // Бел. гіст. часопіс. 1997. № 2. С. 94-116.

Гадлеўскі В. З беларускага палітычнага жыцьця ў Менску ў 1917-1918 гг. // Спадчына. 1997. № 5. С. 18-39.

Гадлеўскі В. Публіцыстыка. Патрэба нацыянальнай ідэі // Спадчына. 1993. № 2. С. 38-51.

Гражданские движения в Белоруссии: документы и материалы, 1986-1991: Общеакад. программа "Человек. Наука. Общество" / Сост. П.В. Терешкович М.: ЦИМО, 1991. 325 с.

Дакументы Беларускае Сацыялістычнае Грамады часоў рэвалюцыі 1905 г. // Спадчына. 1991. № 3. С. 36-43.

Дакументы да змовы Гітлера і Сталіна да пачатку Другой сусветнай вайны // Спадчына. 1994. № 1. С. 79-84.

Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. Т. 2. (1772-1903) / Пад рэд. Н.М. Нікольскага і І.Ф. Лочмеля. Мн.:АН БССР, 1940. 955 с.

Документы и материалы по истории Белоруссии. Т. 3. (1900-1917 гг.). / Под. ред. В.Н. Перцева и др. Мн.: Изд-во АН БССР, 1953. 1019с.

Документы и материалы по истории Белоруссии. Т. 4. (1917 март - 1919 февраль). Из нстории установления Советской власти в Белоруссии и образования БССР. / Редкол. А.И. Азаров и др. Мн.: Изд-во АН БССР, 1954. 514 с.

Дэкларацыя Вярхоўнага Савета БССР "Аб дзяржаўным суверэнітэце БССР" (27 ліпеня 1990 г.). Мн.: Беларусь, 1990. 23 с.

Езавітаў К. Аўтабіяграфія // Полацак. 1992. № 5.

Езавітаў К. Першы Усебеларускі з'езд // Бел. мінуўшчына. 1993. № 1. С. 25-29.

Ермаловіч В. З архіваў партызанскага руху // Бел. гіст. часопіс. 1994. № 2. С. 13-19; № 4. С. 7-16.

Жылуновіч З. Нацыянал-дэмакраты за "працай" (1920-1928 гг.) // Спадчына. 1991. № 4. С. 85-97; № 5. С. 62-75.

Завершение коллективнзации сельского хозяйства и организационно-хозяйственное укрепление колхозов Белорусской ССР (1933 г. - июнь 1941 г.): Сб. документов и материалов / Сост. В.В. Грамович, Л.П. Нартыш-Блук, К.Ф. Плахотнкова и др.; Ред. кол. М.П. Костюк н др. Мн.: Беларусь, 1985. 286 с.

Закон Беларускай ССР "Аб мовах у Беларускай ССР". Мн.: Беларусь, 1990. 31 с.

"Злітуйцеся..." (дакументы аб рэпрэсіях у 1947-1952 гг.) // Спадчына. 1990. № 4. С. 34-38.

Знешняя палітыка Беларусі: Зборнік дакументаў і матэрыялаў / Склад. У.М. Міхнюк і інш. Мн.: БелНДІДАС, 1997-2001. Т. 1-4.

Идеологическая деятельность Компартии Белоруссии, 1918-1945: Сб. документов / Сост. Н.С. Сташкевич н др. Мн.:Беларусь, 1990. Ч. 1: 1918-1928. 357 с.

Индустриализация Белорусской ССР. (1926-1941 гг.). Сб. документов и матерналов / Под. ред. В.Н. Жигалова н др. Мн.: Беларусь, 1975. 467 с.

История Беларуси в документах н материалах / Авт.-сост. И.Н. Кузнецов, В.Г. Мазец. Мн.: Амалфея, 2000. 672 с.

Каліноўскі К. За нашу вольнасць: Творы, дакументы / Ук-лад., прад., паслясл., пер. і камент. Г. Кісялёва; Навук. рэд. Я. Янушкевіч. Мн.: Бел. кнігазбор, 1999. 459 с.

Калиновский К. Из печатного и рукописного наследия / Предисл. В.Ф. Шалькевича. Мн.: Беларусь, 1988. 208 с.

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь. Мн.: Беларусь, 1994; 1996.

Кароткая справаздача 3-га паседжання Рады Беларускае Народнае Рэспублікі // Спадчына. 1997. №1. С. 6-10.

Кнігі Памяці.

Коленкур де Арман. Мемуары. Поход Наполеона в Россию. М.: Госполитиздат, 1943. 380 с.

Кооперативно-колхозное строительство в Белорусской ССР (1917-1927 гг.). Сб. документов и материалов / Сост. Т.А. Воробьева, Р.С. Васильева, Э.Л. Козловская и др.; Ред. кол. М.П. Костюк и др. Мн.: Наука и техника, 1980. 310 с. Купалава "пакаянне" // Спадчына. 1998. № 2. С. 189-203. Луцкевіч А. Дзённік // Полымя. 1990. № 4-5.

Луцкевіч А. За дваццаць пяць гадоў (1903-1928): Успаміны аб працы першых беларускіх палітычных арганізацый: Беларуская

рэвалюцыйная грамада, Беларуская сацыялі-стычная грамада / Паслясл. А.М. Сідарэвіча. 2 выд. Мн.:БелСЭ, 1991. 64 с.

Малецкі Я. Пад знакам пагоні. Успаміны. Таронта: Пагоня, 1976. 199 с.

Мастацтва Савецкай Беларусі. Зб. дакументаў і матэрыялаў / Рэд. кал. В.К. Бандарчык (адк. рэд.) і інш. Мн.: Навука і тэхніка, 1976-1986. Т. 1-2.

Мемарандум Рады БНР да канферэнцыі дзяржаў у Генуі // Бел. гіст. часопіс. 1997. № 1. С. 54-57.

Мирный договор между Россией и Литвой (12 июля 1920 г.) // Спадчына. 1993. № 5. С. 48-55.

Мирный договор между Россией и Украиной, с одной стороны, и Польшей– с другой // Спадчына. 1993. № 4. С. 12-22.

Мнрный договор между Россией, с одной стороны, и Германией, Австро-Венгрией, Болгарией и Турцией, с другой (3 марта 1918 г.) // Спадчына. 1993. № 2. С. 52-57.

Народное образование в БССР: Сб. документов и материалов. Мн.: Нар. асвета, 1979-1980. Т. 1-2.

Нацистская политика геноцида и "выжженной земли" в Белоруссии (1941-1944) / З.И. Белуга, Г.Б. Белькевич, В.С. Лазебников и др. Мн.: Беларусь, 1983. 271 с.

"Нацметское золото" из Беларуси. Документы и материалы / Сост. В.И. Адамушко и др. Мн.: НАРБ, 1998. 413 с.

Нямецка-фашысцкі генацыд на Беларусі (1941-1944) / Пад. агул. рэд. У.М. Міхнюка. Мн.: БелНДЦДААС, 1995. 411 с.

Обретение республики. История образования БССР и создание КП Белоруссии в документах // Неман. 1983. № 3. С. 113-128.

Октябрь и судьбы политической оппозиции: Совмест. рос.-белорус. исслед.: Учеб. пособие для преподавателей и студентов вузов / Под общ. ред. Э.М. Энтина. Гомель: Бел. агентство научно-технической и деловой информации, 1993. Ч 1-3.

Пачынальнікі. З гісторыка-літаратурных матэрыялаў XIX ст. / Уклад. Г.В. Кісялёў; Рэд. В.В. Барысенка, А.І. Мальдзіс. Мн.: Навука і тэхніка, 1977. 543 с.

Першы з'езд беларусаў свету. Дакументы // Бел. гіст. часопіс. 1993. № 3. С. 3-10.

Подготовка сплошной коллективизации сельского хозяйства Белорусской ССР (ноябрь 1927 г. - ноябрь 1929 г.). Сб. документов и матерналов / Под ред. А.й. Азарова и др. Мн.:

Беларусь, 1976. 271 с.

Польско-советская война 1919-1920: (Ранее не опубликованные документы и материалы). / Рос. акад. наук, ин-т славяноведения и балканистики и др.; Подгот.: И.И. Костюшко н др. М.: ИСБ РАН, 1994. Ч. 1-2.

Праграмныя дакументы палітычных партый: Вучэб. да-пам. / Склад. П.І. Брыгадзін. Мн.: БДУ, 1994. 100 с.

Пратакол з'езду беларускіх нацыянальных арганізацый у Мінску 25-27 марца 1917 г. // Спадчына. 1990. № 4. С. 29-33.

Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии. 1941-1944. Документы и материалы / Предисл. И.П. Ховратович, Г.Н. Шевела. 2 изд., испр. и доп. Мн.: Беларусь, 1965. 464 с.

Проведение сплошной коллективизации сельского хозяйства Белорусской ССР. (Ноябрь 1929 г. - 1932 г.). Сб. документов и материалов / Предисл. Н.В. Власенко. Под ред. А.И. Азарова и др. Мн.: Беларусь, 1973. 424 с.

Программные документы современных политических партий Беларуси. Учеб. пособие / Авт.-сост. В.К. Коршук и др. Мн.: БГУ, 1997-1998. Вып. 2-3.

Рагуля В. Успаміны // Спадчына. 1994. № 4. С. 107-126.

Революционные комитеты БССР и их деятельность по упрочению Советской власти и организации социалистического стронтельства (июль - декабрь 1920 г.). Сборник документов и материалов. Мн.: Изд-во АН БССР, 1957. 523 с,

Революционные комитеты БССР. (Ноябрь 1918 г. - июль 1920 г.). Сборник документов и материалов / Редкол. Н.В. Каменская (гл. ред.) и др. Мн.: Изд-во АН БССР, 1961. 460 с.

Революционный авангард трудящейся молодежи Западной Белоруссии (1921-1939 гг.). Документы и матерналы / Сост. М.А. Бобер и др. Предисл. Н.С. Орехво и Л.Н. Яшенко. Мн.: изд-во БГУ, 1978. 327 с.

Революционный подъем в Литве и Белоруссии в 1861-1862 гг. Сб. документов / Предисл. Ю. Жюгжды и С. Лазутка. Редкол. В. Дьяков и др. М.: Наука, 1964. 778 с.

Русско-германский добавочный договор к мирному договору между Россией, с одной стороны, и Германией, Австро-Венгрией, Болгарией и Турцией, с другой (27 августа 1918 г.) // Спад-чына. 1993. № 3. С. 73-81.

Русско-польские революционные связи. Документы и материалы / Преднсл. и. Миллер. Редкол. В.А. Дьяков и др. Wroclaw, М.: изд-во АН СССР, 1963. Т. 1-2.

Сборник нормативных документов по восстановлению прав граждан, пострадавших в ходе политических репрессий 20-80-х годов / Сост. В.И. Адамушко, Ю.А. Кладухин. Мн.: Гл. арх. упр. при СМ РБ, 1991. 55 с.

Секретные документы из особых папок // Вопросы истории. 1993. № 1. С. 3-22.

Слуцкі збройны чын 1920 г. у дакумэнтах і ўспамінах / Уклад., падр. тэкст., заўв., камент. і паказ.: А. Гесь і інш. Прадм. У. Ляхоўскі. Мн.: Энцыклапедыкс, 2001. 372 с.

Умпіровіч А., Фурс А. Споведзь няспраўджаных надзеяў // Спадчына. 1997. № 1. С. 132-168.

Уния в документах: Сборник / Сост. В.А. Теплова, З.И. Зуева. Мн.: Лучи Софии, 1997. 518 с.

Усебеларускі з'езд 1917 года: сведчанне сучасніка // Бел. гіст. часопіс. 1993. № 1-4.

Філаматы і філарэты: Зборнік / Уклад., пер. польскамоўн. твораў, прадм., біяграф. даведк. пра аўт. і камент. К. Цвіркі. Мн.: Бел. кнігазбор, 1998. 399 с.

Хрестоматия по истории Белоруссии с древнейших времен до 1917 г. / Сост. А.П. Игнатенко, В.Н. Сидорцов. Мн.: Университетское, 1977. 472 с.

Хрестоматия по истории БССР. 1917-1983 / Сост. А.П. Игнатенко, В.Н. Сидорцов, П.З. Савочкин, А.И. Сидоренко. 2 изд. перераб. и доп. Мн.: Университетское, 1984. 453 с.

ЗМЕСТ

УСТУП

**Тэма I**

БЕЛАРУСЬ У П ЕРЫ ЯД АД ПАДЗЕЛАЎ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ ДА БУРЖУАЗНЫХ РЭФО РМАЎ (канец XVIII ст. - 1861 г.)

(В.А. Цяіілова, В.В. Пуна, А.М. Лукашэвіч, А.У. Кузняцова)

*Лекцыя 1.* ПРАВАВОЕ І САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЕ СТАНОВІШЧА БЕЛАРУСІ ПАСЛЯ ДАЛУЧЭННЯ ДА РАСІІ

*Лекцыя 2.* УРАДАВАЯ ПАЛІТЫКА

*Лекцыя 3.* ВАЙНА 1812 г. ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫ РУХ НА БЕЛАРУС1

*Лекцыя 4.* РАЗВІЦЦЁ КУЛЬТУРЫ

**Тэма II**

СТАНАЎЛЕННЕ БУРЖУАЗНАГА ГРАМАДСТВА

(А.Г. Каханоўскі, В.А. Цяплова, А.У. Кузняцова)

*Лекцыя 5.* БУРЖУАЗНЫЯ РЭФО РМЫ

*Лекцыя 6.* НА ШЛЯХУ КАП1ТАЛ1СТЫЧНАГА РАЗВІЦЦЯ

*Лекцыя 7.* АСАБЛІВАСЦІ САСЛОЎНАЙ УРАДАВАЙ ПАЛІТЫКІ Ў 60-90-я гг. XIXст

*Лекцыя 8.* ГРАМАДСКІ РУХ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX ст

**Тэма III**

БЕЛАРУСЬ У ПАЧАТКУ XX ***ст.*** (ПЛ. Брыгадзін)

*Лекцыя 9.* НАЦЫЯНАЛЬНЫ І САЦЫЯЛЬНЫ СКЛАД ГРАМАДСТВА

*Лекцыя 10.* ЭКАНАМІЧНАЕ І ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЕ ЖЫЦЦЁ

*Лекцыя П.* РЭВАЛЮЦЫЙНЫЯ ПАДЗЕІ Ў ПАЧАТКУ XX ст

*Лекцыя 12.* КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ

**ТэмаIV**

БЕЛАРУСЬ НА П ЕРАЛО МЕ ЭПО Х (У.Ф. Ладысеў)

*Лекцыя 13.* ПЕРШАЯ СУСВЕТНАЯ ВАЙНА 1 БЕЛАРУСЬ

*Лекцыя 14.* ПАДЗЕ1 ЛЮТАЎСКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ Ў БЕЛАРУСІ

*Лекцыя 15.* КАСТРЫЧНІЦКАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ І ЛЁС БЕЛАРУСІ

*Лекцыя 16.* СТАНАЎЛЕННЕ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

*Лекцыя 17.* ПОЛЬСКА-САВЕЦКАЯ ВАЙНА І БЕЛАРУСЬ

**Тэма V**

БЕЛАРУСЬ У 20-30-я гг. XX ст. (П.І. Зялінскі, У .І. Адамушка, А.У. Кузняцова)

*Лекцыя 18.* ДЗЯРЖАЎНАЕ І НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНАЕ БУДАЎНІЦТВА Ў 20-я гг

*Лекцыя 19.* СА ЦЫЯЛ ЬНА-ЭКАНАМ ІЧ Н Ы Я ПЕРАЎТВАРЭННІ Ў 20-30-я гг

**Тэма VI**

ЗАХОДНЯЯ БЕЛАРУСЬ У СКЛАДЗЕ ПОЛЬШЧЫ (У.Ф. Ладысеў)

*Лекцыя 20.* УМОВЫ ЖЫЦЦЯ НАСЕЛЬНІЦТВА КРАЮ Ў СКЛАДЗЕ ПОЛЬШЧЫ

*Лекцыя 21.* НАЦЫЯНАЛЬНА-ВЫЗВАЛЕНЧЫ РУХ

**Тэма VII**

БЕЛАРУСЬ У ПЕРЫЯД ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ (У.Ф. Ладысеў, В.І. Ермаловіч, В.В. Пупа)

*Лекцыя 22.* ПЕРШЫ ЭТАП ВАЙНЫ

*Лекцыя 23.* НЯМЕЦКАЯ АКУПАЦЫЯ БЕЛАРУС1

*Лекцыя24.* АНТЫФАШЫСЦКАЯ БАРАЦЬБА

**Тэма VIII**

РАЗВІЦЦЁ БССР У 1945-1985 гг. (С М. Ходзін, П.І. Зялінскі, А.У. Кузняцова)

*Лекцыя 25.* АДНАЎЛЕННЕ ГАСПАДАРКІ І РАЗВІЦЦЁ БССР У ПЕРШАЕ ПАСЛЯВАЕННАЕ ДЗЕСЯЦІГОДДЗЕ

*Лекцыя 26.* ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЕ ЖЫЦЦЁ Ў 1950-1980-х гг

*Лекцыя 27.* САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ Ў 1950-1980-х гг

**ТэмаIX**

БЕЛАРУСЬ НА ШЛЯХУ СІСТЭМНЫХ ПЕРАЎТВАРЭННЯЎ (Ю.Л. Казакоў, У.Ф. Ладысеў, А.Г. Каханоўскі, В.В. Пупа)

*Лекцыя 28.* ДАСЯГНЕННЕ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ

*Лекцыя 29.* ЭКАНОМІКА, ПАЛІТЫКА, КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ: ТЭНДЭНЦЫІ РАЗВІЦЦЯ

ХРАНАЛОГІЯ (А.М. Лукашэвіч)

ЛІТАРАТУРА (А.М. Лукашэвіч)

КРЫНІЦЫ (А.М. Лукашэвіч)

© OCR: Камунікат.org, 2011 год
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год
© PDF: Камунікат.org, 2011 год